МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ»

БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА І ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

(ДА 80-ГОДДЗЯ ПАЧАТКУ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАСКОПАК У Г. ПОЛАЦКУ)

Зборнік навуковых прац
рэспубліканскага навукова-практычнага семінара
20 – 21 лістапада 2008 года

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. Д.У. Дука,
канд. гіст. навук, дац. У.А. Лобача

Наваполацк
ПДУ
2009

УДК 908(476.5)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43
Б43

Рэдакцыйная калегія:

д-р гіст. навук, прафесар Г.В. ШТЫХАЎ
(гал. навук. супрацоўнік ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі»);
чл.-кар. НАН Беларусі, д-р гіст. навук, прафесар М.Ф. ПІЛІПЕНКА
(гал. навук. супрацоўнік ДНУ «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі
і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі»)

Б43 **Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку)** : зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20 – 21 лістап. 2008 г. / пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – 300 с.

ISBN 978-985-418-787-7.

У зборніку прадстаўлены навуковыя артыкулы па выніках работы рэспубліканскага навукова-практычнага семінара «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў». Прадстаўлены вынікі палявога археалагічнага, краязнаўчага, этнаграфічнага, антрапалагічнага і лінгвістычнага даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб развіцці тапаграфіі пасяленняў, матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва Беларускага Падзвіння ў рэтраспектыве часу. Падведзены вынікі антрапалагічнага даследавання старажытнага насельніцтва Беларускага Падзвіння.

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцяў ВНУ, мастацтвазнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

УДК 908(476.5)(082)
ББК 63.3(4Беи)я43

ISBN 978-985-418-787-7

© Установа адукацыі
«Полацкі дзяржаўны універсітэт», 2009

А.М. ЛЯЎДАНСКІ – ПАЧЫНАЛЬНІК ПОЛАЦКАЙ АРХЕАЛОГІІ

У 2008 годзе споўнілася 80 гадоў з таго моманту, калі ў Полацку пачала працаваць археалагічная экспедыцыя пад кіраўніцтвам вядомага беларускага археолага Аляксандра Мікалаевіча Ляўданскага. І хаця археалагічныя даследаванні праводзіліся ў Полацку і раней гэтага часу, базавыя пытанні развіцця тапаграфіі горада, яго планіровачнай структуры былі ўпершыню сістэмна разгледжаны экспедыцыяй Інбелкульта.



А.М. Ляўданскі – пачынальнік полацкай археалогіі, ён упершыню вызначыў, што старажытнае полацкае гарадзішча, пачатковы дзяцінец горада, знаходзілася на пагорку мысавага тыпу ў рэчышчы Палаты.

А.М. Ляўданскі таксама вызначыў, што функцыі дзяцінца Полацка гарадзішча мела да канца XII стагоддзя, калі ў вусці Палаты паўстае новы дзяцінец – Верхні замак. Гэтая думка блізкая да вынікаў сучасных даследаванняў з тым удакладненнем, што пачатковы дзяцінец існаваў на гарадзішчы да пачатку XIV стагоддзя.

А.М. Ляўданскі ўпершыню пазначыў магчымасць перапланіроўкі Полацка падчас Лівонскай вайны, у прыватнасці змену русла Палаты. Пошук старажытнага паселішча каля падножжа гарадзішча даследчык не паспеў правесці, але вызначыў магчымасць яго размяшчэння па накірунку ад гарадзішча ўздоўж Палаты да Дзвіны. Сёння наяўнасць старажытнага паселішча каля падножжа гарадзішча з'яўляецца навуковым фактам.

А.М. Ляўданскі даследаваў на Верхнім замку сляды старажытнай пабудовы з плінфы, якая, магчыма, з'яўляецца яшчэ адным помнікам манументальнага дойлідства XII стагоддзя. Ён выказаў трапнае меркаванне, што Верхні замак быў заселены не раней за XI стагоддзе, што пацверджана сучаснымі археалагічнымі даследаваннямі.

На тэрыторыі «Старога горада» (Запалоцце) А.М. Ляўданскі адкрыў сляды старажытнага пасада. Праведзеныя раскопкі на тэрыторыі Бельчыцкага Барысаглебскага і Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыроў прывялі даследчыка да высновы аб адсутнасці на іх тэрыторыях слядоў пасялення раней за XII стагоддзе, што сведчыць аб асаблівай ролі манастыроў у горадабудаўнічай структуры тагачаснага Полацка.

Такім чынам, усе даследаванні А.М. Ляўданскага ў г. Полацку пачынаюцца са слова «Упершыню...». Геніяльны даследчык беларускай даўніны заклаў краевугольныя камяні сучаснаму ўяўленню пра сацыятапаграфічную структуру найстаражытнейшага горада Беларусі.

У методыцы даследаванняў А.М. Ляўданскі абапіраўся на даныя этнаграфічных крыніц, што дазволіла верыфікаваць звесткі пра змены ў 1563 годзе рэчышча Палаты, наяўнасці старажытнейшага пасада ў Запалоцці.

Такім чынам, А.М. Ляўданскаму належыць гонар узвядзення на старажытным падмурку гістарычнага вывучэння Полацка асновы сапраўднага дома археалагічнай навукі, аздобу якога працягваюць ствараць сучасныя навукоўцы.

Сёння археолага-этнаграфічны накірунак даследавання Полацка і Беларускага Падзвіння з'яўляецца адным з прыярытэтнейшых у дзейнасці Полацкага дзяржаўнага універсітэта – вышэйшай навучальнай установы на старажытнай Полацкай зямлі, якая пачала дзей-

насць у 1968 годзе ў г. Наваполацку. Этнаграфічныя экспедыцыі праводзяцца штогадова з 1994 года, іх вынікам сталі шматлікія навуковыя адкрыцці ў справе вывучэння традыцыйнай народнай культуры беларусаў Падзвіння.

Археалагічныя раскопкі супрацоўнікаў ПДУ працягваюць традыцыі археалагічнага даследавання Полацка і Полацкай зямлі, закладзеныя славутымі папярэднікамі.



Г.В. Штыхаў і маладыя археолагі
на старажытным полацкім гарадзішчы (2007 г.)

Прымеркаваная да юбілею археалагічнага вывучэння Полацка рэспубліканскі навукова-практычны семінар ставіць мэту аб'яднання намаганняў археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, лінгвістаў і краязнаўцаў у спасціжэнні гістарычнага мінулага Падзвінскага краю і сумежных тэрыторый. Адна з яго задач – пашырэнне вопыту арганізацыі міждысцыплінарных краязнаўчых даследаванняў у розных рэгіёнах свету.

Д.У. Дук, кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі
Полацкага дзяржаўнага універсітэта

АРХЕАЛОГІЯ

РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПАХАВАЛЬНАГА АБРАДУ КРЭМАЦЫІ ПА ДАНЫХ РАСКОПАК КУРГАННЫХ МОГІЛЬНІКАЎ ПОЛАЦКАЙ ЗЯМЛІ

А.В. ВАЙЦЯХОВІЧ
(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)

Па даных раскопак курганных могільнікаў Полацкай зямлі разглядаюцца пахавальны абрад крэмацыі, яго рэканструкцыя. Даецца спроба прасачыць стадыі пахавальнага абраду крэмацыі згодна пісьмовым крыніцам. Вылучаюцца наступныя стадыі: апрананне цела, будоўля пахавальнага вогнішча, непасрэдна працэс крэмацыі, транспартыроўка парэшткаў на месца пахавання, насыпанне курганнага насыпу. Таксама разглядаюцца асобныя рытуалы: ахвярапрынашэнне жывёлы, змяшчэнне ў пахаванне рэчаў, не звязаных з касцюмам, каменныя і драўляныя канструкцыі ў насыпу.

Абрад крэмацыі існаваў ў розных народаў і ў розныя часы. Вогненнае пахаванне ўзгадваецца ў Іліадзе Гамера, Саге аб Беавульфе, Індыі Абу Рэйхана, Хроніцы М. Стрыйкоўскага і інш. Аднак толькі падрабязнае апісанне спалення цела заможнага руса зробленае Ібн Фадланам у X стагоддзі дае ўяўленне аб складанасці і разнастайнасці язычніцкіх пахавальных рытуалаў і іх паэтапнасці ад моманта смерці да збудавання курганнага насыпу.

Звесткі аб існаванні абраду трупаспалення ў славян лясной зоны Еўропы можна знайсці ў Аповесці мінулых часоў, Анапімнай Рэляцыі, вытрымкі з якой прыводзяцца Ібн Рустэ, у творах ал Масуда. У першай гаворыцца аб звычаях радзімічаў, вяцічаў, севяран, крывічаў і ішых язычнікаў: «И аще къто умьяряши творяху тризну над ним. И посемь сътвороху краду велику и възложаху на краду мьртвьца и съжьжаху и. Посемь, събравъше кости, възложаху в судину малу и поставляху на стълпе на путех...» [1, с. 15]. У пазнейшай устаўцы XIII стагоддзя дададзена: «...и в курганы сыпаху...». Ібн Рустэ піша: «Калі памірае ў іх (славян) нехта, труп яго спальваюць... На другі дзень пасля спалення нябожчыка яны ідуць на месца, дзе гэта адбывалася, збіраюць попел з таго месца і кладуць яго на ўзгорак». Ал Масуд у X стагоддзі таксама звяртае ўвагу на некаторыя аспекты абраду славян і русаў: «яны спальваюць сваіх нябожчыкаў з цяглавай жывёлай, зброяй упрыгожваннямі. Калі памірае мужчына, то спальваецца з ім і жонка яго жывою, а калі памірае халасты, то яго ажэняць пасля смерці. Калі памірае жанчына, то муж не спальваецца» [2, с. 51, 228, 338].

Аднак для высвятлення розных этапаў пахавальнага абраду і рэканструкцыі рытуалаў фрагментарных адрыўкаў з пісьмовых крыніц, відавочна, недастаткова, таму для ажыццяўлення гэтай мэты, галоўным чынам, трэба звяртацца да вынікаў археалагічных раскопак курганных могільнікаў і даных эксперыментальнай археалогіі.

Першую стадыю абраду – падрыхтоўку цела да пахавання – археалагічна прасачыць практычна немагчыма. Па сведчанню Ібн Фадлана, гэта частка займала 10 дзён і ўключала ў сябе пашыў адзення, выбар і падрыхтоўку наложніцы для спалення, памінальныя піры, збудаванне вогнішча. Аднак трэба ўлічваць што для сялянскіх могільнікаў разглядаемай тэрыторыі стадыя падрыхтоўкі цела была больш простай. У пахаваннях часта знаходзяць дэталі касцюма. Вопратка заўсёды палкам згарае. У адноснай захаванасці да нас дахозяць толькі металічныя рэчы. Комплекс жаночых упрыгожанняў VIII – X стагоддзяў звычайна складаўся з пэўнага набору, індыкатарамі якога з'яўляюцца плоскія серпападобныя скроневыя кольцы, спіральныя пранізкі ад галаўных венчыкаў, тралецыяпадобныя падвескі, шкляныя пацеркі (пераважаюць сінія і жоўтыя) і інш. З сярэдзіны X стагоддзя з'яўляюцца новыя тыпы ўпрыгожанняў, якія сустракаюцца ў пазнейшых курганах з інгумацыяй: браслетападобныя дротавыя скроневыя кольцы, грушападобныя бразготкі з крыжападобным проразам, некаторыя віды пацерак і інш). Дэталі, характэрныя для мужчынскага касцюма, – жалезныя і бронзавыя паясныя спражкі (паясны набор мог складацца з паясных кольцаў, абойміц, накладак), жалезныя і бронзавыя падковападобныя фібулы.

Наступным крокам абраду крэмацыі з'яўлялася збудаванне пахавальнага вогнішча, размяшчэнне на ім цела памерлага і непасрэдна сам працэс трупаспалення. Прасачыць гэтыя этапы археалагічна, за рэдкім выключэннем, немагчыма. Для высвятлення закранутага пытання трэба звяртаца да вынікаў эксперыментальнай археалогіі.

Эксперыменты з рознымі пахавальнымі вогнішчамі паказваюць, што найбольш аптымальнай з'яўляецца канструкцыя ў выглядзе кратаў квадратнай ці прамавугольнай формы. Яна складзена з бярвенняў альбо плашак стосам у некалькі ярусаў. Ніжнія складзены больш вольна, для лепшага прытоку паветра. Паміж ярусамі рабіліся праслойкі з галля. Стос у некаторых выпадках умацоўваўся камянямі, драўлянымі калодамі ці вертыкальнымі коллямі, якія ўкопваліся ў зямлю.

Цела памерлага, верагодна, клалі не на верх стоса, а ва ўнутр, таму што праз 15 хвілін спалення яно лопаецца і вадкасці разлятаюцца на некалькі метраў. Тым больш пры такім размяшчэнні цела крэмацыя адбываецца хутчэй і эфектыўней. Працэс спалення ад пачатку і да астывання вогнішча працягваецца каля 10 гадзін пры спрыяльных умовах надвор'я. Сам стос гарыць 3 гадзіны, затым ён тлее, а косткі працягваюць гарэць. Пры пахаванні на баку ад вогнішча косткі, верагодна, выбіраліся на наступны дзень апасля крэмацыі, аб гэтым жа ўзгадваў Ібн Рустэ.

Слядоў месц для трупаспалення на баку ад кургана на тэрыторыі Полацкай зямлі не зафіксавана. Ф.В. Пакроўскі пытаўся інтэрпрэтаваць пляцоўку з вугалямі на ўзгорку каля могільніка Загор'е падобным чынам [3, с. 166], аднак адсутнасць перапаленых касцей не дазваляе пацвердзіць гэта.

Курганоў са слядамі правядзення крэмацыі на месцы няшмат. Тут вылучаюцца насыпы, дзе вогнішча было раскладзена на ўзроўні гарызонта альбо на спецыяльна зробленай падсыпцы. У першым выпадку гэта 11 курганоў на 7 могільніках, 9 з якіх можна аднесці да спалення на месцы з пэўнай доляй верагоднасці. З упэўненасцю можна гаварыць аб падобным рытуале ў Глінішчы № 12 і Мілтах № 4 [4, с. 124; 5, с. 122 – 124].

У Глінішчы і Мілтах, досыць вялікіх па дыяметру насыпах (10 м), можна прасачыць рэшткі пахавальных вогнішч. У першым выпадку яно мела выгляд плямы з буйным вуголлем, пад якой быў моцна пракалены пясок. Памеры плямы, арыентаванай з поўначы на поўдзень, 3,2 × 2,6 м. У паўночна-усходняй частцы знойдзены сляды слупка, які мог падтрымліваць дравяніцу. У Мілтах вогнішча было пакладзена на папярэдне выпаленай пляцоўцы і мела выгляд вуглістай плямы, арыентаванай з поўначы на поўдзень, памерам 2 × 1 м. На ёй фіксаваліся сляды абгарэлых плашак, пакладзеных у выглядзе кратаў.

Да трупаспалення на падсыпцы можна аднесці 7 курганоў на 6 могільніках. Са значнай доляй верагоднасці можна інтэрпрэтаваць трупаспаленнем на месцы насыпу пахаванні ў курганах Вітунічы № 4 і Новыя Валосавічы № 5 [6, с. 86 – 87; 9, с. 90].

У Вітунічах сляды вогнішча мелі выгляд попельна-вугальнай праслойкі 3,6 × 3,2 м, глеба пад ім была абпалена. Вышыня падсыпкі складала 0,2 м. На мяжы вогнішча знойдзены 2 абгарэлыя бервяны даўжынёй 0,8 і 1,7 м. Па кутах вогнішча былі пакладзены вялікія камяні памерам 0,4 – 0,7 м.

У Новых Валосавічах на мацерыку фіксавалася падсыпка з белага пяску магутнасцю да 0,34 м, зверху якой прасочвалася попельная праслойка па ўсёй плошчы насыпу. Само трупаспаленне адбывалася на вышыні 0,74 м. Сляды вогнішча мелі выгляд вугальнай плямы 3,2 × 1,6 м, арыентаванай з захаду на ўсход. Магутнасць складала да 0,2 м, глеба пад ім была абпалена. Перапаленыя косткі мелі выгляд паласы даўжынёй 1,8 м. Ва ўсходняй частцы фіксаваліся косткі чэрапа і сплаўленыя пацеркі, у заходняй пераважна фрагменты трубчатых костак.

Значна большая частка трупаспаленняў на тэрыторыі Полацкай зямлі адбывалася на баку ад кургана. Стацыянарныя месцы для трупаспалення, верагодна, былі асобныя для кожнага паселішча. Мяркуючы па такім месцам, знойдзеным на могільніках Валынцаўскай культуры, частка касцей і некаторыя рэчы маглі пакідацца на прагарэўшым вогнішчы, а частка збіраліся і змяшчаліся ў курган. Аб гэтым сведчыць і малая колькасць парэшткаў у пахаваннях.

Вялікая колькасць касцей у трупаспаленнях, праведзеных на баку ад месца пахавання, можа тлумачыцца адначасовым спаленнем некалькіх чалавек на адным вогнішчы, напрыклад, мужчыны і жанчыны. Па гэтых пахаваннях цяжка вызначыць, ці меў тут месца рытуал спалення жонкі, як апісваў ал Масуд, ці наложніцы, як у Ібн Фадлана. Аднак у кургане № 2 Вітунічы быў пахаваны чалавек заможнага саслоўя, аб чым сведчыць багаты пояс з бронзавымі накладкамі. Менавіта колькасць накладак (у гэтым выпадку каля 60) з'яўляецца індыкатарам высокага рангу чалавека і яго прыналежнасці да дружыны (калі ў пахаванні прысутнічае зброя) альбо да княскіх чыноўнікаў [8, с. 137; 9, с. 136]. Другое пахаваннне – жаночае – прадстаўлена толькі асобнымі фрагментамі касцей, сплаўленых са шклянымі пацеркамі. Гэта сведчыць аб тым, што такія косці наўмысна выбіраліся (так як па-іншаму аддзяліць мужчынскія і жаночыя косці з агульнага пахавання немагчыма) і змяшчаліся асобна ад асноўнага пахавання, магчыма, для таго, каб падкрэсліць сацыяльную няроўнасць пахаваных. Наяўнасць паясных накладак, аднак у значна меншай колькасці (некалькі адзінак) таксама адзначалася ў курганах з крэмацыяй на тэрыторыі Полацкай зямлі, аднак ва ўсіх адсутнічала зброя. Зброя наогул рэдкая знаходка для трупаспалення на тэрыторыі распаўсюджвання культуры Смаленска-Полацкіх доўгіх курганоў (КСПДК). Найбольшай колькасцю прадстаўлены наканечнік стрэлаў у 4 курганах. Найчасцей падобныя пахаванні звязваюцца з дружыннай культурай [10, с. 88 – 90]. Аднак толькі наяўнасць іншых прадметаў, уласцівых менавіта дружыннікам, дазваляе вызначыць прыналежнасць пахаванага да гэтага саслоўя. Толькі курган у Баноні № 7 адпавядае гэтым крытэрыям [4, с. 120 – 121]. У астатніх выпадках стрэлы маглі выконваць магічныя функцыі абярэгаў [11, с. 94]. Падобнае ж месца ў абрадзе займалі жалезныя заточаныя прадметы, у прыватнасці нажы, якія даволі часта сустракаюцца як у мужчынскіх, так і ў жаночых пахаваннях. Прылады, звязаныя з земляробствам, прадстаўлены сярпом з кургана № 2 у Глінішчы [4, с. 123]. Сякера знойдзена ў кургане № 3 Загор'е [3, с. 169]. Такія сякеры звычайна выкарыстоўваліся як баявыя і працоўныя.

Сведчаннем прыналежнасці да гандлёвага саслоў'я можа з'яўляцца знаходка гірак разнавагі з кургана № 4 Даўборы [3, с. 204 – 205]. Астатнія рэчы, не звязаныя з касцюмам, прадстаўлены ў жанчын пра-

селкамі і іголкамі, у мужчын – крэсівамі, тачыльнымі брускамі, г.з. тымі прадметамі, якія выкарыстоўваліся ў паўсядзённым жыцці і маглі спатрэбіцца на тым свеце. У двух выпадках у жаночых пахаваннях у Рудня № 15 і Новыя Валосавічы II № (разбураны) знойдзены фігуркі жывёл каня і барана, выразаныя з косці [4, с. 121; 12, с. 95]. Прычым апошняя арнаментаваная фігурка з'яўлялася часткай нейкага касцянога вырабу з рукаяткай. Верагодна, яны былі звязаны з культам жывёлы, ахвярапрынашэннем якой у іншым выпадку тлумачыцца значная колькасць касцей у пахаваннях.

У Ібн Фадлана апісваецца гэты рытуал: жывёл (сабаку, 2 кані, 2 кароў, пеўня і курыцу) забілі, разрэзалі на часткі і кінулі на вогнішча. Конь, сабака і певень з'яўляюцца правадзнікамі нябожчыка на той свет і часта сустракаюцца ў пахавальных культах скандынаваў і насельніцтва Усходняй Еўропы [13, с. 85 – 86]. На тэрыторыі Полацкай зямлі вядомы 14 курганоў, дзе выяўлены парэшткі жывёлы, аднак гэта лічба даволі ўмоўная, так як у большасці выпадкаў астэалагічны аналіз не праводзіўся. Найбольшую колькасць складаюць хатнія жывёлы: свіння – 6 выпадкаў, авечка – 4, конь – 3, карова – 2, сабака – 1. Дзікія: куніца – 2, воўк – 1, казуля – 1, чарапаха – 1. З птушак 3 экзэмпляры невызначаная. Толькі ў 3 выпадках адзначалася наяўнасць непаленых касцей жывёлы (конь у Дарахах II № 3 і буйная жывёла ў Даўборах № 4) [4, с. 132; 3, с. 204 – 205], у II групе могільніка Чарневічы быў адзначаны чэрап авечкі ў кургане з трупаспаленнем [14, с. 134]. У астатніх пахаваннях жывёлы былі спалены разам з нябожчыкамі.

Амаль усім хатнім жывёлам былі ўласцівы магічныя функцыі, таксама яны сімвалізавалі пэўныя з'явы прыроды (конь – рух сонца; сабака – вецер і навальніцу; певень – ачышчальны агонь; свіння – культ урадлівасці) [15, с. 265, 324, 377, 394]. Трэба звярнуць увагу на тое, што парэшткі драпежнікаў прадстаўлены канечнасцямі. Гэтая з'ява тлумачыцца, што лапы з кіпцюрамі дапамогуць нябожчыкам у пад'ёме на неба – гару [16, с. 9].

Апасля астывання месца спалення косці (ці іх частка) выбіраліся і транспартыраваліся да месца пахавання альбо пакідаліся на месцы, калі тут збіраліся насыпаць курган. У якасці транспартнай тары маглі выкарыстоўвацца берасцяныя карабы, што назіралася на Смаленшчыне [17, с. 226], на тэрыторыі Полацкай зямлі рэшткі такога кораба зафіксаваны толькі ў кургане № 16 Глінішча [4, с. 125]. У іншым выпадку магло выкарыстоўвацца глінянае начынне. У адным ляпным гаршчку, тыповым для КСПДК, можна прынесці 300 – 500 г касцей (вымярэнні рабіліся на прыкладах начыння з Глінішча, Плусаў), што адпавядае вагі касцей з большасці насыпаў.

Адным з асноўных рытуалаў пахавальнага абраду з'яўляецца выпальванне месца будучага пахавання. Наяўнасць попельна-вугальных праслоек на ўзроўне мацерыка пад усім насыпам, альбо ілям у месцах пахавання зафіксавана ў 118 курганах, адсутнасць падобных слядоў – у 36. Для розных форм размяшчэння парэшткаў у працэнтных суадносінах выпальванне падэшвы кургана складае:

I. Пахаванне размешчана на паверхні насыпу – 75 %;

II. Пахаванне знойдзена ў насыпу – 63 %;

III. Пахаванне зроблена на ўзроўні гарызонта - 90 %;

IV. Пахаванне знаходзіцца ў мацерыковай ямцы – 93 %.

Як бачна, найменшая колькасць папярэдняга абпальвання месца ўзвядзення кургана адпавядае II форме пахавальнага абраду, аднак для гэтых курганоў характэрана наяўнасць слядоў попельна-вугальных праслоек у насыпу на ўзроўні пахавання. Выпальванне месца пахавання звязана з агульнай верай індаеўрапейскіх народаў у ачышчальную сілу агню.

Наступным этапам з'яўляецца размяшчэнне прынесеных парэштак на падрыхтаваную пляцоўку. Для IV формы характэрна паступовае змяншэнне колькасці ямак з цягам часу (ад 75 % у канцы VIII – IX ст. да 17,4 % у X - пач. XI ст.). Тая ж тэндэнцыя назіраецца і ў памяншэнні глыбіні ямак нават к X - пач. XI стагоддзя частка з іх робіцца не ямкамі а паглыбленнямі ў грунце. Памеры ямак не залежаць ні ад полу, ні ад заможнасці пахаванага. III форма, наадварот, у канцы VIII – IX стагоддзі прадстаўлен толькі некалькімі, верагодна, упускнымі пахаваннямі, а да пачатку XI стагоддзя складаў 44 % ад агульнай колькасці курганоў з крэмацыяй.

Спіцыфікай пахавальнага абраду II формы з'яўляецца наяўнасць пахаванняў, спецыяльна змешчаных на падсыпках, і збудаванне драўляных канструкцый. Асобным відам гэтага тыпу абраду можна лічыць падзахаванне парэшткаў у існуючы курган. Без уліку падзахаванняў сітуацыя з II формай нагадвае папярэднюю, калі ў канцы VIII – IX стагоддзі працэнт пахаванняў гэтага тыпу зусім нязначны (7,4 %), а ў наступныя перыяд адносна роўны (36 %).

Звычайна падсыпка робілася з таго ж грунта, што і сам курганны насып, вышыня яе не залежыла ні ад храналагічнага перыяда, ні ад статуса нябожчыкаў. Часам у аснаванні курганоў прасочваюцца невялікія праслойкі белага пяску, на якіх распальваліся ачышчальныя вогнішчы і затым рабілася праслойка, аднак ніколі само пахаванне на размяшчалася на гэтай праслойцы.

У час будаўніцтва кургана ў насып маглі змяшчацца дапаўняльныя каменныя і драўляныя канструкцыі, аднак гэтая з'ява не была шырока распаўсюджана. Паміж каменных канструцый можна вызначыць некалькі тыпаў: 1. Стосы камянёў зафіксаваны ў 8 курганах. Будаваліся яны ў асноўным з краю насыпу, колькасць камянёў складала ад 5 да некалькі дзесяткаў. Функцыянальнае прызначэнне меў толь-

кі адзін стос у Селішчы, на якім стаяў гаршчок [18, с. 206]. 2. Невялікія па памерах вымасткі. Знойдзены ў 2 выпадках. 3. Агароджы вакол вогнішча – 2. 4. Камяні пакладзеныя ў насып без пэўнай сістэмы: па краях пахвальнай пляцоўцы – 2. Да гэтай катэгорыі можна аднесці і каменны жорнаў з кургана № 3 у Дарахах II [4, с. 132], жорны заўсёды надзяляліся магічнай сілай і выкарыстоўваліся на пазнейшых могілках у якасці аснаванняў для крыжоў. Каменныя канструкцыі сустракаюцца ва ўсіх храналагічных групах, і іх наяўнасць не залежыць ні ад тыпу абраду, ні ад полу пахаванага.

Драўляныя канструкцыі сустракаюцца толькі з IV тыпам абраду. Тут вылучаюцца слупавыя і зрубныя канструкцыі. Слупавая канструкцыя выяўлена толькі на могільніку Сукалі II курган № 3 [19, с. 44]. Падобны абрад назіраўся на могільніку культуры доўгіх курганоў Пацерпіліцы I (Наўгародскай вобл), дзе слупавую канструкцыю звязваюць з умацаваннем сценак насыпу ў час яго збудавання [20, с. 178].

Амаль усе зрубныя канструкцыі прадстаўлены абпаленымі ў 1 – 2 вянкі, якія выконваюць функцыю агароджаў вакол пахаваня. Выключэннем з'яўляюцца курганы, дзе пахаванні размешчаны вышэй зрубаў, некранутага агнём з 5 вянкоў у Азярцы № 1 і абпаленага з 2 вянкоў у Любасне № 2 [4, с. 173; 19, с. 46].

Курганы са зрубнымі канструкцыямі ў 1 – 2 вянкі «церамкамі» былі распаўсюджаны на тэрыторыі рассяленя дрыгавічоў [21, с. 33], аднак у большай ступені з інгумацыяй. Курганы ў Азярцы ўтрымліваюць характэрны для КСПДК інвентар і не з'яўляюцца помнікамі дрыгавічоў, але зрубы тут маглі будавацца пад уздзеяннем гэтай традыцыі. Пахавальны абрад у Араве № 1 і Сінчуках № 2 [22, с. 51] могуць быць звязаны з Роменска – Боршаўскай традыцыяй змяшчаць парэшткі крэмацыі ў урны і размяшчаць іх у драўляных агароджах [23, с. 139, 141].

Апошняй стадыяй з'яўляецца насыпанне альбо дасыпанне курганнага насыпу, калі ён набывае канчатковую форму. Большасць насыпаў мае паўсферычную форму і памер 5 – 8 м. Паводле палавога прызнака мужчынскія і жаночыя курганы не маюць істотнай розніцы, аднак трэба адзначыць што насыпы з пахаваннямі жанчын не дасягаюць дыяметра больш за 10 м. Паміж круглымі курганамі больш за 10 м ёсць пахаванні нябожчыкаў з высокім сацыяльным статусам (Азярцо № 1; Банонь № 7), аднак заможных памерлых маглі хаваць і ў курганах сярэдніх памераў (Вітунічы № 2). Больш рэдкімі з'яўляюцца насыпы падоўжанай формы. Найбольшая іх колькасць канцэнтруецца на могільніках канца VIII – IX стагоддзя, на могільніках іншых храналагічных груп падобныя насыпы не складаюць большасці, аднак вялікія падоўжаныя курганы працягвалі будаваць і ў другой палове X стагоддзя. У падоўжаных курганах сустракаецца абрад усіх тыпаў. Істотным адрозніваннем падоўжаных курганоў на тэрыторыі Полацкай зямлі ад Смаленскіх з'яўляецца адсутнасць паэтапнасці ў насыпанні падобнага насыпу, калі яго даўжыня павялічваецца з кожным новым пахаваннем, што ўласціва менавіта смаленскім курганам [24, с. 34 – 35]. Аднак на тэрыторыі Полацкай зямлі амаль усе курганы падоўжанай формы будаваліся за адзін раз.

Яшчэ адной апошняй дэталлю будаўніцтва кургана з'яўляецца выкопванне ровікаў вакол насыпаў. Практычна не зафіксавана ровікаў вакол курганоў з пахаваннямі ў мацерыковых ямках. Для III формы размяшчэння парэшткаў характэрна наяўнасць сегментападобных ровікаў, якіх налічваецца ад 1 да 4, у адзінкавых выпадках разам з сегментападобнымі ровікамі прысутнічаюць ямападобныя. Выключна ямападобная форма ровікаў адзначана на могільніку Бірулі. Вакол курганоў з IV формай галоўным чынам фіксуюцца сегментападобныя ровікі, ямападобныя выяўлены толькі ў Бірулях, што з'яўляецца лакальнай асаблівасцю помніка. Вельмі рэдка сустракаюцца паўкальцавыя ровікі. У адным выпадку (Ігналіна № 1) зафіксаваны кальцавы ровік [19, с. 45]. Глыбіня ровікаў пязначная, звычайна 0,2 – 0,4 м, у адзінкавых выпадках яна дасягае 0,5 м, шырыня звычайна складае 1 – 1,5 м. Слядоў попела і вуголля на дне ровікаў не фіксуецца, за выключэннем курганоў Бірулі № 112 і Вітунічы № 4, дзе сляды агню прысутнічаюць толькі ў адной яме. Мяркуючы па памерах ровікаў, яны выконвалі галоўным чынам рытуальную засцерагальную функцыю мяжы паміж месцам пахавання і светам жывых, так як зямлі, выкапанай з ровікаў, у большасці выпадкаў недастаткова, каб насыпаць курган.

ЛІТАРАТУРА

1. Лихачёв, Д.С. Повесть временных лет / Д.С. Лихачёв. – М.; Л., 1950 (22). – Ч. I – II.
2. Рапов, О.М. Русская церковь в IX – первой трети XII в. Принятие христианства / О.М. Рапов. – М.: Высш. шк., 1988. – 414 с.
3. Покровский, Ф.В. Курганы на границе современной Литвы и Белоруссии / Ф.В. Покровский // Труды IX археолог. съезда в Вильне, 1893. – М., 1895. – Т. 1. – С. 166 – 220.
4. Штыхаў, Г.В. Крывічы / Г.В. Штыхаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 188 с.
5. Плавінскі, М. Раскопкі курганнага могільніка Мілты / М. Плавінскі, А. Плавінскі // Гіст.-археалаг. зб. – 2005. – № 20. – С. 122 – 130.
6. Вайцяховіч, А.В. Пахавальны абрад курганнага могільніка канца X – XII стст. каля в. Вітунічы Докшыцкага раёна Віцебскай вобл. / А.В. Вайцяховіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2007. – № 14. – С. 86 – 109.

7. Вайцяховіч, А.В. Пахавальныя помнікі каля вёскі Новыя Валосавічы Лепельскага раёна Віцебскай вобл. / А.В. Вайцяховіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2006. – № 12. – С. 89 – 102.
8. Кенько, П.М. Элементы поясного набора из II курганной группы Витуничы / П.М. Кенько // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2007. – Вып. 14. – С. 136 – 148.
9. Мурашова, В.В. Древнерусские ременные наборные украшения (X – XIII вв.) / В.В. Мурашова // Эдиториал УРСС. – М., 2000. – С. 20.
10. Алешковский, М.Х. Курганы русских дружинников XI – XIII вв. / М.Х. Алешковский // Советская археология. – 1960. – № 1.
11. Фетисов, А.А. Функции стрел в погребальном инвентаре «дружинных курганов» / А.А. Фетисов // Российская археология. – 2004. – № 3. – С. 89 – 98.
12. Вайцяховіч, А.В. Курганны могільнік каля вёскі Новыя Валосавічы Лепельскага раёна Віцебскай вобл. / А.В. Вайцяховіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2006. – № 11. – С. 94 – 104.
13. Жарнов, Ю.Э. Животные в погребальном обряде курганов периода становления древнерусского государства / Ю.Э. Жарнов // СА. – 1991. – № 2. – С. 76 – 89.
14. Голубович, Е. Славянские поселения правобережной Дисны в Вилейском округе БССР / Е. Голубович, В. Голубович // Краткие сообщ. ин-та археологии СССР (КСИА). – 1945. – Вып. IX. – С. 126 – 137.
15. Афанасьев, А.Н. Поэтические воззрения славян на природу / А.Н. Афанасьев. – М., 1995. – Т. 1.
16. Зайкоўскі, Э.М. Месца вялеса ў дахрысціянскім светапоглядзе насельніцтва Беларусі / Э.М. Зайкоўскі // Дакл. XII міжнар. з'езда славістаў. – Мінск, 1998. – С. 3 – 9.
17. Шмидт, Е.А. О смоленских длинных курганах / Е.А. Шмидт // Славяне и Русь. – М.: Наука, 1968. – С. 224 – 229.
18. Сербаў, І.А. Археолёгічныя помнікі Вушацкага р-ну, Полацкай акругі / І.А. Сербаў // Запіскі аддзелу гуманітарных навук. – Менск, 1930. – Кн. 11: Працы археалагічнай камісіі. – Т. II. – С. 200 – 211.
19. Сергеева, З.М. Курганы северо-запада Полоцкой земли / З.М. Сергеева. – М., 1996.
20. Меснянкина, С.В. Погребальный обряд культуры длинных курганов как источник по изучению язычества / С.В. Меснянкина // Тр. VI междунар. конгр. славянской археологии. – М.: Эдиториал УРСС, 1999. – Т. 5. История и культура древних и средневековых славян. – С. 177 – 185.
21. Лысенко, П.Ф. Дреговичи / П.Ф. Лысенко. – Минск: Наука и техника, 1991. – 244 с.
22. Алексеев, Л.В. Раскопки курганов в Восточной Белоруссии / Л.В. Алексеев, З.М. Сергеева // КСИА. – 1973. – Вып. 135. – С. 49 – 55.
23. Седов, В.В. Восточные славяне в VI – XIII вв. / В.В. Седов. – М., 1982. – 326 с.
24. Енуков, В.В. Ранние этапы формирования Смоленско-Полоцких кривичей / В.В. Енуков. – М.: ААЭТИМ, 1990. – 262 с.

ЛЯПНАЯ КЕРАМІКА І РЭЧАВЫ КОМПЛЕКС ВАКОЛЬНАГА ГОРАДА СТАРАЖЫТНАГА ПОЛАЦКА (ПА ВЫНІКАХ РАСКОПАК 2008 ГОДА)[1]

канд. гіст. навук, дац. Д.У. ДУК
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

Прадстаўлены рэчавы комплекс з раскопа 1 (2008 г.) на Ніжнім замку Полацка (тэрыторыя найстаражытнейшага вакольнага горада). Прадстаўлена тыпалогія ляпной керамікі з раскопа. Зроблена параўнаўчая характарыстыка ляпной керамікі раскопа 1 з ляпной керамікай раскопаў на старажытным полацкім гарадзішчы і т. зв. селішчы-перадгораддзі. Даецца характарыстыка ніжняга стратыграфічнага пласта раскопа 1. Зроблена параўнаўчая харакатырстыка стратыграфіі найстаражытнейшага Полацка з сінхроннымі помнікамі Беларускага Падзвіння (Віцебскам і Лукомлем). Прадстаўлены вынікі радыёвугляроднага датавання дрэва з ніжняга стратыграфічнага пласта. Зроблена выснова аб часе ўтварэння ніжняга пласта Полацка ў IX – X стагоддзях.

Уводзіны. У 2008 годзе на тэрыторыі Ніжняга замка (былы вакольны горад старажытнага Полацка) былі праведзены археалагічныя раскопкі. Раскоп 1 быў разбіты на плошчы 40 кв. м на т. зв. стрэлцы Ніжняга замка, г. зн. тэрыторыі, прылеглай да старажытнага полацкага гарадзішча. У выніку быў раскапаны культурны пласт з ляпной керамікай і нешматлікім рэчавым комплексам, што дазволіла прыадчыніць таямніцу пачатковай гісторыі Полацка.

[1] Работа выканана пры падтрымцы БРФФД-РГДФ, грант Г08Р014.

Значнасць адкрыцця культурнага пласта з ляпной керамікай цяжка пераацаніць. На старажытным полацкім гарадзішчы аднародны культурны пласт з ляпной керамікай практычна адсутнічае, а ляпная кераміка знойдзена ў перамешаных напластаваннях ніжняга стратыграфічнага гарызонта [2]. Пласт з ляпной керамікай у моцна пашкоджаным выглядзе захаваўся на селішчы каля Чырвонага моста [7]. Стратыграфічна аднародны культурны пласт быў адкрыты С.В. Тарасавым на тэрыторыі Ніжняга замка ў 1987 – 1988 гадах. У 2008 годзе на адлегласці каля 150 м ад места раскопак С.В. Тарасава быў закладзены раскоп 1.

Культурны пласт з ляпной керамікай быў выяўлены на глыбіні каля 1,8 м. Яго магутнасць складае ў сярэднім каля 0,3 м. Пласт перакрывае больш 20 мацерыковых ям. Знаходкі прадстаўлены пераважна фрагментамі ляпнога керамічнага посуду, керамічнымі праселкамі і нешматлікімі рэчамі з жалеза і косці. Асабліваснію гэтага пласта з'яўляецца поўная адсутнасць пацерак, яны былі знойдзены ў вышэйразмешчаным пласце з раннеганчарным посудам. Аналагічная карціна назіраецца ў Віцебску, дзе храналагічны дыяпазон «выпадзення» пацерак прыпадае на час не ранней за X стагоддзе [3, с. 6].

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца тыпалогія ляпной керамікі з раскопа 1 як найбольш прадстаўнічай катэгорыі артэфактаў і вызначэнне часу бытавання асобных груп. Асноўная задача – на падставе вывучэння існавання асноўных груп ляпной керамікі высветліць час утварэння і існавання культурнага пласта вакольнага горада старажытнага Полацка.

Асноўная частка. У апошні час праблеме вывучэння і класіфікацыі ляпнога посуду раннесярэдневяковых гарадоў Беларускага Падзвіння надаецца вялікая ўвага. Сведчаннем гэтаму з'яўляецца колькасць публікацый калекцыі ляпной керамікі Полацка, Віцебска і Лукомля [1 – 4, 6, 7].

Усю ляпную кераміку раскопа 1 можна падзяліць на 4 групы, скарыстаўшы за аснову тыпалогію керамікі з селішча каля Чырвонага моста, распрацаваную М.А. Плавінскім і Г.В. Штыхавым [7, с. 63]. Па-першае, дадзеная тыпалогія керамікі з селішча з'яўляецца універсальнай, паколькі прадугледжвае варыятыўнасць[2] у межах асобных тыпаў. Па-другое, селішча каля Чырвонага моста з'яўляецца блізкім (калі не падобным) па храналогіі гістарычным помнікам Полацка.

Усяго ў раскопе 1 было знойдзена 227 фрагментаў ляпнога посуду. З іх 75 – венцаў, 10 – донцаў, 1 – накрыўка. Намі замаляваны ўсе венцы і тыя часткі посуду (сценкі, фрагменты верхніх частак гаршчкоў), якія з'яўляюцца найбольш інфарматыўнымі. Малюнкі прадстаўлены ў наступнай паслядоўнасці: спачатку адлюстраваны выявы посуду з мацерыковых ям (мал. 1 – 7); пасля – выявы посуду груп 1 – 4 і індывідуальных форм (мал. 8 – 18). Гэты посуд знойдзены ў ніжнім стратыграфічным пласце раскопа 1 па-за межамі мацерыковых ям. Асобна прадстаўлены індывідуальныя знаходкі з ніжняга стратыграфічнага пласта (мал. 19 – 20).

Класіфікацыя посуду зроблена на падставе аналізу 75 венцаў гаршчкоў і місак. Усе яны падзелены на 4 групы, з іх 3 першыя цалкам супадаюць з класіфікацыяй А.М. Плавінскага і Г.В. Штыхава.

Кераміка гладкасценная, грубая, з дамешкамі жарствы (часцей за ўсё некалібраванай). У асобных выпадках у керамічным цесце прысутнічаюць сляды раслінай арганікі. Паверхня посуду загладжана, аднак зерне жарствы вылучаецца на паверхні, што робіць яе гузаватай і няроўнай. Колер фрагментаў звычайна шэра-карычневы, зрэдку карычневы ці белы, звычайна посуд пакрыты плямамі ад нераўнамернага абпалу. На многіх фрагментах заўважаны сляды акапчэння і нагару. Донцы гаршчкоў утрымліваюць сляды падсыпкі буйназярністага пяску і жарствы.

Група 1 (19 венцаў) – слабапрафіляваныя гаршчкі з амаль не выяўленым плечуком, з праманастаўленым ці зусім крыху адагнутым вонкі венцам (гл. мал. 2: 2; 8; 13: 1). Захавалася верхняя частка аднаго з гаршчкоў, ён мае выражаны плячук і вертыкальна пастаўленыя сценкі (гл. мал. 13: 1). Дыяметр гэтага начыння складае 42 см (!). У лік групы 1 залічаны венцы (11 шт.), якія паводле прафіліроўкі з'яўляюцца пераходнымі паміж групай 1 і групай 2 (гл. мал. 2: 1, 3; 5: 2; 6: 2; 9). У гаршчкоў гэтага варыянта больш выражаная прафіліроўка верхняй часткі тулава і крыху больш выгнутае вонкі венца.


Група 2 (12 шт.) – гэта посуд з S-падобным профілем верхняй трэці начыння (гл. мал. 3; 1; 5: 1; 10; 11). Плячук адносна выяўлены, адагнутае вонкі венца найчасцей прамое.

Група 3 (8 венцаў) – моцнапрафіляваныя пасудзіны з добра выяўленым плечуком (гл. мал. 1: 3; 12; 13: 2 – 3).


Група 4 (12 венцаў) аб'ядноўвае венцы слоікавай формы з роўным (гл. мал. 14: 4 – 6) ці крыху адагнутым вонкі венцам без плечука (гл. мал. 6: 3; 14: 1 – 3). Да гэтай жа групы аднесены венцы з вертыкальна пастаўленым высокім горлам і слаба выражаным плечуком (гл. мал. 1: 2, 4; 15: 2, 3), а таксама венца з вертыкальна пастаўленым кароткім венцам і рабрынай у верхняй трэці пасудзіны (гл. мал. 15: 1).

Акрамя вылучаных груп знойдзены 13 венцаў індывідуальных форм (гл. мал. 4: 2; 6: 4; 7: 2; 16; 18: 5, 6), а таксама 7 венцаў ляпных місак (гл. мал. 1: 1; 6: 1; 7: 3; 17). Знойдзены кавалак ляпной пасудзінкі нявызначанага прызначэння (гл. мал. 2: 5), 2 кавалкі ляпных накрывак (мал. 3: 3), адна з якіх аздоблена насечкамі (гл. мал. 2: 6). У калекцыі ляпнога посуду ёсць 10 донцаў (гл. мал. 2: 7; 4: 1; 7: 4, 5; 15: 4, 5; 18: 1, 2, 3, 4).


[2] Паколькі крынічная база штогадова папаўняецца, то ў дадзенай рабоце вылучэнне асобных варыянтаў з'яўляецца не мэтазгодным.




Мал. 1. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Ляпная кераміка з мацерыковай ямы 1




Мал. 2. Полацк. 2008 г. Ніжні замак. Ляпная кераміка з мацерыковай ямы 2 (1 – 4, 6 – 7) і ямы 25




Мал. 3. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Ляпная кераміка з мацерыковых ям 5 (1, 2), 6 (3) і 14 (4)




Мал. 4. Полацк, 2008 г. Ніжні замак.
Ляпная кераміка з мацерыковай ямы 7 (1) і ганчарная (?) кераміка з ямы № 23 (2)




Мал. 5. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Венцы ляпных гаршчкоў з мацерыковай ямы 8




Мал. 6. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Ляпная кераміка з мацерыковых ям 12 (1, 2), 22 (3) і 26 (4)




Мал. 7. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Ляпная кераміка з мацерыковых ям 9 (1). 13 (2, 3) і 15 (4, 5)



Мал. 8. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Венцы лянных гаршчкоў групы 1




Мал. 9. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Венцы ляпных гаршчкоў групы 1, пераходныя да групы 2




Мал. 10. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Венцы ляпных гаршчкоў групы 2

№ 442 кв. 6 пл. 9




1

№ 439 кв. 6 пл. 9




2

№ 220 кв. 10 пл. 9




3



4


№ 169 кв. 3 пл. 9

Мал. 11. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Венцы ляпных гаршчкоў групы 2




Мал. 12. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Венцы ляпных гаршчкоў групы 3


дыяметр 42 см № 214, 215, 216 кв. 2 пл. 9




№ 155 кв. 5 пл. 9



№ 261 кв. 8 пл. 9




Мал. 13. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Венца ляпнога гаршчка групы I (1) і венцы ляпных гаршчкоў групы 3 (2 – 3)




Мал. 14. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Венцы ляпных гаршчкоў групы 4

№ 228 кв. 4 пл. 9




1

№ 189 кв. 3 пл. 9




2

№ 170 кв. 3 пл. 9, дыяметр каля 23 см




3

№ 240 кв. 4 пл. 9




4

№ 435 кв. 6 пл. 9




5


Мал. 15. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Венцы ляпных гаршчкоў групы 4




Мал. 16. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Венцы ляпных гаршчкоў індывідуальных форм




Мал. 17. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Венцы ляпных місак



Мал. 18. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Донцы ляпных гаршчкоў (1 – 4) і венцы гаршчкоў індывідуальных форм (5 – 6)



Мал. 19. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Жалезныя (1 – 4, 6) і касцяны (5) вырабы з ніжняга стратыграфічнага пласта раскопа 1



Мал. 20. Полацк, 2008 г. Ніжні замак. Керамічныя праселкі

Датаванне вызначанага керамічнага комплексу зроблена на падставе параўнання з аналагічнымі групамі керамікі іншых сінхронных помнікаў, а таксама даных радыёвугляроднага датавання кавалкаў дрэва, знойдзеных у асобных мацерыковых ямах. Адпаведна посуд з гэтых мацерыковых ям прадстаўляе найбольшую цікавасць.

Датаванне першых трох груп керамікі на падставе гісторыка-параўнаўчага і тыпалагічнага метадаў пераканаўча прадстаўлена А.М. Плавінскім і Г.В. Штыхавым [7, с. 66]. Так, посуд групы 1 мае аналогіі на пражскіх помніках VI – VIII стагоддзяў і ў матэрыялах банцараўскай культуры, пахаваннях культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў. Віцебску. Гэтая група самая ранняя ў калекцыі з селішча каля Чырвонага моста, яна наследуе формы посуду трэццяй чвэрці I тыс., аднак больш вузкую дату яе датавання, чым дыяпазон VIII – X стагоддзяў, даследчыкі не вылучаюць [7, с. 66].

Посуд групы 2 шырока прадстаўлена на помніках тыпу Лукі Райкавецкай, у культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, на Паўночным Захадзе Расіі. Аналагічныя матэрыялы знойдзены ў Віцебску, Лукомлі і Гнёздаўскім селішчы [7, с. 66]. Кераміка мае генетычную сувязь з групай 1, пра што сведчаць пераходныя формы.

Група 3 дэманструе самую апошнюю стадыю развіцця ляпной керамікі – перадганчарную і, верагодна, ужо сінхронную існаванню ганчарнага круга [7, с. 66 – 67].

Гаршчкі групы 4 (гл. мал. 14 – 15) у матэрыялах паселішча каля Чырвонага моста адсутнічаюць, аднак яны знойдзены на полацкім гарадзішчы (раскопкі 2007 г.), а таксама ў іншых раннесярэдневяковых гарадах Беларускага Падзвіння – Віцебску і Лукомлі [1, с. 72 – 73, рис. 9; 3, с. 6; 4, с. 112]. Гэта посуд тыповы для банцараўскай культуры трэццяй чвэрці I тыс., ён прадстаўлены 3 венцамі слоікавай формы (гл. мал. 14: 4 – 6). Да гэтай групы посуду належаць некалькі сценак ад начыння, а таксама донцы, у якіх вугал нахіла сценкі каля донца не пакідае сумненняў у іх слабапрафіляванай форме (гл. мал. 2: 4; 3: 2, 4; 15: 4, 5). Яшчэ тры венцы вылучаюцца асобна. Гэта слабапрафіляванае начынне, у першым выпадку венца крыху адагнута вонкі і аздоблена рэльефным арнаментам (гл. мал. 14: 1), у другім край венца крыху загнуты ўнутр, венца не арнаментаванае (гл. мал. 14: 2). Трэцяе венца пастаўлена вертыкальна і мае крыху выразны плячук (гл. мал. 14: 3).

Асобныя венцы гаршчкоў групы 4 (мал. 15: 1 – 3) маюць падабенства з керамікай тыпу Лукі Райкавецкай VIII – IX стагоддзяў [1, с. 76, рис. 14: 2, 18: 1].

Даныя радыёвугляроднага датавання кавалкаў дрэва з мацерыковых ям № 1, 2, 8 прадстаўляюць дадатковыя магчымасці для датавання асобных груп ляпной керамікі, паколькі гэта асноўны рэчавы матэрыял, знойдзены ў запаўненні ям.

Так, з ямы № 1 атрымана калібровачная радыёвугляродная дата IGSB-1373 390-50 BC. У мацерыковай яме № 1 сабрана 39 фрагментаў ляпной керамікі, з якіх – 4 венцы (гл. мал. 1), 32 – сценкі, 3 кавалкі керамічнай абмазкі печы; таксама знойдзены 1 кавалак шлака. Сярод венцаў: 1 венца міскі (гл. мал. 1: 1), 1 венца гаршчка групы 3 (?) (гл. мал. 1: 3) і 2 венца групы 4 (гл. мал. 1: 2, 4). Храналагічны дыяпазон гаршчкоў групы 3 і ляпной міскі – другая палова VIII – X стагоддзя (больш верагодны – IX – X стст.). Венцы групы 4 належалі да слабапрафіляваных гаршчкоў выцягнутых прапорцый, што характэрна для посуду днепрадзвінскай і банцараўскай культур. Да гэтай жа групы належыць сценка масіўнага, грубага, слабапрафіляванага керамічнага начыння з гузаватай паверхняй з-за вялікай колькасці буйной жарствы (гл. мал. 1: 5).

З ямы № 2 атрымана калібровачная радыёвугляродная дата IGSB-1376 340 – 660 AD. Ляпная керамiка з мацерыковай ямы № 2 прадстаўлена 36 фрагментамі, з іх – 3 венца (гл. мал. 2: 1 – 3), 27 сценак, 1 донца (гл. мал. 2: 7), 1 арнаментаваны фрагмент накрыўкі (гл. мал. 2: 6), 4 керамічныя бясформенныя злепкі; 2 венца належылі гаршчкам групы 1, пераходным да групы 2 (гл. мал. 2: 1, 3), 1 венца гаршчка групы 1 (?) (гл. мал. 2: 2); 1 сценка гаршчка належала да слабапрафіляванага начыння слоікавай формы (гл. мал. 2: 4), з пэўнай доляй верагоднасці тое ж можна адзначыць і для фрагмента донца (гл. мал. 2: 7). Гэтыя два кавалкі гаршчкоў падобныя на посуд банцараўскай культуры.

З ямы № 8 атрыманы калібровачныя радыёвугляродныя даты IGSB-1377 660 – 900 і 910 – 950 AD. Ляпная кераміка з мацерыковай ямы № 8 прадстаўлена 12 фрагментамі, з іх – 2 венца (мал. 5), 10 сценак. Венцы належыць гаршчкам групы 2 (мал. 5: 1) і пераходнаму ад групы 1 да групы 2 (мал. 5: 2). Гэтая кераміка тыповая для культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў VIII – X стст. Найбольш верагодны храналагічны дыяпазон бытавання дадзенай керамікі – 910 – 950 гг.

Калібровачныя радыёвугляродныя даты IGSB-1374 атрыманы з ямы № 3 – 240 – 600 AD. Знаходкі ў яме адсутнічалі. Проба IGSB-1375 кавалка дрэва, які быў знойдзены ў кв. 3 пл. 9 прадстаўляе калібровачную дату 420 – 670 AD. Менавіта ў гэтым квадраце ў пласце 9 знойдзены два венца слоікападобнага посуду банцараўскай культуры і два венцы керамікі, падобнай да валынцаўскага тыпу (гл. мал. 15: 2, 3).

Індывідуальныя знаходкі з ніжняга стратыграфічнага пласта прадстаўлены жалезным вырабам нявызначанага прызначэння (гл. мал. 19: 1), жалезным прабойнікам (?) (гл. мал. 19: 2), дзвюма жалезнымі заклёпкамі ад ладдзі (гл. мал. 19: 3, 6), двушыпным жалезным моцнакаразіраваным наканечнікам стралы (гл. мал. 19: 4), а таксама аднабаковым наборным касцяным грабянём (гл. мал. 19: 5). Грэбень мае агульнаеўрапейскае распаўсюджванне і датуецца ў межах IX – XI стагоддзяў, але найбольш часта прадстаўлены ў пластах X стагоддзя [5, с. 300 – 308; 8, с. 88]. Заклёпкі ад ладдзі знойдзеныя на тэрыторыі паўночнай Русі ў пластах VIII – X стагоддзяў [8, с. 92]. Двушыпныя ўтулкавыя наканечнікі стрэл з'яўляюцца тыповай знаходкай у гарадах, дзе зафіксаваны напластаванні апошняй трэці I тыс. [4, рис. 15: 1 – 3].

У ніжнім стратыграфічным пласце раскопа 1 знойдзены 6 керамічных праселак (гл. мал. 20). Гэтыя праселкі маюць дыскападобную форму, звычайна з рабрынай па краю. Дыяметр праселак вагаецца ад 2,5 да 3,5 см.

У раскопах С.В. Тарасава на Ніжнім замку былі знойдзены кавалкі керамічнага посуду банцараўскай культуры [9, мал. 47: 2] і культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў [9, мал. 47: 1, 3, 4, 5], што карэлюецца з матэрыяламі раскопа 1 2008 года. Падкрэслім, што тыпалогія ляпнога посуду з раскопу С.В. Тарасава яшчэ не праводзілася, што можа (і павінна!) выявіць групы керамікі, характэрныя для ніжняга пласта раскопа 1.

Заключэнне. Ніжні стратыграфічны пласт раскопа 1 утварыўся ў IX – X стагоддзях. Гэты пласт утрымлівае кераміку банцараўскай культуры, кераміку культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў апошняй чвэрці I тысячагоддзя, керамічныя праселкі, адзінкавыя металічныя і касцяныя знаходкі і рэшткі дрэва. Пераважная колькасць усіх рэчаў з ніжняга пласта датуецца апошняй чвэрцю I тысячагоддзя. Відавочна, што актыўная гаспадарчая дзейнасць у гэты час прывяла да знішчэння культурнага пласта

трэццяй чвэрці I тысячагоддзя. Культурны пласт гэтага часу захаваўся ў межах асобных мацерыковых ям. У сукупнасці з данымі радыёвугляроднага датавання магчыма вызначыць час існавання вакольнага горада старажытнага Полацка ў другой палове VIII – IX стгоддзяў (час існавання ляпной керамікі групы 1). Дагэтуль з VI стагоддзя на яго месцы існавала селішча банцараўскай культуры, што пацвярджаецца радыёвугляродным датаваннем кавалкаў дрэва і наяўным керамічным матэрыялам. Адсутнасць сцерыльных прапластак у структуры пласта, а таксама значнай колькасці вугалю дае падставы для вызначэння бесперапыннага характару існавання селішча – вакольнага горада ў VI – X стагоддзях.

ЛІТАРАТУРА

1. Бубенько, Т.С. Стратиграфия и хронология нижнего слоя Витебска / Т.С. Бубенько, О.Н. Левко // Ранние славяне Белорусского Поднепровья и Подвинья: материалы по археологии Беларуси. – Минск, 2003. – № 8. – С. 71 – 95.
2. Дук, Д. Старажытныя славяне полацкага гарадзішча (780 – 1310 гг.) / Д. Дук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 7. – С. 21 – 27.
3. Еремеев, И. Лепная керамика средневекового Витебска / И. Еремеев, Г. Бубенько, Г. Штыхов // Acta archaeologica Albaruthenica. Vol. II (Вып. 2) / уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Минск : І.П. Логвінаў, 2007. – С. 5 – 24.
4. Еремеев, И. Древний Лукомль. Лепная керамика и раннесредневековый культурный слой / И. Еремеев, Г. Штыхов // Acta archaeologica Albaruthenica. Vol. I (Вып. 1) / уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Мінск: І.П. Логвінаў, 2007. – С. 110 – 134.
5. Кондратьева, О.А. Древнерусские гребни IX – XI вв.: местное производство и общеевропейские традиции / О.А. Кондратьева // Памятники старины. Концепции. Открытия. Версии: в 2 т. – СПб. – Псков, 1997. – Т. 1. – С. 300 – 308.
6. Плавінскі, М. Полацк да Рагвалода (пытанні тапаграфіі і храналогіі культурнага слоя) / М. Плавінскі // Acta archaeologica Albaruthenica. Vol. II (Вып. 2) / уклад. М.А. Плавінскі, В.М. Сідаровіч. – Мінск: І.П. Логвінаў, 2007. – С. 25 – 44.
7. Плавінскі, М. Ляпная кераміка полацкага селішча / М. Плавінскі, Г. Штыхаў // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2006. – № 21. – С. 62 – 73.
8. Старая Ладога. Древняя столица Руси. Каталог выставки. – СПб: Изд-во Гос. Эрмитажа, 2003. – 121 с.
9. Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 183 с.

ВЫНІКІ АНТРАПАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ Ў 1998 – 2008 ГАДЫ

В.А. ЕМЯЛЬЯНЧЫК
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

Разглядаюцца антрапалагічныя даследаванні старажытнага насельніцтва Беларускага Падзвіння, якія праводзіліся на працягу 1998 – 2008 гадоў на базе Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Па комплекснай праграме былі вывучаны краніялагічныя серыі, прадстаўленыя матэрыяламі пахаванняў розных эпох, пачынаючы з XI і да XVIII стагоддзя. У артыкуле прадстаўлены асноўныя вынікі даследаванняў краніялогіі розных груп насельніцтва.

Уводзіны. Антрапалагічныя даследаванні старажытнага насельніцтва Беларускага Падзвіння распачаліся ў канцы XIX стагоддзя. Першая публікацыя, прысвечаная апісанню курганных чарапоў з тэрыторыі Віцебскай губерні, належыць рускаму антраполагу В.Н. Майнову, які даследаваў матэрыялы з раскопак Е.Р. Раманава [1]. У гэты перыяд увагу даследчыкаў у першую чаргу прыцягвалі курганныя пахаванні. Шкілетныя матэрыялы з курганнага могільніка каля в. Пуцілкавічы (зараз Ушацкі р-н Віцебскай вобл.) з раскопак Ф. Вярэнькі і В. Шукевіча вывучаў польскі антраполаг Л. Седлячэк [2].

Серыю чарапоў полацкіх крывічоў, атрыманую ў выніку раскопак А.Н. Ляўданскага і І.А. Сербава, у 1930 годзе даследаваў вядомы савецкі антраполаг Г.Ф. Дэбец [3]. Г.Ф. Дэбец адзначыў выражаны еўрапеоідны характар серыі полацкіх крывічоў, яе падабенства да краніялагічных серый дрыгавічоў і радзімічаў [3, с. 74]. У далейшым, разглядаючы агульную сукупнасць крывіцкіх краніялагічных серый (пскоўскія, смаленскія, цвярскія, полацкія крывічы), Г.Ф. Дэбец адзначыў яе неаднастайнасць: калі заходняя галіна крывічаў (полацкія крывічы) прадстаўлена выражаным еўрапеоідным тыпам, то на ўсходзе, там дзе курганы ўтрымліваюць фінскія ўпрыгожванні, часцей сустракаюцца сублапаноідныя прымесі, ступень выражанасці еўрапеоіднасці памяншаецца [4, с. 248].

У пасляваенны час у савецкай антрапалогіі асаблівая ўвага надавалася вывучэнню праблемы этнагенезу ўсходніх славян. У гэты час былі апублікаваны абагульняючыя працы Т.А. Трафімавай [5], Т.І. Аляксеевай [6]. Т.І. Аляксеева пацвердзіла выснову аб неаднастайнасці антрапалагічнага складу крывічоў, адпаведнай археалагічнаму дзяленню гэтай славянскай групы на плямённыя саюзы ў канцы I тыс. н. э.: полацкія крывічы з'яўляюцца прадстаўнікамі еўрапеоіднай расы, у той час як крывічы вярхоўяў Волгі і Волга-Клязьмінскага міжрэчча выяўляюць рысы, уласцівыя мясцоваму даславянскаму (усходнефінскаму) насельніцтву [6, с. 49 – 51].

Пачынаючы з 1965 года, пасля стварэння аддзела антрапалогіі ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, распачаліся даследаванні беларускіх антраполагаў. Аднаўляецца сістэматычны збор і планамернае вывучэнне шкілетных рэшткаў са старажытных пахаванняў. На працягу 1966 – 1971 гадоў І.І. Салівон быў сабраны значны матэрыял па вясковаму насельніцтву Беларусі, набліжанаму да сучаснасці (XVIII – XIX стст.). У тым ліку было даследавана і насельніцтва з тэрыторыі Беларускага Паздвіння (Лукомль, Чашніцкі р-н). І.І. Салівон канстатавала ўзаемнае падабенства асобных лакальных груп вясковага насельніцтва з тэрыторыі Беларусі, што дазволіла аб'яднаць іх у адну групу. Параўнанне краніялагічных серый з вясковых могільнікаў XVIII – XIX стагоддзяў і курганных могільнікаў XI – XIII стагоддзяў выявіла высокую ступень іх падабенства па комплексу асноўных расавадыягнастычных прыкмет. На гэтай падставе І.І. Салівон зрабіла выснову аб генетычнай пераемнасці насельніцтва Беларусі, пачынаючы з эпохі сярэднявечча і да сучаснасці [7].

У 80-я гады XX стагоддзя краніялагічныя матэрыялы з тэрыторыі Беларускага Падзвіння даследавалі А.І. Кушнір і І.У. Чаквін [8]. Аналіз новых палеаантрапалагічных матэрыялаў з курганных пахаванняў дазволіў прасачыць мазаічнасць антрапалагічнага складу насельніцтва Полацкай зямлі X – XIII стагоддзяў.

На сучасным этапе даследаванні старажытнага насельніцтва Беларусі праводзяцца не толькі на базе Акадэміі навук Беларусі, але і на базе Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Працягваецца далейшае назапашванне краніялагічных і астэалагічных калекцый з тэрыторыі Беларускага Падзвіння. У сярэдзіне 90-х гадоў беларускімі археолагамі была адкрыта і даследавана новая катэгорыя пахавальных помнікаў – грунтовыя могільнікі X – XIII стагоддзяў. Археалагічныя раскопкі, якія штогод праводзяцца на базе Полацкага дзяржаўнага універсітэта пад кіраўніцтвам Д.У. Дука, дазволілі атрымаць каштоўныя матэрыялы па насельніцтву Полацка XVII – XVIII стагоддзяў. Антрапалагічнае вывучэнне новых матэрыялаў праводзіцца па комплекснай праграме, якая ўключае, акрамя класічных краніяметрычных даследаванняў, вывучэнне палсадэмаграфіі і палеаэкалогіі старажытнага насельніцтва.

Асноўная частка. На працягу 1998 – 2008 гадоў па комплекснай праграме намі былі даследаваны групы насельніцтва з тэрыторыі Беларускага Падзвіння, прадстаўленыя матэрыяламі курганных, грунтовых і жальнічных пахаванняў XI – XIV стагоддзяў, матэрыяламі крыптаў Спаса-Праабражэнскай царквы Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, матэрыяламі пахаванняў полацкай шляхты XVII – XVIII стагоддзяў з тэрыторыі Полацкага гарадзішча. Па выніках даследаванняў быў апублікаваны шэраг артыкулаў [9 – 12].

Курганныя пахаванні (XI – XIII стст.). У склад даследаванай намі серыі курганных чарапоў часткова ўвайшлі матэрыялы, якія ў свой час вывучаліся І.У. Чаквіным і А.І. Кушніром, а таксама новыя матэрыялы з раскопак Л.У. Дучыц, Г.М. Семенчука, Г.В. Штыхава. Сярэднія памеры і паказальнікі мужчынскіх чарапоў прадстаўлены ў табліцы 1.

Сумарная серыя курганных мужчынскіх чарапоў характарызуецца даліхакраніяй (чарапны паказальнік 74,1), вялікімі абсалютнымі памерамі падоўжнага і вышыннага дыяметраў чэрапа і сярэднімі – папярочнага. Твар – сярэдні як паводле абсалютных памераў, так і паводле верхнетваравага паказальніка, артагнатны, моцна прафіляваны ў гарызантальнай плоскасці. Арбіты шырокія, нізкія як паводле абсалютнай велічыні, так і паводле арбітнага паказальніка. Па насавым паказальніку серыя адносіцца да катэгорыі сярэдняносых. Мужчынская серыя чарапоў выяўляе полімарфізм па шырыні і прафіліроўцы твару, выступанню насавых касцей. Для астатніх паказчыкаў зменлівасць блізкая да «нармальнай» альбо паніжаная.

Даследаванне тэрытарыяльных груп курганных чарапоў з тэрыторыі Беларускага Падзвіння не выявіла істотных адрозненняў паміж асобнымі лакальнымі групамі, за выключэннем серыі, прадстаўленай матэрыяламі курганных пахаванняў з тэрыторыі Глыбоцкага р-на (могільнікі Перавоз-4, Зябкі, Падсвілле). Сумарная серыя мужчынскіх чарапоў гэтай групы вылучаецца мезакраніяй (чарапны паказальнік 75,8), сярэднім падоўжным дыяметрам чэрапа, шырокім тварам, больш высокім дакрыяльным паказальнікам з адначасова больш выражанай сплошчанасцю твару ў ніжняй яго частцы.

Грунтовыя могільнікі (X – XIII стст.). Да нядаўняга часу адзінай крыніцай інфармацыі аб антрапалогіі насельніцтва Полацкой зямлі X – XIII стагоддзяў былі курганныя пахаванні. Аднак у 90-я гады мінулага стагоддзя беларускімі археолагамі былі выяўлены і даследаваны грунтовыя могільнікі, сінхронныя курганным. Да іх адносяцца могільнік XI – XIII стагоддзяў Дрысвяты-Пашавічы (Браслаўскі район, раскопкі Г.М. Семянчука) і грунтовы могільнік X – XI стагоддзяў Казлоўцы (Міёрскі район, раскопкі Л.У. Дучыц і Г.М. Семянчука).

Табліца 1

Сярэднія памеры і паказальнікі мужчынскіх чарапоў

№ паводле Марціна	Прыкметы	Курганы полацкіх крывічоў XI – XIII стст.			Жальнікі XIII – XIV стст.			Полацкае гарадзішча XVII – XVIII стст.			Полацк, Спаская царква XVII – XVIII стст.			Вясковыя могілкі Беларусі XVIII – XIX стст.		
		n	X	s	n	X	s	n	X	s	n	X	s	n	X	s
1	Падоўжны дыяметр	43	187,8	5,90	14	182,8	4,76	11	180,1	4,01	5	184,0	2,55	52	176,4	5,46
8	Папярочны дыяметр	42	139,1	4,29	14	141,0	6,41	11	142,5	5,22	5	152,8	1,30	51	143,1	4,52
8:1	Чарапны паказальнік	40	74,1	2,95	14	77,1	2,82	11	79,1	3,29	5	83,1	1,52	50	81,3	3,94
10	Найбольшая шырыня ілба	38	118,7	4,38	14	118,9	4,09	11	118,8	4,69	5	127,0	2,92	52	121,9	4,17
45	Скулавы дыяметр	15	134,4	7,23	5	131,4	4,62	10	130,3	3,80	4	137,5	4,20	22	129,9	4,95
17	Вышынны дыяметр	38	137,8	4,81	14	138,1	5,66	9	130,8	4,24	5	137,4	8,73	44	132,1	4,73
5	Даўжыня асновы чэрапа	39	104,3	4,14	14	100,3	3,83	9	100,2	3,73	5	102,6	4,34	43	98,9	3,90
40	Даўжыня асновы твару	32	99,0	4,82	13	97,6	4,70	8	97,5	5,81	4	96,8	6,50	32	93,0	4,91
40:5	Паказальнік выступання твару	32	94,7	3,94	13	97,1	4,10	8	97,3	4,85	4	95,6	6,02	31	94,1	4,31
48	Верхняя вышыня твару	34	69,6	3,92	13	68,5	3,20	9	69,2	6,50	4	75,0	7,53	38	67,6	4,34
48:45	Верхнетваравы паказальнік	15	51,8	3,65	5	52,2	1,92	8	52,6	4,57	4	54,6	5,72	20	52,2	3,02
9	Найменшая шырыня ілба	39	98,2	4,41	14	96,1	4,71	11	96,7	4,63	5	97,8	2,39	52	96,7	4,42
43	Верхняя шырыня твару	33	106,0	4,29	14	102,4	4,47	11	103,3	4,67	5	105,6	3,65	52	103,5	4,70
46	Сярэдняя шырыня твару	20	96,4	4,38	12	92,6	5,40	10	93,8	3,97	4	92,8	2,63	41	93,3	5,29
51	Шырыня арбіты	40	43,9	1,75	13	42,0	1,35	10	42,2	1,75	3	43,3	0,58	45	41,4	2,21
52	Вышыня арбіты	41	32,3	1,95	13	31,2	1,74	10	31,8	2,49	3	36,0	2,00	45	32,1	2,44
52:51	Арбітны паказальнік	40	73,5	4,36	13	74,4	4,50	10	75,3	4,88	3	83,1	3,69	45	77,6	6,08
54	Шырыня носу	33	25,1	1,73	14	24,9	1,51	10	25,6	1,78	3	26,0	2,00	40	24,7	1,90
55	Вышыня носу	39	51,8	2,96	13	49,6	2,02	10	51,2	3,46	3	54,3	8,39	40	50,4	3,23
54:55	Насавы паказальнік	33	48,5	4,02	13	49,7	3,55	10	50,2	4,15	3	48,2	4,17	39	49,2	4,43
29	Лобная хорда	43	113,7	5,41	14	114,4	6,64	11	110,2	3,16	5	114,4	5,08	54	109,8	4,42
30	Цемянная хорда	44	115,3	5,15	13	117,5	5,36	11	112,4	5,64	5	120,4	11,19	54	110,0	6,47
31	Патылічная хорда	41	97,8	4,42	13	96,5	3,31	11	94,5	4,57	5	95,2	9,20	43	94,4	4,60
12	Шырыня патыліцы	41	110,9	4,22	14	111,6	2,56	11	110,7	3,69	5	116,8	3,42	50	109,9	5,62
11	Шырыня падставы чэрапа	41	124,7	4,78	14	123,6	4,38	10	125,1	4,28	5	130,4	5,77	49	123,6	5,15
61	Шырыня альвеалярнай дугі	28	62,0	3,28	12	59,8	4,00	10	58,9	4,65	4	60,8	0,96	24	59,3	3,30
63	Шырыня паднябення	37	37,6	2,34	12	35,8	1,70	10	37,0	1,94	4	34,3	2,63	36	36,0	1,87
62	Даўжыня паднябення	32	48,7	2,36	12	46,9	2,68	10	46,6	2,46	4	47,8	3,95	37	45,7	2,71
27	Цемянная дуга	43	132,5	7,09	13	134,9	7,02	11	130,2	6,62	4	133,8	8,54	50	127,8	8,55
28	Дуга патыліцы	40	123,6	6,02	13	118,4	4,66	10	117,4	4,88	4	119,5	4,12	45	117,9	6,73

Грунтовы могільнік Дрысвяты-Пашавічы ўваходзіць у склад археалагічнага комплексу, які ўключае ў сябе таксама гарадзішча і неўмацаванае селішча, размешчаныя на востраве «Замак» возера Дрысвяты. Археалагічныя помнікі на востраве ўяўляюць сабою рэшткі памежнай крэпасці Полацкай зямлі XI – XIII стагоддзяў [13, с. 191]. Грунтовы могільнік размешчаны на бліжэйшым паўвостраве. У пахавальным інвентары пераважаюць рэчы, характэрныя для старажытных беларускіх гарадоў, што дазволіла Г.М. Семянчуку даць азначэнне могільніку як гарадскому некропалю, бескурганнаму па форме і хрысціянска-славянскаму па зместу [13, с. 195].

Праведзенае намі даследаванне дрысвяцкай серыі чарапоў паказала павышаную ўнутрыгрупавую зменлівасць як мужчынскай, так і жаночай выбаркі, што ўказвае на генетычную неаднароднасць групы. У фарміраванні антрапалагічнага складу насельніцтва Дрысвяцкай крэпасці прымалі ўдзел прадстаўнікі балцкага насельніцтва, носьбіты культуры ўсходнелітоўскіх курганоў. Асабліва яскрава гэта праявілася ў жаночай выбарцы чарапоў, для якой уласцівы характэрны зрух у бок масіўнасці, у параўнанні з курганнымі чарапамі. Па ўсёй верагоднасці, прышлае славянскае насельніцтва, пераважна мужчыны (прадстаўнікі княжаскай адміністрацыі, дружыннікі), маглі ўступаць у шлюбныя адносіны з мясцовымі балцкімі жанчынамі [10]. Гэтая выснова знаходзіць пацверджанне ў матэрыялах археалогіі. Умацаванае гарадзішча на востраве да XI стагоддзя належыла балцкаму насельніцтву; сярод упрыгожванняў, знойдзеных на гарадзішчы і селішчы, пераважалі балцкія рэчы (зааморфныя бранзалеты, трапецападобныя падвескі, фібулы з макападобнымі і ромбападобнымі галоўкамі) [13, с. 347].

Грунтовы могільнік Казлоўцы размешчаны на правым беразе р. Дзісны, на адлегласці 12 км на захад ад г. Дзісны. У выніку археалагічных раскопкак, праведзеных у 1988 – 1990 гадах Л.У. Дучыц і Г.М. Семянчуком, былі выяўлены пахаванні па абраду крэмацыі і інгумацыі. Нягледзячы на сваю нешматлікасць, матэрыялы грунтовага могільніка Казлоўцы заслугоўваюць асаблівай увагі. Мужчынскія чарапы з грунтовага могільніка выразна адрозніваюцца ад курганнага насельніцтва Полацкай зямлі і характарызуюцца мезакраніяй, невялікім падоўжным дыяметрам чэрапа, шырокім і нізкім тварам з паслабленай прафіліроўкай. Падобны «лапаноідны» комплекс прыкмет характэрны для фінамоўнага насельніцтва Прыбалтыкі і Паўночнага Захаду Расіі [14, с. 69 – 70; 15].

Меркаванне пра сувязі насельніцтва, што пакінула грунтовы могільнік Казлоўцы, з фінамоўным насельніцтвам знаходзіць сваё пацверджанне ў археалагічных матэрыялах [16]. Такім чынам, у XI – XII стагоддзях на тэрыторыю Полацкага княства маглі пранікаць асобныя групы прыбалтыйска-фінскага насельніцтва з поўначы. Адсутнасць выражаных антрапалагічных адрозненняў жаночых чарапоў з могільніка Казлоўцы ад курганных чарапоў таксама можа ўказваць на шлюбныя сувязі прышлага і мясцовага насельніцтва.

Магчыма, што антрапалагічная спецыфіка тэрытарыяльнай групы курганнага насельніцтва з Глыбоцкага р-на (могільнікі Перавоз, Зябкі, Падсвілле), а менавіта зрух у бок мезакраніі, у спалучэнні з паслабленнем гарызантальнай прафіліроўкі твару, адлюстроўваюць вынікі працэсаў метысацыі мясцовага і прышлага прыбалтыйска-фінскага насельніцтва. Паводле археалагічных даных, у матэрыялах курганнага могільніка Перавоз таксама прысутнічаюць прыбалтыйска-фінскія культурныя элементы (галаўныя ўборы, вышываныя бляшкамі) [16, с. 17].

Аналіз антрапалагічных матэрыялаў абодвух грунтовых могільнікаў з тэрыторыі Полацкай зямлі X – XIII стагоддзяў указвае на актыўныя міжэтнічныя кантакты, якія суправаджаліся разбурэннем прынцыпу племяннай эндагаміі і спрыялі станаўленню новага тыпу этнічнай супольнасці, які прыходзіў на змену старой племяннай арганізацыі разам са станаўленнем раннесярэднявечнай дзяржаўнасці.

Жальнікі XIII – XIV стагоддзяў. Жальнікі ўяўляюць сабою пераходны тып пахаванняў ад курганоў да сучасных грунтовых магіл. Жальнікі існавалі даволі працяглы час – з XIII па XVIII стагоддзе. Для жальнічных магіл характэрна абкладка з камянёў круглаватай, авальнай або чатырохкутнай формы, адзін альбо два вялікія валуны ў галовах і ў нагах, каменныя крыжы. Жальнікі былі распаўсюджаны на тэрыторыі Паўночнай Беларусі, Пскоўшчыны, Усходняй Латвіі [17].

У склад даследаванай намі серыі ўвайшлі матэрыялы ранніх жальнічных пахаванняў з тэрыторыі Глыбоцкага (Перавоз) і Докшыцкага (Волча, Марговіца) раёнаў, атрыманыя ў выніку раскопак А. Квяткоўскай. Серыя, прадстаўленая раннімі жальнічнымі пахаваннямі, з'яўляецца злучальным храналагічным звяном паміж пахаваннямі курганнага перыяду і пахаваннямі, набліжанымі да сучаснасці. Сярэднія памеры мужчынскіх чарапоў з серыі жальнічных пахаванняў прадстаўлены ў табліцы 1. Сумарная серыя мужчынскіх чарапоў характарызуецца мезакраніяй, сярэднімі падоўжным і папярочным дыяметрамі чэрапа, вялікай вышынёй чарапной каробкі. Твар сярэдні як паводле абсалютных памераў, так і паводле верхнятваравага паказальніка, артагнатны, моцна прафіляваны ў гарызантальнай плоскасці. Арбіты сярэднешырокія, нізкія як паводле абсалютнай велічыні, так і паводле арбітнага паказальніка. Па насавым паказальніку серыя адносіцца да катэгорыі сярэдняносых. У параўнанні з курганным насельніцтам назіраецца тэндэнцыя да зруху ў накірунку эпахальнага змянення чарапной каробкі: скарачаецца падоўжны дыяметр чэрапа (брахікефілізацыя), памяншаюцца памеры твару (грацылізацыя).

Вывучэнне насельніцтва Полацка XVII – XVIII стагоддзяў. Да апошняга часу звесткі пра антрапалагічныя асаблівасці насельніцтва Полацка адсутнічалі. Нягледзячы на тое, што на працягу 50 – 70 гадоў XX стагоддзя шэрагам археолагаў (М.К. Каргер, П.А. Рапапорт, У.А. Булкін) былі выяўлены і апісаны пахаванні X – XIII стагоддзяў у полацких храмах, антрапалагічная экспертыза шкілетных матэрыялаў не праводзілася. Між тым вывучэнне антрапалогіі старажытнага насельніцтва Полацка XI – XIII стагоддзяў мае надзвычай важнае значэнне, паколькі дазволіць адказаць на шэраг важных пытанняў з гісторыі Полаччыны: вызначыць месца палачан у антрапалагічным складзе насельніцтва Беларускага Падзвіння, прасачыць спецыфіку славянскага засялення рэгіёна і г.д.

У лістападзе 2005 года пад кіраўніцтвам Д.У. Дука праводзіліся археалагічныя раскопкі ў Спаса-Праабражэнскай царкве Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Усяго было даследавана 8 склепаў. Было высветлена, што ўсе склепы пабудаваны ў адзін час, у межах 2-й паловы XVIII стагоддзя [18, с. 58]. У 3-х склепах былі зафіксаваны чалавечыя косткі. Усю сукупнасць выяўленых астэалагічных матэрыялаў можна падзяліць на дзве групы: 1) моцна парушаныя і фрагментарныя рэшткі чалавечых шкілетаў з крыптаў № 1 – 3 без слядоў пахавальнага абраду, з дамешкамі костак жывёл; 2) калектыўнае пахаванне ў дамавіне з крыпты № 3. Сярод чалавечых костак з першай групы былі выяўлены рэшткі не менш за 37 чалавек, сярод якіх 5 дзяцей, а таксама дарослыя мужчыны і жанчыны рознага ўзросту (ад 20 да 60 год). Мяркуючы па фрагментарнасці шкілетаў, многія з якіх былі прадстаўлены адзінкавымі косткамі, пахаванні былі моцна парушаны. Магчыма, гэтыя косці скідвалі разам з косткамі жывёл у склепы, калі знаходзілі іх падчас будаўнічых работ на тэрыторыі манастыра.

Другая група (калектыўнае пахаванне ў дамавіне) уяўляе сабой гамагенную паводле полу і ўзросту групу, прадстаўленую амаль поўнымі шкілетамі 6-ці мужчын сталага веку (узрост больш за 50 год). Падобна, што калектыўнае пахаванне ў адной дамавіне паўстала ў выніку перапахавання шкілетаў, паколькі асобныя косткі былі абгорнуты дарагой тканінай з срэбранай ніткай.

Прыдатнымі для вымярэнняў паводле стандартнай краніяметрычнай праграмы аказаліся 6 чарапоў з другой групы. Сумарная серыя мужчынскіх чарапоў з пахавання ў дамавіне вылучаецца выражанай брахікраніяй (чарапны паказальнік 83,1), пры сярэдніх велічынях падоўжнага дыяметра і вялікіх памерах папярочнага і вышыннага дыяметраў чэрапа. Твар шырокі і высокі паводле абсалютных памераў, сярэдні паводле вехнятваравага паказальніка, артагнатны. Арбіты шырокія і высокія паводле абсалютнай велічыні, паводле арбітнага паказальніка – сярэднія. Паказальнік выступання твару характарызуе серыю як артагнатную. Такім чынам, ужо на ўзроўні апісальнай характарыстыкі прасочваецца марфалагічная адметнасць групы. Паводле звестак І.П. Дэйніса, у часы, калі ў манастыры знаходзілася рэзідэнцыя генералаў ордэна іезуітаў, склепы Спаскай царквы выкарыстоўваліся для пахавання кіраўнікоў ордэна [19, с. 131]. Такім чынам, даследаваныя намі пахаванні маглі належыць іезуітам.

У 2007 годзе пад кіраўніцтвам Д.У. Дука праводзіліся археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Полацкага гарадзішча. У верхніх пластах помніка, на глыбіні 0,8 – 1,4 м, былі выяўлены пахаванні, датаваныя на падставе аналізу пахавальнага інвентара XVII – XVIII стагоддзяў. На думку Д.У. Дука, на могілках хавалі прадстаўнікоў полацкай шляхты. У выніку раскопак быў атрыманы шкілетны матэрыял, прадстаўлены рэшткамі 36 чалавек, сярод якіх 13 дзяцей і 23 дарослых. Прыдатнымі для даследавання па краніяметрычнай праграме аказаліся 16 чарапоў (11 мужчынскіх і 5 жаночых). Сярэднія памеры і стандартныя адхіленні мужчынскіх чарапоў прадстаўлены ў табліцы 1.

Сумарная серыя мужчынскіх чарапоў характарызуецца мезакраніяй (чарапны паказальнік 79,1), сярэднімі велічынямі падоўжнага і папярочнага дыяметраў чэрапа ў спалучэнні з малой вышынёй чарапной каробкі. Твар сярэдні як паводле абсалютных памераў, так і паводле верхнятваравага паказальніка, артагнатны. Арбіты сярэднешырокія, нізкія як паводле абсалютнай велічыні, так і паводле арбітнага паказальніка, нос сярэдні. Мужчынская серыя чарапоў выяўляе полімарфізм па верхняй вышыні твару. Для астатніх паказчыкаў зменлівасць блізкая да «нармальнай», альбо паніжаная. Па сваіх абсалютных памерах полацкая серыя мужчынскіх чарапоў выяўляе значнае падабенства з сумарнай серыяй вясковага насельніцтва Беларусі XVIII – XIX стагоддзяў. Гэты факт указвае на мясцовае паходжанне полацкай шляхты, яе генетычныя сувязі з карэнным насельніцтвам Беларусі.

Міжгрупавы аналіз даследаваных краніялагічных серый. З мэтай параўнання паміж сабой даследаваных груп насельніцтва быў праведзены кананічны дыскрымінантны аналіз. Аналіз праводзіўся для чатырох краналагічных серый мужчынскіх чарапоў з тэрыторыі Беларускага Падзвіння: 1) матэрыялы курганных пахаванняў XI – XIII стагоддзяў; 2) матэрыялы жальнікаў XIII – XIV стагоддзяў; 3) матэрыялы пахаванняў XVII – XVIII стагоддзяў з тэрыторыі Полацкага гарадзішча; 4) матэрыялы пахаванняў у Спаскай царкве Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. У параўнальны аналіз была таксама ўключана серыя вясковага насельніцтва Беларусі XVIII – XIX стагоддзяў як эталонная для карэннага насельніцтва Беларусі новага часу. Першапачаткова ў аналіз быў уключаны набор з 30 метрычных прыкмет. У выніку пакрокавага адбору ў сістэму было ўключана 16 найбольш інфарматыўных прыкмет. Верагоднасць памылкі першага роду для F-крытэрая Фішэра ($p < 0,000$) указвае на існаванне невыпадковых адрозненняў па даным наборы прыкмет.

У сувязі з тым, што разглядалася 5 выбарак, для апісання міжгрупавой зменлівасці дастаткова 4-х дыскрымінатараў, ці кананічных пераменных. Для першай і другой кананічных пераменных $p < 0,05$, што ўказвае на невыпадковы характар адпаведнай заканамернасці міжгрупавой варыяцыі. Для трэцяга і чацвёртага дыскрымінатараў такая невыпадковасць не была даказана. Па значэннях назапашаных доляў сумарнай міжгрупавой варыяцыі першая кананічная пераменная ўлічвае каля 70 % зменлівасці, другая – каля 17 %. У суме першыя два кананічныя вектары адлюстроўваюць каля 87 % зменлівасці і з'яўляюцца найбольш значнымі. У табліцы 2 прадстаўлены нагрузкі зыходных прыкмет на кананічныя пераменныя. Наборы нагрузак выкарыстоўваюцца для інтэрпрэтацыі сэнсу кананічных пераменных.

Табліца 2

Нагрузкі зыходных прыкмет на кананічныя пераменныя в мужских группах

№ паводле Марціна	Прыкмета	Кананічныя пераменныя	
		1	2
1	Падоўжны дыяметр	0,608	0,435
8	Папярочны дыяметр	-0,329	0,504
63	Шырыня паднябення	0,229	–0,257
17	Вышынны дыяметр	0,301	0,395
5	Даўжыня асновы чэрапа	0,364	0,210
28	Дуга патыліцы	0,285	0,047
10	Найбольшая шырыня ілба	–0,249	0,258
40:5	Паказальнік выступання твару	–0,000	0,146
62	Даўжыня паднябення	0,280	0,183
8:1	Чарапны паказальнік	–0,625	0,056
52	Вышыня арбіты	–0,006	0,230
9	Найменшая шырыня ілба	0,098	0,038
46	Сярэдняя шырыня твару	0,130	–0,067
45	Скулавы дыяметр	0,108	0,386
40	Даўжыня асновы твару	0,259	0,193
61	Шырыня альвеалярнай дугі	0,179	0,070

Першая кананічная пераменная найлепшым чынам падзяляе паміж сабой розныя храналагічныя групы насельніцтва (серыю курганных чарапоў XI – XIII стст. і серыі XVII – XIX стст.) і вылучае антрапалагічны тып, які характарызуецца зніжэннем чарапнога паказальніка, павелічэннем даўжыні чарапной каробкі і зніжэннем яе шырыні, павелічэннем высотнага дыяметру. Гэты «архаічны» комплекс прыкмет уласцівы курганнаму насельніцтву Полацкай зямлі.

Другі дыскрымінатар добра падзяляе паміж сабой дзве храналагічна блізкія серыі: серыю, прадстаўленую пахаваннямі ў Спаскай царкве, і серыю вясковага насельніцтва Беларусі. Мужчыны з пахаванняў у Спаскай царкве адрозніваюцца ад вясковага насельніцтва Беларусі павелічэннем усіх абсалютных памераў мазгавога чэрапа, больш шырокім і высокім тварам, высокімі арбітамі.

Па выніках кананічнага аналізу быў пабудаваны графік ацэнак кананічных пераменных (мал. 1). На графіку прадстаўлена наглядная карціна ўзаемнага размяшчэння асобных чарапоў, якія належаць да розных груп, у прасторы першых 2-х кананічных пераменных.


У правай частцы графіка размяшчаюцца курганныя чарапы полацкіх крывічоў, якія характарызуюцца даліхакраніяй, вялікімі памерамі падоўжнага і вышыннага дыяметраў. У левай частцы графіка размешчаны серыі, набліжаныя да сучаснасці (XVII – XIX стст.). Гарызантальная вось графіка, такім чынам, адлюстроўвае эпахальны працэс брахікефалізацыі, які складаецца ў змяненні формы чарапной каробкі ад падоўжанай да круглай за кошт памяншэння падоўжных памераў і павелічэння шыротных памераў чэрапа.

Дзве серыі чарапоў, прадстаўленыя жальнічнымі пахаваннямі XIII – XIV стагоддзяў і пахаваннямі полацкай шляхты XVII – XVIII стагоддзяў, займаюць на графіку прамежкавае становішча. Цікава адзначыць значнае перакрыванне зон абодвух графікаў, што ўказвае на блізкае падабенства ўказаных серый.


У цэлым для ўсіх даследаваных серый, за выключэннем серыі са Спаскай царквы, характэрна прыцягненне да адзінага цэнтра згушчэння. Серыя чарапоў са Спаскай царквы, наадварот, стаіць абасоблена, пры гэтым зоны, утвораныя 2-ма полацкімі серыямі (Спаская царква і полацкае гарадзішча), не перакрываюцца паміж сабой, што ўказвае на іх выразнае марфалагічнае адрозненне.

З мэтай атрымання нагляднага ўяўлення аб ступені падабенства і адрознення даследаваных груп насельніцтва быў праведзены кластэрны аналіз. У модулі правядзення дыскрымінантнага аналізу была знойдзена матрыца адлегласцяў Махаланобиса, якая затым выкарыстоўвалася для кластэрызацыі па ме-

тадзе Уорда. На малюнку 2 прадстаўлена гарызантальная дэндраграма кластэрнага аналізу. На першым кроку кластэрызацыі, на ўзроўні адлегласці 2,57, быў утвораны кластэр, які ўключае групы вясковага насельніцтва Беларусі і полацкай шляхты На другім кроку, на ўзроўні адлегласці 3,61, да іх далучылася група насельніцтва, прадстаўленага жальнічнымі пахаваннямі. На трэцім кроку, на адлегласці 6,32, да іх далучылася група курганных крывічоў. Група, прадстаўленая матэрыяламі пахаванняў ў Спаскай царкве, стаіць адасоблена, што пацвярджае яе антрапалагічную адметнасць.



Мал. 1. Узаемнае размяшчэнне мужчынскіх груп у прасторы двух кананічных перамешных



Мал. 2. Гарызантальная дэндраграма кластэрнага аналізу

У выніку праведзенага даследавання былі зроблены наступныя высновы:

1) аналіз антрапалагічных матэрыялаў 2-х грунтовых могільнікаў X – XIII стагоддзяў з тэрыторыі Полацкай зямлі ўказвае на актыўныя міжэтнічныя кантакты. У фарміраванні насельніцтва памежнай крэпасці Полацкай зямлі Дрысвяты прымаюць удзел групы славянскага і балцкага насельніцтва, матэрыялы грунтовага могільніка Казлоўцы адлюстроўваюць узаемадзеянне прышлага прыбалтыйска-фінскага і мясцовага насельніцтва;

2) паміж насельніцтвам Беларускага Падзвіння эпохі ранняга сярэднявечча (полацкія крывічы) і новага часу (полацкая шляхта, вясковае насельніцтва) прасочваецца генетычная пераемнасць. Адроз-

ненне паміж курганным насельніцтвам і насельніцтвам, набліжаным да сучаснасці, з'яўляецца вынікам эпахальнай трансфармацыі будовы чэрапа (брахікефалізацыя);

3) блізкае падабенства паміж сабой серыі вясковага насельніцтва Беларусі і серыі полацкай шляхты ўказвае на іх генетычную блізкасць і агульнае паходжанне;

4) антрапалагічная своеасаблівасць серыі, прадстаўленай пахаваннямі ў Спаскай царкве, сведчыць на карысць адсутнасці генетычных сувязей з мясцовым насельніцтвам.

ЛІТАРАТУРА


1. Известия Императорского Общества любителей естествознания, антропологии и этнографии. – М., 1886. – Т. 49, вып. 2. – С. 98 – 119.
2. Sedlaczek, L. Dregowiczanie. Studium antropologiczne. Przyczynek do paleontologii Białej Rusi // Polska Akademija Umejętności. Prace Komisji Antropologii i Prehistorji. – Krakow: Drukarnia Uniwersitetu Jagellońskiego, 1929. – 55 s.
3. Дэбец, Г.Ф. Чарапы Люцынскага могільніку і старажытных славян Беларусі і месца апошніх у палеантрополёгіі Усходняй Эўропы / Г.Ф. Дэбец // Працы секцыі археолёгіі Інстытута гісторыі Беларускай АН. – Мінск, 1932. – Т. 3. – С. 69 – 80.
4. Дебец, Г.Ф. Палеоантропология СССР / Г.Ф. Дебец. – М.: Изд-во Акад. Наук СССР, 1948 – 389 с. (Труды / Ин-т этнографии. Т. 4).
5. Трофимова, Т.А. Кривичи, вятичи и славянские племена Поднепровья по данным антропологии / Т.А. Трофимова // Советская этнография. – 1946. – № 1. – С. 91 – 136.
6. Алексеева, Т.И. Этногенез восточных славян по данным антропологии / Т.И. Алексеева. – М.: Изд. Моск. ун-та, 1973. – 332 с.
7. Саливон, И.И. Антропологическая характеристика населения Белоруссии II тыс. н. э. по палеоантропологическим материалам / И.И. Саливон // Очерки по антропологии Белоруссии / И.И. Саливон [и др.]; под ред. В.П. Алексеева, Ю.Г. Рычкова. – Минск, 1976. – С. 18 – 101.
8. Кушнир, А.И. Новые материалы к антропологической характеристике населения Полоцкой земли XX – XIII вв. / А.И. Кушнир, И.В. Чаквин // История и археология Полоцка и Полоцкой земли: конф. к 1125-летию Полоцка. – Полоцк, 1987. – С. 28 – 30.
9. Емяльянчык, В. Комплексная антрапалагічная характарыстыка насельніцтва Полацкай зямлі X – XIII стст. (па даным краніялогіі) / В. Емяльянчык // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV Міжнар. навук. канф., Полацк, 23 – 24 кастр. 2002 г.; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т гісторыі НАНБ, НПГКМЗ; укл. Т.А. Джумантаева. – Полацк, 2003. – С. 122 – 130.
10. Емельянчик, О.А. Краниологическая характеристика материалов грунтового могильника XI – XIII вв. Дрисвяты-Пашевичи / О.А. Емельянчик // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2006. – № 7. – С. 16 – 24.
11. Емяльянчык В.А. Вынікі антрапалагічнай экспертызы астэалагічных матэрыялаў з крыптаў Спаскай царквы Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра // Гіст-археалаг. зб. – 2006. – № 21. – С. 224 – 228.
12. Емяльянчык, В.А. Антрапалогія двух грунтовых могільнікаў курганнага перыяду (да пытання аб этнічнай сітуацыі на тэрыторыі Полацкай зямлі ў X – XIII стст.) / В.А. Емяльянчык // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы V Міжнар. канф., Полацк, 24 – 25 кастр. 2007 г.; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, НПГКМЗ. – Полацк: НПГКМЗ, 2007. – Т. 2. – С. 14 – 21.
13. Семянчук, Г. Раннесярэднявечны грунтовы могільнік Дрысвяты-Пашавічы / Г. Семянчук // Гіст.-археалаг. зб. – 2002. – № 17. – С. 191 – 195.
14. Денисова, Р.Я. География антропологических типов балтских племён и этногенетические процессы в I – начале II тысячелетия н. э. на территории Литвы и Латвии / Р.Я. Денисова // Балты, славяне, прибалтийские финны: Этногенетические процессы: сб. ст.; Латв. акад. наук, Ин-т истории Латвии; отв. ред. Р.Я. Денисова. – Рига: Зинатне, 1990. – С. 28 – 81.
15. Санкина, С.Л. Этническая история средневекового населения Новгородской земли по данным антропологии / С.Л. Санкина. – СПб.: Дмитрий Буланин, 2000. – 109 с.
16. Дучыц, Л.У. Археалагічныя дадзеныя аб прыбалтыйскіх фінах на тэрыторыі Беларусі ў пачатку II тысячагоддзя / Л.У. Дучыц // Гісторыя Беларусі: жалезны век і сярэднявечча: тэз. дакл. навук. канф., Мінск, 27 – 28 лістап. 1997 г.; Ін-т гісторыі НАН Беларусі; нав. рэд. В. Шадыра. – Мінск, 1997. – С. 16 – 18.
17. Дучыц, Л.У. Жальнікі / Л.У. Дучыц // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл.; Беларус. энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 252.
18. Дук, Д.У. Гісторыя Порлацка: па матэрыялах археалагічных даследаванняў: вучэб.-метад. компл. для студ. спец. 1-21 03 01-01 01 «Гісторыя Беларусі» / Д.У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 112 с.
19. Дэйніс, І.П. Полацкая даўніна / І.П. Дэйніс; уклад., прадм. і камент. М. Баўтовіча; пер. з руск. мовы М. Ермалаева. – Мінск: Медисонт, 2007. – 330 с.

АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ ДАСЛЕДАВАННЯ ГАРАДЗІШЧА СВІСЛАЧ
(ПА МАТЭРЫЯЛАХ 2000, 2005 – 2008 ГАДОЎ)

канд. гіст. навук, дац. В.І. КОШМАН
(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)

Прадстаўляюцца асноўныя вынікі даследавання гарадзішча Свіслач (Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць). Жыццё на паселішчы ўзнікла яшчэ ў часы жалезнага веку, было адноўлена ў пачатку XII стагоддзя і з пэўнымі перапынкамі праіснавала да канца XVII стагоддзя. Гарадзішча з XII стагоддзя з'яўлялася паўднёва-усходнім фарпостам Менскага княства і магло быць заснавана па ініцыятыве Глеба Усяслававіча Менскага. Гарадзішча атаясамліваецца даследчыкам з летапіснай «Віслаччу», у якой княжыў Ізяслаў (1256 г.). Падчас вывучэння помніка атрыманы матэрыялы, якія сведчаць аб мангольскім разарэнні гарадзішча ў сярэдзіне XIII стагоддзя. Здабытыя археалагічныя артэфакты характарызуюць матэрыяльнае і духоўнае жыццё паселішча замкавага тыпу Сярэдняй Бярэзіны.

Гарадзішча Свіслач размешчана на паўднёвай ускраіне аднайменнай вёскі Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці і займае высокі мыс, які ўтвораны ўпадзеннем ракі Свіслач у раку Бярэзіну. З поўдня, захаду і ўсходу гарадзішча мае стромкія схілы вышынёй 10 – 12 м. Пляцоўка блізкая да трохвугольнай, памерам каля 70 × 70 м; з боку вёскі (з поўначы) яна ўмацавана ровам глыбінёй каля 2 м, шырынёй да 13 – 17 м і валам вышынёй каля 2,2 – 2,5 м, шырынёй каля падэшвы 8 – 9 м.



Мал. 1. План гарадзішча Свіслач на аснове інвентара 1560 года, паводле Дз.І. Даўгялы

Уезд на гарадзішча размешчаны ў разрыве вала з напольнага боку. Мясцоваму насельніцтву гэты помнік вядомы пад назвамі *«Замак»*, *«Замчышча»*.

Гарадзішча Свіслач (як *«замок Свислочь»*) неаднаразова ўзгадваецца ў Метрыцы ВКЛ, пералічваюцца свіслацкія дзяржаўцы, намеснікі, старасты (Рыгор Ісаевіч Грамыка (1511 – 1518 гг.), Войцех Юр'евіч Навасілоўскі (1518 – 1522 гг.), Андрэй Якубавіч Няміровіч (1522 – 1535 гг.), князь Кузьма Іванавіч Ж(З)аслаўскі (1540 г.), князь Васіль Міхайлавіч Сангушка (1546 – 1552 гг.), ваявода Станіслаў Давойна (1558 – 1563 гг.), Баркулаб Корсак (1564 г.), князь Андрэй Курбскі (1565 г.), Міхаіл Гарабурда (1566 – 1568 гг.) і інш.

Першае апісанне гарадзішча ўтрымліваецца ў інвентары Свіслацкага замка, які быў складзены ў ліпені 1560 года рэвізорамі Р. Валовічам і М. Нарушэвічам. Ён змяшчае шмат важнай інфармацыі аб замкавых умацаваннях, пабудовах на пляцоўцы гарадзішча, падатках і г.д. [1]. Падрабязны разгляд інвентара 1560 года прадпрыняў Д.І. Даўгяла (мал. 1) [2].

У 1882 годзе па цыркулярнаму прадпісанню мінскага губернатара валастным пісарам Свіслацкай воласці была запоўнена анкета, якая змяшчае апісанне Свіслацкага замка, двух гарадзішчаў, адной батарэі і 375 курганоў у воласці [3]. Апісанне пабудавана па прынцыпу «пытанне – адказ» і ўяўляе пэўную цікавасць для ацэньвання стану захаванасці гарадзішча ў канцы XIX стагоддзя.

№ 575, ноября 29 дня 1882 г.

с. 5 § 1. Свислочский замок

а) при впадении р. Свислочь в р. Березину, на низменном месте;

б) одиночно построен;

в) Размер: длина внутренней площадки 32 сажни, ширина 26 сажен, возвышен над поверхностью окружающей местности, от р. Березины по уклону 14 сажен, от р. Свислочь 11 сажен и от Николаевской церкви 6 сажен, глубина рва от Николаевской церкви 1 ½ сажни и ширина 7 сажен;

г) форма замка продолговатая. Есть один промежуток для въезда на замок через ров, где построен деревянный мост ширина коего 2 сажни и длина 5, со стороны самого местечка Свислоч;

д) на внутренней площади замка есть 2 каменных 1 деревянное строение. При постройке каменных строений было найдено 2 ямы гнилой пшеницы и скилет какого-то животного наподобие оленя;


с. 5 адв. е) народное название самой насыпи «Замок». Так местные крестьяне его называют. Предания о замке имеются, что он издавна устроен для военных действий, но кто устроил насыпь и кто в ней проживал неизвестно. Каменные строения, находящиеся в настоящее время на замке, устроены в 1849 году владельцем имения Свислочь Яковом Незабытовским;

ж) в двух верстах от другого старейшего памятника, находящегося на правом берегу р. Березины, называемого «Городок»;

з) в самом местечке Свислочь.

Не меней цікавая інфармацыя змяшчаецца ў Апытальных лістах 1924 года [4, с. 305 – 308]. У апытальніку, які быў запоўнены А.М. Гардзеевым 12 – 13.06.1924 г., паведамляецца аб мясцовай назве гарадзішча («Замак»), дасцца яго апісанне (чатырохвугольнік з акругленымі вугламі плошчаю дзесяціна; вышыня над узроўнем рэчкі каля 7 сажняў; глыбокі роў і інш.), а таксама паведамляецца аб наяўнасці кургана каля т. зв. «Крывавага ручая» і аб тым, што Свіслач паміж мястэчкам і маёнткам уяўляе сабой буйны могільнік. На наш погляд, вельмі цікавым з'яўляецца заўвага аб тым, што людзі сталага ўзросту тлумачаць адсутнасць паданняў аб Свіслачы тым, што падчас адной з войнаў усё насельніцтва было знішчана. Не выключана, што гэта адлюстраванне ў народнай памяці знішчэнняў замка і мястэчка падчас ваенных катаклізмаў сярэдзіны XVII стагоддзя.

Першае навуковае апісанне гарадзішча змяшчаецца ў працы С.С. Шутава і М.М. Улашчыка пры апісанні іх разведкі па абодвух берагах р. Свіслач і невялікага ўчастка правага берага р. Бярэзіны [5, с. 112 – 113, табл. 1; 10 – 18, мал. 2]. Яны апісалі месцазнаходжанне гарадзішча (паўднёвая ўскраіна мястэчка, на стыку р. Бярэзіны і р. Свіслач), яго памеры і ўмацаванні (67 × 77 м, шырыня рва да 22 м, глыбіня да 6,3 м) (мал. 2). Быў сабраны і апісаны пад'ёмны матэрыял (ляпны і ганчарны посуд), а таксама зроблены шэраг цікавых назіранняў над тапаграфіяй гарадзішча і самога мястэчка. Частка матэрыялаў гэтай разведкі (фрагменты ганчарнай керамікі) захоўваецца ў фондах ІГ НАН Беларусі пад нумарам 1168.



Мал. 2. План гарадзішча Свіслач, паводле С.С. Шутава і М.М. Улашчыка (1926 г.)

Да археалагічнага вывучэння гарадзішча Свіслач навукоўцы прыступілі ў пачатку 1960-х гадоў. У 1962, 1969 – 1971 гадах археалагічнымі экспедыцыямі БДУ імя У.І. Леніна пад кіраўніцтвам Э.М. Загарульскага было вывучана каля 720 кв. м. Матэрыялы гэтых маштабных работ апублікаваны толькі часткова. Найбольш даследаванай катэгорыяй знаходак аказаліся вырабы са шкла, якія з'яўляюцца надзвычай распаўсюджанай знаходкай у напластаваннях XII – XIII стагоддзяў [6, 7].


У 2000 годзе вывучэнне гарадзішча было адноўлена супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі [8] і працягнута ў 2005 – 2008 гадах [9 – 12]. За гэты час было вывучана 164 кв. м.

У выніку даследаванняў было ўстаноўлена, што культурны слой на гарадзішчы мае магутнасць 1,7 – 2,2 м (у ямах да 3,20 м). Верхнія напластаванні (магутнасць 0,3 – 0,5 м) уяўляюць сабой шчыльны цёмна-шэры слой з уключэннямі будаўнічага смецця і перамешанымі матэрыяламі XII – XX стагоддзяў (пераважна XVI – XVII стст.). Сярэдні гарызонт (магутнасць 1,0 – 1,4 м) прадстаўлены чорным гумусіраваным слоем, насычаным попелам, вугалем, праслойкамі светлага пяску і гліны. Па характэрным знаходкам ён датуецца XII – XIII стагоддзямі. Ніжні гарызонт (перадмацерыковы і частка ямаў) ўтварыўся яшчэ ў раннім жалезным веку (II – IV стст. н. э.), прадстаўлены сухім цёмна-шэрым (чорным) гумусіраваным слоем і звязаны з пражываннем прадстаўнікоў культуры штрыхаванай керамікі.


Сярод знаходак перадмацерыковага гарызонта характэрнай з'яўляецца ляпная кераміка з штрыхоўкай па знешняй паверхні пасудзін. Пераважна гэта рабрысты посуд (варыянт К2 паводле А.У. Ільюціка), іх вянчыкі і шыйка выгнуты вонкі (мал. 3 – 4). Даследчыца адзначае, што рабрыстыя гаршчкі распаўсюджаны, у асноўным, па р. Свіслач і толькі адзінкавыя экзэмпляры вядомы на р. Бярэзіне. Датуецца такая кераміка даволі шырока – з апошняй чвэрці I тыс. да н. э. і да 3 – 4 стст. н.э. [13].

На мяжы XI – XII стагоддзяў (пачатку XII стю) адбываецца паўторнае засяленне гарадзішча. Сярод керамічнага матэрыялу адсутнічае характэрны посуд X – XI стагоддзяў, у ніжніх пластах сустракаюцца шкляныя бранзалеты. Аднаўленне ўмацаванага паселішча ў Свіслачы мы звязваем з другім этапам у раз-

віцці т. зв. «свіслацкай агламерацыі паселішчаў» [14, с. 154 – 161; 15, с. 42 – 43, 49, 58 – 61, мал. 18]. Гэта паселішча адзначаецца вельмі выгадным геастратэгічным палажэннем, якое тлумачыцца размяшчэннем на двух важных гандлёва-камунікацыйных магістралях – р. Бярэзіна і р. Свіслач, якія адыгрывалі важную ролю ў падняпроўска-нёманскай эканамічнай зоне. У гэты час важнай транспартнай магістраллю паміж Ноўгарадам і Кіевам выступае Днепра-Нёманскі-Заходне-Дзвінскі шлях з выхадам у басейн Ловаці. Шляхі, якія злучалі дняпроўскі і заходнедзвінскі басейны, праходзілі ўздоўж р. Бярэзіны, р. Свіслач і р. Гайны.




Мал. 3. Рэканструкцыя ляпнога гаршчка з мацерыковай ямы (раскопкі 2007 г.)
(мал. З.А. Харытановіч)




Мал. 4. Донцы ляпных гаршчкоў з мацерыковай ямы (раскопкі 2007 г.)
(мал. З.А. Харытановіч)

Бачыцца, што аднаўленне гарадзішча ў Свіслачы трэба звязваць з дзейнасцю сына Усяслава Брачыслававіча – Глебам Усяслававічам Менскім (1104 – 1119 гг). Заняпад адкрытага гандлёва-рамеснага паселішча на р. Менка і заснаванне ў другой палове XI стагоддзя Менска на р. Свіслач, пабудова на мяжы XI – XII стагоддзяў новага дзядзінца ў Ізяславі абумовілі большую ўвагу да абароны воднага шляху па р. Свіслач і сярэдняй Бярэзіне. Праявілася гэта, відаць, у актыўнай дзейнасці Глеба Усяслававіча па пашырэнню свайго Менскага ўдзела. У нашым выпадку адлюстраваннем гэтай дзейнасці было аднаўленне жыцця на ланцужку гарадзішчаў па сярэдняй Бярэзіне і ніжняй Свіслачы (Свіслач, Паліцкае, Зборск, Жужлянка). Гэтыя добра ўмацаваныя гарадзішчы маркіруюць паўднёвую мяжу Полацкага княства і паўднёва-усходнюю Менскага. Асабліва інтэнсіўна жыццё працякала ў сярэдзіне XII – сярэдзіне XIII стагоддзя. Згодна сацыяльна-гістарычнай тыпалогіі гарадзішча Свіслач у XII – XIII стагоддзях можна з упэўненасцю аднесці да феадальнай сядзібы-замка. Адметным з'яўляецца тое, што каля гарадзішча адсутнічае селішча-спадарожнік гэтага часу, што часам расцэніваецца даследчыкамі як прыкмета памежных крэпасцей.


Падчас вывучэння помніка знойдзена вялікая колькасць керамічнага матэрыялу, побытавых рэчаў, прылад працы і рыбалоўства, зброя і рыштунак конніка, вырабы з рогу і косці, каляровага металу (мал. 5 – 14).




Мал. 5. Рэканструкцыя ганчарнага гаршчка





Мал. 6. Ганчарны посуд з падпадлогавай ямы






Мал. 7. Ганчарны посуд з падпадлогавай ямы







Мал. 8. Вырабы з гліны:
1 – 2 – горлы глякаў з палівай; 3 – арнаментаваная сценка




Мал. 9. Ганчарныя донцы з клеймамі




Мал. 10. Шыферныя праселкі




Мал. 11. Сякеры з падпадлогавай ямы (мал. М.А. Плавінскага)



Мал. 12: 1 – навершша мяча; 2 – аснова навершша мяча; 3 – крыжавіна; 4 – рэканструкцыя мяча (мал. М.А. Плавінскага)



Мал. 13. Вырабы з рога (1 – 4, 6) і жалеза (5): 1 – 2 – наканечнікі стрэлаў; 3 – 4 – пласціны ад налуччаў; 5 – кручок для падвешвання калчана; 6 – навершша



Мал. 14. Колт з каляровага металу

Адметным з'яўляецца тое, што раскопамі 2005 – 2007 гадоў даследаваны рэшткі вялікай спаленай пабудовы памерамі каля 10 × 8 м. Пабудова арыентавана па баках свету і фіксавалася па адзінкавым рэшткам абгарэлых бярвенняў, распаўсюджванню вугольля і нівеліровачнай праслойцы светла-жоўтым пяском. Цікавымі канструктыўнымі элементамі пабудовы з'яўляюцца ганак, які складаўся з двух вялікіх пляскатых камянёў, абпаленае бервяно з пятачнай адтулінай пад дзверы і падклет (?) (падпадлогавая яма ?) памерамі прыблізна 4,4 × 4,4 м і глыбінёй ад мацерыка 0,8 – 1,0 м. Хутчэй гэта магла быць наземная пабудова з падклетам (падпадлогавай ямай), не выключана што двухкамерная. Менавіта ў падпадлогавай яме было сабрана абпаленае зерне (па вызначэнню Д.І. Трацціякова, ячмень, жыта, проса, пустазелле), а таксама мноства археалагічных артэфактаў (фрагменты ганчарнага посуду, астэалагічны і іхціялагічны матэрыял, сякеры, фрагменты шкляных бранзалетаў, фрагмент амфары, невызначальныя вырабы з каляровага металу і інш.). У межах пабудовы сабрана асноўная колькасць бытавых рэчаў (нажы, нажніцы, замкі, ключы, долаты, шыферныя праселкі, варган, гіра ад бязмена), прылад працы (жорнавыя камні, порхліца, сашнік, цясло, фрагмент сярпа, рыбалоўны кручок), упрыгожванняў (шкляныя бранзалеты, сердалікавая пацерка, колт з каштоўнага металу), фрагмент т. зв. «багародзіцкага» энкалпіёна, прадметы

ўзбраення (фрагменты шпор, наканечнікі стрэл, шып булавы, навершша і скрыжаванне меча (тып Т1, «куршскі»), фрагменты шлема з паўмаскай (тып 4 паводле А. Кірпічнікава)).

Комплекс «эліtарных» матэрыялаў, атрыманых пры раскопках гэтай часткі гарадзішча, дазваляе гаварыць аб высокім сацыяльным статусе ўладальніка гэтых рэчаў (мясцовы феадал (баярын, князь ?)) і аб тым, што выяўленая пабудова належыла менавіта яму. Факт знішчэння гарадзішча ў вялізарным пажары адзначае і Э.М. Загарульскі. Лічым, што трагічнае знішчэнне паселішча ў пажары можна суаднесці з раптоўным уварваннем атрада мангола-татар недзе ў сярэдзіне XIII стагоддзя. Гэты факт даказваецца цэлай серыяй уласцівых ім наканечнікаў стрэл, жалезным кручком ад адкрытага калчана і касцяным навершшам дрэўка значка невялікага воінскага падраздзялення манголa-татар. Дакладны час знішчэння гарадзішча прапанаваць складана. Не выключана, што тут мы маем справу з паходам манголаў, які ўвогуле ніяк не адлюстраваны ў пісьмовых крыніцах. Тым не менш нам здаецца магчымым прапанаваць дзве найбольш верагодныя даты паходаў. Першая гэта 1239 год, калі качэўнікі разрабавалі Чарнігаўскую зямлю, у тым ліку шэраг паселішчаў на Беларусі – Гомель (Гомий) [16, с. 61, рис. 2: 19 – 21], Магілёў [17, с. 18, 67, 69 – 70 мал. 7б: 5, 53: 4 – 5] і невялікі атрад манголаў мог прадпрыняць рабаўнічы паход як у Верхняе Падняпроўе, так і на Сярэднюю Бярэзіну. Другая дата – 1258/59 гады, калі манголa-татарскі хан Бурундай ажыццявіў паход на Літву, прычым гэта дата выглядае найбольш «перспектыўнай», асабліва ўлічваючы тое, у якім кантэксце ўзгадваецца адзін з свіслацкіх князёў (больш падрабязна гл. [18]).

Галіцка-Валынскі летапіс падчас апісання паходу на яцвягаў кааліцыі князёў на чале з Данілам Галіцкім узгадвае князя *«Изяслава со Вислочи»* (1256 г.) *«По том Данило пойде на ятвязе съ братомъ и сыномъ Львом и съ Шсварномъ, младу сущу ему, и посла по Романа въ Новьгородок. И прійде к нему Романъ со всеми новгородци и с цтемъ своимъ Глебомъ и со **Изяславомъ со Вислоческымъ**... » «....И бысть рать велика, яко же наполнити болота ятвяжьскаа полкомъ»* [19, стб. 831; 20, стб. 707, с. 303]. Цяжка не заўважыць, што ўладанні часткі пералічаных князёў знаходзяцца дастаткова далёка ад Сярэдняй Бярэзіны і адпаведна горад (замак, крэпасць) князя Ізяслава трэба шукаць недзе на Панямонні. Аднак археалагічныя пошукі ў мясцовасцях з назвай Свіслач (скажонае *Віслач* (?)) так і не выявілі слядоў старажытнарускага паселішча як на Панямонні, так і ў вярхоўях ракі Свіслачы Дняпроўскай. Можна канстатаваць, што дагэтуль адсутнічае «прэтэндэнт» на ролю гэтага горада (замка, крэпасці), акрамя гарадзішча Свіслач. Грунтуючыся на гэтым, мы салідарызуемся з даследчыкамі [21, с. 43], якія атаясамліваюць летапіснае паведамленне са Свіслаччу, якая размешчана пры ўпадзенні аднайменнай рэчкі ў раку Бярэзіну.

Даніла Галіцкі на той час з'яўляўся фігурай, якая была здольная аб'яднаць старажытнарускія землі, і акрамя паходаў на балцкія землі ён змагаўся і з манголамі. Так, у канцы 1255 года Даніла Галіцкі атрымаў перамогу над ханам Курамсы [20, стб. 713, с. 309]. Не выключана, што паход кааліцыі князёў на яцвягаў 1256 года быў своеасаблівым выпрабаваннем новага саюзу, які мог быць накіраваны надалей супраць манголаў. У 1258 годзе хан Бурундай ажыццявіў паход на Літву, які, па сутнасці, быў дэманстрацыяй сілы Арды, аднак паход не быў накіраваны супраць Данілы, які нават сам быў запрошаны прыняць удзел у выправе (*«....аже миринъ, пойди съ мною»*). Адначасова паход Бурундая мог ставіць мэтай і пакаранне саюзнікаў і васалаў Данілa, у тым ліку і *«Изяслава со Вислочи»*. Можна дапусціць, што Даніла перад пагрозай мангольскага разарэння свайго княства прадэманстраваў сваю лаяльнасць перад манголамі і «ахвяраваў» качэўнікам сваіх былых саюзнікаў. Бурундай у сваю чаргу, акрамя рабаўніцтва Літвы, відаць, адправіў невялікія атрады для пакарання іншых удзельнікаў мяркуемай антыманголькай кааліцыі. У такім разе знішчэнне гарадзішча ў сярэдзіне XIII стагоддзя можна гіпатэтычна звязваць з паходам Бурундая 1258 года, які пакараў *«Изяслава со Вислочи»*.

Такім чынам, можна гаварыць аб асноўных выніках даследавання гарадзішча Свіслач у 2000, 2005 - 2008 гады:

- археалагічнымі раскопкамі апошніх гадоў выяўлена карціна разарэння гарадзішча Свіслач і знішчэння забудовы ў вялізарным пажарышчы. Менавіта ў ім і была зафіксавана цэлая серыя ўзбраення, сярод якой выразна выдзяляецца зброя «абаронцаў» і «захопнікаў» [18]. Атрыманыя матэрыялы дазволілі па-новаму паглядзець на гісторыю рэгіёна ў сярэдзіне XIII стагоддзя і скарэктаваць тэзіс, які замацаваўся ў беларускай гістарыяграфіі, аб ненападзе манголаў на тэрыторыю Беларусі;

- атрымана прадстаўнічая калекцыя археалагічных артэфактаў, якая з'яўляецца важнай крыніцай для ўзнаўлення асаблівасцей матэрыяльнага і духоўнага жыцця насельніцтва на паселішчы замкавага тыпу ў XII – XIII стагоддзях;

- лакалізавана пабудова ўладальніка (князя, баярына ?) гарадзішча Свіслач;

- падкарэктаваны тэзіс аб спецыфіцы забудовы замкавых пляцовак. Згодна даследаванням пляцоўка была забудавана не толькі па перыметру, але і па цэнтру;

- для помнікаў басейна р. Бярэзіны ўпершыню зроблена палеабатанічнае вызначэнне, выяўлена зерня;

- у выніку іхціялагічнага вызначэння ўстаноўлена наяўнасць асятровых відаў рыб у р. Бярэзіна і Свіслач у XII - XIII стагоддзях;

- астэалагічны аналіз перканаўча даказаў, што пераважную колькасць мяса насельніцтва Свіслачы атрымлівала ў выніку палявання, а не хатняй жывёлагадоўлі. Гэта з'яўляецца адлюстраваннем феадальнага характару паселішча (паляванне як адзін з відаў прывілегіяванага адпачынку) і характарызуе гаспадарчую стратэгію.

ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 694. – Воп. 7. – Спр. 936, арк. 1 - 31.
2. Даўгяла, Зьм. Ів. Сьвіслацкі замак у 1560 г. / Зьм. Ів. Даўгяла // Наш край. – Мінск, 1927. – № 6 – 7. – С. 60 – 64.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 3823 г, арк. 4 – 7 адв.
4. Опросные листы 1924 г. по Бобруйскому уезду. Басейн Березины (Бобруйск – Осиповичи). – Архіў археалагічнай навуковай дакументацыі ІГ НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 69.
5. Шутаў, С.С. Археолёгічныя разведкі на ніжняй Свіслачы ўлетку 1926 г. / С.С. Шутаў, М.М. Улащчык // Запіскі аддзела гуманітарных навук Беларускай Акадэміі навук. – Мінск, 1930. – Кн. 11. Працы археалагічнай камісіі. – Т. 2. - С. 105 – 120.
6. Скрыпчанка, Т.С. Свіслацкія шкляныя бранзалеты / Т.С. Скрыпчанка // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. – Мінск, 1980. – № 3. – С. 66 – 71.
7. Гаврилюк, Н. Стеклянные изделия Свислочского замка (по материалам раскопок 1969, 1970 гг.) / Н. Гаврилюк // Тез. III регион. студенч. археолого-этнограф. конф. вузов северо-запада СССР. – Рига, 1971. – С. 40 – 42.
8. Ільюцік, А.У. Справаздача аб археалагічных раскопках на гарадзішчы Свіслач Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў 2000 г. / А.У. Ільюцік, В.І. Кошман // Архіў археалаг. навук. дакументацыі ІГ НАН Беларусі. – Спр. 1873.
9. Кошман, В.І. Справаздача аб археалагічных раскопках на гарадзішчы Свіслач і палявых работах у Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці ў 2007 г. / В.І. Кошман // Архіў археалаг. навук. дакументацыі ІГ НАН Беларусі. – Спр. 2502.
10. Кошман, В.І. Справаздача аб археалагічных раскопках на гарадзішчы Свіслач (Асіповіцкі р-н) і палявых работах у Асіповіцкім (Магілёўская вобл.) і Бярэзінскім раёнах (Мінская вобл.) у 2008 г. / В.І. Кошман // *у працэсе напісання.*
11. Кошман, В.І. Справаздача аб археалагічных раскопках на селішчы Капланцы (Бярэзінскі р-н) і гарадзішча Свіслач (Асіповіцкі р-н) у 2005 г. / В.І. Кошман // Архіў археалаг. навук. дакументацыі ІГ НАН Беларусі. – Спр. 2298.
12. Кошман, В.І. Справаздача аб археалагічных раскопках на селішчы Капланцы (Бярэзінскі раён Мінскай вобласці) і гарадзішчы Свіслач (Асіповіцкі раён Магілёўская вобласць) у 2006 г. / В.І. Кошман // Архіў археалаг. навук. дакументацыі ІГ НАН Беларусі. – Спр. 2335.
13. Ильютик, А.В. Керамика городищ железного века бассейна Березины / А.В. Ильютик // Гіст.-археалаг. зб. – 1998. – № 13. – С. 25 – 39.
14. Кошман, В.І. «Свіслацка-бярэзінскі» мікрарэгіён у X – XIII стст. / В.І. Кошман // Археалогія эпохі сярэдневякоўя (да 75-годдзя з дня нараджэння П.Ф. Лысенкі): матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2006. – № 12. – С. 154 – 161.
15. Кошман, В.І. Паселішчы міжрэчча Бярэзіны і Дняпра ў X – XIII стст. / В.І. Кошман. – Мінск, 2008.
16. Макушников, О.А. Основные этапы развития летописного Гомия (до середины XIII в.) / О.А. Макушников // Проблемы археологии Южной Руси: материалы ист.-археолог. семинара «Чернигов и его округа в IX - XIII вв.». – Киев, 1990. – С. 56 – 62.
17. Марзалюк, І.А. Магілёў у XII – XVIII стст. Людзі і рэчы / І.А. Марзалюк. – Мінск, 1998.
18. Кошман, В.І. Прадметы ўзбраення з гарадзішча Свіслач (па матэрыялах раскопак 2000, 2005 – 2007 гг.): да пытання аб мангольскіх нападах на тэрыторыю Беларусі ў сярэдзіне XIII ст. / В.І. Кошман, М.А. Плавінскі // Acta Archaeologica Albaruthenica. – Мінск, 2008. – Vol. IV. – С. 85 – 110.
19. Ипатьевская летопись. ПСРЛ. – Т. II. – М., 2001.
20. Галицко-Волынская летопись. Текст. Комментарий. Исследование / под ред. Н.Ф. Котляра. – СПб., 2005.
21. Насевіч, В.Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы / В.Л. Насевіч. – Мінск, 1993.

ИТОГИ, ЗАДАЧИ И ПЕРСПЕКТИВЫ АРХЕОЛОГИЧЕСКОГО ИССЛЕДОВАНИЯ ПОЛОЦКА И ЕГО ОКРУГИ

д-р ист. наук О.Н. ЛЕВКО
(Институт истории НАН Беларуси, Минск)

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 647 от 17.12.2007 г. в рамках Комплексной программы развития Полоцка на 2008 – 2012 годы и в связи с его 1150-летием поставлена задача изучения Полоцкой земли, которая открывает новые возможности перед белорусскими археологами. Подводится итог исследованиям, осуществленным на территории города и его округи на протяжении 80 лет. Определяются вопросы, требующие первоочередного изучения, вырабатывается стратегия их решения, а также использования историко-археологического наследия в современных условиях.

Выполнение пункта 23 Комплексной программы «Организация работы постоянно действующей археологической экспедиции по изучению Полоцкой земли» возложено на Институт истории Национальной академии наук Беларуси при участии Полоцкого государственного университета и Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника.

Введение. Древний Полоцк вполне обоснованно притягивает постоянное внимание не только белорусских исследователей, но и наших коллег из ближнего зарубежья. На карте Восточной Европы он отмечен в числе наиболее ранних городов, таких как Киев, Новгород, Ладога и другие, известных по летописным сообщениям, а также в результате полевых исследований. Сегодня Полоцк также актуален, как и много веков назад, еще и потому, что он не только стоял у истоков государственности на территории Беларуси и играл значительную роль в этом процессе в рамках всей Восточной Европы, но и был одним из важнейших звеньев в разветвленной системе трансъевропейских путей, открывших возможность широкого общения между странами и народами.

Основная часть. IX – XIII века – время становления древнего Полоцка как колыбели государственности, духовности и культуры белорусов. Историко-культурное наследие, оставленное нам полочанами, формировалось в рамках славянских традиций и в то же время под влиянием многих народов, с которыми они вступали в контакты.

Контакты эти были разнообразны: от дипломатических миссий и военных столкновений до мирного торгового обмена и передачи опыта в производственной сфере и искусстве. И многое из того, чему научились жители древней белорусской земли, было привито им благодаря живому общению с иноземцами, прибывавшими сюда по нашим рекам. Междуречье Днепр – Двина – Неман и Припять привлекали внимание викингов, которых на восточнославянских землях называли «варягами».

Но это был не только путь, соединяющий север с югом и запад с востоком, а главным образом и в первую очередь путь духовного единения, укрепления и развития славянских традиций на всем пространстве Восточной Европы.

Проблемы, затрагивающие вопросы взаимоотношений населения белорусских земель со Скандинавией в эпоху викингов (конец VIII – начало XII в. н.э.), достаточно давно рассматриваются в отечественной историографии, хотя и не получили однозначной оценки. Уже в середине XIX века графы Евстафий и Константин Тышкевичи, анализируя древности, которые к ним попали в результате раскопок в Центральной Беларуси, пришли к выводу, что некоторые типы вооружения и украшений являются предметами импорта из Скандинавии или сделаны по их образцу. Историки-краеведы, а позднее и ученые Института истории АН БССР (НАН Беларуси) продолжили изучение истоков и поиск аналогий ряда предметов с территории Беларуси в Северной Европе. На этой работе следует сконцентрировать внимание и сейчас, чтобы взвешенно и объективно оценить вклад каждой страны в историко-культурное развитие восточноевропейского пространства в целом.

На рубеже XIX – XX веков наряду с использованием археологического материала стали изучать письменные источники. Много внимания уделял этому вопросу известный витебский исследователь средневекового документального материала А. Сапунов – автор собраний документов «Витебская старина» и книги «Река Западная Двина». Скандинавские источники по ранней истории Полоцка представлены сагами. Переводы «Саги об Эймунде» на русский язык выполнены О.И. Сенковским и Е.А. Рыдзевской. Синтез археологических и письменных источников позволил белорусским исследователям определить характер участия выходцев из Скандинавии в политических событиях, связанных с развитием Полоцкого княжества в X – XI веков [1].

Подвержен критическому анализу и рассказ о Святохне, опубликованный В.Н. Татищевым в «Истории Российской» и датируемый им 1217 годом [2]. К сожалению, вопросы, освещающие взаимоотношения населения с территории Беларуси (и в том числе Полоцкой земли) с выходцами из стран Северной и Центральной Европы в средневековье, в настоящее время мало разработаны в отечественной истории, следствием чего является появление монографий спекулятивного характера [3].

Со второй половины XX века увеличение объемов археологических исследований в Беларуси позволило накопить новый материал по проблеме связей с Северной Европой. Весьма ценные коллекции были получены белорусскими учеными при раскопках древнего комплекса в Лукомле (городище, селище, курганные могильник), который изучал Г.В. Штыхов, городища и селища Прудники в Миорском районе (раскопки В.И. Шадыро). Уникальные находки рунических надписей выявлены Л.В. Дучиц на городище Масковичи в Браславском Поозерье. Следы контактов со скандинавами зафиксированы и в северо-восточной Беларуси при раскопках Витебска (Г.В. Штыхов, Т.С. Бубенько), Оршанского Поднепровья (О.Н. Левко). В Центральной Беларуси они присутствуют на городище Менка и в курганных могильниках окрестностей Минска (Озерцо, Дудовка, курганы в Избище). В Белорусском Понеманье варяжские предметы выявлены в Волковыске (раскопки В.Р. Тарасенко, Я.Г. Зверуго), на городище Кульбачино (работы С. Пивоварчика). Во время работ В.С. Вергей и О.В. Иова на городище под Пинском, а также на городище Франополь в Полесье были обнаружены следы пребывания здесь варягов. Новый этап исследований по проблеме взаимоотношений белорусских земель с северными соседями дополняется и вопросами, которые необходимо еще решить в рамках развития богатых традиций всего славянского населения Восточной Европы и его контактов с южными странами в период функционировавшего пути «из варяг в греки».

На прошедшей в г. Полоцке в мае 2008 года международной научно-практической конференции **«Из варяг в греки: историко-культурный транзит через Беларусь. Традиции и перспектива»** были рассмотрены ключевые аспекты историко-культурного осмысления древнего пути «из варяг в греки», позволившие констатировать следующее:

1) *зона прохождения древнего пути по территории Беларуси* согласно письменным источникам – современные Витебская, Могилевская, Гомельская области по рекам Западная Двина и Днепр (восточная часть Беларуси). *Время исторического функционирования данного пути* (в соответствии с названием): IX – XI века;

2) в северной своей части данный путь связывает Скандинавию, Россию и Беларусь, в южной части – Беларусь, Украину, Грецию. Таким образом, *Беларусь является срединной частью* этого пути.

Анализ письменных и археологических источников показывает, что путь «из варяг в греки» служил нескольким исторически важным целям. Во-первых, это *путь приобщения народов севера, и в том числе Скандинавии, к европейской цивилизации,* колыбелью которой была Византия (культурный и торговый аспекты). Во-вторых, это *путь военных походов и государственного строительства в Восточной Европе* (военно-политический аспект). И, наконец, в-третьих, это *путь приобщения язычников к христианству* (духовный аспект).

Названные и некоторые другие аспекты оказали решающее влияние на возникновение и становление государственности на белорусских землях, прежде всего на формирование Полоцкого княжества, которое со временем территориально и структурно оформилось в Полоцкую землю. В Киеве, Новгороде, Полоцке прослежена единая форма законодательной основы государственных структур, нашедшей отражение в летописных известиях и «Русской правде». Экономический подъем отмечен развитием ремесел, торгового обмена на всей территории Восточной Европы и в том числе Беларуси. О переменах в духовной жизни населения свидетельствует внедрение христианства в православной форме. В Полоцке в середине XI века строится Софийский собор, одноименный и равнозначный Киевскому и Новгородскому храмам.

Выявленный в пределах очерченного пространства и имеющийся к настоящему времени в распоряжении ученых *археологический материал* свидетельствует о многообразии связей, имевших важное значение для истории населения этого пространства от самого севера Скандинавского полуострова до юга Европы, Царьграда-Константинополя, столицы Византийской империи и до Средиземного моря. Народы, живущие здесь сегодня, тесно сотрудничают в рамках большого числа европейских и других международных организаций. Их связи основаны на устойчивом фундаменте общего культурного и исторического прошлого.

Предварительные научные исследования позволяют утверждать, что возрождение «пути из варяг в греки» на новой, современной основе в качестве международного туристического маршрута еще более будет способствовать развитию экономического сотрудничества, содействовать усилению культурного обмена и одновременно укреплять сложившиеся традиции в отдельных регионах посредством их представления друг другу.

К настоящему времени проблема «пути из варяг в греки» *как самостоятельное научное направление в Беларуси* еще не получила должной научной разработки. Имеются лишь общие сведения письменных источников о движении военно-торговых отрядов, а также ряд археологических материалов (клады, отдельные предметы), указывающих на главные направления этого движения по водным магистралям. В научном плане особого внимания заслуживает Двинско-днепровское направление (Полоцк, Городок, Витебск, Орша, Могилев, Гомель), вблизи которых сосредоточены клады IX – XI веков, четко прослеживаются древние волоки и поселения, их обслуживавшие, а также могильники, относящиеся к этим поселениям.

С целью получения полноценной научной информации, которую можно будет использовать для реконструкции исторически важных участков пути «из варяг в греки» в пределах Беларуси и их внедре-

ния в сферу организации туризма, необходимо разработать долгосрочную комплексную программу научно-практических мероприятий, включающую полевые научные исследования, историко-культурные реконструкции, их реализацию через туристические зоны. Весь комплекс мероприятий, осуществляемых на территории Беларуси, должен находиться во взаимосвязи с разработками в этом направлении в других странах-участницах предполагаемого международного проекта.

О том, что существует вполне конкретный интерес северных стран к развитию культурно-туристических связей с Беларусью на современном этапе, свидетельствуют визиты в нашу страну губернатора острова Готланд и заключение договоров о намерениях с властными структурами Витебской области и Институтом истории НАН Беларуси, предусматривающих также обмен научными экспедициями.

Полоцк являлся важным объектом и на стадии формирования законодательной основы международных торговых отношений по р. Западной Двине, связывающей страны Западной Европы с восточноевропейскими в XII – XVIII века. На ряду со Смоленском и Витебском он вступает во взаимоотношения с Ригой и «немецким берегом» (впоследствии города Ганзейского союза) в качестве одного из контрагентов западноевропейского купечества на основе договоров, определяющих общие правила торговли в Двинском бассейне. Позднее, когда в Полоцке основана немецкая торговая фактория, город становится ведущим торговым пунктом Белорусского Подвинья с западными странами [4].

Нельзя достоверно проследить и определить роль и значение города в исторических процессах региона в целом (Восточная Европа) и в пределах связанной исторически с этим городом конкретной территории (Полоцкая земля), если не вникнуть в суть преобразований, происходивших на данной территории в течение многих веков. Для решения проблемы поэтапного формирования раннегосударственной структуры необходимо проведение археологических исследований не только в зоне расположения древнейших напластований культурного слоя самого Полоцка. Следует изучить также взаимосвязь складывающегося городского организма с округой. Грань между раннегосударсвенным и племенным институтами власти слабо просматривается на археологических материалах одного объекта. Письменные же источники лишь фиксируют какой-то свершившийся факт (не всегда достоверный), что также не позволяет проследить череду событий, его подготовивших. И только если сопоставить все имеющиеся в наличии вещественные источники по развитию округи и ее центра во взаимосвязи, можно говорить о периоде качественного преобразования одной структуры в другую. Поэтому насущной задачей в изучении Полоцкой земли является исследование всех видов памятников ближайшей округи Полоцка, относящихся к стадии его формирования как центра данной округи. Проведенные на основе уже имеющихся данных исторические реконструкции древнейшего периода Полоцкого государственного образования [5] необходимо дополнить и развить на основе новых фактических материалов.

И, наконец, вполне очевиден тот факт, что при достаточно полно изученном развитии топографической структуры Полоцка в эпоху средневековья [6, 7] требуется не менее скрупулезное изучение огромного количества накопленных за многие годы исследований разнообразных артефактов, большинство из которых представляют фонды историко-культурного заповедника.

Есть вопросы, требующие своего рассмотрения и в рамках развития архитектурного наследия Полоцка. Многие культовые комплексы, а также известные по письменным источникам здания, представлявшие гражданскую архитектуру, еще мало, а то и вовсе не исследованы и даже не установлено их местонахождение.

Заключение. Означенный в круг вопросов не является исчерпывающим при решении проблемы изученности Полоцкой земли как комплекса историко-культурного наследия Беларуси в эпоху средневековья. Однако сама возможность обозреть данную проблему под новым углом позволит раскрыть новые аспекты в историческом развитии Полоцка и его округи.

ЛИТЕРАТУРА

1. Заяц, Ю.А. Полоцкие события «Саги об Эймунде» / Ю.А. Заяц // Полоцкий летописец. Ист.-литератур. журнал. – Полоцк, 1993. – № 1 (2). – С. 5 – 11.
2. Заяц, Ю.А. К вопросу о достоверности татищевского рассказа о Святохне / Ю.А. Заяц // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2000. – № 15. – С. 106 – 115.
3. Катлярчук, А. Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў / А. Катлярчук. – Вільня, 2007. – 303 с.
4. Левко, О.Н. Торговые связи Витебска в X – XVIII вв. / О.Н. Левко. – Минск, 1989. – 87 с.
5. Левко, О.Н. Начальный этап формирования Полоцкого государства / О.Н. Левко // Полацк: карані нашага радавода. Полацкая зямля як сацыякультурная прастора ўзнікнення і развіцця беларускага этнасу і нацыянальнай дзяржаўнасці: міжнар. навук. канф. 5 – 6 верас. 1995 года. – Полацк, 1996. – С. 36 – 41.
6. Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 183 с.
7. Дук, Д.У. Полацк XVI – XVIII стагоддзяў: Нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва Беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк, 2007. – 267 с.

АБУТКОВЫЯ ПАДКОЎКІ XV – XVIII СТАГОДДЗЯЎ
(ПА МАТЭРЫЯЛАХ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У ГОРАДЗЕ ПОЛАЦКУ Ў 2000 – 2008 ГАДЫ)

І.У. МАГАЛІНСКІ
(Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік)

На падставе аналізу рэчавых крыніц і навуковай літаратуры ў артыкуле робіцца спроба стварэння тыпалагічнай схемы развіцця абутковых падковак па матэрыялах археалагічнага вывучэння г. Полацка ў 2000 – 2008 гадах. У ходзе даследавання робіцца выснова, што самымі важнымі крытэрыямі вылучэння асобных тыпаў і відаў дадзенай катэгорыі артэфактаў з'яўляюцца форма аснавання і спосаб яго мацавання да абцаса. Разглядаючы спосаб мацавання ў якасці характарыстыкі, вытворнай ад формы аснавання, аўтар прапаноўвае новы варыянт тыпалогіі абутковых падковак, заснаваны на карэляцыі абодвух гэтых крытэрыяў.

Уводзіны. Адну з найбольш прадстаўнічых частак калекцыі полацкіх чорнаметалічных артэфактаў, што захоўваецца ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (далей – НПГКМЗ), складаюць абутковыя падковкі. Абутковая падкоўка – гэта найбольш універсальнае прыстасаванне для абароны абцасаў абутку ад сцірання. Гэтая група артэфактаў мела важнае функцыянальнае прызначэнне і праіснавала да апошніх дзесяцігоддзяў XX ст., калі патрэба ў ёй адпала ў сувязі з выкарыстаннем для вырабу абутковых абцасаў сучасных высокатрывалых матэрыялаў [1]. Абутковыя падкоўкі ўяўляюць сабой узор масавай вытворчасці, якая павінна была задавольваць патрэбы ў гэтым відзе вырабаў кожнага жыхара горада. Дадзеная акалічнасць абумовіла вялікую частату іх выяўлення ў познесярэднявечных слаях беларускіх гарадоў, у тым ліку і ў Полацку (у сярэднім па адным экземпляры на кожныя 4 кв. м напластаванняў XVII – XVIII стст.) [2, с. 156]. Натуральна, што масавы характар вырабу абутковых падковак прадугледжваў існаванне дастаткова ўстойлівых іх форм, якія змяняліся ў адпаведнасці са зменай формы саміх абцасаў. У сувязі з гэтым узнікае магчымасць вылучэння з усяго масіву дадзенай катэгорыі вырабаў пэўных відаў і тыпаў паводле часу бытавання, функцыянальных і марфалагічных прыкмет. Створаную на гэтай глебе тыпалагічную схему полацкіх абутковых падковак можна будзе выкарыстоўваць у якасці важнага дапаможнага сродка для даціроўкі культурнага слоя не толькі Полацка, але і іншых беларускіх гарадоў.

У гэтай рабоце прапануецца новы варыянт тыпалогіі абутковых падковак з г. Полацка. Адпаведна, асноўным матэрыялам для напісання артыкулу паслужылі вырабы, якія былі выяўлены падчас археалагічных даследаванняў горада за 2000 – 2008 гады (археалагічнае вывучэнне праводзілася экспедыцыямі ІГ НАН Беларусі пад кіраўніцтвам Д.У. Дука) [3, 4]. Акрамя таго, пэўная частка рэчавых матэрыялаў, выкарыстаных у працы, была ўзята з прыватнай калекцыі навуковага супрацоўніка навукова-рэстаўрацыйнага аддзела НПГКМЗ А.А. Салаўёва, якая ў цяперашні час захоўваецца ў фондах запаведніка. Для аналізу і навуковай апрацоўкі намі былі адабраны толькі падкоўкі найбольш добрай захаванасці, якія дазваляюць зрабіць максімальную колькасць дакладных статыстычных вымярэнняў і падлікаў. Дзякуючы гэтаму стала магчымым улічыць розныя варыянты падковак (усяго звыш 50 экземпляраў), што дазволіла павысіць узровень навуковай аб'ектыўнасці зробленых у працы высноў.

Такім чынам, мэтай работы з'яўляецца стварэнне тыпалогіі абутковых падковак па матэрыялах археалагічных даследаванняў г. Полацка ў 2000 – 2008 гады. Для яе вырашэння ставяцца наступныя задачы:

1) прааналізаваць асноўныя падыходы даследчыкаў да пытання тыпалогіі абутковых падковак;

2) вылучыць асноўныя крытэрыі падзелу гэтай катэгорыі вырабаў на асобныя віды і тыпы;

3) стварыць тыпалогію абутковых падковак.

Гістарыяграфія. Нягледзячы на вялікую значнасць дадзенай групы артэфактаў для даціроўкі культурнага слоя і комплексаў знаходак, пэўную ўвагу на яе пачалі звяртаць толькі ў адносна нядаўні час. Гэта звязана з тым, што ў ранейшы перыяд развіцця археалагічнай навукі найбольшае значэнне надавалася вывучэнню помнікаў і артэфактаў старажытнарускага часу, тады як познесярэднявечныя матэрыялы заставаліся па-за ўвагай навукоўцаў. Для вызначэння кола характарыстык абутковых падковак, якія могуць скласці аснову для стварэння тыпалогіі гэтай катэгорыі вырабаў, разгледзім падыходы розных даследчыкаў да іх вылучэння.

Адным з першых у кантэксце даследавання жалезаапрацоўваючага рамяства старажытнага Ноўгарада ўвагу азначанай праблеме надаў Б.А. Колчын. За аснову тыпалагізацыі ім быў прыняты спосаб мацавання падковак да абцаса, на падставе якога даследчыкам было вылучана два тыпы вырабаў: 1) на шыпах; 2) на цвіках. Першы тып ён звязваў з абуткам на звычайным шырокім абцасе, а другі – з абуткам на вузкім, высокім абцасе. Па Б.А. Колчыну, абодва тыпы існавалі ў XIV – XV стагоддзях, прычым падкоўкі «на цвіках» ён лічыў больш познімі [5, с. 108, 110].

У кантэксце вывучэння скураной вытворчасці старажытнага Ноўгарада пэўную ўвагу абутковым падкоўкам надала С.А. Ізюмава, якая назвала іх «жалезнымі абцасавымі набойкамі» і аднесла з'яўленне гэтай катэгорыі вырабаў да XIV стагоддзя [6, с. 214].

Адна з першых спецыяльных прац па гісторыі кавальскага рамяства і яго прадукцыі ў XVI – XVII стагоддзях была напісана А.У. Нікіціным. Ім была праведзена спроба тыпалагізацыі абутковых падковак па спосабу мацавання іх да абцаса. Як і Б.А. Колчын, А.У. Нікіцін вылучае падкоўкі для высокіх (набіўныя) і нізкіх (уразныя) абцасаў, але акрамя гэтага ўказвае на існаванне яшчэ аднаго тыпу – камбінаваных падковак. Вырабы такога кшталту мацаваліся з дапамогай не толькі шыпоў, але і цвікоў і з'яўляліся, як падаецца, **пераходным тыпам ад уразных да набіўных падковак [7, с. 42].**

Праблема вылучэння найбольш важных характарыстык абутковых падковак, неабходных для стварэння надзейнай тыпалагічнай схемы іх развіцця, прывяло да спробы комплекснага аналізу дадзенай катэгорыі вырабаў. Такі аналіз быў прапанаваны расійскімі археолагамі А.Г. Векслерам, Ю.А. Ліхтэрам і Д.А. Осіпавым у сумесным артыкуле [1]. Абапіраючыся на матэрыялы раскопак г. Масквы, аўтары прапанавалі некалькі тыпалогій абутковых падковак, заснаваных на карэляцыі найбольш важных іх характарыстык. Такі падыход дазволіў не толькі ўлічыць усе магчымыя варыянты форм падковак, але спрагназіраваць і такія, якія пакуль яшчэ невядомыя археалагічнай навуцы. Калі прагнозы даследчыкаў будуць падмацаваныя рэальнымі знаходкамі, то гэтую схему будзе варта браць за ўзор усім археолагам.

У беларускай археалагічнай навуцы адну з першых спроб стварэння тыпалагічнай схемы развіцця абутковых падковак на матэрыялах раскопак г. Віцебска зрабіла В.М. Ляўко. Пры падзеле гэтай групы вырабаў на асобныя тыпы ёю ўлічваўся не толькі спосаб мацавання іх да абцасу, але і характарыстыкі формы аснавання (вышыня і шырыня). Даследчыцай было вылучана два віды падковак: 1) з шыпамі і 2) з адгулінамі. Кожны з відаў у сваю чаргу падзяляецца на тры тыпы ў залежнасці ад формы аснавання і ступені ахопу абцаса. Абутковыя падкоўкі з Віцебска, арыентуючыся на наўгародскія матэрыялы, В.М. Ляўко датуе XIV – XVIII стагоддзямі [8, с. 48]. У прыведзенай тыпалогіі найбольш важным крытэрыем лічыцца спосаб мацавання падкоўкі да абцаса абутку, у той час як іншыя яе прыкметы выступаюць у ролі другасных, што ствараюць аснову для вылучэння больш дробных таксанамічных катэгорый паводле характарыстык аснавання.

Акадэмічная версія тыпалогіі абутковых падковак прадстаўлена ў адпаведным артыкуле Г.М. Сагановіча, які размешчаны ў 4 томе фундаментальнай «Археалогіі Беларусі», а таксама ў шэрагу яго артыкулаў і спецыяльных даследаванняў [9 – 12]. Крытэрыямі падзелу гэтай групы артэфактаў на тры тыпы, па меркаванню аўтара, з'яўляюцца спосаб мацавання да абцаса, форма аснавання і папярочнае сячэнне дугі. Г.М. Сагановіч вылучае тры тыпы падковак: 1) з высокай пласцінападобнай асновай, выгнутай у дугу па перыметры абцаса, з трыма шыпамі; 2) дугападобныя шыпавыя падкоўкі, аснова якіх сплюшчана гарызантальна і мае сячэнне прамавугольніка ці квадрата; 3) бясшыпныя падкоўкі [9, с. 271].

На сучасным этапе развіцця археалагічнай навукі даследчыкі матэрыяльнай культуры беларускіх гарадоў XV – XVIII стагоддзяў пастаянна звяртаюць увагу на дадзеную групу вырабаў з чорных металаў, распрацоўваючы іх тыпалогію [13, 14]. Так, В.С. Пазднякоў на матэрыялах археалагічных даследаванняў старажытнага Клецка вылучыў 5 груп абутковых падковак (за аснову іх вылучэння былі ўзяты форма аснавання і спосаб мацавання да абцаса): 1) падкоўкі, моцна сплюшчаны па вертыкалі, з трыма шыпамі (XVI - XVII стст.); 2) пласцінкі, утвораныя квадратным у сячэнні дротам (XVI ст.) з трыма шыпамі; 3) плоскія гарызантальныя пласціны з трыма шыпамі (XVII ст.); 4) квадратныя ў сячэнні пласціны з трыма адгулінамі (XVII – XVIII стст.); 5) плоскія, гарызантальныя з чатырма адгулінамі для цвікоў (XVIII – XIX стст.) [15, с. 67 – 68].

У кантэксце нашага даследавання найбольшую цікавяць уяўляюць спробы тыпалагізацыі абутковых падковак, якія былі праведзены на полацкіх матэрыялах. Першая такая спроба была прадстаўлена ў сумесным артыкуле Д.У. Дука і А.А. Салаўёва аб гарбарным рамястве Полацка XVI – XVIII стагоддзяў. У дадзенай працы была прапанаваная адмысловая тыпалогія абутковых падковак, заснаваная на ступені ахопу абцаса, спосабе мацавання і форме пласціны. Паводле першага крытэрыя аўтарамі былі вылучаныя тры варыянты падковак («А», «Б», «В»), якія ў сваю чаргу падзяляліся на тры тыпы ў залежнасці ад формы пласціны і спосабу яе мацавання да абцаса [16].

Яшчэ адна спроба тыпалогіі абутковых падковак з Полацка прадстаўлена ў манаграфіі Д.У. Дука «Полацк XVI – XVIII стст.: нарысы...». У дадзенай рабоце галоўнымі крытэрыямі былі абраны спосаб мацавання падковак да абцасу і форма аснавання. На гэтай падставе вылучаюцца чатыры тыпы вырабаў: 1) высокія з пласцінчатай асновай, якія мацаваліся пры дапамозе трох шыпоў (XV – XVI стст.); 2) дугападобныя, шыпавыя з квадратнай у сячэнні асновай (XVI – XVII стст.); 3) камбінаваныя (XVII – XVIII стст.); 4) набіўныя (XVII – XVIII стст.) [2, с. 156 – 157].

Такім чынам, за перыяд даследаванняў абутковых падковак у савецкай і найноўшай беларускай археалагічнай навуцы не склалася адзінага погляду на крытэрыі падзелу гэтай групы артэфактаў на асобныя тыпы. Амаль кожны даследчык матэрыяльнай культуры беларускага познесярэднявечнага горада імкнецца стварыць сваю тыпалогію, заснаваную на самастойна вылучаных крытэрыях, якія б у найбольш поўнай ступені раскрывалі натуральныя сувязі, рэальна існуючыя паміж асобнымі экземплярамі дадзенай катэгорыі вырабаў. Між тым такая стракатасць падыходаў не з'яўляецца крокам назад у вырашэнні праблемы. На нашу думку, яна толькі набліжае магчымасць стварэння найбольш прыймальнай тыпалагічнай схемы развіцця не толькі для абутковых падковак, але і іншых груп артэфактаў.

Асноўная частка. З усіх крытэрыяў, што склалі б надзейную аснову для стварэння аптымальнай тыпалогіі абутковых падковак, паспрабуем вылучыць тыя, якія найбольш часта выкарыстоўваюцца айчыннымі і замежнымі навукоўцамі пры стварэнні ўласных схем: 1) спосаб мацавання падкоўкі да абцаса; 2) форма аснавання (вышыня, шырыня, таўшчыня, папярочнае сячэнне); 3) ступень ахопу абцаса. Найбольш істотнымі, з функцыянальнай кропкі гледжання, падаюцца першыя два. Ступень ахопу абцаса на нашу думку не з'яўляецца вызначальнай характарыстыкай абутковых падковак, бо яна дубліруецца іншымі, больш універсальнымі прыкметамі.

Такім чынам, асновай для вылучэння храналагічных і функцыянальных груп сярод гэтай катэгорыі вырабаў будуць служыць такія характарыстыкі як форма аснавання і спосаб мацавання да абцаса. Між тым для таго, каб пазбегнуць парушэння аднаго з галоўных правілаў лагічнай працэдуры дзялення (дзяленне павінна праводзіцца толькі па адным аснаванні) у якасці асновы падзелу абутковых падковак на віды і тыпы варта ўзяць толькі адзін з крытэрыяў [17, с. 115]. У нашым даследаванні такой характарыстыкай будзе з'яўляцца форма аснавання падкоўкі. Натуральна, што дадзеная прыкмета не з'яўляецца аднароднай, складаючыся з некалькіх (вышыня, форма выгіну, шырыня, сячэнне). Найбольш важнай з функцыянальнай і храналагічнай кропкі гледжання ўяўляецца размяшчэнне аснавання ў прасторы – у вертыкальнай ці гарызантальнай плоскасці. Менавіта гэтая характарыстыка пакладзена ў аснову падзелу падковак на асобныя віды, у той час як іншыя параметры формы аснавання выкарыстоўваюцца для вылучэння варыянтаў. Спосаб мацавання абутковых падковак да абцаса ў нашым даследаванні разглядаецца як характарыстыка, вытворная ад формы аснавання і непасрэдна з ёй звязаная.

Прызнаючы форму аснавання вядучай характарыстыкай абутковай падкоўкі, мы зыходзілі з функцыянальнай значнасці таго ці іншага яе элементу. У сувязі з гэтым варта адзначыць, што форма аснавання адыгрывала найбольш важную ролю ў выкананні падкоўкай сваіх функцыянальных задач, бо менавіта дадзеная частка вырабу непасрэдна адказвала за захоўванне цэласнасці абцаса пры яго кантакце з зямлёй. Такім чынам, спосаб мацавання варта разглядаць выключна як вытворную характарыстыку, што знаходзілася ў прамой залежнасці ад формы аснавання. На нашу думку, такі падыход у найбольш поўнай ступені адлюстроўвае натуральныя ўзаемасувязі, што існуюць паміж асобнымі экземплярамі гэтай катэгорыі вырабаў.

Для стварэння тыпалогіі будзем карыстацца наступнымі тэрмінамі: від, варыянт, тып, падтып. Асновай вылучэння відаў і тыпаў з'яўляецца наяўнасць у калекцыі не менш як трох абутковых падковак з аднолькавымі марфалагічнымі і функцыянальнымі характарыстыкамі [18]. Вырабы, якія былі сустрэты намі ў адзінкавых экземплярах, у тыпалогіі ўлічаны не былі.

Уся маса абутковых падковак з Полацка падзяляецца на два вялікія віды паводле размяшчэння аснавання (пласціны) ў прасторы:

I. Пласціна, сплюшчаная ў вертыкальнай плоскасці.

II. Пласціна, сплюшчаная ў гарызантальнай плоскасці (малюнак).

Дадзеныя прыкметы ў найбольшай ступені характарызуюць функцыянальныя і храналагічныя адрозненні паміж падкоўкамі.

Так, падкоўкі першага віду (від I) уяўляюць сабой высокую, трохшыпную пласціну. Акрамя сваёй галоўнай функцыі – ахоўвання абцасу ад сцірання – яна выконвала яшчэ і дадатковую – прымацоўвала яго скураныя пласцінкі да падэшвы (малюнак: 1 – 4).


Другі від (малюнак: 5 – 19) уключае ў сябе падкоўкі з аснованнем, сплюшчаным у гарызантальнай плоскасці. Падкоўкі з пласцінамі вышэй за 1 см (уключна) будзем адносіць да віду I.

У межах віду II выдзяляецца некалькі варыянтаў паводле сячэння аснавання і яго шырыні. Варыянт II.1. (малюнак: 5 - 13) характарызуецца чатырохграннай пласцінай (сюды ўваходзяць квадратныя і прамавугольныя ў сячэнні пласціны, не шырэйшыя за 1 см), а варыянт II.2. – шырокай і плоскай пласцінай (малюнак: 14 – 19).

Гэтыя віды дастаткова добра карэлююцца з адпаведнымі тыпамі і падтыпамі паводле спосабу мацавання да абцаса (табліца). Тып А (малюнак: 5 – 11, 14 – 16) уяўляе сабой т. зв. «уразныя» падкоўкі, якія мацаваліся да абцаса з дапамогай двух (тып А I) ці трох (тып А II) шыпоў. Дадзены спосаб мацавання быў характэрным не толькі для падковак віду I, але і для віду II. Прычым падкоўкі тыпу А I (малюнак 1: 5 – 7) былі ўласцівыя толькі для віду II.1.

Тып В (малюнак: 18) з'яўляецца пераходным паміж уразнымі і набіўнымі падкоўкамі, змяшчаючы ў сябе характэрныя рысы як аднаго, так і другога тыпу. Такія абутковыя падкоўкі мацаваліся да абцаса пры дапамозе не толькі шыпоў, але і цвікоў. Гэты спосаб мацавання быў характэрным выключна для падковак віду II.

Тып С (малюнак: 12, 13, 17, 19) уяўляе сабой фінальную ступень эвалюцыі абутковай падкоўкі, бо менавіта ён прадугледжваў мацаванне да абцаса выключна цвікамі. Такі спосаб мацавання быў характэрным для падковак віду II.



Мал. 1. Тыпалогія абутковых падковак XV – XVIII стагоддзяў з Полацка

Карэляцыя відаў і тыпаў абутковых падковак XV – XVIII стагоддзяў з Полацка

Паводле формы пласціны		**Паводле спосабу мацавання**			
		Тып А (уразныя)		**Тып В** (камбінаваныя)	**Тып С** (набіўныя)
		Тып А I (двухшыпныя)	**Тып А II** (трохшыпныя)		
Від I (пласціна, сплюшчаная ў вертыкальнай плоскасці)		–	+	–	–
Від II (пласціна, сплюшчаная ў гарызантальнай плоскасці)	**Варыянт II.1** (чатырохгранная)	+	+	–	+
	Варыянт II.2 (шырокая і плоская)	–	+	+	+

Цяпер засяродзім нашу ўвагу на датаванні відаў і тыпаў абутковых падковак. Як было адзначана вышэй, першым і найбольш раннім відам падковак у Полацку былі вырабы з высокай, сплюшчанай у вертыкальнай плоскасці пласцінай і трыма шыпамі-мацавальнікамі (від I, тып А II). Гэтыя вырабы датуюцца канцом XV – XVI стагоддзем [2, с. 156; 4, мал. 30: 8]. Вышыня пласціны такіх падковак звычайна вагалася ад 1 да 2,5 см, а таўшчыня ад 0,2 да 0,4 см. Максімальная вышыня шыпа дасягла 3 см.

Другі від абутковых падковак (від II) мае больш шырокі храналагічны дыяпазон бытавання – XVI – XVIII стагоддзі [2, с. 156]. Яго характэрная асаблівасць – сплюшчанасць пласціны ў гарызантальнай плоскасці. Гэтая характарыстыка дапаўняецца яшчэ папярочным сячэннем і шырынёй аснавання ў гарызантальнай плоскасці. Паводле такіх прыкмет вельмі добра вылучаюцца два варыянты падковак другога віду. Вырабы першага варыянта (варыянт II.1) з'яўляюцца адной з найбольш распаўсюджаных груп абутковых падковак. Чатырохгранныя ў сячэнні (квадратныя і прамавугольныя) дугападобныя пласціны з'яўляліся асновай амаль для ўсіх, вылучаных намі тыпаў вырабаў (уразныя і набіўныя). Вышыня іх не прывышае 1 см, а шырыня – 0,5 см.

Ніжняй мяжой існавання віду II.1 можна лічыць XVI, а верхняй – XVIII стагоддзе [2, с. 156 – 157]. Між тым падкоўкі віду II.1 тыпу А з'яўляюцца больш раннімі і датуюцца канцом XVI – XVII сагоддзем, а тыпу В і С – XVII – XVIII стагоддзямі [2, с. 156; 3, мал. 16: 7; 4, мал. 30: 6, 7]. Гэты від абутковых падковак атрымаў найбольшае распаўсюджванне ў дадзены перыяд з-за сваёй значнай эканамічнасці (у параўнанні з падкоўкамі першага віду на іх выраб ішло значна меншая колькасць жалеза) і большай універсальнасці (яны маглі быць як уразнымі, так і набіўнымі).

Падкоўкі другога варыянта паходзяць ад папярэдняй групы вырабаў і адрозніваюцца тым, што іх аснаванне моцна пашыраецца ў гарызантальнай плоскасці (для большай зручнасці вырабы з пласцінай шырэй за 1 см будзем адносіць да другога варыянта). Натуральна, што вялікая шырыня пласціны падкоўкі дазваляла больш надзейна ахоўваць абцас абутку ад сцірання, што абумовіла далейшую эвалюцыю дадзенай катэгорыі вырабаў у гэтым накірунку. Падкоўкі другога варыянта мацаваліся да абцасу з дапамогай як шыпоў, так і цвікоў і атрымалі шырокае распаўсюджванне ў XVII (від II.2, тып В) і XVIII (від II. 2, тып С) стагоддзях [2, с. 156 – 154; 4, мал. 30: 9].

Акрамя таго ў даследаванай намі калекцыі абутковых падковак выяўлены вырабы, якія можна лічыць пераходным варыянтам паміж гэтымі групамі вырабаў. Яны адрозніваюцца ад падковак першага і другога варыянтаў тым, што звычайна маюць моцна пашыраную сярэднюю частку, якая паступова пераходзіць у чатырохгранныя (квадратныя ці прамавугольныя) канцы.

Заключэнне. На падставе аналізу рэчавага матэрыялу можна стварыць пэўнае ўяўленне пра развіццё форм абутковых падковак у XV – XVIII стагоддзях. Верагодна, гэтая катэгорыя артэфактаў з'явілася ў г. Полацку напрыканцы XV – пачатку XVI стагоддзя, што было абумоўлена распаўсюджваннем на беларускіх землях абутку на абцасе. Першымі вядомымі формамі абутковых падковак сталі вырабы з высокай, сплюшчанай у вертыкальнай плоскасці пласцінай з трыма шыпамі, якія былі вылучаныя намі ў асобны від – від I. Далейшае развіццё дадзенай катэгорыі вырабаў адбывалася па шляху памяншэння вышыні пласціны і пашырэння яе ў гарызантальнай плоскасці. Гэтая група абутковых падковак была аднесена намі да другога віду (від II). Між тым і ўнутры яго вылучаюцца некалькі варыянтаў, асноўнае адрозненне якіх заключаецца ў папярочным сячэнні і шырыні аснавання.

Падкоўкі першага віду мацаваліся да абцаса пры дапамозе выключна шыпоў, таму гэты спосаб мацавання можна лічыць найбольш архаічным. На аснове пласцін другога віду адбывалася развіццё і іншых спосабаў мацавання падковак да абцаса абутку – пры дапамозе цвікоў (набіўныя), а таксама цвікоў і шыпоў (камбінаваныя). Такія спосабы мацавання былі распаўсюджаныя адначасова. Між тым мацаванне пры дапамозе цвікоў атрымала далейшае развіццё ў больш позні перыяд, у той час як бытаванне камбінаваных падковак абмяжоўваецца XVIII стагоддзем. У сувязі з гэтым камбінаваныя падкоўкі варта разглядаць як пераходны тып ад «уразных» да набіўных.

Такімі чынам, адначасовая камбінацыя вялікага кола характарыстык абутковых падковак не дазваляе стварыць надзейную тыпалагічную схему развіцця гэтай катэгорыі вырабаў. Кіруючыся галоўным правілам лагічнай працэдуры дзялення, за аснову, па якой будзе праводзіцца класіфікацыя, варта браць толькі адну з характарыстык падкоўкі. У той жа час найбольш вызначальнымі маркерамі абутковых падковак уяўляюцца дзве прыкметы – форма аснавання і спосаб мацавання да абцаса. Зыходзячы з функцыянальнага прызначэння дадзенай катэгорыі вырабаў форму аснавання трэба лічыць галоўнай характарыстыкай абутковай падкоўкі, у той час як спосаб мацавання – вытворнай ад яе. У сувязі з гэтым у дадзеным артыкуле прапанавана схема тыпалогіі абутковых падковак, заснаваная на карэляцыі дзвюх азначаных прыкмет. У адпаведнасці з гэтым былі распрацаваныя дзве схемы (гл. табліцу), якія на нашу думку найбольш аб'ектыўна адлюстроўваюць натуральныя сувязі паміж асобнымі экземплярамі даследаванай групы артэфактаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Векслер, А.Г. Обувные подковки XV – XVIII вв. (по материалам раскопок в г. Москве) / А.Г. Векслер, Ю.А. Лихтер, Д.О. Осипов // Российская археология. – 1997. – № 3. – С. 114 – 120.

2. Дук, Д.У. Полацк XVI – XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.
3. Дук, Д.У. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у горадзе Полацку ў 2000 г. / Д.У. Дук, С.В. Тарасаў // Архіў ІГ НАНРБ. – Воп. 1. – Спр. 1880.
4. Дук, Д.У. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у горадзе Полацку ў 2001 г. / Д.У. Дук // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1921.
5. Колчин, Б.А. Железообрабатывающее ремесло Новгорода Великого // Материалы и исследования по археологии СССР: тр. Новгород. археолог. эксп. / под ред. Б.А. Колчина и А.В. Арциховского. – М.: Изд-во АН СССР, 1959. – № 65, Т 2. – С. 7 – 120.
6. Изюмова, С.А. К истории кожевенного и сапожного ремёсел Новгорода Великого / С.А. Изюмова // Материалы и исследования по археологии СССР: тр. Новгород. археолог. эксп. / под ред. Б.А. Колчина и А.В. Арциховского. – М.: Изд-во АН СССР, 1959. – № 65, Т 2. – С. 5 – 224.
7. Никитин, А.Ф. Русское кузнечное ремесло XVI – XVII вв. / А.Ф. Никитин. – М.: Наука, 1971. – 84 с.
8. Левко, О.Н. Витебск XIV – XVIII вв.: (Стратиграфия, хронология, социально-историческая топография и технология производств) / науч. ред. В.А. Булкин. – Минск: Наука и техника, 1984. – 120 с.
9. Археалогія Беларусі: у 4 т. / В.М. Ляўко [і інш.]; пад рэд. В.М. Ляўко [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 4: Помнікі XIV – XVIII стст. – 597 с.
10. Сагановіч, Г.М. Кавальска-слясарскія вырабы з раскопак Крэўскага замка / Г.М. Сагановіч // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні / пад рэд. В.М. Ляўко. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 92 – 98.
11. Сагановіч, Г.М. Кавальскія вырабы сярэдневяковага Мсціслава / Г.М. Сагановіч // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: новыя даследаванні: зб. арт. / рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 183 – 189.
12. Саганович, Г.Н. Кузнечное ремесло Белоруссии XIV – XVIII вв.: дис. ... канд. ист. наук: 07.00.06 / Г.Н. Саганович. – Минск, 1988. – 299 с.
13. Краўцэвіч, А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV – XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой / А.К. Краўцэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 171 с.
14. Трусаў, А.А. Металічныя вырабы з раскопак Лідскага і Мірскага замкаў (XIV – XVIII стст.) / А.А. Трусаў, А.А. Краўцэвіч, Г.М. Сагановіч // Весці АН БССР. Сер. грам. навук. – 1987. – № 4. – С. 73 – 83.
15. Пазднякоў, В.С. Клецк X – XVIII стст.: матэрыяльная і духоўная культура беларус. феад. горада / В.С. Пазднякоў; навук. рэд. П.Ф. Лысенка. – Мінск: БелНДІДАС, 2008. – 287 с.
16. Дук, Д.В. Кожевенно-сапожное ремесло Полоцка XVI – XVIII вв. (по итогам археолог. надзора на территории Великого посада в 2000 – 2002 гг.) / Д.В. Дук, А.А. Соловьёв // Гіст.-археалаг. зб. – 2004. – № 19. – С. 241 – 250.
17. Ивин. А.А. Логика: учеб. пособие. – 2-е изд. – М.: Знание, 1998. – 240 с.
18. Тыпалогія // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск: Бел.Эн., 1993. – С. 621 – 622.


КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК ПАГОШЧА: АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ РАСКОПАК 2005 – 2008 ГАДОЎ

М.А. ПЛАВІНСКІ
(Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Мінск)

Прадстаўлены вынікі раскопак курганнага могільніка Пагошча Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці, якія праводзіліся экспедыцыяй пад кіраўніцтвам аўтара на працягу 2005 – 2008 гадоў. Пачатак функцыянавання помніка прыпадае на трэцюю чвэрць I тыс. н.э. і звязаны са з'яўленнем у Браслаўскім Паазер'і носьбітаў культуры пскоўскіх доўгіх курганоў. Большасць даследаваных курганоў належыць да другой паловы канца X – пачатку першай паловы XI стагоддзя (найбольш верагодна – апошнімі дзесяцігоддзямі X – пачаткам XI ст.). Могільнік належаў калектыву, які ўключаў розных па паходжанні і этнакультурнай прыналежнасці членаў. Сярод іх дамінуючае становішча займалі прадстаўнікі полацкай княжацкай адміністрацыі, якія мелі пэўнае карпаратыўнае ўяўленне аб прэстыжным пахавальным абрадзе інсумацыі ў «камерах».

Курганны могільнік Пагошча знаходзіцца ў лесе за 500 м на паўночны ўсход ад вёскі Пагошча (Опсаўскі с/с Браслаўскага р. Віцебскай вобл.) на ўсходнім беразе возера Бяржонка (мал. 1). Помнік размешчаны на тэрасе, якая ўзвышаецца над возерам Бяржонка прыкладна на 3 м. Курганы выцягнуты паміж схілам тэрасы і лясной дарогай. Могільнік зарос лесам (сосны, бярозы) і кустоўем (арэшнікам). Уся яго плошча моцна пацярпела ад гаспадарчай актыўнасці людзей. Большасць курганоў пашкоджана і

часткова знішчана розначасовымі скарбашукальніцкімі і гаспадарчымі ямінамі (гэтая тэрыторыя выкарыстоўваецца пад сметнік і скотамогільнік). Прастора між курганамі засыпана будаўнічым смеццем і гаспадарчымі адыходамі. Такі стан захаванасці насыпаў замінае іх дакладнаму падліку. Першапачаткова намі было зафіксавана і нанесена на план 14 курганоў [13, с. 217].




Мал. 1. Месцазнаходжанне курганнага могільніка Пагошча ў Браслаўскім Паазер'і (А) і лакалізацыя археалагічных помнікаў у наваколлі вёскі Пагошча (В):
1 – селішча Пагошча II (Канстаціна); 2 – селішча Пагошча I; 3 – курганны могільнік Пагошча


Па завяршэнні раскопак 2008 года стала магчыма казаць аб наяўнасці ў могільніку 15 курганоў (мал. 2). На працягу 2005 – 2008 гадоў могільнік раскопваўся суцэльнай плошчай – даследаваліся не толькі насыпы курганоў і раўчукі вакол іх, але і міжкурганная прастора. Усяго за чатыры гады было раскапана каля 1000 кв. м і даследавана 11 пахавальных насыпаў. Натуральна, што такая колькасць прыдатных для аналізу курганоў не дазваляе рабіць катэгарычных высноў аб храналогіі і культурнай інтэрпрэтацыі некропаля. Разам з тым, варта адзначыць, што па ступені даследаванасці (адсотак раскапаных курганоў ад іх агульнай колькасці) могільнік, відавочна, з'яўляецца найлепш вывучаным у Браслаўскім Паазер'і.

Сапраўдны артыкул мае на мэце абагульненне асноўных вынікаў праведзеных даследаванняў. Таму мы не станем спыняцца на канструктыўных асаблівасцях пахавальных збудаванняў, датаванні асобных комплексаў інвентару і г.д. (гэтыя пытанні ўжо былі разгледжаны ў шэрагу папярэдніх артыкулаў [13; 14; 15, с. 135 – 136]), але адразу звернемся да вызначэння датавання ўсяго некропаля і яго месца сярод сінхронных помнікаў Браслаўскага Паазер'я.

З 11 даследаваных курганоў пахаванні былі знойдзены ў 9. У практычна цалкам разбураным кургане 16 слядоў пахавання выяўлена не было, што не дазваляе датаваць гэты насып. Курган 2, у якім пахаванне выяўлена не было, але ў насыпе знойдзена правушная матыка (мал. 3), можа быць датаваны толькі надзвычай шырока – сярэдзінай I – пачаткам II тыс. н.э. Гэта не дазваляе выкарыстоўваць яго ў пэўных храналагічных пабудовах. Больш-менш вузкае датаванне можа быць вызначана для дзевяці курганоў (1, 6, 7, 8, 9, 10, 12, 14, 15). Гэтыя пахавальныя комплексы падзяляюцца на два культурна-храналагічныя гарызонты.




Мал. 2. План курганнага могільніка Пагошча з пазначэннем раскопаў 2005– 2008 гадоў (Р. I – 2005 г.; Р. II – IV – 2006 г.; Р. V – VI, Ш. I, Тр. I – 2007 г.; Р. VII – X – 2008 г.)




Мал. 3. Курганны могільнік Пагошча. Матыка, знойдзеная ў насыпе кургана 2 (раскопкі 2005 г.)

Першы культурна-храналагічны гарызонт прадстаўлены курганам 9, які можа быць датаваны трэцяй чвэрцю I тыс. н.э. (найбольш верагодна – VII ст.) і аднесены да культуры пскоўскіх доўгіх курганоў. Надзвычай вялікую цікавасць прадстаўляе выяўлены ў кургане пахавальны абрад (мал. 4: 1).



а)




б)

Мал. 4. Курганны могільнік Пагошча. Курган 9:
а – план мацерыка і профілі; б – варыянт рэканструкцыі будовы насыпу і драўлянай канструкцыі на яго вяршыні

Шматлікія асобныя кальцынаваныя косткі былі знойдзены непасрэдна пад дзірванам і ў верхніх слаях падоўжанага насыпу. Асобныя дробныя косткі сустракаліся нават у раўчуку па-за яго межамі. Найбольшая канцэнтрацыя кальцынаваных костак прасочвалася ў паўднёва-ўсходнім сектары кургана. Непасрэдна пад дзірванам на паўднёва-ўсходнім краі насыпу і часткова ў раўчуку па-за яго межамі была выяўлена аморфная праслойка кальцынаваных костак з асобнымі ўключэннямі попелу і дробнага вугалля, выцягнутая па лініі паўночны захад – паўднёвы ўсход памерам 2,65 × 1,7 м і магутнасцю да 0,15 м. Вага знойдзеных костак перавышае 6,1 кг (пасля сушкі і ачысткі ад пяску). Сярод костак вызначаны рэшткі не менш як чатырох чалавек – адзін дарослы мужчына, адна дарослая жанчына і двое дзяцей. Акра-

мя таго, былі ідэнтыфікаваныя косткі зайца, вавёркі, куніцы, сабакі, прадстаўніка сямейства сабачых, свінні, казы, авечак, буйных рагатых жывёлін, двух птушак і фрагмент ракушкі малюска (антрапалагічнае вызначэнне прафесара астэалогіі С. Стэн (факультэт археалогіі і астэалогіі універсітэта Готланда, Швецыя) і прафесара астэалогіі М. Врэтэмарк (аддзел археалогіі і культурнага ландшафту Музея Вестэрётланда, Швецыя), астэалагічнае вызначэнне – малодшага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі А.А. Разлуцкай). У праслойцы кальцынаваных костак знойдзены 34 фрагменты аплаўленых бронзавых упрыгажэнняў, сярод якіх можна вызначыць (мал. 5: 1 – 18): фрагмент бронзавага бранзалета з пашыранымі (авальнымі ў сячэнні) арнаментаванымі канцамі; 4 фрагменты бронзавых літых бранзалетаў, арнаментаваных двума гарызантальнымі паралельнымі лініямі (фрагменты належаць да некалькіх бранзалетаў, але вызначыць іх першапачатковую колькасць немагчыма); 8 фрагментаў бронзавых колцаў з трохграннага ў сячэнні дроту (не выключана, што фрагменты належаць не да колцаў, а да пранізкі (ці пранізак) вялікага дыяметру); 12 фрагментаў бронзавых спіральных пранізак з трохграннага ў сячэнні дроту; 10 надзвычай моцна аплаўленых фрагментаў бронзавых вырабаў, якія не могуць быць ідэнтыфікаванымі.




Мал. 5. Курганны могільнік Пагошча. Курган 9. Інвентар пахавання па абрадзе крэмацыі (раскопкі 2006 г.)

Побач з праслойкай кальцынаваных костак на поўдзень ад яе, ля паўднёвай сценкі Раскопу II, пад дзірванам знаходзіўся развал вялікага ляпнога слабапрафіляванага гаршчка ўсечана-канічнай формы з адагнутым вонкі венцам (гл. мал. 5: 19).

Паслядоўнасць дзеянняў, якія былі ажыццёўлены падчас узвядзення кургана 9, можа быць рэканструявана наступным чынам (гл. мал. 4: 2). На пляцоўцы, прызначанай пад курган, было раскладзена

вогнішча. Пасля гэтага, з грунту, узятага з раўчукоў, быў узведзены насып. Відавочна, што рэшткі трупаспаленняў некалькіх людзей і жывёлін не былі закапаныя ў насып. Характар размяшчэння асобных кальцынаваных костак пад дзірванам па ўсёй паверхні насыпу і праслойкі костак у яе паўднёва-ўсходняй частцы дазваляе меркаваць, што першапачаткова пахаванні былі змешчаны ў нейкай драўлянай канструкцыі на яе вяршыні. Гэтая канструкцыя не пакінула слядоў, якія маглі б быць зафіксаванымі падчас раскопак. Верагодна, яна з'яўлялася ўсыпальняй, якая функцыянавала працяглы час і куды змяшчаліся рэшткі пахаванняў, што, магчыма, належалі прадстаўнікам адной сям'і. З часам драўляная канструкцыя мусіла спарахнець, а косткі, якія ў ёй знаходзіліся, пачалі прасыпацца (гэтым тлумачыцца іх знаходжанне па ўсёй плошчы паверхні насыпу. Нарэшце, калі драўляная канструкцыя канчаткова спарахнела, яна, відавочна, завалілася ў паўднёва-ўсходнім накірунку, а кальцынаваныя косткі рассыпаліся па схіле кургана. Сюды ж скаціўся гаршчок (прычым костак унутры яго не было).

Даследаваны курган прадстаўляе цікавасць не толькі сам па сабе, але і для вырашэння шэрага істотных праблем у межах усёй культуры пскоўскіх доўгіх курганоў. Па першае, зараз ёсць падставы меркаваць, што і іншыя так званыя «пахаванні на паверхні насыпаў пад дзірванам» [16, с. 19; 9, с. 140; 23, с. 24 – 25] таксама першапачаткова знаходзіліся ў нейкіх драўляных канструкцыях. На карысць гэтага можа сведчыць той факт, што, як і ў Пагошчы, кальцынавныя косткі ў падобных курганах знаходзіліся на схіле насыпу на плошчы ў некалькі квадратных метраў [16, с. 43; 23, с. 27 – 28], што магло стаць вынікам іх прасыпання са спарахнелай канструкцыі; па-другое, даследаванне кургана 9 могільніка Пагошча ў Браслаўскім Паазер'і, а таксама новага пахавальнага помніка культуры пскоўскіх доўгіх курганоў Гарадзішча Полацкага раёна (даследаванні Д.У. Дука, 2008 г.) дазваляюць меркаваць, што носьбіты гэтай традыцыі засялялі і левы бераг Дзвіны (мал. 6).




Мал. 6. Пахавальныя помнікі культуры пскоўскіх доўгіх курганоў у Беларускім Падзвінні:
1 – Дарахі; 2 – Янкавічы; 3 – Гаравыя; 4 – Субаўшчына; 5 – Гарадзішча; 6 – Пагошча; 7 – Рацкі Бор


Другі культурна-храналагічны гарызонт курганнага Пагошча прадстаўлены васьмю насыпамі (1, 6, 7, 8, 10, 12, 14, 15 (мал. 7 – 16)). Можна дапусціць яго шырокае датаванне ў межах X – XI стагоддзяў. Разам з тым найбольш верагодным падаецца яго датаванне другой паловай X – першай паловай XI стагоддзя і, нават больш вузка, -- апошнімі дзесяцігоддзямі X – пачаткам XI стагоддзя.

Улічваючы тое, што зараз вывучана ўжо больш за 2/3 ад агульнай колькасці насыпаў могільніка, можна зрабіць шэраг высноў наконт пахавальнай абраднасці калектыву, які яго пакінуў.


Найперш варта адзначыць, аднастайнасць абраду ўсіх пахаванняў дарослых мужчын (курганы 1, 10, 12, 14, 15). Усе яны здзейснены па абрадзе інгумацыі ў падкурганных ямінах, якія пераразалі попельны слой на аснаванні курганоў. Звернутыя галовамі на ўсход нябожчыкі былі змешчаны ў берасцяныя канструкцыі накшталт трун. У курганах 1, 10, 14 пры пахаваннях былі змешчаны прадметы ўзбраення, дэталі строю і посуд (мал. 7, 13, 15). Інгумацыя ў кургане 15 значна саступае ім па багацці інвентару – тут выяўлены толькі жалезная фібула, паясное колца і нож (мал. 16).




Мал. 7. Курганны могільнік Пагошча. Курган 1. Інвентар пахавання па абрадзе інгумацыі (раскопкі 2005 г.)




Мал. 8. Курганны могільнік Пагошча. Курган 6. Інвентар пахавання па абрадзе інгумацыі (раскопкі 2008 г.)



Мал. 9. Курганны могільнік Пагошча. Курган 7. Інвентар пахавання 1 па абрадзе інгумацыі (раскопкі 2007 г.)




Мал. 10. Курганны могільнік Пагошча. Курган 7. Інвентар пахавання 2 па абрадзе інгумацыі (раскопкі 2007 г.)



Мал. 11. Курганны могільнік Пагошча. Курган 7. Інвентар пахавання 2 па абрадзе інгумацыі (раскопкі 2007 г.)

Асаблівую цікавасць прадстаўляе мужчынскае пахаванне ў кургане 12, даследаванае ў 2008 годзе Нябожчык знаходзіўся ў яміне памерам 3,7 × 4,6 м і глыбінёй каля 1 м. Пры ім выяўлены сякера, кап'ё, нож, крэсіва, бранзалет, фібула і ляпны гаршчок (мал. 14). Справа ад нябожчыка знаходзілася дадатковае безінвентарнае пахаванне (пол якога пакуль не вызначаны). Магільная яміна была перакрытая драўляным насцілам, на якім змяшчалася трэцяе пахаванне, здзейсненае па абрадзе трупаспалення з багатым пахавальным інвентаром – набор шкляных пацерак і крывіцкія серпападобныя скроневыя колцы, бранзалет. Побач з магільнай ямінай, паралельна яе доўгаму боку, на попельна-вугальнай праслойцы на аснаванні кургана быў выяўлены фрагмент драўлянага вырабу даўжынёй 2,5 м, які можа быць інтэрпрэтаваны, як човен. Памеры магільнай яміны, асаблівасці будовы кургана і рытуальных дзеянняў дазваляюць меркаваць, што людзі, якія іх ажыццяўлялі, мелі ўяўленне аб так званым «камерным» пахавальным абрадзе [10]. Дакладней, не столькі аб «класічным камерным» рытуале, колькі аб яго позніх праявах, вядомых па матэ-

рыялах Паўночнага Захаду Расіі XI стагоддзя. Існуе меркаванне, што ў позніх камерах Наўгародскай зямлі былі пахаваныя прадстаўнікі цэнтральнай адміністрацыі, верагодна, не мясцовага паходжання і іх бліжэйшыя сваякі [11, с. 225; 20, с. 277]. Разам з тым падабенства абраду пахавання мужчыны ў кургане 12 з мужчынскімі пахаваннямі са зброяй у курганах 1, 10 і 14 дазваляе таксама разглядаць апошнія, як «камерныя».



Мал. 12. Курганны могільнік Пагошча. Курган 8. Інвентар пахавання па абрадзе крэмацыі (раскопкі 2006 г.)


Акрамя кургана 12, жаночыя пахаванні былі выяўлены ў курганах 7 і 8. Даследаванае ў кургане 8 пахаванне змяшчалася ў мацерыковай ямцы. Разам з рэшткамі здзейсненага па-за межамі кургана спалення дзяўчынкі-падлетка (13 – 16 год) знаходзіліся кальцынаваныя косткі дзвюх птушак (адна з сямейства курыных і адна дробная качка), а таксама хатніх млекакормячых (дзве з іх належалі казе ці авечцы, дзве іншыя – авечцы (вызначэнне А.А. Разлуцкай)). Як па асаблівасцях абраду, так і па характары інвентару (гл. мал. 12) курган 8 можа быць аднесены да фінальнага этапа існавання культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў у Беларускім Падзвінні.

У кургане 7 выяўлена парная інгумацыя. Пахаванне 1 належала дзіцяці, было арыентаванае галавой на паўднёвы ўсход і знаходзілася на попельна-вугальным слаі на мацерыку (гл. мал. 9 – 11). Другое пахаванне, якое належала багатай жанчыне, выяўлена ў падкурганнай яміне. Яно было здзейснена ў труне і арыентавана галавой на паўночны захад. Сярод іншага інвентару пры пахаванні выяўлены ўплеценыя ў косы крывіцкія бранзалетападобныя скроневыя колцы, завязаныя на абодва канцы (гл. мал. 10: 1 – 6).

Варта адзначыць адсутнасць пэўнага стандарту ў жаночым пахавальным абрадзе. Таксама можна меркаваць, што ўсе жаночыя пахаванні мелі падпарадкаваны і другасны ў параўнанні з мужчынскімі характар у планіграфічнай структуры некропаля. На плане могільніка заўважана, што курганы з мужчынскімі інгумацыямі са зброяй размяшчаюцца «ланцужком» па цэнтры некропаля (№ 1, 5, 10, 12, 14 (гл. мал. 2)), яны вызначаюцца большымі памерамі і маюць відавочна першачарговае значэнне ў яго тапаграфічнай структуры. Прычым пры ўзвядзенні кургана 6, дзе быў пахаваны хлопчык з дроцікам (гл. мал. 8), былі пашкоджаны практычна сінхронныя яму курганы 7 і 8 з жаночымі пахаваннямі (гл. мал. 2). Гэта сведчыць аб першачарговай ролі мужчын у пагашчанскім калектыве.

Дзеля таго, каб адэкватна ўсвядоміць прычыны з'яўлення курганнага могільніка Пагошча і лёс той групы насельніцтва, якая яго пакінула, варта разгледзець яго месца сярод сінхронных помнікаў Браслаўскага Паазер'я. У канцы I тыс. н.э. у рэгіёне распаўсюджваюцца помнікі культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў (мал. 17). Характэрная для гэтай культуры кераміка «з плечукамі» і рэчавы матэрыял, выяўленыя ў культурных слаях гарадзішча «Замак» на возеры Дрысвяты, гарадзішча «Замкавая гара» ў Браславе, селішча Зазоны, гарадзішча і селішча Пруднікі [3, с. 72 – 73; 17, с. 62; 18, с. 300; 22, рис. 9: 10].

Курганныя могільнікі культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў канцэнтруюцца на захадзе Браслаўскага Паазер'я – ў наваколлі азёр Богінскага і Дрывяты. У дадзеным рэгіёне з канца XIX стагоддзя было даследавана 95 курганоў у 7 могільніках (Вусце, Богіна, Опса, Даўбор, Рацкі Бор, Заборныя Гумны [4, с. 210]). Асноўная маса вузкадатаваных пахаванняў богінска-дрывяцкага мікрарэгіёна належыць да X стагоддзя.




Мал. 13. Курганны могільнік Пагошча. Курган 10. Інвентар пахавання па абрадзе інгумацыі (раскопкі 2006 г.)


У другой палове X стагоддзя на ўсходзе Браслаўскага Паазер'я (у наваколлі азёр Укля – Абстэрна – Важа) з'яўляюцца курганныя могільнікі (мал. 18), у якіх цалкам пераважаюць пахаванні па абрадзе інгумацыі, а крэмацыі сустракаюцца вельмі рэдка [4, с. 212]. З'яўленне падобных могільнікаў варта звязваць з прытокам новага насельніцтва з усходу, паходжанне якога можа разглядацца ў кантэксце фарміравання раннедзяржаўнага ўтварэння ў Сярэднім Падзвінні з цэнтрам у Полацку. Функцыянаванне курганных могільнікаў з трупапакладаннямі на ўсходзе Браслаўскага Паазер'я працягваецца і ў далейшым – і ў XI, і ў XII стагоддзях [12, с. 79].

У канцы X – пачатку XI стагоддзя ў могільніках культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў богінска-дрывяцкага мікрарэгіёна з'яўляецца шэраг пахаванняў па абрадзе інгумацыі (гл. мал. 18), у большасці з якіх знойдзены прадметы ўзбраення старажытнарускіх і паўночнаеўрапейскіх тыпаў [4, с. 212]. Відавочна, што гэтыя пахаванні былі пакінуты іншародным насельніцтвам. У хуткім часе, не пазней за

сярэдзіну XI стагоддзя, курганныя могільнікі богінска-дрывяцкага мікрарэгіёна перастаюць функцыянаваць ((мал. 19) [12, с. 79]). З'яўленне інгумацый са зброяй адлюстроўвае пачатак замацавання цікавасцяў Полацкага княства ў рэгіёне [4, с. 212], а самі гэтыя пахаванні належаць полацкім дружыннікам.



Мал. 14. Курганны могільнік Пагошча. Курган 12. Інвентар пахавання па абрадзе інгумацыі (раскопкі 2008 г., *4 – мал. А. Ткачова*)




Мал. 15. Курганны могільнік Пагошча. Курган 14. Інвентар пахавання па абрадзе інгумацыі (раскопкі 2008 г.)

Адначасова са з'яўленнем у некропалях культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў пахаванняў па абрадзе трупапакладання са зброяй, у канцы X -- пачатку XI стагоддзя адбываюцца пажары на гарадзішчы «Замак» на возеры Дрысвяты і на гарадзішчы «Замкавая Гара» ў Браславе (гл. мал. 18), а на іх месцы ўзнікаюць гарадскія цэнтры з тыповай старажытнарускай матэрыяльнай культурай [1, с. 103 – 105;

2, с. 40; 18, с. 300, 306; 19, с. 93]. Жыццё на селішчы ў Зазонах спыняецца, а на гарадзішча і селішча Прудніkі пранікаюць традыцыі старажытнарускай матэрыяльнай культуры [21, с. 138, 144]. На ўсход ад Браслава ўзнікаюць старажытнарускія крэпасці Маскавічы [5, с. 24 – 26; 6, с. 13] і Рацюнкі [7, с. 180; 8].


Знішчэнне гарадзішчаў мясцовага насельніцтва, стварэнне магутнай сістэмы ўмацаванняў, распаўсюджанне адміністрацыі адбыліся на працягу кароткага часу, што сведчыць аб спланаванай і мэтанакіраванай дзейнасці прышэльцаў. Можна ўпэўнена звязваць гэтыя падзеі з працэсам пашырэння межаў Полацкага княства. Прычым замацаванне гэтай тэрыторыі за Полацкам, якое выявілася ў стварэнні магутнай сістэмы ўмацаваных цэнтраў, магло адбыцца ў першыя гады праўлення Брачыслава Ізяславіча – на самым пачатку XI стагоддзя [12, с. 79]. У сваю чаргу распаўсюджванне ў рэгіёне полацкай адміністрацыі магло адбыцца раней.




Мал. 16. Курганны могільнік Пагошча. Курган 15. Інвентар пахавання па абрадзе інгумацыі (раскопкі 2007 г.)

Курганны могільнік Пагошча размяшчаецца ў цэнтры богінска-дрывяцкай групы помнікаў смаленска-полацкіх доўгіх курганоў. Аднак з васьмі даследаваных насыпаў другога культурна-храналагічнага гарызонту з традыцыямі гэтай культуры могуць быць суаднесены толькі пахаванне ў кургане 8 і пахаванне па абрадзе трупаспалення ў кургане 12. Акрамя таго, увесь знойдзены пры пахаваннях другога культурна-храналагічнага гарызонту ляпны посуд прадстаўлены тыповымі для культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў гаршчкамі «з плечукамі». Увогуле ж могільнік Пагошча падаецца не звязаным з пахавальнымі традыцыямі культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў. Мужчынскія інгумацыі са зброяй, здзейсненыя ў падкурганных ямінах («камерах»), могуць быць інтэрпрэтаваныя як пахаванні прадстаўнікоў новай адміністрацыі, якія мелі пэўнае калектыўнае ўяўленне аб пахавальным рытуале, што адпавядаў іх групавому і сацыяльнаму статусу.


Адпаведна, з'яўленне другога культурна-храналагічнага гарызонту курганнага могільніка Пагошча можа быць суаднесена з уваходжаннем богінска-дрывяцкай групы помнікаў культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў у сферу ўплыву Полацкага княства і распаўсюджання тут полацкай адміністрацыі. Нарэшце, варта адзначыць той факт, што тэраса, на якой размяшчаецца курганны могільнік Пагошча, была заселена яшчэ ў бронзавым веку. Ва ўсіх раскопах 2005 – 2008 гадоў сустракаліся асобныя фрагменты керамікі і апрацаваны крэмень гэтага часу (мал. 20), а ў асобных месцах захаваліся і невялікія ўчасткі культурнага слоя. Іх выяўленне стала магчымым толькі дзякуючы методыцы суцэльнага даследавання плошчы могільніка.



Мал. 17. Археалагічныя помнікі Браслаўскага Паазер'я канца I тыс. н.э.:
1 – Дрысвяты; 2 – Браслаў; 3 – Зазоны; 4 – Прудніkі; 5 – Вусце; 6 – Богіна; 7 – Опса; 8 – Даўбор; 9 – Рацкі Бор; 10 – Заборныя Гумны; 11 – Бяльмонты
(a – гарадзішча з матэрыяламі культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, b – селішча з матэрыяламі культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, c – курганны могільнік культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў)



Мал. 18. Археалагічныя помнікі Браслаўскага Паазер'я мяжы X–XI стст.:
1 – Дрысвяты; 2 – Браслаў; 3 – Маскавічы; 4 – Рацюнкі; 5 – Прудніки; 6 – Вусце; 7 – Богіна; 8 – Опса; 9 – Даўбор; 10 – Рацкі Бор; 11 – Заборныя Гумны; 12 – Бяльмонты; 13 – Пагошча; 14 – Укля; 15 – Кузьмаўшчына; 16 – Лясная; – 17 – Кублішчына (a – гарадзішча з матэрыяламі культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, спаленае на мяжы X – XI стагоддзяў, на месцы якога ўзнікла старажытнаруская крэпасць; b – старажытнаруская крэпасць; c – селішча са старажытнарускімі матэрыяламі; d – курганны могільнік культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў; e – курганны могільнік культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў з дружыннымі пахаваннямі; f – старажытнарускі курганны могільнік)




Мал. 19. Археалагічныя помнікі Браслаўскага Паазер'я другой паловы XI стагоддзя:
1 – Дрысвяты; 2 – Браслаў; 3 – Маскавічы; 4 – Рацюнкі; 5 – Прудніки; 6 – Укля; 7 – Кузьмаўшчына; 8 – Лясная; 9 – Кублішчына (a – старажытнарускае гарадзішча; b – старажытнарускае селішча; c – старажытнарускі курганны могільнік)

Такім чынам, праведзеныя ў 2005 – 2008 гадах раскопкі курганнага могільніка Пагошча дазваляюць меркаваць, што пачатак функцыянавання помніка прыпадае на трэцюю чвэрць I тыс. н.э. У гэты час у Браслаўскім Паазер'і з'яўляюцца групы носьбітаў культуры пскоўскіх доўгіх курганоў, якім і належыць пахавальны комплекс кургана 9 могільніка Пагошча.

Большасць даследаваных курганоў належыць да другога культурна-храналагічнага гарызонту, які можа быць папярэдне датаваны другой паловай/канцом X – пачаткам/першай паловай XI стагоддзя (найбольш верагодна – апошнімі дзесяцігоддзямі X – пачаткам XI стагоддзя) і звязаны з працэсам уваходжання заходняй часткі Браслаўскага Паазер'я ў сферу цікавасцяў Полацкага княства. Могільнік належаў калектыву, які ўключаў розных па паходжанні і этнакультурнай прыналежнасці членаў. Сярод іх дамі-

нуючае становішча займалі прадстаўнікі полацкай княжацкай адміністрацыі, якія мелі пэўнае карпаратыўнае ўяўленне аб прэстыжным пахавальным абрадзе інгумацыі ў вялікіх падкурганных ямінах з перакрыццём, так званых «камерах».



Мал. 20. Курганны могільнік Пагошча. Матэрыялы бронзавага веку з раскопаў 2005 – 2008 гадоў (10 – 11 – мал. В. Сідаровіча, 12 – мал. А. Ткачова)

ЛІТАРАТУРА

1. Алексеев, Л.В. Раскопки древнего Браслава / Л.В. Алексеев // Краткие сообщ. ин-та археологии. – М., 1960. – Вып. 81. – С. 95 – 106.
2. Аляксееў, Л.В. Старажытны Браслаў / Л.В. Аляксееў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 1978. – № 4. – С. 37 – 40.
3. Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры: в 2 кн. / Л.В. Алексеев. – М.: Наука, 2006. – Кн. 1. – 289 с.
4. Дернович, С.Д. Междуречье Западной Двины и Десны в системе торговых коммуникаций Эпохи Викингов / С.Д. Дернович, Н.А. Плавинский // XV конф. по изучению истории, экономики, литературы и языка скандинавских стран и Финляндии: тез. докл. – М.: «ИВИ РАН», 2004. – Ч. 1. – С. 209 – 212.
5. Дучыц, Л.У. Браслаўскае Паазер'е ў IX – XIV стст. / Л.У. Дучыц. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 120 с.
6. Дучыц, Л.У. Маскавічы / Л.У. Дучыц // Полоцкий летописец. – Полоцк, 1993. – № 1 (2). – С. 13 – 18.
7. Дучиц, Л.В. Городище Ратюнки / Л.В. Дучиц, А.Г. Митрофанов // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 1994. – № 5. – С. 163 – 182.
8. Егорейченко, А.А. Средневековые материалы городища Ратюнки (предварительные итоги изучения 1999 – 2002 гг.) / А.А. Егорейченко // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV міжнар. навук. канф. – Полацк: «НПГКМЗ», 2003. – С. 118 – 121.
9. Енуков, В.В. Ранние этапы формирования смоленско-полоцких кривичей (по археологическим материалам) / В.В. Енуков. – М., 1990. – 261 с.
10. Михайлов, К.А. Древнерусские камерные погребения в Гнёздово / К.А. Михайлов // Археолог. сб. Гнёздово. 125 лет исследования памятника: тр. Гос. Ист. музея. – М.: ГИМ, 2001. – С. 159 – 175.
11. Михайлов, К.А. Новгородские наборные пояса XI – XII вв. / К.А. Міхайлов, В.Ю. Соболев // Археолог. вести. – СПб., 2000. – № 7. – С. 222 – 228.

12. Плавінскі, А.М. Новыя дадзеныя па гісторыі Браслаўскага Паазер'я на мяжы I і II тыс. н.э. (па матэрыялах раскопак курганнага могільніка Опса) / А.М. Плавінскі, М.А. Плавінскі // Браслаўск. чыт.: матэрыялы VI навук.-краязн. канф., прысв. 150-й гадавіне з дня нарадж. Браслаўск. лекара, грамадск. дзеяча Станіслава Нарбута (1853 – 1926). – Браслаў, 2003. – С. 78 – 80.
13. Плавінскі, М. Даследаванні ў Браслаўскім раёне / М. Плавінскі // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2006. – № 21. – С. 217 – 219.
14. Плавінскі, М. Раскопкі курганнага магільніка Пагошча / М. Плавінскі // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2007. – Вып. 23. – С. 225 – 227.
15. Плавінскі, М. Аб адной катэгорыі пахавальнага посуду ў курганах канца I – пачатку II тыс. н.э. на захадзе Полацкай зямлі / М. Плавінскі, А. Плавінскі // Acta archaeologica Albaruthenica. – Мінск, 2007. – Vol. I. – С. 135 – 145.
16. Седов, В.В. Длинные курганы кривичей / В.В. Седов // Свод археологических источников. – М.: Наука, 1974. – Вып. Е 1 – 8. – 94 с.
17. Семянчук, Г. Гарадзішча «Замкавая гара» ў Браславе / Г. Семянчук // Гісторыя Беларусі: жалезны век і сярэднявечча. Да 70-годдзя з дня нарадж. Г.В. Штыхава. – Мінск: «ІГ НАН Беларусі», 1997. – С. 61 – 65.
18. Семенчук, Г.А. Раннесредневековый археологический комплекс Дрисвяты / Г.А. Семенчук // Lietuvos archeologija. – Т. 21. – Vilnius, 2001. – С. 299 – 310.
19. Семянчук, Г. Вынікі археалагічнага вывучэння Дрысвяцкага рэгіёну ў 1996 г. і 1999 г. / Г. Семянчук. Т. Міроньскі // Браслаўскія чытанні 2000: матэрыялы V навук.-краязн. канф., прысв. 935-годдзю першай згадкі Браслава ў пісьмовых крыніцах. – Браслаў, 2001. – С. 92 – 94.
20. Соболев, В.Ю. О древнерусских камерных погребениях Новгородской земли / В.Ю. Соболев // Памятники старины. Концепции. Открытия. Версии. – СПб. – Псков: Невельская типогр., 1997. – Т. II. – С. 272 – 277.
21. Шадыро, В.И. Средневековые материалы из городища Прудники / В.И. Шадыро // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 138 – 146.
22. Шадыро, В.И. Городище и селище Прудники / В.И. Шадыро // Lietuvos archeologija. – Vilnius, 2001. – Т. 21. – С. 267 – 274.
23. Штыхаў, Г.В. Крывічы: Па матэрыялах раскопак курганоў Паўночнай Беларусі / Г.В. Штыхаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 191 с.

КАМЕННЫЯ БУДЫНКІ ПОЛАЦКАГА ЕЗУІЦКАГА КАЛЕГІУМА АПОШНЯЙ ЧВЭРЦІ XVII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVIII СТАГОДДЗЯ

(ПА ВЫНІКАХ НАТУРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ КОРПУСА В)

А.А. САЛАЎЁЎ
(Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік)

Прадстаўлены вынікі натурнага вывучэння корпуса В былога Полацкага езуіцкага калегіума. Падчас яго мадэрнізацыі ў 2006 – 2008 гадах былі больш дэталёва вывучаны рэшткі старажытнага будынка, які быў знойдзены папярэднімі даследчыкамі. Гэты старажытны будынак існаваў да ўзвядзення ў сярэдзіне XVIII стагоддзя існуючых зараз карпусоў. Падчас вывучэння корпуса В была часткова рэканструявана ўнутраная планіроўка памяшканняў старажытнага будынка, сабрана шматлікая калекцыя будаўнічых матэрыялаў XVII – першай паловы XVIII стагоддзя. Таксама была зроблена прывязка выяўленых археалагічных рэшткаў цагляных пабудоў да вядомых выяў Полацкага калегіума першай паловы XVIII стагоддзя.

Полацкі езуіцкі калегіум – адзін з буйнейшых і цікавейшых архітэктурных ансамбляў Полацка, але нягледзячы на яго месцазнаходжанне ў гістарычным цэнтры горада ён практычна ніколі не даследаваўся належным чынам. Пасля перадачы калегіума Полацкаму дзяржаўнаму ўніверсітэту і пачатку буйнамаштабнай мадэрнізацыі будынкаў з'явілася магчымасць яго натурнага вывучэння. Ва ўмовах, калі пісьмовыя і графічныя крыніцы па яго архітэктурнай гісторыі вельмі абмежаваны, а часам проста недаступны натурныя даследаванні набываюць першасны і вызначальны характар.


У айчыннай гістарыяграфіі ўсталяваліся меркаванне, што да сярэдзіны XVIII стагоддзя полацкі калегіум быў цалкам драўляным. Да яго ўзвядзення тут знаходзіўся кальвінскі збор, які быў адзіным цагляным будынкам. Гэтыя звесткі ўпершыню былі пададзены ў працы А.К. Марэля «История города Полотска и возникновения здания Полотскаго кадетскаго корпуса» [1, с. 8, 9] і пазней паўтораны ў кнізе В.П. Вікенцьева «Полотский кадетский корпус» [2, с. 18]. Гэта сцвярджэнне трывала ўвайшло ў навуковую літратуру і пытанне аб магчымасці існавання ў структуры існуючага калегіума больш старажытных цагляных езуіцкіх пабудоў да другой паловы 90-х гадоў XX стагоддзя нават не ставілася.

У гэты час планавалася рэстаўрацыя карпусоў Б і В з размяшчэннем у іх Музея гісторыі горада, таму быў распачаты збор інфармацыі аб іх будаўнічай гісторыі і архітэктуры. Архіўныя пошукі, праведзеныя В. Кукуняй і В. Собалем, дазволілі скласці гістарычную даведку па корпусу В, але яны таксама ставілі пытанне аб магчымасці існавання ў яго структуры больш ранніх цагляных езуіцкіх пабудоў не закраналі. Думкі аб тым, што калегіум да сярэдзіны XVIII стагоддзя быў цалкам драўляным першапачаткова прытрымліваўся і В.В. Гліннік, навуковы кіраўнік рэстаўрацыі калегіума.

У другой палове 90-х гадоў XX стагоддзя В.В. Гліннікам у першыню былі праведзены натурныя даследаванні будынкаў калегіума. Падчас зандажу муроўкі корпуса В ім была звернута ўвага на існаванне ў структуры корпуса В рэшткаў больш ранняй цаглянай пабудовы [3, с. 4]. Пазней ім было высветлена, што ў некаторых дакументах XVIII стагоддзя корпус В праходзіць пад назвай «стары калегіум». Гэтая назва ўзнікла ў сярэдзіне XVIII стагоддзя падчас узвядзення існуючых зараз будынкаў калегіума [3, с. 4]. Звесткі аб знаходжанні на яго месцы кальвінскага збора, прыведзеныя А.К. Марэлем і В.П. Вікенцьевым не знайшлі пацверджання. Больш таго, Ю.А. Бараноўскі, які вывучаў архітэктуру Полацка эпохі барока, указвае на месцазнаходжанне кальвінскага збора на супрацьлеглым баку плошчы [4, с. 203].

Такім чынам, упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі В.В. Глінніку ўдалося паставіць пытанне аб існаванні больш старажытных каменных пабудоў калегіума ўзведзеных у пачатку XVIII стагоддзя. Гэта было зафіксавана ў Архітэктурным праекце, складзеным у 2001 годзе [3, с. 4]. Таксама В.В. Гліннікам была прапанавана рэканструкцыя планаў і фасадаў будынка калегіума пачатку XVIII стагоддзя, але абмежаваны аб'ём натурных даследаванняў прывёў яго да памылковых вывадаў.

Графічныя крыніцы па будынках езуіцкага калегіума таксама даволі сціплыя. Выявы пабудоў калегіума, якія існавалі да сярэдзіны XVIII стагоддзя ёсць на планах Полацка, складзеных падчас Паўночнай вайны. Абодва планы пазначаны датай 1707 год, на іх былі зафіксаваны толькі тыя пабудовы, якія адгрывалі вырашальную ролю пры абароне горада [5, с. 79]. У гістарычнай навуцы больш вядомы план знойдзены М. Ткачовым, дзе калегіум уяўляў сабой вялікі комплекс пабудоў, якія ўтваралі замкнёны дворык. Другі план, які пазней быў знойдзены і вывучаны А. Белым таксама меў выяву калегіума. Але тут выява калегіума ўяўляе сабой невялікую двухпавярховую (?) пабудову з крыжамі на франтонах. А. Белы лічыць гэты план найбольш раннім і дакладным [6, с. 13]. Адзінае, што аб'ядноўвае малюнкі калегіума на планах – наяўнасць высокай вежы каля заходняга тарца будынка (мал. 1). На больш познім плане, знойдзеным М. Ткачовым і датаваным А. Белым 1720-мі гадамі калегіум разам з яўрэйскай школай утвараў дадатковы пояс абароны перад Верхнім замкам.



Мал. 1. Выявы «старога калегіума» на планах, датаваных 1707 годам

Рэшткі яўрэйскай школы выяўлены на вул. Ніжне-Пакроўскай, 7 падчас земляных работ, гэта быў магутны цагляны будынак са скляпеністым сутарэннем. Д.У. Дукам ён датаваны канцом XVII стагоддзя [4, с. 92].

Планы Полацка, апошняй чвэрці XVIII – першай паловы XIX стагоддзя фіксуюць толькі прыблізныя контуры будынкаў існуючага зараз архітэктурнага ансамбля. Найбольш дакладным з іх з'яўляецца абмерны план калегіума складзены ў 1828 годзе [7, с. 17: рис. 6]. Адзінай дэталлю на гэтым плане, якая можа ўскосна сведчыць аб існаванні ў структуры корпуса В больш ранняй старажытнай пабудовы, з'яўляецца ламаная лінія яго паўночнага фасада. Гэта крывізна сцяны бачна і зараз.

Абмерныя чарцяжы падвала і першага паверха корпуса В, складзеныя ў 1828 годзе не дазваляюць выявіць у структуры яго планіроўкі прыкмет больш ранняй пабудовы, бо маюць шэраг недакладнасцяў. Гэтыя недахопы былі ліквідаваны падчас стварэння абмерных планаў падвала ў 2006 годзе. На абмерным чарцяжы, складзеным у 2006 годзе ў падвале корпуса В, звяртае на сябе ўвагу надзвычай тоўстая сцяна ў яго цэнтральнай частцы. Месцамі яе таўшчыня дасягае 3 м, пры гэтым яна не несла ніякай значнай нагрузкі ў існуючым зараз будынку. Таксама звяртае ўвагу разнароднасць абрысаў памяшканняў усходняй і заходняй частцы падвала і іх нестыкоўка паміж сабой.

Археалагічныя крыніцы па будынку корпуса В езуіцкага калегіума прадстаўлены найбольш багата, іх можна падзяліць на тры групы. Да першай групы адносіцца сабраная падчас наглядаў за будаўнічаземлянымі работамі і шурфоўкі ўнутры памяшканняў вялікая калекцыя будаўнічых матэрыялаў, датаваных пачаткам XVII – першай паловай XVIII стагоддзя. Яна прадстаўлена кафляй, цэглай і дахоўкай. Другая група прадстаўлена культурным пластом. Вакол корпуса В ён часам моцна пашкоджаны перакопамі XIX – XX стагоддзяў, але добра захаваўся пад падлогай памяшканнняў корпуса В і дазваляе выявіць сляды будаўніцтва і знішчэння старажытных пабудоў, узведзеных да сярэдзіны XVIII стагоддзя. Таксама ён дазвалае прасачыць структуру засыпцы скляпенняў падвала. Структура яго разнародная – гэта прапласткі

зямлі і будаўнічага смецця, якое засталося ад рамонтаў і пераробак корпуса В, пласты чырвонай абпаленай гліны ад разбураных печаў і вуголляў ад пажараў. Да трэцяй групы археалагічных крыніц можна аднесці выяўленыя ў шурфах, будаўнічых ямах і траншэях муроўкі сцен, падмуркаў, і падлогаў.


Да 1999 года археалагічнае вывучэнне корпуса В полацкага езуіцкага калегіума не вялося. У чэрвені на тэрыторыі корпуса В упершыню быў праведзены археалагічны нагляд Д.У. Дукам пад кіраўніцтвам С.В. Тарасава ва ўнутранім двары калегіума падчас пракладцы каналізацыі да мастацкай галерэі. Ім жа пад кіраўніцтвам С.В. Тарасава ў 2000 годзе былі распрацаваны архітэктурна-археалагічныя шурфы каля падмуркаў корпуса В і дзякуючы праведзеным даследаванням была зафіксаванна разнародная канструкцыя яго падмуркаў і перамешаны культурны пласт з матэрыяламі XVII – XVIII стагоддзяў – кавалкі кафлі з рэшткамі вапнавай рошчыны і плоскай дахоўкі [8]. Больш позднія археалагічныя раскопкі 2001 – 2003 гадоў вяліся ўжо перад мастацкай галерэяй і выявілі развалы кафляных езуцкіх печак, якія засталіся ад драўляных пабудоў калегіума.

Вясной 2003 года таксама пачалася рэстаўрацыя корпуса В – вялася расчыстка скляпенняў над першым паверхам. Засыпка скляпенняў ўяўляла сабой бітую кафлю і пячную абмазку. Яны датаваны першай паловай XVII – сярэдзінай XVIII стагоддзя. Гэты матэрыял быў сабраны аўтарам. Потым рэстаўрацыйныя работы з-за адсутнасці фінансавання спыніліся да 2006 года, пазней корпус быў перададзены Полацкаму дзяржаўнаму універсітэту.

Дзякуючы падтрымцы замоўшчыка ў 2006 – 2008 гадах падчас мадэрнізацыі гэтага корпуса былі праведзены больш глыбокія натурныя даследаванні. Шматлікія дэфармацыі, правалы і трэшчыны бетонных падлогаў патрабавалі высветлення прычын іх узнікнення. Для гэтага вялася шурфоўка ў памяшканнях будынка корпуса В і назіранні за будаўнічымі траншэямі і ямамі прылеглымі да яго падмуркаў.

За два гады даследаванняў быў сабраны багаты матэрыял па архітэктуры корпуса В і існаваўшых на яго месцы ранейшых цагляных будынкаў калегіума. У гэтым артыкуле для большай зручнасці мы пазначым іх назвай «стары калегіум» якая замацавалася з другой паловы XVIII стагоддзя за корпусам В. Прывязка знойдзеных рэшткаў будынка зроблена да абмернага чарцяжа 2006 года.

Асноўная частка. Даследаванні падмуркаў і падвала корпуса В дазволілі высветліць, што яны вельмі разнародны як па будаўнічым матэрыялам, так і па канструкцыі. У заходняй частцы падвала знаходзіцца адзінае памяшканне з крыжовым скляпеннем (зараз яно атынкавана). Муроўка яго была з вельмі тонкай цэглы-пальчаткі таўшчынёй 4,5 – 6 см. Яе даўжыня вагалася ў межах прыкладна 31 – 27 см. Падобная цэгла ўжывалася ў II палове XVII – I палове XVIII стагоддзя [9, с. 112]. Яна была вельмі добрага абпала ад цёмна-чырвонага да ліловага колеру і мела 3 – 4 прадольныя штампаваныя барозны. З захаду ў сцяне памяшкання была глыбокая ніша, з усходу – падобны да яе дзвярны праём (мал. 2). З поўдня і поўначы знаходзіліся вялікія аркавыя праёмы. Муроўка сцен і скляпення гэтага памяшкання была раўнаслойнай, характэрнай для II паловы XVII стагоддзя яна ўжывалася пры падрыхтоўкі сцен пад тынкоўку [9, с. 90].



Мал. 2. Заходняя сцяна памяшкання з крыжовым скляпеннем і прабітай нішай

Прылеглыя да гэтага памяшкання астатнія памяшканні падвала былі змураваны з цэглы іншага фармата. Яны былі ўзведзены ў сярэдзіне XVIII стагоддзя. Цэгла была таўшчынёй 6 – 7,5 см, яе даўжыня вагалася ў межах 29 – 31 см і мела 3 касыя барозны пракрэсленыя пальцамі, гэта асноўны фармат цэглы, з якога збудаваны карпусы калегіума сярэдзіны XVIII стагоддзя. Муроўка сцен гэтых памяшканняў была мяшанай, скляпенняў – тычковай [9, с. 86, 90]. Гэтыя памяшканні мелі цыліндрычныя скляпенні з распалубкамі для ваконных і дзвярных праёмаў і ўяўлялі собой самастойныя пакоі, злучаныя дзвярыма. Усходняя частка падвала была аддзелена ад заходняй часткі магутнай сцяной таўшчынёй да 3 м, якая зафіксавана на абмерным часцяжы 2006 года. Назіранні за ўсходняй часткай падвала паказалі, што яна

таксама мае незвычайную канструкцыю і планіроўку. Параўнанні знойдзенай падчас яе даследаванняў цэглы і характару муровак, з заходняй часткай падвала паказалі, што гэта частка падвала, належыць да будынка «старога калегіума». Першапачаткова гэта было вялікае Г-падобнае памяшканне з нізкім цыліндрычнымі скляпеннямі, якія маюць выступ пад сцяной калідора першага паверха. Пры гэтым таўшчыня скляпення ў тым месцы дасягае 0,6 м. Паўднёвая яго частка знесена пры будаўніцтве ў пачатку XX стагоддзя памяшкання бойлернай. Назіранні за ўсходняй часткай памяшкання падвала «старога калегіума» паказалі, што фармат цэглы яе скляпення, прадольных сцен і вакна паўтарае цэглу памяшкання з крыжовым скляпеннем, яе таўшчыня 4,5 – 6 см. Яна таксама мела прадольныя барозны і аналагічную па структуры рошчыну муроўкі, як у памяшканні з крыжовым скляпеннем. Асноўны жа фармат цэглы большай часткі падвала, падмуркаў і першага паверха «старога калегіума» таўшчынёй 6,7 – 7,5 і даўжынёй 28 – 30 см, але з прадольнымі штампаванымі чатырма барознамі і ўвагнутымі кутамі верхняй пасцелі. Быў таксама прасочаны і стык усходняй і заходняй частцы скляпення падвала старога калегіума». Усходні тарэц гэтай часткі памяшкання быў выкананы ў тэхніцы мяшанай муроўкі з разнафарматнай цэглы – пальчаткі. Яна адрозніваецца ад цэглы скляпенняў. Верагодна, што ўсходняя частка скляпення належала да сутарэння яшчэ больш старажытнай пабудовы сярэдзіны XVII стагоддзя.

Падчас даследаванняў рэшткаў «старога калегіума» ўсяго было знойдзена каля 7 розных відаў цэглы, якія можна датаваць другой паловай XVII – першая паловай XVIII стагоддзя. Ад цэглы-пальчаткі сярэдзіны – канца XVIII стагоддзя яны адрозніваюцца памерамі, якасцю і тэхналогіяй вырабу, колькасцю і размяшчэннем барознаў. Пры гэтым цагліны другой паловы XVII – першай паловы XVIII стагоддзя былі выяўлены альбо ў саміх рэштках «старога калегіума, альбо непасрэдна каля яго. Памяшканне падвала «старога калегіума» першапачаткова не было звязана з астатняй заходняй часткай падвала і толькі ў цэнтры заходняй сцяны меліся прыкметы дзвярнога праёма. Апошні быў арыентаваны на вышэйназванае памяшканне з крыжовым скляпеннем і, магчыма, быў звязаны з ім падземным пераходам. Падчас будаўніцтва корпуса В сярэдзіны XVIII стагоддзя пераход быў знесены, дзвярны праём прыстасаваны пад новыя памяшканні. Таксама было высветлена, што патаўшчэнне сцяны да 3 м утварылася ў выніку ўзвядзення побач с заходняй вонкавай сцяной «старога калегіума» новых памяшканняў сярэдзіны XVIII стагоддзя. Падвал «старога калегіума» з пачатку меў тры акны. Пазней паўднёвае вакно было перароблена ў дзвер, а ў пачатку XX стагоддзя знесена.

Ва ўсходняй сцяне асноўнага памяшкання ёсць замураваная лествіца з першага паверха (мал. 3). Яе прыступкі – з пастаўленай на кромку малафарматнай пальчаткі. Скляпенне лествічнага праходa цыліндрычнае, з пачатку выкладзена продольнымі шэрагамі, потым выканана ў «ёлку». У паўднёвай сцяне гэтага перахода знаходзілася неглыбокая ніша з шэрай тынкоўкай.



Мал. 3. Праём лесвіцы ў падвал з першага паверха

На ўсход ад бойлернай захавалася скляпеністае памяшканне з вельмі тоўстай цэглы-пальчаткі (мал. 4). Назіранні за ім паказалі, што гэтае памяшканне было ўпушчана ў існуючый контур падмуркаў у канцы XVII – пачатку XVIII стагоддзя, ужытая ў муроўцы яго прадольных сцен і скляпенняў цэгла памерамі ад 7,5 – 8,0×15×30 – 31 см. Муроўка прадольных сцен і скляпення тычковая (мал. 5).

У паўночнай сцяне з маленькай нішай і паўднёвай, з вакном, цэгла больш тонкая, яны выкананы ў тэхніцы мяшанай муроўкі. Абедзве сцяны, магчыма, зроблены пазней, у сярэдзіне XVIII стагоддзя, такім чынам, былі ўмацаваны і абкладзены падмуркі «старога калегіума», якія маглі дасягаць глыбіні каля 3,0 м ад сучаснай дзённай паверхні. Падмуркі сцен «упушчанага» памяшкання знаходзяцца на глыбіне каля 3,5 м. Паміж сцянамі апошняга і першапачатковымі падмуркамі «старога калегіума» знойдзены кавалкі хвалістай дахоўкі, якая з'явілася ў канцы XVII – пачатку XVIII стагоддзя [9, с. 128]. Аб больш позднім паходжанні гэтага памяшкання сведчаць і кавалкі кафлі ў засыпцы над яго скляпеннем. Цэгла памерамі

ад 7,5 – 8,0×15×30 – 31 см аналагічна цэгле дома Пятра I, збудаванага ў 1692 годзе [5, с. 478], там яна ўжыта ў муроўцы сцен падвала разам з малафарматнай цэглай-пальчаткай.



Мал. 4. План першага паверха корпуса В з рэшткамі муроў «старога калегіума»



Мал. 5. Тычковая муроўка ўсходняй сцяны «ўпушчанага» памяшкання

Падмуркі «старога калегіума» былі выкананы з вялікіх камянёў да 0,6 м у дыяметры. Яны знаходзіліся на рознай глыбіні. Некаторыя з іх былі пакладзены «насуха». У месцах, дзе падмуркі былі найбольш глыбокімі, для эканоміі матэрыялу былі ўсталяваны вялікія паўцыркульныя разгрузачная аркі шырынёй каля 3,0 м, але ў любым выпадку ў іх муроўцы сустракалася шмат кафлі пачатку – сярэдзіны XVII стагоддзя, яе самыя познія пласціны мелі «дывановы арнамент» [10, с. 103, 107]. Часам кафля мела сляды нагара. Гэтая кафля была выкарыстана ў якасці напаўняльніка вапнавай рошчыны пры будаўніцтве падмуркаў. Падмуркі «старога калегіума» праразалі культурны пласт практычна да мацерыка. Падчас яго даследавання ўнутры памяшканняў сустрэты праслойкі абпаленай чырвонай гліны і кафлі сярэдзіны XVII стагоддзя. Яны былі на глыбіне каля 1,0 м ад сучаснай падлогі і не дамыкалі да падмуркаў. Гэтыя праслойкі гліны захаваліся ад печак драўляных будынкаў, якія папярэднічалі «старому калегіуму».

Ніжнія часткі сцен першага паверха «старога калегіума» таксама ўтрымоўвалі кавалкі кафлі, аналагічнай той, што сустрэта ў яго падмурках. Часткова сцены былі выкананы ў тэхніцы двухпанцырнай (лусковай) муроўкі, больш характэрнай для будынкаў першай паловы XVII стагоддзя [9, с. 83, 86]. Сярэдзіна сцен, акрамя кафлі з чатырохбаковым і «дывановым» арнаментам [10, с. 103, 107], была забутавана невялікімі камянямі. У гэтай тэхніцы былі выкананы як унутраныя, так і знешнія сцены паўночнай частцы будынка. Гэта пацвердзіў адзін з шурфоў, які закладзены ў 2000 годзе Д.У. Дукам і С.В. Тарасавым каля паўночнага фасада той частцы будынка, дзе схаваны рэшткі «старога калегіума». Там Д.У. Дукам было знойдзена шмат плоскай паўцыркульнай дахоўкі і кафлі з рэшткамі вапнавай рошчыны сярэдзіны XVII – пачатку XVIII стагоддзя. Пласты, дзе былі выяўлены гэтыя матэрыялы, утварыліся ў сярэдзіне XVIII стагоддзя, калі знешняя паверхня муроў «старога калегіума» была разабрана да падмуркаў. Пасля гэтага падмурак і сцяна былі ўзведзены зноў. Пры гэтым іх першапачатковы накірунак часткова зменены і сцяна набыла крывізну, якая была «схавана» з дапамогай руставаных пілястраў. Крывізна і разнароднасць структуры сцяны і выклікала неабходнасць яе дадатковага ўмацавання гліняным замком у сярэдзіне XVIII стагоддзя, пасля гэтага ён быў засыпаны перамешаным слоем. Там жа быў

знойдзены кавалак кафлі з гербам князёў Друцкіх-Сакалінскіх. Далейшыя назіранні ў памяшканні, каля якога быў выкапаны гэты шурф, паказалі, што гэты фрагмент належаў кафле адной з печаў «старога калегіума» [8, с. 3 – 4; 4, с. 60].

Даследаванні на першым паверсе корпуса В дазволілі часткова аднавіць планіроўку памяшканняў і інтэр'еры «старога калегіума». Былі прасочаны вялікія фрагменты капітальных унутраніх сцен і часткі вонкавай паўднёвай. Ва ўсходняй частцы існуючага зараз калідора захаваліся тры вялікіх фрагмента сцен і нават частка скляпення «старога калегіума». Паўночная сцяна калідора корпуса В захавала фрагмент з рэшткамі ўвахода ў сутарэнне «старога калегіума» – нізкага дзвярнога праёма з лучковай аркай, у яго адхоне зафіксаваны крук ад дзвярной завесы. Наступны фрагмент сцяны з боку памяшканняў корпуса В меў счасаную ў сярэдзіне XVIII стагоддзя паверхню муроўкі на глыбіню да ½ цагліны – раней на яе месцы была пята скляпення над лествіцай у падвал. Таксама гэты фрагмент сцяны захоўваў рэшткі ўвахода ў паўночнае памяшканне, які першапачаткова меў лучковую арку, з абодвух бакоў сцяны знаходзіліся дзве нішы. На іх паверхні ацалелі рэшткі пабеленай тынкоўкі. Паміж расчасаным праёмам і нішай «старога калегіума» былі прасочаны рэшткі счасанай перагародкі ў адну цагліну. Супрацьлеглая сцяна калідора таксама мела нішу і рэшткі дзвярнога праёма. Палова нішы была перакрыта вонкавай тарцовай сцяной калідора сярэдзіны XVIII стагоддзя. Гэта сведчыла, што «стары калегіум» выходзіў за межы корпуса В. Паўднёвая паверхня гэтага фрагмента сцяны з боку памяшкання ад вышыні 1 м была счасана, магчыма да сярэдзіны XVIII стагоддзя тут была пята скляпення. Усходняя вонкавая сцяна існуючага зараз будынка ўключае ў сябе вялікі фрагмент капітальнай перагародкі з двума нізкімі і глыбокімі нішамі з рэшткамі пабелкі. У паўднёвай вонкавай сцяне корпуса В захаваліся нязначныя кавалкі вонкавай сцяны «старога калегіума».

Частка сцен «старога калегіума» была знойдзена пад бетонам падлогі пачатку – першай паловы XX стагоддзя, яны былі выкарыстаны ў якасці падмуркаў капітальных перагародак сярэдзіны XVIII стагоддзя. Сцены «старога калегіума» былі значна таўсцей за іх, каля 1 – 1,2 м. Гэта сведчыла, што яны былі разлічаны на цяжар скляпеністай столі. Фрагмент апошняй быў выяўлены ў муроўцы сцяны ўсходняга тарца калідора корпуса В. Яна знаходзіцца на вышыні каля 3,8 м ад сучаснай падлогі. Муроўка скляпення ў цагліну, тычковая, на ім часткова захавалася пабеленая тынкоўка (мал. 6).




Мал. 6. Скляпенне «старога калегіума»
ў муроўцы ўсходняй тарцовай сцяны калідора корпуса В

Дзякуючы рэшткам скляпення і сцен стала магчыма аднавіць прыблізныя памеры чатырох памяшканняў «старога калегіума» (мал. 7).

Таксама былі сустрэты рэшткі падлогаў і печаў. Найлепш падлогі захаваліся ў тых памяшканнях, пад якімі не было падвала. Падлогі былі выкананы з квадратных тонкіх керамічных плітак 18,2 × 19,2 × 3,5 см, якія былі пакладзены на пяшчную падсыпку. Блізкія па фармату пліткі (мал. 8) знойдзены ў Полацку на Запалоцкім пасадзе, дзе былі датаваны XVIII стагоддзем і ў Магілёве [4, с. 97, 122].

Таксама былі сустрэты рэшткі двух печак, якія аціплялі «стары калегіум». Падмурак печы № 1 уяўляў сабой аплыўшы бугор гліны з квадратнай пляцоўкай па сярэдзіне памерамі каля 0,8 × 0,8 м. На ўзроўні падэшвы, мяркуючы, па мяжы рэшткаў пліткавай падлогі памеры апечка печы былі каля 1,5 × 2,0 м у развале было шмат кафлі другаснага ўжытку пачатку – сярэдзіны XVII стагоддзя. Большасць яе мела выявы герба Друцкіх-Сакалінскіх [4, с. 60]. Таксама знойдзены кафлі з езуіцкай сімволікай і выявамі вазы з кветкамі, падобныя тым, што вывучала Н.І. Здановіч, але кафлі з калегіума не мелі рамкі [8, с. 104, 107]. Сустрэты таксама і кавалкі цэглы са штампаванымі прадольнымі барознамі. Гэты комплекс матэрыялаў дазволіў зрабіць рэканструкцыю магчымага выгляду печы № 1. Асновай для рэканструкцыі яе канструктыўных асаблівасцяў знойдзенай печы стаў малюнак печы XVII стагоддзя з выявай камбінаванай печ, але крыху іншай канструкцыі [10, с. 115].



Мал. 7. План першага паверха корпуса В з рэшткамі мураў «старога калегіума»

– існуючыя і выяўленыя муры «старога калегіума» (да сярэдзіны XVIII ст.);
– існуючыя і выяўленыя муры кадэцкага корпуса і шпіталя (XIX – XX стст.);
– мяркуемыя і страчаныя муры «старога калегіума» (да сярэдзіны XVIII ст.);
– мяркуемыя і страчаныя муры кадэцкага корпуса і шпіталя (XIX – XX стст.);
– шурфы, зонды;
– існуючыя і выяўленыя муры новага калегіума (сярэдзіны – канца XVIII ст.);
– розначасовыя пераробкі;
– мяркуемыя і страчаныя муры новага калегіума В (сярэдзіна – канец XVIII ст.);
– трубы, бэлькі;
– калодзежы і трубы пачатку XX ст.

Знойдзеная печ № 1 была вялікім збудаваннем на высокім цагляным апечку, прыкладна на вышыне каля 0,5 м ён завяршаўся шырокім цагляным выступам, аформленым у выглядзе драўлянай лавы і пакрытым шырокімі дошкамі. Далей пачынаўся ніжні ярус з топкай. Яго шырыня была каля 1 – 1,2 м і ён таксама быў цагляны. Гэты ярус падзяляўся на дзве няроўныя часткі. У меншай частцы ў паўднёвай сценцы печы было аркавае вусце скляпеністай топкі. Под топкі быў выкладзены цэглай і меў нахіл у паўднёвы бок. Гэта частка топкі магла мець канічны альбо акруглы верх сценак з умазанымі ў яе міскавымі кафлямі з блізкім да квадрату вусцем. Паўночная частка топкі была квадратнай і служыла асновай для кафлянай надстаўкі. Яна таксама мела ўстаўкі міскавай кафлі ў сярэдніх частках сцен. Куты яе былі абвязаны цэглай. Не выключна, што гэтыя часткі печы былі абмазаны глінай, аздоблены прафіляванымі карнізамі і пабелены, такім чынам былі бачны толькі вусці міскавыых кафляў. Надстаўка была квадратнай, сабранай з разнатыпнай зялёнапаліванай і тэракотавай кафлі. Яна мела складаную архітэктоніку. Сама печка, магчыма, была трохкамернай, каўпаковай, для яе палення ў паўднёва-заходнім куце памяшкання была зроблена невялікая пляцоўка [12, с. 23; 13, с. 62]. Дымаход з засаўкай пры гэтым знаходзіўся, верагодна, у заходняй сцяне памяшкання (мал. 9).




Мал. 8. Фрагмент прасеўшай плітквай падлогі «старога калегіума» з нагарам ад пажару


Рэшткі яшчэ адной печы (печ № 2) былі знойдзены ў паўночна-заходнім кутнім памяшканні «старога калегіума». Яны ўяўлялі сабой цагляную пляцоўку 1,5 × 1,5 м, размешчаную на цэнтральнай восі скляпення. Магчыма, яна ацяплялася з боку калідора праз пячны праём, над якім быў дымаход. Яе кафля была скінута за сценкай у сумежным памяшканнні сярэдзіны XVIII стагоддзя ў якасці засыпцы скляпення падвала. Падчас даследаванняў пад падлогай гэтага памяшкання была сабрана унікальная калекцыя кафлі розных тыпаў. Вырабы адносіліся да пачатку – сярэдзіны XVII стагоддзя. Некаторыя іх тыпы добра вядомы па аналагічным матэрыялам вывучаным Н.І. Здановіч [10, с. 103, 108]. Але большасць з іх былі даволі рэдкія, альбо сустракаліся ўпершыню.

Большасць кафлі зялёнапаліваная, ёсць пласціны з надрэзамі, для закладкі шчылін. Некаторыя кафлі з'яўляліся свавасаблівымі іконамі з выявамі «Нараджэння Хрыстова» і «Маленні аб Чашы», куты яе шэрагаў аздаблялі гарэльефныя выявы мужчын у рэнесансных строях. Яны не маюць аналагаў. Магчыма, гэтая кафля паходзіць з печак разбуранага пасля захопу царскім войскам Полацка езуіцкага касцё-

ла, збудаванага ў 1636 годзе. Гэты касцёл меў каменныя крыпты [7, с. 4] і, верагодна, да яго можна аднесці памяшканне з крыжовым скляпеннем і ўсходняя частка скляпення Г-падобнага падвала. Гэтая версія патрабуе дадатковай праверкі.



Мал. 9. Рэканструкцыя магчымага выгляду ўсходняга і паўночнага фасада печы № 1




Мал. 10. Рэканструкцыя магчымага выгляду паўночнага фасада печы № 2

Сама печка ўяўляла сабой вялізарны гмах вышыёй каля 3 – 3,5 м, яна была цалкам сабрана з разнатыпнай кафлі другаснага карыстання (мал. 10.)

З улікам разнатыпнасці кафлі можна меркаваць, што цаглянай была ўся печка. Гэта было двухкамернае збудаванне з вялікай топкай у ніжняй камеры. Таўшчыня сценак яе скляпеністай топкі месцамі магла быць у цагліну. З улікам таго, што ў плане яна была блізкай да кватрату, надстаўка ўзведзеная з пакладзенай на рабро цэглы, мела чатыры жаравых калодзежа. Галоўны паўночны фасад быў цалкам з зялёнапаліванай і бакавыя, асабліва каля сценкі – з тэракотавай. Майстрам якія яе збудавалі патравалалася сумясціць разнатыпныя і разнафарматныя кафлі не толькі ў люстэрцы печы, але і ў межах аднаго шэрага, зыходзячы толькі з іх памераў, таму печ набыла вельмі складаную і незвычайную архітэктоніку. Разам з тэракотавымі кафлямі ў бакавых фасадах месціліся і міскавыя. Яны чаргаваліся з квадратнымі пласцінамі 17,5 × 17,5 см. Найбольш шырокія швы паміж кафлямі таксама былі на бакавых фасадах печы, бліжэй да сцяны памяшкання. Яны маглі дасягаць шырыні 1 – 1,5 см. Прыклад іх размеркавання па люстэрку печы добра паказаны на праектным малюнку XVII стагоддзя [9, с. 148: рис. 99]. Насупраць усходняга фасада печы № 2 была прасочана пляцоўка лествіцы перад уваходам у паддашша, якая была над уваходам у падвал. Што тычыцца даху будынка, то ён быў пакрыты плоскай дахоўкай з акруглым тарцом, кавалкі якой былі сустрэты і ўнутры памяшканняў (мал. 11).

Назіранні за фасадамі корпуса В дазваляюць меркаваць, што, магчыма, дэкор першага паверха – руставаныя пілястры – быў запазычаны ў сярэдзіне XVIII стагоддзя ад будынка «старога калегіума», бо ў пабудовах калегіума сярэдзіны XVIII стагоддзя яны больш нідзе не сутракаюцца. Гэтае меркаванне патрабуе дадатковага пацверджання архіўных пошукаў і дадатковых даследаванняў памяшкання з крыжовымі скляпеннямі, асабліва яго паўднёвай сцяны, якая ўмуравана ў сценку кацельні і можа ўтрымліваць іх рэшткі.



Мал. 11. Фрагмент прасеўшай пліткавай падлогі «старога калегіума» з нагарам ад пажару

Параўнанне выяўленых і даследаваных археалагічных рэштак «старога калегіума» з яго выявамі на планах першай паловы XVIII стагоддзя паказала, што, магчыма, яны адлюстроўваюць розны стан будынка да і пасля перабудовы, якая адбылася ў першай чвэрці XVIII стагоддзя, калі быў створаны другі план. Абодва малюнкі добра накладваюцца на выяўленыя падмуркі і падвалы.

Памяшканне з крыжовым скляпеннем было падмуркам наглядальнай вежы, якая была звязана з каменным калегіумам падземным пераходам. Яна прыкрывала і галоўны ўваход у будынак, які знаходзіўся ў яго заходняй сцяне. Цалкам магчыма, што гэта вежа магла быць драўлянай і атынкаванай звонку. Таксама цікава і размяшчэнне калегіума – на стыку Верхняга і Ніжняга замку з Вялікім пасадам. Такім чынам, ён разам з яўрэйскай школай утвараў дадатковы пояс абароны. Абарончы характар «старога калегіума» тлумачыць і незвычайную таўшчыню падмурка яго паўднёвай сцяны, якая некалькі разоў перабудоўвалася і нарошчвалася. Гэтая сцяна першая прымала ўдар ворага пры аблозе комплексу. Не менш трывалымі былі скляпенні падвалаў і першага паверха, іх муроўка ў самым тонкім месцы была ў адну цагліну – каля 30 см. Гэтым жа абрончым мэтам служыла і размяшчэнне ўвахода ў падвал з нутры пабудовы.

На працягу апошняй чвэрці XVII – першай паловы XVIII стагоддзя «стары калегіум» неаднаразова перабудоўваўся. Паводле выяў «старога калегіума» на прыгаданых планах Полацка прыкладна паміж 1707 і 1720 гадамі быў перанесены вонкавы ўваход у падвал з-пад галоўнага будынка ў сутарэнне вежы і дабудавана ўсходняя частка без падвала. Аб гэтым сведчаць разабраныя разгрузачныя аркі паўднёвай сцяны, «упушчанае» памяшканне канца XVII – пачатку XVIII стагоддзя каля бойлернай. Таксама знойдзены рэшткі сцен, якія канструктыўна не звязаны як з рэшткамі даследаваных памяшканняў «старога калегіума», так і існуючага зараз корпуса В. Магчыма, у гэты час з'явілася першая медальённая кафля і кафля з выявамі вазы з кветкамі ў дадатковай дэкаратыўнай васьмікутнай рамцы [14, с. 47]. Гэтыя кафлі мелі аднаўступную рамку. Кавалкі кафлі з выявамі букета ў вазе былі знойдзены як у засыпцы скляпення «ўпушчанага» памяшкання падвала пад падлогай канца XVII – пачатку XVIII стагоддзя, так і ў самім памяшканні падвала. Але туды яна трапіла ў пачатку XX стагоддзя пры зносе паўднёвай частцы падвала «старога калегіума» [15, с. 24]. Можна меркаваць, што паўднёвая частка «старога калегіума» найчасцей рэканструявалася і перабудоўвалася, чым і можна патлумачыць знаходжанне тут гэтых тыпаў кафлі.

Пасля апошняй перабудовы «стары калегіум» набыў два галоўныя фасады, паўднёвы і ўсходні, перад якім была плошча і касцёл. Таксама з'явіўся ўнутрані дворык акружаны з трох бакоў драўлянымі пабудовамі. Прыблізна ў такім выглядзе «стары калегіум» праіснаваў да сярэдзіны XVIII стагоддзя, калі ён быў знішчаны вялікім пажарам.

Высновы. У выніку праведзеных натурных даследаванняў было высветлена, што ў структуры корпуса В знаходзяцца рэшткі двух цагляных пабудоў апошняй чвэрці XVII – першай паловы XVIII стагоддзя – вежы і галоўнага корпуса калегіума. Апошні неаднаразова перабудоўваўся. Гэта былі галоўныя і найбольш прадстаўнічыя пабудовы калегіума. Яны былі ўзведзены ў апошняй чвэрці XVII стагоддзя на рэштках яшчэ больш стражытных падмуркаў і сутарэнняў. Збудаванні ўзводзіліся з разнафарматнай цэглы ад разбураных пабудоў калегіума і кацёла і дамоў мяшчан, узведзеных падчас вайны. Для яго печак ужываецца кафля пачатку – сярэдзіны XVII стагоддзя другаснага выкарыстання, частка якой можа паходзіць з драўлянага касцёла, збудаванага ў 1636 годзе. Дах будынкаў с пачатку быў пакрыты плоскай дахоўкай з круглым тарцом, пазней яна часткова заменяецца хвалістай дахоўкай. Сам будынак «старога калегіума» спалучаў у сябе рысы архітэктуры і планіроўкі гарадской сядзібы і абарончага ўмацавання. Выявы на планах, датаваных 1707 годам, сведчаць пра яго значныя і шматразовыя перабудовы, першая з якіх, магчыма, адбылася на мяжы XVII і XVIII стагоддзяў – час узвядзення дома Пятра I (1692 г.). Ваход у будынак знаходзіўся з захаду па сярэдзіне сцяны і быў умацаваны высокай наглядальнай трохпавярховай вежай. Яна была злучана з ім падземным пераходам.

Аздабленне фасадаў будынка было вельмі сціплым і, магчыма, элементы яго дэкору паўтораны на першым паверсе корпуса В, каб падкрэсліць пераемнасць будаўнічых традыцый і захаваць памяць аб папярэднім каменным калегіуме. У той час калегіум становіцца значным і складаным архітэктурным ансамблем, які складаўся з каменных і драўляных пабудоў і пачаў аказваць істотны ўплыў на фарміраванне архітэктурнага ансамбля гарадской гандлёвай плошчы.

Як і раней, Полацкі езуіцкі калегіум чакае новых даследчыкаў. Неабходны новыя архіўныя пошукі. Здабытыя археалагічныя матэрыялы і атрыманыя вынікі даследаванняў патрабуюць далейшага, больш глыбокага вывучэння і асэнсавання.

ЛІТАРАТУРА

1. Морель, А.К. История города Полоцка и возникновение здания Полоцкого кадетского корпуса / А.К. Морель. – Вильно, 1907.
2. Викеньтьевъ, С.П. Полоцкій кадетскій корпусь (историческій очеркъ 75-летія его существованія) / С.П. Викеньтьевъ. – Полоцк, 1910. – 396 с., 43 табл. КП – 5 2457 2458.
3. Глинник, В.В. Архитектурный проект. Общая пояснительная записка / В.В. Глинник, В.Д. Старостин. – Минск, 2001. – Раздел 1. Объект 06-98 ОПЗ.
4. Дук, Д.У. Полацк XVI – XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.
5. Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 т. / А.І. Лакотка [і інш.]; навук рэд. А.І. Лакотка. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – Т. 2. XV – сяр. XVIII ст. – 626 с.
6. Белы, А. Plan von Rolocko anno 1707 / А. Белы // Спадчына 4. – 1998. – С. 12 – 16.
7. Глинник, В.В. Лицензия № П-920/1 Благоустройство территории комплекса иезуитского коллегиума в г. Полоцке. Комплексные научные изыскания / В.В. Глинник. – Минск, 2004.
8. Дук, Д.У. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у г. Полацку ў 2000 г. / Д.У. Дук, С.В. Тарасаў // Архіў ін-та гіст. НАН Беларусі. – Воп. 1. – Спр. № 1880. – С. 3 – 4.
9. Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI – XVII вв.: архитект.-археолог. анализ / О.А. Трусов. – Минск: Наука и техника, 1988. – 160 с. ил.
10. Здановіч, Н.І. Полацкая кафля XVI – XVII стст. / Н.І. Здановіч // Гіст.-археалаг. зб. – 2001. – № 12. – С. 103 – 125.
11. Трусаў, А.А. Старонкі мураванай кнігі. Манументальная архітэктура эпохі феадалізма і капіталізма / А.А. Трусаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 191 с.
12. Литавар, В.В. Как построить печь, камин, баню / В.В. Литавар, Г.Л. Койданов. – Минск, 1999.
13. Dąbrowska, M. Kafle i piece kaflowe w Polsce do konca XVIII w. / M. Dąbrowska // Studia i materiały z historii kultury materialnej. – 1987. – T. LVIII. – 270 s.
14. Заяц, Ю.А. Заслаўская кафля / пад рэд. Г. В. Штыхава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 62 с.
15. Кукуня, О. Объект: историко-культурная ценность иезуитского коллегиума в г. Полоцке (Корп. «Б» и «В») / О. Кукуня, В. Соболь // Историко-архивные и библиограф. исслед. – Минск, 2001. – С. 1.

«БЕЛЫЯ ПЛЯМЫ» ПОЛАЦКАЙ АРХЕАЛОГІІ І ГІСТОРЫІ

канд. гіст. навук, дац. С.В. ТАРАСАЎ
(Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва, Мінск)

Першыя беларускія міфы, паданні, легенды, такія, напрыклад, як «Стаўры і Гаўры» ці «Легенда пра Белаполя», канкрэтна прывязваюцца да тэрыторыі, зямлі, на якой пачалі мешкаць продкі беларусаў. Прычым вельмі істотна, што гэтая тэрыторыя, апрача таго, што яе абабеглі міфалагіныя сабакі, ці абляцелі казачныя птахі, яшчэ была абазначана і рэкамі: Дняпром і Дзвіной як не толькі натуральнымі межамі, але і шляхамі спачатку для звяр'я, а потым і для людзей [1, с. 78 – 79].

Ад міфалагічнага мінулага ў беларусаў застаўся з большага толькі пантэон язычніцкіх багоў, ды нязменнае да сённяшняга дня жыццё па няпісаных правілах земляробчага календара. Змяняюцца разам з гісторыяй афіцыйныя і дзяржаўныя святы, нават дапаўняюцца новымі святамі царкоўныя каляндары, а вось Купала, Дажынкі, Юр'я, Каляды, Радаўніца-Дзяды – застаюцца нязменнымі. І гэта быў той крок, дзякуючы якому мы не толькі адзначыліся на абжытай намі зямлі, але і вызначыліся на ёй сваёй адметнасцю і непаўторнасцю.

Бадай самым ці не істотнейшым крокам для любога народа становіцца яго палітычнае вызначэнне ў абшарах існавання сабе падобных. І ён звязаны не толькі з хрэстаматыйным выдучэннем моцных, багатых канцэнтрацыяй уласнасці ў абмежаваных колах і руках. Любая палітычная структура абвяшчала аб

сабе ўвядзеннем кодэксаў законаў, правілаў, усталяваннем аўтакратычнай, альбо нават дэмакратычнай улады (прыгадем існаваўшыя храналагічна адначасова грэчаскую рэспубліку, Персію і Егіпет). Неад'емнай умовай дзяржаўнасці станавілася пісьмовасць, справаводства, і выцякаючыя з усяго гэтага, дзяржаўныя структуры. Для сённяшніх даследчыкаў ужо не істотна, ці захавалася пісьмовасць таго ці іншага народа-дзяржавы, альбо ці здольны мы яго прачытаць, ці іначай кажучы, ці адлюстравана ў нечым пісьмовым рання храналагічная гісторыя. (Так, мы мала ведаем пра Месапатамска-Ассірыйскую цывілізацыю ці Егіпетскую, нават навучыўшыся чытаць клінапісныя таблічкі і егіпецкія іерогліфы. Да сёння для нас загадка, нават пры наяўнасці пісьмовых крыніц, гісторыя фінікійцаў, Крыта-Мікенскай цывілізацыі ці, напрыклад, нубійцаў, на мове якіх гаварылі фараоны многіх дынастый, па прычыне немагчымасці прачытаць напісанае). Разам з тым у так званых мёртвых мовах іншых народаў паўстае гісторыя народаў суседніх. І менавіта па гэтых звестках, спалучаючы іх з матэрыяльнымі рэшткамі-артэфактамі, мы можам меркаваць аб гістарычным шляху і многіх народаў, і многіх дзяржаваў.

Да падобных народаў і дзяржаў можна аднесці і нас беларусаў. Не таму, што не мелі сваёй пісьмовасці ў самай далёкай старажытнасці, ці яна была не патрэбнаю ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Апускаючы праблему старажытнаславянскай дахрысціянскай пісьмовасці, так званых «чэрт і рэзаў», адзначым, што розныя значкі, сімвалы, як потым і літары, досыць часта сустракаюцца на археалагічных матэрыялах дахрысціянскай і раннехрысціянскай эпох. Тут хутчэй пытанне, кажучы сучаснай моваю, у матэрыяльных носьбітах інфармацыі тых часоў. І тое, што першае напісанае ў X стагоддзі слова на тэрыторыі Усходняй Еўропы звязана з імем полацкага князя Ізяслава (яго знакамітая пячатка) вельмі яскравы паказальнік. Узгадаем яшчэ раз, што імя князя было, як прынята лічыць, перададзена ў гэтак званай кірылічнай (славянскай) графіцы, але ў грэцка-візантыйскім гучанні: «Изос(ла)озо» [2, с. 114 – 136]. (Дарэчы, сёння ўжо можна і дыскутваць, ці кірылічнымі літарамі тое было напісана. Ці не была грэцкая мова афіцыйнаю моваю не толькі царквы, але і справаводства на землях усходнеславянскіх дзяржаў, як потым падобнаю сталася латынь у Рымскай імперыі і імперыі Карла Вялікага, а старабаўгарская ў нас?) Так ці іначай, але менавіта ў дзяржаўных адносінах, справаводстве, сферы міжнародных адносін (пячатка Ізяслава прывешана была да нейкага дакумента, а знойдзена ў Ноўгарадзе) гэтая пячатка першы матэрыяльны факт таго, што Полацк быў не шараговым горадам у Гардарыцы, а цэнтрам самастойнай паўночнавартаснай дзяржавы. Апрача вядомых летапісных падзей, менавіта гэтая пячатка другой паловы X стагоддзя сведчыць аб Полацку як месцы, з нетраў якога выйшаў цэлы народ, утварыўшы дзяржаву і нацыю.

У сучаснай гістарычнай навуцы, а таксама ў такіх навуках, як этналогія, археалогія, лінгвістыка, назапашана дастаткова многа факталагічнага матэрыялу. Зразумела, што ён будзе збірацца і надалей. Аднак ужо некалькі гадоў таму, можа нават дзесяцігоддзяў, усё ярчэй паўстае пытанне не аб вывучэнні фактаў саміх па сабе, а аб кантэксце, у якім яны існуюць. Глыбінныя зрэзы факталагічнай структуры, спробы разгледзіць сацыяльныя ці эканамічныя адносіны ў межах аднаго супольніцтва, ці металаграфічны, спектральны і іншы аналіз прыладаў працы, яшчэ адказваюць на пытанне «ЯК», але не тлумачаць «ЧАМУ».

За многія гады вывучэння Полацка па крыніцам летапісным і археалагічным мы з пэўнай верагоднасцю робім рэканструкцыю ўзнікнення і існавання горада на працягу болей тысячы гадоў. Мы ведаем з большага, як пачынаў будавацца Полацк, як ён разрастаўся, як паўставалі ягоныя пасады ў розныя стагоддзі, як жылі гараджане і набілітэт. Як і што елі, дзе спалі, чым займаліся, як кахаліся, спрачаліся і судзіліся. У што верылі, каму верылі, а каму не, на каго хадзілі паходамі, ад каго бараніліся. Ведаем паіменна многіх славутых палачанаў, ганарымся імі і шануйма іх. Але вось некалькі фактаў, існуючых у гістарычнай храналогіі горада і краіны, але абсалютна не зразумелыя і не растлумачаныя да сёння: Якое стагоддзе лічыць пачаткам існавання Полацка як горада? Кім быў першы полацкі князь? Дзе археалагічныя сведчанні існавання горада ў IX стагоддзі? Чаму Рагнеда спрабавала забіць Уладзіміра пасля стольких гадоў сумеснага жыцця? Што рабіў Усяслаў Чарадзей апошнія 20 гадоў свайго жыцця? Кім і адкуль былі першыя полацкія хрысціяне і святары, і дзе манастыры IX – XI стагоддзяў? Куды падзеўся археалагічны пласт горада XIV – XVI стагоддзяў? Навошта Еўфрасіння выправілася ў паломніцтва? Чаму Скарына скончыў жыццё садоўнікам у Празе, а Семеон Полацкі ў Маскве? Нарэшце, дзе полацкія летапісы і берасцяныя граматы, не кажучы пра сапраўдны Еўфрасіньеўскі крыж? На чым пісалі палачане ў раннім сярэднявеччы? Які характар мела ў горадзе рамесніцкая вытворчасць? Як паміж сабою суадносіліся рамяство, гандаль і сельская гаспадарка? Пытанні можна было б доўжыць. Але адказу на большасць з іх у самім Полацку, як гэта не дзіўна, мы можам і не знайсці.

Застаецца толькі спроба вызначэння кантэкстных уплывовых фактараў, якія адыгрывалі ролю ў фармаванні той ці іншай з'явы. Напрыклад. Чаму Полацк узнік менавіта ў сутоцы Дзвіны і Палаты? З пункту гледжання паходжання назвы – зразумела. Аднак, чаму менавіта адсюль пачалося складванне магутнай дзяржавы, а не з Віцебска, Друі ці Дзісны, якія знаходзяцца ў аналагічных прыродна-геаграфічных умовах. Чаму гэтая дзяржава пачала будавацца на поўначы, сярод гушчароў і камяністых палёў, з непрацяглым летам і паніжанымі сяроднегадавымі тэмпературамі, а не вакол, напрыклад, горада на Менцы – першапачатковага Менску, і тым больш не з Турава. Можа справа ў тым, што прыродны, безумоўна, важкі фактар быў не галоўным. Тады які?

Аб гэтых фактарах мы пагаворым крыху ніжэй. А зараз найперш аб пытаннях, якія застаюцца ў археалогіі Полацка. Нягледзячы на тое, што за апошнія дзесяцігоддзі значна прасунуліся нашы веды аб тапаграфічным развіцці горада, застаецца яшчэ вельмі многа пытанняў.

Сярод іх на першае месца мы вылучылі б пытанне аб найстаражытнейшым цэнтры IX стагоддзя. Не ставячы пад сумненне ролю знойдзенага А. Ляўданскім гарадзішча, мы да сёння не можам сказаць аб ягоных рэальных памерах і тапаграфічнай структуры (як вонкавай, а яшчэ менш, унутранай) у часы Рагвалода. Не выклікае сумненняў, што яно было большым за той прыняты на сёння 0,85 га. Як мы даводзілі ў сваёй манаграфіі, пачатковае гарадзішчы было мысавага тыпу [3, с. 36, 61 – 62]. У гэтай сувязі таксама застаецца пытанне аб характары пасадаў старажытнага Полацка адзначанага часу. Калі з пасадам на тэрыторыі сучаснага стадыёна «Спартак» больш-менш усё зразумела, то ўзнікае вялікае пытанне аб ролі і месцы ў тапаграфічнай стуктуры горада адкрытага Г. Штыхавым пасада каля Чырвонага моста. Па-першае, яго тэрыторыя вельмі абмежавана; па-другое, ён не мае абарончых збудаванняў; па-трэцяе, на ім не зафіксавана рамеснай дзейнасці. У гэты ж храналагічны перыяд трапляе і Запалоцкі пасад, прынамсі тымі матэрыяламі, праўда нязначнымі, якія можна аднесці да X – пачатку XI стагоддзя. Ён надзвычай аддалены ад пачатковага гарадзішча, якое заставалася на гэты час цэнтрам горада. Верхні замак яшчэ не існаваў. Дакладней не існаваў у тым выглядзе, каб быць абаронцаю Запалоцкага пасада. Нашто ў такім выпадку на самым відавоку было забудоўваць гэты пляц, адкрыты для любога рабаўніцтва і нападу? Можа, на пачатковым этапе Запалоцце зусім і не было пасадам, а своеасаблівым адкрытым пасялішчам-спадарожнікам?

Верхні замак і структура горада XI – XIII стагоддзяў. Тут найбольш яўнай белай плямаю з'яўляецца сам замак і яго памеры. У любым выпадку ў адзначаны час ён быў меншым за той, які сёння разумеецца пад замкам. Даследы М. Каргера, Г. Штыхава, Вас. Булкіна, Д. Дука і аўтара паказалі надзвычай нераўнамернае распаўсюджанне культурных адкладаў на гэтай тэрыторыі. Прычым гэтая розніца, напрыклад, паміж пляцамі ў заходняй і ўсходняй частцы замка складае да 3 – 4 м. Да таго ж і характар слоя, яго насычанасць артэфактамі і іх уласны характар абсалютна розныя. Такое ўражанне, што мы маем дзве абсалютна асобныя тапаграфічныя структуры, якія былі аб'яднаны ў адно цэлае толькі ў XV – XVI стагоддзях.

У гэтым жа кантэксце адзначым, што значная частка тэрыторыі Верхняга замка зусім не вывучана. Найперш гэта адносіцца да так званай Машны. Месца надзвычай цікавае тапаграфічна. Нагадвае замак у замку. Відаць не выпадкова падчас штурма горада ў 1579 годзе С. Баторый выбраў менавіта гэтае месца. Да таго ж трэба адзначыць, што і княжацкі церам знаходзіўся ў некаторай ступені бліжэй да Машны, чым да Сафійскага сабора.

Практычна не вывучаны археалагічна на сёння абарончыя збудаванні Верхняга замка (як, дарэчы і Ніжняга). Нашымі даследамі былі знойдзены толькі рэшткі ўмацавання замкавых схілаў і мяркуемых фрагментаў гародняў [3, с. 40]. Па тапаграфічных і матэматычных разліках вядомы і месцы знаходжання былых абарончых вежаў. Аднак ніводная з іх археалагічна не даследавана. У наш час ёсць тэндэнцыя рабіць рэканструкцыі старажытных абарончых умацаванняў. На жаль, часцей яны нагадваюць (як у Мазыры) дзіцячыя пацешныя гарадкі. Рабіць нешта падобнае ў Полацку, без правядзення аднаведных раскопак – невуцтва і глупства. З улікам неаднаразовай перабудовы полацкіх абарончых вежаў, нават змянення іх колькасці, на наш погляд, найбольш цікавым і перспектыўным было б даследаванне праязднай вежы на Запалоцце, Каралеўскай – у бок Вялікага пасада і, па магчымасці, Варварынскай вадзяной.

Таксама, калі размова ідзе аб Верхнім замку, застаюцца пытанні аб магчымай наяўнасці на яго тэрыторыі невядомых да сёння манументальных пабудоў. Яшчэ А. Ляўданскі знайшоў у 21 м на паўднёва-ўсходнім баку ад Сафіі рэшткі старажытнай сцяны з плінфы. А. Мітрафанаў пісаў, што сцяна не даследавалася і была засыпана. Месца гэтае таксама не даследавалася. Аднак у камунікацыйных равах, якія праходзілі ў гэтым баку ў 90-я гады XX стагоддзя, кладак не зафіксавана. Адно асобныя фрагменты плінфы. Магчыма, першыя даследчыкі памыліліся з накірункам. Каб гэта было ў паўднёва-заходнім баку ад Сафіі, то сапраўды, А. Ляўданскі мог натыкнуцца на рэшткі базыліянскага кляштара, дзе ў падмурку другасна выкарыстоўвалася сафійская плінфа. У 90-х гадах мы даследавалі гэтыя падмуркі. Але найбольшым аргументам на карысць наяўнасці на Верхнім замку новых манументальных пабудоў (апрача ізаграфічных матэрыялаў XVI – XVII стст.) можа быць то, што менавіта тут фарміравалася галоўная гарадская плошча. Актыўнае будаўніцтва XII стагоддзя наўрад ці магло пакінуць на галоўным гарадскім пляцы толькі храм-прататып смаленскага Міхаіла Архангела і княжацкі церам. Апошнія разам з Сафійскім саборам не пакідаюць уражання завершанасці ансамбля, яго гармоніі. Аргументам можа быць і тое, што і ў больш познія часы храмы будавалі ў замку. Напрыклад, Полацкая Рэвізія згадвае ў 1552 годзе царкву дворную Святога Міколы, наданне князя Андрэя Альгердавіча. Згадайма, што і езуіты першую сваю драўляную царкву ў 1580 годзе таксама будавалі ў Верхнім замку. Таксама ў тым жа 1552 годзе Рэвізія згадвае Машоначны манастыр Уваскрэсення Хрыстова. А гэта ўжо непасрэдна тэрыторыя Верхняга замка. Яшчэ адным аргументам можа быць тое, што ў XII стагоддзі будаваліся шматлікія прыдзелы і крыпты да Сафійскага сабора, вывучаныя раскопкамі Вал. Булкіна. У адзін з гэтых «галубцоў» і ўцякла да цёткі Раманны Еўфрасіння Полацкая.

Паколькі размова аб манументальных пабудовах Полацка ранняга перыяду, то трэба адзначыць, што і тут хапае «белых плямаў». Пытанне аб архітэктурных і іншых асаблівасцях Сафіі мы апусцім. Тут працы хопіць яшчэ на многія гады, нават пры магчымасці дакрануцца да самога помніка. Аднак не ўсё зразумела з іншымі помнікамі. У першую чаргу гэта тычыцца храма на Рву, на Стрэлцы Ніжняга замка, Вялікага храма і Пятніцкага храма-пахавальні Бельчыцкага манастыра, храма-пахавальні Спасаўскага манастыра. Гэта археалагічна знойдзеныя аб'екты. Але казаць, што праведзеныя на гэтых помніках раскопкі далі вычэрпную інфармацыю, не выпадае. На нашу думку, яны патрабуюць паўторных доследаў з выкарыстаннем сучасных метолык, прыцягненнем замежных спецыялістаў у галіне архітэктурнай археалогіі.

Асобная размова аб архітэктурных помніках, чыя прысутнасць у Полацку вядома, але не канкрэтызавана. У першую чаргу гэта тычыцца манастыра Іаана Прадцечы на Востраве і храма-трыконха Бельчыцкага манастыра. Сюды мы б дадалі і лакалізацыю мужчынскага манастыра ў Бельчыцы, заснаванага Еўфрасінняй. Дзве апошнія пазіцыі вельмі праблематычны з пункту гледжання іх якой-небудзь захаванасці. Але што тычыцца манастыра на Востраве, то яго пошукам мала што замінае, апрача адсутнасці сучаснай пошукавай апаратуры (у першую чаргу маюцца на ўвазе геарадары). Нават месца яго знаходжання з вялікай доляй верагоднасці можна вызначыць, як тэрыторыя сучаснай доследнай станцыі юнатаў.

Да адкрытых пытанняў полацкай археалогіі можна аднесці і развіццё тапаграфічнай структуры пасадаў. Нягледзячы на значныя зрухі ў гэтым накірунку, за апошнія дзесяцігоддзі агромністыя плошчы так і засталіся не вывучанымі. Толькі па картаграфічных даных сёння мы вызначаем межы пасадаў. Агульная тэрыторыя больш-менш паддаецца ўліку. Аднак дэталі адсутнічаюць. Знойдзеная абарончая сцяна XI стагоддзя на плошчы Свабоды і яе магчымы працяг на тэрыторыі сённяшняга універсітэта не даюць паўнавартаснай карціны гарадской тэрыторыі гэтага часу. А абарончыя збудаванні XVI – XVII стагоддзяў на Вялікім пасадзе, апрача магчымых фрагментаў Кутняй вежы побач з сучасным музеем прыроды, – мізэрны вынік. Тут было б вельмі цікава (з улікам таго, што картаграфічная лакалізацыя прысутнічае) знайсці рэшткі абарончых сцен, гандлёвых радоў, нарэшце, і ратушы.

Папярэднія даследаванні аўтара і Д. Дука яскрава паказалі характар забудовы і сацыяльны статус насельнікаў цэнтральнай часткі Вялікага пасада ў XII – XVII стагоддзях [4, с. 222 – 236]. Аднак ці распаўсюджваюцца гэтыя характарыстыкі на пасад у цэлым? Ці былі на яго тэрыторыі развіты іншыя рамёствы так, як залатарства? Можа, кавалёў ці гарбароў тут у прынцыпе не існавала? Можа, гэтыя сацыяльныя слаі старажытнага Полацка табарыліся ў Запалоцці і Задзвінні?

Агульнай белай плямаю ў полацкай археалогіі з'яўляецца лакалізацыя гарадскіх прыстаняў на працягу ўсёй яго гісторыі. Апрача фотаздымкаў XIX – пачатку XX стагоддзя, картаграфічных адзнак, мы не маем нічога. Тым больш што гэта быў найгалоўнейшы элемент не толькі транспарціроўкі тавара, але і ўсёй гарадской эканомікі, ажно да з'яўлення чыгункі. Канешне, можна меркаваць, што адной прыстані як такой не было. Магчыма, яна расцягвалася па абодвух берагах Дзвіны ў гарадскіх межах і, магчыма, паза імі. Але дынаміка развіцця гэтага гарадскога і эканамічнага элемента абсалютна не высветлена, апрача ўскосна паказваючых на яе гарадскіх «узвозаў» ад правага берага ў цэнтр Вялікага пасада. Свае ўласныя прыстані павінны былі быць блізка Бельчыцкага і Прадцечанскага манастыроў, у Струні, магчыма, нават і на Палаце ажно пад Спасаўскім манастыром, пакуль не былі збудаваны млыны.

Асобная размова аб манументальных пабудовах часоў развітага сярэднявечча, у першую чаргу манастыроў і храмаў. З 13 манастыроў (улічваючы і тыя, што былі заснаваны раней) мы ведаем месцазнаходжанне толькі сямі. З існаваўшых па пісьмовых крыніцах 22 храмаў больш-менш дакладна можам меркаваць аб пяці. Што ўжо казаць аб такіх агульнагарадскіх пабудовах, як лазня, капліца, важніца, млыны і ратуша з гандлёвымі радамі. Магчыма, ад асобных гэтых элементаў гарадской забудовы сёння і ў зямлі нічога не захавалася. Аднак мы не ведаем, якія з іх былі будаваны з дрэва, а якія з цэглы і каменю. У апошніх значна больш шанцаў захавацца хоць бы ў фрагментах.

Сярод іншых «археалагічных белых плямаў» можна было б адзначыць пытанні аб паселішчах на правым беразе Палаты (раён сучаснай вуліцы Міронавай), аб гарадскіх могільніках IX – XIII стагоддзяў, аб адкрытых паселішчах у непасрэднай блізкасці да горада, практычную адсутнасць у горадзе культурных напластаванняў XIV – XV стагоддзяў і некаторыя іншыя. У сумме недастатковасць нашых ведаў (ці будуць яны калі-небудзь дастатковымі?) у спалучэнні з абмежаванай колькасцю іншых крыніц, спараджае масу пытанняў ужо непасрэдна па полацкай гісторыі. У тым ліку аб умовах і прычынах узнікнення самога горада.

Большасць навукоўцаў сёння пераканана, што ўзнікненне гарадоў перш за ўсё звязана з вытворчымі і сацыяльнымі фактарамі: аддзяленне рамяства ад земляробства, сацыяльным расслаеннем грамадства [5, с. 51 – 65]. Важным таксама называецца зручнае размяшчэнне гарадоў на галоўных, а потым і другасных гандлёвых шляхах. Маюцца факты заснавання гарадоў князямі, ці вырастанне гарадоў з феадальных сядзіб. Аднак, якая з гэтых прычын адыграла першасную ролю, дала штуршок не проста ўзнікненню вялікага горада, але прывяла Полацк на вяршыню дзяржаўнай піраміды, паставіла ў цэнтр вялікага палітычнага і сацыяльна-эканамічнага арганізма?

Мы не возьмем на сябе смеласць даць адназначны адказ на гэтае пытанне. Мы можам толькі паспрабаваць пашукаць перспектыўныя накірункі вызначэння кантэксту, у якім дадзены факт фарміра-

заўся і адбыўся. Найперш трэба ўважліва аднесціся да агульнаеўрапейскіх працэсаў другой паловы першага тысячагоддзя па нараджэнні Хрыста. Ішла цывілізацыйная трансфармацыя так званых «варварскіх» народаў па шляху этнічнай кансалідацыі, стварэння пачатковых дзяржаўных структур, паглынанню і асіміляцыі дробных і слабых этнасаў. Калі глядзець на гэта яшчэ шырэй, то працэс можна параўнаць з вялікімі цунамі, прычынаю якіх стаў культурна-цывілізацыйны землятрус прыблізна пяцітысячагадовай даўніны, які здарыўся амаль адначасова ў Міжрэччы і Кітае. Праз тысячагоддзі хвалі нарэшце дасягнулі і нашай Еўропы. Як вядома, цунамі становіцца мацнейшай, па меры таго, як яна падыходзіць да мелкаводдзя. Яна набірае моц, паглынаючы на сваім шляху энергетычную моц усёй вады. Ад пачатку, умоўна кажучы, – вынайдзенага ў Месапатаміі кола і клінковай пісьменасці – да прынятага ў Рыме і Візантыі хрысціянства, разам з асноўнымі прынцыпамі дзяржаўнага будаўніцтва, хваля ўяўляла агромністы комплекс (кантэкст) існавання цывілізацыі і чалавечага грамадства. Дарэчы, усходняе культурна-цывілізацыйнае «цунамі» ў Кітаі, Індыі і Манголіі ўтварылася падобным чынам, але «дакацілася» да нас толькі ў XII стагоддзі з мангольскім нашэсцем. Спазнілася крыху.

І вось, натуральна, перад Цэнтральна-Усходняй і Паўночнай Еўропай (франкамі, галамі, скандынавамі, усімі славянамі і балтамі, угра-фінамі і г.д.) паўстае натуральнае пытанне выбару: альбо будаваць свой «каўчэг» і далей плыць на гэтай хвалі цывілізацыі, альбо быць змытымі з твару зямлі і гісторыі.

Нам ужо даводзілася пісаць аб дынаміцы ўтварэння новых еўрапейскіх нацыянальных дзяржаў у V – X стагоддзях [6, с. 140 – 152]. І ў кожным выпадку ў кожнага народа была свая матывацыя. Але агульным для ўсіх першасным крокам было прыняцце хрысціянства. Вера ўводзілася зверху – валявым палітычным рашэннем. І пры гэтым, трэба заўважыць, ініцыятарамі выступалі не абавязкова самыя моцныя і ўплывовыя каралі, князі, канунгі і ўвогуле правадыры. Ініцыіравалі тыя, хто бачыў перспектыву, хто спадзяваўся (і не дарма) на падтрымку той самай цывілізацыі. Рэальна ні нарвежскі, ні польскі, ні рускі князь не кантралявалі цалкам на момант прыняцця хрысціянства этнічныя абшары сваіх будучых краін. Некаторыя нават залежылі ад рашэнняў народных сходаў. Аднак калі раней яны былі роўнымі сярод роўных, то зараз імгненна (у гістарычным маштабе) паднімаліся да ўзроўню тагачаснай ім агульнаеўрапейскай цывілізацыі.

З гэтага пункту гледжання ёсць падставы меркаваць, што і першы вядомы па летапісах полацкі князь Рагвалод, натуральна, і ягоная дачка ужо былі хрысціянамі. Полацк канца X стагоддзя мог быць цэнтрам распаўсюджвання новай веры. Вера яшчэ не будучы прынятаю ў Кіеве афіцыйна, усталёўвалася там значна мацней (узгадаем і першых кіева-пячорскіх манахаў-варагаў, і княгіню Вольгу), чым у Ноўгарадзе. Што, магчыма, і паўплывала на шлюбны выбар Рагнеды паміж кіеўскім Яраполкам і наўгародскім Уладзімірам. Полацк X стагоддзя (а можа і IX), верагодна, таксама быў першымі айчыннымі варотамі да веры. Для XI стагоддзя факт ужо бясспрэчны.

Але, відаць, не толькі ідэалагічны кантэкст абумовіў беларускі полацкі пераход да цывілізацыі і дзяржаўнасці. Распаўсюджванне любых інавацый патрабуе шляхоў і носьбітаў. Прычым сам па сабе рух, нават ва ўмовах XXI стагоддзя мае характар перацякання вады ў дзвюх злучаных сасудах, пакуль узровень вадкасці не ўраўнаважыцца. А гэта значыць што ўсюды, маючы нешта сваё, мы не маем чагосьці, што ёсць у суседа. Дарэчы, многія гісторыкі, асабліва з эканамічным ухілам, лічаць, што падмуркам сучаснай цывілізацыі ёсць эканамічна-гандлёвыя адносіны паміж краінамі і народамі [7, с. 16 – 17]. Безумоўна, рацыя ў гэткім пасыле ёсць. Іншая справа, што яна разглядае выключна матэрыяльны бок развіцця цывілізацыі ў цэлым. А гэта, як мы ўжо неаднойчы пераканаліся на ўласнай гісторыі, не ёсць аб'ектыўна поўны шлях для спасціжэння існасці.

Тым не менш сярод беларускіх гарадоў Полацк першым згадваецца ў летапісе. І гэта нягледзячы на тое, што матэрыяльныя (археалагічныя) сведчанні існавання падобных раннегарадскіх паселішчаў таго ж часу ёсць і ў Віцебску, і ў Менску на р. Менцы. Звернем увагу на кантэкст існавання Полацка на першых старонках летапісу: ён згадваецца і звязваецца з іншымі гарадамі – Ноўгарадам, Ізборскам, Псковам, Смаленскам, Старой Ладагаю, нарэшце, з Чарнігавым і Кіевам. Падобныя ланцужкі лёгка чытаюцца таксама ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе прыблізна таго ж часу, ці на стагоддзе раней: Гданьск – Калабжэг – Шчэцын – Уседом – Стары Любек, Брюге – Кёльн – Майнц – Нюрнберг – Вена, Кале – Руан – Парыж – Ліон – Марсель і г.д. З гэтага вынікае, што ўмовы і прычыны стварэння (узнікнення) гэтых гарадоў, іх унутраныя сувязі мелі аналагічны кантэкст. І такім матэрыяльным, эканамічным кантэкстам на той час мог быць толькі гандаль.

На тэму гандлёвых сувязяў беларускіх гарадоў з замежжам, аб таварным і грашовым абарачэнні маецца розная літаратура [8]. І тое, што тавараабмен праходзіў па марах і рэках, таксама пярэчанняў не мае. Аднак цікава іншае, што тагачасныя гарады разглядаліся не як першы ці апошні прытулак гандлёвага каравана, а ў якасці перавалачнай базы – факторыі (накшталт Біркі ці Хэдэбью і інш.) [9, с. 57 – 62]. Гэта тычылася і Полацка. З крыніц XIII – XVI стагоддзяў, якія безумоўна грунтаваліся на больш ранняй традыцыі (знакамітае полацкае «старыны не рухаем, навіны не ўводзім»), вядома, што замежным купцам забараняўся дробны гандаль у гарадах Полацкай зямлі, толькі оптавы. З гэтага выцякала, што набыць

паўднёвыя аксаміты, розныя пацеркі і бразготкі візантыйскага ці кіеўскага паходжання, мячы і іншую зброю з Нямеччыны і Скандынавіі можна было толькі ў полацкіх купцоў, прыехаўшы непасрэдна ў Полацк, ці чакаючы, калі купцы дабяруцца да «глыбінкі». Такім чынам, мы сутыкаемся з першай эканамічнай манаполіяй на тэрыторыі нашай краіны, якая праіснавала не менш паловы тысячагоддзя.

Аднак жа існаваў і адваротны рух тавараў. З Полацка ва ўсе бакі вывозіліся скуры, футра, пянька, паташ, харчовыя прыпасы і г.д. І вывозілася зноў жа не дробнымі і буйнымі вытворцамі, а тымі ж полацкімі гандлярамі-манапалістамі. Апрача задзейнічанага ў гэтай справе адміністрацыйнага княжацкага рэсурса, былі і аб'ектыўныя эканамічныя падставы. Якія рамеснікі, якія вясковыя абшчыны маглі сабе дазволіць будаўніцтва ладдзей і стругаў, а тым больш выпраўляць сваіх работнікаў на гандаль за тысячы кіламетраў на тэрмін ад года да некалькі гадоў? Рэальны сплаў па еўрапейскіх унутраных рэках, як паказалі эксперыменты, мог адбывацца толькі два, а то і адзін раз на год па высокай вясновай ці восеньскай вадзе [10]. Такім чынам, ва ўсіх буйных дзяржаватворчых гарадах Еўропы, у тым ліку ў Полацку, канцэнтраваўся агромністы па мерках тых часоў прыбытак у абмежаваных руках гандляроў. Князь з дружынаю, гарантуючы бяспеку гэтаму працэсу, фактычна жылі на працэнты з яго.

Са школьных падручнікаў усе ведаюць пра так званыя княжацкія «кармленні» – збор даніны па вёсках і падначаленых «малых» гарадах. Але нідзе нам не даводзілася бачыць адказу на пытанне: а навошта князю такая агромністая колькасць харчоў і розных вырабаў пры надзвычай абмежаваным грашовым абарачэнні? Адказ на паверхні – князі імі гандлявалі, пакідаючы сабе толькі частку харчоў і вырабаў, абарачаючы астатняе ў грошы, каштоўнасці, так званую казну. І пры гэтым асноўны грашовы прыбытак зноў-такі заставаўся ў руках гандляроў.

З гэтага пункту можна іначай паглядзець на факт існавання буйных грашовых скарбаў, як, напрыклад, знакаміты полацкі з-пад Каз'янак [11, с. 109]. Можа, гэта не схованка дзвінскіх рабаўнікоў (надзіва блізка ад горада і небяспечна), а схаваны і перыядычна папаўняемы самімі гандлярамі «чорны нал», які не абкладаўся княжацкім падаткам? Прынамсі, дакумент 1765 года пакінуў нам пералік тавараў, якія вывозіліся і ўвозіліся палачанамі кантрабандаю. Вывозіліся: медзь, латунь, жалеза, футра, мыла, чай, воск, сала, скуры, рыба, палатно, украінскі тытунь, мёд. Завозілі жэмчуг, нюрнбергскую галантарэю, грызэт, аксаміт, камзолы, англійскія баваўняныя тканіны, шатландскае сукно, шоўк, шаўковую пражу, залатыя галуны, палотны швабскія і галандскія, кісею, батыст, шаўковыя панчохі і чапцы, англійскія і французскія сагаты. Вялікая колькасць маскоўскіх гандляроў прыязджала да Полацка, карыстаючы яго ў якасці транзітнага пункту далей у Еўропу. Была распрацавана цэлая сістэма, як абмінаць мытні на рэках і азёрах, лясах і балотах; былі адпрацаваны кошты за выкарыстанне коней і іншыя паслугі на гэтым шляху. Маскоўскі гандаль быў асабліва актыўным. Абмінаючы мытні, ён пакідаў казну Вялікага княства Літоўскага без значных прыбыткаў. Напрыклад, на Зэльвенскай ярмарцы ў 1765 годзе футраў прадавалася на мільён злотых, а ў дакументах было зафіксавана толькі на 220 тыс. злотых. У гэтым годзе па ўсіх мытнях на тэрыторыі Беларусі было сабрана падаткаў на 243 тыс. злотых. З іх на Полацкую мытню прыйшлося ўсяго толькі 655 злотых, або 0,27 % [12, с. 172]. Наўрад ці гэтая лічба аб'ектыўна сведчыць пра аб'ём гандлёвых аперацый у Полацку. Бо яшчэ ў 1506 – 1507 гадах, да прыкладу, Полацк даваў 20 % падтквага збору з усіх гарадоў ВКЛ. А гэта былі не толькі гарады сучаснай Беларусі, але і Смаленск, і Кіеў, Коўна, Уладзімір Валынскі і інш.

Так ці іначай, можна пэўна сцвярджаць, што і месца, дзе ўзнік Полацк, і яго адміністрацыйная інфраструктура былі надзвычай зручнымі для гандляроў захаду, поўначы і ўсходу. А гораду і ствараемай вакол яго дзяржаве прыносіла рэальны матэрыяльны прыбытак, упэўненасць і магутнасць. Не дзіва, што за многія гады археалагічных раскопак, з раскапаных гарадскіх пабудоў і сядзіб найбольш яскрава і дакладна вылучаюцца не кавалі ці ганчары, ці шорнікі і інш. (што характэрна для большасці другасных гарадоў сярэднявечча), а менавіта залатары-ювеліры. Бо менавіта яны ў першую чаргу жылі з перапрацоўкі прывазной сыравіны. І прыкладаў таму безліч: неапрацаваны прыбалтыйскі бурштын, оўручскі шыферны сланец у нарыхтоўках, каўказская медзь і бронза, зборачныя дэталі нямецкіх мячоў і г.д. Пават знойдзена адна ліцейная форма, у якой полацкі залатар спрабаваў зрабіць аналаг арабскага куфічнага дырхема. Можа ў якасці ўпрыгожвання-падвескі, а можа і натуральнай фальшывай манеты.

Два разгледжаныя вышэй кантэксты ўзнікнення і жыцця Полацка ў IX – XI стагоддзях не маглі натуральным чынам не выклікаць трэці – палітычны. Ён вынікаў з таго, што падобным шляхам ішлі ўсе еўрапейскія гарады, якім наканавана было стаць сталіцамі дзяржаў; у выпадку Полацка, канечне, ён фармаваўся пад уплывам найперш суседзяў. Тут мы свядома апусцім пытанне этнагенезу славянскіх, балцкіх і фінскіх плямёнаў на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Як і тое, якім этнасам, уласна кажучы, былі палачане: славянамі, балтамі ці «субстратам» [13]. Істотна іншае, што ўжо да XII стагоддзя ўлада Полацка распаўсюджвалася цалкам альбо часткова на тэрыторыі ўсіх пералічаных этнасаў: уласна крывічоў, дрыгавічоў, яцьвягаў, ліваў, латгалаў, дайнову і г.д. Таму можна казаць, што палітычны працэс ішоў таксама і ў кантэксце поліэтнічнай кансалідацыі. Але палітычная складовая паступова выходзіла на першыя пазіцыі.

Факты палітычнай і культурнай гісторыі Полацкай зямлі добра вядомы і няма патрэбы іх паўтараць. Але толькі на першы погляд здаецца, што тут усё зразумела і ясна. Зададзім сабе пытанне: ці ёсць нешта адметнае сярод агульнага гістарычнага кантэксту, што вылучыла менавіта Полацк і ачоленую ім дзяржаву ў якасці правобраза сённяшняй Беларусі? І тут мы знойдзем некалькі цікавых фактаў.

Першае. Да 1104 года мы не маем на тэрыторыі Полацкай зямлі сведчанняў аб княжацкіх міжусобных спрэчках і войнах паміж прадстаўнікамі Рагвалодавічаў-Усяславічаў. Можа, хто скажа, што іх не магло быць з прычыны пераемнасці ўлады па лініі Рагвалод – Рагнеда – Ізяслаў – Брачыслаў – Усяслаў, бо ўсе пералічаныя з'яўляліся адзінкавымі дзецьмі ў семьях пасля Ізяслава Уладзіміравіча. Але захаваўшыяся летапісныя крыніцы ў адносінах да Полацка называюць толькі спадкаемцаў княжацкага стала, без пералічэння ўсіх нашчадкаў. Гэта не характэрна для летапісаў увогуле, калі размова ідзе, напрыклад, аб кіеўскіх і іншых так званых «рускіх» князях. Цяжка паверыць, што ў Ізяслава і Брачыслава было па адным дзіцяці ў сям'і (пытанне – кім быў малалетні Усяслаў, што памёр у 1003 г.). У Рагвалода – 3, ва Уладзіміра – 12 (у тым ліку ад Рагнеды – 6), Усяслава – 4. Тое ж прыблізна і ў кіеўскіх князёў. Значыць, у летапісным кантэксце мы можам бачыць хутчэй не сямейны склад княжацкай дынастыі пачатковага перыяду, а толькі прадстаўнікоў-правадыроў Полацка і дзяржавы. Такім чынам, да факту адсутнасці ў гэты перыяд унутрыполацкіх княжацкіх спрэчак (больш зразумелыя як войны і сутычкі) можна дадаць антытэзу – паразуменне і ўнутраны лад сярод прадстаўнікоў княжацкай дынастыі.

На першы погляд фактар другасны. Але ў ім ёсць агромністая супрацьвага таму, што адбывалася наўкол: пастаянныя бойкі на працягу 2,5 стагоддзяў паміж Уладзіміравічамі за Кіеў, Ноўгарад, Пскоў, Смаленск, Чарнігаў і іншыя гарады і землі. У гэты ж самы час полацкія князі толькі адбівалі чужынскія напады ці хадзілі паходамі за межы сваёй дзяржавы. Нават пасля смерці Усяслава Брачыславіча, калі ўзнікла спрэчка паміж яго сынамі Глебам і Барысам, потым унукамі Рагвалодам і Барысам, то яна не тычылася цэласнасці зямлі і вылучэння з яе самастойных княстваў-дзяржаў (напрыклад, Менскай ці Друцкай), а толькі за ўладаранне і князяванне ў самім стольным горадзе Полацку, а значыць і ва ўсёй дзяржаве.

Гэтая палітычная цэласнасць Полацкай зямлі пры ўяўнай яе поліэтнічнасці, можам меркаваць, сталася падмуркам для далейшых дзяржаватворчых працэсаў XIV – XVII стагоддзяў.

Другое. Лаўрэнцьеўскі летапіс пад 1176 годам паведамляе: «Новгородци бо изначала и Смольняне, и Кыяне, и Полочане, и вся власти, яко на дому (думу) на веча сходятся, на что же старейшии сдумають, на том же пригороди стануть». Большасць гісторыкаў пры розных ацэнках гэтай з'явы сыходзіцца на думцы, што веча (даслоўна «савет») бярэ свой пачатак з родаплемянных адносінаў. Лічыцца, што пры паступовай трансфармацыі родавых адносін у феадальныя яно практычна знікае ў IX – X стагоддзях, нанова адраджаецца ў сярэдзіне XI стагоддз, набірае моц у XII і паступова знікае да XV стагоддзя. В. Сергіевіч у XIX стагоддзі, які першым даследаваў гэтую тэму, меркаваў, што веча было спрадвек характэрна славянам ад часоў племянной арганізацыі. Аднак у далейшым М. Доўнар-Запольскі, Б. Грэкаў, В. Янін, П. Талочка лічылі веча з'яваю «гарадавой» і перыяды яго існавання і ажыўлення звязвалі з ростам гарадоў. Сапраўды, аб наяўнасці ў славянаў і антаў агульнага сходу пісаў у VI стагоддзі Пракопій Кесарыйскі. Ёсць некаторыя намёкі на рашенне палітычных праблем шырокім колам тагачаснай грамадскасці ў часы Алега і Святаслава. Аднак першыя рэальныя згадкі аб сапраўдных вечавых сходах адносяцца ў Ноўгарадзе да 1016 года, Кіеве – 1068, Полацку – 1151 года. Адразу трэба адзначыць, што ў блізкіх нам суседзяў аналагічныя сходы зафіксаваны пісьмовымі крыніцамі толькі на ўзбярэжжы Балтыйскага мора: Бірка, Рыбе, Хэдаб'ю, Воліне, дзе яны называліся «цінг» (народны сход). У ранняй гісторыі іншых заходніх краін, у тым ліку і Польшчы, ажно да зацвярджэння Магдэбургскага права падобных з'яваў не зафіксавана. Апрача што ў антычнай Грэцыі, але аб гэтым ніжэй.

Цікава зрабіць адну рэмарку, паколькі мы гаворым аб кантэксце ў полацкай гісторыі. Першы цінг у шведскай Бірцы зафіксаваны пісьмовымі крыніцамі ў сярэдзіне XI стагоддзя. Падстава: канунг свеяў Олаў, у якога місіянер Ансгарый просіць дапамогі ў хрысціянізацыі жыхароў горада, адказвае: «Але ж, ранейшыя святары былі выгнаны адсюль не каралеўскім загадам, але народным хваляваннем. Таму я не магу ўзяць смеласці зрабіць што небудзь дзеля вашай місіі, не спытаўшы нашых багоў і не даведаўшыся волі народа... Адпаведна іх звычаю, рашэнне аб любой грамадскай справе знаходзіцца менавіта ў аднадушшы волі народа, больш, чым ва ўладзе караля» [9, с. 83 – 84]. У гэтай сувязі адзначым, што аналагічную праблему хрысціянізацыі Кіева і Ноўгарада князь Уладзімір у канцы IX стагоддзя вырашаў зусім інакш. Абраўшы са «старцамі» і дружынаю хрысціянства, ён загадаў усім патэнцыйным удзельнікам цінга-веча з'явіцца на беразе Дняпра для хрышчэння. Наўгародцаў, якія адмовіліся прымаць хрост, папросту рэзалі і тапілі тысячамі ў Волхаве пасланыя Уладзімірам Пуцята і Дабрыня. Падобных падзей у Полацку летапісцы не адзначылі, хаця ў адваротным выпадку міма наўрад ці б прайшлі. Ці не кажа гэта аб тым, што полацкая ранняя палітычная сістэма будавалася хутчэй па шведскаму, чым кіеўскаму і наўгародскаму ўзорам?

Характэрная і яркая дэталь: ноўгарадскае веча перыяду свайго росквіту ў XII стагоддзі вырашала многія пытанні, у тым ліку абрання епіскапа і архіепіскапа. У Кіеў епіскап дасылаўся з Канстантынопаля, але ж удзелу ў вечавых сходах гэтыя іерархі не прымалі, праўда бласлаўлялі іх. У Полацку ж епіскап не

толькі быў пастаянным удзельнікам веча, але і замацоўваў сваёй пячаткаю «Святой Сафіі» яго рашэнні, як, дарэчы, і палітычныя, і гандлёвыя дамовы.

Многія гісторыкі, вывучаючы феномен веча, у выніку схіляюцца да функцыі правядзення ім вузкакласавых (саслоўных) інтарэсаў гарадской вярхушкі: баяраў, буйных землеўладальнікаў, гандляроў, цэхавікоў. Маўляў, праз веча «чэрнь» лічыла, што яна кіруе, і гэтым абмяжоўваўся яе ўдзел у дзяржаўных справах. А гарадскі набілітэт, абапіраючыся на выказаную (створаную імі самімі) волю народа, правіў рэальна. Магчыма, у многіх выпадках так яно і было. В. Янін, каментуючы летапіснае паведамленне аб «ноўгарадскіх 3000 залатых паясах», прыйшоў да высновы, што гэта былі хутчэй за ўсё прадстаўнікі тых 300 сядзіб, якія месціліся ў горадзе. Яны прадстаўлялі не толькі насельніцтва «канцоў», але і ўсіх тых, хто пражываў на тэрыторыі сядзіб – практычна ўсіх насельнікаў Ноўгарада. Менавіта яны на вечы абіралі сабе пасадніка, апрача князя-рурыкавіча, якога дасылалі з Кіева.

У Полацку пасаднікаў не было. Намеснікі вялікага князя з'явіліся толькі ў 1392 годзе з моманту ўваходжання горада ў склад ВКЛ. Да таго часу веча існавала паралельна з княжацкай уладаю. І гэтаму ёсць тлумачэнне, найперш у тым (аб чым мы пісалі вышэй), што ўсе князі былі сваімі, так бы мовіць, «хатнімі». Рагвалодавічы-усяслаўчы не залежна ад таго, у якіх гарадах Полацкай зямлі яны сядзелі, былі мясцовымі радавікамі. Яны ніколі не прэтэндавалі і не займалі «сталы» ні ў Кіеве (у 1068 годзе Усяслаў стаў кіеўскім князем не па сваёй волі), ні ў Ноўгарадзе, Смаленску ці Чарнігаве. Нават Усяслаў Брачыславіч на ўласную волю адмовіўся ад Кіева. З другога ж боку, спробы ўладкаваць кіеўскіх стаўленікаў у Полацку (напрыклад, Мсціслава Ізяславіча ў 1069 г.) завяршалася для іх трагічна. Магчыма, падобныя «хатнія» адносіны да ўласных князёў дазвалялі палачанам у сярэдзіне XII стагоддзя надзвычай свабодна вырашаць іх лёс, праганяючы і запрашаючы то аднаго, то другога.

Безумоўна, у гэты час у Полацку сярод гараджан склаліся, дакладней, вылучыліся, грамадска-сацыяльныя групы. Над тэрмінам «людзі» можна бачыць у прынцыпе ўсіх гараджан (альбо прадстаўнікоў сядзіб, тапаграфічныя памеры якіх, па археалагічных дадзеных, былі не толькі супаставімымі з ноўгарадскімі, але часам і пераўзыходзілі апошнія). А вось пад тэрмінам «мужы», як і пазней, у XIII – XIV стагоддзях хутчэй за ўсё выступаў абраны «людзьмі» вышэйшы орган гарадскога самакіравання, легітымнасць якога пацвярджалася і падтрымлівалася епіскапам ад імя Святой Сафіі.

У гэтым кантэксце немагчыма абмінуць факт існавання грэчаскай, афінскай, «агорскай» дэмакратыі V стагоддзя да нараджэння Хрыстова, якая таксама абапіралася і падтрымлівалася ад імя палітэістычнага Алімпа. Нехта адразу скажа, што любыя прамыя паралелі тут не да месца. Аднак пагадзіцеся, што паралелі паміж Грэцыяй і паўночна-еўрапейскім супольніцтвам куды бліжэйшыя і храналагічна і тэрытарыяльна, чым між егіпецкімі і амерыканскімі пірамідамі. У навуковай літаратуры нават усталяваўся тэрмін, вызначаючы характар існавання Полацка, Ноўгарада і Пскова як «горад поліс» па аналогіі з грэчаскімі. Магчыма, і нават верагодней за ўсё, ніякай люстраной пераемнасці не было. Аднак існаванне вельмі падобных гарадскіх (сацыяльна-палітычных) структур у розных храналагічных спектрах дае падставу шукаць аналагічныя (падобныя) умовы фарміравання дадзенага феномену. На наш погляд, яны не столькі ў родаплемянных вытоках, а ў прычынах сумеснага пражывання людзей на абмежаванай гарадской тэрыторыі. Узгадаем фінікійцаў і падпарадкаваўшых сабе Грэцыю рымлянах.

Полацкую дэмакратыю, разам з тым, таксама не варта абсалютаваць. Па аналогіі з Ноўгарадам яе наўрад ці можна называць «вечавай рэспублікай». Але і на кіеўскую манархію, дзе веча з'яўлялася стыхійна толькі ў моманты бунтаў, полацкі строй не падобны. У Полацкай зямлі хутчэй можна казаць аб існаванні абмежаванай «парламенцкай» манархіі. Права полацкіх князёў на землі, куды іх паклікалі, паступова стала «родавым», бо наступныя пасля Рагвалода генерацыі ўжо нараджаліся на іх. Аднак яно не дазваляла князям распараджацца гэтай самай дарагой у свеце нерухомасцю на свой лад. Нашчадкі Усяслава Полацкага ўступалі ў крывавыя сутычкі за бацькоўскую спадчыну, але канчаткова вырашалі, хто з іх будзе сядзець у Полацку, Менску ці Друцку: веча альбо яго прадстаўнікі ў асобах абраных «мужоў».

Таму і не дзіва, што закат гэтага абмежаванага народаўладдзя (абмежаванай манархіі) пачаўся ў XIII стагоддзі, калі згасла полацкая княжацкая дынастыя. Апынуўшыся безабароннымі перад тварам знешняй агрэсіі, палачане пайшлі на саюз з ВКЛ і запрашэнне да сябе літоўскіх князёў. Толькі трываласцю полацкіх палітычных традыцый можна растлумачыць тое, што да канца XIV стагоддзя ўзаемаадносіны паміж гараджанамі, чые інтарэсы прадстаўлялі баярскія роды, цэхавікі і гандляры, будаваліся на прынцыпе «старыны не рушым, навіны не ўводзім». І гэта быў адносна спакойны і надзвычай крэатыўны з пункту гледжання развіцця эканомікі для горада час.

Са з'яўленнем у Полацку вялікакняскіх намеснікаў, якія імкнуліся падпарадкаваць сабе практычна ўсе сферы гарадскога жыцця ад адміністрацыйнага кіравання да суда і падаткаў, пачаўся перыяд доўгага і жорсткага супроцьстаяння. Аб'ектыўна ў гэтым не было нічога дзіўнага. Развіццё ўсёй еўрапейскай цывілізацыі ішло шляхам тэрытарыяльных узбуйненняў, паглыбленнем феадальных адносінаў, зразумела, на карысць феадалаў і манархаў (Францыя, германскія каралеўствы, Іспанія, Брытанія і г.д.). Аднак, што тычыцца Полацка, маладое новастворанае Вялікае княства Літоўскае пераняла свае здольнасці. Супроцьстаянне вялікакняскай адміністрацыі з гараджанамі зацягнулася на цэлае стагоддзе, якое адзначана

шматлікімі выступленнямі і скаргамі гараджан вялікаму князю і каралю на свавольствы намеснікаў. Галоўным аргументам спрэчкі былі спасылы на тое, што «спакон веку» падобнага не было (павіннасці, падаткі, дзяржаўныя, мясцовыя і мытныя зборы, абавязкі па грамадскіх працах, накшталт умацавання гарадскіх вежаў і паркану і г.д.). Сёння крыніцазнаўчая база дазваляе сцвярджаць, што ў сваіх аргументах палачане, мякка кажучы, казалі не ўсю праўду. Тым не менш яны перамаглі.

У 1498 годзе горад атрымаў грамату (прывілей) на Магдэбургскае права. Здаецца, менавіта гэта меў на ўвазе акадэмік Б. Грэкаў, калі ў сваёй фундаментальнай працы «Кіеўская Русь» адзначыў, што вечавы лад долей за ўсё захаваўся ў заходніх і паўднёва-заходніх вобласцях так званай Кіеўскай Русі. Гэта праўда, але толькі часткова, бо ў канцы XV стагоддзя самога вечавага ладу ні ў Полацку, ні ў Ноўгардзе ўжо не было. Аднак захаваліся традыцыі самакіравання, якія снелым зернем узышлі на глебе еўрапейскага гарадскога права. Менавіта ў Полацку як нідзе (нягледзячы на тое, што Полацк на Беларусі быў не першым. Першае – Берасце, атрымаўшае права ў 1390 годзе) гэтыя прававыя ідэі былі не новымі, але традыцыйна зразумелымі і таму жаданымі. Дарэчы, Ноўгарад яшчэ ў 1471 годзе (на 1/3 заселены крывічамі) быў захоплены і разораны Іванам III пры падтрымцы татар. Пасля чаго на працягу наступных паўтара дзясятка гадоў выразаны, абрабаваны і расселены. Тут, у адрозненне ад Полацка, вечавыя традыцыі згаслі хутка і назаўжды.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што традыцыі народаўладдзя, існаваўшыя ў Полацку, не проста дольш захоўваліся на беларускіх землях у параўнанні з блізкімі суседзямі (і чаго не існавала ўвогуле ў тагачаснай Заходняй Еўропе), але нават былі нсад'емнай часткай палітычнай сістэмы. Можна спрачацца, ці была гэта ўлада ўсяго народа, улічваючы і так званы «плебс», альбо толькі набілітэтныя верхавіны. Хутчэй гэта пытанне храналогіі. Але факт існавання з'явы, яе традыцыі, якія па вялікам рахунку прагледжваюцца ажно да сеймаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, а таксама выбарнасці вялікага князя і караля, яскрава сведчаць на карысць «веча» ва ўсіх ягоных праявах: «старцаў», «людзей», «мужоў», «паноў радцаў» і соймаў усіх рангаў – пераконвае ў традыцыйнасці і сталасці менавіта полацкай дзяржаватворчай структуры ад яе пачатку да позняга сярэднявечча.

Трэцяе. Мы пісалі вышэй аб Полацку як першым цэнтры распаўсюджвання хрысціянскай веры на беларускіх землях. З пункту гледжання вядомых сёння фактаў, не аспрэчваючы нават так званы кіеўскі вектар, гэта так. І першая звестка аб скандынаве Торвальдзе Вандроўніку, які заснаваў манастыр у Полацку, і гіпатэтычны, але верагодны першы гарадскі храм Святой Багародзіцы X стагоддзя, зразумела, Сафійскі сабор і г.д. – усё кажа на карысць Полацка як хрысціянскай мітраполіі свабоднай дзяржавы. Аднак, зыходзячы з вышэйсказанага, узгадаем, што на вяршыні таго цывілізацыйнага «цунамі», якое каціласа да нас ад Месапатаміі і Егіпта і не паспела дакаціцца з Манголіі, вяршыня дзяржаўнай улады заўжды атаясамлівалася і з вяршыняй улады духоўнай, боскай. У хрысціянскай дактрыне гэта атрымала сваё канкрэтнае ўвасабленне: «Любая ўлада ад Бога». І таму папярэднічала не менш як пяці тысячагадовая традыцыя політэістычных вераванняў. Прасцей кажучы, палачане, як і ўсе іншыя, калісьці таксама былі язычнікамі не ў сэнсе іншых моваў – «языкоў», а як носьбіты вераванняў у прыродныя персаніфіцыраваныя (боскія) з'явы. На першы погляд, здаецца, простая, шараговая выснова. І гэта так. Калі толькі не задумацца над фактам існавання ў XIX стагоддзі капішча Перуна і Бабы-Ягі на Валовым азёрку пад Полацкам [14, с. 109], шматлікіх святых камянях, гаях, азёрах па ўсёй Беларусі. Прычым іх канцэнтрацыя этнаграфічна і сёння прыпадае на поўнач краіны – былую Полацкую зямлю.

Але размова крыху не аб тым. Княжацкая ўлада «ад Бога» тое самае, што і язычніцкая ўлада «ад багоў». У дахрысціянскай традыцыі пераддзяржаўнага будавання вялікі (галоўны) князь заўжды і абагаўляўся і міфалагізіраваўся [15, с. 349 – 350]. Князю было неабходна канцэнтраваць у сваіх руках не толькі «зямное» уладарства, але і нябеснае. Найбольш вядомы прыклад - язычніцкі пантэон князя Уладзіміра ў Кіеве 980 года, дзе на чале быў пастаўлены бог вайны і маланак Пярун, найбольш адпавядаўшы перыяду так званай «вайсковай дэмакратыі». Ці больш старажытны прыклад – Егіпет з фараонам-богам. У сілу кантэкстных прычынаў Полацк не мог абмінуць гэтай прыступкі. І фіксуем мы яе пісьмова ўжо ў XI стагоддзі, калі Усяслаў Брачыслававіч нараджаецца «ад валхавання». Таксама, калі ў 1092 годзе ў Полацку з'яўляецца язычніцкае «наў'е» і Бог карае «паганых» палачанаў за іх нявер'е ў Хрыста. Гэтую факталагічную тэму можна было б цягнуць і далей праз падвойныя імёны полацкіх князёў, праз двоеверства (пераход ад адной веры – язычніцкай, да розных хрысціянскіх) полацкіх і літоўскіх князёў Гедыміна, Войшалка, Альгерда, Андрэя Полацкага, Вітаўта, Ягайлу і інш., ажно да бабулі Насты, што на прыканцы 70-х гадоў мінулага стагоддзя малілася Хрысту каля каменя на выгане ўласнай вёскі пад Вілейкаю.

Пакідаючы ўсё гэта ў падтэксце, мы прыйдзем да высновы, што на ранніх этапах фарміравання Полацкай дзяржавы (як, з некаторымі агаворкамі, і на наступных) уладная аснова Полацкай зямлі, як і яе эканамічная аснова, былі непарыўна звязаны з ідэалагічнай (тэалагічнай) асновай. Вышэй мы пісалі, што няма фактаў ні прымусовага, ні не прымусовага хросту Полацка. Аднак хрост адбыўся, і ў маштабах усёй зямлі. Археалагічныя крыніцы, раскопкі курганоў паказваюць, што ў цэлым працэс расцягнуўся не менш як на II стагоддзі. Маючы на ўвазе прыкметы хрысціянскага культа на вясковых, аддаленых ад гарадоў прасторах. (Дарэчы, цікава было б у дэталях прасачыць гэтую дынаміку). І безумоўна, што ў Полацку

ініцыятарам прыняцця новай веры выступалі вялікія князі, абапіраючыся, як шведскія канунгі, на мясцовы «цінг» – веча. Яны ж потым будавалі храмы, фундавалі манастыры. Мы добра ведаем, што Узвіжанскі Крыж Лазару Богшу замовіла Святая Еўфрасіння. Аднак, на чые грошы? За чый кошт ёй было аддадзена Сяльцо пад Полацкам? Якім коштам будаваўся манастыр і храмы ў ім? Можа, часткова і з царкоўнай дзесяціны, але хто гэтую дзесяціну выдаткаваў царкве? Рытарычныя пытанні...

Апрача таго, што прыняцце хрысціянства ў Полацку было ўсвядомленым і асэнсаваным крокам, як і іншымі «варварамі» Еўропы, яно адбылося па згодзе. Як паміж афіцыйнаю еўрапейскаю лацінкаю і рэальнай размоўнай франкскай моваю; пісьмовай царкоўна-балгарскаю і пабытоваю полацкай, ноўгарадскай і кіеўскай; афіцыйнымі іерогліфамі Люксора і размоўнаю моваю нубійцаў. Нарэшце, як ісці далей, то паміж літаратурнаю беларускаю (рускаю, кітайскаю) і размоўнаю паляшуцкай (разанскаю, гуанджоўскаю). У працяг думкі не складана зразумець, чаму Біблія выдадзеная палачанінам Францыскам давяла яго да «нястачы» садоўніка: не той моваю пераклаў Святое Пісанне, не афіцыйнаю, не прынятаю ў набажэнстве не тое што на Маскоўшчыне, але нават і на радзіме.

Афіцыйнае хрысціянства Полацкай зямлі як раз тым і адрозвівалася ад усіх суседзяў (і блізкіх і дальніх) што не было агрэсіўным. Ажно да XVII стагоддзя мы не ведаем на нашых землях канфесійных сутычак. Маюцца на ўвазе не ўзаемаадносіны паміж канфессіямі хрысціянскімі, але і паміж хрысціянамі і язычнікамі. У той жа час падобных прыкладаў безліч: ад Ноўгарада і Пскова да Заходняй Еўропы сярэднявечнага часу. І ў гэтым факце стрыжнем для разумення можа быць толькі тое, што сёння мы называем беларускай талеранцыяй, цярпімасцю, і што ў часы Полацкай Зямлі, верагодна, называлася «дамоваю», «ладам». У традыцыйнай формуле «старыны не рушым, навіны не ўводзім» на першым месцы для палачанаў заставалася «старына», бо «навіна» так ці іначай прыходзіла, прымушала лічыцца са сваім прыходам па за іх жаданнямі. Ім даводзілася і мірыцца, і прыстасоўвацца да гэтай «навіны», адкуль бы яна не прыходзіла: ці ад князя, Богам вызначанага, ці ад адміністрацыі ВКЛ, ці ад умоваў Ганзы. Гэта былі аб'ектыўныя патрабаванні часу. Аднак палачане ўпарта трымаліся сваёй мінуўшчыны, сваіх правоў, вольнасцяў, у тым ліку і духоўных. Паважаючы (і абіраючы ў пэўныя часы) князя, палачане згаджаліся на інавацыі, пакідаючы за сабою права заставацца ў ранейшых «старых» традыцыях. Адсюль і неверагодная жывучасць сапраўднага дваяверства, аб'ектыўная прыстасаванасць хрысціянскага календара да язычніцкага земляробчага цыкла, якія ні тады ні зараз не ўспрымаюца кантрапунктамі ў разуменні агульнасці жыцця і веры, веры і жыцця, існасці і існавання.

Сёння можна толькі рабіць здагадкі, як тое было паўтары тысячагоддзя таму. Аднак кантэкст, і духоўнага у тым ліку, існавання быў закладзены Полацкам. У асобах яго князёў і ў супольнасці грамады горада і яго «прыгарадаў».

Чацвёртае. У сувязі з традыцыйнасцю полацкага ладу і асаблівасцямі хрысціянства нельга абыйсці феномен, які акадэмік В. Янін назваў «полацкім матрыярхатам». Ён першы звярнуў увагу на гендэрны склад калекцыі віслых пячатак XII стагоддзя з Полацка [16, с. 68 – 70, 231 – 232]. Сярод апошніх – пячаткі княгіні Сафіі, Еўфрасінні Полацкай з выявай невядомай святой. У 1998 годзе на тэрыторыі Спасаўскага манастыра ў Полацку была знойдзена яшчэ адна віслая свінцовая пячатка XII стагоддзя. Яна таксама належала жанчыне. На нашу думку сястры Еўфрасінні – Еўдакіі, якая прыняла пасля сястры ігуменства ў манастыры. Не будзем зараз прыводзіць увесь комплекс даследаванняў і аргументацыяй, паколькі гэта тэма для асобнага артыкула. Адзначым толькі самае істотнае. Першае, гэта тое, што падобныя свінцовыя пячаткі называюцца віслымі, бо прывешваліся да дакументаў. Правам мець пячаткі валодалі альбо князі ці намеснікі, альбо іерархі царквы, бо дакументы неслі дзяржаўную ці рэлігійную інфармацыю. Гандлёвыя пячаткі называюцца пломбамі, яныт маюць іншую форму, памеры і легенды.

Па-другое, многія даследчыкі неаднойчы пісалі аб асаблівым становішчы полацкай дзяржаўнай улады ў XII – XIII стагоддзях. Але звернем таксама ўвагу, што першыя вядомыя дамовы Полацка з Рыгаю і Готскім берагам, як і наступныя са Смаленскам, заключаліся ад імя Святой Сафіі. Натуральна, меўся на ўвазе не сам Сафійскі сабор, але інстытут полацкага епіскапату, і можа нават шырэй – усяго хрысціянскага кліру, ці зусім шырока – ад усіх хрысціян Полацка. Такім чынам, мы бачым надзвычай высокі статус менавіта царкоўнай арганізацыі Полацка, якая, на прыкладах дамоваў, лічылася больш высокаю палітычна, чым нават княжацкая ўлада.

І ў гэтым няма нічога дзіўнага. Перыяд пастаяннай змены князёў, а разам з імі, ці перад ім, змены дамінуючай сілы ў баярска-купецкім асяроддзі (чытай на вечавой плошчы), не даваў стабільнасці ў грамадстве, калі б яно было заснавана толькі на свецкай палітычнай уладзе. У XII стагоддзі полацкія епіскапы безумоўна пастаўляліся кіеўскім мітрапалітам. І таму іх нельга было разглядаць іначай як незалежную сілу, стаячую вышэй палітычных інтарэсаў той ці іншай групоўкі, таго ці іншага князя. Да таго ж, уласна кажучы, прызывае і сама хрысціянская вера. Таму абсалютна нармальна лічыць, што ў час, калі ў горадзе адсутнічала свецкая ўлада, яе браў на сябе вышэйшы прадстаўнік кліру.

Чытач мае права запытаць, а прычым тут жаночы полацкі радавод, нават сама Святая Еўфрасіння, калі ў праваслаўнай царкве ніколі не было і няма ніводнага епіскапа-жанчыны? Гэта так, аднак звернемся

да статыстыкі і мы пабачым, што цягам многіх гадоў крыніцы проста не згадваюць полацкіх епіскапаў. Самае простае і лагічнае дапусціць, што іх не ведалі, а таму і не ўпісалі ў крыніцы. Аднак таксама можна дапусціць, што іх і не было. Сярод епіскапаў менавіта гэтага перыяду вядомы Нікіфар, пастаўлены ў Полацк, а ў 1096 годзе прызначаны князем (цікавы факт!) мітрапалітам кіеўскім. Памёр у 1121 годзе [17, с. 23]. Ён прызначыў у Полацк Міну ў 1105 годзе. Памёр Міна ў 1116-м. Наступны, Казьма, з'явіўся толькі ў 1143 годзе (у 1157-м згадваецца Казьма епіскап Галіцкі, калі быў пастаўлены на кафедру і яшчэ раз пад 1165 годам. Не выключана, што Казьма, згаданы ў 1143 – 1156 гадах як полацкі епіскап, і Казьма Галіцкі – адна асоба [16, с. 58] і кіраваў пастваю ў Полацку па 1147 годам. Потым быў выдалены і праз некаторы час зноў з'явіўся ў Полацку. Наступны, Дыянісій, быў рукапакладзены ў 1156 (1166) і памёр у 1182 (1183) годзе.

Такім чынам, атрымоўваецца, што ў 1116 – 1143 гадах і потым некаторы час паміж 1143 і 1156 гадамі ў Полацку не было епіскапаў. Нагадаем, што калі абапірацца на храналогію жыцця Еўфрасінні, то ў 1116 годзе ёй было 12 год, а ў 1143-м адпаведна 39 год. Звернем увагу яшчэ на адну храналагічную акалічнасць. Менавіта на час адсутнасці ў Полацку епіскапаў прыпадае выгнанне полацкіх князёў у Візантыю – 1129 – 1140 гады (у 1133-м вярнуўся Васілька). Гэты факт у некаторай гіпатэтычнай ступені можна тлумачыць і тым, што полацкі епіскап як духоўнік полацкага князя і ўсяго радаводу таксама падзяліў з імі ўсе цяжкасці выгнання. Але так ці іначай, нават на момант, калі вярнуўся першы князь, Еўфрасінні было каля 29 гадоў і яна была ўжо ігуменяй. А да моманту вяртання астатніх князёў ёй споўнілася 36 гадоў, да моманту з'яўлення епіскапа Казьмы – 39. У час адсутнасці епіскапа паміж 1143 – 1156 гадамі Еўфрасінні адпаведна 39 – 52 гады.

Паўстае лагічнае пытанне: хто браў на сябе палітычную ўладу і духоўную адказнасць за паству ў Полацку падчас адсутнасці і князёў, і епіскапаў, у час, калі не назіраецца ніякай актыўнасці полацкага веча? На наш погляд, мы не знойдзем іншай асобы, з вядомых нам, акрамя Еўфрасінні (Прадславы) Полацкай. І толькі гэтым можна патлумачыць наяўнасць у яе дзяржаўнай адміністрацыйнай пячаткі і факт знаходкі другой пячаткі, уладальнікам якой была жанчына-манахіня з полацкага Спасаўскага манастыра.

І гэта толькі частка цікавых гістарычных фактаў і загадак у гісторыі «полацкага матрыярхату». У ранняй гісторыі – IX – X стагоддзяў – гэта папулярнасць і некаторая нават традыцыйнасць у наданні жанчынам княжацкіх радоў імёнаў Прадслава, Прадзіслава, Перадслава, Звеніслава і г.д. Прычым многія з іх так ці іначай былі звязаны менавіта з полацкім радаводам. У больш позняй гісторыі – аповед XIII стагоддзя, запісаны В. Тацішчавым, аб праўленні ў Полацку Святохны – княжацкай жонкі [18, с. 1 – 10]. Але самае цікавае ў аповедзе гэта бязмежная ўлада Святохны і поўная бездапаможнасць князя. З выраджэннем полацкай княжацкай дынастыі і з'яўленнем у горадзе літоўскіх князёў «матрыярхат», відавочна, сыйшоў у нябыт.

Пятае. Культурная аура Полацка. Безумоўна, яна перагукаецца з духоўнай спадчынай, але разам з тым і самастойная. У дадзеным выпадку пад культурай нам бачыцца тое вымярэнне ў існаванні палачан, якое перадавалася ці не на генным узроўні. Яно ўпітывала шматлікія інавацыі, але заўжды перапрацоўвала іх, застаючыся як у агульнацывілізацыйным кантэксце, так ва ўласным, непаўторным полацкім. Да сённяшняга часу няма асобнай працы, якая была бы прысвечана культуры Полацкай зямлі ці Полацку ўвогуле, на момант яго і ўзвышэння, і існавання ў развітым сярэднявеччы, і ў часы заняпаду ў XVII – XIX стагоддзях. Гэты спадчынны «будынак» не рэстаўруецца, а толькі разбіраецца па цаглінах асобнымі даследчыкамі: то аб асобных праявах матэрыяльнай культуры па археалагічных дадзеных, то па ўзорах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва, то на архітэктурныя «цагліны», то па славутых імёнах і г.д. Больш-менш прыстойная карціна была складзена толькі за перыяд жыцця і дзейнасці Ф. Скарыны, калі ў 90-я гады мінулага стагоддзя да 500-годзя першадрукара выдаўся шэраг кніг аб ім і яго часе. Але агульнага разумення аб тым, адкуль яна з'явілася і што нам дала – няма. Апрача і без таго вядомых фактаў: «Слова аб паходзе Ігара», Сафіі, Еўфрасінні, Спасаўскага манастыра, крыжа Лазара Богшы, Скарыны, Семяона і г.д. Храналагічна вытрыманая, але не патлумачаная лінейка з'яў. Тэма, безумоўна, для асобных даследаванняў і не адной кнігі.

Мы прапануем толькі некалькі думак-тэзісаў, якія маглі бы падказаць шляхі ў пошуках адказу на простае пытанне: «Чаму культура Полацка і Полацкай зямлі да сённяшняга часу ляжыць у падмурку беларускай нацыі?». Відавочны просты адказ: яна была першай. Першай для нас, на нашых землях, у нашай цывілізацыйнай прасторы. Між тым рыцарскую баладу аб няўдалым паходзе ноўгарад-северскага князя Ігара толькі гіпатэтычна можна прыпісваць палачаніну і то часткова. Сафійскі сабор быў далёка не першым сярод аналагічных у хрысціянскім свеце. Манаскія подзвігі і заснаванне манастыроў увогуле на той час ужо мелі больш тысячагадовую гісторыю і прыклады. Першыя перагародкавыя эмалі, як на лазараўскім крыжы, узніклі яшчэ ў Егіпце і Грэцыі, былі вельмі папулярныя ў Візантыі, на славянскіх землях упершыню знойдзены на Украіне. Скарыну ў друкаванні славянскіх кніг рэлігійнага зместа апярэдзіў Швайпольт Фіоль у 1491 годзе ў Празе выпусціўшы «Актаіх» і «Часаслоў». А віршы і тэатральныя пьесы пісаў значна раней за Сімеона Полацкага і Гамер, і Апулей, і Дантэ Аліг'еры і г.д. І тады атрымоўваецца, што непаўторнасць полацкай культуры, як і ўсёй далейшай беларускай, толькі ў таленавітай адаптацыі да мясцовых умоваў дасягненняў культуры сусветнай ці еўрапейскай.

У прынцыпе і гэтага было б дастаткова, каб казаць аб яе ўнікальнасці. Бо, сапраўды, Полацк упершыню на беларускіх землях увабраў у сябе, сканцэнтраваў многія, калі не ўсе дасягненні папярэдняй і сучаснай культуры сваёй эпохі. Аднак, магчыма, гэта толькі вяршыня айсберга, які можна назваць полацкай этнакультурнай прасторай, якую перш за ўсё варта шукаць у этапах складвання полацкага этнасу. Спрэчкі і пытанні: «А кім жа яны, нарэшце былі гэтыя палачане-крывічы?» – не марные. Адказу да сёння няма: ці славяне, ці балты, ці сімбіёз, уключаючы вугра-фінаў? Калі прыйшлі, то адкуль, чаму паселі па рэках, займаючы гарадзішчы зніклай Днепра-Дзвінскай культуры і штрыхавікоў? А можа, ні адкуль і не прыходзілі, а былі аўтахтонамі ледзь не з каменнага веку?

Адной з найважнейшых прыкмет любога этнасу з'яўляецца мова. Ранняя беларуская (полацкая) заўважана ўжо з XII стагоддзя, і што б там не казалі (асабліва з пункту гледжання тэорыі аб адзінасці і непадзельнасці так званай Русі і «старажытнарускага» народа да XIV – XV стст.), яна ўжо ў XII стагоддзі адрознівалася і ад мовы кіеўскіх летапісаў і наўгародскіх берасцяных грамат. Не будзем прыводзіць прыклады, яны вядомы [19, с. 114 – 129]. Але ўжо ў той час, нават фанетычна прысутнічаюць нашы класічныя «дзэканне-цэканне», мяккае «ц» і фрыкатыўнае «г», нескладовае «ў». Другую фундаментальную адрознасць трэба, на наш погляд, шукаць у своеасаблівасці этнічных вераванняў і светапоглядах. А таксама ў іх спалучэнні з палітычнай і эканамічнай культурамі. Сучасная этнаграфічная навука зрабіла велізарнейшую працу па пошуку, выяўленню, дакументаванню ўсіх праяваў беларускай этнаграфіі, у тым ліку і рэгіянальных. І гэта абсалютна слушна. Недарма Е. Раманаў, М. Доўнар-Запольскі, Б. Эпімах-Шыпіла і іншыя «першапраходцы» менавіта з этнаграфіі пачыналі спасціжэнне сутнасці беларускага народа. Ужо яны разумелі, што гэта ёсць самыя найглыбіннейшыя пласты беларускай існасці, у адрозненні ад пісьмовых гістарычных фактаў, якія ляжалі ды і зараз з большага ляжаць на паверхні.

Аднак справа ў тым, што робячы аналіз фальклору, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, робячы высновы аб зямельным каляндарным цыкле беларусаў, сучасная этнаграфія рэдка робіць спробу рэтраспектыўнага даследавання, сягаючы ў глыбіню стагоддзяў. Часцей усё абмяжоўваецца XIX – пачаткам XX стагоддзя. Недастаткова распрацавана нават тэма пантэона язычніцкіх багоў. Дакладней, яны быццам бы і вядомы. Але не звязваюцца з канкрэтнымі прыкладамі (капішчамі, камянямі, выяўленчым мастацтвам, гістарычнымі крыніцамі), не зусім зразумела і храналагічная еірархія. Між тым менавіта Полацк упершыню ў нашай гісторыі даў прыклад унікальнага спалучэння язычніцтва і хрысціянства. Культурнае далучэнне да Полацка гістарычнай язычніцкай Літвы толькі падтрымала гэты стан «ін'екцыяй» традыцыйных светапоглядаў. І гэтая нітачка цягнецца да сённяшніх дзён. Пэўна, мы не знойдзем сёння ў свеце (прынамсі ў Еўропе) ніводнага хрысціянскага народа, які быў бы такім язычніцкім па сутнасці. Яна зразумела з простага прыкладу: выбіць на святым камені крыж (як Барыс і Рагвалод), а потым прыносіць яму ахвяры, прасіць дажджу і ўраджаю. Ці як сёння – мець язычніцкі дзень памяці памерлых у якасці дзяржаўнага свята. Падобнага ва ўсёй Еўропе не знайсці.

Унікальнасць полацкай культуры трэба шукаць менавіта ў спалучэнні традыцый і інавацый. Дакладней, у прыняцці і развіцці інавацый, пры абавязковай умове захавання традыцый. Шматлікія народы, абярнуўшыся ў дзяржаўны стан, разумелі універсалізм хрысціянства, як мы разумеем сённяшнюю глабалізацыю. Рэшткі той дахрысціянскай культуры ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе пачалі вынішчацца яшчэ з часоў франкаў і былі дабіты інквізіцыяй. У Масковіі апошні ўдар быў нанесены Іванам Васільевічам, Рым і Візантыя яшчэ раней змянілі статуі багоў на статуі імператараў. І толькі ў Мінску на пачатку XX стагоддзя можна было прыйсці на бераг Свіслачы і памаліцца ля каменя, пакінуўшы ахвяру і багам і дзвюм служкам Севасцеям. Малодшага сына раскулачылі ажно толькі ў 1930-х гадах [20, с. 47 – 50].

Менавіта з гэтых культурных нетраў выйшла непаўторная полацкая культура сярэднявечча. Зразумела, што культура любога народа непаўторная і своеасаблівая. Нават пры ўмове распаўсюджвання універсальных ідэй і універсалізацыі побыту. Іх творчая перапрацоўка і дае элементы адрознасці культур. Полацк XI – XIII стагоддзяў не толькі пацвярджае гэта, але і задае шэраг пытанняў, на якія да сёння няма адказу. Напрыклад, добра вядомы ўсім полацкі Сафійскі сабор. Сапраўды першы (пакуль не знойдзены іншыя) мураваны храм на нашых землях. Але чаму ён так адрозніваўся ад існаваўшых на той час сабораў Кіева, Чарнігава, Ноўгарада як сваімі выцягнутымі прапорцыямі, так і колькасцю купалоў? Адкуль у Сафіі, а потым і ў іншых храмах XII стагоддзя выцягнутасць крыжова-купальнай сістэмы, характэрная для храмаў Балгарыі і Сербіі? Гэта асаблівасць настолькі яўная і непаўторная, што падобныя храмы, пабудаваныя пасля Полацка і ў Смаленску, і ў Гародні, нават вылучылі ў асобную «полацкую школу дойлідства». Адкуль увогуле ў Полацку мог з'явіцца гэтак званы храм-трыконх, унікальны і нехарактэрны для ўсходнеславянскай сярэднявечнай архітэктуры? Чаму першы ў гісторыі Кіеўскай Русі жаночы манастыр узнік менавіта ў Полацку і першай паломніцай у Палестыну стала Еўфрасіння Полацкая? Якімі шляхамі ў Крыж-каўчэг, зроблены Лазарам Богшаю ў 1161 годзе, трапілі святыні: кроў Хрыстова, кавалкі крыжа, на якім яго распялі, фрагменты мошчаў святых першапакутнікаў? На чым пісалі старажытныя палачане, і куды нарэшце падзеліся полацкія летапісы? Не можа ў прынцыпе быць, каб гэтак званы Яропкінскі летапіс, які трымаў у руках М. Тацішчаў і які быццам бы згарэў у маскоўскім пажары

1812 годзе, быў адзіным летапісам у полацкай гісторыі. Дзе астатнія, калі сёння мы ведаем не толькі розныя летапісы Кіева, Ноўгарада, Пскова і г.д., але і розныя іх спісы. Чаму ў матэрыяльнай культуры горада гэтага часу так яскрава праяўляюцца скандынаўскія, балтыйскія ўвогуле, і нават вугра-фінскія рысы. Асабліва ва ўпрыгажаннях? Пытанні можна было б доўжыць. Адказу на іх пакуль што няма. А гэта значыць, што застаецца вялізарнае поле для даследчыцкай працы ў разуменні і тлумачэнні феномена старажытнай полацкай культуры.

Полацк сапраўды – пачатак нашай гісторыі, прынамсі летапіснай. Сапраўдныя карані трэба шукаць значна глыбей. Але і гэтага дастаткова, каб мець рэальныя пачаткі для нацыянальнага часу адлічэння. І не толькі дзеля таго, каб пазначыць даты ў падручніках, не толькі, каб даць штуршок для роздумаў аб айчыннай гісторыі, але і дзеля атаясамлівання сябе саміх у часе і прасторы не толькі агульнаеўрапейскай цывілізацыі, але ў свеце як даннасці. На працягу бягучага стагоддзя, па прагнозах навукоўцаў, колькасць «жывых» моваў зменшыцца да ста – ста пяцідзесяці. Літаральна кожны дзень знікае па адной. Між тым разам з мовамі не знікаюць культурныя набыткі. Наадварот, яны ўсё болей прыцягальны і таямнічы. Згадаем Месапатамію, кельтаў, фінікійцаў, індзейцаў Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі і г.д. Полацкая прастора, нават для нас саміх дагэтуль не канчаткова зразумелая, для акружаючых яшчэ большая «Тэрра інкогніта». Нешта накшталт Мора Геродота ці Атлантыды. Разам з тым менавіта яна прывяла нас у цывілізацыйную супольнасць.

ЛІТАРАТУРА

1. Легенды і паданні / М.Я. Грынблат і [інш.]; пад аг. рэд. А.С. Фядосіка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.
2. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк IX – XIII вв. / Г.В. Штыхаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 136 с.
3. Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVII стст. Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1998. – 183 с.
4. Дук, Д.У. Полацк XVI – XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.
5. Древняя Русь. Город, замок, село / В.Г. Борисевич [и др.]; под общ. ред. Б.А. Рыбакова. – М.: Наука, 1985. – 432 с.
6. Тарасаў, С.В. Раннесярэднявечная беларуская дзяржаўнасць у еўрапейскім геапалітычным працэсе / С.В. Тарасаў; Ін-т гісторыі АН Беларусі; склад. А.А. Мяцельскі // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск: ТАА «Сантанас», 1993. – Ч. 2. – 184 с.
7. Бродель, Ф. Время мира. Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV – XVIII вв. / Ф. Бродель. – М.: Прогресс, 1992. – 680 с.
8. Бектинеев, Ш.И. Переодизация денежного обращения на территории Беларуси с IX в до Люблинской унии 1569 г. / Ш.И. Бектинеев // Гіст.-археалаг. зб.; Ін-т гісторыі АН Беларусі; склад. А.А. Мяцельскі. – Мінск: ВПП Дзяржэканомплана Рэсп. Беларусь, 1994. – № 4.
9. Славяне и норманны в ранней истории балтийского региона // Славяне и скандинавы / И. Херман [и др.]; под общ. ред. Е.А. Мельниковой. – М.: Прогресс, 1986. – 412 с.
10. Воранаў, С. Рэканструкцыя і мадэліраванне старажытных рачных і марскіх шляхоў / С. Воранаў, А. Кіштымаў, С. Тарасаў // Беларус. гіст. часоп. – Мінск, 2005. – № 1. – С. 3 – 10. – № 3. – С. 3 – 14.
11. Рябцевич, В.Н. Нумизматика Беларуси / В.Н. Рябцевич. – Минск: Полымя, 1995. – 687 с.
12. Памяць. Полацк / пад аг. рэд. Г.П. Пашкова. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2002. – 912 с.
13. Седов, В.В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья / В.В. Седов. – М.: Наука, 1970. – 214 с.
14. Без-Корнилович, М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии / М.О. Без-Корнилович. – СПб.: Типография III отд. собст. Е.И.В. Канцелярии, 1855. – (Справ. изд.-е факсим. типа под ред. В.Н. Татура. – Минск: ООО «Алфавит». – 356 с.).
15. Рыбаков, Б.А. Язычество Древней Руси / Б.А. Рыбаков. – М.: Наука, 1987. – 784 с.
16. Янин, В.Л. Актовые печати Древней Руси X – V вв. / В.Л. Янин, П.Г. Гайдуков. – М.: Наука, 1970. – Т. I: Печати X – начала XII вв. – 504 с.
17. Мельников, А.А. Путь непечален. Исторические свидетельства о святости Белой Руси / А.А. Мельников. – Минск: Изд. Белорусской православной церкви Московского Патриархата, 1992. – 242 с.
18. Майоров, А.В. Из истории белорусского летописания: полоцкая летопись В.Н. Татищева / А.В. Майоров // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2005. – № 1.
19. Тарасаў, С.В. З гісторыі полацкай эпіграфікі X – XV стст. / С.В. Тарасаў // Кніжная культура Беларусі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 224 с.
20. Ляўкоў, Э.А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э.А. Ляўкоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 208 с.

ОСНОВНЫЕ ИТОГИ ИССЛЕДОВАНИЙ РАННЕСРЕДНЕВЕКОВЫХ ПАМЯТНИКОВ КАВКАЗСКОЙ АЛБАНИИ

канд. ист. наук М.ДЖ. ХАЛИЛОВ
(Институт археологии и этнографии Национальной академии наук Азербайджана, Баку)

Изучены вехи раннесредневековых археологических памятников одного из значительных государственных образований на Кавказе – Албании. Определяются основные этапы полевых исследований, при этом в качестве поворотного пункта характеризуется полевая деятельность Мингечаурской археологической экспедиции. Для раскрытия характера археологических памятников широко используются данные «Истории албан» (VIII – X вв.). Определенное внимание уделено археологическому изучению Нагорного Карабаха азербайджанскими специалистами в советский период. Статья вызывает особый интерес для ознакомления с состоянием азербайджанской полевой раннесредневековой археологии в постсоветский период. Объектами внимания становятся полевые исследования азербайджанских и зарубежных археологов в совместных экспедициях, а также незаконные раскопки на оккупированной Арменией территории Азербайджанской Республики. Определяются актуальные задачи, стоящие перед раннесредневековой археологией Албании.

Албания – государственное образование на Кавказе античного и раннесредневекового периодов, просуществовавшее на протяжении более 1000 лет. В его состав входили в основном территория современной Азербайджанской Республики, а также некоторые сопредельные регионы других республик Кавказа.

Эпоха раннесредневековья для албан была отмечена тем, что в середине III века их страна вошла в состав империи Сасанидов, сохранив при этом власть местных правителей в полунезависимом государстве, а в начале IV века христианство было объявлено государственной религией в Албании.

С памятниками раннесредневековой Албании ученые впервые ознакомились еще в XVII веке. Немецкий ученый-магистр, преподававший в Лейпцигском университете, Адам Олеарий (Эльшлегер) в 1638 году посетил Дербент, где изучал оборонительные стены, на которых зафиксировал «три строки по-сирийски», арабскую надпись «и еще чуждые письмена, довольно неясные вследствие древности» [1, с. 486]. Скорее всего, здесь имелись в виду пехлевийские (среднеперсидские), арабская и предположительно албанская надписи [2, с. 10 – 11].

Первые археологические раскопки на раннесредневековых памятниках, расположенных на исторической территории Албании, были произведены в 1880 году, когда А.А. Русов и Н.О. Цилоссани исследовали курганы, находящиеся в пределах современного Дербентского района Дагестана [3, с. 8 – 9].

В 1895 году в научный оборот было введено сообщение о фиксации могилы царя Вачагана, отождествляемого с царем Албании Вачаганом III, пришедшим к власти в 487 году. Место его захоронения было выявлено в комплексе храма св. Елисея в Нагорном Карабахе.

Но подлинно научные, систематические и комплексные археологические исследования памятников раннесредневековой Албании начались в 1946 году с изучением Мингечаура под руководством известного азербайджанского археолога С.М. Казиева [4; 5].

Именно в Мингечауре впервые были выявлены новые типы погребальных памятников (бескурганные катакомбы, различные христианские захоронения).

Сенсационным открытием явилось обнаружение материалов албанской эпиграфики [6]. Еще в албанском источнике VIII – X веков «История албан» среди 8 народностей мира, имевших в эпоху раннесредневековья собственную письменность, упоминаются и албаны («История албан», I: 3). Албанские письмена, в основном, зафиксированы на глиняных подсвечниках. Надпись с наибольшим количеством знаков выявлена на известном камне с двумя павлинами. Привлечение кавказского языкового материала для дешифровки албанских надписей не привело к ожидаемым результатам. Малочисленность материалов албанской эпиграфики, отсутствие билингвы также сказываются на процессе их дешифровки. Последние исследования указывают на то, что происхождение древнеалбанской культуры, скорее всего, было связано с переднеазиатскими регионами. Исходя из этого, видимо, следует искать албано-переднеазиатские лингвистические параллели.

Результаты полевых исследований Мингечаурской экспедиции, завершенных в 1953 году, имея огромное значение в деле археологического изучения всего Кавказа, вызвали большой интерес к памятникам Азербайджана за его пределами. В 1953 году была организована совместная Азербайджанская (Орен-калинская) экспедиция Института археологии АН СССР и Института истории АН Азербайджанской ССР под руководством известного российского археолога А.А. Иессена. Основными объектами исследований этой экспедиции стали городище Орен-кала и курган Уч-тепе в Мильско-Карабахской степи.

Открытие в 1955 году гончарных печей для обжига сфероконических сосудов со штампами, где упоминался город Байлакан, позволило исследователям окончательно идентифицировать городище Орен-кала со средневековым городом Байлакан, основанным в VI веке [7, с. 32].

В 1957 – 1960 годах экспедиция вела раскопки одного из курганов Уч-тепе, которые увенчались выявлением впускного захоронения знатного воина начала VII века с золотыми украшениями, керамикой, предметами вооружения и т.д. Явно северокавказская форма керамического сосуда, зафиксированного в погребении, стала решающим фактором для связывания захороненного воина с хазарским войском, в состав которого входили не только собственно хазары, но также воины из других тюркских племен Хазарского каганата [8, с. 173 – 182]. В дальнейшем на территории исторической Албании были исследованы и другие погребальные памятники, а также различные материалы, относящиеся к культуре номадов [9; 10].

Начиная с 1958 года в связи с организацией экспедиций для ведения систематических, стационарных археологических исследований в различных регионах Азербайджана изучение раннесредневековых памятников Албании приобретает широкомасштабный характер. Одна их этих экспедиций вела исследование городища Гявур-кала (Агдамский район). Здесь в 1958 году наряду с остатками различных строений, христианских храмов был выявлен каменный саркофаг, где, судя по надписи, в X веке был погребен брат албанского царя Григора Хамама [11]. В связи с этим городище Гявур-кала было предположительно идентифицировано с летней столицей Албании – городом Алуэн [12, с. 119]. Конечно, мнение о том, что члена царской семьи должны были захоронить именно в столице государства сформулировано логично. Однако также нужно учитывать то обстоятельство, что царь убил своего брата («История албан», III: 21). При такой ситуации погребение в столице становится необязательным. Таким образом, по этому поводу нельзя пока делать окончательные выводы. Будущие исследования должны уточнить этот вопрос.

В 1963 – 1971 годах Институт истории АН Азербайджанской ССР проводил полевые исследования раннесредневековых памятников Нагорного Карабаха [13; 14; 15; 16]. Были произведены раскопки на городище Амарас, в поселениях Сыгнаг, Чардаглы (Магавуз), в крепости Чилаберд (Чараберд), где в начале VII века со знаменитой речью выступил католикос Албании Виро для предотвращения разрушительных действий хазар («История албан», II: 14).

В 1964 году в селе Джанятаг в Нагорном Карабахе, а также в селе Шефибейли (Агдамский район) в равнинном Карабахе были выявлены каменные изваяния, изготовленные в едином каноне. В дальнейшем были обнаружены и другие изваяния данного круга, которые еще раз подтвердили тезис о том, что равнинный и Нагорный Карабах в этнокультурном аспекте составляли единое целое [17; 18]. Возможно, именно эти памятники скульптуры имелись ввиду в «Истории албан», где упоминались идолы Арцаха, против поклонения которым боролся царь Вачаган III («История албан», I: 17).

В 1968 году была обнаружена и исследована могила албанского католикоса св. Григориса в Амарасе [19]. Он был убит в 337 году. О его могиле в «Истории албан» указано следующее: «Подняв его ученики привезли в городок Амарас в области Хабанд и там положили в церкви, близ кафедры, с северной стороны» («История албан», I: 14). И действительно, на глубине 4 метров, под северной частью алтаря церкви Амарасского монастыря была вскрыта могила, где в круглом деревянном ящике были обнаружены плохо сохранившиеся костные останки. На такой глубине рядом другие погребения не были выявлены. На всей исторической территории Албании были исследованы и другие погребальные памятники, которые состоят из 7 основных типов: грунтовые, кувшинные, ванночные, катакомбные погребения, каменные ящики (гробницы), курганы и различные христианские захоронения. Могила Григориса, естественно, относится к последним. Грунтовые погребения, каменные ящики (гробницы), а также поздние катакомбы были характерны как для языческой погребальной практики, так и для христианства. Кувшинные погребения, захоронения в керамических ваннах и курганы зафиксированы только у язычников Албании [20]. Наоборот, гробницы из сырцового кирпича, каменные саркофаги встречались только у христиан Албании. В конструкции христианских и языческих погребений аналогичных типов особые различия не наблюдаются. Особенности проявляют себя лишь в погребальных обрядах и ритуалах.

В 1971 году было проведено археологическое исследование комплекса храма св. Елисея у подножия Муровдагского хребта в Нагорном Карабахе [21]. Этот храм был построен в память о св. Елисее – первом проповеднике христианства в Албании. Он был учеником апостола Фаддея («История албан», I: 6). Предполагается, что именно на месте постройки храма был убит Елисей. Произведенными археологическими раскопками установлено, что храм несколько раз перестраивался, а его первоначальная постройка относится приблизительно к VI веку. В одной из часовен, входящих в комплекс храма, находится могила царя Вачагана. По данным «Истории албан», царь Албании Вачаган III Благочестивый соорудил столп на месте гибели Елисея («История албан», I: 7). Дютакан – родное село Вачагана III («История албан», I: 21, II: 10) также локализуется вблизи этого храма [22, с. 90]. Другое известное карабахское село Каланкату, считающееся родным для одного из авторов «Истории албан» («История албан», II: 11), в результате ар-

хеологических исследований было предположительно идентифицировано с поселением Чардаглы (Магавуз), расположенным на правом берегу реки Тертер в Нагорном Карабахе [23, с. 267 – 268]. Предварительное изучение данного поселения позволило выдвинуть мнение о том, что оно возникло в эпоху раннесредневековья и продолжало свое существование приблизительно до XVI века.

Таким образом, археологическое изучение раннесредневековых памятников Нагорного Карабаха раскрыв их роль и значение в развитии албанской культуры, подтвердило мнение о том, что без этого региона немыслимо само понятие албанская история и культура эпохи раннего средневековья.

С 1971 года ведутся систематические, стационарные исследования Дербента, которые позволили скорректировать хронологию оборонительного сооружения. До археологического изучения Дербента господствовало мнение о том, что Сасанидский Иран постепенно захватывая в северо-восточном (гуннском) направлении отдельные части территории албанской прикаспийской области Чол, каждый раз сооружал оборонительную стену между Каспийским морем и Кавказскими горами [24, с. 268]. При такой ситуации наиболее древними считались Беш-бармакские стены, расположенные южнее Гильгильчайских и Дербентских стен, а Дербентские стены наиболее поздними, так как находились севернее двух других оборонительных сооружений. При этом исследователи не обратили внимание на данные «Истории албан» о том, что уже при Сасаниде Ездигерде II (439 – 457-е года) область Чол находилась под управлением иранского наместника («История албан», II: 2), т.е. никакого «поэтапного» движения в проходе между Кавказом и Каспием не было. Выявление археологическими раскопками в Дербенте Сасанидских монет, чеканенных от имени Ездигерда II, а также остатков оборонительной стены из сырцового кирпича периода правления Ездигерда II [25, с. 257] доказало, что Дербентское оборонительное сооружение является первым образцом среди фортификационных строений данного типа в Прикаспийской Албании. Вообще, нужно отметить, что подобные сооружения, вошедшие в научную литературу под условным названием «длинные стены», не имеют прямых аналогов на Кавказе и Передней Азии. Уникальность Дербента в мировом масштабе заключается в том, что этот город был построен между двумя, параллельными, длинными стенами. Сообщение «Истории албан» о том, что в процесс строения были привлечены албанские архитекторы («История албан», II: 11) является веским доводом, подтверждающим мнение о принадлежности дербентских сооружений албанской архитектуре.

В 1972 и 1974 – 1977 годах было проведено археологическое исследование городища Торпак-кала (Таузский район Азербайджана). Торпак-кала в переводе с азербайджанского языка означает «земляная крепость». Интересно, что один из албанских городов Хунан имел параллельное арабское название – Галат ат-тураб (X век) и параллельное грузинское название – Мтверская крепость (XI век), которые переводятся также как «земляная крепость». Этот фактор, а также расположение Торпак-калы, как и Хунана на пути от города Шамкир в сторону Грузии не оставили сомнений в тождестве Торпак-калы и Хунана, тем более, что холм Торпак-кала примыкает к равнине под названием Хунам.

Раскопки 1975 года позволили уточнить еще один вопрос. Выяснилось, что нижний слой городища относится к VII – IX векам [26], а это противоречит мнению об идентичности Хунана и албанской крепости Хнаракерт, так как в отличие от Хунана Хнаракерт известен с V века. На основе этого, а также сравнения сведений письменных источников о Хунане и Хнаракерте, наконец, удалось выяснить, что эти города не имеют никакого отношения друг к другу, являясь различными пунктами.

В 1984 году начались систематические археологические раскопки зимней столицы раннесредневековой Албании города Партав (Барда) [27]. До этого на городище проводились мелкомасштабные археологические исследования. В 1985 – 1986 годах были выявлены культурные слои VI – VIII веков [28]. Но, к сожалению, в дальнейшем раскопки были приостановлены на неопределенный срок. В настоящее время прилагаются усилия для восстановления стационарного археологического изучения Партава (Барды).

Именно малоизученность не позволила пока воссоздать основные черты столичного города. По «Истории албан», известно, что в начале VII века город имел 4 ворота («История албан», II: 11). Это, в свою очередь, дает основание для предположения о том, что Партав застраивался по крестообразному плану, то есть в центре перекрещивались под прямым углом 2 улицы, которые вели к определенным воротам. При этом город состоял соответственно из 4 крупных кварталов.

В 2000 – 2001 годах совместная азербайджано-норвежская экспедиция провела археологические раскопки христианского храма в селе Киш Шекинского района Азербайджана [29, с. 39 – 182]. Основной задачей экспедиции явилось определение времени постройки храма. В «Истории албан» сообщается о том, что св. Елисей построил первую церковь в Албании именно в селе Гис («История албан», I: 6), которая «была матерью восточных церквей» («История албан», II: 48). Албанское село Гис убедительно идентифицировано с современным селом Киш [30, с. 237]. Предварительные результаты полевых исследований, по мнению специалистов, подтверждают дату основания Кишского храма, указанную в «Истории албан». Этот храм функционировал также в течение всей эпохи раннесредневековья.

Нужно отметить, что албаны строили церкви, монастыри также далеко за пределами Албании. В 70 – 80-х годах XX века в Верхнем Чирюрте (Северный Дагестан) были обнаружены остатки 4 церквей эпохи раннесредневековья [31]. Основание первых церквей в Верхнем Чирюрте исследователи связывают с миссионерской деятельностью албанского епископа из Арцаха Исраэля в стране гуннов в конце VII века («История албан», II: 41), при этом выявляют некоторые идентичные детали верхнечирюртовских церквей и описанной в «Истории албан» церкви, построенной Исраэлом [32, с. 196; 33, с. 167 – 171; 34, с. 33]. Албаны, по данным «Истории албан», возводили монастыри в Ерусалиме. Монастырь, носивший название Партав в честь столицы Албании, располагался рядом со знаменитой Башней Давида («История албан», II: 52). Это прекрасный ориентир для будущих археологических исследований.

В 2001 – 2002 годах совместная археологическая экспедиция, в состав которой входили специалисты из Азербайджана, США и Дагестана, исследовала Гильгильчайскую оборонительную стену. Были проведены обмерные и картографические работы, начиная с морского побережья в отдельности изучено 190 башен, выявлены места ворот и таким образом, была получена точная информация о 1/3 части этой длинной стены [35].

С 2006 года экспедиция Института археологии и этнографии НАН Республики Армения ведет незаконные раскопки городища на берегу реки Хачын, на территории Агдамского района, оккупированной Арменией в ходе Карабахской войны. Агдамский район, до захвата армянами заселенный исключительно азербайджанцами, никогда не входил в состав бывшей Нагорно-Карабахской автономной области. Археологи из Армении датировали культурные слои городища в пределах I в. до н. э. – XIV в. н. э. Таким образом, это городище существовало в течение всей эпохи раннего средневековья. Армянскими археологами данное городище идентифицируется с Тигранакертом, построенным царем Армении Тиграном II в I в. до н. э. Но подобная идентификация не вызвала особого доверия даже в научных кругах самой Армении. По нашему мнению [36], в этом случае можно говорить об открытии совершенно другого города, возможно, Анариаки, упоминаемой Страбоном в своей «Географии» (XI, 7, § 1).

Раскопки 2007 года, проведенные в крепости, входившей в единый комплекс городища, дали материал первой половины I тыс. до н. э., тем самым была окончательно отвергнута «тигранакертская» версия.

В настоящее время перед раннесредневековой археологией Албании стоят еще более актуальные, важные задачи.

Как было указано выше, в широкомасштабных археологических раскопках нуждается Барда – зимняя столица Албании со II половины V века. Пока остаются нелокализованными Халхал – зимняя столица раннесредневековой Албании до переноса столицы в Партав (Барду), летняя столица Албании город Алуэн, упоминаемый в связи с событиями конца V века. Еще не выявлены захоронения аристократии Масгутского (массагетского) царства, просуществовавшего на исторической территории Северо-Восточной Албании с конца III века до начала VIII века.

Эти и другие задачи – ориентир для будущих археологических исследований.

ЛИТЕРАТУРА

1. Олеарий, А. Описание путешествия в Московию и через Московию в Персию и обратно / А. Олеарий. – СПб., 1906.
2. Халилов, М.Дж. А. Олеарий о городах и селениях Ширвана / М.Дж. Халилов // Almaniya – Azərbaycan ədəbi-mədəni və tarixi əlaqələri mövzusuna həsr olunan elmi konfransın məqalələr toplusu. – Bakı, 2006. – S. 4 – 13.
3. Гмыря, Л.Б. Прикаспийский Дагестан в эпоху Великого переселения народов. Могильники / Л.Б. Гмыря. – Махачкала: Изд-во Дагест. Науч. центра, 1993. – 367 с.
4. Vahidov, R.M. Mingəçevir III – VIII əsrlərdə / R.M. Vahidov. – Bakı, Azərbaycan SSR EA nəşriyyatı, 1961. – 180 s.
5. Асланов, Г.М. Материальная культура Мингечаура I – VII вв.: автореф. дис. ... канд. ист. наук / Г.М. Асланов. – Баку, 1963. – 26 с.
6. Vahidov, R.M. Mingəçevir epiqrafik abidələrinin arxeoloji xarakteristikası / R.M. Vahidov // Azərbaycan SSR EA Xəbərləri. İctimai elmlər seriyası. – 1958. – № 4. – S. 107 – 120.
7. Иессен, А.А. Из исторического прошлого Мильско – Карабахской степи / А.А. Иессен // Труды Азербайджанской археологической экспедиции. – М. – Л.: Наука, 1965. – Т. II (МИА СССР, № 125). – С. 10 – 36.
8. Иессен, А.А. Раскопки большого кургана в урочище Уч-тепе / А.А. Иессен // Тр. Азербайдж. археолог. экспедиции. – М. – Л.: Наука, 1965. – Т. II (МИА СССР, № 125). – С. 153 – 194.

9. Халилов, М.Дж. Северные номады и материалы из раннесредневековых албанских памятников / М.Дж. Халилов // Археология, этнология, фольклористика Кавказа: междунар. науч. конф. – Тбилиси: Универсал, 2007. – С. 207 – 210.
10. Helilov, M. Ösmagyarok Azerbajdzsánban / M. Helilov, S. Nyitray. – Budapest: HUN-idea, 2008. – 230 o.
11. Vahidov, R.M. Govurqalada arxeoloji qazıntılar / R.M. Vahidov // AMM, VI c. – Bakı, Azərbaycan SSR EA nəşriyyatı, 1965. – S. 167 – 182.
12. Göyüşov, Rəşid. Azərbaycan arxeologiyası / Rəşid Göyüşov. – Bakı: İşıq, 1986. – 186 s.
13. Göyüşov, Rəşid. Sığnaq yaşayış yerindən aşkar edilmiş məişət təsvirli xaç daş / Rəşid Göyüşov // Azərbaycan SSR EA Xəbərləri. – Tarix, fəlsəfə, hüquq seriyası, 1968. – № 4. – S. 38 – 43.
14. Göyüşov, Rəşid. Amaras – Ağoğlan / Rəşid Göyüşov. – Bakı: Elm, 1975. – 100 s.
15. Геюшев, Р.Б. Археологическое обследование городища Ана шехер и крепости Чараберд / Р.Б. Геюшев // Материалы к Сессии, посв. итогам археологических и этнографических исследований 1964 года в СССР: тез. докл. – Баку: изд-во АН Азербайдж. ССР, 1965. – С. 148 – 149.
16. Геюшев, Р.Б. Стекловарная печь у Амарасского монастыря / Р.Б. Геюшев, А.Б. Нуриев // Материальная культура Азербайджана. – Баку: Элм, 1980. – Т. IX. – С. 112 – 116.
17. Халилов, М.Дж. Исследование каменных изваяний Карабаха / М.Дж. Халилов // АО 1982 года. – М.: Наука, 1984. – С. 438 – 439.
18. Халилов, М.Дж. Каменные изваяния Азербайджана (II пол. I тыс. до н.э. – I тыс. н. э.): автореф. дис. … канд. ист. наук / М.Дж. Халилов. – М.: МГУ им. М.В. Ломоносова, 1988. – 20 с.
19. Геюшев, Р.Б. О могиле Григориса, католикоса Кавказской Албании / Р.Б. Геюшев // Материалы к Всесоюз. сессии, посв. итогам археологических и этнографических исследований 1969 г. в СССР: тез. докл. – Баку, 1970. – С. 7.
20. Халилов, М.Дж. Раннесредневековые кувшинные погребения Азербайджана / М.Дж. Халилов // Новейшие археологические и этнографические исследования на Кавказе: материалы междунар. науч. конф. – Махачкала: Эпоха, 2007. – С. 183 – 186.
21. Геюшев, Р.Б. Храм Елисей в Азербайджане / Р.Б. Геюшев // Материалы к Сессии, посв. итогам полевых археологических и этнографических исследований 1971 г. в СССР: тез. докл. археологов и этнографов Азербайдж. ССР. – Баку: Элм, 1972. – С. 32 – 33.
22. Геюшев, Р.Б. Христианство в Кавказской Албании / Р.Б. Геюшев. – Баку: Элм, 1984. – 192 с.
23. Göyüşov, R.B. Orta əsr Bərdə – Dvin ticarət yolu haqqında / R.B. Göyüşov, N.M. Quliyev // AMM, VII c. – Bakı: Elm, 1973. – S. 263 – 270.
24. Тревер, К.В. Очерки по истории и культуре Кавказской Албании IV в. до н. э. – VII в. н. э. / К.В. Тревер. – М. – Л.: Изд-во АН СССР, 1959. – 391 с.
25. Кудрявцев, А.А. О датировке первых сасанидских укреплений в Дербенте / А.А. Кудрявцев // Советская архитектура. – 1978. – № 3. – С. 243 – 258.
26. Ваидов, Р.М. Археологические работы Таузского отряда в 1975 году / Р.М. Ваидов, Н.М. Гулиев, Э.А. Гасымов // Археологические и этнографические изыскания в Азербайджане (1975 г.). – Баку: Элм, 1978. – С. 44 – 46.
27. Нуриев, А.Б. Раскопки в Барде / А.Б. Нуриев // АО 1984 года. – М.: Наука, 1986. – С. 423 – 424.
28. Нуриев, А.Б. Раскопки в средневековой Барде / А.Б. Нуриев // АО 1986 года. – М.: Наука, 1988. – С. 463.
29. Керимов, В. Киш. История, архитектура, археология / В. Керимов, Б. Стурфиел. – Баку: Чашыоглу, 2003. – 183 с.
30. Ямпольский, З.И. Древняя Албания III – I вв. до н. э. / З.И. Ямпольский. – Баку: Изд-во АН Азербайдж. ССР, 1961. – 383 с.
31. Магомедов, М.Г. Новые раннесредневековые культовые памятники в приморском Дагестане / М.Г. Магомедов // Обряды и культы древнего и средневекового населения Дагестана: сб. ст. – Махачкала, 1986. – С. 109 – 122.
32. Магомедов, М.Г. Раннесредневековые церкви Верхнего Чирюрта / М.Г. Магомедов // Советская архитектура. – 1979. – № 3. – С. 186 – 202.
33. Магомедов, М.Г. Образование Хазарского каганата / М.Г. Магомедов. – М.: Наука, 1983. – 224 с.
34. Плетнева, С.А. Хазары / С.А. Плетнева. – М.: Наука, 1986. – 91 с.
35. The Ghilghilchay defensive Long wall: new investigations / A. Aliev Asker [и др.] // Ancient west and east. Volume 5, nos. 1 – 2. – Leiden – Boston, 2006. – P. 143 – 177.
36. Халилов, М.Дж. О локализации албанского Тигранакерта / М.Дж. Халилов // Irs/Наследие. – Москва – Баку, 2007. – № 4 – 5. – С. 32 – 34.

КЕРАМИКА ГОРОДИЩ СЕВЕРНОЙ БЕЛАРУСИ

З.А. ХАРИТОНОВИЧ
(Институт истории НАН Беларуси, Минск)

Подводятся итоги изучения керамического комплекса городищ Белорусского Подвинья с учетом исследований последних 10 – 15 лет. Основная задача статьи – выделить характерные черты керамического комплекса по типам обработки поверхности и профилировке верхних частей сосудов с учетом локальных и хронологических особенностей. Были выделены ранний и поздний этапы развития. Ранний этап характеризуется преобладанием гладкостенной и небольшим количеством других типов керамики в слое городищ, большим процентом форм А и В (баночные и бочонковидные) наряду с формой С (слабопрофилированные), распространением разнообразного орнамента, появлением приема дополнительного подчеркивания шейки. На позднем этапе отмечено увеличение количества штрихованной, шероховатой, сетчатой и лощеной керамики, что свидетельствует об инокультурных контактах с соседних территорий, уменьшение количества форм А и В, распространение форм С и D (профилированных) изменение их пропорций, постепенное исчезновение орнамента, широкое применение дополнительного выделения шейки. Прослежены локальные различия в керамическом комплексе (западная и восточная часть Подвинья).

Северная Беларусь (Поозерье) очень интересный в археологическом отношении регион, который охватывает бассейн Западной Двины и притоков. Изучение памятников Северной Беларуси проводится на протяжении многих лет, написаны обобщающие работы, и отдельные статьи. Но керамическому комплексу городищ уделялось мало внимания. В редких случаях приводились статистические данные, локальные и хронологические особенности раскрывались в общих чертах.

Типология керамики В.И. Шадыро основывалась на выделении двух форм посуды: баночные и профилированные. На основании такой типологии проводить сопоставление керамического комплекса с соседними территориями было невозможно. Тем не менее, исследователь выделял два варианта днепродвинской культуры: западный и смоленский, отмечая различия в керамическом комплексе. Граница между западным и восточным вариантом проводилась по линии от Чашников к Оболи. Так для западного варианта отмечалось преобладание баночных форм в комплексе памятников, чаще использовался орнамент [19, с. 109 – 111].

Исследования городищ Северной Беларуси, которые проводились в течение последних 10 – 15 лет, позволили получить новые материалы по истории населения региона. Получены богатые и интересные коллекции керамики, позволяющие по-новому взглянуть на особенности керамического производства в регионе.

В связи с получением новых данных поставлена задача – выделить характерные черты керамического комплекса по типам обработки поверхности и профилировке верхних частей, с учетом локальных и хронологических особенностей.

При подготовке статьи были использованы опубликованные материалы раскопок городищ (исследования А.М. Медведева, М.И. Лошенкова, А.Г. Митрофанова, К.П. Шута, В.И. Шадыро), ранее не публиковавшиеся, или опубликованные в недостаточном объеме коллекции керамики, хранящиеся в фондах музеев Беларуси (Боровно, Новое Село, Августово, Кострица, Кубличи, Заговалино и др.), а также материалы самостоятельных археологических исследований на памятниках Лепельского района (Новые Волосовичи, Старый Лепель).

Вся керамика обрабатывалась по единой схеме, которая включала несколько этапов:

1) анализ статистических данных (способ обработки поверхности) по пластам;

2) выделение форм сосудов по единой схеме, с учетом частных особенностей форм, пропорций и их соотношений. По данной схеме сосуды можно разделить на четыре основных формы, которые различаются по количеству составных (функциональных) частей в строении сосуда (устье, венчик, шея, плечо, тулово, днище / схема выделения функциональных частей базируется на теории А.А. Бобринского [1, с. 6]).

А – баночные сосуды, самая простая форма. Плечо, шейка и венчик отсутствуют. Состоит из днища, тулова и устья. По классификации А. Васкса и А. Ильютик – тип I [3, с. 21; 9, с. 26 – 27] (рис. 1: 1).

В – бочонкообразные сосуды, у которых отсутствует шея, но выделено плечо. По классификации А. Васкса и А. Ильютик – тип С (рис. 1: 2).

С – Сосуды у которых не выделен венчик. Они имеют цилиндрическую (прямо поставленную или с наклоном внутрь) шейку. Шейка может быть различной длины. По классификации А. Васкса и А. Ильютик – тип CS (рис. 1: 3);

D – Сосуды, состоящие из полного набора функциональных частей. Имеют S-образный профиль с отогнутым наружу венчиком. По классификации А. Васкса и А. Ильютик – тип S (рис. 1: 4);

3) сопоставление схем керамических комплексов городищ в рамках локальной группы и локальных групп между собой;

4) выделение локальных и хронологических особенностей керамических комплексов Белорусского Подвинья.




Рис. 1. Формы сосудов, выделенные в зависимости от количества функциональных частей:
1 – форма А; 2 – форма В; 3 – форма С; 4 – форма D

В результате проделанной работы выявлены локальные и хронологические варианты керамики городищ Северной Беларуси, определены направления инокультурных контактов на разных этапах развития.

На территории Северной Беларуси выделяются несколько локальных групп городищ, которые привязаны к определенным ландшафтам. Групповое расположение городищ на территории Северной Беларуси отмечает К.П. Шут, выделяя три больших группы памятников: Браславскую и Освейско-Россонскую, Ушачско-Лепельскую и Городокско-Витебскую [25, с. 262]. К указанным группам следует добавить Миорскую, Докшицкую, Глубокскую, Поставскую, Толочинскую группы (рис. 2). В работе рассматриваются материалы Браславской, Освейской, Ушачско-Лепельской, Витебско-Городокской, Миорской, Докшицкой и Глубокской групп.




Рис. 2. Локальные группы городищ на территории Белорусского Подвинья
(по карте В.И. Шадыро)

Хронологически самые ранние памятники, с преобладанием каменного и костяного инвентаря отмечены преимущественно в западной и северной части региона (Ратюнки, Зазоны, Запрудье, Поддубники, Язно, Урагово, Замошье, Бураково, и т.д.). С последних веков I тыс. до н.э. наблюдается увеличение количества укрепленных поселений на территории Подвинья. На многих памятниках костяной и каменный инвентарь отмечен в небольших количествах только в нижних пластах, а в верхних преобладают изделия из железа (серпы, ножи, топоры и пр.), в слое городищ встречено много глиняных пряслиц, не характерных для предыдущего периода.

Подобные изменения в хозяйстве и материальной культуре отмечены А.А. Егорейченко для культуры штрихованной керамики [7]. Видимо это был общий процесс для населения Северной и Центральной Беларуси, который связан с развитием земледелия и производства железа. С этим периодом связывают и широкое расселение племен железного века на территории Беларуси.

Как и в КШК, для населения Подвинья характерна смена типов керамики. Можно выделить два этапа развития керамического комплекса: ранний (до рубежа н.э.) и поздний (первая половина I тыс. н.э.).

На раннем этапе в слоях памятников преобладает гладкостенная или бугристая керамика, причем вторая отмечена в нижних слоях, а с течением времени ее количество уменьшается преимущественно за счет увеличения количества гладкостенной и, в меньшей ступени, других типов посуды (штрихованной, шероховатой, сетчатой).

На памятниках, близких ареалу КШК (Браславская, Глубокская и в меньшей степени Миорская группа), фрагменты со штриховкой встречаются уже в нижних пластах (Ратюнки, Тарилово, Запрудье, Поддубники). На памятниках расположенных дальше на восток количество штрихованной керамики не превышает 10 % (Освейская группа, Полоцкий, Городокский, Витебский р-н [22 – 24]).

В керамическом комплексе ранних памятников преобладают баночные и профилированные сосуды форм **А**, **В** и **С**. Форма **А** представлена сосудами с вертикальными или слегка сужающимися к днищу стенками (рис. 3: 9; 4: 6, 14; 5: 16, 23). Для нее характерен орнамент в виде ямочных вдавлений или сквозных отверстий под краем, реже – нарезных линий. Срез устья закруглен или утончен. Эта форма занимает значительный процент в слое ранних памятников.

Форма **В** – сосуды бочонкообразной формы с выраженным плечиком (рис. 3: 4, 5; 4: 2, 9, 11; 5: 13), распространены преимущественно в северной части Белорусского Подвинья. Эта форма орнаментировалась сквозными отверстиями под краем, но количество орнаментированных фрагментов значительно меньше, чем у баночных сосудов. На остальной территории форма **В** встречается в верхних пластах памятников, и от ранней отличается полным отсутствием орнамента и более выпуклым плечиком (рис. 6: 7)

Форма **С** – профилированные сосуды с выраженной шейкой, поставленной прямо или наклоненной внутрь (рис. 3: 3, 7; 4: 3, 7; 5: 4, 6, 8 – 10, 17, 19, 22, 24, 25, 27, 29 – 30). Форма **С** встречается уже в нижних пластах культурного слоя городищ, но с течением времени ее количество увеличивается, вытесняя формы **А** и **В**. Орнамент на такой керамике очень распространен и разнообразен. Чаще всего встречаются ямочные вдавления и сквозные отверстия по шейке, достаточно распространены прочерченные линии и лучи по плечику, косые наколы, отпечатки наклоненной палочки и различные сочетания указанных типов орнамента. Высота шейки сосудов формы **С** лежит в пределах 0,5 – 2 см, но в западной части ареала преобладает 0,5 – 1,5 см, а в восточной увеличивается. Также высота шейки меняется со временем: в нижних слоях она меньше.

На памятниках западной части ареала на сосудах формы **С** отмечено появление приема дополнительного выделения шейки с помощью отпечатков шнура или прочерченной линии (рис. 3: 3; 4: 17). На позднем этапе этот прием распространяется практически по всей территории Подвинья, а на раннем этапе он отмечен на памятниках Миорской (Язно, Поддубники [17, с. 68]), Глубокской (Запрудье [15, рис. 20: 1]), Освейской (Урагово [24]), в ранних слоях городищ Ушачско-Лепельской группы (Кострица, Кубличи, Заговалино [22, 23]).

В конце раннего периода, в последние века первого тысячелетия до н.э. на памятниках распространяются сосуды формы **D**, профилированные горшки с выделенным венчиком (рис. 3: 2, 6, 7; 4: 4, 13; 5: 1, 2, 5, 25). По пропорциям они мало отличаются от сосудов формы **С** (высота и профилировка плечика, высота шейки/венчика) и вероятно демонстрируют развитие этой формы. Типы орнамента также совпадают, но наносится он не только по шейке и плечику, а также по краю венчика. Для формы **D** также характерно выделение шейки с помощью шнура или прочерченной линии (рис. 3: 2, 7).

Керамический комплекс поздних памятников Подвинья генетически связан с предыдущим периодом, но имеет свои особенности.

Так, на позднем этапе увеличивается процент штрихованной керамики на памятниках, что вызвано расширением территории распространения КШК. Некоторое влияние КШК проявилось и в формах сосудов.

На памятниках Подвинья появляются сосуды с ребристым оформлением плечика.

На памятниках Браславской группы, в слоях рубежа н.э. наряду с увеличением количества штрихованной керамики в слое встречаются ребристые сосуды со штриховкой или без [18, с. 180 – 181].

Подобная ситуация зафиксирована А. Васксом на памятниках юго-восточной Латвии. Исследователь отмечает не только появление новых форм посуды, но и изменения в технике лепки, т.е. речь может идти о приходе групп нового населения с новыми навыками изготовления керамики [3, с. 102 – 103]. Ребристая керамика Браславской группы городищ имеет свои особенности: ребро выражено слабо, иногда только намечено, полностью отсутствует орнамент, характерный для керамики с памятников Северо-Восточной Литвы (рис. 4: 12, 15). Кроме того, пропорции сосудов с ребром совпадают с пропорциями сосудов соответствующих форм без ребра. Видимо, для этого региона можно говорить о сильном влиянии, или о приходе отдельных групп населения, от которых происходит заимствование приемов.

На памятниках Глубокской и Миорской групп ребристые горшки встречены в единичных экземплярах. На городищах Запрудье и Глубокое (рис. 4: 5, 8, 18) фрагменты ребристых сосудов украшены характерным для КШК орнаментом [15, мал. 16: 1], но незначительное их количество говорит только о заимствовании (скорее, импорте) с территорий КШК.




Рис. 3. Керамика городищ западной части Белорусского Подвинья:
1 – 10 – керамика с городища Поддубники; 2 – 7, 9 – фрагменты керамики раннего периода;
1, 8, 10 – фрагменты сосудов позднего периода
(рис. З.А. Харитонович)

Территория Ушачско-Лепельской группы затронута этим влиянием в меньшей степени. Здесь на поздних памятниках отмечено значительное количество штрихованных фрагментов (Березино [8], Августово, Волосовичи, Новое Село) (рис. 6; 7) но качество штриховки отличается от классических памятников КШК, а ребристые сосуды практически не встречены.

На памятниках Толочинской группы (Кисели, Черкасово) отмечено гораздо более сильное влияние из региона КШК, кроме значительного количества штрихованных фрагментов, отмечается также присутствие в слое горшков ребристых форм, которые не составляют большинства [11, с. 185, 198].

Присутствие штрихованных сосудов в культурном слое, и даже значительный их процент на определенных этапах жизни поселений нельзя связывать исключительно с КШК. Штрихованная керамика встречена широко на территории Восточной Европы [4, с. 59]. Значительное ее количество (до 60 %) наблюдается на других городищах раннего железного века на территории Беларуси, в том числе вне ареала распространения культуры штрихованной керамики [10, с. 100 – 101, 12, с. 115], на территории Литвы и Латвии [2, 3]. Присутствие штрихованной керамики в нижних пластах культурного слоя отмечается для большинства днепро-двинских городищ [15, с. 85; 19, с. 70 – 86]. Видимо, появление штриховки на сосудах этого региона связано также и с местными традициями изготовления керамики. Таким образом, территория Подвинья хоть и находилась в зоне влияния керамических традиций КШК, но может соотноситься только с древностями днепро-двинской культуры.




Рис. 4. Керамика городищ западной части Белорусского Подвинья:
1, 4, 6, 7 – городище Запрудье (рис. А.М. Медведева); 2, 5, 10, 13, 16, 18 – городище Глубокое (рис. А.М. Медведева);
11, 14, 17 – городище Урагово (рис. К.П. Шута); 3, 9, 12, 15 – городище Ратюнки (рис. А.М. Медведева);
1, 2, 3, 6, 7, 9, 11, 13, 14 – фрагменты керамики раннего периода;
4, 5, 8, 10, 12, 15, 16, 17, 18 – фрагменты керамики позднего периода

Появляется другие типы керамики. Так, в западной части Подвинья процент шероховатой керамики в верхних пластах может достигать 20 % (Тарилово, Поддубники [6, табл. 1; 17, табл. 1]), на остальной территории она также отмечена, но в гораздо меньших количествах. Такая ситуация свидетельствует об инокультурном импульсе в начале I тыс. н.э., который мог существенно повлиять на этнокультурную ситуацию в регионе, и стать причиной уменьшения количества штрихованной керамики в верхних пластах.

Шероховатая посуда известна в Литве с рубежа н.э. [5, с. 21]. Появление такого типа посуды на литовских городищах связывают с влиянием с южных и западных территорий (Польша, Калининградская область). Однако он встречается на памятниках, расположенных вдоль течения р. Неман, и практически не отмечен на городищах северо-восточной Литвы [26, zem. 7]. На территории Латвии распространение шероховатой керамики отмечено на памятниках к югу от Даугавы (Двины). Именно с проникновением населения, использующего данную посуду, связывается исчезновение западной группы штрихованной керамики на рубеже н.э. [3, с. 128].

В начале н.э. на территории Беларуси шероховатая посуда найдена в верхних пластах городищ КШК Горани, Кащеличи и других [13, с. 38, рис. 96]. Такой тип керамики появляется на этих памятниках в результате инокультурных импульсов с запада, но ее ареал на памятниках КШК Беларуси свидетельствует, что данная территория не могла быть исходной для поступления шероховатой керамики на памятники Северо-запада Беларуси. Таким образом, исходным пунктом поступления этой посуды на изучаемые памятники могут быть поселения Латвии.




Рис. 5. Керамика городищ восточной части Белорусского Подвинья:
1, 2, 4 – 6, 8 – 10, 22, 25, 27 – городище Кострица;
3, 7, 12 – 21, 23, 24, 28, 32 – городище Кубличи, 26, 29 – 31 – городище Бураково (рис. К.П. Шута);
1, 2, 4 – 6, 8 – 10, 16, 17, 18, 28, 29 –31 – фрагменты керамики раннего периода;
3, 7, 11, 12, 14, 15, 19 – 27, 32 – фрагменты керамики позднего периода

В северо-восточной части Подвинья в керамическом комплексе памятников отмечена сетчатая и лощеная керамика. Появление сетчатой керамики отмечает контакты населения с памятниками соседних, восточных территорий, где была распространена керамика такого типа. Однако количество ее в комплексе составляет не более 10 % от общего числа определимых фрагментов. На городище Новое Село сетчатая керамика отмечена в нижних пластах культурного слоя, содержащих материалы рубежа – первых веков н.э. [16, с. 206 – 207], в верхних слоях она исчезает. Это значит, что внешнее влияние не привело к значительным переменам в комплексе и отразилось только на способе обработки поверхности. В небольших (до 1 %) количествах сетчатая керамика встречается и на памятниках западной части региона [18, с. 180 – 181].

На поздних городищах практически исчезают из обращения баночные формы (**А** и **В**), уступая место профилированным (**С** и **D**) (рис. 3: 1, 8, 10; 4: 10, 12, 15, 16; 5: 3, 7, 11, 12, 14, 15, 20, 21, 28, 32; 6; 7). Происходит постепенное изменение пропорций сосудов: высота шейки увеличивается (до 2 – 4 см, может достигать 5 см). Высота плечика имеет некоторые особенности: на раннем этапе она держится в средних пределах 1,5 – 2,5 см, а на позднем встречаются как сосуды с очень низким, сильно выпуклым плечиком (рис. 7: 5, 6), так и с высоким, слабопрофилированным (рис. 3: 8). Но в целом по региону показатели отгиба венчика и профилировки плечика лежат в единых пределах, характерных для всего Подвинья.

Изменяются и пропорции сосудов формы **D**. Для керамики поздних городищ характерны горшки с высоким, часто сильно отогнутым наружу венчиком (Августово, Волосовичи, Новое Село, Кубличи). Диаметр по горлу равен или превышает диаметр по плечу (открытые сосуды).




Рис. 6. Керамика городищ восточной части Белорусского Подвинья:
1 – 14 – городище Новые Волосовичи, керамика позднего этапа (рис. З.А. Харитонович)

Количество сосудов формы **С** уменьшается и первенство занимает форма **D**. Особенностями позднего периода, кроме расширения бытования сосудов этой формы, являются уменьшение количества орнаментированных фрагментов, широкое распространение приема подчеркивания шейки и его эволюция, распространение сосудов с загнутым внутрь краем отогнутого наружу венчика (см. рис. 6; 7).

Орнаментация упрощается и представлена в основном ямочными вдавлениями, реже сквозными отверстиями. Наносится орнамент либо по шейке, либо под краем венчика. На Кубличском городище отмечено применение линейного орнамента по плечику [25, рис. 3 – 4], а на некоторых памятниках орнаментированные сосуды отсутствуют совершенно (Августово, Волосовичи).

Прием подчеркивания шейки развивается от прочерченной линии к пальцевой борозде. На памятниках ранней группы в верхних слоях новый тип выделения почти не встречается, а на поздних бытует сначала параллельно с линией и отпечатками шнура (Августово, рис. 7), а затем постепенно вытесняет их, трансформируясь в прием полного заглаживания поверхности сосуда от шейки до края венчика с акцентом пальцем в основании шейки, что часто образует уступ в виде небольшого ребра (Волосовичи) (см. рис. 6: 1, 2, 4, 8, 10).

Подобные приемы выделения шейки больше характерны для восточной части Подвинья, особенно для городищ Ушачско-Лепельской группы и далее на восток. В западной части ареала доминирующим остается выделение с помощью линии по шейке, которое часто сочетается с выгнутым венчиком (Глубокская и Миорская группы).

Локальные различия прослеживаются в меньшей степени, чем хронологические. Для городищ западной части Подвинья (Браславская, Глубокская, Миорская, Освейская группы) отмечается схожее соотношение различных типов керамики. Во время существования памятников в керамическом комплексе преобладает гладкостенная посуда. Присутствует в некотором количестве штрихованная керамика (уже с начала заселения, но ее удельный вес возрастает в слоях около рубежа н.э.). Штриховка на ранних сосудах невыразительная, хаотичная, на поздних глубокая, регулярная.




Рис. 7. Керамика городища Августово
(рис. З.А. Харитонович)

Хронологические особенности керамического комплекса западного ареала характеризуются на раннем этапе преобладанием форм **A**, **B** и **C** (с появлением на позднем этапе формы **D**), большим количеством орнаментированных фрагментов, разнообразием орнамента (с преобладанием ямочных вдавлений или сквозных отверстий). Показатели пропорций сосудов лежат в среднем диапазоне (средневыпуклое плечико, высота шейки/венчика 0,5 – 2 см, плечика 1 – 3 см). Развитие на позднем этапе идет по двум направлениям. Керамический комплекс Браславской группы развивается под влиянием Латвийских городищ, а остальные – в общем для всего Подвинья направлении, испытывая влияние с территории КШК: распространение сосудов формы **D**, постепенное исчезновение орнамента, появление приема выделения шейки.

Восточная часть региона на раннем этапе характеризуется большей долей профилированных сосудов в комплексе (форма **C**), преобладанием линейного орнамента. Различия по пропорциям сосудов западной и восточной части региона не фиксируются. Наиболее ярко различия проявляются на позднем этапе, когда распространяются сосуды формы **D**, имеющие своеобразную профилировку и пропорции (высота венчика увеличивается до 3 см, плечико становится более выпуклым для одной группы сосудов и практически незаметным для другой). Широкое распространение получают приемы выделения шейки, эволюция которых, видимо, приводит к появлению своеобразных сосудов с ребром-уступом в основании шейки, которое позже смещается на плечико (Волосовичи (рис. 6: 1, 2). Различные приемы выделения шейки отмечаются и на сосудах из городищ смоленского Поднепровья [20, ил. 23 – 24]. Сосуды с уступом в основании шейки находят аналогии на памятниках Смоленщины более позднего периода (гор. Близнаки), на памятниках мощинской культуры [21, табл. 56: 1; с. 63 – 65].

В русле этих данных следует затронуть вопрос о милогроидной керамике А.Г. Митрофанова. Исследователь относил к этому типу, как наиболее представительный, керамический комплекс городища Августово (см. рис. 7) [14, с. 11]. Но памятник следует относить к позднему этапу бытования ДДК (первая половина первого тысячелетия н.э.), когда о каком либо влиянии милоградских форм говорить не приходится. Сосуды формы **D**, с длинным венчиком, край которого может быть загнут внутрь, и с выделением шейки характерны только для днепро-двинских городищ и встречается практически на каждом, в

ом числе и на севере Витебской области. Подобный тип керамики характеризует развитие керамическо-о комплекса ДДК в первой половине I тыс. н.э. и может служить культурным и хронологическим марке-ом изучаемого периода.

ЛИТЕРАТУРА

1. Бобринский, А.А. Функциональные части в составе емкостей глиняной посуды / А.А. Бобринский // Проблемы изучения археологической керамики: межвуз. сб. науч. ст. – Куйбышев. – 1988. – С. 5 – 21.
2. Васкс, А.В. Ранний комплекс керамики укрепленного поселения Брикули / А.В. Васкс // Изв. АН ЛатвССР. – Рига. – 1982. – № 9 (422). – С. 57 – 67.
3. Васкс, А.В. Керамика эпохи поздней бронзы и раннего железа Латвии / А.В. Васкс. – Рига: Зинатне, 1991. – 198 с.
4. Граудонис, Я.Я. Штрихованная керамика на территории Латвийской ССР и некоторые вопросы этногенеза балтов / Я.Я. Граудонис // Из древнейшей истории балтских народов; отв. ред. Э.С. Мугуревич. – Рига: Зинатне, 1980. – С. 59 – 69.
5. Данилайте, Е. Штрихованная керамика в Литве (некоторые данные об этногенезе литовцев): автореф. дис. ... канд. ист. наук / Е. Данилайте. – Вильнюс, 1967. – 32 с.
6. Егорейченко, А.А. Этнокультурная ситуация в Белорусском Подвинье в железном веке / А.А. Егорейченко // Гіст.-археалаг. зб. – 1996. – № 10. – С. 8 – 11.
7. Егорейченко, А.А. Культуры штрихованной керамики / А.А. Егорейченко. – Минск: БГУ, 2006. – 207 с.
8. Ильютик, А.В. Отчет об археологических раскопках в 1991 г. на городище Березино Докшицкого района Витебской области / А.В. Ильютик // Архив ИИ НАН Беларуси. – Дело № 1346.
9. Ильютик, А.В. Керамика городищ железного века бассейна Березины / А.В. Ильютк // Гіст.-археалаг. зб. – 1998. – № 13. – С. 25 – 39.
10. Колосовский, Ю.В. Штрихованная керамика на северо-востоке Беларуси (по материалам городищ Оршанского Поднепровья) / Ю.В. Колосовский // Гістарычныя лёсы Верхняга Падняпроўя. – Магілёў, 1995. – Ч. 1. – С. 99 – 109.
11. Левко, О.Н. Раскопки городищ у д. Кисели (Дымокуры) Толочинского района и у д. Черкасово Оршанского района Витебской области / О.Н. Левко, Ю.В. Колосовский // Ранние славяне белорусского Поднепровья и Подвинья: материалы по археологии Беларуси. – Минск, 2003. – № 8. – С. 182 – 208.
12. Медведев, А.М. Раскопки городища в Белыничском районе / А.М. Медведев // Гістарычныя лёсы Верхняга Падняпроўя. – Магілёў, 1995. – Ч. 1. – С. 110 – 120.
13. Медведев, А.М. Белорусское Понеманье в раннем железном веке (I тысячелетие до н.э. – 5 в. н.э.) / А.М. Медведев. – Минск, 1996. – 200 с.
14. Митрофанов, А.Г. Железный век средней Белоруссии / А.Г. Митрофанов. – Минск: Наука и техника, 1978. – 160 с.
15. Мядзведзеў, А.М. Да пытання аб паўднёвай мяжы днепра-дзвінскай культуры (па выніках даследаванняў апошніх гадоў) / А.М. Мядзведзеў // Гіст.-археалаг. зб. – 2004. – № 19. – С. 70 – 87.
16. Подгурский, П.Н. Исследование городища Новое Село. Раскоп VI / П.Н. Подгурский // Гіст.-археалаг. зб. – 2008. – № 23. – С. 206 – 207.
17. Харитонович, З.А. Городище Поддубники / З.А. Харитонович // Памятники эпохи железа и средневековья Беларуси: материалы по археологии Беларуси. К 60-летию О.Н. Левко. – Минск, 2007. – № 14. – С. 54 – 86.7
18. Харитонович, З.А. К вопросу о культурной принадлежности городищ северо-запада Беларуси / З.А. Харитонович // Археалогія эпохі сярэднявечча. Да 80-годдзя з дня нарадж. Г.В. Штыхава: матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск: ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі», 2008. – Вып. 15. – С. 173 – 185.
19. Шадыро, В.И. Ранний железный век Северной Белоруссии / В.И. Шадыро; ред. А.Г. Митрофанов. – Минск: Наука и техника, 1985. – 126 с.
20. Шмидт, Е.А. Городище Самсонцы в Смоленском Подвинье / Е.А. Шмидт // Смоленские древности. – Смоленск, 2002. – Вып. 2. Городища Смоленской земли; отв. ред. Ф.Э. Модестов. – С. 98 – 166.
21. Шмидт, Е.А. Верхнее Поднепровье и Подвинье в III – IV вв. н.э. Тушемлинская культура / Е.А. Шмидт; отв. ред. Ф.Э. Модестов. – Смоленск, 2003. – 296 с.
22. Шут, К.П. Отчет о полевых археологических работах в 1964 г. / К.П. Шут // Архив ИИ НАН Беларуси. – Дело № 237.
23. Шут, К.П. Отчет о полевых работах в 1965 г. / К.П. Шут // Архив ИИ НАН Беларуси. – Дело № 257.
24. Шут, К.П. Отчет о раскопках и разведках в 1966 г. / К.П. Шут // Архив ИИ НАН Беларуси. – Дело № 273.
25. Шут, К.П. Городище Кубличи Ушачского района / К.П. Шут // Древности Белоруссии. – Минск, 1969. – С. 262 – 289.
26. Lietuvos TSR archeologijos atlasas, II, piliakalniai. – Vilnius: Mintis, 1975. – 228 p.

КРАМЯНЁВЫЯ ВЫРАБЫ ПАЎНОЧНАБЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў МАТЭРЫЯЛАХ РАСКОПАК 2000 – 2007 ГАДОЎ: ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ ДАСЛЕДАВАННЯ

канд. гіст. навук Макс.М. ЧАРНЯЎСКІ
(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)

Аналізіруюцца крамянёвыя вырабы з паселішча паўночнабеларускай культуры Асавец 7 (Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці), атрыманай у выніку даследаванняў 2000 – 2007 гадоў. Падаецца агульная характарыстыка матэрыялу, яго асаблівасці, праводзіцца марфалагічная класіфікацыя калекцыі. Робяцца высновы аб высокай ступені выкарыстання сыравіны (аж да паўторнага выкарыстання зламаных прыладаў), аб асаблівасці мясцовай крамянёвай індустрыі на фоне астатніх рэгіёнаў Беларусі перыяду позняга неаліту – бронзавага веку, аб перавазе ў калекцыі вырабаў паўночнабеларускай культуры прылад, змайстраваных у традыцыях ляснога неаліту.

Паўночнабеларуская культура існавала з канца трэцяй чвэрці 3 тыс. да н.э. да сярэдзіны 2 тыс. да н.э. Яна займала амаль усё Беларускае Паазер'е, паўднёва-усходнюю Латвію, частку паўночна-заходняй Расіі (паўночна-заходнюю Смаленшчыну і паўднёвую Пскоўшчыну) і, верагодна, невялікую частку паўднёва-усходняй Літвы. Дадзеная культура выклікае асаблівы інтарэс даследчыкаў тым, што існавала ў час актыўнага распаўсюджання ва Усходняй Еўропе культур шнуравога кола, суседнічала і ўзаемадзейнічала з некаторымі з іх, аднак з'яўлялася эвалюцыйным працягам неалітычных традыцый рэгіёна. Тэрыторыя, якую займала паўночнабеларуская культура, вядомая сваёй беднасцю на крэмень – асноўны матэрыял для майстравання прылад у каменным – бронзавым вяках Беларусі. Гэта сталася прычынай існавання багатай касцярэзнай традыцыі, вытокі якой знаходзяцца яшчэ ў мезаліце рэгіёна. Аднак у паўночнабеларускай культуры, у адрозненні ад папярэдніх, фіксуецца рэзкае павелічэнне колькасці крамянёвых вырабаў.


На сённяшні дзень вядома больш 20 помнікаў, на якіх сустракаюцца матэрыялы паўночна-беларускай культуры (мал. 1: 1) [1, с. 311, мал. 100; 2, с. 12 – 14]. Найбольш іх выяўлена на Крывінскім тарфяніку, на памежжы Бешанковіцкага і Сенненскага раёнаў Віцебскай вобласці. Сярод іх самымі даследаванымі з'яўляюцца паселішчы Крывіна 1 (раскапана больш за 525 кв. м) і Асавец 2 (больш 350 кв. м) [2, с. 6]. Выяўленыя на гэтых помніках матэрыялы складаюць да 90 % ад агульнай колькасці вядомых артэфактаў паўночнабеларускай культуры на тэрыторыі Беларусі. Тым не менш перад даследчыкамі паўстае праблема дакладнай культурнай ідэнтыфікацыі знойдзеных артэфактаў, у тым ліку і крамянёвых, бо амаль усе вышэйпералічаныя помнікі ўтрымліваюць таксама і матэрыялы папярэдняй, генетычна звязанай з ёй усвяцкай культуры. Распаўсюджванне знаходак гэтых дзвюх культур на Крывінскіх помніках паказвае, што вылучыць чыстыя стратыграфічныя гарызонты на ўжо даследаваных плошчах амаль немагчыма [2, с. 46, табл. 1]. Як вынік, дакладная культурная прыналежнасць большай часткі артэфактаў, за выключэннем керамічных, застаецца пад пытаннем. Да нядаўняга часу адзіным помнікам з чыстымі матэрыяламі паўночнабеларускай культуры было паселішча Крывіна 3, выяўленае і даследаванае ў 1979 і 1980 гадоў Э.М. Зайкоўскім. На жаль, памеры даследавання і атрыманыя матэрыялы не вельмі значныя і не могуць быць выкарыстанымі для культурнага размежавання калекцый суседніх помнікаў [3, 4].

У 2000 годзе Міхал Чарняўскі, падчас абследавання тарфяніковага пажарышча 1999 года, за 1,5 км на паўднёвы-паўднёвы-усход ад в. Асавец Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці выявіў новае паселішча Асавец 7, матэрыялы якога амаль цалкам адносяцца да паўночнабеларускай культуры з нязначным уключэннем керамікі сярэднедняпроўскай культуры і сярэдняй бронзы (разам менш за 1 % ад агульнай колькасці). З 2000 па 2007 гады на помніку праводзіў раскопкі Максім Чарняўскі [5, 6]. Усяго даследавана 95 кв. м, з іх 25 кв. м зачышчаны на глыбіню тарфянога попелу (0 – 5 см). Паселішча датуецца канцом трэцяй чвэрці 3-га – першай паловай 2 тыс. да н.э. У сваёй цэнтральнай і паўночнай частках яно амаль цалкам знішчана пажарам.


Помнік надзвычай багаты на археалагічны матэрыял. Выяўлена звыш 26 тысяч фрагментаў керамікі, 251 касцяны і рагавы выраб, 7 бурштынавых упрыгожанняў, 190 вырабаў з кары і дрэва, 5 каменных вырабаў, 1 меднае шыла, звыш 17 тысяч фрагментаў костак млекакормячых, птушак і рыб, амаль тысяча лясных арэхаў, чылімаў, жалудоў [2, 6].

Крамянёвы матэрыял на паселішчы (1537 артэфактаў, мал. 1: 2) прадстаўлены адшчэпамі (62 % ад агульнай колькасці), пласцінамі (3 %), сколамі (3 %), лускамі (5 %), а таксама вырабамі (27 %): наканечнікамі стрэл, наканечнікамі дроцікаў, сякерамі, скрэбламі, скрабкамі, скоблямі, нажамі, праколкамі, свердламі, адціскальнікамі, долатамі, рэтушаванымі адшчэпамі і пласцінамі (пададзенае тыпалагічнае вызначэнне прылад першапачатковае і будзе скарэктаванае пасля правядзення трасалагічнага аналізу калекцыі). У вялікай колькасці сустракаюцца камбінаваныя вырабы, пераважна са скрабковай асновай. Колькасна на паселішчы дамінуюць наканечнікі стрэл – 23,2 % ад агульнай колькасці прылад, і вырабы скрабучага

рызначэння (29,2 %), астатнія вызначаныя класы прылад не дасягаюць і 5 % (за выключэннем рэжуых – 8,7 %). На паселішчы візуальна вызначаецца сожскі, валдайскі і нёманскі крэмень. Частка прыадаў была змайстравана з мясцовага крамяністага мінералу з шурпатай паверхняй сколаў.



1



2

Мал. 1. Помнікі паўночнабеларускай культуры (1);
размеркаванне крамянёвых артэфактаў у раскопе на паселішчы Асавец 7 (2)

Адным з найбольш марфалагічна разнастайных класаў прылад на паселішчы з'яўляюцца **наканечнікі стрэл**. За 8 гадоў даследавання іх выяўлена 98 экземпляраў. Канцэнтрацыя наканечнікаў стрэл у раскопе дасягае 1,3 экземпляра на 1 кв. м.

Наканечнікі стрэл прадстаўлены 5 базавымі формамі-архетыпамі: лістападобным, рамбічным, падрамбічным, трохкутным і фігурным. У межах кожнага з іх на падставе агульных абрысаў вырабаў вылу-


чаюцца групы, якія падзяляюцца на 2 тыпы – чаранковыя (a) і безчаранковыя (b). Асобна стаяць выпадковыя наканечнікі стрэл, абрысы якіх прыстасаваны да канкрэтнага абранага пад выраб адшчэпа. Тым не менш нават у іх з нейкай ступенню верагоднасці можна распазнаць згаданыя архетыпы, а часам і групы.

Для лістападобнага архетыпу вылучаюцца 4 групы:

Група 1. Лістападобныя сіметрычныя (мал. 2: 1 – 4,8):

- тып a: чаранковыя (мал. 2: 1, 2);
- тып b: безчаранковыя (мал. 2: 3, 4, 8).

Чаранковыя вырабы прадстаўлены 7 экземплярамі, безчаранковыя – 16 экземплярамі.



Мал. 2. Асавец 7. Наканечнікі стрэл лістападобнага і рамбічнага архетыпаў:
1 – 4, 8 – лістападобныя сіметрычныя; 5, 7 – лістападобныя са змешчаным да вастрыя найбольшым пашырэннем корпуса;
6 – лістападобны кроплепадобны; 9 – 12 – вербалістыя; 13, 15 – 18 – рамбічныя сіметрычныя;
14, 19 – рамбічныя з найбольшым пашырэннем змешчаным да вастрыя

Група 2. Лістападобныя са змешчаным да вастрыя найбольшым пашырэннем корпуса, безчаранковыя (тып b, мал. 2: 5, 7).

Вырабы гэтай групы прадстаўлены 7 экземплярамі.

Група 3. Вербалістыя (мал. 2: 9 – 12):

- тып a: чаранковыя (мал. 2: 11, 12);
- тып b: безчаранковыя (мал. 2: 9, 10).

Адрозненне вырабаў гэтай групы ад лістападобных сіметрычных вызначаецца суадносінамі шырыні і даўжыні наканечнікаў. Апошняя ў вербалістых перавышае шырыню ў 3 і больш разоў, у лістападобных у 2 разы.

Вербалістыя наканечнікі стрэл налічваюць 10 экземпляраў.

Група 4. Кроплепадобныя (найбольшае пашырэнне размешчана ў ніжняй частцы вырабу) безчаранковыя (тып b, мал. 2: 6).

Прадстаўлены 1 экземплярам.

Рамбічны архетып складаецца з 3 груп:

Група 1. Рамбічныя сіметрычныя:

- тып a: чаранковыя (мал. 2: 15, 17, 18; 3: 3);
- тып b: безчаранковыя (мал. 2: 13, 16).

Чаранковыя вырабы гэтай групы прадстаўлены 6 экземплярамі; безчаранковыя – 14 экземплярамі.

Група 2. Выцягнутыя рамбічныя, чаранковыя (мал. 3: 1, 2). Прадстаўлены 2 экземплярамі.

Група 3. Рамбічныя асіметрычныя, з найбольшым пашырэннем змешчаным да вастрыя:


- тып a: чаранковыя (мал. 2: 19);
- тып b: безчаранковыя (мал. 2: 14).

Чаранковыя наканечнікі гэтай групы прадстаўлены 1 экземплярам, а безчаранковыя – 3 экземплярамі.

Для *падрамбічнага архетыпу* вылучана адна група падрамбічных сіметрычных шырокіх наканечнікаў з выпуклымі бакавінамі, якая дзеліцца на чаранковыя, тып (a) (мал. 3: 4, 6) і безчаранковыя, тып (b) (мал. 3: 5).

Трохкутны і фігурны архетыпы складаюцца кожны з адной групы (мал. 3: 7 – 10; 3: 11 – 14).

З пяці базавых архетыпаў колькасна дамінуюць лістападобны і рамбічны (41 і 26 экземпляраў адпаведна). На групавым узроўні пераважаюць лістападобныя сіметрычныя безчаранковыя і рамбічныя сіметрычныя безчаранковыя вырабы.



Мал. 3. Асавец 7. Наканечнікі стрэл рамбічнага, падрамбічнага, трохкутнага і фігурнага архетыпаў:
1, 2 – выцягнутыя рамбічныя; 3 – рамбічны семітрычны (чаранковы варыянт);
4 – 6 – падрамбічныя; 7 – 10 – фігурныя наканечнікі стрэл


Трэба адзначыць, што наканечнікі стрэл у межах адной групы і нават аднаго тыпу могуць быць па рознаму апрацаванымі, грубай або струменьчатай, плоскай або пільчатай рэтушшу. Яна можа пакрываць усю паверхню вырабу, або размяшчацца толькі па яго перыметры, а часам толькі на вастрыі і насадзе. Рэтуш пераважна двухбаковая, аднак часам з брушка маюцца толькі сляды падрэтушоўкі (мал. 3: 11, 12).

У вырабах гэтага класа абсалютна пераважаюць традыцыйныя для мясцовага неаліту формы. Яны амаль цалкам ідэнтычныя вырабам усвяцкай культуры, якая папярэднічала паўночнабеларускай у Крывінскім рэгіёне. Да запазычанняў з іншых тэрыторый адносяцца выцягнутыя падрамбічныя чаранковыя,

трохкутныя з увагнутай асновай, сіметрычна рамбічныя з завужаным насадам і вастрыём, і вербалістыя з кароткім чаранком наканечнікі стрэл. Іх з'яўленне трэба ўвязваць з традыцыямі культур шнуравой керамікі, якія прасочваліся ў рэгіён з Падняпроўя і Прыбалтыкі. Фігурныя наканечнікі стрэл хутчэй за ўсё маюць мясцовае паходжанне, зыходзячы з кампактнага распаўсюджання дакладных аналогій і малой колькасці саміх артэфактаў. Цікава, што некаторыя крамянёвыя наканечнікі капіруюць формы адной з найбольш шматлікіх груп касцяных наканечнікаў стрэл [2, мал. 6: 9, 10, 8: 10].

Наканечнікаў дзід у цэлым выглядзе выяўлена не было. Адзін артэфакт можа быць папярэдне ідэнтыфікаваны як нарыхтоўка такой прылады (мал. 4: 1), шэраг дробных фрагментаў таксама можа быць аднесены да гэтага класа. **Наканечнікі дроцікаў** уяўляюць сабой павялічаныя копіі лістападобных сіметрычных чаранковых наканечнікаў стрэл (мал. 4: 2). Прадстаўлены адным цэлым і трыма пашкоджаным экземплярамі. Цэлых крамянёвых **сякер** на паселішчы выяўлена не было. Адзіны завершаны выраб з'яўляецца перапрацоўкай большай прылады і ўяўляе сабой невялікую сякерку з набліжаным да лінзападобнага папярэчным сячэннем і прытупленым абушком. Корпус пасярэдзіне выразна звужаны. Шліфоўка пакрывае значную частку корпуса і дасягае абушка. Лязо прышліфаванае асобна і больш акуратна (мал. 4: 3).

Акрамя апісанага вышэй вырабу, вядома яшчэ 5 фрагментаў гэтага класа. Першапачатковая колькасць крамянёвых шліфаваных сякер на помніку была значна большай. Пра гэта сведчаць разнастайныя дробныя прылады, а таксама адшчэпы і пласцінкі, паверхня якіх утрымлівае ўчасткі з прышліфоўкай (мал. 4: 4, 5). Усе яны з'яўляюцца сведчаннем другаснага выкарыстання пашкоджаных сякер, што было выклікана недахопам крэмню ў рэгіёне. Колькасць падобных артэфактаў на паселішчы дасягае 10 экземпляраў. Яшчэ адным сведчаннем аб больш шырокім выкарыстанні шліфаваных сякер на паселішчы з'яўляюцца шматпляцовачныя шліфавальныя пліты, якія былі выяўлены ў 2 асобніках (мал. 4: 6).



Мал. 4. Асавец 7, крамянёвыя і каменныя вырабы:
1 – нарыхтоўка наканечніка дзіды; 2 – наканечнік дроціка; 3 – мініяцюрная сякера;
4, 5 – вырабы з участкамі зашліфаванасці на паверхні; 6 – шліфавальная пліта


Долаты прадстаўлены вырабамі двух тыпаў. Першы з іх уяўляе сабой дробны вузкі выраб з прышліфаваным з двух бакоў лязом (мал. 5: 1), другі аформлены на масіўнай высокай прызмападобнай у сячэнні пласцінцы, бакавіны якой апрацаваны крутой рэтушшу, а вастрыё – больш плоскай (мал. 5: 2). Рэтуш па бакавінах з моцнымі заломамі, верагодна, яны выкарыстоўваліся як скрабніцы. Абедзве прылады выяўлены ў адным экземпляры.

Крамянёвыя **прылады колюча-свідруючага** прызначэння (праколкі, пракруткі і свердлы – 10 артэфактаў), прадстаўлены трыма групамі:

- група 1. З кароткай вызначанай працоўнай часткай, аформленай супрацьлеглай, радзей двухбаковай па адной з бакавін, рэтушшу. Вылучаюцца два тыпы – з вострым завяршэннем і «стажковым» завяршэннем (мал. 5: 4, 5, 7, 9). Частка прылад мае дадатковае функцыянальнае прызначэнне, рэжучае або скоблячае;

- група 2. З сіметрычнымі завостранымі працоўнымі часткамі, якія апрацаваныя з абедзвюх паверхняў акуратнай падвастраючай рэтушшу. Апошняя не змяшчае візуальных слядоў прытупленасці або запаліраванасці ад выкарыстання (мал. 5: 6, 8);

- група 3. З закругленымі шырокімі працоўнымі часткамі, апрацаванымі па перыметры дробнай рэтушшу (мал. 5: 3). Апошняя моцна спрацавана, візуальна адсочваецца яе моцная прышліфаванасць па бакавінах. Частка прылад мае дадатковае функцыянальнае прызначэнне, пераважна рэжучае.




Мал. 5. Асавец 7:
1, 2 – долаты; 3 – 9 – прылады колюча-свідруючага прызначэння:
3 – група 3; 4, 5, 7, 9 – група 1; 6, 8 – група 2

Крамянёвыя **прылады скрабучага прызначэння** складаюць самую вялікую катэгорыю прылад, колькасны падлік якой ускладнены дастаткова шматлікай групай камбінаваных вырабаў. Папярэдне да класа аднесены 123 артэфакты, з улікам камбінаваных вырабаў іх колькасць складзе 148 экземпляраў). Сярод іх можна вылучыць наступныя групы:

- група 1. Падквадратныя. Вылучаюцца тры тыпы – тарцовыя, тарцовыя аднабаковыя і тарцовыя двухбаковыя вырабы (мал. 6: 4);

- група 2. Мініяцюрныя, з невысокай скрабніцай, размешчанай на тарцы і абедзвюх бакавінах (мал. 6: 13);
- група 3. Выцягнутыя падпрамакутныя вырабы з адной тарцовай скрабніцай (мал. 6: 12). У адным выпадку яна высокая і стромкая, у другім – невысокая, аформленая дробнай рэтушшу;
- група 4. Трапецыяпадобныя вырабы з вузкай падставай, некаторыя вырабы набліжаюцца да падтрохкутных. Вылучаюцца тры тыпы – тарцовыя, тарцовыя аднабаковыя і тарцовыя двухбаковыя вырабы (мал. 6: 1 – 3, 6, 11);
- група 5. Выцягнутыя вырабы, аформленыя пераважна на высокіх пласцінках. Змяшчаюць тарцовую і адну бакавую скрабніцы, на другім баку маецца ад адной да 3 скоблячых выемак (мал. 6: 9, 10);
- група 6. Вырабы «мысавога» тыпу (мал. 6: 14, 15). У двух выпадках падстава таксама змяшчае скрабніцу, што набліжае гэтыя вырабы да трапецыяпадобных з тарцавой двухбаковай скрабніцай;
- група 7. Дробныя вырабы падквадратнай або трапецыяпадобнай формы са скрабніцай па перыметры (мал. 6: 7, 8);
- група 8. Вырабы са скрабніцай на паўкруглай бакавіне. Вылучаюцца два тыпы: 1) стромкая рэтуш ідзе па ўсёй бакавіне (мал. 6: 16), 2) рэтушаваная толькі палова бакавіны. У адным выпадку на супрацьлеглай бакавіне маецца яшчэ адзін невялікі ўчастак скрабніцы.



Мал. 6. Асавец 7. Вырабы скарубчага прызначэння:
1 – 3, 5, 6, 11 – група 4; 4 – група 1; 7, 8 – група 7; 9, 10 – група 5; 12 – група 3; 14, 15 – група 6;
16 – група 8; 19 – група 9; 17, 18, 20 – атыповыя вырабы; 13 – група 2

Асобна трэба адзначыць шэраг скрабкоў розных груп, якія аб'ядноўвае адна дэталь, а менавіта кароткі (стажковы) выступ у адным з кутоў тарцовай скрабніцы (пераважна правым – мал. 6: 18). Толькі ў

адным выпадку ён размешчаны крыху бліжэй да сярэдзіны. Выступ афармлены маленькімі скаблоіднымі выемкамі. Ва ўсіх выпадках скрабніца як выемак, так і стажковага выступу нясе слады моцнай спрацаванасці.

Падобнае прызначэнне можа мець і наступная група (9) невялікіх па памерах вырабаў, у якіх скрабучыя або скоблячыя бакавіны сыходзяцца ва ўмоўнае вастрыё (мал. 6: 19);

- група 10. Вырабы на высокіх, злёгку выгнутых пласцінках трохкутнага сячэння, на бакавінах якіх афармлены скрабучыя і скоблячыя скрабніцы (мал. 7: 4, 8);

- група 11. Масіўныя скрэблы на сколах з высокімі бакавымі скрабніцамі.

Колькасна пераважаюць трапецыяпадобныя вырабы (група 4), на наступным месцы прылады 5 і 8 групаў.


Скоблячыя вырабы, колькасцю 18 экземпляраў, прадстаўлены наступнымі групамі:

- група 1. Падтрохкутныя вырабы з адной ці двума скоблячымі выемкамі на большай бакавіне (мал. 7: 5). У адным выпадку адна з меншых бакавін таксама ўтрымлівае скоблячую выемку;

- група 2. Вырабы на пласцінах і пласцінчатых адшчэпах. Вылучаецца некалькі тыпаў: аднабаковыя з адной або некалькімі скоблячымі выемкамі і двухбаковыя вырабы, з адной або некалькімі скоблячымі выемкамі з кожнага боку (мал. 7: 7);

- група 3. Вырабы на адшчэпах выпадковай формы з адной або дзвюма скоблячымі выемкамі (мал. 7: 6);

Скоблячыя вырабы папярэдне можна падзяліць таксама паводле апрацоўкі скрабніцы і накірунку руху падчас працы – стромкія скрабніцы для скаблення ў кірунку на сябе і больш плоскія скрабніцы для працы ад сябе, больш габлюючага дзеяння.



Мал. 7. Асавец 7. Крамянёвыя вырабы скаблоіднага (5 – 7), скрабучага (4, 8), рэжучага (9 – 13, 15) і нявызначанага значэння (1 – 3, 14). Скаблоідныя: 5 – група 1; 6 – група 3; 7 – група 2. Скрабучыя: 4, 8 – група 10. Рэжучыя: 9, 10 – група 2; 11 – група 4; 12 – група 1; 13 – група 6; 15 – група 3

Сярод 37 экземпляраў **прылад рэжучага прызначэння** можна вылучыць 6 груп:

- група 1. Востраканечнікі на адшчэпах з двума лёзамі, якія зыходзяцца на вастрыё. Рэтуш плоская, падвастраючая (мал. 7: 12). У трох выпадках адна з бакавін мае дадатковую падрэтушоўку з брушка;

- група 2. Вырабы на адшчэпах з рэтушаванай адной бакавінай або найбольш выступаючым участкам на ёй. Прымыкаючая да яе пад адносна вострым кутом другая бакавіна або прытуплена стромкай рэтушшу, або мае натуральную тупую паверхню (мал. 7: 9, 10);

- група 3. Падпрамакутны, крыху скошаны ў плане, выраб апрацаваны па перыметру месцамі падвастраючай, месцамі прытупліваючай рэтушшу (мал. 7: 15);

- група 4. Серпападобны выгнуты нож на масіўным адшчэпе, апрацаваны адносна стромкай рэтушшу з абедзвюх бакавін, якія сыходзяцца на вастрыё (мал. 7: 11).

- група 5. Масіўныя пласцінчатыя адшчэпы з падвастраючай рэтушшу на адной з бакавін.

- група 6. Пласцінкі, зломы пласцінак і пласцінчатыя адшчэпы з падвастраючай рэтушшу (мал. 7: 13).

Разцы на помніку прадстаўлены 2 прыладамі. Адна з іх мае 2 разцовыя сколы, размешчаныя на супрацьлеглых бакавінах, на другой разцовыя сколы сыходзяцца на адну вяршыню.

Такое мізэрнае прадстаўніцтва разцоў на помніку з вялікай колькасцю касцяных і рагавых вырабаў дазваляе меркаваць, што для апрацоўкі косткі носьбіты паўночнабеларускай культуры выкарыстоўвалі і іншыя прылады, найперш скрабучага і рэжучага прызначэння.

Рэтушор – адбойнік на абломку шліфаванай сякеры з трыма працоўнымі паверхнямі. Дзве з іх размешчаны на калялёзавым зломе і выкарыстоўваліся выключна для рэтушавання прылад, трэцяя знаходзіцца на самым завяршэнні абушка і прызначалася як для рэтушавання, так і для адбіцця адшчэпаў або пласцін. Выяўлены ў 1 экземпляры.

Асобна трэба адзначыць **прылады невядомага прызначэння:**

1) вырабы на зломах пласцінак і на пласцінчатых адшчэпах, апрацаваных па бакавінах. З аднаго боку рэтуш стромкая, прытупліваючая, з другога больш плоская, завостраваючая (гл. мал. 6: 20). Верагодна, маглі выкарыстоўвацца як камбінаваныя скаблільна-рэзальныя прылады. Выяўлены ў 7 экземплярах;

2) вырабы на выгнутых пласцінках і адшчэпах з адной рэтушаванай плоскай падвастраючай рэтушшу бакавінай. У выніку працоўнае лязо мае крыху выгнутую лінію (гл. мал. 7: 14). Як нож такія прылады выкарыстоўваць цяжка праз выгнутасць ляза, яно не зможа рэзаць па прамой лініі. Аднак калі прыціснуць лязо пад кутом, набліжаным да 90 градусаў, то атрымліваецца добры скрабучы інструмент. Усяго іх выяўлена 5 экземпляраў;

3) востраканечнікі на доўгіх пласцінках, апрацаваныя па перыметры дастаткова стромкай рэтушшу (мал. 7: 14). Асноўнае прызначэнне нявызначана. Рэтуш на бакавінах нясе візуальныя прыкметы спрацаванасці. Адзін з вырабаў мае сустрэчную падрэтушоўку вастрыя з брушка і мог дадаткова выкарыстоўвацца як пракрутка/праколка. Вастрыё другой прылады падпраўлена з брушка разцовым сколам. У трэцяй прылады апрацаваны базальны канец, на якім аформлена косая скрабніца. На сённяшні дзень падобных вырабаў вядома 7 экземпляраў;

4) дробныя вырабы на адшчэпах і зломах пласцінак з вельмі малымі ўчасткамі рэтушы на бакавінах, прамымі або, пераважна, увагнутымі (мал. 7: 1 – 3). Усяго выяўлена 13 экземпляраў.

Акрамя вышэйпералічаных прыладаў, вядома 37 невызначальных фрагментаў крамянёвых вырабаў, амаль палова з якіх пашкоджана агнём.

Такім чынам, ужо на першым этапе аналізу крамянёвай калекцыі паселішча паўночнабеларускай культуры Асавец 7 можна адзначыць наступныя асаблівасці:

- высокі працэнт артэфактаў з другаснай апрацоўкай, у параўнанні з адначасовымі матэрыяламі Падняпроўя, Пасожжа і Панямоння (29 % на паселішчы Асавец 7) [7, с. 98 – 99];

- перавага вырабаў на адшчэпах;

- вялікая разнастайнасць формаў прылад аднаго функцыянальнага прызначэння;

- камбінаванасць прылад – на адной прыладзе аформлены скрабок і скобля, або нож і разец, або скрабок і пракрутка і г.д.;

- паўторнае выкарыстанне пашкоджаных прылад, найперш вялікіх памераў – сякер, наканечнікаў дзід і г.д.;

- колькасная перавага ў калекцыі вырабаў скрабуча-скоблячага прызначэння;

- вялікая колькасць наканечнікаў стрэл;

- мінімальная колькасць разцоў для культуры з багатай касцярэзнай традыцыяй;

- амаль поўная адсутнасць нуклеусаў (спрацаванасць да мінімальных памераў).

У якасці асноўнай рысы крамянёвага матэрыялу паселішча можна адзначыць перавагу прыладаў, выраблены у традыцыях ляснога неаліту (наканечнікі стрэл, скрабкі, скоблі і г.д.).

ЛІТАРАТУРА

1. Чарняўскі, М.М. Паўночнабеларуская культура / М.М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі: у 4 т. – Мінск: Беларус. навука, 1997. – Т. 1: Каменны і бронзавы вякі. – С. 311 – 329.


2. Чарняўскі, Макс.М. Касцяныя і рагавыя вырабы на паселішчах Крывінскага тарфяніку (неаліт – бронзавы век) / Макс. М. Чарняўскі. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 152 с.
3. Зайкоўскі, Э.М. Паселішча на Крывінскім тарфяніку / Э.М. Зайкоўскі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1980. – № 1. – С. 29.
4. Зайкоўскі Э.М. Новае паселішча паўночнабеларускай культуры / Э.М. Зайкоўскі // Весці АН БССР. Сер. грамадз. навук. – 1982. – № 5. – С. 82 – 88.
5. Чарняўскі, Макс.М. Першыя вынікі даследавання тарфяніковай стаянкі Асавец 7 / Макс.М. Чарняўскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2003. – № 6. – С. 70 – 84;
6. Чернявский, Макс.М. Асавец 7 – новое поселение Кривинского торфяника / Макс.М. Чарняўскі // Человек. Адоптация. Культура. – М., 2008. – С. 374 – 388.
7. Калечиц, Е.Г. Памятники каменного и бронзового веков восточной Белоруссии / Е.Г. Калечиц. – Минск: Наука и техника, 1987. – 158 с.

КЕРАМІКА УСВЯЦКАЙ КУЛЬТУРЫ: НАБЫТКІ АПОШНІХ ПАЛЯВЫХ СЕЗОНАЎ

канд. гіст. навук, дац. Міх.М. ЧАРНЯЎСКІ
(Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск)

Неалітычная эпоха на поўначы Беларусі прадстаўлена трыма асноўнымі археалагічнымі культурамі – нарвенскай (ранні неаліт), усвяцкай (сярэдні неаліт) і ранняй фазай паўночнабеларускай (позні неаліт). Амаль 2000 фрагментаў керамікі ўсвяцкай культуры, атрыманых у 2002 – 2007 гады на паселішчы Асавец 2 Бешанковіцкага р-на, паходзяць пераважна ад гаршчкоў. Гэта былі вастрадонныя пасудзіны шлемападобнай або паўсферычнай формы з гладкімі сценкамі з дабаўкамі тоўчаных ракавін, арнаментаванымі пераважна насечкамі. У аздабленні керамікі прысутнічаюць стылізаваныя выяўленчыя матывы, якія адлюстроўваюць вераванні тагачаснага чалавека – качкі, змеі, яйкі, знакі воднай стыхіі.

Неалітычная эпоха на поўначы Беларусі прадстаўлена трыма асноўнымі археалагічнымі культурамі – нарвенскай (ранні неаліт, 4-е тыс. да н.э.), усвяцкай (сярэдні неаліт, першая палова III тыс. да н.э.) і паўночнабеларускай (позні неаліт, ад сярэдзіны 3-га тыс. да н.э.), якая працягвала сваё існаванне ў бронзавым веку. І кожная з іх вылучаецца найперш адметнасцю і непаўторнасцю керамічных комплексаў – тэхналогіяй вырабу, формамі посуду, стылямі яго арнаментацыі. У гэтым сэнсе выдатнае месца займае кераміка ўсвяцкай культуры, калекцыя якой істотна папоўнілася раскопкамі апошніх гадоў (2002 – 2007) на стаянцы Асавец 2 каля адназоўнай вёскі Бешанковіцкага р-на (мал. 2). Гэты помнік увыходзіць у комплекс паселішчаў неаліту – бронзавага веку Крывінскага тарфяніка на мяжы Бешанковіччыны і Сенненшчыны [1].



Мал. 1. Тарфяніковая стаянка Асавец 2:
1 – асноўны раскоп; 2 – раскоп 2002 – 2007 гг.;
3 – выяўленая канцэнтрацыя матэрыялаў усвяцкай культуры; 4 – межы помніка


Археалагічныя помнікі, перакрытыя торфам, захоўваюць мноства артэфактаў, асабліва арганічных, якія залягаюць у непарушанай тысячагоддзямі стратыграфіі. Гэта вымагае няспешнай і вельмі акуратнай разборкі культурнага пласта на малых плошчах, у якой выключаецца прымяненне рыдлёвак. Так, за

адзначаныя вышэй гады ў Асаўцы 2 ускрыты 27 кв. м, аднак атрымана больш 7000 знаходак з керамікі, каменя, косткі, рогу, дрэва і нават з бурштыну, не ўлічваючы шматлікіх драўнінных рэштак.

У пласце таўшчынёй 0,80 – 1,00 м верхнюю палову займалі артэфакты паўночнабеларускай культуры, а з узроўню 0,60 м і да мацерыка залягалі выключна матэрыялы культуры ўсвяцкай, і сярод іх 1839 фрагментаў керамікі. Але спачатку крыху інфармацыі пра гэту культуру на Беларускім Паазер'і...

Даследуючы матэрыялы К.М. Палікарповіча, П.А. Прыбыткіна і Я.Г. Краскоўскай з раскопак стаянак Крывіна 1 і 2 на Крывінскім тарфяніку каля вёс. Галоўск Сенненскага р-на, а таксама з уласных раскопак Асаўца 2 аўтар у самым пачатку звярнуў увагу на своеасаблівасць керамікі з надмацерыковых пластоў названых паселішчаў. Гэта дало магчымасць вылучыць кераміку «тыпу ніжняга пласта Крывіны», адносячы яе да другога, сярэдненеалітычнага, або позняга этапа нарвенскай культуры ў яе крывінскім варыянце [2, с. 10, 11; 1, с. 96]. Пры гэтым адзначалася [1, с. 96] яе падабенства да сярэдненеалітычных матэрыялаў з паўднёвай Пскоўшчыны, на падставе якіх А.М. Мікляеў вылучыў усвяцкую культуру [3, с. 9 – 11, 21]. Апошнія даследаванні стаянак Крывінскага тарфяніка, выяўленне ў Паазер'і тыповых старажытнасцяў нарвенскай культуры паказалі, што кераміку тыпу «ніжняга пласта Крывіны», як і суправаджаючыя прылады працы, таксама мэтазгодна залічаць да ўсвяцкай культуры.

Кераміка ўсвяцкай культуры з паселішча паўднёвай Пскоўшчыны Усвяты 4 прадстаўлена фрагментамі вастрадоннага посуду з гладкімі сценкамі, у якіх прысутнічаюць дамешкі тоўчаных ракавін і якія фармаваліся з стужак тарцовым прылепам; посуд арнаментаваўся пераважна насечкамі і грабеньчатымі адбіткамі [4, с. 19]. Да гэтай культуры адносіцца і большасць сярэдненеалітычных помнікаў Паўночнай Беларусі (мал. 2).




Мал. 2. Этнакультурная сітуацыя на поўначы Беларусі ў сярэдненеалітычны час:
1 – выявы качак на кераміцы; 2 – помнікі культуры грабеньчата-ямкавай керамікі;
3 – паўднёвая мяжа ўсвяцкай культуры; 4 – тапонімы з коранем «вера»;
5 – кірпкі ўплываў усвяцкай культуры; 6 – Крывінскі мікрарэгіён;
НмК – нёманская культура; УПК – усходнепалеская культура; ВДК – верхнедняпроўская культура

Амаль 2000 фрагментаў усвяцкай керамікі, атрыманых у 2002 – 2007 гадах пры раскопках паўночнай часткі Асаўца 2, паходзяць пераважна ад гаршчкоў і, значна радзей, місак.

Форма гаршчкоў цалкам пакуль што не рэканструявана, за выключэннем малых экземпляраў (мал. 3). Па наяўных абломках гэта былі вастрадонныя даволі танкасценныя пасудзіны шлемападобнай або паўсферычнай формы з цыліндрычнай верхняй часткай, плаўна пераходзячай у частку прыдонную. Дны ў асявым сячэнні звычайна мелі 90° і больш. Іх заканчэнні часта прыкруглена затупляліся. Малыя гаршчкі і міскі звычайна капіявалі большыя ўзоры.

Горлы посуду былі шырока адкрытыя, яго вышыня напэўна была роўнай шырыні або не нашмат яе перавышала. Пра гэта сведчаць захаваныя фрагменты, а таксама адносна вялікая, у параўнанні з бакавінкамі, колькасць абломкаў венцаў. Венцы посуду былі прамымі або ледзь прыгнутымі, у некаторых выпадках злёгку адгіналіся (мал. 3, 4). Вельмі характэрным было афармленне іх краю (мал. 3, 4). Гаршчкі ўсвяцкага тыпу на Асаўцы 2 звычайна маюць патоўшчаны край (брыж) з плоскім, у большасці скошаным

унутр зрэзам. Патаўшчэнне часам фармавалася з дапамогай налепленага глінянага жгуціка. Такая форма краю венца надавала дадатковай трываласці верхняй частцы пасудзіны. Праўда, сустракаюцца венцы з такім жа плоскім зрэзам, але без патаўшчэння. Маюцца і экземпляры плаўна патончаныя ад сярэдзіны.




Мал. 3. Асавец 2. Формы посуду (1 – 3) і венцаў (4 – 20)

У глінянае фармовачнае цеста дабаўляліся дробна тоўчаныя ракавіны, нярэдка ў вялікай колькасці, і нейкая дробная арганіка, выгараючая пры абпале. У выніку чарапкі лёгкія і порыстыя, а калі мокрыя, то вельмі крохкія, распадаюцца на драбнейшыя фрагменты. У свежым разломе сценкі заўважаецца шчыльная мікрапласцінчатая структура, арыентаваная ўздоўж паверхняў, так жа арыентаваны і лусачкі тоўчаных ракавін. Унутры разлома маецца цямнейшы шэра-шызы прапластак, што сведчыць пра недастатковае прапальванне керамікі. Дарэчы, гэта прывяло, ва ўмовах працяглага залягання чарапкоў у моцна вільготным асяроддзі, да страты абпалу і фактычнага звароту керамікі ў стан прэсаванай гліны.

Гаршчкі ляпіліся з даволі стандартных гліняных стужак шырынёй 5 – 7 см спосабам тарцовага прылепу «у паз». Некаторыя знойдзеныя чарапкі расслоеныя на дзве палавінкі. Мяркуючы па гэтым, спачатку скочваўся гліняны валік, які затым пляскаўся (раскочваўся?) у тонкую стужку. Потым яна згіналася па доўгай восі ўдвая. Такім манерам з аднаго краю стужкі ўтвараўся паз, з супрацьлеглага – патончаны кант, што і неабходна было пры тэхніцы тарцовага прылепу. Стыкі стужак замазваліся глінай, а паверхні сценак раўняліся выстукваннем з абодвух бакоў з дапамогай «малаточка і кавадлачка». Пры

гэтым «кавадлачкам» мог быць пляскаты камень, а «малаточкам» – дошчачка, на якую часам намотвалі шнурок. У апошнім выпадку на паверхні сценкі заставаліся яго паралельныя адбіткі. Здзіўляе, як старажытныя «гаршчкалепы» маглі «выстукваць» такія роўныя сценкі нават у вялікіх пасудзін. Праўда, А.М. Мікляеў лічыў, што такім чынам выроўніваліся самі стужкі [4, с. 10]. У выніку выстуквання абедзьве паверхні посуду атрымліваліся вельмі гладкімі, а знешняя, магчыма, часам дадаткова глянцавалася або націралася цёртым вугалем, ад чаго атрымліваўся характэрны цёмна-шэры глянец.

Любая кераміка пры доўгім захоўванні ў торфе набывае шэрае адценне. Не з'яўляецца выключэннем і матэрыял з Асаўца 2, ён звычайна шэра-рудаваты. На некаторых паверхнях бакавінак, асабліва ўнутраных, захаваўся пласт нагару ад падгарэлай ежы, месцамі таўшчынёй да 2 мм. Па больш-менш чыстых участках можна меркаваць, што першапачаткова большасць пасудзін мела прыгожы светла-шэра-жаўтавы колер.




Мал. 4. Асавец 2. Венцы посуду ўсвяцкай культуры

Падрыхтоўка глінянага фармовачнага цеста з адпаведнымі дамешкамі, лепка посуду, яго аздабленне і сушка былі справай працаёмкай і карпатлівай. Таму гліняныя вырабы бераглiся, а пры пашкоджанні рамантаваліся – звязваліся з дапамогай шнуркоў і бяросты. Пра гэта сведчаць прасвідраваныя пасухому рамонтныя адтуліны на краях чарапкоў.

Знешнія паверхні посуду аздабляліся штампаванымі ўзорамі, часам лінейнымі нарэзкамі (мал. 4, 5, 6). Сярод элементаў арнаменту дамінуюць насечкі – больш 90 % (мал. 4, 5). Яны звычайна сярэдніх памераў (1 – 1,5 см), аднак даволі шмат маецца дробных, сустракаюцца і доўгія, а таксама семечкападобныя. Некаторыя насечкі даволі шырокія і нагадваюць адбіткі лінейнага штампа з закругленымі канцамі. Вусеневыя адбіткі і наколы займаюць 3 – 4 %. Апошнія даволі разнастайныя – падтрохкутныя, квадратныя,

іголкавыя, аморфныя, як кароткія насечкі і нават капытковыя. Ямкавыя і прачэрчаныя лінейныя элементы адзінкавыя. Ямкі неглыбокія і невыразныя, прачэрчаныя лініі вузкія або шыракаватыя.




Мал. 5. Асавец 2. Арнаменты бакавінак посуду

Большасць элементаў наносілася нахіленым арнаменцірам у адступаючай «скорапіснай» манеры. Пераважная большасць насечак скошана ўправа. Зусім мала іх вертыкальных або косых улева. Гэта звязана, мабыць, з дамінуючай праварукасцю арнаментальшчыц.

Што датычыць краю венцаў, то ён заўсёды меў арнаментацыю – на плоскім або плаўным скосе (гл. мал. 3, 4). Калі ж край быў тонкі, пояс аздаблення змяшчаўся на яго ўнутраны край. Часам такое назіраецца і пры патоўшчаным краі. Венца звычайна мела тыя ж элементы арнаменту, што і корпус пасудзіны. Падобны характар аздаблення краю венца – адна з культуравызначальных рысаў усвяцкай керамікі.


Арнаментальныя матывы на кераміцы звычайна разрэджаныя і ўтвараюць адзінкавыя, здвоеныя, або, значна радзей, шматрадныя гарызантальныя паясы, часам толькі пад краем венца (мал. 6). У некаторых выпадках паскі элементаў накіраваны коса або вертыкальна, нават перасякаюцца, утвараюць замкнутыя зоны. Частка пасудзін увогуле пазбаўленая аздаблення.



Мал. 6. Асавец 2. Матывы арнаментаў

Ідучы за даволі распаўсюджанай традыцыяй называць кераміку па арнаментальных элементах (грабеньчатая, грабеньчата-накольчатая, грабеньчата-ямкавая, ямкава-грабеньчатая і г.д.), яе можна было б назваць насечкавай, або насечкава-накольчатай. У той жа час звяртае ўвагу амаль поўная адсутнасць (долі працэнта) грабеньчатых адбіткаў, што не знаходзіць пакуль што тлумачэння. Справа ў тым, што на ўсвяцкай кераміцы з паселішчаў Нарацкіх азёр, якія ўяўляюць заходнюю перыферыю культуры, грабеньчатыя элементы маюцца. Ёсць яны і на Ўсвяцкіх азёрах паўднёвай Пскоўшчыны, хоць і займаюць там другое месца пасля насечак [4, с. 19].

Адметнасць арнаментацыі ўсвяцкай керамікі Крывінскага тарфяніка – стылізаваныя выяўленчыя матывы (мал. 7) [5]. Яшчэ ў канцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя на керамічным чарапку з Крывіны і быў заўважаны абрыс качкі, гравіраваны ямчатымі наколамі (мал. 7: 2). У 2006 годзе ў у Асаўцы 2 знойдзены абломак гаршчка, аздобленага цудоўнымі фігурамі плывучых на хвалях качак (мал. 7: 1); у 2007-м выяўлены развал невялікай пасудзіны з схематычнымі выявамі змей у выглядзе характэрных лукатак з кароткіх насечак (мал. 7: 3).



Мал. 7. Крывінскі тарфянік. Выяўленчыя элементы на кераміцы:
1, 2 – выявы качак; 3 – выявы змей; 4 – ромбы; 5 – лукаткі; 6 – разетка лістоў чыліма

Для нас сённяшніх арнаменты на неалітычнай кераміцы маюць найперш эстэтычную вартасць. Але для тагачасных людзей яны напаўняліся магічным сэнсам. Стылізаваныя ж выявы неслі глыбінны сакральны змест, адлюстроўвалі тагачасны светапогляд. Так, выявы птушак і яек, паказаных рамбічнай формай, фіксавалі міф аб стварэнні сусвету з яйка, знесенага чароўнай качкай. Гарызантальныя паясы з адрэзкаў кароткіх лукатак, або гарызантальныя лукаткі маглі ўвасабляць першапачатковую водную стыхію. Вертыкальныя паясы лукатак паказвалі вобраз змея, важнага персанажа старажытных вераванняў.

Што ж магло прывесці да заняпаду (або трансфармацыі) нарвенскай культуры на Крывінскім тарфяніку і ўсталявання тут культуры ўсвяцкай?

Істотныя кліматычныя змены парушалі, часам катастрафічна, экалогію і маглі мець драматычныя наступствы для існавання пэўных калектываў. Засухі пачатку субатлантыку (каля 5 тыс. гадоў назад) выклікалі абмяленне і змяншэнне памераў азёр. Гэта прывяло да збяднення рыбных запасаў і, адпаведна, праблем у існаванні калектываў, арыентаваных найперш на рыбалоўства. «Культурны кансерватызм» слабеў і яны рабіліся больш успрымальнымі да навацый, што нярэдка вяло да культурных трансфармацый. У асабліва неспрыяльных умовах калектывы змяншаліся колькасна і не маглі эфектыўна супраць-

стаяць суседзям. І наадварот, іншыя супольнасці па нейкіх прычынах больш паспяхова адаптаваліся да кліматычных змен і пачыналі пашыраць свой арэал. Калі разглядаць канкрэтна сітуацыю ў Крывінскім мікрарэгіёне, то заўважана, што ў пачатку суббарэала старажытнае возера адступіла ад ранейшых берагоў і квітнеўшае ў раннім неаліце паселішча Асавец 4 апынулася адрэзаным ад вады шырокай стужкай балацявіны. Жыхары, носьбіты нарвенскай культуры, вымушаныя былі шукаць новыя месцы для пасяленства. Гэты працэс адлюстроўваюць знаходкі адзінкавых фрагментаў нарвенскага посуду ў самым нізе культурнага пласта помніка Асавец 2. Аднак на прыкладзе апошняга бачна, што далейшае развіццё мікрарэгіёна, як і ўсяго Паазер'я ў цэлым, адбываецца ў рэчышчы новай, усвяцкай культуры.

У пачатку таго ж суббарэала на поўнач Беларусі з Усходняй Латвіі, дзе яны з'явіліся каля 5250 гадоў назад [6, с. 74] пачынаецца пранікненне носьбітаў культуры грабеньчата-ямкавай керамікі. Іх рух адбываецца шырокім пасам паміж Нарачанскімі і Лепельскімі азёрамі, затухаючы перад узбярэжжам Віліі. Аднак пэўныя ўплывы находнікаў адчуваліся ажно ў верхняй частцы Бярэзіны Дняпроўскай (стаянка Зацэнне ў Лагойскім р-не). Перасяленцы з усходняй Прыбалтыкі ўступалі ў нейкія кантакты з прадстаўнікамі мясцовага нарвенскага насельніцтва, пра што сведчыць з'яўленне, напрыклад на Нарацкіх азёрах, выразнай гібрыднай керамікі.

Тыповай грабеньчата-ямкавай керамікі пакуль не знойдзена на Крывінскім тарфяніку. Але, на думку аўтара, частку сваіх адметных рысаў посуд усвяцкай культуры атрымаў менавіта ад находнікаў з поўначы – шлёмападобнасць формы, гладкасценнасць, марфалогію венцаў і іх арнаментацыю, пашырэнне вусеневых узораў, выявы качак.

Прадстаўнікі культуры грабеньчата-ямкавай керамікі традыцыйна лічацца продкамі прыбалтыйскіх фінаў [7, с. 339]. Этнічную ж прыналежнасць носьбітаў усвяцкай культуры акрэсліць цяжка. Сфармаваная на нарвенскім субстраце, яна, верагодна, мела сінкрэтычны характар, набыўшы ад прафінскіх находнікаў пэўныя рысы матэрыяльнай і духоўнай культуры, а таксама мовы. Пра гэта можа сведчыць тое, што ў арэале ўсвяцкай культуры знаходзяцца старажытныя фіна-угорскія тапонімы кшталту Вера, Верацея, Верачата і інш. (гл. мал. 2).

Фармаванне ў другой палове III тыс. да н.э. на Падзвінні паўночнабеларускай культуры з моцнымі кампанентамі культур верхнедняпроўскай і шнуравой керамікі спыніла далейшую «фінаізацыю» нашага Паазер'я, канчаткова павярнуўшы яго ў індаеўрапейскае этнакультурнае рэчыша.

Кераміка ўсвяцкай культуры – гэта нашы вавілонскія гліняныя таблічкі з гравіраванымі пісьмёнамі. Праўда, яны не зафіксавалі дат, імёнаў герояў і нейкіх канкрэтных гістарычных падзей. Але лаканічныя стылізаваныя выявы-піктаграмы на сценках гліняных пасудзін з Крывінскіх стаянак – захаваныя на вякі і тысячагоддзі ўяўленні тагачаснага чалавека пра навакольны свет і яго месца ў ім.

ЛІТАРАТУРА

1. Чернявский, М.М. Археологические культуры Кривинского торфяника / М.М. Чернявский // Древности Подвинья: исторический аспект. – СПб., 2003. – С. 94 – 98.
2. Чернявский, М.М. Неолит северо-западной Белоруссии: автореф. … канд. ист. наук / М.М. Чернявский. – Минск, 1971. - 20 с.
3. Микляев, А.М. Памятники каменного века и периода бронзы в бассейне верхнего течения Западной Двины: автореф. … канд. ист. наук / А.М. Микляев. – Л., 1971. – 24 с.
4. Микляев, А.М. Каменный – железный век в междуречье Западной Двины и Ловати / А.М. Микляев // Петербургский археологический вестник. – СПб., 1994. – № 9. – С. 7 – 39.
5. Чарняўскі, М.М. Выявы птушак на кераміцы ў першабытнай культуры Беларусі / М.М. Чарняўскі // Acta Archaeologica Albaruthenica. – 2008. – Vol. III. – С. 67 – 76.
6. Лозе, И. Мезолит и неолит на территории Лубанской низины // Древности Подвинья: исторический аспект / И. Лозе. – СПб., 2003. – С. 71 – 83.
7. Янитс, Л.Ю. Поселения эпохи неолита и раннего металла в приустье р. Эмайыги (Эстонская ССР) / Л.Ю. Янитс. – Таллин, 1959. – 380 с.

КРАЯЗНАЎСТВА І ЭТНАГРАФІЯ

ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ПРЫЁМЫ ГАДАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ НА ПАДЗВІННІ

канд. гіст. навук С.Ул. АНДРЫЕЎСКАЯ
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

Разглядаюцца традыцыйныя прыёмы догляду за дзецьмі малодшай узроставай групы на тэрыторыі Падзвіння ў сучаснасці з прывядзеннем гістарычных аналогій. Абагульняюцца вынікі этнаграфічных назіранняў за медыка-гігіенічнымі, бытавымі ўмовамі гадавання дзяцей на тэрыторыі Падзвіння. Апісваюцца забароны, вераванні, магічныя прыёмы, сродкі народнай медыцыны ў адносінах да дзяцей малодшай узроставай групы ў беларускіх сем'ях.

Нягледзячы на глабалізацыю, урбанізацыю ў сучасным жыцці мы сустракаемся са з'явамі, якія можна назваць традыцыйнымі. Даследчыкі-этнографы не аднаразова адзначалі, што найбольш рэліктавых, архаічных з'яў захоўваецца менавіта ў той частцы культуры, якая найменш падвержана трансфармацыям і навацыям. Калі палітычная, эканамічная сферы жыцця змяняюцца вельмі хутка, то бытавая сфера больш кансерватыўная, асабліва ў вёсцы. Яе кансерватызм моцна праяўляецца там, дзе канкрэтны чалавек аддае перавагу назапашанаму пакаленнямі вопыту. У нацыянальным характары беларусаў закладзена асцярожнасць у адносінах да новага, вось чаму традыцыйныя прыёмы гадавання дзяцей захаваліся да сённяшняга дня на Падзвінні. Безумоўна, ёсць шэраг псіхалагічных, эканамічных і іншых фактараў, што спрыяюць гэтай з'яве. Напрыклад, высокі аўтарытэт для маладых у вёсцы людзей сталага веку, недахоп медыцынскай асветы і аслугоўвання ў сельскай мясцовасці, недахоп матэрыяльных сродкаў – усё гэта спрыяе таму, што ў сферы догляду за дзецьмі малодшага ўзросту (ад 0 да 3 год) і сёння пануюць традыцыйныя прыёмы. Гэтаму можна назваць і шэраг іншых прычын, аднак звернемся непасрэдна да з'явы.

Традыцыйным абрадам, звязаным з нараджэннем, хрышчэннем дзіцяці, прысвечана значная колькасць публікацый. Заснаваны яны ў асноўным на матэрыялах XIX – пач. XX стагоддзя [1]. Сучасныя этнаграфічныя назіранні прадстаўлены дастаткова сціпла. Бытавая сфера ў гадаванні дзяцей узросту ад 0 да 3 гадоў апісана вельмі дрэнна. Выхаваўчыя прыёмы ў літаратуры прадстаўлены вельмі сціпла (па тыпу «працоўнае выхаванне», «павага да старэйшых» і г.д.). Бытавыя ж умовы існавання дзяцей, прыёмы догляду за імі апісаны ўвогуле агульнымі сказамі: «елі тое ж, што і дарослыя», «насілі адзежу ад старэйшых» і г.д. Запоўніць гэты недахоп магчыма ў сучаснасці. Назіранне і этналагічнае фіксаванне традыцыйных прыёмаў гадавання дзяцей у XX – XXI стагоддзях, магчыма, дапаможа змадэляваць карціну гэтага боку побыту беларусаў Падзвіння больш ранніх перыядаў. Павышэнне цікавасці да т. зв. «паўсядзённай гісторыі» вымушае закрануць і тэму дзяцінства ў этналагічнай навуцы.

Даследчыкі-этнографы, абапіраючыся на матэрыялы XIX стагоддзя, падзяляюць перыяд дзяцінства на чатыры ўзроставыя ступені: маленства – ад нараджэння да 6 – 8 гадоў; дзяцінства – ад 6 – 8 гадоў да 12 – 14 гадоў; падлеткавы ўзрост – ад 12 – 14 да 16 – 17 гадоў і юнацтва – ад 16 – 17 да 18 – 20 гадоў [2, с. 10]. Ступень маленства даследчыкамі (паводле дадзеных XIX – пач. XX стагоддзя) падзяляецца на ўзроставыя падгрупы – «анёлкі» і «блазнюкі». Першая пачнылася да з'яўлення на свет дзіцяці – немаўляці, «анёлка» і заканчвалася, калі яго адымалі ад грудзей – у 2 – 3 гады [2, с. 10]. Дзеці ад 2 – 3 гадоў да 6 – 8 гадоў называліся ў беларусаў «блазнюкамі» [2, с. 13]. Прапанаваная класіфікацыя досыць умоўная, бо пераносіць назвы ўзроставых груп, характэрныя для XIX – пач. XX стагоддзя, і на XX стагоддзе цалкам. Для тэрыторыі Падзвіння XX стагоддзя больш прыймальнай (на думку аўтара) здаецца дзяленне па ўзросце. Узроставая група ад нараджэння да трох гадоў даследавана найменш. Менавіта яна цікавіць аўтара даклада.

Прадметам разгляду ў артыкуле з'яўляюцца традыцыйныя прыёмы, умовы гадавання дзяцей ад 0 да 3 гадоў. Безумоўна, зафіксаваная аўтарам інфармацыя не прэтэндуе на вычарпальнасць. Задача, хутчэй, пазначыць праблемнае поле навуковага інтарэсу.

Першы пазначаемы аспект – рознанакіраванасць пошуку. Спецыфіка тэмы вымагае разгледзіць наступныя накірункі фіксавання: традыцыйныя народныя медыцынскія і гігіенічныя прыёмы догляду дзяцей, харчовыя традыцыі, бытавыя ўмовы, элементы выхавання.

Найбольш буйная група захаваўшыхся традыцыйных прыёмаў – медыцынскія і гігіенічныя. Іх перавага абумоўлена тым, што найважнейшай задачай бацькоў пасля нараджэння дзіцяці з'яўляецца захаванне яго жыцця і здароўя. У XIX – пач. XX стагоддзя смерць дзіцяці не была рэдкай з'явай, што кампенсавалася высокай нараджальнасцю. Таму першачарговай задачай для бацькоў было хутчэйшае ўключэнне дзіцёнка ў «свет людзей», (пасля чаго смерць не ўспрымалася як нешта страшнае), на што і накіраваны былі традыцыйныя магічныя прыёмы, якія практыкаваліся адразу пасля нараджэння, хрышчэння і г.д.

У сучаснасці ў сувязі з тым, што смерць дзіцяці з'ўляецца надзвычайнай з'явай, гэтая задача адыйшла і першачарговае месца заняла задача засцеражэння ад траўматызму і хваробаў, што адлюстравалася ў трывалым захаванні прыёмаў лекавання. Галоўным прынцыпам з'яўляецца выкарыстанне даступных сродкаў: мацярынскага малака, словаў, вады, зёлак, некаторых прадуктаў.

Напрыклад, такі прыём, як закапванне ў нос немаўляці мацярынскага малака, традыцыйны і шырока распаўсюджаны гігіенічны прыём. Парады рабіць так даюць нават медыкі, нягледзячы на тое, што салодкае малако заліпае і стварае перашкоды для дыхання немаўляці. Дарэчы, афіцыйная медыцына прапануе такі сродак, як «вазелінавы алей». Маткі і зараз аддаюць перавагу традыцыйнаму сродку. Яшчэ адін цікавы гігіенічны прыём паведаміла інфарматарка. У немаўлят часта бываюць на скуры так званыя *«апрэласці»*[1], каб пазбегнуць іх распаўсюджана была такая працэдура: жанчына скрэбла ножам ільняны саматканы рушнік так, каб утваралася ільняная *«трасца»* (дробныя часцінкі ільну), гэтымі саскрэбкамі і пасыпалі скуру дзіцяці ў балючых месцах. Ільняныя саскрэбкі аказвалі цудоўнае дзеянне – вельмі хутка скура станавілася здаровай. Заўважым, што метад выкарыстоўваўся ў афіцыйнай медыцынскай установе («радзільным доме») у 60 – 70 гадах XX стагоддзя па мудрай парадзе адной з мацярок. Некаторыя народныя метады лекавання дзяцей, якія выкарыстоўваліся ў XX стагоддзі, верагодна, прыйшлі з далёкіх часоў. Адразу пасля нараджэння народная медыцына прапаноўвала некалькі сродкаў для лячэння немаўлят і іх мамак. Так, калі дзіця нараджалася з чырвонымі плямамі на твары, маці прасіла ў медыцынскага персаналу кавалак *«дзіцячага месца»* (плацэнту) абавязкова ад мамкі-першародкі (г. зн. не абавязкова сваю) і цёрла ёй чырвоныя месцы. Для падрыхтоўкі грудзей маці да кармлення, выкарыстоўваліся розныя сродкі: расціранне жорсткай тканінай, сырым кіслым яблыкам, раслінным алеем і інш.

Першы перыяд жыцця дзіцяці – 28 (30) дзён, калі паводле медыцынскай тэрміналогіі ён лічыцца нованароджаным, супадае з традыцыйным перыядам да хрышчэння (уводзінаў у царкву). Дзіця, звычайна, нікому не паказвалі, бо лічылі, што яму лягчэй у гэты перыяд жыцця пашкодзіць. У сучаснасці, старэйшыя сваякі не рэкамендуюць маладой маці выносіць дзіця на двор. Тлумачыцца гэта проста: *«каб не захварэў»*. Непажаданым з'яўляецца ў гэты перыяд з'яўленне ў хаце чужых людзей, бо дзіця могуць *«сурочыць»*. Выключэнне ў некаторых выпадках робіцца толькі для *«адведак»*, ды і то іх, часам, пераносяць на пазнейшы перыяд. Калі ж у хату прыйшоў хтосьці чужы, у якасці перасцярогі, пасля яго выходу, традыцыйна рэкамендуецца маці сцерці дзіця *«па руху сонца тры разы падалом сваёй ісподняй рубашкі»*. На Падзвінні верылі ў залежнасць развіцця дзіцяці ад уплыву іншых людзей. Так, калі нараджалася дзіця, імкнуліся як мага хутчэй паведаміць найбольшай колькасці людзей аб гэтай падзеі. Лічылася, чым хутчэй усе даведаюцца, тым хутчэй дзіця пачне гаварыць. Дарэчы, шкодны ці станоўчы ўплыў на будучае дзіця можна аказваць, па меркаванню беларусаў, яшчэ на стадыі цяжарнасці жанчыны. Так, адна з інфарматарак паведамляла, што калі яна была цяжарная (70-я гады XX ст.), папрасіла ў адной бабкі агуркоў, тая не дала (а адмаўляць цяжарнай жанчыне нельга, бо *«ўсё паядуць мышы»*), і каб гэтага не здарылася, злосная бабка выкарыстала магічны прыём *«адсыпання ад цяжарнай пяском»*, які пашкодзіў дзіцяці, і тое, калі падрасло і яго сталі выводзіць на вуліцу, *«жменямі ела пясок»*. Даследчыкі іншых рэгіёнаў (напрыклад, Палесся) у XIX стагоддзі паведамляюць аб тым, што дзіця імкнуліся першы раз загарнуць у бацькоўскую адзежу, «каб паважала бацькоў» [1, с. 181]. Аўтар артыкула сустракаў на Падзвінні іншае ўяўленне. Дзіця адразу пасля нараджэння імкнуліся загарнуць у нешта новае (калі не было новых пялюшак, проста ў кавалак новай тканіны). Рабілася гэта з «эканамічнай» мэтай, каб *«рабёнак не рваў адзежу, бо ёсць такія дзеці, на якіх усё гарыць»*. Для параўнання, у іншым этнаграфічным рэгіёне – на Палессі – хуткае зношванне адзення на дзіцёнку звязвалі з яго будучай недаўгавечнасцю [1, с. 185].

Штодённая працэдура купання дзіцяці да 6 месяцаў стала звычайнай толькі ў XX стагоддзі. Раней нованароджанага так часта не мылі. У 50 – 80 гады XX стагоддзя абавязковым купаць дзіця штодзённа лічылася нормай да двух тыдняў, пасля гэтага купалі радзей (па звестках інфарматараў, раз у 3 – 7 дзён). Цікава, як старэйшыя жанчыны абгрунтоўвалі неабходнасць купання дзяцей. Казалі, што *«пасля купання дзіця добра спіць і матка можа рабіць работу,* што *«дзеці, якіх купалі, раслі разумнейшыя і здаравейшыя»*. З купаннем дзіцяці звязаны шэраг забаронаў, якія захаваліся да сучаснасці: нельга заходзіць у хату з вуліцы, калі дзіця голае (*«будзе находзіць»*); нельга выліваць ваду ў якой мылі дзіцёнка пад плот, на дарогу, пажадана выліваць яе пад садовае дрэўца (вішню, яблыню); пажадана купаць дзіця да захода сонца, бо пасля захода сонца ваду нельга выліваць на вуліцу. Паводле паведамленняў, сабраных А.К. Сержпутоўскім, падобныя забароны існавалі і ў іншых рэгіёнах Беларусі [1, с. 182]. Прыёмы купання носяць адбітак традыцыйных уяўленняў. Так, паводле меркавання старэйшых людзей, першы раз дзіцёнка не павінны купаць бацькі. Гэтую місію даваяюць бабулям. Раней першае купанне ажыццяўляла бабка-павітуха. Звычай трансфармаваўся і зараз купаць дзіця на тэрыторыі Падзвіння рэкамендуецца роднай бабцы. Тлумачэнне, якое даюць рэспандэнты, утрымлівае і рацыянальную, і ірацыянальную кампаненту. Лічыцца, што бабулі, па-першае, «ужо ўмеюць і пакажуць маладым, як рабіць», па-другое, «старыя ўжо выгадавалі

[1] Тут і далей у косках выкарыстаны дакладныя цытаты са слоў інфарматараў з запісаў аўтара артыкула.

сваіх дзяцей, значыць, у іх "лёгкая рука"». Цікава, што прыём першага купання бабулямі рэкамендуецца не толькі для першынца, але і для ўсіх наступных дзяцей. Падаецца, што гэта звязана з верай ва ўплыў першых актаў, якія ажыццяўляюцца над дзіцём на далейшы яго лёс. Пры купанні звычайна рэкамендуецца дадаваць у ваду зёлкі. Звычайна гэта чарада, рамонак, мята, валер'яна. Пералічаныя расліны аказваюць заспакойваючае і антысептычнае дзеянне. Калі на скуры з'яўляліся нейкія пашкоджанні ці высыпанні, народная медыцына Падзвіння рэкамендуе ўжываць чараду *(«сучкі»)*, якая расце ля бягучай вады, маўляў, *«з вадой сплывуць і болькі»*. Медыкі першыя тыдні жыцця дзіцёнка рэкамендуюць купаць яго ў ахалоджанай кіпеўшай вадзе. Народная традыцыя гэта рабіць не рэкамендуе. «Нельга дзіця купаць у кіпені, а то будзе *ўтрапёны*» (гэта значыць дзіцё будзе неспакойным, мітуслівым чалавекам, што ў беларусаў, з разважлівым і памяркоўным нацыянальным характарам, лічылася яўным недахопам). Цікава, што вада як даступны сродак лячэння дзяцей выкарыстоўваецца ў беларусаў у розным выглядзе. Напрыклад, калі *«у рабёнка на твары чырвоныя плямы, то гэта находы»* (находам называюць невядомую афіцыйнай медыцыне хваробу, якая праяўляецца ў выглядзе плямаў на твары і целе, прычынай якіх з'яўляецца тое, што дзіцёнак сядзей на парозе, калі інша жанчына). У такім выпадку лячэнне ажыццяўляецца самой маці, яна водзіць мізінцам левай рукі па вакопным шкле з вадзяным кандэнсатам (які здараецца ад розніцы тэмператур у хаце і на двары) і прагаворвае пэўную замову (ці без яе), а потым гэтым пальцам дакранаецца да месца паражэння скуры. Выкарыстоўваецца вада як сродак ад *«супуду»* (іспуга). Калі здараецца, што дзіця спужаецца чаго-небудзь, то ў хатніх умовах маці набірае ў рот вады і тры разы змывае дзіця гэтай вадой са свайго рота.

Стрыжка пазногцяў і валасоў – важная гігіенічная і магічная працэдура. Паводле звестак XIX стагоддзя, яе рэкамендуецца не рабіць да года, у некаторых мясцовасцях – да трох гадоў. На тэрыторыі Падзвіння такі звычай захаваўся да сучаснасці. Да года (у некаторых выпадках – трох гадоў) не стрыгуць валасы. Пажадана, каб першую стрыжку ажыццяўляў чалавек «з лёгкай рукой». Стрыжку валасоў народная традыцыя рэкамендуе ажыццяўляць на маладзік, бо ён будзе расці і добра будуць расці валасы. Валасы дзіцёнка пажадана захоўваць, ні ў якім разе не выкідваць, бо птушка ці мыш можа ўзяць валасы *«на гняздо»* і ў малога будзе балець галава. Падобныя ўяўленні сустракаліся на тэрыторыі Беларусі і ў больш раннія часы [1, с. 183]. Стрыжка пазногцяў немаўляці так строга не рэгламентуецца, аднак ёсць асаблівасць: некаторыя бабулі рэкамендуюць у вёсцы мамкам пазногці дзіцёнку не стрыгчы, а адкусваць зубамі і закопваць у зямлю. Не ў якім разе не паліць, бо «рабёнку будзе пячы і ён будзе трывожна спаць». Трэба пазначыць, што забароны, звязаныя са стрыжкай валасоў і пазногцяў, характэрны і для іншых рэгіёнаў Беларусі [1, с. 185]. Лакальныя адрозненні тут заўважаюцца ў асаблівасцях самога дзеяння і звязаных з ім перасцярог.

Закранем таксама такую далікатную праблему, як кармленне дзіцёнка. Карміць дзіця, паводле крыніц XIX стагоддзя да 1,5 – 2 гадоў лічылася нормай. У савецкія часы, калі жанчына павінна была найхутчэй вярнуцца да працы на карысць сацыялістычнай дзяржавы, медыцына з поспехам даказвала шкоднасць грудного кармлення больш 9 месяцаў. Існаваў нават міф аб развіцці нейкіх невядомых паталогій. Ці варта казаць, што не ўсе жанчыны прытрымліваліся такіх «навуковых» рэкамендацый. Іншыя справы, што эканамічныя ўмовы прымушалі мацярок рана заканчваць кармленне. Сучасная медыцына даказала карыснасць грудного кармлення. Сусветная Арганізацыя Аховы здароў'я пры ААН рэкамендуе карміць дзіця да 2 – 3 гадоў. Народная традыцыя беларусаў Падзвіння цалкам пагаджаецца з найноўшымі дасягненнямі і рэкамендуе *«карміць рабёнка грудзямі, каб быў разумнейшы і здаравейшы»*.

Вядомы народнай медыцыне і сродкі павелічэння лактацыі ў жанчын. Каб у маткі было малако, традыцыйна рэкамендуецца: карміць дзіця *«каб ніхто не бачыў, бо сурочаць і малако прападзе»*, трэба таксама церці грудзі мужчынскай шапкай. Дарэчы, такі ж сродак рэкамендуецца і дзяўчатам-падлеткам, каб *«цыцкі раслі»*. Для павялічэння лактацыі рэкамендуецца маці піць адвар кмену, часцей даваць дзіцёнку сасаць грудзі. Сучасная медыцына ўзяла гэтыя народныя сродкі на ўзбраенне.

Калі ў маці раптам прападае малако, то традыцыйна гэта звязваецца на Падзвінні з *«сурокам»*. У такім выпадку рэкамендуецца рабіць для кормячай мамкі ваду *«ад дрэннага вока»* з надзеяй на вяртанне лактацыі. Цалкам ірацыянальным з'яўляецца ўяўленне сярод вяскоўцаў на Падзвінні аб тым, што жанчына з малымі грудзямі будзе мець мала малака, а з вялікімі – шмат. Тут заўважна моцная аналогія з жывёльным светам, які вяскоўцы назіраюць на працягу ўсяго жыцця. Адсюль, у некаторых выказваннях аб кормячых матках, паралелі з «кароўкай». Напрыклад, запрашэнне кормячай жанчыны да стала: *«трэба ж і нашу кароўку карміць...»* Дарэчы, пры выбары будучай жонкі вяскоўцы ўлічвалі не толькі матэрыяльны дастатак бацькоў нявесты, але і яе здароў'е. Імкнуліся ўзяць дзяўчыну, *«каб была кроў з малаком»*, забяспечыць такім чынам сабе ў гаспадарку добрую работніцу і здаровую маці для будучага патомства. У адносінах да дзяцей лічылася таксама, чым больш поўны дзіцёнак, тым ён здаравейшы. І сучасныя маці (асабліва бабулі) імкнуцца дасягнуць гэтага «ідэалу», што спараджае, пры наяўнасці штучнага кармлення дзяцей раняга ўзросту, праблемы з залішняй вагой. Сучасная медыцына актыўна кантралюе гэтае пытанне. Навуковы і медыцынскі прагрэс наклаў свой адбітак на адносіны да донарскага кармлення.

Яшчэ ў 80 – пач. 90-х гадоў XX стагоддзя гэта была шырока распаўсюджаная з'ява. Цікава, што этнаграфічныя крыніцы кан. XIX – пач. XX стагоддзя ўтрымліваюць згадкі пра распаўсюджанне донарскага кармлення дзяцей [1, с. 182]. Інфарматары XX стагоддзя з тэрыторыі Падзвіння таксама нярэдка паведамлялі аб донарскім кармленні дзяцей. У XX стагоддзі нават у радзільных дамах у мацярок з дастатковай лактацыяй бралі малако для чужых дзяцей. У 90-я гады XX стагоддзя пачала актыўна праводзіцца агітацыя супраць такой з'явы, што было звязана з праблемай перадачы СНІДу, віруснага гепатыту праз малако. Сучасныя маці аддаюць перавагу штучным замяняльнікам малака пры адсутнасці лактацыі. Змяніліся і адносіны да малака кароў як замяняльніка мацярынскага малака. Калі для XIX – XX стагоддзяў гэта нармальны і, як здавалася сялянам, натуральны прадукт для кармлення дзяцей [2, с. 48], то ў XXI стагоддзі даказана шкоднасць і патэнцыйная небяспечнасць гэтага прадукта для страўніка дзіцяці да года [3, с. 100]. Аднак традыцыя настолькі моцная, што і зараз у вёсках Падзвіння гэты прадукт актыўна выкарыстоўвасцца ў харчаванні дзяцей да года. Завяршэнне кармлення дзіцяці народная традыцыя рэкамендуе ажыццяўляць *«на адзеты лес»* (г. зн. у такую пару года, калі на дрэвах ёсць лісце), у адваротным выпадку лічыцца *«дзіця будзе жыць бедна»*. Гэтае народнае ўяўленне не стасуецца з рэкамендацыямі афіцыйнай медыцыны, якая заканчвае кармленне рэкамендуе ў халодную пару года, калі менш рызыкі страўнікавых інфекцый для дзіцёнка і маці менш ужывае вадкасці, што змяншае колькасць малака. Каб дзіця перастала патрабаваць кармлення мацярынскім малаком, традыцыйна старэйшыя раілі мазаць «цыцку» перцам, гарчыцай і інш. Зразумела такі традыцыйны сродак адвучвання дзіцёнка дрэнна ўплываў на яго страўнік. Тым не менш такая практыка захавалася і ў XX стагоддзі.

Першы прыкорм сучасныя маці гатуюць пры дапамозе сучасных бытавых прыстасаванняў (міксер, блэндар і інш.). Аднак, часам, у вёсках сустракаецца такі прыём, як жаванне ежы для дзіцёнка дарослымі, што, безумоўна не гігіенічна і шкодна, але традыцыйна. Традыцыйна беларусы імкнуліся як мага раней прывучыць дзіця да ежы дарослых. Гэта звязана з шматдзетнасцю ў сем'ях і з занятасцю бацькоў, бо рыхтаваць спецыяльна ежу для дзіцёнка ў маці проста не было часу. Цікава, што і сёння глыбокім перакананнем вясковых матуль на Падзвінні з'яўляецца тое, што трэба дзіцёнку як мага раней прапанаваць пакаштаваць больш страў «з агульнага стала». Напрыклад, адна з інфарматарак вельмі ганарылася, калі паведамляла, што яе васьмімесячны сын есць боршч *«з агульнага катла»*. Пры гэтым традыцыя доўгага кармлення грудзьмі, якая практыкавалася (па этнаграфічных звестках) у XIX стагоддзі працягвалася і ў XX стагоддзі, прычынай з'яўлялася трывалая вера жанчын у тое, што пакуль яны кормяць дзіця *«цыцкай»* не могуць зацяжарыць зноў.

Да сённяшняга дня дайшлі некаторыя бытавыя забароны ў адносінах да дзяцей, якіх прытрымліваюцца беларусы ў паўсядзённым побыце. Карані такіх забарон хаваюцца ў далёкім мінулым, магчыма, яшчэ ў язычніцтве. Напрыклад, маці забараняецца *«жаргаць»* праз дзіця, калі тое сядзіць на парозе. Тлумачэнні розныя: «не будзе расці», «на твары будуць чырвоныя плямы», «захварэе». У любым выпадку – будзе нанесена шкода здароўю дзіцяці. Шырока распаўсюджана таксама забарона перадаваць дзіця з рук у рукі спіной (народная традыцыя раіць абавязкова паварочваць тварам да таго, хто бярэ дзіця). Лічыцца непажаданым таксама карміць дзіця лыжкай *«навыварат»* (ад сябе). Тлумачыцца тым, што дзіцёнку *«будзе дрэнна»*.

Бытавыя ўмовы ўтрымання дзяцей залежаць ад магчымасцяў сучаных сямей. Аднак і тут можна знайсці элементы, якія замацаваны традыцыяй. Так, у XX стагоддзі наяўнасць асобнай калыскі (ложка) для дзіцёнка лічылася абавязковай. Напрыклад, калекцыя Полацкага нацыянальнага музея-запаведніка ўтрымлівае калекцыю калысак, сярод якіх ёсць палатняная калыска, для таго каб браць з сабой малое дзіця на палявыя работы. Прадстаўленыя ў фондах згаданага музея калыскі і дзіцячыя ложкі пераважна адносяцца да кан. XIX – XX стагоддзя. Паводле звестак этнографаў XIX стагоддзя калыску рабіў для дзіцёнка сам бацька. Калі ж яе выраблялі нехта іншы, то бацька імкнуўся хаця б што-небудзь дарабіць сам [1, с. 181]. Лічылася, што ў такім выпадку дзіця будзе паважаць бацькоў. Распаўсюджаны выпадкі, калі малое дзіця спала разам з мамкай. Сярод этнаграфічных звестак XIX стагоддзя сустракаюцца паведамленні аб тым, што жанчыны часам маглі *«прыспаць»* (задушыць) дзіця вагой свайго цела, калі спала разам з ім [2, с. 57]. Безумоўна, гэта было вялікае гора для маці. Таму наяўнасць дзіцячага ложка з'ява станоўчая. На тэрыторыі Беларусі існавалі розныя назвы і мадэлі дзіцячых ложкаў: люлькі, зыбкі, калыскі. У мінулым іх рабілі з саломы, дрэва, палатна, лазы. У XX стагоддзі з'явіліся прамысловыя металічныя і драўляныя ложкі для дзяцей. У 1920 – 1930 гадах у дзіцячы побыт увайшлі «ложкі-качалкі» [4, с. 175]. Каляска стала даступнай для беларусаў толькі з 2-й пал. XX стагоддзя (а для вяскоўцаў і пазней). У сучаснасці каляска і дзіцячы ложак з'яўляюцца абавязковымі атрыбутамі любой сям'і з малымі дзецьмі. З калыскай у беларусаў звязваліся шматлікія забароны, апісаныя ў этнаграфічнай літаратуры [5]. Некаторыя з іх дайшлі да сучаснасці, як, напрыклад, забарона калыхаць пустую калыску (каляску). Захвалася вера ў тое, што ў такім выпадку дзіця будзе дрэнна спаць.

У адносінах да іншых прадметаў дзіцячай мэблі нельга сказаць, што яны былі абавязковымі, але сустракаліся і спецыяльныя столікі для кармлення, хадункі, стаякі і г.д. Нельга забывацца, што ў XX стагоддзі прамысловасць прапаноўвала дастатковы асартымент дзіцячай мэблі і развіваючых прытасаван-

няў. Нягледзячы на гэта, на Падзвінні ў XX стагоддзі выкарыстоўваліся і самаробныя рэчы. Для дзяцей, якія толькі вучыліся хадзіць мясцовыя майстры ў вёсках прапаноўвалі хадункі (нешта накшталт стульчыка, які ставіцца наперадзе і за які дзіця трымаецца), стаякі (драўляны квадрат, за які дзіця трымалася і так стаяла), гушкалкі, качэлькі і інш. Канчаткова самаробныя рэчы ў дзіцячым побыце на тэрыторыі Беларускага Падзвіння былі выцеснены, верагодна, у 80 – 90 гады XX стагоддзя, калі замежныя тавары для дзяцей сталі даступнымі мясцоваму сельскаму насельніцтву. Да гэтага часу, дзякуючы недастатковай увазе з боку савецкай прамысловасці да такіх вырабаў, у вёсках захоўваліся самаробныя прадметы дзіцячай мэблі, часта яны перадаваліся з пакалення ў пакаленне. У сувязі з гэтым здзіўляе амаль поўная адсутнасць «дзіцячага інвентару» ў калекцыях беларускіх музеяў.

Дзяцей першага года жыцця спавівалі ў пялюшкі (полкі) з ільнянога палатна, часцей старога, якія добра ўбіралі вільгаць, не вызывалі раздражнення скуры. Звязвалі іх зверху «спавічам» – гэта вузкі даматкані паяс у 2 вяршкі (8,8 см) шырынёй і 2,5 аршыны (1, 77 м) даўжынёй, бо лічылі, што тады ногі дзіцяці будуць роўныя. Некалькі разоў на дзень іх размотвалі і давалі наварушыцца, мянялі пялюшкі. Спавівалі да таго часу, пакуль дзіця не ўставала на ногі. Тады яго апраналі ў кашулю і ставілі ў стойку [4, с. 172 – 173]. Паводле паведамленняў апрошаных інфарматараў, на Падзвінні моцнае спавіванне бытавала да 80 – 90-х гадоў XX стагоддзя. Дзіця спавівалі вельмі моцна, так, што яно не магло кануцца. Лічылі, што такі спосаб спрыяе не толькі фарміраванню роўных ног, але і таму, што дзіця *«не ўздрыгвае, не пужаецца сваіх рук»*. Адна з інфарматарак паведамляла, што яе малодшая сястра (30-я гады XX ст.) да трох гадоў клалася «стоўбікам» перад сном і маці яе спавівала, толькі тады дзяўчынка засынала. У 90-я гады XX стагоддзя пад уплывам медыцынскай прапаганды, распаўсюдзілася так званае «вольнае спавіванне». Медыкі даказалі, што дзіця лепш развіваецца, калі мае магчымасць вольна рухацца. Акрамя пялюшак, у немаўлят у XIX – перш. пал. XX стагоддзя было, звычайна 1 – 2 рубашачкі, чэпчык, коўдра, «спавівач», «мятлік» [4, с. 173]. У XX стагоддзі асартымент дзіцячага адзення значна пашырыўся. Прамысловасць прапаноўвала шмат варыянтаў адзення для дзяцей так званай «ясельнай групы». Галоўным прызначэннем адзення з'яўляецца абарона дзіцяці ад холаду. Пашырына ў XX стагоддзі ўяўленне аб тым, што галоўка дзіцёнка павінна быць заўсёды прыкрыта, бо *«калі застудзіць цемечка, раднічок, будзе позна гаварыць»*. Увогуле, у паўсядзённым побыце дзяцей на тэрыторыі Падзвіння значнае месца працягваюць адыгрываць рознага кшталту забароны і забабоны. Напрыклад, лічыцца што нельга астаўляць сушыцца на двары памытае дзіцячае адзенне на ноч, тады дзіця будзе хварэць (па звестках XIX – пач. XX стагоддзя, з-за таго, што ў адзенне залезуць нячысцікі) [1, с. 182]. На тэрыторыі Падзвіння вяскоўцы пазбягаюць мыць дзіцячае адзенне напярэдадні рэлігійных святаў (асабліва *«гадавых»*), бо *«калі адзенне ў свята будзе сушыцца, рабёнак можа захварэць»*. Таксама распаўсюджанай забаронай з'яўляецца апранаць дзецям адзенне з дзіркамі, ці зашытае. Нельга, па меркаваннях інфарматараў, апранаць дзіцёнку адзенне *«навыварат»*. Забараняецца таксама зашываць адзенне на дзіцёнку, бо *«зашываеш памяць»*. Калі такое маці робіць, ёй рэкамендуецца даць дзіцёнку трымаць у роце доўгую нітку. Сустракаецца на Падзвінні шырока распаўсюджаная ў мінулым на тэрыторыі Беларусі забарона дзіцяці хадзіць, апрануўшы толькі адзін чаравік, *«бо асірацее»* [1, с. 186]. Да года дзіцёнку забараняюць глядзецца ў люстэрка. Гэтая забарона вядома з XIX стагоддзя [1, с. 183], аб ёй памятаюць і сёння.

Крыніцы XIX – пач. XX стагоддзя паведамляюць аб частых няшчасных выпадках у сялянскім асяроддзі з-за недагляду за малымі дзецьмі [5]. Сярод паведамленняў інфарматараў сустракаюцца звесткі аб тым, што і ў XX стагоддзі з дзецьмі здараліся няшчасныя выпадкі з-за недагляду. Дзіўнай сёння можа падацца традыцыя *«навязваць»* дзяцей, якія яшчэ не навучыліся хадзіць у вёсцы. У калекцыі аўтара такіх паведамленняў некалькі. Такі звычай існаваў яшчэ ў 80 гады XX стагоддзя сярод вясковых жанчын. Каб мець магчымасць выконваць працу ў хаце ці на двары, жанчына прывязвала за ножку малое дзіця лентай да якога-небудзь буйнога прадмета мэблі (шафы, стала, ложка). Дзіця поўзала, гуляла, *«тузалася»*, але развязаць вузел не магло. Маці ў гэты час *«рабіла работы»*. Без нагляду такое дзіця магло нанесці сабе шкоду. Для сялянскіх сямей беларусаў звычайнай практыкай у XIX – перш. пал. XX стагоддзя было пакідаць старэйшых дзяцей даглядаць маленькіх [1, с. 189 – 190]. У XX стагоддзі распаўсюджанне атрымалі дзіцячыя садкі і яслі. Аднак, па розных прычынах, бацькі пакідалі дзяцей і на старых бабуль і на старэйшых дзяцей. Традыцыйныя нормы, якія рэгламентавалі адносіны дарослых з дзецьмі мелі дваісты, амбівалентны характар, бо яны, з аднаго боку, прадпісвалі вельмі клапатлівыя, уважлівыя, спагадлівыя адносіны дарослых да дзяцей і асуджалі жорсткасць ці грубасць у адносінах да іх, з другога – выказвалі даволі нізкую сацыяльную каштоўнасць дзяцей да 6 – 7 гадоў [2, с. 24].

Такім чынам, у бытавых умовах гадавання дзяцей на тэрыторыі Падзвіння на працягу з XIX да пач. XXI стагоддзя адбыліся значныя якасныя змены, што з'яўляецца натуральным. Здзіўляе тое, што некаторыя метады, прыёмы догляду за дзецьмі засталіся амаль некранутымі за такі значны прамежак часу. Звязаныя з доглядам дзяцей забабоны, прыкметы, забароны не зніклі і ў XXI стагоддзі, яны працягваюць існаваць і перадавацца сярод насельніцтва Беларускага Падзвіння. Застаючыся прафаннай, перыферыйнай сферай дзяцінства ў побыце беларусаў, захоўвае шмат аархаічных, традыцыйных элементаў. Асаб-

ліва гэта заўважна ў адносінах да малодшай узроставай групы, пакуль дзіця не ўключана ў афіцыйныя, калектыўныя формы грамадскіх адносінаў, якімі з'яўляецца сістэма дашкольнага і школьнага выхавання, а знаходзіцца ў сям'і.

ЛІТАРАТУРА

1. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / прадм. У.К. Касько. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
2. Ракава, Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай весцы / Л.В. Ракава. Мінск: Ураджай, 2000. – 111 с.
3. Аверьянова, Н.И. Вскармливание ребёнка первого года жизни: учеб. пособие / Н.И. Аверьянова, А.А. Гаслова. – Ростов н/Д: Феникс, 2007. – 192 с.
4. Беларусы / В.К. Бандарчык [і інш.]; рэдкал.: В.К. Бандарчык [і інш.]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 5: Сям'я. – 375 с.
5. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. VI: Игры и игроки / Н.Я. Никифоровский // Этнографическое обозрение. – М., 1897. – № 3. – С. 21 – 66; Очерки Витебской Белоруссии. II: Дудар и Музыка // Этнограф. обозр. – М., 1892. – Кн. 13 – 14. – № 2 – 3. – С. 172 – 174.
6. Гоптаревский, И. Надзор за крестьянскими детьми в страдную пору / И. Гоптаревский // Гродненские губернские ведомости. – 1905. – № 24. – 24 июня. – С. 6.

ТРАДЫЦЫЙНАЯ ДУХОЎНАЯ КУЛЬТУРА ПАДЗВІННЯ Ў МАТЭРЫЯЛАХ АРХІВА «БЕЛАРУСКАГА ЭТНАЛІНГВІСТЫЧНАГА АТЛАСА»

канд. філал. навук, дац. М.П. АНТРОПАЎ
(Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, Мінск)

Разглядаецца арэальная распаўсюджанасць народнай тэрміналогіі жніўнай абраднасці на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Канстатуецца супрацьпастаўленасць двух падзвінскіх арэалаў гэтага сегмента беларускай традыцыйнай духоўнай культуры – заходняга і ўсходняга, прычым якраз у заходняй канцэнтруецца найбольшая колькасць этналінгвістычных старажытнасцей. Магчыма, апошняе звязана з тым, што адзначаная тэрыторыя з'яўляецца, з аднаго боку, гістарычным крывічска-дрэгавічскім памежжам, а з другога – зонай шматвяковага славянска-балтыйскага этнакультурнага і этналінгвістычнага кантактавання.


Рукапісныя матэрыялы архіва «Беларускага этналінгвістычнага атласа» (далей БЭЛА), сабраныя ў асноўным па адзінай анкеце-апытальніку «Народная культура Беларусі»[1] ў 1984 – 1993 гады змяшчаюць значную колькасць сведчанняў з населеных пунктаў басейна Заходняй Дзвіны – Беларускага Падзвіння. Гэтаму вялікаму па тэрыторыі этнакультурнаму рэгіёну ў даследчыцкім плане «пашанцавала» значна менеў, чым, напрыклад, Палессю, (этна)лінгвістычная, фальклорная і ўласна этнаграфічная бібліятэкі якога налічваюць тамы і тамы манаграфій, атласаў і слоўнікаў, нарэшце многія сотні артыкулаў. Між тым падзвінская спадчына традыцыйнай духоўнай культуры ніяк не меншая і ў такой жа ступені адметная, што і тэрытарыяльна супрацьлеглая палеская, аб чым сведчаць як работы класікаў беларускай гуманітарыстыкі, а сярод іх, перш за ўсё М.Я. Нікіфароўскага і А.П. Сапунова, чыя выдатная праца «Рака Заходняя Дзвіна» пабачыла свет больш як стагоддзе назад [2], так і сучасныя даследаванні [3, 4].

Сціплым унёскам у адзначаным кірунку можа, як падаецца, быць аналіз падзвінскіх найменняў дажынальнай «барады» – пязжатага з адмысловымі мэтамі, абумоўленымі традыцыйнымі ўяўленнямі, пучка (касмыля) жыта, які пакідалі на полі. Як вядома, усе гэтыя найменні захоўваюць «культурную» семантыку. Прапанаваны аналіз падаецца тым больш актуальным, што картаграфаванне «бародных» намінацый раней ужо было здейснена: у 3 томе «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» (далей – ЛАБНГ) сярод вельмі нешматлікай колькасці карт, якія адлюстроўваюць лексічныя асаблівасці традыцыйнай народнай духоўнай культуры, змешчана наступная [5, карта № 270] і разгорнуты каментарый да яе [5, с. 97 – 98].

Геаграфія падзвінскай «барады» прадстаўлена на падставе матэрыялаў архіва ЛАБНГ, сабраных па пытанні № 2938 адпаведнай інструкцыі [6, с. 133]: «Я.[к] н.[азываўся] пязжаты касмык жыта, які пакідалі на полі: барада, лібарада, Іллі барада...». Тут картаграфаваны 6 найменняў і словазлучэнняў, зафіксаваныя ў 15 з 20 абследаваных населеных пунктах (усяго асобных фіксацый – 19): *барада, Богу барада,*

[1] Нязначна падкарэктыраваная мадыфікацыя вядомай спецыялістам праграмы «Народная культура Палесся», апублікаванай у [1, с. 47 – 49]. Частка матэрыяла збіралася таксама па праграме «Палескага этналінгвістычнага атласа» [1, с. 21 – 46].

каза, дажынкі, дзед, спарнѣ; не дыферэнцыраваны, г. зн. паказаны адным знакам як адзінкавыя 1 лексема з 1 пункта (паказаная як адзінкавая назва з Магуноў Пастаўскага р-на ў каментарыі адсутнічае): *рай*; у 5 н. п. назва не зафіксаваная. Карта з'яўляецца дастаткова інфарматыўнай; тым не менш яна дае толькі самае агульнае ўяўленне аб распаўсюджанні намінацый, звязаных з дажынальным абрадам і яго асноўным матэрыяльным атрыбутам[1] у Падзвінні.



Карта 1 (рэпублікацыя падзвінскай часткі). Барада (абрад у час жніва)

У архіве БЭЛА занатаваныя адказы на два віды пытанняў, звязаных з «барадой»: 1) праграмы «Палескага этналінгвістычнага атласа» (пытанне № 8 «Борода» падпраграмы VII. «Сев и жатва»: а) Как назывались колосья, которые при окончании жатвы оставляли в поле (*коза, борода, перепелица, дожинки, квитка* и т.д.). Сколько колосьев оставляли? Должны ли они были расти из одного зерна?; б) Что делали, оставляя «бороду»: связывали красной ниткой, надламывали, заплетали в косу, обкладывали горстями соломы или камнями; пропалывали, разрыхляли землю серпом; обливали водой; клали внутрь хлеб, соль и т. д.?) і анкеты-апытальніка «Народная культура Беларусі» (пытанне № 22: «Як называліся калосся, якія пры заканчэнні жніва пакідалі ў полі (напр., *барада*)? Што з імі рабілі?»). Відавочна, што першая група пытанняў арыентуе збіральніка як на фіксацыю базавага абрадавага наймення, так і на апісанне ўласна абраду, тады як «кароткая» праграма скіравана амаль выключна ў лінгвістычны бок, і хаця другое пытанне ўсё ж такі мае на ўвазе пэўныя этнаграфічныя сведчанні, аднак як раз гэты бок прадстаўлены ў матэрыялах спарадычна.

Усяго ў архіве захоўваюцца звесткі, сабраныя ў 93 н. п. 16 раёнаў Беларускага Падзвіння[2], але для мэтаў картаграфавання частка пунктаў, якія рэальна знаходзяцца на невялікай адлегласці адзін ад другога, аб'яднаная, таму на картах яны прадстаўлены 52 пазіцыямі. Такім чынам, у параўнанні з картай ЛАБНГ гаворка ідзе пра фактаграфічную базу, якая большая ў некалькі разоў.


Зразумела, асноўнай і найбольш частотнай назвай з'яўляецца адлюстраваная на пададзенай ніжэй карце 2 [барада] і яе дэмінутывы: *барада, бародка, барадёнка*. Звяртаюць на сябе ўвагу два згушчэнні назвы – на захадзе і ўсходзе, прычым канцэнтруюцца непасрэдна ў прыдзвінскіх мікраарэалах.

Таксама з [барадой] звязаны змест наступнай карты 3, але тут асноўнае найменне, пададзенае размытай заліўкай, мае аб'ектныя ці атрыбутыўныя пашыральнікі – своеасаблівыя этналінгвістычныя дэтэрмінатывы: *Богу барада* (Панкры Гарадоцкага р-на), *Богу на бараду* (Філіпенкі Шумілінскага р-на), *Пятрова барада* (Манякова Мёрскага р-на), *Иванава барада* (Саўчанкі Віцебскага р-на), *барада хазяіна* (Пад'яльцы Мёрскага р-на, Саўчанкі), *барада казла* (Вярхоўе Віцебскага р-на). Не можа не выклікаць цікаўнасці канцэнтрацыя падобных словаўтварэнняў у віцебскай зоне, хаця стракатасць іх пашыральнікаў (кожны раз асобнага!) не дазваляе пакуль высунуць ніякіх слушных гіпотэз ні аб распаўсюджанасці, ні адносна іх магчымай генетычнай звязанасці.


---

[1] Падрабязна аб «барадзе» на шырокім славянскім фоне [7, с. 231 – 234].

[2] *Бешанковіцкі* (5/4: 5 н. п., 4 пазіцыі на карце): Берастні, Камоскі, Лабачова, Плісы, Ульянаўка; *Браслаўскі* (9/6): Азяраўцы, Альшанка, Дрысвяты, Дуброўка, Ельня, Зарачча, Плюсы, Урбаны, Шамялі; *Верхнядзвінскі* (1/1): Ляшчылава; *Віцебскі* (12/7): Будзянка, Вярхоўе, Друкава, Камары, Кароўка, Мішкуры, Мяклава, Парэчча, Пухавічы, Саўчанкі, Слабада, Тарасенкі; *Гарадоцкі* (6/3): Віроўля, Паганяліна, Панкры, Панкры Малыя, Скрыпкі, Цемнікі; *Глыбоцкі* (9/5): Бычкова, Бялевічы, Галубічы, Глыбокае, Лавішкі, Канстанцінава, Карабы 2-я, Свіла 2-я, Стрынадкі; *Докшыцкі* (1/1): Несцяроўшчына; *Лепельскі* (8/2): Батуколава, Гаравыя, Двор-Суша, Завадзіна, Завозер'е, Загорцы, Замошша, Суша; *Лёзненскі* (11/3): Вялікае Сяло, Гушчыно, Забалацце, Замошша, Красыні, Лёзна, Смародзіна, Старасселле, Стасева, Чарнаручча, Шавялі; *Мёрскі* (10/5): Восцевічы, Кісялі, Клімяты, Манякова, Пад'яльцы, Перабродзе, Ракуны, Сачыўкі, Супоніца, Туркава; *Пастаўскі* (5/4): Васевічы, Казлоўшчына, Кубаркі, Навасёлкі, Семянец; *Полацкі* (3/3): Завозер'е, Шлюбаўшчына, Шпакаўшчына; *Расонскі* (2/2): Марыніца, Янкавічы; *Сенненскі* (1/1): Рубежніца; *Шаркоўшчынскі* (3/2): Астраўляне, Рачкі, Сасноўцы; *Шумілінскі* (7/3): Грудзінава, Захарава, Обаль, Рассалом, Слудашы, Ферма, Філіпенкі.




Карта 2. [Барада]



Карта 3. [Барада] + аб'ект/атрыбутыў


Карта 4 паказвае распаўсюджанасць прэфіксальных назваў з коранем [-жын-], якія таксама накладзены на размытую заліўку «барады»: з прэфіксам *аб-*: *абжынкі*, *абжынак*; з прэфіксам *да-*: *дажон*, *дажынкі*; з прэфіксам *за-*: *зажынкі*. Безумоўна, супрацьпастаўленымі з'яўляюцца тут перыферыйная заходняя і паўднёвая фіксацыя, з'яднаныя, аднак, прэфіксам *аб-*, і ўсходнія з прэфіксамі *да-* і *за-*. Наяўнае прыцягненне большасці гэтых найменняў да межаў «бародных» арэалаў можа, відаць, сведчыць аб другаснасці ці субстытуцыянальным статусе гэтых найменняў, што цалкам зразумела, калі ўлічыць безумоўную тэндэнцыю да паступовага затухання традыцыі.



Карта 4. [Барада] + найменні з коранем [-жын-]


Наступная карта, на якой картаграфаваны менш частотныя найменні (хаця, напрыклад, [рай] мае столькі ж фіксацый, як і асноўны матыў папярэдняй карты), падаецца найбольш рэпрэзентатыўнай якраз для падзвінскага этнакультурнага рэгіёну. На самой справе, відавочныя (і да таго ж спалучаныя) асобныя арэалы найменняў, якія працягваюць [рай] – *рай, раёк* і [дзед] – *дед, дзед, дзядо́к*, у геаграфічнай сукупнасці з лексемамі з коранем [-спор-] утвараюць спецыфічную этналінгвістычную зону, якая супрацьпастаўлена не толькі ўсходнедзвінскай з адзінкавым [казлом] (*завязалі казла*: Вярхоўе Віцебскага р-на), але вылучаецца як асобная і ў агульнабеларускай этналінгвагеаграфічнай прасторы. Апрача дажынальнай «барады» *раем*, як вядома, называецца і дажыначная песня – намінацыя, хутчэй за ўсё, другасная і семантычна пераасэнсаваная. Безумоўную цікавасць разам са звычайнымі «сінгулярнымі» кантынуантамі [дзед] выклікае найменне *дзядо́к* (Бялевічы Глыбоцкага р-на), якое не можа не асэнсоўвацца ў кантэксце памі-

нальных алюзій. Некаторай варыятыўнасцю адзначаюцца лексемы з коранем [-спор-]: *спарк'іш*, *спарынѣ*, *спарыннѣ*, *спарына́*. Асноўны арэал распаўсюджання намінацый [казёл, каза] – Заходняе Палессе, таму з'яўленне аналагічнай лексемы ў складзе словазлучэння ў крывіцкай зоне можа быць вынікам больш позніх уплываў альбо культурнай міграцыі.



Карта 5. Малачастотныя найменні

Апошняя карта сінтэзуе прадстаўленыя вышэй матэрыялы: на «бародны» фон (асобны абрадавы тэрмін і словазлучэнні з ім) накладзены астатнія групы, аднак найменні з коранем [-жын-] не дыферэнцыруюцца. Менавіта гэты картаграфічны варыянт падаўся найбольш прыдатным для маніфестацыі распаўсюджання ў Падзвінні абрадавай тэрміналогіі, звязанай з дажынальнымі прадметамі, якія сімвалізуюць заканчэнне жніва. Можна, безумоўна, канстатаваць відавочную супрацьпастаўленасць двух падзвінскіх арэалаў гэтага сегмента беларускай традыцыйнай духоўнай культуры – заходняга і ўсходняга, прычым якраз у заходняй канцэнтруецца найбольшая колькасць этналінгвістычных старажытнасцей. Магчыма, апошняе звязана з тым, што адзначаная тэрыторыя з'яўляецца, з аднаго боку, гістарычным крывічска-дрэгавічскім памежжам, а з другога – зонай шматвяковага славянска-балтыйскага этнакультурнага і этналінгвістычнага канактавання.



Карта 6. Намінацыі дажынальнай «барады» ў Падзвінні

ЛІТАРАТУРА

1. Полесский этнолингвистический сборник. – М.: Наука, 1983. – 287 с.
2. Сапунов, А.П. Река Западная Двина. Историко-географический обзор / А.П. Сапунов. – Витебск, 1893. – 512, XXII с.
3. Традыцыйная мастацкая культура Беларусі: у 6 т. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – 910 с.
4. Полацкі этнаграфічны зборнік: у 2 ч. / склад. А.У. Лобач, У.С. Філіпенка. – Новаполацк: ПДУ, 2006. – Вып. 1: Народная медыцына беларусаў Падзвіння. – 148 с.
5. Лексічны атлас беларускіх народных гаворак. – Мінск: ФФД Рэсп. Беларусь; М-ва архіт. і буд-ва, 1996. – Т. 3: Чалавек. – 115 с.; 293 карты.
6. Інструкцыя па збіранню матэрыялаў для складання лексічнага атласа беларускай мовы. – Мінск: Навука і тэхніка, 1971. – 164 с.
7. Терновская, О.А. «Борода» / О.А. Терновская // Славянские древности. Этнолингвист. словарь; под ред. Н.И. Толстого. – М.: Междунар. отношения, 1995. – Т. 1. – 584 с.

НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА СТАРАВЕРАЎ ПАДЗВІННЯ
(НА АСНОВЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ПАЛЯВЫХ ЭТНАГРАФІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ)

Ул.Я. АЎСЕЙЧЫК
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

На аснове палявых этнаграфічных даследаванняў разглядаецца народная медыцына рускіх старавераў Беларускага Падзвіння. Прыходзім да высновы, што сярод старавераў Падзвіння яшчэ і сёння досыць шырока распаўсюджаны некаторыя традыцыйныя сродкі і спосабы лячэння. У першую чаргу гэта датычыць лячэння так званых «народных» хвароб («рожа», «упуд», «зглаз», «валаснік»), з якімі, як лічыцца, не можа справіцца афіцыйная медыцына.

Сярод усіх элементаў традыцыйнай культуры асаблівае месца займае *народная медыцына*, якая не згубіла сваёй актуальнасці і ў наш час. У этналагічнай навуцы пад народнай медыцынай разумеюць «сукупнасць эмпірычна набытых народам ведаў пра гаючыя сродкі, лекавыя травы і гігіенічныя навыкі, а таксама іх практычнае выкарыстанне для зберажэння здароўя, папярэджання і лячэння хвароб» [1, с. 344]. У адрозненні ад медыцыны сучаснага індустрыяльнага (постіндустрыяльнага) грамадства народная медыцына вызначаецца адсутнасцю спецыяльных устаноў, а прыёмы дыягностыкі і лекавання хвароб у традыцыйным грамадстве характарызуюцца сімбіёзам рацыянальнага вопыту, набытага эмпірычным шляхам, з рэлігійна-магічнымі дзеяннямі і абрадамі, што вынікала з асаблівасцяў міфапаэтычнай свядомасці. Таму адной з важных адметнасцяў народнага лекавання было выкарыстанне сімвалічных (магічных) спосабаў.

Народная медыцына – гэта не толькі асобная частка традыцыйнай культуры, але і адна з формаў інтэрпрэтацыі свету. Такім чынам, рэканструюючы гэту вобласць духоўнай культуры, мы робім больш адноўленай агульную карціну свету, што дазваляе больш якасна і поўна характарызаваць іншыя элементы традыцыйнай культуры. Таму даследаваць гісторыю і культуру пэўнага этнасу ці этнічнай групы, а ў нашым выпадку старавераў Падзвіння, немагчыма без аналізу гэтага элемента традыцыйнай культуры.

Народныя спосабы і сродкі лячэння ў жыцці старавераў адыгрывала важную ролю яшчэ ў другой палове XX стагоддзя, пра што сведчаць палявыя этнаграфічныя матэрыялы. Такое шырокае выкарыстанне народных сродкаў лячэння ў стараверскім грамадстве тлумачыцца не толькі малой колькасцю ўрачоў і медыцынскіх устаноў, але і іх ізаляваным і адасобленым ад знешняга свету ладам жыцця. Нежаданне мець зносіны з іншаверцамі і па магчымасці менш судакранацца з «антыхрыставым» светам доўгі час не дазваляла старавераам звяртацца за дапамогай да ўрачоў. Гэта зрабіла народную медыцыну старавераў яшчэ больш унікальнай і каларытнай. Па гэтай прычыне ў ёй аж да нашага часу захавалася шмат архаічных рысаў.

Народная медыцына ўключае не толькі веды пра сродкі і спосабы лячэння і папярэджванне хвароб, але і веды адносна саміх хвароб. Ва ўмовах традыцыйнага грамадства адной з важных асаблівасцяў быў падзел усіх хвароб на «натуральныя» (якія абапіраюцца на натуральныя падставы, маюць пад сабой жыццёвыя, натуральныя выпадкі) – тыя, што могуць лячыцца дактарамі і на «звышнатуральныя» (прычынай якой маглі стаць дзеянні звышнатуральных варожых сілаў ці чалавека) – тыя, якія дактары не лечаць [2, с. 19, с. 20]. Падобныя ўяўленні сярод старавераў Падзвіння захаваліся і да нашага часу: «Есць балезні врачэбныя, а есць народныя, дык усякія. Бываіт чалавек балеіт, а хто знаіць, я ж ні знаю, какая ў яго балезнь. А можа яна врачэбная. Тока рожа, упуд лечацца»[1].

Такое размежаванне хвароб і выдзяленне тых, што не лечаць урачы, прадугледжвала існаванне і спецыялістаў, якія ў першую чаргу займаліся іх лячэннем – *знахароў*. З аналізу палявога этнаграфічнага матэрыялу можна меркаваць, што знахарскія практыкі былі і застаюцца досыць распаўсюджанымі сярод стараверскага насельніцтва Падзвіння. Такой сітуацыі, акрамя прыведзеных вышэй прычын, у немалой ступені паспрыяў той факт, што духоўныя настаўнікі старавераў не забаранялі гэтую дзейнасць (у адрозненні ад праваслаўных і каталіцкіх святароў): «Наш духоўны настаяцель, еслі знал что в абшчыне маюцца знахары, то толька добра пра іх гаварыў» [4, с. 31].

Пераважная большасць знахароў з ліку старавераў Падзвіння, што вынікае з палявых этнаграфічных даследаванняў, з'яўляюцца «навучанымі», г. зн. атрымалі свае здольнасці і веды ад некага. Так, вядомы браслаўскі знахар Меркур'еў Іларыён Іларыёнавіч атрымаў свае веды ад маці стараверкі [4, с. 32]. А Аляксеева Галіна Дзянісаўна пераняла веды і здольнасці ад свайго свёкра: «*А Вам эта адкуль дасталась?* Свёкр знал. Ён ужо тожа не гаварыл, толька две неделі пажыл і тада гаварыт, што вазьмі, перапішы. Я гавару дачка ж есць, дачке можа адлай. Ну яна ня любіць этава» [2].

Сярод старавераў Падзвіння падчас этнаграфічных экспедыцый не заўважана нейкіх абмежаванняў адносна таго, хто можа быць знахарам. Найбольш распаўсюджаным з'яўляецца меркаванне, што да-

[1] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Пазняковай Ф., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.

[2] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Аляксеевай Г.Д., 1929 г. нар., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.

памагаць людзям можа кожны, але толькі пасля спецыяльнага навучання: «Каждый могет, ну так там жа нада ўчыцца»[1]. Але веданне толькі самой замовы не гарантавала поспех у лячэнні: «Вот я вам скажу. Есць такія людзі, што яны знают. Вот у нас там есць, у Кукаўке, там Аксана такая. Яна маладая. Ну яна папала эту кніжку, можа гдзе купіла. Но загаварыць ня можыць, нет сілы ў яе такой. Ну вот яна прачытаіць так, ну чалавеку не памагаіт. Я гавару, у цябе ж ёсць эта кніжка, чыво ты прыходзіш? Ну ні памагаіт. І патом другая ей тожа. Эта нада на чалавека, каторый можыт проста энергіяй, я ні знаю»[2].

Моцныя знахары, згодна ўяўленням старавераў Падзвіння, маглі дапамагаць нават на значнай адлегласці: «Я ні знала, што я магу загаварываць за глаза. Вот, напрымер, я тут загаварываю, а нехта ў Мінске ці ў Віцебске. Ну вот, у нас у Мінске вучыўся малец. І тожа была ў его рожа. Вечарам прыйшоў бацька. А нада да захада сонца загаварываць. І он гаварыт, а я ні знаю што дзелаць. Баліць нага ў евонага сына, ён ужо с кастылямі ходзіць, знаіць што рожа там, но людзі ні знаюць как загаварыць яго. А я гавару, што ўжэ сонца зашло, я свінням давала ў хляву якраз. Ну і гавару, папробую, загаварю на этат вецер. Ну, стала загаварываць, ён ужо пайшоў, ужо сонца зайшло, стала загаварываць на ўліцы. Ну я ні знаю. Думаю: ну вот эта было вечарам, а тады ўжо ўтрам буду загаварываць. Утрам устаю загаварываць, загаварыла. Ну і вечарам мне ешчэ нада загаварыць. А в абед прыхажу, а вот такая бальшая, как есць банкі, канфет стаіць. Хто паставіл і чыво стаіць? Аж эта прышла ягоная матка і яна кароў даіла і паставіла. І гаворыць: «Ай, Галячка, ужо ні нада, ужо яму, ён ужо сідзел на крыльцэ, нага балела, как та ж стала». Нада ў канцы загавара пафукаць і тры раза плюнуць чэраз левае плячо. А, гаворыт, в эта врэмя как я фукала, па ім вецер пайшоў, ён у Мінске. Вот эта первый раз был, вылечылся. А патом дзевачка з Лужок, і яна в Гродне, на заочна ўчылася, здавала экзамены там. І тожа ей так случылася, і тожа памагло. Два раза. Дык я знаю, што магу за глаза загаварываць»[3].

Важным сродкам для лячэння захворванняў у арсенале знахара з'яўляецца ***замова*** («загаворы», «малітвы», «малітвцы», «сціхі»). Замова з'яўляецца не простым наборам слоў, а вельмі важным сродкам магічнага ўздзеяння, магічнай формулай. Таму адносна яе выкарыстання і перадачы існавала шмат розных рэгламентацый і забаронаў. Так, сярод стараверскага насельніцтва існавала меркаванне, што нельга прамаўляць замову пабочнаму чалавеку. Гэта магло прывесці да страты сваіх здольнасцяў: «*А вот вы не расказываеце саму замову?* Ну, не. *А чаму?* Ну, ні памагаіт. *Патом ні будзіт памагаць, еслі каму раскажыце?* Да»[4]. «Еслі ты перадал свой загавар, то ўжо ты не далжон упатрэбляць. Еслі свой загавар передал, то ўжо ты далжон не работаць»[5]. «Не, я не магу расказаць. Нічога эта я не магу вам пра эта... Патаму што мне нада ішчо ўнукаў, праўнукаў. Дзелаю сама ваду»[6]. Таму, нават, каб навучыцца гэтай справе перадавалі толькі перапісаныя замовы: «Мая дочынька сільна ўпугу баялася, і я трыцаць кіламетраў атсюды хадзіла. Туда пашла, такой был дзядуля. І дзядуля сам мне не перадал, а напісал тока ў запіску. Сам не перадал, не гаварыл, а напісал і малітвы нада, какое ўсё. Эта я спісала ўсё, прынясла дамоў»[7]. Існуе меркаванне, што перадаваць веды можна толькі калі і табе перадаюць нейкія пэўныя веды: «Дык вот еслі даеш адзін аднаму, а другой табе даёт, то эта можна»[8]. Што ж датычыцца асобаў, якім перадаюцца знахарскія веды, то ў цяперашні час сярод старавераў Падзвіння не назіраецца такой прынцыповасці і строгай рэгламентацыі: «*А каму вот перадаюць сваі знанія? Старшым, младшым?* Всё равно»[9]. Аднак і сёння сустракаецца меркаванне, што нельга перадаваць веды старэйшаму за сябе чалавеку: «*А перадаецца любому чалавеку?* Малодшаму, старшаму нільзя сібя»[10].

Замоўны рытуал патрабуе выканання шэрагу абавязковых працэдур. Перад замовай неабходна прамовіць спецыяльную малітву. Сярод старавераў Падзвіння сустракаецца такі яе варыянт: «Господи Исуси Христе сыне Енинародного без начального твоего отца. Ты рикал Прочистоми устами твоими. Яко без миня не можете творити ничтоже. Господи мой господи вераю обем в душе моей. И сердце табою радчёного. Пропадаю твоей благости, помоги мне грешной ене дел мною начинаемое о небе совершица. Аминь, Аминь, Аминь» [5[11]]. Сама замова можа прамаўляцца на балючае месца (часцей за ўсё пры «рожы»), ваду, соль, хлеб, муку, крухмал. Пры розных варыянтах замаўлення замова застаецца адной і той жа: «Есць людзі і на соль [замаўляюць – А.У.], а как загаварывают рожу, на крухмал ілі на муку. Таксама адзінакавы

---

[1] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Басаковай П.Е., 1930 г. нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[2] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Аляксеевай Г.Д., 1929 г. нар., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
[3] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Аляксеевай Г.Д., 1929 г. нар., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
[4] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Аляксеевай Г.Д., 1929 г.нар., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
[5] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Гаўрылавай Т.Е., 1938 г.нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[6] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Басаковай П.Е., 1930 г.нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[7] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Басаковай П.Е., 1930 г.нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[8] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Аляксеевай Г.Д., 1929 г. нар., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
[9] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Аляксеевай Г.Д., 1929 г. нар., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
[10] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Пазняковай Ф., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
[11] Тэкст прыводзіцца ў адпаведнасці з арыгіналам з захаваннем усіх яго асаблівасцяў.

загавор»[1]. У працэсе замаўлення важным быў час, калі адбываўся рытуал: «А вот падучую балезнь [эпілепсію – А.У.] лечыл толька на ісход месяца»[2]. «А нада да захада сонца загаварываць [рожу – А.У.]»[3].

Адной з самых цяжкіх хвароб стараверамі лічылася **«рожа»**. Рожа праяўляецца ў выглядзе пухліны: «Апухніт усё. Во раз на ліцу была, мыцца вадой нільзя было. А я памылася – глазы все аслеплі»[4]. Як лічылася, прычынамі рожы могуць быць розныя: «*А рожа ад чаго можыць быць?*» «Ана раздуіт ні с чаво. С ветра могет быць яна, эта рожа... Ну тожа, спужаешся, і с ветру бывает, і с прастуды, гдзе с-за ўгла хваціт»[5]. Згодна народнаму перакананню, рожу могуць вылечыць толькі знахары. Старавераскае насельніцтва даволі скептычна ставіцца да магчымасці вылечвання гэтага захворвання афіцыйнай медыцынай: «Врачы тока рэжут тады. Можа ж памогят как яны, дык тамака могет сгніць»[6]. Стараверам Падзвіння вядома дванаццаць відаў «рож». Як лічылася, толькі веданне ўсіх іх гарантуе поспех пры лячэнні: «*А сколька рож бываіт?* «Двінац-цаць» [далей інфарматар пералічыў толькі адзінаццаць відаў]. «*А какія ані?*» «Вот ана калдуніха, скуліха, падгубная, падзубная, ліцавая, патом ручная, нажная, патом касцяная, калючая, балючая, жгучая... Некаторыя знают чатыры рожы. Так вот еслі пападзёт на эці чатыры рожы, так эта паможыт, а еслі нет. Нада двінаццаць»[7]. Лячылі рожу спецыяльнай замовай. Замоўны рытуал патрабуе трохразовага паўтарэння ў адпаведныя моманты часу: «Рожу загаварывают тры раза но па дзевяць раз. Первы раз дзевяць, напрымер вот утрам і вечарам, і на заўтра ўтрам. Ілі вечарам, утрам і апяць вечарам»[8].

Адметнае месца ў знахарскай практыцы стараверaў Падзвіння займала лячэнне **«упуду»** і **«сглазу»**. Спецыфіка гэтых «хвароб» праяўляецца ў тым, што афіцыйнай медыцынай яны не дыягназуюцца, а таму і не лечацца: «А што врачы с упуду? Яны нічога с упуду ні памагают»[9]. Згодна з народнымі ўяўленнямі, «упуд» і «сглаз» могуць прывесці да дрэнных наступстваў – цяжкага захворвання і нават смерці: «С упуду цяжкая балезня прыключаецца»[10]. «С упуду ўсякая балезня, с удару. Вот с чаго ракі [рак (хвароба) – А.У.], вот эта с упуду, еслі спужаішся. Абізацельна могіт, ежэлі ня вылечыш этай вадой». «*І эта можыць быць любая балезнь с упуду?*» «Да, любая балезнь»[11].

Яшчэ адной «народнай» хваробай з'яўляецца **«валаснік»** (гнойны нарыў на пальцах, прычынай якога лічылася пранікненне ў палец «воласа»). Для лячэння «валасніка», акрамя замоўнай практыкі, выкарыстоўвалі і фітатэрапію: «Валаснік. Да, эта травы валасніку памагают какія-та, загаворы. Загаварывает валаснік, знаіш хто, Яўменіява матка, Фядосія валаснік загаварывала. У мяне палец выбалеўшы. Врачы хацелі палец атрэзаць мне. І я ня дала атрэзаць ім... Рабёнак спаў у хаце, а я пад сцяной шэсць нядзель гвалту і гвалту крычала. Пайшоў малец к этай Фядосіі і загаварыл, прынёс мне травы. Спарыла травы і стала к пальцу прыкладаць. І палец не атрэзалі»[12].

Вельмі цяжкай хваробай, лячэннем якой займаліся толькі вельмі моцныя знахары, з'яўляецца **«падучая»** (эпілепсія). Яе лячэнне прадугледжвае вельмі складаны рытуал: «Ну эта сціхамі [замовамі – А.У.] ні атдзелаешся. Ён спецыяльна дзелаў сціх сціхамі гаварыл. Вот чалавека бярот, он кладзёт бальнога вот так на шубу. Тады цягнуць яго, загаварывают у галавы і нагах. І тады цягнуць да дзвярэй, рост атмяраюць так во ножыкам. І тады во шэпчут там і забіват какіе-та колікі асінавыя. Эта падучая балезнь, нада очэнь многа знаць»[13].

Адной з захворванняў стараверамі лічылася **п'янства**. Нягледзячы на той факт, што большасць стараверaў Падзвіння вызначалася рэгламентаваным спажываннем алкаголю, і ў гэтым плане яны больш выгодна выглядалі, чым мясцовае беларускае насельніцтва [6, с. 24; 8, с. 204], усё ж празмернае ўжыванне алкагольных напояў назіралася і ў іх асяродку [7, с. 286]. Для лячэння п'янства выкарыстоўваліся спецыяльныя лекавыя сродкі, прыгатаванне якіх спалучалася з прамаўленнем адпаведнай замовы. Так, для лекавання гэтай хваробы маглі выкарыстоўваць настой вады на вяроўках, якія былі завязаны на нагах у пакойніка: «Те веровки катория были завязаны на ногах у мужчины покойника сполосните в воде и наговорите эту воду дайте пьющему мужчине. Читают так: Как пакойник (имя мертвого) не пьет, так бы и раб Божий (имя) не пил. Аминь» [5]. Існавалі і іншыя спосабы лячэння: «Живую рибину опустите в спиртное и сразу выньте. Нагаварив дайте выпить пьяницы. Как это рибина трепещица в водке, так бы

[1] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Гаўрылавай Т.Е., 1938 г. нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[2] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Пазняковай Ф., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
[3] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Аляксеевай Г.Д., 1929 г. нар., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
[4] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Трафімавай Е.М., 1928 г. нар., в. Ніўнікі Міёрскага раёна.
[5] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Басаковай П.Е., 1930 г. нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[6] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Басаковай П.Е., 1930 г. нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[7] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Аляксеевай Г.Д., 1929 г. нар., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
[8] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Аляксеевай Г.Д., 1929 г. нар., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
[9] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Басаковай П.Е., 1930 г. нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[10] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Гаўрылавай Т.Е., 1938 г. нар.. в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[11] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Басаковай П.Е., 1930 г. нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[12] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Басаковай П.Е., 1930 г. нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[13] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Пазняковай Ф., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.

дрончала душа у раба Божиего (имя) когда увидит водку. Аминь» [5]. Некаторыя са спосабаў лячэння гэтай хваробы былі строга суаднесены з пэўнымі часавымі прамежкамі: «Помоч такой беде можно 13 апреля. Возмите серий камешок из ручайка левой рукой несите его в дом молча и неоглядоваесь. Дома положите в холодное питьё и скажите. Как данный камень воды не пёт так и (имя) водки не запьёт. Аминь» [5].

Акрамя замоўнай практыкі для лячэння маглі выкарыстоўваць і іншыя сімвалічныя дзеянні. Так, лічылася, каб вылечыць **«хохліч»** (коклюш) трэба было некалькі разоў аб'ехаць з хворым вакол могілак: «Хохліч вылячалі – кругом магілы вазілі рабёнка. Тры разы нада была, ілі дзевяць раз кругом магілак. І вот на каню вазілі как-та да сонца. Ну хохліч такая, што ён забівал рабёнка кашлем»[1]. Каб пазбавіцца ад **«калтуна»** (спляценне валасоў, што выклікае боль у галаве), згодна народным уяўленням, нельга бы-ло карыстацца нажніцамі ці нажом. У такім выпадку яго «адбівалі» камнем: «На камні атбівалі, стрічь ня можна. А палажыць на камень валасы балючыя і камнем другім атбіваць. Ну што б ні ножыкам, ні нажнямі»[2].

Значную ролю ў народнай медыцыне стараверaў Падзвіння адыгрывалі лекавыя сродкі расліннага паходжання. Пераважна яны выкарыстоўваліся для лячэння прастудных захворванняў: «Прастыніш – эта нада лякарства, травы піць, сабірают»[3]. Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца маліннік, бруснічнік, зверабой, рамонак, шыпшына: «Ну, ат кашлю маліннік там п'юць, алі ж не садавой, а палявой, куставой»[4]. «І маліннік і бруснічнік ат кашлю, рамашка, зверабой, шыпоўнік»[5]. Часам выкарыстоўвалі травы і для лячэння больш сур'ёзных захворванняў (пра лячэнне эпілепсіі глядзі вышэй).

Народная медыцына з'яўлялася адной са сфер актыўнага міжэтнічнага ўзаемадзеяння рускіх стараверaў і мясцовага беларускага насельніцтва Падзвіння. Досыць пашыранай з'явай быў зварот беларускага праваслаўнага і каталіцкага насельніцтва за дапамогай у лячэнні хвароб да знахароў-стараверaў: «Вот былі такія людзі, каторыя давалі ваду ат іспугу. Вот яна жыла вот в этай дзярэўні. І ана давала гэту ваду с глазу, ат іспугу. І гэта яна памагала» «*Яна стараверка?*» «Ага, яна памагала» «*А вот яна і праваслаўным памагала?*» «Усем-усем, хто абрашчаўся ўсем, а как жа»[6]. Часам і стараверскае насельніцтва звярталася за дапамогай да беларусаў: «Тады пашла, чалавек адзін быў, ён памёр, загаварыл два раза і прашло... А рожу загаварываў мужчына баальшой такой, палячок[7] такой»[8].

Шырокае прымяненне стараверамі знахарскіх практык для лячэння розных захворванняў стымулявала распаўсюджванню сярод мясцовага беларускага насельніцтва ўяўленняў аб іх чараўніцкіх здольнасцях: «У нас падрабляюць цыганы і маскалі, ад іх можа шкоды многа быць» [4, с. 29]. «Ого, гэтыя маскалі, яны ўсе чаруюць, гэта ў іх ад чорта» [4, с. 32]. «Мая суседка пасварылася з адным стараверам, а людзі казалі, што ён умее чараваць і калі яна ішла да хаты, то падвярнула нагу. Можа і ён падрабіў» [4, с. 31].

Пра моцныя чараўніцкія здольнасці дэструктыўнага характару стараверaў (асташоў[9]) ва ўяўленнях беларусаў Віцебшчыны пісалі яшчэ даследчыкі XIX стагоддзя Я. Баршчэўскі і С. Максімаў [9, с. 146; 10, с. 446]. Аднак такія ўяўленні былі характэрныя ў адносінах тых стараверaў, якія займаліся адрознымі ад сельскай гаспадаркі заняткамі (лоўля рыбы). Акрамя таго, у прыгаданых выпадках чараўнікамі выступаюць яшчэ і «прышлыя» («чужыя») стараверы, якія ўжо толькі па гэтай прычыне і незалежна ад канфесійнай прыналежнасці могуць надзяляцца такімі якасцямі. Што ж датычыць «мясцовых» («сваіх») стараверaў, якім ва ўмовах традыцыйнага грамадства хоць і прыпісваюцца звышнатуральныя (магічныя) здольнасці, але характарызуюцца значна лепш і часта вядомыя як добрыя знахары, што дапамагаюць людзям: «Стараверaў у нас лічылі за добрых знахароў і калі каму што балела ці здаралася няшчасце, то за дапамогай не баяліся прыходзіць і да стараверaў, хоць некаторыя і казалі што яны і шкодзяць» [4, с. 31]. «Ну часам і казалі што пра маскалёў, але ад звіху і ад вужакаў яны лечаць добра» [4, с. 32].

Стараабраднікі ў сваю чаргу прыпісвалі чараўніцкія здольнасці мясцоваму беларускаму насельніцтву, найперш каталікам: «Варожаць у нас на нядобрае толькі католікі» [4, с. 32]. «Каталікі хоць і дужа набожныя, але ўмеюць чараваць» [4, с. 32]. Але часам самі ж адзначалі, што аднаверцы куды больш абазнаныя ў гэтай сферы, чым мясцовае беларускае насельніцтва: «Мая мамка говоріла што в соседней абшчыне в Кіріліно жылі не хорошіе москалі, і оні часто подделывалі так, што в нашей деревне болела скотіна, так даже католікі не колдовалі» [4, с. 30].

Такім чынам, зыходзячы з матэрыялаў палявых этнаграфічных даследаванняў, можна зрабіць выснову, што сярод стараверaў Падзвіння яшчэ і сёння досыць шырока распаўсюджаны некаторыя «народныя» сродкі і спосабы лячэння. У першую чаргу гэта датычыць лячэння так званых «народных» хвароб («рожа»,

---

[1] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Гаўрылавай Т.Е., 1938 г. нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[2] Запісана ў 2008 г. Кавалёвай І. і Лупенько Т. ад Аляксеевай Г.Д., 1929 г.нар., в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
[3] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Трафімавай Е.М., 1928 г. нар., в. Ніўнікі Міёрскага раёна.
[4] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Басаковай П.Е., 1930 г. нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[5] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Гаўрылавай Т.Е., 1938 г. нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.
[6] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Шкляровай І.А., 1930 г. нар., в. Ніўнікі Міёрскага раёна (каталіцкага веравызнання).
[7] Так стараверскае насельніцтва называла мясцовых беларусаў, пераважна каталіцкага веравызнання.
[8] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Трафімавай Е.М., 1928 г. нар., в. Ніўнікі Міёрскага раёна.
[9] Асташы – рускія стараверы з Асташкаўскага павету Цвярской губерні, што займаліся рыбалоўствам.

«упуд», «сгаз», «валаснік»), з якімі, як лічылася, урачы не могуць справіцца. Папулярнасць і запатрабаванасць элементаў народнай медыцыны ў жыцці сучаснага грамадства яскрава характарызуе той факт, што нават дыпламаваныя ўрачы не адмаўляюць некаторыя «народныя» метады лячэння, у тым ліку і замоўную практыку (!): «Мы к адной жэншчыне ездзілі ў Бяляне. Там такая, умярла даўно. Дзелала ваду ат эпілепсіі. І вот ана гаварыт, ка мне прыехал врач с Браслава, усё запісал мой разгавор на магнітафон»[1].

ЛІТАРАТУРА

1. Мінько, Л. Народная медыцына / Л. Мінько // Этнаграфія Беларусі: энцыкл. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 344 – 345.
2. Філіпенка, У.С. Анатамічна-фізіялагічныя ўяўленні, этыялогія, прафілактыка і дыягностыка хвароб у сістэме народнай медыцыны беларусаў Падзвіння / У.С. Філіпенка // Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. / склад. А.У. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – Ч. 1. – С. 16 – 25.
3. Лобач, У.А. Народная медыцына беларусаў Падзвіння ў сучасным грамадстве / У.А. Лобач // Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. / склад. А.У. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – Ч. 1. – С. 58 – 64.
4. Навічонак, Я.Л. Магічныя практыкі на Браслаўшчыне ў другой палове XIX – XX стст: гісторыка-параўнальны і структурна-семантычны аналіз / Я.Л. Навічонак. – Наваполацк: ПДУ, 2005. – 44 с.
5. Сшытак з замовамі, атрыманы ад Пазняковай Ф. (стараверкі), в. Каралева Шаркаўшчынскага раёна.
6. Горбачевский, И.Д. Лепельский уезд Витебской губернии / И.Д. Горбачевский. – Витебск. 1895. – 38 с.
7. Hedeman, O. Historija powiatu Brasławskiego / O. Hedeman. – Wilno. 1930. – 434 s.
8. Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. – СПб., 1905. – Т. 9: Верхнее Поднепровье и Белоруссия. – 620 с.
9. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.
10. Максимов, С.В. Белорусская Смоленщина с соседями / С.В. Максимов // Живописная Россия. Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литовское и Белорусское Полесье: – Минск: БелЭн., 1994. – С. 429 – 472. – (Репринт. воспроизв. изд. 1882 г.).

АРХІТЭКТУРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ КУЛЬТАВАЙ ЗАБУДОВЫ ПОЛАЦКАГА БЕЛЬЧЫЦКАГА БАРЫСАГЛЕБСКАГА МАНАСТЫРА

Ю.А. АЎЧЫННІКАВА
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

У артыкуле разглядаюцца архітэктурныя асаблівасці страчаных храмаў Бельчыцкага (Барысаглебскага) манастыра – адной з найбольш старажытных і вядомых абіцеляў Полацкай зямлі. Чатыры манастырскія храмы: Барысаглебская царква, царква Св. Параскевы Пятніцы, Вялікі безназоўны сабор і храм-трыконх уяўлялі сабою комплекс унікальных помнікаў самабытнай Полацкай школы культавага дойлідства XII – XIII стагоддзяў.

На пачатку XII стагоддзя ў Полацку трывала ўсталявалася хрысціянская рэлігійная традыцыя, распачаўся працэс інтэнсіўнай культава-будаўнічай творчасці, пошукаў якасна новых, мясцовых выяўленчых структур. Аб гэтым сведчыла не толькі значная для сярэднявечнага горада колькасць асобных мураваных цэркваў (дасягала пяці), але і наяўнасць буйных храмава-архітэктурных комплексаў – трох праваслаўных манастыроў [1, с. 76; 2, с. 156]. Сярод апошніх – Бельчыцкі Барысаглебскі мужчынскі манастыр.

Заснаваны ў XII стагоддзі, манастыр у імя Св. Барыса і Глеба на працягу амаль васьмі стагоддзяў з'яўляўся не толькі адным з важных цэнтраў палітычных і культурна-рэлігійных працэсаў гарадскога жыцця, але і выдатным узорам самабытнай архітэктурнай спадчыны Полацкай школы дойлідства.

Манастыр сінтэзаваў у сабе як богаслужбовую, духоўна-абрадавую дзейнасць манахаў і святарства, так і спецыфічную арганізацыю іх сацыяльна-эканамічнага жыцця, гаспадаркі, штодзённага побыту. Таму, з'яўляючыся часткай гарадской забудовы, абіцель уключала розныя па сваёй сутнасці архітэктурныя кампаненты: у першую чаргу комплекс культавых пабудоў, акрамя таго жылыя, гаспадарчыя, пабытовыя будынкі, прыродныя элементы і інш. Гэтыя аб'екты знаходзіліся ў функцыянальным і мастацкім адзінстве, стваралі непаўторную архітэктурна-рэлігійную і культурна-эстэтычную якасць.

[1] Запісана ў 2008 г. аўтарам ад Гаўрылавай Т.Е., 1938 г. нар., в. Яўцерышкі Міёрскага раёна.

У склад культавай забудовы тэрыторыі Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра ўваходзілі мураваныя храмы першай трэці XII стагоддзя [3, с. 43]:

1) царква Св. Барыса і Глеба (Барысаглебская), разабрана ў 20-я гады XX стагоддзя;

2) царква Св. Параскевы Пятніцы (Пятніцкая), разабрана ў 20-я гады XX стагоддзя;

3) Вялікі безназоўны (ці Успення Прысвятой Багародзіцы) сабор, страчаны прыкладна ў XVI – пач. XVII стагоддзя;

4) храм-трыконх, страчаны да пачатку XVIII стагоддзя, рэшткі ўпершыню выяўлены ў 1790 годзе падчас будаўнічых работ.

Акрамя мураваных храмаў Бельчыцкаму манастыру ў XVII – XVIII стагоддзях належалі дзве драўляныя царквы:

1) Іаана-Багаслоўская (пабудавана на манастырскія сродкі ў 1769 г.);

2) Успення Прысвятой Багародзіцы (пабудавана на месцы страчанага каменнага Вялікага сабора каля 1615 года «иждевением кобацких мещан») [4, с. 39].

Да культавай забудовы абіцелі ў канцы XVIII – XIX стагоддзі далучаўся таксама буйны комплекс драўляных гаспадарчых будынкаў (цёплы манастырскі дом, узведзены каля 1773 года, жылыя памяшканні для работных людзей, двухпавярховы амбар, канюшанны хлеў, скотнік, гумно, ток, асець і інш.), вакол тэрыторыі абіцелі размяшчалася сінхроннае манастырскае паселішча [5, ф. 2904, воп. 1, спр. 1, а. 1 – 2; 1, с. 78].

Першапачаткова Барысаглебская царква Бельчыцкага манастыра, пабудаваная прыблізна ў 10-я – 20-я гады XII стагоддзя, уяўляла сабою трохнефавы крыжовакупальны шасціслуповы храм памерамі 8,3 × 15,5 м [3, с. 49]. Да сярэдзіны XIX стагоддзя царква Барыса і Глеба не зведала сур'ёзных зменаў свайго знешняга выгляду і архітэктурнай структуры.

Наўразбураны стан, у якім апынуўся будынак храма напачатку 50-х гадоў XIX стагоддзя, патрабаваў тэрміновых рамонтных работ. Частковая рэстаўрацыя была праведзена ў 1852 годзе. Да алтарнай часткі старажытнай сцяны была прыбудавана новая каменная рызніца, праз якую зроблены ўваход у царкву. Дах у выніку праведзеных работ атрымаў выгляд шатра на тры скаты з цыбулепадобнай галавой [6, ф. 2503, воп. 1, спр. 23, арк. 360].

У 1907 – 1908 гадах у Барысаглебскай царкве па ініцыятыве Віцебскай архіўнай камісіі быў распачаты новы этап капітальных рамонтна-рэстаўрацыйных мерапрыемстваў. Да будынка храма далучыліся новая апсіда і драўляны прытвор, адбылася замена растрэсканых каменных зводаў новымі драўлянымі; знутры сцены царквы былі пакрыты масленаю фарбаю, а звонку – тынкоўкай [7, ф. 2694, воп. 1, спр. 100, арк. 57]. Для агляду праведзенай рэстаўрацыі ў Полацк быў камандзіраваны член імператарскай Маскоўскай археалагічнай камісіі акадэмік П.П. Пакрышкін, які адзначаў, што ў выніку рамонтных работ былі страчаны старажытныя арыгінальныя архітэктурныя рысы царквы Барыса і Глеба і каштоўныя фрэскавыя роспісы XII стагоддзя [8, с. 33].

Дэталёвае навуковае апісанне і аналіз архітэктурнай структуры бельчыцкіх храмаў упершыню ажыццявіў выдатны археолаг М.М. Варонін. У 1929 годзе ён у складзе навукова-даследчай экспедыцыі Цэнтральных дзяржаўных рэстаўрацыйных майстэрняў распачаў вывучэнне рэшткаў на той час амаль цалкам разбураных манастырскіх цэркваў.

Па выніках праведзеных даследаванняў царква Барыса і Глеба з'яўлялася выцягнутай у плане пабудовай з шырокім прытворам і дзвюма парамі цесна пастаўленых, пляскатых лапатак на бакавых сценах, што адпавядалі размяшчэнню слупоў унутры. Прамежкі між лапаткамі былі заняты дзвюхступеннымі нішамі, дзе знаходзіліся старажытныя вокны, размешчаныя ў два ярусы: вялікія – у ніжнім ярусе, малыя – у верхнім [9, с. 122]. Разбор запаўнення старажытных вокнаў выявіў рэшткі суцэльнай сасновай дошкі з трохвугольнымі адтулінамі пасярэдзіне, што сведчыла аб наяўнасці на вокнах драўляных аканіцаў, звычайнага для XII стагоддзя тыпу: з круглымі адтулінамі са шклом пасярэдзіне і трохвугольнымі па баках [10, с. 5]. Аканіцы зашчапляліся дзвюма драўлянымі засаўкамі, што былі ўстаўлены ў гнёзды адхону аконных праёмаў. Месцы стыкаў аканіц з цаглянай муроўкай абмазваліся глінай, гэта рабілася з мэтай захавання цяпла [3, с. 49]. Акрамя таго, рэшткі невялікіх вокнаў размяшчаліся над паўночным уваходам у храм і на паўднёвай сцяне [10, с. 5].

Барысаглебская царква мела крыжовыя слупы, над прытворам храма размяшчаліся хоры на корабавым зводзе, але дзе знаходзіўся ход на хоры, вызначыць цяжка [10, с. 6]. Па сведчаннях гісторыка-краязнаўцы XIX стагоддзя К.А. Гаворскага «уваход на оныя (хоры) унутры, але ў старажытнасці быў звонку» [4, с. 39]. Цікавым з'яўляецца і пытанне аб наяўнасці ў храме старой алтарнай перагародкі ці каменнага іконастасу. К.А. Гаворскі прыводзіў звесткі аб існаванні гэтай часткі ўнутранага інтэр'еру царквы: алтарная перагародка была зроблена са старажытнай цэглы і мела тры адтуліны (для «царскай брамы», бакавых уваходаў і адну, уверсе над «царскай брамай», для іконы) [4, с. 39].

Царква Барыса і Глеба па сваёй архітэктуры была вельмі падобная да Спаскай царквы Ефрасіннеўскага манастыра, што дазваляе зрабіць выснову аб пабудове абодвух храмаў знакамітым полацкім дойлідам XII стагоддзя – Іаанам. Археолаг Л.В. Аляксееў сцвярджае, што Іаан быў вучнем кіеўскай будаўнічай арцелі, якая ўзвяла ў Полацку тры храмы-пахавальні князёў Усяславічаў (Георгіеўскую царкву,

Успенскі сабор Бельчыцкага манастыра, храм-пахавальню Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра). Згадкі Іаана ў «Жыціі Ефрасінні Полацкай» як «отче Иоанне приставник над делателями церковными» дазваляюць меркаваць, што ён з'яўляўся манахам, хутчэй за ўсё, менавіта Бельчыцкай абіцелі [11, с. 106].

Моцнае імкненне кіеўскай арцелі да вертыкалізму ў храмавым будаўніцтве было, відаць, блізкім Іаану, і, стаўшы кіраўніком самастойнай полацкай арцелі, ён увасобіў гэтае імкненне ў архітэктурных формах Барысаглебскай, Пятніцкай царквы Бельчыцкага манастыра і асабліва ў Спасскім храме Ефрасіннеўскага манастыра [11, с. 106]. Аднак, варта адзначыць, што ў дэкоруме і вынаходніцтвах некаторых канструктыўных частак Барысаглебская царква значна адрознівалася ад Спаскай. Так, Бельчыцкі храм меў паўкупальны пастамент, апрацаваны трохлопаснымі какошнікамі. Спецыяльная разбіўка бакавых сцен храма лапаткамі сведчыла аб моцна выдзеленай цэнтральнай вежы сабора, што не назіралася ў Спаскай царкве [3, с. 49].

Цэгла Барысаглебскай царквы была добра абпаленая, ярка-чырвонага колеру, памерамі (3 – 4,2× ×21×31 – 33 см) была пакладзена на вапняны рошчын ружовага колеру з вельмі тонка цёртым цагляным напаўняльнікам. Шоў паміж радамі цэглы складаў у сярэднім (3,5 см). Кладка сценаў храма ўяўляла сабою чаргаванне выступаючага і схаванага радкоў цэглы з ружова-жоўтым цэмяначным напаўняльнікам, шырынёй у 10 – 12 см паміж выступаючымі радамі [10, с. 7]. Іры гэтым «паласатасць» фасадаў царквы была павялічана суцэльнай размалёўкай цагляных радоў цёмнай, чырвона-карычневай фарбай [10, с. 8]. Асаблівы эфект надавала змяшчэнне расфарбаваных палос уступаў ніш аконных арак. Шурпатая тынкоўка паміж палосамі цаглін была апрацавана спецыяльным драўляным штампам, каб атрымаць выгляд каменнай муроўкі з туфу [3, с. 49]. Дзе-нідзе ў складзе рошчына, што пакрываў схаваны рад цэглы, трапляліся дробныя круглыя камяні – сведчанне сувязі прыёма чыста цаглянай кладкі з тэхнікай старажытнай змешанай муроўкі [10, с. 8].

Паводле І.П. Дэйніса, у 1959 годзе агляд падмурка Барысаглебскай царквы зрабіў археолаг Л.Д. Побаль. Ён таксама адзначаў своеасаблівую старажытную сістэму муроўкі гэтай часткі храма. Падмурак складаўся з камення, пакладзенага на вялікі пласт вапнянкі белага колеру, што сведчыла аб пабудове помніка не пазней XII стагоддзя. Аднак вынікі гэтых даследаванняў не былі ўключаны Л.Д. Побалем у справаздачы і публікацыі [12, ф. 1164, воп. 5, спр. 13, арк. 32].

Шырыня падмурка, узведзенага на жоўтым мацерыковым пяску, складала 1,4 м, таўшчыня культурнага пласта тут дасягала 0,5 м [13, ф. 1164, воп. 5, спр. 13, арк. 32].

Унутры Барысаглебскай царквы размяшчаўся ўваход у скляпенне, што было падведзена пад алтар. Па сведчаннях К. Гаворскага, у сярэдзіне XIX стагоддзя ў скляпеннях храма захоўваліся пахаванні мошчаў трох уніяцкіх архімандрытаў: двух Барысаглебскіх – Кесарыя Чудоўскага (кіраваў манастыром з 1790 па 1794 г.) і Ісайі Шулякевіча (кіраваў манастыром з 1794 па 1822 г.), а таксама ўладыкі Белацаркоўскага – Фёдара Суляцікага [4, с. 40].

Такім чынам, архітэктурныя асаблівасці будынка, старажытная сістэма кладкі сцен (са схаваным радам) і падмурка дазваляюць аднесці час узвядзення Барысаглебскага храма да 10-х – 20-х гадоў XII стагоддзя. На думку Л.В. Аляксеева, узвядзенне княжыцкага храма-пахавальні Барыса і Глеба ажыццяўляла будаўнічая арцель пад кіраўніцтвам полацкага дойліда Іаана [11, с. 106]. Перабудовы, рамонтныя і рэстаўрацыйныя работы другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя прывялі да моцнага змянення першапачатковага выгляду царквы, страты ёю непаўторных рысаў самабытнай Полацкай школы культавага дойлідства XII стагоддзя і каштоўных узораў манументальнага жывапісу. На пачатку 30-х гадоў XX стагоддзя царква Барыса і Глеба была амаль цалкам зруйнавана.

На паўночна-ўсходнім напрамку ад Барысаглебскага храма ў старажытнасці знаходзілася царква Св. Параскевіі Пятніцы [4, с. 40].

Самыя раннія згадкі Пятніцкай царквы Бельчыцкага манастыра ў пісьмовых крыніцах адносяцца да пачатку XVI стагоддзя. Так, Жалаваная грамата караля Жыгімонта І Івану Зяноўевічу Корсаку ад 1507 года ўтрымлівае наступнае: «...а в мещанке полоцкое... в месте Полоцком против церкви святое Пятницы... «Полацкая Рэвізія 1552 года сведчыць: «Церковь Святое Пятницы в месте, наданье от давъных часов мещан Полоцких» [1, с. 172].

Пазней (у 1576 г.) польскі храніст М. Стрыйкоўскі паведамляў, што на момант напісання «Літоўскай хронікі» Пятніцкі храм на Бельчыцы быў амаль цалкам разбураны [4, с. 40].

У 1670 годзе па ініцыятыве Барысаглебскага архімандрыта Кесарыя Чудоўскага былі распачаты будаўнічыя работы па ўзнаўленню царквы, дзеля чаго выкарыстоўваліся як старажытная плінфа і бут з руінаў, так і новая цэгла. Гэта выклікала ўзнікненне распаўсюджанага сярод гісторыкаў XIX стагоддзя памылковага меркавання, што Пятніцкая царква была пабудавана ў другой палове XVII стагоддзя [4, с. 40]. Версію такога позняга паходжання храма прапанаваў член Імператарскага Археалагічнага таварыства Г. Струкаў, які рабіў навуковы агляд будынка ў 1864 годзе [14, с. 46].

У 1919 годзе падчас баявых дзеянняў Грамадзянскай вайны на тэрыторыі Полацка, артылерыйскі снарад, які патрапіў у цэнтральную частку будынка, агаліў спецыфічную старажытную муроўку са схаваным радам, што дало магчымасць датаваць пабудову храма не пазней XII стагоддзя [3, с. 50].

У 1929 годзе археалагічныя даследаванні руінаў малой царквы Параскевіі Пятніцы праводзіў М.М. Варонін. Даследчык выявіў, што ў аснове пабудовы XVII стагоддзя знаходзіўся старажытны мАленькі храм XII стагоддзя, пашыраны прыбудовамі з захаду і ўсходу і пазбаўлены першапачатковай апсіды [10, с. 9]. Пры перабудове алтара, ва ўсходняй сцяне былі прабіты бакавыя ўваходы, а заходні фасад будынка даноўніла драўляная шатровая званніца над каменным прытворам [8, с. 38].

У 20-я – 30-я гады XX стагоддзя Пятніцкая царква ўяўляла сабою рэшткі вельмі вузкага і доўгага збудавання памерамі (5,10×19,75 м). У яго складзе яскрава выдзялялася паніжаная заходняя частка і алтар, што быў складзены з брусчатай цэглы XVII стагоддзя з дадаткам вялікай колькасці старажытнай плінфы. Сярэдняя частка будынка, абмежаваная па вуглах пілястрамі лапаткамі, з'яўлялася рэшткамі больш ранняга маленькага бясстоўпнага храма [10, с. 9]. Цэгла пабудовы была ярка-чырвонага колеру, вельмі добрага абпалу, памерамі (3,5×15 – 18×29 – 31 см). Сістэма кладкі адпавядала кладцы ў Барысаглебскім храме: на ружовам рошчыне вапны з дамешкай драбнёнай цэглы вызначаліся выступаючыя і заглыбленыя рады плінфы [9, с. 121]. «Паласатая» фактура, падкрэсленая расфарбоўкай выступаючых радоў цэглы на фасадах, унутры храма была перакрыта суцэльнай тынкоўкай таўшчынёй 0,5 – 1,5 см [10, с. 10].

Самая старажытная частка Пятніцкай царквы захавалася да 1929 года, цэнтральны ўваход у алтар заставаўся першапачатковым, апсіда была цалкам разбурана, але рэшткі дазволілі выявіць яе першасную форму – прамавугольную ў плане з аднаабломнымі лапаткамі па вуглах. Цікавым з'яўляецца той факт, што падобная форма апсіды амаль не сустракаецца ў іншых помніках старажытнарускага дойлідства XII – XIII стагоддзяў [10, с. 10].

Асноўны аб'ём Пятніцкай царквы быў невялікім (прамавугольнік памерамі 5,75×5,10 м) ён, як і апсіда храма, быў крыты корабавым зводам [10, с. 12]. Наяўнасць падземнай камеры (крыпты) пад усім будынкам царквы, акрамя алтара, сведчыла аб выкарыстанні храма ў якасці спачывальніцы. Магчыма, царква была пабудавана для пахавання заснавальніка Бельчыцкага манастыра полацкага князя Барыса Усяслававіча, які памёр у 1128 годзе. Падобныя маленькія надмагільныя храмы бясстоўпнага тыпу былі распаўсюджаны ў X – XII стагоддзях на тэрыторыі Балгарыі (так званыя «костницы») і Каўказа, што сведчыла аб сувязях полацкага дойлідства з архітэктурнымі традыцыямі гэтых краін [15, с. 183].

Цэнтральны аб'ём Пятніцкай царквы быў моцна выцягнуты ўверх, апсіда таксама была вельмі высокай: уваход у яе меў вышыню 6 м, што было ў 3,5 – 4 разы болей за шырыню храма. Нягледзячы на тое, што пабудова апускалася ў зямлю на 0,75 – 1 м, яе агульная вышыня дасягала 7 м [10, с. 13].

Мяркуючы па размяшчэнню фрэскавых роспісаў, Пятніцкая царква не мела бакавых уваходаў, адзіны – цэнтральны ўваход – размяшчаўся ў заходняй сцяне. Па бакавых сценах, адно над другім, знаходзіліся два акны, магчыма, і над заходнім уваходам было вакно другога яруса. Такім чынам, светлавыя вертыкалі па ўсіх чатырох сценах падкрэслівалі вышыню памяшкання. Першапачатковы аб'ём храма складаўся з трох частак: высокі чацвярык, да якога з усходу прымыкала ніжэйшая прамавугольная апсіда, а з захаду – вузкі прытвор. Усе часткі царквы былі накрыты драўлянымі корабавымі зводамі [10, с. 13].

Прынцып шматпрыступкавасці, які быў характэрны для Спаса-Еўфрасіннеўскага храма, назіраўся і ў архітэктуры Пятніцкай царквы-пахавальні. Аднолькавасць тэхнікі кладкі, памеры і якасць цэглы дазволілі.

Л.В. Аляксееву выказаў думку, што царква Параскевіі Пятніцы разам з Барысаглебскім і Спаса-Ефрасіннеўскім храмам была ўзведзена знакамітым полацкім дойлідам Іаанам у 20-я гады XII стагоддзя [11, с. 106].

Наяўнасць крыпты ў падмурку храма выклікала з'яўленне ў XIX стагоддзі сярод палачанаў паданння аб існаванні пад паўночнай сцяной царквы Параскевіі ўвахода ў падземны тунэль, які нібыта ў старажытнасці быў праведзены пад р. Дзвіною ад Пятніцкага храма Бельчыцкага манастыра ла Верхняга замка і Спаскай царквы Еўфрасіннеўскага манастыра. Такім чынам, тры асноўныя аб'екты горада злучаліся паміж сабою [4, с. 40]. У 1812 годзе манахі Бельчыцкай абіцелі рабілі спробу адшукаць гэты ўваход. Яны доўгім кіем знайшлі адтуліну ў падмурку, але цалкам расчысціць яе ад зямлі і будаўнічага смецця не наважыліся «по причине черезвычайно дурнаго и вредоснаго, исходящего из сего хода воздуха» [4, с. 40]. Даследчык К.А. Гаворскі ў 60-х гадах XIX стагоддзя таксама спрабаваў знайсці падземны тунэль на месцы размяшчэння Пятніцкай царквы, але беспаспяхова [4, с. 40]. Толькі ў 1928 годзе раскопкі І.М. Хозерава выявілі «наличие подземной камеры под всем зданием церкви, но не доходя до алтаря», на аснове чаго былі зроблены высновы аб выкарыстанні Пятніцкага храма ў якасці пахавальні [15, с. 183].

У першай палове XX стагоддзя царква Параскевіі Пятніцы, як і астатнія помнікі Бельчыцкага архітэктурнага комплексу, была страчана. Напачатку 1929 года ад руінаў Пятніцкага храма-пахавальні засталіся толькі нязначныя рэшткі паўднёвай і заходняй сценаў, а таксама паўднёвыя часткі апсіды. Астатняя старажытная цэгла была выкарыстана пры пабудове маста праз р. Заходнюю Дзвіну ў 30-х гадах XX стагоддзя [15, с. 192].

Трэці помнік Бельчыцкага манастыра – Вялікі (безназоўны) сабор – быў страчаны раней XVI – XVII стагоддзяў і ніколі не ўзнаўляўся, таму архітэктурная структура храма вядома сучасным даследчыкам толькі на аснове археалагічных даных.

Гісторык-храніст М. Стрыйкоўскі ўпершыню ўзгадваў руіны старажытнага каменнага храма паблізу царквы Барыса і Глеба [14, с. 47]. У 60-х гадах XIX стагоддзя А.М. Семянтоўскі апісваў рэшткі «неизвестного ранее собора»: «на восточной стороне двора монастырского в 30 саженях от Борисоглебской и в 10 саженях от Параскевиевской церкви виднеются остатки фундамента от древней церкви. Судя по фундаменту, древняя церковь должна была иметь в длину, вместе со средним выступом олтарной стены, около 75 футов, в ширину 49 футов. Фигура ея представляла четырёхугольник, с тремя полукруглыми выступами олтарной стены» [14, с. 47].

Дакладная назва помніка на сённяшні дзень невядома, яго лічылі то царквой Барыса і Глеба, пабудаванай князем Барысам Усяслававічам, то першапачатковым храмам Параскевіі Пятніцы [10, с. 14]. Дакументальныя крыніцы першай паловы XVII стагоддзя ўтрымліваюць звесткі, што акрамя Барысаглебскай і Пятніцкай цэркваў на Бельчыцы былі пабудаваны і два драўляныя храмы: Іаана Багаслова і Успення Прысвятой Багародзіцы. Апошні быў адноўлены на месцы страчанага каменнага Вялікага сабора «иждевением кобацких мещан» каля 1615 года [4, с. 39]. Час першапачатковага ўзвядзення і месца размяшчэння гэтых цэркваў дакладна невядомы [10, с. 14].

У актах апісання цэркваў г. Полацка і ўезда Віцебскай царкоўна-будаўнічай прысутнасці за 1868 год таксама ўзгадваецца страчаны каменны сабор, «вядомы толькі па паданнях», які насіў назву Успення Прысвятой Багародзіцы, ці скарочана – Успенскі сабор [6, ф. 2503, воп. 1, спр. 23, арк. 358].

М.М. Варонін прапаноўваў суадносіць руіны безыменнага сабора з прыгаданай у гісторыі царквой «Багародзіцы старой», якая была пабудавана ў 1107 годзе, а ў 1159 годзе з'яўляўся цэнтрам полацкай гарадской «братчыны», куды гараджане клікалі князя Расціслава для перамоў. Менавіта гэтая старажытная драўляная царква магла, на думку археолага, з'яўляцца папярэднікай мураванага бельчыцкага сабора [10, с. 14].

Пабудова саборнага храма Барысаглебскага манастыра хутчэй за ўсё была звязана з паляпшэннем палітычнага становішча Полацка, усталяваннем дружалюбных і раўнапраўных адносін з Кіеўскім княствам, пасля таго як Усевалад Вольгавіч, які зацвердзіўся ў Кіеве ў 1139 (1140) годзе, ажаніўся на полацкай князёўне, дачцэ князя Васількі – унука Усяслава Чарадзея. З таго часу тут з'явілася будаўнічая арцель, якая ўзвяла Бельчыцкі Успенскі сабор у традыцыях дойлідства Кіеўскай дзяржавы [16, с. 104; 17, с. 198].

На карысць такому меркаванню сведчаць тыпалагічнае падабенства і аднолькавая будаўнічая тэхніка Вялікага сабора Бельчыцкага манастыра з царквой Спаса ў княжацкім сяле Бярэставе пад Кіевам [18, с. 50 – 51].

Першае навуковае археалагічнае даследаванне архітэктуры Бельчыцкага собора здзейсніў у 90-х гадах XIX стагоддзя А.М. Паўлінаў. Помнік уяўляў сабою трохапсідны шасцістоўпны храм, сярэдняя пара слупоў якога была прамавугольная ў плане, астатнія – крыжовыя [19, с. 53]. А.М. Паўлінаў адзначаў асаблівую, вельмі падобную да Сафійскага сабора, кладку пабудовы бельчыцкага храма: «из тонкого кирпича в три ряда на известковом растворе, причём шов раствора толще кирпича в 1 дюйм; при ширине 6 дюймов и длине 12 ¼ дюйма, три ряда имеют толщину 10,5 дюйма; над этим рядом идет ряд булыжников разной величины» [19, с. 54]. Падобная тэхніка муроўкі сведчыла аб магчымым адначасовым узвядзенні Вялікага (безназоўнага) сабора ў Бельчыцкім насадзе і Сафійскага на Верхнім замку.

Раскопкі І.М. Хозерава, праведзеныя ў 1928 годзе, дазволілі больш дакладна выявіць асноўныя архітэктурныя асаблівасці сабора Барысаглебскага манастыра. Гэта быў вялікі (23,5×16,5 м) шасцістоўпны трохапсідны храм з крыжовымі слупамі, трыма прытворамі і пляскатымі ўнутранымі і знешнімі лапаткамі. Купал царквы, крыты волавам, абапіраўся на заходнюю пару слупоў і быў ссунуты на адно чляненне на захад, што з'яўлялася асаблівасцю планіроўкі. Падмурак храма быў закладзены на глыбіні 1,63 м. У яго аснову былі пакладзены тры рады дубовых бярвенняў памерамі 22×25 см у спілу, замацаваныя на стыках жалезнымі каванымі цвікамі па 24 см даўжынёй. Над апсідамі таксама знаходзілася драўляная канструкцыя ў форме шматкутніка, якая была заліта розчынам вапны таўшчынёй у 20 25 см; вышэй ішла залітая цэментавым рошчынам забутоўка з булыжнага каменя, таўшчынёй ад 8 10 да 25 – 30 см. На глыбіні 20 см ад паверхні зямлі пачыналася кладка цагляных сцен [10, с. 15]. Структура кладкі супадала з Барысаглебскай і Пятніцкай цэрквамі – цагляная «са схаваным радам». Памеры плінфы складалі 3,5×20 – 22×30 – 33 см, сустракалася таксама і больш вузкая – шырынёю 15,5 – 16,5 см [3, с. 48]. На некаторых цаглінах меліся знакі ў выглядзе літар, геаметрычных фігур і арнаментаў; адзін з іх у форме пяціпрамянёвай зоркі адпавядаў знакам, выяўленым на цэгле полацкага Сафійскага сабора, што дае магчымасць адносіць пабудову Вялікага сабора да другой паловы XII стагоддзя [10, с. 15].

Акрамя звычайных рэшткаў плінфы, на месцы былога размяшчэння храма ў выніку археалагічных раскопак былі знойдзены і так званыя лекальныя плінфы – цагліны з паўкруглым тарцом і сегментападобнай формы, якія маглі ўжывацца для выкладкі паўкалонак на барабане сабора і аркатурнага паса на фасадах [10, с. 16].

У бельчыцкім саборы было выяўлена дзве падлогі. Першая – з гладка адпаліраванай цэментавай заліўкі таўшчынёй 10 – 12 см, другая, насланая значна пазней, была з квадратнай маёлікавай паліванай пліткі, пакладзенай на цэментавую змазку, памерамі 17×17 см, жоўтых, зялёных і чырвона-карычневых колераў [10, с. 16]. Другі пласт падлогі храма быў вельмі падобны да старажытнай падлогі, выкладзенай у полацкай Сафіі.

Археалагічныя даследаванні Вялікага сабора ажыццяўлялі таксама ў 1965 годзе М.К. Каргер, а ў 1977 годзе – П.А. Рапапорт. Апошні дакладна вызначыў у храме Бельчыцкага манастыра такія характэрныя рысы кіеўскага культавага дойлідства канца XI – пачатку XII стагоддзя, як цагляная муроўка «са схаваным радам», плоскія лапаткі на фасадах, драўляны каркас пад падмуркам, замацаваны жалезнымі кастылямі [20, с. 98].

Верагодна, Бельчыцкі сабор узводзілі кіеўскія майстры ў хуткім часе пасля будаўніцтва царквы Спаса на Бярэставе, бо менавіта ў гэтым храме ўпершыню склалася крыжовая схема плана, дзякуючы наяўнасці трох прытвораў. Аднак у полацкім храме дойліды перанеслі падкупальную прастору на адно чляненне на захад, у параўнанні са звычайнымі шасціслуповымі храмамі. Такі кампазіцыйны прыём, а таксама наяўнасць прытвораў сведчаць, што дойліды імкнуліся стварыць цэнтрычную кампазіцыю, дзе больш нізкія чым асноўны аб'ём прытворы падкрэслівалі б вышыню ўвенчанай купалам цэнтральнай часткі [18, с. 50 – 51].

У саборы Бельчыцкага манастыра была вызначана тэндэнцыя да істотнай перапрацоўкі крыжовакупальнай схемы храма ў бок стварэння кампазіцыі з вежанадобна ўзнятым барабанам купала. У далейшым гэтая тэндэнцыя атрымала інтэнсіўнае развіццё, пра што сведчаць рэшткі храма другой паловы XII стагоддзя на полацкім дзядзінцы. Агульная схема плана гэтага збудавання супадала з Бельчыцкім (безназоўным) саборам і адначасова з'яўлялася прататыпам царквы архангела Міхаіла ў Смаленску (другая назва Свірская царква), якую пабудаваў у 80-х – 90-х гады XII стагоддзя запрошаны полацкі дойлід [21, с. 7].

Эвалюцыйная лінія полацкага дойлідства ад сабора Бельчыцкага манастыра праз храм на дзядзінцы да смаленскай царквы архангела Міхаіла прывяла да фарміравання новага архітэктурнага вобраза ўрачыстага вежанадобнага храма, у якім візантыйскія кампазіцыйныя прыёмы былі цалкам перапрацаваны і пераасэнсаваны [18, с. 51].

Такая творчая актыўнасць полацкіх дойлідаў у асноўным была абумоўлена палітычнай незалежнасцю ад Кіева. Мясцовыя будаўнікі захавалі старадаўнюю муроўку «са схаваным радам», хаця ў архітэктуры суседніх усходнеславянскіх княстваў ад яе на той час адмовіліся. Толькі ў пабудовах Канстанцінопаля плінфу клалі з утопленым радам і ў змешанай тэхніцы муроўкі да сярэдзіны XII стагоддзя. Не выключана, што полацкія дойліды, як і іх візантыйскія калегі, захоўвалі гэтую муроўку дзеля больш практычнага і таннага дэкаратыўнага афармлення фасадаў [18, с. 51]. Паступова такі будаўнічы прыём стаў адной з тыповых рысаў самастойнай арыгінальнай Полацкай школы дойлідства.

Такім чынам, Вялікі (безыменны), ці Успенскі, сабор Барысаглебскай абіцелі уяўляў сабою выдатны помнік культавага дойлідства XII стагоддзя, які адрозніваўся буйнымі памерамі, спецыфічнай складанай архітэктурай, арыгінальнымі ўпрыгожваннямі фасаду і ўнутранага інтэр'еру будынка.

Прыблізна адначасовая пабудова бельчыцкага (безназоўнага) і Сафійскага сабораў мела на ўвазе важную агульнадзяржаўную мэту – падкрэсліць не толькі палітычную і рэлігійна-культурную незалежнасць Полаччыны ад Кіеўскага княства, але і роўнасць з ім.

Акрамя трох дакладна лакалізаваных і археалагічна вывучаных помнікаў Барысаглебскага манастыра, існаваў і чацвёрты храм, які па паданню насіў назву манастырскага дома [8, с. 69]. Гэтая манументальная пабудова была незвычайнай і рэзка вылучалася сярод іншых архітэктурных помнікаў Полаччыны. Уперыпню падмурак храма быў выяўлены ў канцы XVIII стагоддзя падчас зямельных работ. Невядомы сёння аўтар склаў «Запіску», у якой утрымліваўся план збудавання [8, с. 70]. Гэтыя матэрыялы былі знойдзены М.М. Варонiным у бібліятэцы імя Леніна ў Маскве і ўпершыню апублікаваны ў 1962 годзе [12, ф. 1164, воп. 5, спр. 11].

У «Запісцы» пазначалася, што ў 1790 годзе на тэрыторыі Бельчыцкай абіцелі праводзіліся работы па прыбудове новай рызніцы да старажытнай Барысаглебскай царквы. Для будаўніцтва выкарыстоўваўся пясок з невялікага пагорка на манастырскім падвор'і, пад пластамі пясчанай глебы рабочымі былі знойдзены спачатку рэшткі мураванай сцяны, а потым трывалы каменны падмурак старажытнага храма своеасаблівай формы. Царква была пабудавана з плінфы, залітай цэмяначным розчынам, але ў адрозненне ад іншых пабудоў манастыра, кладка была камбінаваная (паўбутавая) – звонку выкладзеная з плінфы, а знутры – з каменя. На рэштках сцен і слупоў захоўваліся фрагменты старажытных фрэскавых роспісаў пераважна зялёнага колеру [12, ф. 1164, воп. 5, спр. 11, арк. 36]. Вышэйпрыведзеныя факты далі магчымасць аднесці час пабудовы невядомага храма да XII стагоддзя, як і трох астатніх цэркваў Барысаглебскага манастырскага комплексу [22, с. 102].

Схематычны план, які прыкладаўся да «Запіскі», сведчыў, што пабудова з'яўлялася не жылым «манастырскім домам», а помнікам культавага дойлідства. Гэта была аднаапсідная і незвычайна выцягнутая ў даўжыню царква. З поўначы і поўдня, прыкладна пасярэдзіне яе бакавых сцен, вылучаліся адкрытыя ўнутр паўкруглыя выступы, якія ўтвараліся чатырма квадратнымі слупамі. Слупы былі расстаўлены вельмі шырока, такім чынам сетка нефаў, што звычайна рассякае інтэр'ер крыжовакупальных храмаў, знікала і замянялася адзінай прасторай зальнага характару. У той жа час значныя памеры падкупальнага прамавугольніка сведчылі ці аб надзвычай вялікіх памерах барабана, ці аб вежанадобнай форме верху [22, с. 102]. Такія кампазіцыйныя прыёмы ў параўнанні з традыцыяй акружаць трохнефнае ядро

храма галерэямі, што рабіла яго па сутнасці пяцінефным, выглядалі менш зграбнымі, але затое надавалі пабудове шматграннасць, гульню светлаценю і дазвалялі ўзводзіць агульную кампазіцыю па прынцыпу прыступкавага звужэння ўверх. Гэта з'яўлялася адной з адметных рыс полацкага дойлідства і найвышэйшага развіцця дасягнула ў Спаса-Прэабражэнскай царкве Ефрасіннеўскага манастыра [18, с. 53].

Бакавыя паўкружжы – конхі – адыгрывалі мастацкую і канструктыўную ролю: яны з'яўляліся контрфорсамі па папярэчнай восі распора і адначасова ствараліяруснасць і шматпрыступкавасць кампазіцыі. Прамавугольныя выступы па васях пабудовы з поўначы, поўдня і захаду (на плане), магчыма, вызначалі ўваходы ў храм і пляцоўкі перад імі [22, с. 103].

Аўтар «Запіскі» ўзгадваў таксама глыбокую адтуліну ў апсідзе знойдзенай пабудовы. Малая Пятніцкая царква Барысаглебскага манастыра мела крыпту ў падмурку асноўнага памяшкання храма. Магчыма, што падобная крыптапахавальня была і ў чацвёртай царкве абіцелі, аднак яна размяшчалася толькі пад алтарнай часткай, як гэта рабілі ў храмах «раманскага Захаду» [12, ф. 1164, воп. 5, спр. 11, арк. 36].

Увогуле чацвёрты храм Барысаглебскага манастыра быў вельмі незвычайным для манументальнага дойлідства як Полаччыны, так і ўвогуле Беларусі XII – XIII стагоддзяў. Калі першыя тры царквы Бельчыцкай абіцелі адносіліся да Полацкай школы старажытнарускай традыцыі храмавага будаўніцтва, то чацвёртая належыла да тыпу «трыконхаў» – храмаў, распаўсюджаных у манастырскай архітэктуры Афона, Балгарыі, Румыніі і асабліва Сербіі на працягу XI – XVII стагоддзяў. Бакавыя конхі былі звязаны з асаблівым тыпам царкоўных спеваў і выкарыстоўваліся для стварэння якаснай акустыкі, у Балгарыі яны насілі назву «певинцы». Такім чынам, чацвёрты храм дакладна з'яўляўся культавай, а не гаспадарчай манастырскай пабудовай [22, с. 103].

З шэрагу трыконхаў бельчыцкі помнік належыў да найбольш старажытных узораў, аб чым гавораць матэрыялы і тэхніка пабудовы. З'яўленне ў Полацку ў XII стагоддзі храма-трыконха сведчыла аб сувязях Полацкага княства з Балканамі (асабліва Сербіяй) і знаёмстве мясцовых дойлідаў з архітэктурай гэтых краін [22, с. 104]. Магчыма, прыход на Полаччыну падобнай традыцыі храмавага будаўніцтва адбываўся не з тэрыторыі паўднёвых славян, а з Візантыі. Старажытны Полацк меў шчыльныя гандлёвыя і культурна-рэлігійныя сувязі з Царградам, тым больш, што ў першай палове XII стагоддзя шасцёра полацкіх князёў разам з сем'ямі: Расціслаў, Святаслаў, Георгій, сыны Рагвалода-Барыса Васіль і Іван, а таксама Давыд па загаду кіеўскага князя Мсціслава (ад 1129 г.) знаходзіліся там у ссылцы. Толькі два выгнанніка – браты Рагвалодавічы Васіль і Іван – праз дзесяць гадоў вярнуліся на радзіму [16, с. 103]. Менавіта яны маглі прывезці з Візантыі дойліда, які і збудаваў у Полацку храм-трыконх [3, с. 43]. Нажаль, найцікавейшы чацвёрты помнік Барысаглебскага манастырскага храмавага комплексу – адна са спецыфічных эвалюцыйных ліній полацкага дойлідства XII – XIII стагоддзяў – да сённяшняга дня дакладна навукова не лакалізаваны і археалагічна не вывучаны [1, с. 78].

Такім чынам, наяўнасць характэрных асаблівасцяў у архітэктуры Барысаглебскай, Пятніцкай цэркваў, Вялікага (безназоўнага) сабора і храма-тыконха Бельчыцкага манастыра дазваляе аднесці іх да лепшых узораў Полацкай школы дойлідства. Самабытная школа склалася ў полацкім культавым будаўніцтве XII стагоддзя на аснове традыцый візантыйскай і кіеўскай архітэктуры пад уплывам першага манументальнага культавага збудавання на Беларусі – полацкага Сафійскага сабора [23, Т. 5, с. 533].

У пабудовах Полацкай школы дойлідства адбыўся частковы адыход ад візантыйскіх крыжова-купальных шматнефавых структур з некалькімі апсідамі, культавыя будынкі былі значна выцягнутымі ў плане з больш вузкімі бакавымі нефамі, асноўную кампазіцыйную дамінанту ўтварала сярэдняя апсіда [23, Т. 5, с. 533].

Вышэйпазначаныя асаблівасці разам з арыгінальнай плінфавай муроўкай са «схаваным радам» назіраліся ў архітэктуры ўсіх чатырох страчаных помнікаў Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра.

ЛІТАРАТУРА

1. Тарасаў, С.В. Полацк IX – XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія / С.В. Тарасаў. – Мінск.: Беларус. навука, 2001. – 183 с.
2. Тихомиров, М.Н. Древнерусские города / М.Н. Тихомиров. – М., 1956. – 417 с.
3. Трусаў, А. Бельчыцкі манастыр / А. Трусаў // Беларус. гіст. часопіс. – 1993. – № 1. – С. 43 – 50.
4. Говорский, К. Историческое описание Полоцкого Борисоглебского монастыря / К. Говорский // Полоцкий летописец. Ист.-лит. журнал. – 1992. – № 1. – С. 37 – 42.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (НГАБ). Фонд 2904. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 2 – 5. Ведомость о состоянии заштатного Борисоглебского монастыря за 1864 г.
6. НГАБ. Фонд 2503. – Воп. 1. – Спр. 23. – Арк. 355 – 368. Акты осмотра церквей г. Полоцка и уезда Витебского губернского церковно-строительного присутствия за 1868 г.
7. НГАБ. Фонд 2694. – Воп. 1. – Спр. 100. – Арк. 53 – 57. Акты осмотра церквей г. Полоцка и уезда Витебского губернского церковно-строительного присутствия за 1904 г.

8. Селицкий, А.А. Живопись Полоцкой земли XI – XII вв. / А.А. Селицкий. – Мінск.: Навука і тэхніка, 1992. – 173 с.
9. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX – XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск.: Наука и техника, 1978. – 160 с.
10. Воронин, Н.Н. Бельчицкие руины / Н.Н. Воронин // Архитектурное наследство. – 1956. – № 6. – С. 3 – 20.
11. Алексеев, Л.В. Домонгольская архитектура Полоцкой земли в историческом осмыслении / Л.В. Алексеев // Российская археология. – 1996. – № 2. – С. 96 – 110.
12. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. Фонд 1164. – Воп. 5. – Спр. 13. – Арк. 32. Документы личного происхождения почётного гражданина г. Полоцка И.П. Дейниса.
13. Хозеров, И.М. Полоцкое зодчество XI – XII веков в свете новых исследований / И.М. Хозеров // Адраджэнне: гіст. альманах. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – Вып. 1. – С. 157 – 195.
14. Сементовский, А. Полоцкий Борисоглебский монастырь / А. Сементовский // Полоцкий летописец. Ист.-лит. журнал. – 1992. – № 1. – С. 42 – 47.
15. Чантурия, В.А. Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / В.А. Чантурия. – Минск: Полымя, 1986. – 240 с.
16. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / І.І. Крэнь (кір.) [і інш.]. – Мінск: РІВШ БДУ, 2000 – 2002. – Ч. 1: Са старажытных часоў да канца XVIII ст. / І.І. Коўкель [і інш.]. – 2000. – 656 с.
17. Загарульскі, Э.М. Заходняя Русь: IX – XIII стст. / Э.М. Загарульскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 240 с.
18. Кушнярэвіч, А.М. Полацкае дойлідства XII ст. ва ўсходнеславянскім і агульнавізантыйскім архітэктурным кантэксце / А.М. Кушнярэвіч // Весці АН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 1996. – № 4. – С. 49 – 56.
19. Павлинов, А.М. Древние храмы Витебска и Полоцка / А.М. Павлинов // История русской архитектуры. – 1895. – С. 53 – 55.
20. Раппопорт, П.А. Русская архитектура XI – XIII вв. Каталог памятников / П.А. Раппопорт. – Л.: Наука, 1982. – 136 с.
21. Воронин, Н.Н. Зодчество Смоленска XII – XIII вв. / Н.Н. Воронин, П.А. Раппопорт. – Л.: Наука, 1979. – 29 с.
22. Воронин, Н.Н. К истории полоцкого зодчества XII в. / Н.Н. Воронин // Краткие сообщ. Ин-та археологии АН СССР. – М., 1962. – Вып. 87. – С. 102 – 104.
23. Шупенька, І. Каталог асабістага фонду Дэйніса І.П. (збіральніка і захавальніка гісторыі Полацка): агляд калекцыі / І. Шупенька // Матэрыялы навук. практ. канф. (па выніках навук.-даслед. работы Полац. гіст.-культурн. музея-запаведніка ў 1998 г.). – Полацк, 1999. – С. 116 – 118.

ГІСТОРЫЯ ЭТНАГРАФІЧНАГА І ФАЛЬКЛОРНАГА ВЫВУЧЭННЯ ПАДЗВІННЯ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

А.Ю. БАБІЧ
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

Разглядаецца працэс фальклорнага і этнаграфічнага вывучэння Падзвіння ў перыяд з другой паловы XX да пачатку XXI стагоддзя, а таксама акрэсліваюцца асаблівасці арганізацыі і правядзення этнаграфічных даследаванняў у пазначаным рэгіёне як у савецкі час, так і ў часы існавання суверэннай Рэспублікі Беларусь. Ахарактарызаваўшы асноўныя беларускія цэнтры этнаграфічнага і фальклорнага вывучэння Падзвінскага рэгіёну ў пазначаны перыяд, прыходзім да высновы, што калі ў 1950-я – 1980-я гады асноўным цэнтрам фальклорна-этнаграфічнага вывучэння Беларускага Падзвіння з'яўлялася АН БССР, то напачатку 1990-х гадоў сітуацыя ў галіне фальклярыстыкі і этнаграфіі змяняецца: паўстаюць новыя дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі, рэгіянальныя цэнтры, якія займаюцца актыўнай этнаграфічнай дзейнасцю.

Уводзіны. Унікальная непаўторнасць асобных праяў традыцыйнай культуры гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, у тым ліку Падзвіння, вымагае ад айчынных этнографаў, фалькларыстаў, музыказнаўцаў надаваць усё большую ўвагу накірунку арыяльнага даследавання спецыфікі культуры беларускага этнасу. Аднак, нягледзячы на значныя поспехі ў галіне вывучэння рэгіянальнай спецыфікі традыцыйнай культуры Беларускага Падзвіння, і сёння застаюцца актуальнымі праблема захавання сабраных матэрыялаў, адсутнасць належнага фінансавання даследчыцкіх праектаў, а таксама непрапарцыйнасць у вывучэнні асобных пытанняў беларускай традыцыйнай культуры. Назіраецца амаль поўная адсутнасць каардынацыі дзейнасці паміж дзяржаўнымі цэнтрамі этнаграфічных даследаванняў і недзяржаўнымі грамадскімі арганізацыямі, паміж агульнарэспубліканскімі і рэгіянальнымі навукова-даследчымі і навучальнымі ўстановамі. У прыватнасці, гэта праяўляецца падчас арганізацыі і правядзення палявых даследаванняў – у нескаардынаванасці маршрутаў, тэматыкі, мэтаў і задач асобных этнаграфічных экспедыцый. Неабход-

насць творчага навуковага супрацоўніцтва ўсіх устаноў, арганізацый і суполак, якія працуюць у сферы этнаграфічнага вывучэння Беларускага Падзвіння вымагае стварэння адзінага інфармацыйна-каардынуючага цэнтра, які, з пункту гледжання аўтара, павінен з'явіцца ў хуткім часе.

З гэтай нагоды аб'ектам дадзенага даследавання абрана этнаграфічная навука ў Беларусі, а ў якасці прадмета выступаюць асноўныя этапы і асаблівасці этнаграфічнага і фальклорнага вывучэння Падзвіння беларускімі даследчыкамі з 50-х гадоў XX стагоддзя да нашых дзён. У ходзе распрацоўкі дадзенай праблемы былі вызначаны наступныя задачы:

1) ахарактарызаваць асноўныя беларускія цэнтры этнаграфічнага і фальклорнага вывучэння Падзвінскага рэгіёну ў другой палове XX – пачатку XXI стагоддзя;

2) паказаць дынаміку развіцця этнаграфічнага вывучэння Падзвіння ў асноўных навукова-даследчых, навучальных і краязнаўчых цэнтрах Беларусі ад савецкіх часоў да сучаснасці;

3) вызначыць асаблівасці дзяржаўнай і недзяржаўнай формаў этнаграфічных даследаванняў;

4) на аснове аналізу арганізацыі і правядзення экспедыцыйнай дзейнасці па тэрыторыі Беларускага Падзвіння акрэсліць сучасны стан этнаграфічных палявых даследаванняў у дадзеным рэгіёне, метадалагічныя прынцыпы іх арганізацыі і правядзення, а таксама вызначыць прыярытэты і перспектывы іх развіцця.

Акадэмічнае даследаванне Падзвінскага рэгіёну ў савецкі час (1950 – 1980-я гг.)

Збіранне і вывучэнне фальклору. Асноўным цэнтрам даследавання беларускай вусна-паэтычнай творчасці на працягу дзесяцігоддзяў заставалася Акадэмія навук БССР. Збіральніцкая і даследчыцкая дзейнасць у галіне фальклору канцэнтравалася тут спачатку ў сектары этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі, а з 1957 года – у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (ІМЭФ).

Зразумела, што за савецкім часам камуністычная ідэалогія накладала свой адбітак і ў галіне фальклярыстыкі. «Побач з актыўнай прапагандай, якая прышчэплівае народу непавагу да нацыянальнага мастацтва, вялікую шкоду зберажэнню традыцыйнага фальклору на Віцебшчыне прынесла кампанія так званай "барацьбы з рэлігіяй", якая асабліва актыўна праводзілася ў 1970 – 1980-я гады ў Докшыцкім і Лепельскім раёнах работнікамі аддзелаў культуры райвыканкомаў і райкомаў партыі» [1, с. 689]. Пад маскай антырэлігійнай барацьбы забаранялася спяваць абрадавыя песні, вядомы шматлікія выпадкі праследаванняў, штрафаў за пічадраванні, Гуканне вясны, Купалле.

У той жа час у рамках падрыхтоўкі да выдання шматтомнага збору беларускай народнай творчасці з канца 1950-х гадоў пачалося сістэматычнае і мэтанакіраванае фальклорнае абследаванне ўсіх рэгіёнаў Беларусі. Збіранне вусна-паэтычных твораў, якое ажыццяўлялася галоўным чынам шляхам правядзення палявых даследаванняў, стала адным з важнейшых напрамкаў навуковай дзейнасці супрацоўнікаў ІМЭФ [2, с. 200]. Планаванне экспедыцый ажыццяўлялася з улікам апублікаваных і архіўных матэрыялаў таго ці іншага рэгіёну, у сувязі з тым, як вырашаліся праблемы з транспартам і фінансаваннем. Населеныя пункты выбіраліся па прынцыпе «трохкутніка». Экспедыцыі наладжваліся штогод і звычайны былі шматпрофільнымі. Акрамя супрацоўнікаў Акадэміі навук, у іх прымалі ўдзел студэнты філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў г. Мінска (БДУ, МДПІ і інш.) У сувязі з гэтым Акадэмія Навук стала своеасаблівым каардынацыйным цэнтрам у галіне палявых фальклярыстычных даследаванняў. Пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору быў створаны каардынацыйны савет, які абмяркоўваў планаванне не толькі навуковай, але і экспедыцыйнай дзейнасці [3, с. 144]. Маршруты і час правядзення экспедыцыйных выездаў на Падзвінне можна даволі дакладна прасачыць па запісах «Кнігі ўліку» фонда № 20 за 1960 – 1983 года, а таксама з дапамогай жанравай картатэкі (фонд № 8) фальклорнага архіва аддзела славістыкі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору [4].

Грунтоўнае і сістэматычнае вывучэнне Падзвіння пачалося з 1971 года, калі адбылася першая комплексная экспедыцыя ІМЭФ у пазначаны рэгіён. На працягу 1970-х гадоў найбольш актыўна і дасканала супрацоўнікамі ІМЭФ даследаваліся наступныя раёны Падзвіння: Пастаўскі, Браслаўскі, Верхнядзвінскі, Міёрскі, Лепельскі, Полацкі і Докшыцкі.

Нягледзячы на тое, што асаблівае значэнне надавалася выяўленню таленавітых носьбітаў фальклору – казачнікаў і казачніц, спевакоў і спявачак, з той мэтай каб запісаць ад іх лепшыя ўзоры народнай паэзіі, фальклярысты ІМЭФ таксама фіксавалі этнаграфічныя апісанні абрадаў, рабілі запісы інструментальнай музыкі, прывозілі прадметы матэрыяльнай культуры.

Актыўная экспедыцыйная дзейнасць працягнулася і ў наступнае дзесяцігоддзе. На працягу 80-х гадоў адбыліся тры значныя экспедыцыі на Падзвінне: 1981 год – Бешанковіцкі раён; 1987 - Докшыцкі раён, 1989 – Расонскі, Віцебскі і Шумілінскі раёны.

Большая частка фальклорных запісаў, зробленых у 1960– 1980-я гады падчас пазначаных вышэй экспедыцый, увайшла ў шматтомнае выданне «Беларуская народная творчасць» (БНТ) [5, с. 158]. У значнай ступені дзякуючы збіральніцкай дзейнасці савецкага часу быў сфармаваны фальклорны архіў, які размяшчаецца зараз у аддзеле славістыкі ІМЭФ НАНБ. Архіву нададзены статус нацыянальнага набытку (рэестравы № 3), што зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэсп. Беларусь ад 2 жніўня 2001 г. № 1137.

Этнаграфічныя даследаванні. Калі ў даваеннай, і тым больш у дарэвалюцыйнай, беларускай этнаграфіі прыярытэтнае месца займалі даследаванні традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў, то ў пасляваенныя гады малалікі сектар этнаграфіі, які быў створаны ў 1945 годзе пры АН БССР, асноўную ўвагу надае матэрыяльнай культуры [6, с. 53]. У 1950 годзе ў сектары этнаграфіі Інстытута гісторыі АН БССР была запланавана тэма па вывучэнні побыту тагачаснай вёскі [7, с. 88]. Яе распрацоўка прадугледжвала правядзенне актыўнай палявой даследчыцкай дзейнасці. Звычайна экспедыцыі былі комплекснымі і маршрутнымі, сумесна з этнографамі працавалі мовазнаўцы і фальклярысты. Для збору звестак па матэрыяльнай культуры было распрацавана восем спецыяльных праграм, і акрамя ўласных назіранняў і падрабязных запісаў размоў з інфарматарамі падчас экспедыцый збіраўся ілюстрацыйны матэрыял [7, с. 93].

Першая экспедыцыя, якая закранула Падзвінскі рэгіён, адбылася ў 1954 годзе. Яна праводзілася па паўночна-заходніх раёнах Беларусі, памежных з Літвой. Пачаўшы з Гродна, даследчыкі рушылі на поўнач да беларуска-літоўскай мяжы (да Браслава), а потым уздоўж беларуска-латвійскай мяжы да Дрэтуні. Па паўночна-ўсходняму беларускаму памежжу з Латвіяй і Расіяй праходзіла экспедыцыя ў 1955 годзе, якая пачалася ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці і скончылася на поўначы Гомельшчыны [7, с. 89].

У 1958 – 1960 гадах у асноўным збіраўся матэрыял па традыцыйнаму беларускаму адзенню. Адна з такіх экспедыцый (1959 г.) праходзіла на працягу месяца, і пераважна па Віцебскім Падзвінні: Глыбоцкі, Докшыцкі, Сенненскі, Багушэўскі (былы), Бешанковіцкі, Суражскі (былы), Чашніцкі, Лепельскі, Ушацкі, Ветрынскі (былы) раёны [7, с. 90 – 91].

Падчас збору дадзеных па матэрыяльнай культуры за 1945 – 1965 гадоў было абследавана 60 вёсак Віцебскай вобласці. Частка экспедыцыйных матэрыялаў увайшла ў калектыўную працу «Народы Еўрапейскай часткі СССР» (М., Т. 1, 1964 г.) і манаграфію Л.А. Малчанавай «Матэрыяльная культура беларусаў» (Мінск, 1968). Даследчыца выдзяляе тры этнаграфічныя раёны: раён Падняпроўя (сучасная Магілёўская і ўсходняя палова Гомельскай вобласці); Паўднёва-заходні (ахоплівае ў асноўным Беларускае Палессе); Паўночна-ўсходні (Віцебская, поўнач Мінскай і Гродзенскай абласцей) раёны, якія адрозніваюцца паміж сабою асобнымі элементамі матэрыяльнай культуры [8, с. 97].

У сувязі з падрыхтоўкай гісторыка-этнаграфічнага атласа Беларусі з 1965 года колькасць палявых даследаванняў у сектары этнаграфіі значна павялічылася (2 – 3 экспедыцыі штогод). На аснове праведзенай працы былі выдадзены 3 манаграфіі: «Беларускае народнае адзенне» (Мінск, 1975(; «Народная сельска-гаспадарчая тэхніка беларусаў» (Мінск, 1974); «Беларускае народнае жыллё» (Мінск, 1973). Яны змяшчаюць ілюстрацыі і карты, якія вызначаюць распаўсюджванне розных з'яў беларускай матэрыяльнай культуры. Дадзеныя працы заклалі аснову для далейшага вывучэння гістарычна-этнаграфічнага раянавання матэрыяльнай культуры беларусаў, паколькі ў іх аснову быў пакладзены не толькі храналагічны, але і арэальны прынцып даследавання [9, с. 95].

Далейшую распрацоўку гістарычна-этнаграфічнага раянавання матэрыяльнай культуры беларусаў праводзіў В.С. Цітоў («Гістарычна-этнаграфічнае раянаванне матэрыяльнай культуры беларусаў XIX – пачатку XX стст.», 1983), які вылучыў асноўныя гістарычна-этнаграфічныя рэгіёны на Беларусі: Падзвінне, Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Усходняе Палессе і Заходняе Палессе [10, с. 85].

Паступова тэматыка экспедыцыйных даследаванняў значна пашырылася: побач з матэрыяльнай культурай у праграму даследаванняў уключаліся пытанні па народнай медыцыне, народнай абрадавасці, рэлігійных уяўленнях і г.д. [7, с. 95]. У 1960-я гады значная ўвага надавалася вывучэнню праблемы паходжання і этнічнай гісторыі беларусаў (1968 г. – манаграфія «Беларусы: Нарысы паходжання і этнічнай гісторыі» М.Я. Грынблат) [9, с. 84]. У 1970 – 80-х гадах на аснове аналізу этнаграфічных матэрыялаў па асобных прамысловых і рамесных занятках з'яўляецца шэраг фундаментальных даследаванняў: В.С. Цітоў «Народныя дрэваапрацоўчыя промыслы Беларусі 1917 – 1941 гг.» (1976); І.М. Браім «Рыбалоўства ў Беларусі» (1976); А.М. Курыловіч «Беларускае народнае ткацтва» (1981); С.А. Мілючэнкаў «Беларускае народнае ганчарства» (1984), а ў 1984 годзе выйшла ў свет фундаментальная калектыўная манаграфія «Промыслы і рамёствы на Беларусі» [9, с. 362]. На працягу 1970 – 80-х гадоў этнографы ІМЭФ праводзілі вывучэнне сям'і з выкарыстаннем сацыялагічных метадаў даследавання, асобна даследавалася сямейная абрадавасць беларусаў. Вынікам даследавання стала манаграфія «Сям'я і сямейны быт беларусаў» (1990 г.) [9, с. 292].

Этнамузыказнаўчыя даследаванні. Збіральніцкая і навукова-даследчая праца ў галіне музычнага фальклору пачалася ў ІМЭФ адразу пасля яго заснавання, калі ў інстытут прыйшлі Л.М. Фёдараў, В.І. Елататаў, а пазней І.П. Благавешчанскі [11, с. 181].

Уласна этнамузыкалагічная, народазнаўчая скіраванасць даследаванняў разгарнулася ў ІМЭФ з пачаткам навуковай дзейнасці З.Я. Мажэйкі (з 1960-х гг.), а пазней – Т.Б. Варфаламеевай і Г. Таўлай (з 1980-х гг.) [11, с. 184]. З гэтага часу значную ўвагу этнамузыколагі АН надаюць вывучэнню рэгіянальных асаблівасцей традыцыйнай музычнай культуры Беларусі. Пачынаецца выданне навукова-даследчых зборнікаў музычных фальклорных твораў, якія пабудаваныя па арэальным прынцыпе і складаюцца з матэрыялаў сістэматычных мэтанакіраваных экспедыцый супрацоўнікаў музычнага аддзела ІМЭФ.

У цэлым навуковая дзейнасць З.Я. Мажэйкі ў роўнай ступені ахоплівае сферу тэарэтычнага музыказнаўства і практычнай фальклярыстыкі. Яна паставіла на мэце і ў значнай ступені ажыццявіла мэтанакіраванае суцэльнае экспедыцыйнае абследаванне ўсіх рэгіёнаў Беларусі са стацыянарным вывучэннем вёсак метадам «уключанага назірання», праводзіла шматлікія тэматычныя экспедыцыі, а таксама параўноўвала экспедыцыйныя запісы 1930-х гадоў з уласнымі 1960-х гадоў. Вынікам яе даследчыцкай дзейнасці на Падзвінні стала кніга «Песні беларускага Паазер'я» [12], выдадзеная ў 1981 годзе.

Яшчэ адзін зборнік, прысвечаны традыцыйнай музычнай і абрадавай культуры Беларускага Падзвіння, быў выдадзены ў 1988 годзе Т.Б. Варфаламеевай «Северобелорусская свадьба: Обряд, песенно-мелодические типы» [13]. У ім змешчаны матэрыялы, сабраныя падчас экспедыцыйнага даследавання Падзвінскага рэгіёну пераважна ў другой палове 1970-х гадоў (Лёзненскі, Віцебскі, Шумілінскі, Гарадоцкі, Чашніцкі, Глыбоцкі, Верхнядзвінскі, Лепельскі, Аршанскі, Пастаўскі, Шаркаўшчынскі, Браслаўскі, Талачынскі, Полацкі і Ушацкі раёны). Актыўнае экспедыцыйнае даследаванне Падзвіння працягваецца Т.Б. Варфаламеевай і ў 1980-я гады (Глыбоцкі, Аршанскі, Верхнядзвінскі, Талачынскі, Браслаўскі, Пастаўскі, Шаркаўшчынскі, Ушацкі, Лёзненскі, Лепельскі раёны). Частка гэтых запісаў музычнага фальклору ўвайшла ў другі том «Традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў» [14], які выйшаў у 2004 годзе.

З 1970-х гадоў пачынаецца мэтанакіраваная збіральніцкая і даследчая дзейнасць І.Дз. Назінай у галіне беларускай народнай інструментальнай культуры. З сабраных ёю ва ўсіх рэгіёнах Беларусі народных найгрышаў складаецца выдадзены ў 1986 годзе зборнік «Беларускія народныя найгрышы», а частка зробленых ёю запісаў увайшла ў тамы «Беларуская народная інструментальная музыка» і «Жаніцьба Цярэшкі» (серыя БНТ). Акрамя таго, даследчыца апублікавала дзве манаграфіі пад агульнай назвай «Белорусские народные музыкальные инструменты» (1979; 1982) [11, с. 231].

Музей старажытнабеларускай культуры. Пасля прыняцця Прэзідыумам АН СССР і калегіяй Міністэрства культуры СССР у 1967 годзе пастановы аб падрыхтоўцы «Збору помнікаў гісторыі і культуры народаў СССР» у канцы 1969 года ў ІМЭФ АН БССР быў створаны сектар «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» [15, с. 4]. А ў 1970-я гады пачалося сістэматычнае натурнае выяўленне помнікаў, даследаванне культавых храмаў Беларусі, у якіх яны знаходзіліся.

Актыўная палявая дзейнасць супрацоўнікаў аддзела старажытнабеларускай культуры ў Падзвінскім рэгіёне пачалася з другой паловы 1970-х гадоў. Першая экспедыцыя праходзіла ў 1976 годзе. За два тыдні (20 траўня – 3 чэрвеня) супрацоўнікі інстытута абследавалі шэраг вёсак Лепельскага і Полацкага раёнаў [16, акт № 59]. У наступным годзе (экспедыцыя 5 – 13 ліпеня 1977 г.), ў Браслаўскім, Докшыцкім, Глыбоцкім і Пастаўскім раёнах Віцебскай вобласці вышукваліся і набываліся прадметы народнага побыту [16, акты № 74 – 75]. Двухтыднёвая экспедыцыя 1979 года закранула шэраг вёсак Лепельскага, Міёрскага, Браслаўскага раёнаў, а таксама некалькі вёсак Чашніцкага і Пастаўскага раёнаў Віцебскай вобласці [16, № 42, акты № 115, 118].

Чатыры вялікія экспедыцыі былі праведзены летам – восенню 1984 года. Яны ахапілі большасць раёнаў Віцебскай вобласці і мелі на мэце навуковую інвентарызацыю культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца ў культавых збудаваннях Віцебскай вобласці [16, акты № 28 – 30].

Падчас дзвюх музейных экспедыцый, якія адбыліся ў 1987 і 1988 гадах, выяўляліся і даследаваліся помнікі культуры ў фондах музеяў Віцебскай вобласці, а таксама працягвалася вывучэнне некаторых куль-тавых збудаванняў, складанне навуковых пашпартоў і фатаграфаванне [16, акт № 45].

Зараз у фондах музея знаходзіцца каля 18 000 экспанатаў, большасць з якіх – гэта ахвяраванні або знойдзеныя, адкрытыя самімі супрацоўнікамі творы. Удзельная вага экспанатаў, прывезеных з Падзвіння, адносна невялікая. Супрацоўнікі аддзела тлумачаць гэта меншай у параўнанні з іншымі рэгіёнамі колькасцю праведзеных экспедыцый (найбольш – на Усходняе Палессе, у Цэнтральны рэгіён Беларусі), а таксама своеасаблівай «беднасцю» дадзенага рэгіёну на помнікі матэрыяльнай культуры.

Вывучэнне рэгіянальнай спецыфікі традыцыйнай культуры Падзвіння на сучасным этапе (1990-я – пач. 2000-х гг.)

Пасля набыцця Беларуссю рэальнай дзяржаўнасці і суверэнітэту ў краіне пачынаецца перыяд нацыянальнага адраджэння, які перад усім быў звязаны з аднаўленнем асаблівай цікавасці грамадства да сваёй этнакультурнай спадчыны. У пачатку 1990-х гадоў паўстаюць новыя дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі, рэгіянальныя цэнтры, якія займаюцца этнаграфічнай дзейнасцю, у тым ліку і на Падзвінні, актывізуецца шырокі краязнаўчы рух.

Лабараторыя традыцыйнага мастацтва БелДІПК. Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры быў утвораны ў 1991 годзе. А ўжо ў 1993-м пры аддзеле народнай творчасці Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры была створана лабараторыя традыцыйнага мастацтва. З 1993 па 2006 год супрацоўнікі лабараторыі ўдзельнічалі ў распрацоўцы і рэалізацыі трох вялікіх этнаграфічных праектаў, якія непасрэдна тычыліся раёна Паазер'я.

У 1995 і 1996 гадах Лепельскім аддзелам культуры па ініцыятыве яго загадчыцы, В.І. Закрэўскай, ладзіліся этнаграфічныя экспедыцыі па Бярэзінскай воднай сістэме. Першая экспедыцыя праходзіла ў

межах Лепельскага раёна (вв. Кветча, Крайцы, Пераходцы, Валова Гара). Другая экспедыцыя была лодачнай і закранала тэрыторыю Лепельскага, Чашніцкага і Бешанковіцкага раёнаў. Другі значны праект звязаны з вывучэннем культуры страабрадцаў, супрацоўнікі лабараторыі традыцыйнага мастацтва праводзілі разам з Браслаўскім этнаграфічным музеем[1].

Трэці вялікі праект лабараторыі традыцыйнага мастацтва ў БелДЦПК, на якім неабходна спыніцца падрабязней, звязаны з распрацоўкай навуковай тэмы «Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў Паазер'я (Віцебшчына)». Практычным вынікам распрацоўкі дадзенай навуковай тэмы стала выданне 2-га тома шасцітомнай анталогіі пад агульнай назвай «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», прысвечанага Віцебскаму Падзвінню [17]. Важнейшым прынцыпам дадзенай серыі з'яўляецца тое, што яна пабудована на экспедыцыйных матэрыялах апошняй чвэрці XX – пачатку XXI стагоддзя, прычым большасць фальклорных і этнаграфічных матэрыялаў, якія змяшчаюцца ў кнізе, друкуюцца ўпершыню. Акрамя фальклорна-этнаграфічнага архіва Інстытута праблем культуры ў кнізе выкарыстаны матэрыялы з архіваў ІМЭФ АН РБ, Фальклорнай камісіі Саюза кампазітараў БССР, Фальклорны архіў навукова-даследчай лабараторыі БДУ, з уласных архіваў Л.П. Кернажыцкай, А. Емельянава, І.С. Катвіцкай, М.А. Козенка, І.Л. Сіневіч.

Экспедыцыйныя выезды на тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці праводзіліся на працягу 1997 – 1999 гадоў. За тры гады праведзена 12 экспедыцый, падчас якіх абследаваны 204 населеныя пункты ўсіх раёнаў вобласці і апытана звыш 700 носьбітаў традыцый. Матэрыял запісаны на 4-х відэакасетах (па 3 гадзіны кожная) і 148 аўдыёкасетах (па 90 хвілін) [17].

Трэба асобна адзначыць паспяховую дзейнасць лабараторыі традыцыйнага мастацтва ў накірунку распрацоўкі метадалогіі палявых этнаграфічных даследаванняў [18]. У 1998 годзе была падрыхтавана і выдадзена серыя анкетальнікаў: агульны; па асноўных відах традыцыйнай культуры – каляндар; песенны і танцавальны фальклор; народная проза; народны касцюм; мастацкія рамёствы [3, с. 143].

Акадэмічныя даследаванні Падзвінскага рэгіёну. Пасля набыцця Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці айчынная этнаграфічная навука атрымала новы імпульс для свайго развіцця. На жаль, змены ў фальклорным і этнаграфічным сектарах ІМЭФ у галіне палявых даследаванняў адбыліся не ў лепшы бок. Каардынацыйны савет, які ажыццяўляў планаванне экспедыцыйнай дзейнасці, у часы перабудовы спыніў сваё існаванне. Нязначнае фінансаванне прывяло да таго, што супрацоўнікі інстытута з 1990-х гадоў вымушаны ладзіць самастойныя адзіночныя экспедыцыйныя выезды, звычайна на сваю «малую радзіму». Сярод іх фалькларыстка, канд. філалаг. навук, Т.В. Валодзіна. У выніку сістэматычнага экспедыцыйнага вывучэння Лепельшчыны дадзены рэгіён быў абследаваны ёю амаль цалкам. У розныя гады Т.В. Валодзіна збірала этнаграфічныя і фальклорныя матэрыялы ў Ушацкім, Бешанковіцкім, Чашніцкім, Верхнядзвінскім, Докшыцкім, Глыбоцкім, Талачынскім раёнах Віцебскай вобласці[2].

У 1990-я гады вывучэннем Падзвінскага рэгіёну займаўся У.М. Сысоў. Яго манаграфіі «З крыніц спрадвечных» (1997 г.) і «Беларуская пахавальная абраднасць: Структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння» (1995 г.) змяшчаюць аўтарскія палявыя матэрыялы з Віцебскага, Гарадоцкага, Дубровенскага, Сенненскага, Расонскага, Шумілінскага раёнаў Віцебскай вобласці.

Аддзелам этнаграфіі ІМЭФ НАНБ падчас падрыхтоўкі асобных тамоў «Беларусаў» праводзіліся мэтанакіраваныя экспедыцыйныя выезды ў розныя рэгіёны Беларусі, у тым ліку і на Падзвінне. Так, для тома шостага «Грамадскія адносіны» на Падзвінні збіралі матэрыялы ў Гарадоцкім (Г.І. Каспяровіч), Лепельскім (Г.М. Курыловіч), Полацкім (Л.В. Ракава) раёнах. У апошнія гады палявымі даследаваннямі на Падзвінні займаліся супрацоўнікі аддзела этнаграфіі ІМЭФ Т.І. Кухаронак (духоўная культура), Г.І. Каспяровіч (вывучэнне беларуска-расійскага памежжа) і інш.

Трэба адзначыць, што ў «Кнізе ўліку» (фонд № 20) [4], якая змяшчае інфармацыю аб паступіўшых у архіў фальклорных матэрыялах, апошні запіс датуецца 1996 годам. З гэтага можна зрабіць выснову, што калі да сярэдзіны 1990-х гадоў усе палявыя матэрыялы траплялі ў Архіў ІМЭФ НАНБ, то зараз яны звычайна застаюцца ў даследчыкаў. Да таго ж апошнім часам вельмі востра стала пытанне захавання аўдыёзапісаў фальклорнага архіва інстытута, бо «узрост» некаторых з іх складае ўжо 30 – 40 гадоў, што не адпавядае ніякім патрабаванням [3, с. 144]. Таму робяцца спробы пераводу матэрыялаў на лічбавыя носьбіты. На жаль, недахоп сродкаў значна замаруджвае гэты працэс.

Значныя змены адбыліся ў сектары музычнага мастацтва і этнамузыкалогіі ІМЭФ НАНБ, які ў апошнія гады стаў надзвычай малалікім. Нягледзячы на тое, што палявыя даследаванні ў галіне музычнага фальклору не спыніліся і ў 1990-я гады, іх колькасць значна памяншаецца: пераважае індывідуальная форма правядзення экспедыцый, а таксама супрацоўніцтва з іншымі навучальнымі і навукова-даследчымі ўстановамі. Так, экспедыцыйныя матэрыялы, сабраныя Т.Б. Варфаламеевай на Падзвінні на

[1] Запісана аўтарам 09.03.2006 г. ад Богаеваў А.М., загадчыцы лабараторыі традыцыйнага мастацтва аддзела народнай творчасці БелДПК у г. Мінску.

[2] Запісана аўтарам 18.02.2008 ад Валодзінай Т.В., навуковага супрацоўніка фальклорнага аддзела ІМЭФ НАНБ.

працягу 1970-х – 1990-х гадоў, часткова ўвайшлі ў другі том «Традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў» [14], які быў падрыхтаваны і выдадзены Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры. Т.Л. Канстанцінава, якая адначасова з'яўляецца супрацоўнікам ІМЭФ НАНБ і выкладчыкам Беларускай акадэміі музыкі, неаднаразова, на працягу 1990-х гадоў, ездзіла збіраць музычныя фальклор у сваю родную мясцовасць – Докшыцкі раён, а таксама ў межах падрыхтоўкі і складання апытальнікаў для збору этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў па радзіннай абраднасці беларусаў – у Талачынскі раён[1].

Апошняе 15-годдзе стала надзвычай плённым для беларускіх этнографаў і фалькларыстаў у сферы распрацоўцы як традыцыйных, так і малаадследаваных праблем. Структуру і функцыі беларускага пахавальнага абраду, яго рэгіянальную спецыфіку падрабязна даследаваў У.М. Сысоў («Беларуская пахавальная абраднасць...», 1995), радзінную абраднасць беларусаў з выкарыстаннем вялікай колькасці архіўных, друкаваных і палявых матэрыялаў грунтоўна прааналізвала Т.І. Кухаронак («Радзінныя звычаі і абрады беларусаў», 1993) [9, с. 345]. У манаграфіях Т.В. Валодзінай «Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў» (1997); «Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў» (1999) былі выкарыстаны метады і прынцыпы семіялогіі, што дазваляе глядзець на народную культуру не адчужана, а нібы вачамі ўласна носьбіта традыцыйнай культуры і разумець, што азначае кожны сімвал, кожнае дзеянне.

Надзвычайную ўвагу даследчыкаў, прыцягнула да сябе тэма народнага каляндара, амаль забароненая ў савецкі час. За кароткі часавы перыяд з'яўляецца цэлы шэраг навуковых прац, прысвечаных дадзенай праблематыцы: «Беларускі народны каляндар» (пад рэд. Ю. Лозкі); 1993; В.Дз. Ліцьвінка «Святы і абрады беларусаў», 1997; У.М. Сысоў «3 крыніц спрадвечных», 1995; І. Крук «Следам за сонцам...: Беларускі народны каляндар» і шэраг іншых [6, с. 60].

Не аслабла ўвага даследчыкаў у гэты час і да традыцыйнай матэрыяльнай культуры беларусаў, адметнасцяў народнага мастацтва. Так, С. Сергачоў («Беларускае народнае дойлідства», 1992) і А.І. Лакотка («Беларускае народнае дойлідства», 1991; «Пад стрэхамі прашчураў», 1995) падрабязна і дэтальна, з вялікай колькасцю фотаздымкаў і схем ахарактарызавалі тэхналогію, сацыяльную і рэгіянальную спецыфіку беларускага дойлідства [9, с. 331].

Надзвычай важнай падзеяй у беларускай этнаграфіі на сучасным этапе стала выданне шматтомнай серыі «Беларусы». Аўтары імкнуліся надаць працы маштабны абагульняючы характар, садзейнічаць уключэнню беларускага фальклору ў агульнаславянскі кантэкст. На жаль, такая абагульнёнасць амаль цалкам пазбавіла даследаванне рэгіянальных кампанентаў: фактычна ва ўсіх выданнях серыі «Беларусы» аўтары толькі фрагментарна, эпізадычна пазначаюць арэальныя асаблівасці і рэгіён бытавання розных этнакультурных з'яў.

Вывучэнню рэгіянальных асаблівасцей этнамузычнай культуры Падзвіння прысвечана праца прафесара Беларускага універсітэта культуры і мастацтваў, А.В. Скорабагатчанкі «Народная інструментальная культура беларускага Паазер'я» [19].

У 1990 – 2000-я гады працягваецца выданне кніг серыі БНТ: «Вяселле: Мелодыі» і «Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі», «Паэзія беларускага земляробчага каляндара», «Замовы», «Жаніцьба Цярэшкі» (зборнік прысвечаны абраду, асноўным арэалам распаўсюджання якога з'яўляецца Падзвінне), «Радзіны: Абрад. Песні», «Гульні, забавы, ігрышчы» (пазначаюцца тэрыторыі распаўсюджання асноўных велічальных гульняў, што ілюструецца адпаведнымі картамі), «Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка». Апошняя ўяўляе сабой даволі поўны звод народных медыцынскіх рытуальна-магічных практык, сабраных з самых розных друкаваных крыніц і архіваў. Як пазначае аўтар выдання, Т.В. Валодзіна, не ўсім рэгіёнам аднолькава «пашанцавала» са збіральнікамі лекавальнай магіі. Так, пэўную перавагу мае Падзвінне праз грунтоўныя зборы такіх выбітных народазнаўцаў, як Ф. Вярэнька і М. Нікіфароўскі, і збіральніцкую дзейнасць супрацоўнікаў і студэнтаў Полацкага дзяржаўнага універсітэта [20, с. 76].

Такім чынам, нягледзячы на значныя поспехі беларускіх навукоўцаў у галіне вывучэння традыцыйнай культуры, у тым ліку яе рэгіянальных асаблівасцей, важнай праблемай айчыннай этнаграфічнай навукі на сучасным этапе застаецца адсутнасць прац, у якіх аб'ектамі комплекснага і сістэмнага вывучэння выступалі б гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны, ў прыватнасці – Падзвінне.

Рэспубліканскае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства». Першым цэнтрам, які запачаткаваў сучасную неакадэмічную практыку даследавання народнай культуры, стаў цэнтр этнакасмалогіі «Крыўе», які ўзнік у 1992 – 1993 гады. Гэты грамадска-навуковы рух задаў пэўны ідэалагічны накірунак беларускаму фальклорна-этнаграфічнаму краязнаўству: узняў праблему этнагенэзу беларусаў і роль Балтыі, паставіў геапалітычныя арыенціры не на Захад ці на Усход, а на Поўнач; узняў праблему культурнай блізкасці беларусаў і балтыйскіх народаў; вылучыў як ядро беларускага этнасу крывіцкую тэрыторыю і традыцыю крывіцкай дзяржавы – Полацкага княства, што прадвызначыла назву арганізацыі і асноўныя накірункі этнаграфічных даследаванняў. Цэнтрам этнакасма-

[1]Запісана аўтарам 10.03.2006 ад Канстанцінавай Т.Л., дацэнта кафедры беларускай музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, ст. навуковага супрацоўніка ІМЭФ НАНБ у г. Мінску.

логіі «Крыўе» на працягу 1993 – 1994 гадоў было арганізавана чатыры этнаграфічныя экспедыцыі на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Адметна, што ўсе яны былі прывязаны да культавых месцаў: «Змееў камень» (Чашніцкі раён, ваколіцы Лукомскага возера), «Сцёп-камень» (Докшыцкі раён, этнаграфічна-археалагічная экспедыцыя), «Ушацкія азёры» (комплекс азёр на мяжы Полацкага і Ушацкага раёнаў), «Вытокі рэчкі Віліі» (вытокі р. Віленкі, памежная з Літвой тэрыторыя)[1].

Па меркаванні А.А. Глушко, старшыні студэнцкага этнаграфічнага таварыства, цэнтр этнакасмалогіі «Крыўе» першым у сваёй працы паставіў задачу комплекснага вывучэння феномена традыцыйнай культуры, звярнуўшы асаблівую ўвагу на той пласт, які ляжыць у падмурку традыцыйнай культуры: міфалагічныя ўяўленні, уяўленні мадэлі свету, спосабы ўздзеяння чалавека на гэты свет, у тым ліку магічныя, і вывучэнне сакральнай геаграфіі. Гэтую традыцыю потым пераняла і студэнцкае этнаграфічнае таварыства (СЭТ). Як пазначана ў Статуце СЭТа, прынятага на ўстаноўчым сходзе 7 красавіка 2002 года, Рэспубліканскае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне (РМГА) «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» – гэта самадзейная арганізацыя, якая аб'ядноўвае моладзь, згуртаваную на глебе каштоўнасцяў беларускай традыцыйнай этнічнай культуры і ставіць на мэце захаванне і забеспячэнне пераемнасці беларускай аўтэнтычнай культурнай традыцыі; захаванне і аднаўленне беларускага прыроднага і культурнага ландшафту як натуральнага асяроддзя існавання традыцыйнай этнічнай культуры; пераадоленне крызісу духоўнасці ў сучасным грамадстве на аснове каштоўнасцей традыцыйнай беларускай культуры.

З 1998 года СЭТ стала і рэгулярна займаецца палявой этнаграфічнай дзейнасцю. Сябры таварыства праводзяць летнія экспедыцыі, а таксама выезды (у іншы час звычайна больш кароткія) з мэтай запісу канкрэтных выканаўцаў, альбо правядзення сумесна з вяскоўцамі аўтэнтычнага свята ці абраду [3, с. 147]. Акрамя гэтага ў таварыстве распрацоўваюцца метадычныя матэрыялы па краязнаўству (вучэбны фільм па правядзенню этнаграфічных даследаванняў), праводзіць культурна-асветныя, мастацкія акцыі, народныя святы і абрады, мерапрыемствы экалагічнага характару (расчышчэнне забруджаных могілак, святых крыніц), здзяйсняе вытворчую дзейнасць на аснове народных рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, ладзіць навуковыя семінары і канферэнцыі. Працягласць комплекснай летняй экспедыцыі – дваццаць тыдні, а колькасць удзельнікаў – 15 – 20 чалавек. Размясціўшы ў адным з населеных пунктаў вызначанага рэгіёну агульную экспедыцыйную базу, усе ўдзельнікі экспедыцыі падзяляюцца на невялікія групы (па 2 – 4 чалавекі) і накіроўваюцца па розных маршрутах. Потым усе ізноў збіраюцца на агульнай базе і падводзяць вынікі даследавання. Эфектыўнасць дадзенай методыкі ў тым, што яна дазваляе не толькі ахапіць значную тэрыторыю, але і сабраць вялікі фальклорна-этнаграфічны матэрыял, галоўны ж недахоп – некаторая павярхоўнасць даследавання, бо такія экспедыцыі носяць больш разведвальны характар.

Дзякуючы такой актыўнай палявой этнаграфічнай дзейнасці РМГА «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» сабрала даволі багаты фальклорна-этнаграфічны архіў, які складаецца з аўдыё- і відэазапісаў, а таксама з фотаздымкаў. З 2000 года матэрыялы пачалі архівавацца ў лічбавы фармат, у чым істотную дапамогу аказвае аддзел славістыкі ІМЭФ АН [3, с. 148]. Актуальнай праблемай застаецца апрацоўка і архівацыя сабраных дадзеных. Па выніках кожнай вялікай экспедыцыі афармляецца фотаальбом, лічбуюцца відэа- і аўдыёкасеты, аднак на падрабязную апрацоўку матэрыялаў для ўпарадкавання архіва звычайна не хапае часу.

Этнаграфічнае і фальклорнае вывучэнне Беларускага Падзвіння ў вышэйшых навучальных установах Беларусі

Беларускі дзяржаўны універсітэт і навукова-даследчай лабараторыя беларускага фальклору. Традыцыя збірання фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў студэнтамі БДУ бярэ пачатак ад часоў адкрыцця універсітэта (з 20-х гадоў XX ст.), аднак усе сабраныя даваенныя матэрыялы, якія былі перададзены ў архіў Акадэміі навук, былі знішчаны ў час вайны [2, с. 226].

Пасля ўвядзення двухтыднёвай палявой вучэбнай практыкі па фальклору напачатку 1960-х гадоў фалькларыстыка на філфаку БДУ была пастаўлена на навуковую аснову, стала планамернай, сістэматычнай і мэтанакіраванай. Яе ўзначалілі фалькларысты В.А. Захарава і Н.С. Гілевіч. Выбраны імі накірунак даследавання рэгіянальнай спецыфікі фальклору арганічна дапаўняў фундаментальныя жанрава-мастацкія даследаванні фальклору Акадэміі навук. Н.С. Гілевіч узначаліў збор этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў студэнтамі на Падзвінні і ў Цэнтральнай Беларусі [21]. Запісы, зробленыя ў гэтых рэгіёнах, увайшлі ў фундаментальныя зборнікі: «Песні народных свят і абрадаў», «Казкі і апавяданні беларусаў», «Лірычныя песні», «Лірыка беларускага вяселля», «Замовы», выдадзеныя ў розныя гады Н.С. Гілевічам.

Такім чынам, з пачатку 1960-х гадоў філалагічны факультэт БДУ арганізоўваў этнаграфічныя экспедыцыі па збору фальклору па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Экспедыцыі праводзіліся ў якасці фальклорна-этнаграфічнай практыкі студэнтаў першага курса, якія падзяляліся на групы па 12 – 18 чалавек і адпраўляліся ў пэўны рэгіён. Кіраўнікамі экспедыцый прызначаліся навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі філфака БДУ або іншых устаноў [3, с. 146].

[1] Запісана аўтарам 06.03.2006 ад Глушко А.А., старшыні РМГА «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» ў г. Мінску.

З канца 1990-х гадоў гэта практыка пераравана з-за поўнай адсутнасці сродкаў. Зараз студэнты атрымліваюць індывідуальнае заданне, якое прадугледжвае мінімальную колькасць сабраных фальклорных твораў – каля 50-ці фальклорных адзінак. Раён праходжання індывідуальнай практыкі пазначаецца кіраўніком у якасці рэкамендацыі, але звычайна студэнты выязджаюць збіраць матэрыялы ў сваю мясцовасць[1]. Праверкай работы студэнтаў займаюцца выкладчыкі кафедры тэорыі літаратуры, у якіх не заўсёды атрымліваецца заўважыць нядобрасумленна выкананае заданне. Таму, як пазначаюць супрацоўнікі лабараторыі, якасць студэнцкіх матэрыялаў пасля ўвядзення самастойнай формы праходжання фальклорнай практыкі на філфаку БДУ значна пагоршылася.

Вялікая збіральніцкая і даследчая фальклярыстычная праца на моўных і літаратурных кафедрах падрыхтавала адкрыццё на філфаку БДУ ў студзені 1982 года Міністэрствам адукацыі Беларусі спачатку групы, а ў 1985 годзе навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору і дыялекталогіі як каардынацыйнага цэнтра збірання, вывучэння і даследавання фальклору ў ВНУ краіны.

Асновай працы лабараторыі сталі створаныя на аснове кафедральных архіваў філфака БДУ, а пазней і філфакаў большасці іншых універсітэтаў і інстытутаў 4 фальклорныя архівы лабараторыі: рэгіянальны і жанравы (у кожным на сённяшні дзень каля 4 мільёнаў тэкставых запісаў), аўдыё- і відэаархіў [21]. Па колькасці матэрыялаў Віцебскі рэгіянальны архіў саступае архівам Мінскай, Гродзенскай і Гомельскай абласцей. Важнейшай задачай для супрацоўнікаў лабараторыі беларускага фальклору з'яўляецца захаванне багатых архіваў, асабліва аўдыё-і відэаархіваў. Таму з 2003 года вядзецца рэстаўрацыя і перанос усіх сабраных аўдыё-і відэаматэрыялаў на электронныя носьбіты інфармацыі [3, с. 148].

Кабінет народнай музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Значная ўвага палявым даследаванням на-аецца ў Беларускай акадэміі музыкі. Тут у 1982 годзе быў створаны кабінет народнай музыкі імя Р. Шырмы, з мэтай утварэння базы для навуковых распрацовак і вучэбных курсаў па музычнаму фальклору і інструментальнай народнай культуры. У выніку шматгадовай пошукава-экспедыцыйнай работы студэнтаў акадэміі музыкі пад кіраўніцтвам спецыялістаў-этнамузыколагаў у кабінеце народнай музыкі сабраны каштоўны па сваім музычным змесце фонаархіў. Большую частку архіўных фондаў складаюць унікальныя палявыя запісы ўзораў аўтэнтычнага песеннага і інструментальнага фальклору, зафіксаваных у 80 раёнах Беларусі, у тым ліку ў 15 раёнах Віцебскай вобласці: Докшыцкім, Чашніцкім, Бешанковіцкім, Мёрскім, Шумілінскім, Віцебскім, Пастаўскім, Лепельскім, Полацкім, Верхнядзвінскім, Аршанскім, Гарадоцкім, Чашніцкім, Талачынскім, Браслаўскім (на 2006 г.)[1].

Фонды архіва этнамузыкі пачалі складацца значна раней, чым быў створаны кабінет. Першыя нотныя транскрыпцыі датуюцца 50-мі гадамі XX стагоддзя, зробленыя Л.С. Мухарынскай. Ёю ў розныя гады былі арганізаваны і праведзены працяглыя і мэтанакіраваныя экспедыцыі ў розных кутках Беларусі, у тым ліку і на Падзвінні (Дзісненскі, Верхнядзвінскі, Докшыцкі раёны Віцебскай вобласці).

Палявыя даследаванні Акадэміі музыкі не скіраваны пэўны адзіны гісторыка-этнаграфічным рэгіён. Іх вылучае суцэльнае, на аснове рэкагнасцыровачных і пауторных выездаў, пераважна франтальным ахопе аб'ектаў назірання, абследаванне беларускай этнічнай тэрыторыі. Геаграфія экспедыцый ахоплівае большую частку сучаснай адміністратыўнай тэрыторыі Беларусі, а таксама некаторыя сумежныя раёны Смаленскай і Пскоўскай абласцей.

Так, напрыклад, у Падзвінскім рэгіёне праводзіліся палявыя даследаванні: 1990 год – Мёрскі і Лепельскі раёны; 1993 – 1994, 2001 гады – Пастаўскі раён; 1995, 1996 і 1998 – Докшыцкі раён; 1996, 2001 – Полацкі раён; 1997 год – Чашніцкі раён; 2003 –Дубровенскі, Аршанскі, Браслаўскі раёны і інш.

Палявая этнаграфічная практыка студэнтаў Беларускай акадэміяй музыкі праходзіць наступным чынам. Фарміруецца група, звычайна 22 - 24 чалавекі, пад кіраўніцтвам 1 – 3 выкладчыкаў з кафедры беларускай музыкі ці лабарантаў кабінета народнай музыкі (спецыялізацыя этнамузыколаг) і выязджае ў пэўную мясцовасць. Яны спыняюцца ў інтэрнаце ці размяшчаюцца лагерам у наймётах. Потым студэнты падзяляюцца на больш дробныя групы (3 – 5 чалавек), якія накіроўваюцца па розных маршрутах. Тэрмін экспедыцыі 2 – 4 тыдні[1].

Асаблівасцю правядзення палявых даследаванняў этнамузыколагаў з'яўляецца непасрэдны запіс народных музычных твораў на стужкавыя ці лічбавыя носьбіты і далейшае яго паціраванне. Хаця найбольшая ўвага падчас экспедыцый надаецца этнамузыказнаўчаму накірунку (гэта ў асноўным песенны фальклор), але паралельна фіксуецца этнаграфічнае апісанне абрадаў, празаічныя фальклорныя творы. У пэўнай ступені дзякуючы гэтаму, а таксама прафесійнаму ўзроўню правядзення палявых даследаванняў Акадэміяй музыкі, сабраныя матэрыялы вызначаюцца высокай якасцю і дакладнасцю.

---

[1] Запісана аўтарам 10.03.2006 г. ад Бярковіч Таццяны Леанідаўны, загадчыцы кабінета народнай музыкі, дацэнта кафедры беларускай музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ў г. Мінску.

Полацкі дзяржаўны універсітэт. На сённяшні дзень ПДУ з'яўляецца амаль адзіным дзяржаўным універсітэтам, які разам з археалагічнай практыкай студэнтаў-гісторыкаў праводзіць штогадовыя этнаграфічныя экспедыцыі [22, с. 55]. Навуковыя кіраўнікі практыкі: з 1995 па 2006 год – канд. гіст. навук, дацэнт кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі У.А. Лобач; з 2006 года – ст. выкладчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі У.С. Філіпенка. Сферай інтарэсаў экспедыцый ПДУ з'яўляецца выключна рэгіён Падзвіння.

Этнаграфічная практыка ў ПДУ прадугледжана для студэнтаў першага курса і праходзіць улетку. Да гэтага часу студэнты ўжо праслухалі курс «Этнаграфія Беларусі», таму маюць неабходны мінімум ведаў, неабходных для ўдзелу ў палявым этнаграфічным даследаванні. Прычым патрапіць на этнаграфічную практыку могуць толькі тыя студэнты, якія выявілі высокі ўзровень ведаў і зацікаўленасці ў народнай культуры. Група колькасцю 10 – 12 чалавек выязджае на месца экспедыцыі і спыняецца ў лагеры (намётах) ці ў вёсцы. Працягласць экспедыцыі – тры тыдні. Удзельнікі падзяляюцца на групы па 2 – 3 чалавекі. Абследаванне навакольных вёсак адбываецца «радыяльна» (г. зн. пачынаюць з бліжэйшых населеных пунктаў, а потым абходзяць больш дальнія)[1]. Характэрная асаблівасць палявых даследаванняў ПДУ – іх комплекснасць. Збіраецца не толькі песенны фальклор, а таксама інфармацыя па самым шырокім спектары народных уяўленняў: прастора і час, спосабы лекавання хвароб, адносіны да знахарства і чарадзейства, этнічныя стэрэатыпы і г.д. Значная ўвага падчас экспедыцый надаецца вывучэнню сакральнай геаграфіі рэгіёну (вывучаюцца святыя крыніцы, сакральна пазначаныя камяні, валатоўкі, урочышчы, святыя азёры і г.д.)

Адным з важнейшых прынцыпаў правядзення этнаграфічнай даследчыцкай дзейнасці ў ПДУ з'яўляюцца навуковасць, дакладнасць як у зборы матэрыялаў, так і пры іх далейшай іх апрацоўцы. Трэба адзначыць, што сабраныя этнаграфічныя матэрыялы не асядаюць на паліцах універсітэцкага архіва, а актыўна ўводзяцца ў навуковы зварот. Так, напрыклад, палявыя матэрыялы выкарыстоўваліся пры напісанні артыкулаў, курсавых і дыпломных прац па этнаграфіі.

Значным поспехам полацкіх этнографаў стала выданне ў 2006 годзе першага выпуска «Полацкага этнаграфічнага зборніка» (у 2-х т.). Ініцыятарамі выдання сталі выкладчыкі Полацкага дзяржаўнага універсітэта У.А. Лобач і У.С. Філіпенка. Першы выпуск «Полацкага этнаграфічнага зборніка» прысвечаны разгляду дасюль яшчэ маладаследаваных народна-медыцынскіх поглядаў і магічна-рытуальных практык.

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка. Збіральніцкая і даследчыцкая фальклярыстычная дзейнасць у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце (БДПУ) была распачата В.Дзм. Ліцьвінкай, які ўвёў фальклорную практыку для студэнтаў беларускага аддзялення філалагічнага факультэта. Аднак усе сабраныя падчас экспедыцый матэрыялы адразу перадаваліся на захаванне ў Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Уласны архіў вуснай народнай творчасці ў БДПУ пачаў фарміравацца ў 1992 годзе па ініцыятыве фальклярыста, этнографа, канд. філал. навук У.А. Васілевіча (з 2004 года – загадчык кафедры этналогіі і фальклярыстыкі), які ўзначаліў збіральніцкую дзейнасць у галіне фальклору ва універсітэце.

В.Дзм. Ліцьвінка ўвёў фальклорную практыку для студэнтаў у зімовы перыяд, каб праслухаўшы тэарэтычны курс, яны адразу выязджалі «ў поле». Экспедыцыйныя групы былі вялікія (20 – 25 чалавек), у 1990-я гады гэтая колькасць была зменшана да 10 – 12 чалавек. Пазначалася прыблізная колькасць тэкстаў, якія трэба было сабраць кожнаму студэнту. Зараз гэтае патрабаванне – 100 фальклорных твораў ад кожнага студэнта здаецца калі і дасягальным, аднак надзвычай складаным для выканання[2].

З-за адсутнасці належнага фінансавання з 1993 года групавая форма правядзення фальклорнай практыкі ў БДПУ змяняецца на індывідуальную. Такая форма правядзення палявых даследаванняў мае як дадатныя, так і адмоўныя бакі. Падчас практыкі ахоплівасцца значна большая тэрыторыя: «Выйгрыш ад такога планавання быў відавочны – не сем і не чатырнаццаць раёнаў ахоплена за сезон, а звыш шасцідзесяці» (У.А. Васілевіч) [3, с. 150]. У той жа час становіцца складаней кантраляваць якасць і добрасумленнасць выканання задання.

Акрамя тэкставай часткі архіў змяшчае каля 700 аўдыёкасет, больш за паўсотні з якіх запісаныя на Падзвінні (на 2006 г.). Найбольшая колькасць фоназапісаў прывезена з Лепельскага, Дубровенскага, Глыбоцкага, Браслаўскага, Полацкага, Шаркаўшчынскага, Чашніцкага і Пастаўскага раёнаў Віцебскай вобласці)[2].

У заключэнне можна зрабіць наступныя ***высновы***:

1) у 1950-я – 1980-я гады асноўным цэнтрам фальклорна-этнаграфічнага вывучэння як усёй Беларусі ў цэлым, так і асобных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў (у тым ліку і Падзвіння) з'яўлялася Акадэмія навук БССР. Трэба адзначыць, што цэнтралізацыя ў сферы навукі, якая панавала ў гэтыя гады, наяўнасць кіраўнічай, каардынуючай усесаюзнай арганізацыі – АН СССР – мела як адмоўныя, так і станоўчыя бакі.

[1]Запісана аўтарам 18.04.2006 ад Лобача У.А., дацэнта кафедры гісторыі і сацыялогіі Полацкага дзяржаўнага універсітэта.
[2]Запісана аўтарам 15.04.2006 г. ад Васілевіча У.А., загадчыка кафедры этналогіі і фальклярыстыкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта ў г. Мінску.

Усесаюзная Акадэмія навук складала «Каардынацыйны план», у якім узгадняліся накірункі цалкам па рэспубліканскіх акадэміях. Згодна з ім распрацоўвалася тэматыка даследаванняў у кожным сектары АН БССР. Такая арганізацыйная вертыкаль прадугледжвала, забяспечвала належнае фінансаванне навуковых праектаў і спрыяла актывізацыі выдавецкай дзейнасці. З другога боку, такая навуковая цэнтралізацыя ўносіла абмежаванні ў тэматыку тэарэтычных і практычных даследаванняў, якія былі ў асноўным скіраваны на збіранне фальклору, прадметаў матэрыяльнай культуры; вывучэнне сямейна-абрадавага і земляробчага цыклаў беларускай традыцыйнай культуры. Разам з тым абміналіся ці аднабакова разглядаліся пытанні народнай медыцыны, вераванняў і светапогляду. Амаль забаронена ў савецкі час была тэма народнага календара. Таксама свой адбітак накладвалі ідэалагічны ўціск і «барацьба з рэлігіяй»;

2) у пачатку 90-х гадоў сітуацыя ў галіне фальклярыстыкі і этнаграфіі змяняецца: паўстаюць новыя дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі, рэгіянальныя цэнтры, якія займаюцца этнаграфічнай дзейнасцю, у тым ліку і на Падзвінні. Новае жыццё атрымаў у наш час грамадскі краязнаўчы рух. Найбольш дзейснай і масавай арганізацыяй стала РМГА «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства». Таму невыпадкова, што тэматыка этнаграфічных даследаванняў значна пашырылася: акрамя класічных запісаў фальклору і абрадавасці сучасныя даследчыкі цікавяцца сакральнай геаграфіяй, міфалагічнымі і рэлігійнымі ўяўленнямі беларусаў, магічнымі спосабамі ўздзеяння чалавека на навакольны свет. З'яўленне лічбавай апаратуры дазваляе больш надзейна захоўваць інфармацыю. Акрамя гэтага большая ўвага апошнім часам надаецца вывучэнню традыцыйнай беларускай культуры ў рэгіянальным кантэксце. Трэба асабліва адзначыць навукова-даследчыцкую і метадалагічную дзейнасць у дадзеным накірунку Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры;

3) як у савецкія часы, так і на сучасным этапе карыснай крыніцай назапашчвання твораў вуснай народнай творчасці з'яўляецца фальклорна-этнаграфічная практыка студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Найбольшых поспехаў у гэтым накірунку дасягаюць менавіта тыя ВНУ, дзе эфектыўна і арганічна спалучаюцца навучальны і навукова-даследчы працэсы. На прыкладзе Полацкага дзяржаўнага універсітэта, які за апошняе дзесяцігоддзе здолеў стаць важным цэнтрам этнаграфічнага (і археалагічнага) даследавання Падзвіння, бачна, што рэгіёны маюць вялікія патэнцыяльныя магчымасці для вывучэння і захавання (а таксама і аднаўлення) аўтэнтычнай народнай культуры. Трэба, аднак, адзначыць, што якасць студэнцкіх матэрыялаў у некаторых ВНУ, пасля ўвядзення там самастойнай формы праходжання фальклорнай практыкі, значна пагоршылася.

ЛІТАРАТУРА

1. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Докшыцкага раёна: рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2004. – 752 с.
2. Фядосік, А.С. Беларуская савецкая фальклярыстыка / А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987. – 350 с.
3. Палявая фальклярыстыка і этнаграфія: метадалогія, адкрыцці, праблемы. Інфарм. бюл. семінара // Весн. БелДІНК. – 2004. – № 1 (2). – С. 143 – 156.
4. Фальклорны архіў аддзела славістыкі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору.
5. Беларускі фальклор: энцыкл.: ў 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2005. – Т. 1: Акапэла – Куцця. – 768 с.
6. Лобач, У.А. Этнаграфія Беларусі: вучэб.-метад. компл. для студ. спец. 1-21 03 01 «Гісторыя», 1-02 01 02 «Гісторыя. Замежная мова» / У.А. Лобач. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 328 с.
7. Вопросы этнографии и фольклористики / под ред. В.К. Бондарчика. – Мінск: Наука и техника, 1979. – 149 с.
8. Бандарчык, В.К. Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі / В.К. Бандарчык. – Мінск: Навука і тэхніка. – 1972. – 163 с.
9. Беларусы: у 8 т. / В.К. Бандарчык; Ін-т мастацтвазн, этнагр. і фалькл.; рэдкал.: В.К. Бандарчык, М.Ф. Піліпенка, А.І. Лакотка. – Мінск: Бел. Навука, 1999. – Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння. – 365 с.
10. Піліпенка, М.Ф. Этнаграфія і антрапалогія ў НАН Беларусі / М.Ф. Піліпенка, Л.І. Цягака // Весці НАН Беларусі. – Серыя гуманіт. навук. – 1998. – № 4. – С. 83 – 90.
11. Белорусская этномузыкология: Очерки истории (XIX – XX вв.) / З. Можейко [и др.]; под ред. З. Можейко. – Минск: Техналогия, 1997. – 254 с.
12. Мажэйка, З.Я. Песні беларускага Паазер'я / З.Я. Мажэйка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 495 с.
13. Варфаламеева, Т.Б. Северобелорусская свадьба: Обряд, песенно-мелодические типы / Т.Б. Варфаламеева. – Минск: Наука и техника, 1988. – 156 с.
14. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]; склад. Т.Б. Варфаламеева. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – 910 с.
15. Музей старажытнабеларускай культуры: дапаможн. для наведв. / пад рэд. В.Ф. Шматава; Ін-т мастацтвазн., этнагр. і фалькл. НАН Беларусі. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 236 с.

16. Архіў аддзела старажытнабеларускай культуры ІМЭФ НАНБ у г. Мінску, справаздачы аб экспедыцыях: № 25 (акт № 59), № 30 (акты № 74 – 75), № 42 (акты № 115, 118), № 54 (акт № 153), № 90 – 92 (акты № 28 – 30), № 110 (акт № 43), № 112 (акт № 45).
17. Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў Паазер'я (Віцебшчына): навуковая справаздача / А.М. Боганева. - Мінск, 1998.
18. Палявая фальклярыстыка і этнаграфія: метадалогія, адкрыцці, праблемы. Інфарм. бюл. семінара // Весн. БелДІПК. – 2004. – № 1 (2). – С. 143 – 156.
19. Скорабагатчанка, А.В. Народная інструментальная культура Беларускага Паазер'я / А.В. Скрабагатчанка. Мінск: Беларус. навука, 1997. – 471 с.
20. Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка / уклад., прадм. і паказ. Т.В. Валодзінай; навук. рэд. А.С. Ліс. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 776 с. – (Беларуская народная творчасць).
21. Вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору БДУ [Электронны рэсурс] / Распрац.: А. Бей – электрон. дадз. – Мінск: Вучэб.-навук. лабараторыя беларус. фальклору БДУ, 2008. – Рэжым доступу: http://www.folkndl.bsu.by.
22. Этнагеаграфія Беларускага Паазер'я: справаздача па тэме навук. даслед. № 3097. – Наваполацк: ПДУ, 2002.

ВОБРАЗЫ І СЮЖЭТЫ ВЕТХАГА І НОВАГА ЗАПАВЕТАЎ У «НАРОДНАЙ БІБЛІІ» ВІЦЕБСКАГА ПАДЗВІННЯ
(ПА СУЧАСНЫХ ЗАПІСАХ)

А.М. БОГАНЕВА
(Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтва, Мінск)

На падставе шырокага кола этнаграфічных і фальклорных крыніц і матэрыялаў палявых даследаванняў аналізуецца спецыфіка адлюстравання і трансфармацыі біблейскіх сюжэтаў і вобразаў у традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў Падзвіння.

Легенды «Народнай Бібліі» – некананічныя апавяданні аб прадметах Св. Пісання, якія тэматычна і сюжэтна абапіраюцца на матэрыял Ветхага і Новага Запаветаў. Па зместу складаюць як бы другую свяшчэнную гісторыю, паралельную кананічнай, напоўненую казачна-міфалагічнымі элементамі і вобразамі. «Падобна апокрыфам, народныя легенды імкнуцца даць тлумачэнне тым эпізодам Свяшчэннага Пісання, якія, з пункту гледжання чытача або слухача, неабходна выкласці больш падрабязна» [1, с. 8].

Пры звароце да «народнай Бібліі» мы разглядаем толькі сюжэты, якія маюць непасрэдныя тэматычныя адпаведнікі ў Свяшчэнным Пісанні, у некаторых рэдкіх выпадках – у Свяшчэнным Паданні. Этыялагічныя легендарныя сюжэты, такія як аб паходжанні бусла, мядзведзя, зязюлі, некаторых марфалагічных асаблівасцяў людзей, птушак, раслін, жывёл і да т.п., што часта звязваюцца з Бібліяй у народнай свядомасці, але якія не звязаны напрамую з Біблейскай тэматыкай, не бяруцца нами пад увагу пры далейшым разглядзе.

Па нашых назіраннях, носьбітамі народнабіблейскай традыцыі на Падзвінні з'яўляюцца пераважна пажылыя жанчыны (ад 70 гадоў), праваслаўныя або каталічкі, якія маюць пачатковую, больш рэдка – сярэднюю адукацыю або зусім яе не маюць, дастаткова рэгулярна наведваюць (ці наведвалі) царкву (касцёл).

У свядомасці сельскіх жыхароў старэйшага пакалення адсутнічае рэзкая мяжа паміж кананічнай і народнай Бібліямі, таму што асноўнай крыніцай звестак пра біблейскія падзеі з'яўляецца вусная традыцыя (пры тым, інфармант можа спасылацца, што свае веды ён атрымаў у «польскай школе», чуў пропаведзь у царкве або касцёле, чытаў у «святой кніжцы», Евангеллі і да т.п.). Пра гэта ж гаворыць В.В. Белова: «Носьбітамі фальклорнай традыцыі «народная Біблія» ўспрымаецца як дадзенасць; пытанне аб кананічнасці або апакрыфічнасці гэтай крыніцы для іх не варта. <...> Як у фальклоры адзін і той жа сюжэт можа быць прадстаўлены шэрагам варыянтаў, і варыятыўнасць ёсць галоўная форма існавання фальклорнага тэксту, так і наяўнасць «варыянту» Бібліі не бянтэжыць нашых інфармантаў. Такім чынам на кніжную крыніцу пачынае распаўсюджвацца механізм бытавання фальклорнага тэксту» [1, с. 19 – 20].

На Віцебшчыне вусная Біблія актуальны і актыўны корпус тэкстаў, жанравая прыналежнасць якіх не абмяжоўваецца толькі этыялагічнымі легендамі. У жанравых адносінах наратывы, што ўваходзяць у «народную Біблію», уяўляюць досыць разнастайны склад. Па-першае, гэта значная частка этыялагічных, духоўна-этычных і эсхаталагічных легенд, звязаных з народнай інтэрпрэтацыяй Свяшчэннай гісторыі; па-другое, пераказы біблейскіх падзей, блізкія або тоесныя па сэнсу і зместу да кананічнага тэксту, пазбаўленыя апакрыфічных і міфалагічных элементаў, але выкладзеныя ў фальклорнай рэдакцыі і адлюстроўваючыя (відавочным або невідавочным чынам) светаўспрыманне апавядальніка; па-трэцяе, паведамленні пра Біблію, разважанні, выказванні і каментары апавядальніка аб дадзеным прадмеце [2, с. 89].

Тэксты «народнай Бібліі» гэтых трох груп, хоць і нераўнаважныя па сваёй тыповасці, жанравай прыналежнасці і распаўсюджанасці, аднолькава важныя для даследавання светапогляду, ментальнасці супольнасці, адаптацыі рэлігіі да народнага асяроддзя на тым ці іншым гістарычным этапе.

Нажаль, нават этыялагічным легендам менш пашанцавала ў плане даследавання і збірання ў параўнанні з іншымі няказкавымі і казкавымі жанрамі на працягу XX стагоддзя, што ж тычыцца пераказаў і расказаў пра Біблію, імі сталі цікавіцца збіральнікі толькі ў апошнія дзесяцігоддзі XX стагоддзя. Відавочна, што тэксты другой і трэцяй груп выходзяць за рамкі класіфікацыі народных легенд і нават за рамкі звычайнай класіфікацыі народнай прозы ўвогуле.

Так, пераказы фрагментаў Бібліі не з'яўляюцца, строга кажучы, ні легендамі, ні паданнямі, ні былічкамі, ні вуснымі бытавымі апавяданнямі, ні тым больш казкамі. Яны абапіраюцца на пісьмовую першакрыніцу і прадстаўляюць сабой менавіта пераказы гэтай крыніцы. Разам з тым вуснае функцыянаванне гэтых тэкстаў стварае ўмовы для іх фальклярызацыі, і з пункту гледжання ступені фальклярызацыі, пераказы можна раздзяліць на некалькі падгруп.

Першую можна ўмоўна назваць пераказы-копіі – тэксты, якія з большай або меншай дакладнасцю ўзнаўляюць арыгінал па агульным духу, зместу, сюжэту (размова, зразумела, не ідзе пра даслоўнае супадзенне). Часта сустракаюцца пераказы-копіі на тэму грэхападзення першых людзей. Напрыклад: «Расказавала <маці>, што Адам і Ева ня грэшныя людзі, жалі ў раю, хадзілі голыя і не стыдзіліся гэтага. Расказавала. Там расло дрэва, запрэтныя яблыкі. Када Ева сарвала запрэтны плод, Гаспадзь сагнаў іх. Мы цяпер гаруем праз іх»[1].

Другая падгрупа пераказаў – пераказы-удакладненні, калі ў тэксце, змястоўна блізкім да першакрыніцы, з'яўляецца фальклорная канцоўка, якая канкрэтызуе арыгінал з пункту гледжання дыдактыкі або «справядлівасці» завяршэння. Яркі прыклад гэтай групы пераказаў – тэкст пра Іаана Хрысціцеля ў пераказе Уліты Высоцкай 1903 г. н. з в. Міхалінава Лёзненскага раёна, дзе «увязаны» святыя Іаан Хрысціцель і Ілля Прарок, і гэта злучэнне дэманструе глыбокае веданне і разуменне сімвалічнага сэнсу Свяшчэннага Пісання. Змест Евангельскіх падзей, што тычацца смерці Іаана Прадцечы, перададзены вельмі дакладна, так што першую частку тэкста можна назваць пераказам-копіяй: «А Ілья жэ быў прарок, тожэ послан Богам. Ён быў Іванам Кресціцелем тут на земле, а людзі яго ўзялі да ўністожылі. А за што ўністожылі Крестіцеля? Значыць, царь Ірад адбіў ад брата жонку. А ён, Кресціцель, гаворіць: «Ты адбіў ад брата жонку. Эта ніхарашо!» А яе, жонку, звалі Радзіада. У яе і доч была ўжэ ад таго, ад брата. Ну, як сказаў ён так, ета Радзіада ўсё хацела, каб яго ўбіць. А тады нашла такей дзень шчаслівы, штоб яго ўбіць можна было. Царь Ірад мяніны спраўляў свае. Пригласіў тысячы начальнікаў сваіх, царей усіх, з каторымі дружыў, угашчаў іх. Ну і доч Радзіады вышла плісаць, і панравілась усім – дужа плісала харашо. Дужа і царю панравілась. Ён і гаворіць: «Я табе, што хочаш за ета дам. Хоць і палавіна царства свайго!» Ну, іна пашла к матке і гаворіць: «Што прасіць у царя?» А матка: «Прасі галаву Іоана Крясціцеля, каб на блюдзі табе падалі!» Ну, іна прішла к царю і сказала, што хочет галаву Іоана Кресціцеля на блюдзі. Царь паняў, што ён глубако ашібнуўся, што так сказаў, але слово сваё не можець змяніць ужэ. Царь паслаў аружёнца, аруженец атрубіў Іоану Крясціцелю галаву ў цямніцы, і прінёс яе на блюдзе дзеўке етай. А яна аддала мацері» [3, с. 199]. На гэтым заканчваецца пераказ Евангельскага сюжэта. Але з пункту гледжання народнай свядомасці, гісторыі яўна не хапае завершанасці ў плане справядлівай помсты зладзеям яшчэ тут, у зямным жыцці. Так з'яўляецца фальклорная канцоўка пра тое, як скончылі сваё жыццё віноўніцы пакут Іаана Хрысціцеля – Ірадзіяда і яе дачка-танцоўшчыца. «А маці яе, Радзіада, бросіла ету галаву ў мусарную яму. Як убросіла галаву, так іна сідзела на крыльце і задремала. І з трецяга ступня ўпала і забілася насмерць. Ударілася віском аб камень і ўмерла. А дочка яе ішла па кладке, а кладка абмёрзшая была і рукоятка абмёрзшысь. І іна сарвалася і ўтапілася ў ваду, і ей льдамі галаву атрезала. Во, значыць, сагрешылі как. А царь перажываў дужа. Ён знаў, што Іоан Кресціцель дужа прарок харошы, ён баяўся яго»[2] [3, с. 199]. У поўнай згодзе з народнай логікай: падобнае выклікае падобнае, кара грэшнай Ірадзіды і яе дачкі ізаморфная той кары, якой быў пакараны Іаан Хрысціцель.

Трэцяя падгрупа пераказаў – пераказы з этыялагічным вывадам або пераказы-легенды, якія тлумачаць існуючы парадак рэчаў прэцэдэнтам і адрозніваюцца ад этыялагічных легенд галоўным чынам сваёй адзінкавасцю: яны існуюць не ў калектыўнай свядомасці, традыцыі, а толькі ў індывідуальнай інтэрпрэтацыі расказчыка. Пры гэтым пераказы-легенды выдатна дэманструюць сам механізм генерацыі этыялагічных легенд. «Хрыстос сваім учанікам сказаў, умірая, што берагіце Маю Матку. Учанікі ж Яе і дужа бераглі, но Яна забалела і померла. Яна ўсіх благаслаўляла перад смерцю, а аднаго святога ні было, ён паехаў па якіх-та там дзялах. Калі ён прыехаў, Багародзіцы ўжо не было. Яна ўжо ў грабу ляжала, і еты ўчанік Хрыста прышоў да Яе папрашчацца. Адкрылі гроб – а там нет Багародзіцы, только цвяты лілії, Яна вознеслась у неба. <Таму> У гэты празнік у нас свенцюць цвяты, 15 аўгуста»[3] [3, с. 198]. Фактычна,

[1] Зап. А.М. Боганева і Т.В. Валодзіна ў 2006 г. ад С.П. Кузьміч 1934 г. нар., в. Сталюгі Лепельскага р-на.

[2] Зап. В.І. Басько ў 1997 г. ад У. Высоцкай 1903 г. нар., в. Міхалінава Лёзненскага р-на.

[3] Зап. В.І. Басько ў 1998 г. ад С. Бубала 1903 г. нар., в. Каралёва Верхнядзвінскага р-на. Фактычна, гэты сюжэт не біблейскі, а апакрыфічны, ён уваходзіць не ў Свяшчэннае Пісанне, а ў Свяшчэннае Паданне.

перад намі ў тэкставым плане ўжо гатовая этыялагічная легенда, не хапае толькі саюза «таму» перад паведамленнем пра асвячэнне кветак на Успенне і ўвядзенне тэкста ў калектыўны ўжытак.

Чацьвёртая падгруппа пераказаў – пераказы-інтэрпрэтацыі, калі пераказ біблейскага тэкста суправаджаецца каментарыямі і тлумачэннямі расказчыка адносна біблейскіх падзей. У наступным прыкладзе інфармант пераказвае Апакаіпсіс як прароцтва адносна падзей XX стагоддзя. «Откравєнія святога Іоана Богослова. Была кніжка запечатана – сям'ю пячацямі была запечатана. <...> Найшоўся Агнец закланный – ета Іісус Хрістос. <...> Ён узяў ету кнігу і стаў знімаць усе печаці. Сняў первую печаць – явіўся конь белый. На ім усаднік, імеўшій лук і венец пабеды – ета Ленін, царя пабедзіў, во, лук і венец пабеды. Сняў втарую пячаць – явіўся конь рыжый. На ім усаднік, імеець бальшэй меч, і яму дадзена ўзяць мір з зямлі, штоб убівалі друг-друга – ета рэпрэсіі. Данасілі адзін на аднага, во відзіш, як і цяперь убіваюць друг-друга, збываецца ета ўсё. Сняў трецюю печаць – явіўся конь вараны. На ім усаднік, імеець вясы і меру – ета значыць будзець важыць. Ета калхоз – малая плата падзённікам, трудадні... Ай, дзе плацілі, а ў нас дак саўсём не плацілі. Сняў чацвёртую печаць – явіўся конь бледны і за ім і смерць і ад дзьвінулась – ета нямецкая вайна. Тут і ў крематоріі людзей жглі, і ў аўтобусах жглі, такея аўтобусы былі спеціяльныя, і убівалі, і пралівалі кроў. <...> Сняў пятую пячаць – пайдуць на нас чэчэны, можа на нас, можа яшчо дзе, хто іх знаець. Будуць грабіць, будуць убіваць людзей, каго пупала. Толька той жывэй астанецца, хто ў кусты схуваецца, у лес, во. Ета ішчэ ні было – будзець»[1] [3, с. 759 – 760].

Пятая падгрупа пераказаў – пераказы-кантамінацыі, калі ў пераказ біблейскага тэксту (або тэксту Свяшчэннага Падання) уплецены этыялагічныя легенды. На Падзвінні такіх тэкстаў не было запісана, але не таму, што іх там не існуе, а таму што не было мэтанакіраванага збору матэрыялаў па пераказах «народнай Бібліі». Узорам такога пераказу-кантамінацыі можа служыць тэкст з Гродзенскага Панямоння «Пра зямное жыццё Божай Маці і Хрыста (чаму павука нельга біці, яўрэі свініну не ядуць, як певень ажыў)»[2] [4, с. 389].

Апавяданні або разважанні пра Біблію могуць прадстаўляць сабой больш-менш закончанае вуснае апавяданне (па жанру – легендарнае апавяданне), а могуць быць няжанравымі дыскурсіўнымі выказваннямі. «Сямён Пятровіч такій быў у нас, так ён старынных кнігаў быў начытаны. Так ён гаворіць, што было тут перяд вайной, ета кнігі былі да саракавога года напісаны ўсе, а цяпер не, цяпер новыя пішуць каторыя, а тых старынных ужо нет. Так гаворіць, во што будзець. Чалавек... брат брата будзець біць і брат сястру... Адзін у паліцыі, другій у партызанах, вот ета і прайшло. Увесь, гаворыць, сьвет целехвонам абцягнуты... Старыя людзі напярёд зналі, на сколька лет! <...> І вот ён старінны, старінны. Старінныя былі людзі»[3] [3, с. 760]. Тут маецца вельмі тыповая для наратываў пра Біблію спасылка на «старынныя кнігі», у якіх прадказывалася змяненне свету перад яго канцом. Звычайна размова ідзе не проста пра старыя кнігі, а старую Біблію, якая змяшчала прароцтвы пра будучыню. Але самая значная частка любой рэгіянальнай або нацыянальнай «народнай Бібліі» – этыялагічныя легенды.

Па зместу ў «народнай Бібліі» Падзвіння вылучаюцца наступныя тэматычныя фрагменты: стварэнне свету, першых людзей; Адам і Ева – першыя людзі; Каін і Авель; Вялікі Патоп; Вавілонская вежа; пераход яўрэяў праз Чэрмнае мора (Ісход, 14); Ілля-прарок (3-я кніга царстваў); Іаан Хрысціцель; Нараджэнне Хрыста; уцёкі Святога сямейства ў Егіпет; зямное служэнне Хрыста; Страсці Хрыстовы; Распяцце; Уваскрэсенне Хрыстова; Вазнясенне; эсхаталогія.

Сярод гэтых фрагментаў маюцца агульнараспаўсюджаныя па ўсёй Беларусі і рарытэтныя, прадстаўленыя адзінкавымі для традыцыі данага рэгіёну, але невыпадковымі сюжэтамі, што маюць аналагі ў іншых славянскіх народаў або ўвасабляюць тыповыя для розных народаў міфалагічныя прадстаўленні. Гэта, у прыватнасці, сатварэнне свету і людзей, паходжанне незвычайных істот – фараонаў (пераход яўрэяў праз Чэрмнае мора); адкуль сузор'е Вялікае мядзведзіца (Ілля-прарок).

Віцебскія легенды пра стварэнне свету і людзей адлюстроўваюць архаічныя ўяўленні, якія не маюць сувязі з Бібліяй (хоць самі інфарманты, верагодна, гэтага не ўсведамляюць). «Выган вялікі... Неяк расказана... ат веку было эта. Жывога рябёнка найшлі маленькага, і тады свет завёўся. А хто найшоў, як гэта – не помню»[4] [3, с. 758]. Аналагаў гэтага матыву ў сучасных і этнаграфічных славянскіх запісах не маецца, аднак ён выглядае не выпадковым, а архетыпічным, як матыў паходжання свету ад цела першачалавека ці іншай жывой істоты.

Як неаднаразова адзначалася сучаснымі даследнікамі «народнай Бібліі» (В.В. Бяловай [1], Д.У. Громавым [5], А.Е. Мельнікавай [6] і інш.), чытанне Бібліі ў народнай сельскай культуры «устойліва асацыіруецца з працэсам атрымання інфармацыі пра будучыню» і злучаецца з эсхаталогіяй. «У тэкставай

[1] Зап. В.І. Басько ў 1997 г. ад У. Высоцкай 1903 г. нар., в. Міхалінава Лёзненскага р-на.

[2] Зап. А.М. Богданева (далей, калі запісы зроблены А.М. Богдановай збіральнік не назначаецца) у 2002 г. ад В.А. Казакевіч, 1925 г. нар., хут. Дракі Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл.

[3] Зап. у 1998 г. ад А.А.Савельева, 1912 г. нар., в. Полькавічы Шумілінскага р-на.

[4] Зап. у 1998 г. ад А.А. Казловой 1901 г. нар., в. Андрэеўская Слабада Шумілінскага р-на.

прасторы «народнай Бібліі» этыялогія (касмагонія) і эсхаталогія (канец свету) складаюць рамачную канструкцыю, пялюсы якой люстрана адлюстроўваюць адзін аднаго» [1, с. 389].

Аднак, калі зыходзіць з назіранняў над сучасным бытаваннем тэкстаў і адпаведнымі публікацыямі, касмагонія (як падзея) часцей злучаецца з этыялогіяй, а эсхаталогія – з апісаннем светапабудовы [2, с. 101]. Тым не менш на Віцебшчыне сустракаліся апавяданні, дзе касмагонія пераходзіць у эсхаталогію, а эсхаталогія ў касмагонію, што пераканаўча ілюструе цыклічную мадэль міфапаэтычнага ўспрымання часу і гісторыі. «Пра гэта дзядзька расказваў. Гаворыць, сатварыўся сьвет. Васшуміць рака огненная, загудзіць Ангел, Архангел у залатую трубу. <...> І, гаворыць, канец сьвета быў ба. Вот цяпер жа ж <...> двухтысячны год пройдзець, а тады *апяць* (курсіў Л.Б.) канец сьвету будзець, сколькі там гадоў пасля двухтысячнага года. Яшчо даўжон пад Пісаніе, па-старінаму. <...> І загарітца і вада, і зямля, ўсё. У восем лакцей, гаворіт, будзець гарець, как паставіш локаць. Усё выгаріць. А тада Адама і Еву напісаў Сьвятой Дух. Так і завяліс людзі, ета што мы жывём. А то некатарыя гавораць з абезьян! Адам і Ева напісаны на пяску, падняліся людзі і пайшлі. Во дзядзька расказваў начытаны, старынных кнігаў начытаны. <...> *<А што пасля канца свету будзе?>* Згарыць усё, толькі остраў адзін на морі астанецца с людзям гдзе-та, і апяць будуць людзі жыць, ну там у стораны. *<І ат іх людзі разыйдуцца?>* А тут Адам і Еву напісаў Сьвятой Дух на пяску, а яны ўсталі»[1] [3, с. 758 – 759]. Пра «напісанне» человека на зямлі маюцца таксама паралелі ў беларускай «народнай Бібліі» на Гомельшчыне (в. Грабаўка Гомельскага р-на): «Кагда сатварiў Адама, напісаў пярстом, вдунуў душу»[2] [1, с. 222], а таксама ў паўночнарускай «народнай Бібліі»: «Потом Господь говорит Иисусу Христу: "Давай, – говорит, – сделаем мы человека по образу нашему". Вот Господь нарисовал на земле, на песке человека. Вдунул, вдохнул и вдунул душу, в нас дох Господа Бога» [7, с. 5]. (пар.: «И создал Господь Бог человека из праха земного, и вдунул в лице его дыхание жизни, и стал человек душею живою» (Быт. 2:7).

Практычна не сустракаюцца на сучасным этапе дуалістычныя легенды, дзе д'ябал удзельнічае ў стварэнні зямнога рэльефу і жывых істот, хоць на Падзвінні, мяркуючы па запісах Нікіфароўскага, такія легенды былі. У Шэйна, у прыватнасці, прыводзіцца легенда, дзе нячысты выступае ў якасці «нырца за зямлёй» [8, с. 36].

Матыў «нырца за зямлёй», з якой утварылася суша, вядомы ў розных народаў еўразійскага кантыненту і касмаганічных міфах індзейцаў Паўночнай Амерыкі. У сувязі з тым, што гэты матыў (у якасці нырца ў розных народаў могуць выступаць чарапаха, водаплаваючая птушка і іншыя жывёльныя і арніталагічныя персанажы) шырока распаўсюджаны ў розных народаў еўразійскага кантыненту, але адсутнічае ў Афрыцы, Аўстраліі, Акеаніі і на большай частцы Паўднёвай Амерыкі, існуе вялікая верагоднасць, што яго шматлікія еўразійскія і паўночнаамерыканскія версіі генетычна звязаны [9].

У беларускай версіі зямлю са дна дастае нячысцік, Бог робіць сушу з гэтай зямлі, а ўтоеная ад Бога зямля пры спробе нячысціка адыграць ролю творцы становіцца балотам. Персанажы гэтых версій, у прыватнасці, жывёльна-арніталагічныя ў архаічных міфах і нячысцік у беларускай легендзе ўзаемна карэ-ліруюць, пры тым, відавочна, што генетычна больш раннія персанажы – прадстаўнікі жывёльнага свету. Не выключана, што беларуская легенда прадстаўляе сабой трансфармаваную і пераасэнсаваную ў сувязі з монатэістычным светаўспрыманнем познюю версію старажытнага касмаганічнага міфу, вядомага на тэрыторыі Еўразіі і Паўночнай Амерыкі.

Тэма стварэння людзей мае на Падзвінні таксама адметнае ўвасабленне: «<Як> сьвет завёўся: Бог выйшаў, жмэньку ўзяў зямлі, як дунуў, так народ і выйшаў. І ўзяў Ён ту зямлю перяд етым, перяд Ражством. Ну вот. Тады Ісус Хрыстос радзіўся»[3] [3, с. 752]. У даным фрагменце матыў стварэння людзей з «праха зямнога» і дыхання Божага прадстаўлены ў нетыповым варыянце множнасці, калі ствараецца не адзін першы чалавек, а адразу цэлы народ. Акрамя таго, тут маецца звычайнае для «народнай Бібліі» храналагічнае смяшчэнне падзей, і «народ выходзіць» «перяд Ражством. <...> Тады Ісус Хрыстос радзіўся».

Легендарна-этыялагічныя сюжэты і пераказы Біблейскіх падзей, якія шырока распаўсюджаны па тэрыторыі Падзвіння (як і па іншых рэгіёнах Беларусі), шматкратна з пачатку 90-х гадоў запісваліся даследчыкамі – гэта сюжэты, аб'яднаныя тэмамі грэхападзення першых людзей, Вялікага патопу, уцёкаў Святога сямейства ў Егіпет, пакут Хрыстовых, Распяцця і Уваскрэсення Хрыстова, апошнімі часамі перад канцом свету, эсхаталогіяй.

Далей разгледзім толькі Старазапаветныя сюжэты, якія знаходзяць адлюстраванне ў народных этыялагічных легендах Віцебшчыны.

Тэма грэхападзення першых людзей рэалізуецца на Падзвінні пераважна праз легенды з этыялагічным матывам «чаму ў мужчыны кадык на горле»: «Бог прыказаў Адаму і Еве не снімаць яблыкі с ад-

[1] Зап. в 1998 г. от А.А. Савельева 1912 г. рожд., прав., 2 кл., д. Полькаовичи Шумилинского р-на Витебской обл.
[2] Палескі архіў (ПА), зап. Т.В. Рождественская в 1982 г.
[3] Зап. у 1998 г. ад М.П. Чаплінскай 1912 г. нар., в. Андрэеўская Слабада Шумілінскага р-на.

наго дзерава, ня есці. А прышла сатана і саблазніла: «Ай, вы будзеце ў раі есці этыя яблыкі». Як атарвалі, дак Ева з'ела, а Адам удавіўся. Вот у мужыка горла і тарчыць»[1].

У сюжэце, звязаным з грэхападзеннем, нярэдка інфармант упэўнена лічыць, што першы саграшыў Адам. «Сад быў вялікі-вялікі. Жылі ўдваіх, Адам і Ева. Ну, і яны, як... не жылі ўмесці. І Божанька ім сказаў, з якога дзерава ім яблыка есці, а з якога – не. Ну, бабуля мне так расказвала. А Адам яе саблазніў: "Давай з гэтага дзерава з'ядзём яблыка". Як з'елі яблыка – і ўсё. Яны голыя хадзілі, раздзетыя. А тады ў ліcця паўкручваліся, ужо ім стыдна стала. З этага дзерава ня нада была есці, а яны з'елі. З этых два чалавекі вышаў увесь народ, адзін ад аднаго. Усе мы браты і сёстры»[2]. У апошнім наратыве маецца часты для легенд пра Адама і Еву этыялагічны акцэнт пра з'яўленне ў людзей у выніку грэхападзення сораму і наступнага прыкрывання цела адзеннем, што служыць таксама эвфемістычным указаннем на першае злучэнне мужчыны і жанчыны. «Неяк Адам сказаў Еве не кусаць яблык, а яна ўзяла ды ўкуснула. Яны голыя хадзілі. А тады сталі адзежу. А цяпера апяць голыя ходзюць. Каб пупы голыя, эта ж такі пазор! Не хадзі, дзяцёнак так, дужа стыдна»[3]. Відавочна, што эмоцыі інфарманта тут выклікае не толькі і не столькі сучасная манера апранання, сколькі распушчанасць нораваў маладых людзей.

З першымі людзьмі звязана павер'е, што да грэхападзення скура ў іх была як пазногці, і яны не ведалі ні ходаду, ні спякоты. «Скура ў Адама і Евы была як ногці. Саграшылі – з'елі яблык з яблыні»[4]. Матыў пра скуру-пазногці з'яўляецца традыцыйным не толькі для беларускай, але і для украінскай, карпацкай, паўночнарускай, польскай, літоўскай, балгарскай «народных Біблій» [1, с. 239 – 241], паралелі з гэтым матывам маюцца і ў яўрэскіх крыніцах [10, с. 125 – 126]. На Падзвінні, як і па ўсёй Беларусі, мАтыў пра «рагавое цела» першых людзей сустракаецца ўсё больш рэдка, хоць паказальна, што ён яшчэ ўвогуле сустракаецца ў сучасных запісах.

Біблейскі сюжэт, звязаны з Каінам і Авелем, на Падзвінні звычайна рэалізуецца праз этыялагічны матыў паходжання плям на месяцы. «Я вот толькі не знаю, ці Кавель убіў Явеля ці Явель Каіна. Вот ён убіў і носіць на плячах яго. Як луна поўная, там як цень – адзін сагнуты. Гэта з дзетства»[5]. У гэтых легендах вывявы братоў з'яўляюцца на месяцы ў пакаранне за злачынства, а таксама для наставіну і навучання ўсім людзям, што глядзяць на месяц с зямлі. Акрамя Каіна і Авеля на месяцы могуць аказвацца самыя разныя персанажы: два браты, што не падзялілі зярно[6] [3, с. 752], браты, «буцянамі Бог здзелаў»[7] [3, с. 753 – 754] і інш.

Сюжэт пра Вялікі Патоп на Падзвінні сустракаецца як у выглядзе пераказаў, так і ў выглядзе этыялагічных легенд. Прыкладам пераказу-копіі з'яўляецца наступнае паведамленне пра патоп. «Чула, як быў Носў патоп, дык Бог сабраў усіх жывотных на карабль, дзе якая казяўка поўзаіць. Дык Ной сабраў і здзелаў каўчаг, і на ім плаваў. А тады на гарэ... На якой гарэ? Арарат – астанавіўся. І выпусціў усіх жывотных з каўчага і сказаў: «Быў свет і да будзет свет»[8]. У гэтым пераказе словы Бога пры пачатку стварэння свету: «Да будет свет», укладваюцца ў вусны Ноя невыпадкова. У народных легендах адраджэнне свету пасля патопу часта параўноўваецца або атаясамліваецца з другім стварэннем свету.

З патопам у народнай прозе звязаны таксама некаторыя агульнаславянскія этыялагічныя сюжэты, напрыклад, пра паходжанне бусла. «Эта мама расказавала пра змей. Што быў патоп, і тады іх жа ўсякага зверу ўзялі ў каўчэг, і бусла, ўсё. Чаго ён усіх есь? Ён жа і жаб усіх возьмець, і змей. І вот як яны там вываліліся з каўчэга, цэлы мяшок, і ён ухапіў змяю, і яе не праглынуў, а ўхапіў жывую, панёс – і сталі змеі размнажацца. І бусел іх во есь, больш жа ніхто ня есь. Я і сама відзіла, як ён яе б'ець аб зямлю, а яна круціцца, а тады во тут у яго шавеліцца. <Гэта ад патопу?> Ад патопу. <А каб ня вывалілася, змеяў бы не было?> Не было, а хай на іх!»[9]

У Старазапаветным сюжэце пра пераход габрэяў праз Чырвонае мора пільная ўвага ва ўсходнеславянскай традыцыі была нададзена не перайшоўшым габрэям, а патануўшым егіпцянам, з якімі звязваецца паходжанне міфічных істот – фараонаў, русалак, валдзяных, або насельнікаў воднай стыхіі – пэўных рыб (у прыватнасці, камбалы), жаб [1, с. 290 – 294].

На Падзвінні сюжэт пра паходжанне фараонаў – міфічных істот, падобных на русалак – запісаны як спалучэнне былічкі з этыялагічнай легендай (што ўвогуле характэрна для легенд пра фараонаў у розных фальклорных традыцыях). «Дзядзька расказваў пра мора. <...> Дак так ляціць, і ляціць, і ляціць, з вады паднімаецца. А тады апяць у ваду. Так ён казаў, плавалі на морі там фаравоны. Выйдуць далёка, за

---

[1] Зап. Т.І. Кухаронак у 2008 г. ад В.І. Дземянчонак 1916 г. нар., г. Полацк, нар. у в. Сяменчыкі Міёрскага р-на.

[2] Зап. Т.І. Кухаронак у 2008 г. ад В.К. Піліпёнак 1938 г. нар., в. Мураўшчына Полацкага р-на, нар. у в. Якушава, Глыбоцкі раён.

[3] Зап. Т.В. Валодзіна ў 2007 г. ад А.Д. Казакевіч 1936 г. нар., в. Гарнавенчання Талочынскага р-на.

[4] Зап. А.М. Боганева і Т.В. Валодзіна ў 2006 г. ад М.Р. Маціеўскай 1930 г. нар., в. Сокавара Бешанковіцкага раёна.

[5] Зап. Т.В. Валодзіна ў 2007 г. ад Н.М. Шушкевіч 1923 г. нар., в. Слабада Лепельскага р-на, нар. у Чашніцкім раёне в. Мар'іна.

[6] Зап. у 1998 г. ад Э.П. Шчарбаковай 1930 г. нар., г. п. Обаль Шумілінскага р-на

[7] Зап. у 1998 г. ад М.Н. Чаплінаскай 1912 г.нар., в. Андрэеўская Слабада Шумілінскага р-на

[8] Зап. Т.В. Валодзіна ў 2007 г. ад Н.М. Шушкевіч 1923 г. нар., в. Слабада Лепельскага р-на, нар. у Чашніцкім раёне в. Мар'іна.

[9] Зап. А.М. Боганева і Т.В. Валодзіна ў 2006 г. ад С.П. Кузьміч 1934 г. нар. в. Сталюгі Лепельскага р-на.

два кілометры слыхаць... Как запяюць, такія жаласныя яны... Рыбій хвост, а рукі, ногі – жэншчына – сіські. Так у музеі ж былі, матка ж хадзіла, з бацькам у Віцебске ў старыя г'ады. У музеі было фаравон у вадзе плаваў! Так... салдаты заслухваюцца тады. Жаласныя дужа песьні, і па вадзе раздаюцца красіва. І страляюць тады, каб яны хаваліся етыя фаравоны ў ваду. Так а цяпер, дзе яны падзеліся? У старыя г'ады былі. Гавораць, Майсей перавадзіў свайіх людзей чэраз мора... А етыя, каторыя гналіся, хацелі йіх не пусціць. І яны ў вадзе, а здзелалі йіх жывым. І плаваюць, і во ў музейі яны. <...> Эта фаравоны гналіся за йімі, а той Майсей свайіх людзей пав'ёў чэраз Дзьвіну, чэраз мора. А етыя гналіся, хацелі не дапусціць, і асталіся ў вадзе. І фаравонамі сталі»[1] [3, с. 755].

Адметнасць вобразаў фараонаў у даным запісу, што яны падобныя не толькі на русалак, але і на старажытнагрэчаскіх сірэн. Уяўленні пра падобных істот – «марскіх людзей», якія выходзяць на бераг і спевамі прыманіваюць да сябе падарожнікаў, маюцца таксама ў украінцаў Падоліі [11, с. 208].

У Беларусі легенды пра фараонаў – рэдкасць. За ўсю гісторыю збірання фальклору на яе тэрыторыі яны былі зафіксаваны ўсяго некалькі разоў. Упершыню легенда пра фараонаў (якія, дарэчы, таксама спяваюць журботныя песні) была запісана М. Федэроўскім на Гродзеншчыне [12, с. 453]. У 2007 годзе легенда пра фараонаў запісана ў в. Любань Вілейскага р-на «Ён свой народ пав'ёў у Егіпет на ту сторану, а фаравонамі сталі гэтыя, што гналіся людзі. Дак людзі перавярнуліся ў рыбы»[2]. Тут фараоны, як і ў запісах з Рускай Поўначы [13, с. 57, 94 – 97], не спяваюць, выглядаюць напаўрыбамі, напаўлюдзьмі.

У Беларусі маюцца ў сучасных запісах аналагічныя легендарныя сюжэты, звязаныя з пераходам габрэяў праз мора, толькі пра паходжанне русалак[3] [4] і вадзяных людзей[4] [1, с. 292].

Адзінкавым мікрадыялектным народнабіблейскім сюжэтам на Падзвінні (аналагаў яму пакуль што запісана не было) з'яўляецца этыялагічная легенда пра паходжанне сузор'я Вялікая мядзведзіца: «Вот калі тры звязды і яшчэ чатыры – мне мама казала – то святый Ілья ехаў на тройке, а коні збіліся і пабеглі. Не змог іх удзяржаць. І вот тры кані сталі тры звязды, адзін за адным. І чатыры калесы, як воз. Эта так і асталася на небе, і відаць: чатыры калясы – воз гэты і тры кані. Так коні збіліся і асталіся на небе»[5] [3, с. 752]. Строга кажучы, у прыведзенай легендзе адсутнічае ўласна біблейская тэматыка, сюжэт або матыў. Біблейскім тут з'яўляецца толькі персанаж – прарок Ілля. У славянскім фальклоры распаўсюджаны вобраз Ілліпрарока, які ездзіць па небе на каляснiцы, ад чаго грыміць гром. «Эта ж Ілля-прарок <з перуном>. На огненнай калеснiцэ ён ездзіець Ілля-прарок»[6] [3, с. 159].

Усе прыведзеныя легендарныя сюжэты і агульнараспаўсюджаныя, і рарытэтныя – тыповыя і паказальныя як у сінхраніі, так і ў дыяхраніі для беларускай, і, у прыватнасці, Падзвінскай традыцыі.

Пры звароце да матэрыялу рэгіянальных і нацыянальных «народных Біблій» зараз паўстаюць пытанні аб сувязях гэтых наратываў з шэрагам пазафальклорных фактараў. Існаванне і распаўсюджванне сюжэтаў народнай Біблії, несумнеўна, адлюстроўвае пэўны ўзровень і спецыфіку народнай рэлігійнасці – актуалізацыю рэлігійнага досведу ў культуры. Але пытанні, як адлюстроўвае, як народнабіблейскія тэксты звязаны з комплексам народна-хрысціянскіх наратываў у той або іншай лакальнай культуры, прыхадскімі практыкамі і звычаямі, вераваннямі, мясцовымі святынямі і да т.п. застаюцца ў большасці выпадкаў адкрытымі, што і абумоўлівае адпаведны комплекс даследчых задач, у тым ліку правядзення арэальных даследаванняў, накіраваных на ўсталяванне межаў распаўсюджання сюжэтаў, матываў, вобразаў народнабіблейскіх наратываў.

ЛІТАРАТУРА

1. «Народная Библия»: восточнославянские этиологические легенды / сост. и коммен. О.В. Беловой. - М., 2004. – 576 с.
2. Боганева, Е.М. Современные народнобиблейские нарративы белорусов: бытование, контекст, параллели (на материале сюжетов о сотворении мира и первых людях) / Е.М. Боганева // Фольклористика в контексте наук о традиционной духовной культуре: XIV междунар. съезд славистов. – Македония, Охрид, 2008. – С. 87 – 110.
3. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – 912 с.
4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т.: у 2-х кн. – Мінск, 2006. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. – Кн. 2. – 736 с.

[1] Зап. у 1998 г. ад А.А. Савельева 1912 г. нар., в. Полькавічы Шумілінскага р-на
[2] Зап. А.М. Боганева ў 2007 г. ад С.Б. Заікавіч 1935 г. нар., в. Любань Вілейскага р-на Мінскай вобл.
[3] Зап. В.І. Басько ад Веры Бобрык, 1920 г.н., в. Мяшэтнікі Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл.
[4] ПА. Зап. М.Г. Баброўская ў 1982 г. ад А.Я. Голубевай 1912 г. нар., в. Присно Ветковского р-на
[5] Зап. у 1998 г. ад З.С. Аглушэвіч 1928 г. нар., г.п. Обаль Шумілінскага р-на.
[6] Зап. у 1998 г. ад Р.П. Петручышынай 1928 г., г.п. Шуміліна

5. Громов, Д.В. Фольклорные тексты о «ранешней» Библии / Д.В. Громов // Живая Старина. – 2003. – № 1. – С. 42 – 44.
6. Мельникова, Е.А. Ожидания от книги. К вопросу о роли Библии в народной культуре / Е.А. Мельникова // Живая Старина. – 2003. – № 1. – С. 39 – 41.
7. Каспина, М.М. Образы Адама и Евы в народной культуре Каргополья / М.М. Каспина // Живая старина. – 2002. – № 3. – С. 5 – 6.
8. Легенды і паданні. – 2-е выд. дап. і дапрац. – Мінск, 2005. – 552 с.
9. Березкин, Ю.Е. Мир черепахи: от детских рассказов до космогоний (в связи с оберегом из североамериканской коллекции МАЭ) / Ю.Е. Березкин // Сб. МАЭ. – 2005. – Т. 50. – С. 251 – 279.
10. Каспина, М.М. Восприятие сюжета о грехопадении Адама и Евы в еврейской и славянской традиции / М.М. Каспина // Концепт греха в славянской и еврейской культурной традиции. – М., 2000. – С. 116 – 129.
11. Чубинский, П.П. Мудрість віків / П.П. Чубинский. – Київ, 1995. – Кн. 1. – 224 с.
12. Federowski, M. Lud bialoruski na Rusi Litewskiej / M. Federowski. – Krakow, 1987. – T. 1. – S. 108 – 109. (цыт. па Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік. – Мінск, 2004. – 592 с.).
13. Мифологические рассказы и легенды Русского Севера / сост. и автор коммент. О.А. Черепанова. – СПб., 1996. – 212 с.

ПРАВОСЛАВНЫЕ МОНАСТЫРИ ПОЛОЦКОЙ ЕПАРХИИ В XIX – XX ВЕКА

Е.Н. БОРУН
(Полоцкий государственный университет)

Представлено описание православных монашеских общин, существующих с 1833 по 1920 годы в пределах Полоцкой епархии. Определены их статус и роль в религиозной жизни Витебского региона.

30 апреля 1833 года была восстановлена Полоцкая епархия, в границах Витебской, Виленской, Курлянской губернии. С октября 1840 года ее приделы были уменьшены до административных границ Витебской губернии. В состав епархии входило 9 монастырей – 7 мужских и 2 женских:

- Марков Свято-Троицкий в Витебске;
- Полоцкий Богоявленский;
- Полоцкий Борисо-Глебский;
- Спасо-Евфросиниевский в Полоцке;
- Махировский Свято-Покровский;
- Невельский Свято-Преображенский мужской (с 1798 года являлся приписным к Витебскому Марковому монастырю);
- Тадулинский Успенский мужской;
- Свято-Духов в Витебске.

Существовавшие до 1839 года базилианские монастыри были упразднены или реформированы. Так, Сиротинский (в местечке Сиротино, Полоцкого уезда), Дорбыгорский (Лепельского уезда), Ушачский (Лепельского уезда) были упразднены, а их храмы обращены в приходские церкви. Женский монастырь Базилианок, при Софийском соборе был закрыт, монахинь переместили в Полоцкий Спасо-Евфросиниевский монастырь [1, ф. 2502, оп. 1, д. 2, л. 8 – 8 об].

В 1888 году по сведениям Витебского губернского статистического комитета на территории Полоцкой епархии находилось 7 монашеских общин. Из них штатных – 4, заштатных – 3. Штатными первоклассными являлись – Витебский Марков Святой Троицы мужской монастырь, Полоцкий Спасо-Евфросиниевский женский монастырь.

К второклассным относились – Полоцкий Богоявленский мужской, Тадулинский Успенский мужской (местечко Яновичи Витебского уезда Витебской губернии).

Заштатные: Невельский Преображенский мужской, Вербиловская Покровская женская община (село Вербилово Полоцкого уезда Витебской губернии), Бельчицкий Борисоглебский мужской монастырь [2, ф. 2502, оп. 1, д. 445, л. 4 – 6].

Большинство из них имени статус общежительных (киновиальных), лишь Полоцкий Богоявленский второклассный был необщежительным (идиоритм).

Уменьшение числа монастырей произошло в результате изменения их статуса, они были лишены самостоятельности и стали приписными. В 1854 году Витебский Свято-Духов монастырь, из-за полного запустения, попал под духовную протекцию Спасской обители. В 1855 году в нем проживало только 6 престарелых монахинь. В 1857 году Свято-Духов монастырь был упразднен, а все его земли (42 десятины 1068 кв. сажень усадебной и пахотной 37 десятин 2350 кв. сажень) были переданы Спасу. В монастыр-

ских корпусах разместилась женская тюрьма. В 1872 году тюрьме было предоставлено новое здание, а здание бывшего Свято-Духова монастыря, после необходимого ремонта было заселено новыми обитательницами – ученицами женского училища духовного ведомства [3, с. 26].

Махировский мужской монастырь, который находился в селе Махирова Слобода Полоцкого уезда Витебской губернии (до 1839 года был базилианским) в 1840 году стал заштатным. А с 1860 года его церковь стала использоваться как приходская.[4, ф. 2531, оп. 1, д. 40, л. 50]

В 1842 году вся собственность Борисоглебского мужского монастыря с 600 крестьянами поступила в казну, а сам он был причислен к заштатным [1, ф. 2502, оп. 1, д. 2, л. 8]. Руководство обителью осуществляли борисоглебские иеромонахи Инокентий Блыщинский (1842 – 1843 гг.) и Фауст Соболевский (1843 – 1847 гг.), а с 1847 года – протоиерей полоцкого Софийского собора Андрей Юркевич [5, с. 41]. По клировым ведомостям и спискам братства за 1843 – 1864 гг. число духовных лиц – жителей монастыря не превышало пяти человек (игумен-настоятель, заштатный священник, 1 – 2 монаха, послушник) [6, ф. 2904, оп. 1, д. 1, л. 5; ф. 2694, оп. 1, д. 62, л. 12]. Последним самостоятельным руководителем монастыря с 1862 года являлся игумен-иеромонах Августин Шостацкий, при нем в качестве эконома служил иеромонах Анатолий Точицкий, больше духовных лиц в клировой ведомости обители не числилось. С 16 августа 1863 года Бельчицкий заштатный монастырь был присоединен к Полоцкой Богоявленской обители и перешел под управление ее настоятеля архимандрита Сергия [7, ф. 2904, оп. 1, д. 1, л. 5;ф. 2904, оп. 1, д. 6, л. 1 – 2]. По его распоряжению для заведования и проведения богослужения к Борисоглебскому монастырю были прикомандированы священник Иоанн Лузгин и послушник Захарий Высоцкий [6, ф. 2904, оп. 1, д. 1, л. 4 об. – 5].

В 1879 году монастырь был приписан к Полоцкому Спасо-Евфросиниевскому и преобразован в женский. Спасская обитель получила: церковь Бориса и Глеба (каменная, однопрестольная); теплую церковь Святой Параскевы; деревянный двухэтажный дом; хозяйственные постройки; фруктовый сад; огород; озеро Черствяты; пахотной земли – 89 десятин 639 кв. сажень; сенокосной – 25 десятин 580 кв. сажень; леса – 142 десятины 1545 кв. сажень. При Борисо-Глебском монастыре находились 4 монахини и 4 послушницы (на 1907 год).

В 1888 году Тадулинский Свято-Успенский монастырь был преобразован из мужского в женский, после чего туда переехала часть насельниц Спасо-Евфросиниевского монастыря.

Крупнейшими и наиболее значительными для епархии являлись Витебский Марков монастырь (мужской) и Полоцкий Спасо-Евфросиниевский женский. По реестру они относились к первоклассным. В Марковой обители на 1903 год числилось 23 инока и 13 послушников, по штату из казны ежегодно отпускалось 4085 рублей. В собственности у Свято-Троицкой обители имелось 385 дес. 820 кв. сажень земли, озеро Кошо в Городокском уезде с 60 десятинами луговой земли, 2 кирпичных завода, водяная мельница, денежного капитала в общей сумме 26055 рублей [8, с. 91].

В Спасе в 1903 году проживали 32 инокини и 100 послушниц, на их содержание отводилось 3056,5 рублей. В 1909 году его населяло уже 156 человек, из которых: 40 монахинь, 36 рясофорных послушницы, 79 послушниц, 1 настоятельница. Из них: дворянского сословия – 5 человек, крестьянского – 137, мещанского – 16, дочерей священнослужителей – 6, дочерей чиновников – 3.

Спасская обитель владела 318,42 десятинами земли в Полоцке и 42 десятинами и 67 кв. саженями в Витебске, озером Чемесским, мельницей, денежным капиталом в размере 58936 рублей. В 1895 году Спасу был пожертвован крестьянами Вологодской Слободы Московской волости Санкт-Петербургского уезда участок земли (82,5 кв. сажень), где был организован монастырский двор, в 1906 году от А.П. Крыловой перешел деревянный дом в городе Витебске. В 1914 году крестьянин Т. Куль отписал своё недвижимое имущество, находящееся в селе Веденском, Царскосельского уезда, Санкт-Петербургской епархии.

Существенную роль в религиозной жизни региона играл Богоявленский мужской монастырь, в котором проживало 10 монахов и 23 послушника. Данный монастырь владел довольно крупной собственностью: хутором «Ропно» с озером «Рочница» (что составляло 254 дес. 840 кв. саж.); пустошью «Богоявленская» около Полоцка (31 дес. 1680 кв. саж.); пустошью «Глушица» (5 дес. 1560 кв. саж.); плацами в г. Полоцке (29,655 кв. саж.); мельницей на реке Полота.

Все монастыри епархии имели опыт религиозного просвещения. Церковно-приходские школы существовали практически при каждой обители: при Витебском Свято-Троицком с 1875 года, при Полоцком Богоявленском с 1896,при Тадулинском Успенском с 1894,при Вербиловской общине с 1897 года [8, с. 93].

С 1844 по 1918 год при Спасо-Евфросиниевском монастыре действовало женское училище. Открыто оно было в годы настоятельства игуменьи Клавдии Щепановкой. В первый год в нем обучалось 4 девочки, а уже в 1847 году – 18. В основном это дети в возрасте от 8 до 18 лет умерших священнослужителей. Они изучали Закон Божий, русский язык, историю, географию, арифметику, рукоделие. Девочки были уроженки Речецкого, Себежского, Полоцкого, Дрисенского, Лепельского, Невельского, Городецкого, Велижского уездов [9, с. 4]. В первые годы деления на классы не было, так как наблюдалась нехватка педагогов и классных помещений.

В 1850 году училище стало трехклассным. Обучение длилось 6 лет по два года в каждом классе. В первом классе изучали славянское и гражданское чтение, рукоделие; во втором – Закон Божий, чтение, русскую грамматику, чистописание и рукоделие; в третьем – Закон Божий, русскую историю, всеобщую географию, арифметику, русскую грамматику, пение и рукоделие [4, ф. 2531, оп. 1, д. 40, л. 21]. Для училища было выстроено отдельное здание с вместительными спальными, столовыми, учебными помещениями, учебные пособия имелись в достатке (так епископом Василием было подарено 200 экземпляров книг духовно-нравственного характера). Число воспитанниц неуклонно росло, на 1857 год их уже было – 34 [10, л. 32].

Расцвет деятельности училища пришелся на конец XIX века. Для комфорта учащихся было построено в 1897 году 2-х этажное здание, состоящее из прихожей, трех учебных помещений, зала, библиотеки, учительской комнаты и спальни (постройки велись на сбережения училища – 4 тыс. рублей; 2 тыс. были взяты из монастырского капитала). Кроме этого ему принадлежали выстроенные ранее (в 1876 году) два классных здания, хозяйственные помещения (1886 – 1889 гг.), отдельные помещения для больницы (1895), баня с прачечной (1898).

Благодаря стараниям игуменьи Евгении Говорович, управляющей Спасом с 1879 по 1900 год, в 1897 году для преподавания ряда дисциплин были приглашены лица, имеющие академическое образование. Вследствие этого была расширенна программа русского языка и дидактики, ввели преподавание иконописи, первоначальной медицинской помощи и гигиены, словесности, церковного пения (занятия вели педагоги Полоцкого кадетского корпуса).

В 1899 году женское училище приняло программу епархиального [11, с. 14]. Это дало возможность изучать историю русской литературы и физику, а с 1990 года обучать девочек игре на скрипке.

В результате таких положительных изменений возросло количество желающих обучаться в этом заведении – на 1897 год их число составило 117 . Этому способствовал и тот факт, что в конце 70-х годов с разрешения преосвященного Викториана двери училища открылись для представительниц всех сословий православного вероисповедания в возрасте от 9,5 до 12,5 лет (до этого таким правом обладали лишь дети священнослужителей) [12, л. 15]. По окончании обучения девицы получали звание учителей церковно-приходских школ.

В 1918 году женское училище было закрыто. На тот момент в нем обучались 265 воспитанниц (из которых 172 девочки – крестьянского и разночинного сословия, 93 – духовного). В училище преподавали следующие дисциплины: русский язык; словесность; история русской литературы; гражданская история; педагогическая психология; география; арифметика; алгебра; геометрия; физика; естествоведение; дидактика; пение; гигиена; чистописание; черчение; рисование; гимнастика; французский и немецкий языки. Но так как здания и хозяйственные постройки были хорошо сохранены, имелись методические и учебные пособия, 9 человек учителей, то по решению отдела народного образования на базе епархиального училища организовали совтскую школу 1 – 2 ступени [13, ф. 54, оп. 1, д. 12, л. 1].

Поле революционных событий 1918 года в связи с переходом к жесткой антирелигиозной государственной политике деятельность монашеских общин на Беларуси была запрещена. К 1920 году почти все монастыри в Полоцкой епархии были закрыты. Лишь Спасо-Евфросиниевская обитель продержалась до 1928 года. В год закрытия монастыря число его монахинь и послушниц составляло около 250 человек [14, с. 72].

ЛИТЕРАТУРА

1. Сведения о церквях, монастырях и духовенстве бывших белорусских епархий за 1839 – 1840 гг. // Национальный исторический архив Беларуси в г. Минске (НИАБ). – Фонд 2502. – Оп. 1. – Д. 2. – Л. 8 – 8 об.
2. Сведения о монастырях Витебской губернии. 26 июня – 13 сентября 1889 г. // НИАБ. – Фонд 2502. – Оп. 1. – Д. 445. – Л. 4 – 6.
3. Лебедев, Г.П. Витебский Свято-Духов девичий монастырь, его история и перспектива воссоздания / Г.П. Лебедев. – Витебск: Свято-Духов жен. монастырь, 1998. – 30 с.
4. Отчет Архиепископа Полоцкого и Витебского Василия о состоянии епархии за 1861 год // НИАБ. – Фонд 2531. – Оп. 1. – Д. 40. – Л. 50.
5. Говорский, К. Историческое описание Полоцкого Борисоглебского монастыря / К. Говорский // Полоцкий летописец. Ист.-лит. журнал. – 1992. – № 1. – С. 37 – 42.
6. НИАБ. 1. Фонд 2904. – Оп. 1. – Д. 1. – Л. 2 – 5. Ведомость о состоянии заштатного Борисоглебского монастыря за 1864 г. 2. Фонд 2694. – Оп. 1. – Д. 62. – Л. 10 – 12. Рапорт ректору Полоцкой духовной семинарии от настоятеля заштатного Борисоглебского монастыря игумена Фауста о числе лиц духовного звания и количестве прихожан.
7. НИАБ. 1. Фонд 2904. – Оп. 1. – Д. 1. – Л. 2 – 5. Ведомость о состоянии заштатного Борисоглебского монастыря за 1864 г. 2. Фонд 2904. – Оп. 1. – Д. 6. – Л. 1 – 2. Ведомость о братстве Полоцкого заштатного Борисоглебского монастыря за 1862 г.
8. Довгялло, Д.И. Полоцкая епархия к 1903 году / Д.И. Довгялло. – Витебск: Губерн. типогр., 1903. – 106 с.

9. Текущий архив Полоцкого Спасо-Евфросиниевского женского монастыря. Ведомости о девицах духовного звания, обучаемых в училище, 1847.
10. Отчет епископа Василия в Св. Синод, 1857.
11. Довгялло, Д.И. Памяти настоятельницы Полоцкого Спасо-Евфросиниевского женского монастыря игуменьи Евгении (Говорович) / Д.И. Довгялло. – Витебск, 1900. – 25 с.
12. Текущий архив Полоцкого Спасо-Евфросиниевского женского монастыря. Отчет преосвященного Викториана в Св. Синод, 1876.
13. Зональный государственный архив в г. Полоцке. – Фонд 54. – Оп. 1. – Д. 12. – Л. 1. Протокол заседания коллегии Полоцкого Отдела Народного Образования, 1919 г.
14. Шейкин, Г.Н. Полоцкая епархия: Историко-статистическое обозрение / Г.Н. Шейкин. – Минск: Свято-Петро-Павловский собор, Белорусское православное Братство Трех Виленских Мучеников, 1997. – 96 с.

ИСТОКИ ВИЛИИ. ПОПЫТКА РЕКОНСТРУКЦИИ САКРАЛЬНОГО ЛАНДШАФТА

д-р ист. наук В. ВАЙТКЯВИЧЮС
(Институт истории и археологии Балтийского региона Клайпедский университет, Литва)

Представлена попытка реконструкции сакрального ландшафта района истоков Вилии. Исследование опирается на фольклорный материал, собранный в 1857 – 2007 годах, а также на археологические, исторические и лингвистические данные. Сакральный ландшафт характеризует в первую очередь Степ-камень и к нему примыкающее болото Застебье, с которого в прошлом брала своё начало река. Это место – центральная арена мифа о возникновении реки. В этом отношении прослеживается несколько важных контекстов, главными из которых, по нашему мнению, являются противоположные, но активно взаимодействующие пары воды и камня (вероятно, также воды и огня), языческих божеств мужского и женского пола, христианского святого Степана и мученицы Акилины. Археологические данные дают основание предполагать существование определенного сакрального пространства во второй половине I – начале II тыс. н.э.; курганы данного периода составляют органичную часть указанного территориального комплекса.

Места, в которых начинаются реки, – особые. Чем больше река, тем более нас привлекает ее начало. Часто черты природного либо культурного характера, прослеживаемые у истоков и в верховьях реки, сопровождают ее и всё остальное течение. Не является исключением и основной приток Немана – река Вялья (либо Вялля, Вяльля), которую в литературе принято называть Вилией.

В самом начале на себя обращает внимание факт, что развитие природной среды истоков Вилии в течение нескольких тысяч лет является неисследованным. С середины XIX века истоки реки локализируются между деревнями Великое Поле и Шиленцы, но местные жители старшего поколения до сегодняшнего дня утверждают, что река начинается (либо начиналась) у Степ-камня, в болоте под названием Застебье, или еще более конкретно, – в южной части данного болота, которая примыкает к Степ-камню. Недавно там еще лежало небольшое зарастающее озеро: *Вілія тут начынаецца ад Сцёп-каменя* [1, LTR 7647/191], *Там ёсць балота, цячэць вада, у раку Вілію ўходзіць* [1, LTR 7647/465]. В отличие от графа Константина Тышкевича [2, s. 23], профессор Чесловас Кудаба не опроверг такой возможности, хотя в своей работе, посвященной реке Вилии, этого вопроса не детализировал [3, p. 5 – 6].

Источники по исторической географии конца XVI – начала XIX века подтверждают тот факт, что к данному времени река действительно начиналась в озере, ориентированном по направлению юг – север, либо в водянистом верховом болоте, сегодня известном под названием Застебье. Это положение фиксирует первая, по существу заслуживающая доверия, карта Великого Княжества Литовского, составленная примерно в 1590 – 1600 годах и отпечатанная в 1613 году [4, p. 52 – 53]. Эту же самую информацию повторяют, с некоторыми исключениями, более поздние карты включительно до первой половины XIX века [4, с. 70 – 71, 72 – 73, 92 – 93]. Соединение между Азерцом (так называется западная часть болота Застебье) и дальнейшим течением реки Вилии было локализировано в 2007 году участниками экспедиции Вилия-Нерис. В июне месяце текущей воды здесь не было видно, но не зарастающая полоса свидетельствовала о том, что здесь грунтовые воды максимально приближены к поверхности.

В прошлом, в районе истоков реки Вилии из поколения в поколение передавались предания о чудесном возникновении реки. Характер этих преданий можно представить из рассказа Софии Насенник (Батуро) (1929 г. н., дер. Городище):[1] «*Сколькі мне было гадоў, яшчэ малая... Зрання ўстанем, у часы чатыры – ў Бегамлі нада нясці яблыкі прадаць на базар. А ў нас жанчына была, удава. Яна нам расказва-*

[1] Данный текст и остальные фрагменты расшифровали: Т. Володина и Ю. Унукович.

ець, ідзём па лесе (там нада ад нас у Бегамля – дваццаць кіламетраў і па лесе ідзём). Гэна ісці праз Вільлю. Ідзём і яны расказваюць. Мы пераходзім гэта ўжо Шылінцы, Доўгае там ёсць. У Доўгім прыходзім – пятухі пяюць. Пасядзім пад хлеўчыкам, паддыхнём, эта ж ужо не знаем надта дужа, а яна ў нас як маці – бабушка. Вот яна нам раскажыць. „Во гэта, – кажыць, – дарожка ідзець на Сцёп-камень, а з гэтага Сцёп-каменя – там імшары, імшары – начынаецца гэта рака Вялья". У Шылінцах. А гэты Сцёп-камень – даўна ж людзі неяк пракліналі адзін аднаго. Мужык паехаў араць туды. Там поле было – аралі, а цяпер ужо балота зарасло. З быкамі паехаў араць. Там, казалі, гэты камень гэдак ён і зрабіўся (...).

Прыехаў, араў-араў. Прыходзіць жонка, прыносіць есці. Прыносіць есці яму і, гаворыць, нешта ён можа еў там, можа ня еў, і нешта яны ўжо заругаліся. І яна ўжо будзіць на яго казаць: „Каб ты Сцёп-каменем узяўся! Як ты мне ўжо надаеў!" А ён кажыць: „Каб ты ракой Вяльлёй пайшла!" І з таго ці не з таго з гэтага месца, з гэтых імшар абразавалася гэта Вілья. А там вялікі-вялікі камень стаіць. Можа ў траву дзе ўрос. Балеячка стаіць. А камень, кажуць, настаяшчэ быкі, кажуць, як рогі, кажуць, гэтыя. Дык два ж гэтыя і гэткі камень вялікі. Яго, як тады ўжо гэдак ён пракляў, усе людзі празвалі Сцёп-камень. Ён, той мужык, зваўся Сцёпа. Дык Сцёп-камень. А яна, я не знаю, як звалася. Толькі ён сказаў: „Каб ты Вяльлёй узялася". І ад таго ці не ад таго, ну мне дык тожа бабушкі расказывалі...» [5].

Данный миф о возникновении реки Вилии в памяти людей уже давно разбился на многочисленные фрагменты и иногда даже противоречивые варианты. Несмотря на это, при реконструкции сакрального ландшафта он является одним из самых значительных источников. Весь массив нарративов на сегодняшний день составляет несколько десятков текстов, записанных в течение 1857 – 2007 годов [2, s. 20 – 23; 6, с. 379 – 381; 7, с. 5, 11, 17; 1, LTR 7647]. В своем исследовании мы будем вынуждены опираться также на данные археологии, истории и этнографии.

Предварительный анализ текстов

В центре большинства преданий о возникновении реки – Степ-камень (в вариантах – просто Степан), представленный на рисунке 1. Вместе с ним предания и исследователи также упоминают по соседству растущую священную сосну Кулину (иногда – Акулину). В большинстве вариантов Кулина на сегодняшний день уже занимает место жены Степана Вельяны.



Рис. 1. Степ-камень (фото автора 2004 г.)

В записях XIX – начала XX века Степан чаще всего представляется портным либо сапожником, жителем данной местности, который подвергся наказанию и окаменел из-за заключенного союза с нечистой силой. Несмотря на это, он занимался своим ремеслом, даже оказавшись в таком положении. Люди приносили материал, клали его на камень и потом забирали сшитое. Способности шить камень лишился лишь после того, когда некий человек обратился к нему со словами *сшый мне ні то, ні сё* [7, с. 57], *poszyj mnie ni to, ni owo* [2, s. 22].

На сегодняшний день в текстах преобладает образ Степана-крестьянина, который пошел пахать поле на Пасху и был проклят своей женой (в вариантах – матерью) вместе со своими быками. Кроме того, прежде чем окаменел сам, Степан успел проклясть свою жену, которая обратилась в сосну либо разлилась водой.

Проклятия в разных по содержанию текстах являются самой устойчивой и с некоторыми исключениями даже формульно повторяют часть предания: *Каб ты каменем стаў! Каб ты вадой разьлілася!* – таков диалог между супругами [7, с. 20, 56 и др.]. Несмотря на то, что диалог происходит между Степаном, который вот-вот превратится в камень, и Кулиной, которая в это мгновение обычно превращается в сосну, указание на превращение в воду в формуле проклятия чрезвычайно важное. Как раз это обстоятельство позволяет нам сосну в паре камень – вода считать относительно поздней инновацией. Как парадоксально это бы не выглядело, священная сосна при дороге на восток от камня в преданиях заменяет водоем (болото, озеро либо реку) в направлении на запад от Степ-камня, ср.: *Яна пашла, Куліна, гэта сасна, ракой Вільлёй* [1, LTR 7647/174] или же Застебье, которое дословно означает болото, расположенное за Степ-камнем, в то же время может выступать как собственное имя жены Степана! [7, с. 20, 51].

Кстати, можно привести и больше примеров о том, как действующие лица и места, упоминаемые в тексте, путаются. Это свидетельствует лишь о давнем происхождении основного мотива, сложном его развитии и трансформациях. Иногда даже невозможно установить – или людям характерно тиражирование тех самых мотивов преданий, или в одно время одинаковые мотивы существовали параллельно. Например, конфликт между пашущим мужем и его женой переносится за 2 км от Степ-камня, в местность деревни Баяры: *Карагодзішча. Тожа былі дзед і баба. Ён араў, а яна яму прынясла есці. І кляла тожа там: «І каб ты возерам узяўся». Усяк* [1, LTR 7647/243]. За 8 км от Степ-камня указывается проклятый пахарь с быками недалеко от деревни Глинище: *там нехта араў, дык гэткі камень – коні, як і плуг, і чалавек* [1, LTR 7647/476] и т. д.

Таким образом, в центре событий, которые происходят на месте истоков реки, – камень и вода. Как в балтийской, так и в славянской мифологии эта пара постоянно в месте, члены которой дополняют один другого и обмениваются своими свойствами, демонстрируя, что их существование невозможно без взаимного участия. Есть все основания считать, что представление камень – вода (камень в море, камень на берегу реки, источник, бьющий из-под камня, и т.д.) является одним из основополагающих, так как при его помощи выражается понимание огня и воды, жизни и смерти, и ряда других родственных концептов [8, p. 144 – 148]. (Кстати, зафиксированы и некоторые комплексы священных мест того же типа, который мы обнаружили в районе истоков Вилии, – ср. группу камней в местности Стабине и болото (бывшее озеро) Стабас там же (Таурагский р-н, Литовская Республика) [9, p. 612 – 614].

Степ-камень – валун отличительной формы – это ориентир, знак определенного места в местности, а в мифическом отношении – гарант бесконечного источника воды, так как в то время, когда камень **стоит**, вода – **течет**. Это часть священного места и всего пространства, которая представляет собой мужское начало или, возможно, мифическое божество. На образ последнего указывают рассказы о том, каким этот камень (= человек, который обратился в камень) был в прошлом. А он поражал своим необыкновенным ростом, имел голову, плечи, знаки рук, груди и даже ноги, через которые можно было проехать верхом: *Ужо ён быў такі вялікі, што празь яго, празь ногі дажа і с канём можна было праехаць* [5, с. 56]. Некоторые утверждают, что сам Степан был на коне и *было відаць, што там конь і чалавек* [1, LTR 7647/472] (ср.: *Чатыры, казалі, нагі ў тым каменю* [1, LTR 7647/266]).

Вода, разлившаяся возле Степана, – это женская часть комплекса. Предания иногда считают эту воду слезами печали, но в большинстве рассказов говорится о том, что это чистая, холодная криничная вода, которую каждый может пить в жару: *Дык дзеткі піць хочуць за цэлы дзень – бягуць туды піць вадзічку. А вадзічка халодная-халодная была. Балота, а вада – як усё роўна крыніца б'е* [1, LTR 7647/611].

Предания о других священных местах Беларуси и Литвы указывают на то, что превратиться в воду и течь – это чаще всего судьба проклятой невесты, едущей на свадьбу, или уже на обратном пути со свадьбы, либо ее дальнейшее существенное состояние[1] (ср. Девичье озеро в лесу возле местечка Вевис, которое образовалось на месте проклятого свадебного кортежа).

На фоне возникновения реки немаловажным является, правда, редкий, мотив о том, что некая женщина Кулина под сосной родила дитя: *Ішла баба, трэба ей радзіць, села пад сасну і радзіла* [1, LTR 7647/266], *Жанчына, яна нарадзіла малога пад той соснай* [1, LTR 7647/290].

Эдвард Зайковский верно обратил внимание на тот факт, что Кулина, как и Степанида, в одном и том же заговорном тексте от укуса змеи (этот текст записан в исследуемом нами регионе) означают змею: *змяя Скурапея, сястра яе Палагея, Сцепаніда, Арына, Куліна, Салепянета, Цыкліда* [10, с. 122]. Эту тему продолжают данные о Змеевой могиле (*Змяёва магіла*) – насыпи извилистой формы, которая находилась у истоков реки Вилии. Ее характеристика (*магіла... ізвілістая як змея*) напоминает, хотя, возможно, позднее, истолкование самого названия реки: *яна ідзець няроўненька, а гэдак віляючы. Тымі лучкамі, вот сюды яна пахінецца, то туды пахінецца. Яна не ідзець прамая рака. Так вот і Вілія* [1, LTR 7647/601].

[1] Эта параллель наблюдается и в литовском: *nuotaka* 'невеста' и *tekėti* 'течь'.

Несмотря на интригующие данные и наши усилия их истолковать, облик мужского божества истоков реки остается довольно смутным. Возможно, что разные его образы и черты характера все-таки означают одно и тоже божество. В первую очередь так можно судить о мужчине необыкновенного роста и змее, близкая аналогия которым известна в местности Гоголевка, где находится Змеев камень [11, с. 131 – 135; 6, с. 363 – 365].

Контуры водяного божества – женщины (возможно, в статусе невесты?) – еще более туманные. Но некоторые мотивы преданий указывают на то, что эти представления в прошлом все-таки могли быть более конкретными. Например, говориться о том, что данная женщина была очень хорошая и обязательная, заслужившая почтение у каждого жителя в окрестностях [1, LTR 7647/373]. Немаловажно упомянуть кладбище на окраине деревни Шиленцы (на сегодняшний день оно разрушено). На том месте якобы была похоронена женщина Вяльяна, которая дала начало водам реки; в ее память на могиле была воздвигнута часовня: *Вяльяну хораша пахавалі, ухаўтурылі і на яе магілцы пабудавалі цэркаўку. І цяпер на Вельянавай магілцы ў Шылянах стаіць царква* [6, с. 381].

В начале XX века опубликован текст о Вяльяне, похороненной в Шиленцах, который является на сегодняшний день единственным нам известным случаем, когда рассказ указывает на название реки и ее лексическую форму. И лишь гораздо позже чужие люди, которым не было известно о возникновении реки, стали употреблять неправильное название Вилии – так оканчивается этот текст: *толькі чужынцы, не ведаючы гэтай гісторыі, перайначылі крыху яе праўдзівае імя, завучы Віліяй* [6, с. 381].

Сегодня названия реки уже никто не объясняет по существу и не уделяет ему внимания. На месте Вяльи часто упоминается Кулина, также Застебье [7, с. 20], Зося [7, с. 51] и т.д. Для некоторых информантов Вялья – это просто речка (*ракушка*) или река: *не знаю, як яна называецца. «Наша рака»* [1, с. 257], собственное имя которой забыто или даже вообще не было известно!

От мифа к культу

Начиная с 1990-х, когда Степ-камень оказался в фокусе внимания исследователей, о нем высказано довольно много мнений, когда предпринимались попытки описать функции этого священного места, его социальную и культовую роль [11, с. 135 – 140; 12; 13, p. 287 – 290; 14, с. 37 – 45].

Первое положение ученых касается географического положения Степ-камня. Факт, что камень находится в водоразделе между Вилией и Березиной (относительно Немана и Днепра, Балтийского и Черного морей), указывает якобы на то, что Степ-камень – это знак пути «из варягов в греки» (*адменіца аднаго з малавядомых транспартных шляхоў «з варагаў у грэкі»*), который являлся, возможно, объектом ритуалов, связанных с путешествиями [11, с. 139 – 140].

Без всякого сомнения, положение Степ-камня совершенно исключительное, оно не могло не влиять на функционирование этого священного места и на состав участников в ритуалах. Однако сегодня определенно можно сказать лишь то, что в пределах водоразделов часто находились священные места, предназначенные для объединений нескольких общин, земель, племен и регионов [15, p. 198 – 199]. В исследуемом случае некоторым подтверждением положения этого характера могут служить данные о территориальном и административном делении по крайней мере в XVI – XVIII века, когда в окрестностях Докшиц сходились границы воеводств Вильнюса, Минска и Полоцка. В конце XIX – начале XX века границы государственного и четырех частных имений также сходились недалеко от Степ-камня – в местности Пять копцов [7, с. 55]. Пять копцов – группа курганов, очевидно, была всем известна с давних времен как визуально ярко выделяющееся место. В том же контексте обращает на себя внимание локализированая за 2,5 км на север от Степ-камня местность *Крывіна* и соответственно – *Падкрывіна* [7, с. 51] (*Госп. д. Кривые* [16]; *Кривино* [17]). Имеем некоторое основание связывать происхождение названий данного типа с местами, где в прошлом происходили собрания, иногда известные и под названием *кривуля* [18, с. 15]. Собрания такого типа в форме копного суда в районе истоков Вилии еще известны в XVI – XVII века [19, с. 137].

Вторая гипотеза исследователей как раз обращает внимание на название самого Степ-камня. Основательно апеллируя к названию болота *Застеб'е*, лежащего за камнем, предполагается, что перед тем, как камень стал Степ-камнем или камнем [Святого] Степана, предыдущее его название могло быть родственно слову *stabas* «объект поклонения у язычников» и звучать как *Сцёб, Стаб* или *Сцяб*. Таким образом, камень, судя по значению его названия, сам являлся идолом для представителей балтов, проживающих в данном регионе [11, с. 139].

Вероятность крайне большая, что имя Святого Степана, атрибутом которого является камень либо камни [20, p. 289], в христианскую эпоху заменило близкий по звучанию *Стаб* или *Сцяб*. Но такое предположение еще должны подтвердить лингвистические исследования. Мы можем лишь дополнительно обратить внимание на тот факт, что Степ-камень, имеющий форму вертикального столба, и в текстах всегда **стоит**, иногда даже как кол (*Сцяпан, што табе стала тут стаяць?* [1, LTR 7647/48]; *Каб ён каменем і колам сеў* [1, LTR 7647/242]). В сравнение, другие камни в том же регионе обычно **сидят** (напр.: *дзе ён той камень сядзіць* 1, LTR 7647/476]).

Со словом литовского происхождения *kulynas* «молодняк» (но также *kūlis* со значением «камень») Эдуард Левков сопоставлял также название сосны Кулины [11, с. 140]. Но по своему образованию данное название все-таки не выделяется из ряда соседних местностей, таких как *Баравіна, Дзеравіна, Пярэміна*, а его значению возможны разные белорусские альтернативы [14, с. 42 – 43], не исключая и связи с собственным именем [мученицы] Акилины (ср. вариант названия сосны *Акуліна*).

На сегодняшний день в районе истоков Вилии определен один бесспорный топоним балтийского либо литовского происхождения – это название *П'янное поле* [1, LTR 7647/296] ([*урочышча*] *П'янныя* [5, с. 56]) у деревни Баяры. Очевидна его связь с литовским *pjaunis* «низина; сенокос; поле, где пашни менче, чем сенокоса» (либо *pjaunys*), который часто фигурирует и в канцелярских документах Великого Княжества Литовского XVI – XVII веков [21, p. 164 – 166].

Третья значительная гипотеза связана с установлением имени и функций божества исследуемого священного места. Образ Степана, который вырисовывается из преданий о Степ-камне, считается заменой хтонического божества славянских народов Вялеса: *фальклорны Сцяпан паводле сваіх характарыстык можа быць суаднесены з Вялесам* [12, с. 10]. Тем временем нам известен широкий анализ фолькорного материала ряда индоевропейских народов, на основе которого утверждается, что *особенности Степана дают аргументы считать его результатом переименования Перуна* (!) [22, с. 120]. Важно обратить особое внимание на деятельность (либо присутствие) Перуна в случае Степ-камня: первое, голову Степ-камню якобы отбил Перун [11, с. 136] – и мы узнаем контакт, в результате которого здесь появляется еще один важный элемент – огонь. И второе: широко известно, что окаменение происходит во время грозы или, чаще всего, молния является знаком подобного превращения.

В последних публикациях взаимные отношения божеств, связанных со Степ-камнем, представляются гораздо осторожней и в более широких контекстах, обращая внимание на весь массив разной, иногда даже противоречивой информации [14, с. 37 – 45]. Исследования Татьяны Володиной, представленные в 2007 году на конференции «Балто-славянские культурные связи» в Риге и еще не опубликованные, указывают на факт, что шитье одежды либо сапог не является чертой, принадлежащей какому-либо божеству, связанному с определенным камнем. Скорее всего это метафора и тем самым способ говорить о характере ритуальных отношений между людьми и божествами. Следовательно, в священных местах человек становится одетым или раздетым (это действия, всегда имеющие и важные социальные значения), чувствует холод или согревается, теряет жизненные силы или приобретает здоровье. Из-за вторжения христианства, данное «шитье» одежды или обуви в языческих культовых местах стало одной из ярких или, в отдельных случаях, самой яркой негативной чертой, всегда характерной для нечистой силы, демонов либо просто людей-грешников.

Таким образом, нам уже очевиден двойной характер священного места – истоков Вилии. Он связан с присутствием центральной пары камень – вода, мужского и женского элементов, божеств разных сакральных характеров, с точки зрения социальных отношений – с мужчиной и женщиной, братом и сестрой и т.д. Очевидно, что выискивать одно божество и одну сакральную сферу, которая преобладала бы в исследуемом нами случае, не стоит усилий.

Самая поздняя – христианская – идеология подтверждает сказаное своим определенным образом, так как там встречаемся со Степаном (т.е. Святым Степаном) и Кулиной (в вариантах – Акулиной), которая, вероятно, имеет прямую связь с мученицой Акилиной. Соответственно, первому приписывается опека над лошадьми, второй – над коровами. День Св. Степана отмечается 26 декабря, а день Акулины симметрично – спустя полгода, 26 июня [23, с. 133, 223].

О характере ритуалов в священном месте мало данных. Значительных результатов не дали и археологические раскопки в 1993 г. возле Степ-камня и окаменелого быка. Ни следы кострища, ни остатки от столбов не подверглись датированию, а никаких артефактов не было найдено [13, p. 287 – 290].

Предания свидетельствуют, что в прошлом, но скорее всего после введения христианства, могла существовать какая-то ритуальная практика, направленная на лошадей с целью гарантировать их здоровье или его укрепление. Повод этому дает симптомно рассказываемый мотив в деревни Баяры – верхом можно было проезжать посреди ног окаменевшего Степана [7, с. 56; 1, LTR 7647: 266, 289]. Внимание обращает и указание с деревни Красники, что между ногами Степана люди могли пройти на коленях [11, с. 136].

Сосна Кулина считалось неприкосновенной, *не ахраняў ніхто, але яе абходзілі, як набожная... Яе каб ня трогалі* [1, LTR 7647/189]. Когда в советские годы кто-то задумал ее спилить, это сделать не удалось, так как из дерева потекла кровь (в вариантах – появились кровавые опилки).

В 2005 – 2006 годах часто приходилось слышать воспоминания информантов о том, что детьми они часто заходили к Степ-камню и к Кулине, некоторые – приносили им в жертву часть того, что собрали в лесу – ягод или грибов, считая это жертвой несчастному Степану или даже самому Богу: *Сабіраем ягады. Знаем, што там можа хто пагібшы быў, там ягады занясём туда* [1, LTR 7647/169], *Мы як*

пайдзём у паземкі і тады ахвяру ягад сыпем каля гэтага каменя, каля Куліны... Гэта нам ужо кажуць, што ахвяркі кладзіце [1, LTR 7647/610]. Оказывается, что ягоды Степану сыпались на своеобразный порог впереди камня, внизу, на левой стороне (рис. 2).



Рис. 2. Ниша на передней стороне Стёп-камня, куда ещё в XIX – XX века клали хлеб и ягоды

Удивительный рассказ Михаила Лынько (1921 г. р., дер. Кромавичи) о том, как он с попутчиками пешком ходил в Бегомль и как они останавливались выпить у Степана с Кулиной: *Ідзём аж туды, да гэтага каменя. Станавімся кала яго... Вып'ем, тады: «Ну, Куліна, будзь здарова»... выпілі, пагаварылі, паглядзелі яшчэ на сасну, на камень. Адходзім: «Ну, бывайце! Мы пайдзём па свайму назначэнню»* [1, LTR 7647/373]. Но особено ярким примером, отражающим архаичные отношения между людьми и священным местом, являются рассказы Елены Капыл (1920 г. р., дер. Красники).



Рис. 3. Рассказы Елены Капыл записывает Татьяна Володина (фотография Д. Вайткявичене 2006 г.)

Однажды ее бабушка, бывая у Степ-камня, в своих мыслях подумала себе, чего ты тут стоишь, Степан. А Степан ответил ей ночью во сне, с некоторым упреком спрашивая у женщины, чего же она пришла к нему, не на смех ли. *Яна кажаць: «Сцяпан, Сцяпан, што табе стала тут стаяць?». А ён: «Што ты прышла тут насьмешку строіць зь мяне»* [1, LTR 7647/53]. Ровно такую же традицию общения продолжает сама Е. Капыл, так как она просит здоровья у Степана и Кулины: *Эта я сама с сабой гавару і з гэтым камнем. Кажу: «І ты мне памажы, як здароўя ў мяне няма». Во гэткая гаворка. Сама с сабой так,* а *с сасной толькі пастаяла і падумала: «Куліна, Куліна, якая ты бедная, так цябе падрэзалі. А ты стаіш, не далі табе рады. Ты, наверна, у Бога шчаслівая, што цябе ня зрэзалі»* [1, LTR 7647/53]. На Пасху Е. Капыл сама часто жертвовала кусочек хлеба (часть еды, которую обычно несут на кладбище или раздают нищим), а собирая в лесу ягоды – что имела с собой, хлеба или чего другого [1, LTR 7647/53].

Священное место и курганы

Следя за мифами, мы предварительно уже отметили пределы сакрального пространства между деревнями Баяры, Шыленцы и Красники. Оно охватывает Степ-камень, сосну Кулину и к ним примыкающее болото Застебье. Однако существует еще один фактор, важный для изучаемой в нашей работе цели. Это курганные группы, характерные для периода приблизительно VII – XI веков и связанные с кривичами – скорее всего субкультурной группой балтов и славян – представляющими жителей южной окраины Полоцкой земли (княжества). В любом случае надо учесть факт, что до сих пор ни один из курганов, находящихся непосредственно в районе истоков Вилии, не подвергся раскопкам.

Моя идея в отношении данных курганов, которую в первую очередь и подчеркиваю, актуализирует факт, что курганы в лесу у истоков реки соединяет между собой дорога, а основная сеть дорог служит для установления связи не только между курганами, но также между ними и главным священным местом (рис. 4).




Рис. 4. Положение Степ-камня, Застебья, истоков Вилии и курганных групп (составлено автором в 2008 г.)

Первый по дороге, продвигаясь с запада на восток, – курган возле ныне не существующего хутора Долгое. Вторая курганная группа у хутора Долгое – гипотетичная, она чуть отклоняется от нашей дороги. Доходим до места, где находилась так называемая могила Змеи. Без сомнений, она играла мифологическую роль, которая, кроме связи этого места с захоронениями, нам пока остается неизвестной. Названия с именем Змеи в Беларуси довольно редки, но известны в роли наименований археологических памятников, ср. *Змяінкі, Змяінец* [24, с. 23, 47]. От Змеевой могилы возле истоков Вилии мы имеем возможность повернуть налево – к Степ-камню, или идти дальше, в Баяры. За 1,3 км по направлению Баяр достигнем курганную группу ближе деревни Красники и вскоре – уже упомянутых нами выше – Пять копцов.

Дальше по дороге достигнем местность *Карагодзішча* – болотистую низину, название которой происходит от слова *карагод* и прямым образом связано как с преданиями о провалившемся на Пасху хороводе, так и с обычаем собираться здесь на веселье (ср. аналогии мест под тем же названием – *Дзявочы карагод* в Губском лесу, Вилейском районе; *Dziewiczy korohod* – в Вилии-Нерисе у деревни Вилькине, Вильнюсского района).

В деревне Баяры дорога разветвляется на Бегомль, и вскоре здесь видно бывшее место Баярских курганов, уничтоженных карьером, а если продолжать идти на восток, по дороге будут курганы в лесу у деревни Студенка. В последних двух случаях сталкиваемся с названиями типа *валатоўкі*, которые происходят, вероятно, от слова *волат* «великан» и встречаются по всей северной Беларуси, в Витебской области. На юг традиция меняется, и преобладает название курганов – *капцы* [24, с. 11 – 13; 25, с.120] (ср. нами упомянутые *Пять копцов*). В этом отношении район истоков реки Вилия представляет смежную или переходную зону.

Явление, когда для сооружения мест захоронения – курганов – подбирались окраины дорог либо непосредственно соседнее пространство с перекрестками, уже был отмечен мною, когда приходилось искать ответа на вопрос, почему курганы V – XI веков в окрестностях Кернаве, на Литве, располагаются вроде параллельно самой реке Вилии-Нерис. Обобщая данные о географическом положении и размещении курганов в пределах 130 восточно-литовских курганных групп, стал очевидным факт, что группы курганов представляют собой два основных типа. Первый – линиарный, второй – в виде нерегулярного, но плотного скопления. Не учитывая разницу в форме расположения курганов, надо отметить, что всем им характерна взаимосвязь с дорогами и их перекрестками [26, p. 117 – 125]. Скорее всего и в исследуемом случае нет никакой случайности, и это даже не просто рациональное решение. Не последнюю роль играло мифологическое значение дорог и передвижения по ним как такого. Очевидно, что дороги соединяли пространство живых (усадьбы и поселения) с пространством мертвых (кладбищами в виде курганных групп) и, что особенно важно, сопутствовали взаимной коммуникации в любом отношении и в любом направлении.

Попытка реконструкции сакрального ландшафта

Сакральный ландшафт истоков Вилии характеризует в первую очередь Степ-камень на узкой полосе земли между бассейнами Балтийского и Черного моря и к нему примыкающее болото – скорее всего бывшее озеро, с которого берет свое начало река Вилия. Это место – центральная арена мифа, познанного нами из многочисленных преданий. Вода начинает течь тогда, когда возникает камень, и можем добавить от себя, что вода здесь течет до тех пор, пока стоит камень. Когда последний в течение веков теряет основные части своего тела (голову, ноги) и идентичность (знаки плеч, рук, груди)[1], вода прекращает течь, озеро становится болотом и очевидное начало реки перемещается куда-то дальше, к деревни Великое Поле.

Как и стоило ожидать, мифическая история возникновения озера (источника реки) у камня имеет несколько важных контекстов, из которых наше внимание остановилось на противоположных, но активно взаимодействующих парах первичных элементов, таких как вода – камень; и (вероятно также, при помощи Перуна) вода – огонь, языческих божеств мужского и женского пола, христианского святого и мученицы, также некоторых других. Это – основной контекст культа и ритуалов в исследуемом месте. Увы, их характер остался нам пока довольно смутным.

Археологические данные позволяют судить о существовании определенного сакрального пространства, под современным названием ландшафта, датировать его второй половиной I тысячелетия – началом II тысячелетия, так как курганы характерны для данного периода и составляют органичную часть всего обширного территориального комплекса. Указанный период – это хронологический ориентир, но ни в коем случае не его ограничение, так как это же в некоторых отношениях сакральное пространство не переставало существовать до XX века и, весьма вероятно, берет свое начало в более глубоком прошлом, чем средний железный век.

Таким образом, исследование, которое потребовало от нас больших усилий дома и на поле, объяснило, увы, не так много. Хотя часть удачи состоит даже в том, что мы сумели четко сформулировать некоторые важные вопросы для дальнейших разысканий.

Конечно, нам нельзя забывать и тот факт, что сегодня Вилия стала, по нашим сведениям, первой рекой в Беларуси и на Литве с так основательно исследованными истоками.

Статья является результатом комплексных исследований 2005 – 2007 годов, проведенных в сотрудничестве с литовскими и белорусскими коллегами: Андреем Вайтеховичем, др. Дайвой Вайткявичене, др. Татьяной Володиной, др. Юлией Гурской, др. Людмилой Дучиц, др. Эдвардом Зайковским, Александром Зайцевым, Гедрюсом Зибертасам, др. Андреем Прохоровым, Альгирдасам Тарвидасам, Юрасем Унуковичем. Всем им, а также Алексею Глушко за предоставленную возможность познакомиться с материалами экспедиции 1993 года, выражаю свою глубокую благодарность.

ЛИТЕРАТУРА

1. Архив института литовской литературы и фольклора.
2. Tyszkiewicz, K. Wilija i jej brzegi. Pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym / K. Tyszkiewicz. – Drezno, 1871.
3. Kudaba, Č. Nerimi / Č. Kudaba. – Vilnius, 1985.
4. Lietuva žemėlapiuose. – Vilnius, 2002.
5. Материалы экспедиции Вилия-Нерис, 2007 г.
6. Легенды і паданні. – Мінск, 2005.
7. Этнаграфічная экспедыцыя «Сьцёп-камень» 15 – 25 жніўня 1993 г. // Сб. центра этнокосмологии Крыўя, хранящийся в архиве Студенческого этнографического общества.

[1] Кстати, их заменяют христианские символы – кресты выбиты на лицевой стороне камня!

8. Vaitkevičienė, D. Ugnies metaforos. Lietuvių ir latvių mitologijos studija / D. Vaitkevičienė. – Vilnius, 2001.
9. Vaitkevičius, V. Senosios Lietuvos šventvietės. Žemaitija / V. Vaitkevičius. – Vilnius, 1998.
10. Замовы. – Мінск, 1992.
11. Ляўкоў, Э.А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э.А. Ляўкоў. – Мінск, 1992. – С. 131 – 135.
12. Зайкоўскі, Э.М. Месца Вялеса ў дахрысціянскім светапоглядзе насельніцтва Беларусі / Э.М. Зайкоўскі. – Мінск, 1998.
13. Zaikovskiy, E. Šventviečių tyrimai Neries (Vilijos) baseine / E. Zaikovskiy // Lietuvos archeologija. – 2005. – T. 27.
14. Кашкурэвіч, Т. Касмаграфія і тапаграфія ў крыўскіх легендах пра камяні-краўцы ды пра паходжанне рэк Вялля (Нярыс) і Бярэзіна / Т. Кашкурэвіч // Druvis. – 2005. – № 1. – С. 37 – 45.
15. Vaitkevičius, V. Alkai. Baltų šventviečių studija / V. Vaitkevičius. – Vilnius, 2003.
16. [Топографическая карта 1865 – 1866 гг. Вильнюсской и Ковенской губерний. Номер листа XIII – 6].
17. [Карта] Военно-топографическое управление. Масштаб 1 верста в дюйме [Первая половина XX в., номер листа LXVIII – 15].
18. Санько, С. Крыўя / С. Санько // Druvis. – 2005. – № 1.
19. Акты, издаваемые Виленского комиссіею для разбора древнихъ актовъ. – Вильна, 1891. – Т. 18.
20. Krikščioniškosios ikonografijos žodynas. Sudarė D. Ramonienė. – Vilnius, 1997.
21. Jablonskis, K. Lietuviški žodžiai senosios Lietuvos raštinių kalboje / K. Jablonskis. – Kaunas, 1941. – T. 1.
22. Иванов, В.В. Исследования в области славянских древностей / В.В. Иванов, В.Н. Топоров. – М., 1974.
23. Лозка, А. Беларускі народны каляндар / А. Лозка. – Мінск, 2002.
24. Дучыц, Л. Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў / Л. Дучыц. – Мінск, 1993.
25. Дучыц, Л. Этнаграфія і міфалогія курганоў Беларусі / Л. Дучыц // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2006. – № 21.
26. Vaitkevičius, V. Examining the Layout Tendencies of East Lithuanian Barrows / V. Vaitkevičius // Papers from the Second Theoretical Seminar of the Baltic Archaeologists (BASE) held at the University of Vilnius, Lithuania, Oct. 21 – 22, 2005. Interarchaeologia-2. – Vilnius – Helsinki – Riga – Tartu, 2007.

ДА АРЭАЛЬНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ЗАМОЎНАЙ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

канд. філал. навук Т.В. ВАЛОДЗІНА
(Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, Мінск)

«Загаворы хай па беламу свету ходзяць»
(з каментарыя знахаркі з Лепельскага р-на)

Прадстаўленая першасная характарыстыка замоўнай традыцыі Віцебшчыны як самой па сабе, так і ў межах агульнабеларускай карціны, а таксама спроба вылучэння тых мікраарэалаў, якія маглі б быць аб'яднаныя па тых ці іншых крытэрыях. Асноўная ўвага ўдзяляецца вылучэнню пэўнай спецыфікі лакальнай традыцыі, якая праяўляецца ў большым ці меншым развіцці пэўных сюжэтаў, матываў і асаблівасцяў структуры тэксту. Такім чынам абмалёўваюцца своеасаблівыя ізаглосы, якія ахопліваюць тэрыторыю Падзвіння і не абавязкова супадаюць з адміністрацыйнымі межамі.

Замовы – адзін з тых жанраў народнай творчасці, якія выяўляюць высокую ступень інтэрнацыянальнасці як у межах сэнсавай характарыстыкі, так і структуры. Менавіта сярод замоў асабліва выяўна выступаюць тыя фармальныя і сэнсавыя элементы, якія залічваюцца да універсалій, бо абапіраюцца на архаічную сістэму ўяўленняў, псіхафізіялагічную агульнасць чалавечай прыроды, а таксама на падобныя прынцыпы тэкстаскладання. Разам з тым кожная тэрыторыя характарызуецца сваім і даволі ўстойлівым наборам функцыянальных тыпаў, сюжэтаў і персанажаў. Адрознымі выступаюць і асаблівасці структурнай арганізацыі (наяўнасць/адсутнасць зачынаў, закрэпак, зваротаў і г.д.). Сваю ролю ў падобнай неаднароднасці адыгралі многія фактары, сярод якіх – канфесійная прыналежнасць, фактар іншаэтнічных уплываў, ступень распаўсюджанасці кніжнай замоўнай традыцыі і інш.

Крыніцамі даследавання сталі ўсе магчымыя друкаваныя звесткі, а гэта том «Замовы» [1], куды ўвайшлі і запісы Е. Раманава, А. Шлюбскага, «Полацкі этнаграфічны зборнік» [2]. Для дадзенай працы былі франтальна прапрацаваныя архівы Беларусі, дзе патэнцыйна такія замовы маглі б змяшчацца. Гэта Фальклорны архіў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта (кіраўнік У. Васілевіч), Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАНБ, Архіва навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору БДУ (кіраўнік Т. Марозава), Архіў Студэнцкага этнаграфічнага таварыства (кіраўнік А. Глушко),

Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры Віцебскага дзяржаўнага універсітэта (хаця і скрайне недастаткова). Значную частку займаюць уласныя запісы (з 11 раёнаў Віцебшчыны).

Безумоўна, усе далейшыя назіранні могуць мець толькі папярэдні характар, найперш па прычыне недастатковай сабранасці матэрыялу. Наогул, першая выснова даследавання – замовы Віцебшчыны пакуль сабраныя і апісаныя недастаткова. Наогул адкрытым застаецца пытанне, наколькі сабраныя ў дадзеным рэгіёне замовы адлюстроўваюць асаблівасці традыцыі, ці толькі інтарэсы самога збіральніка. Можна нават казаць, што колькасна матэрыял паказвае ў большай ступені на ўзровень даследаванасці той ці іншай тэрыторыі тым ці іншым збіральнікам/збіральнікамі, а не на ўласна асаблівасці бытавання замоў. Каля 250 зафіксаваных лепельскіх замоў побач з 7 браслаўскімі сведчыць найперш пра даследаванасць раёна і ўжо толькі затым пра спецыфіку функцыянавання і ступень пашыранасці замоўнай практыкі.

Найперш колькі заўваг адносна запісу замоў у сучасных умовах, што наўпрост карэлюе з самой традыцыяй бытавання замоў і іх міжпакаленнай трансляцыі.

Перадача майстэрства магла ажыццяўляцца не толькі ў спадчыну ў межах сям'і, але і суседзям, проста блізкім і адпаведным, на думку шаптухі, людзям. Адзін з важнейшых прынцыпаў перадачы ведаў – вучань мусіў быць маладзейшым за настаўніка і па магчымасці быць найменшым або найстаршым у сям'і («Если б вы за мяне старшая была, я б вам не расказала. А раз маладзейшая, можна расказаваць і паўчыць можна»[1]). Цікава, адным з фактараў перадачы ведаў выступала, як гэта не дзіўна, добрая памяць пераемцы. Гэта вытлумачальна з пункту гледжання непісьменнасці ў былыя часы, аднак асобныя выпадкі дазваляюць меркаваць пра добрую памяць як асаблівы сакральны дар. Так, Ксеня Скорба, вядомая на ўсю акругу знахарка з в. Сітнікі Лепельскага р-на, пра сваё навучаннне расказала такую гісторыю. У гады вайны праз вёску ішлі бежанцы, і яна, тады яшчэ маладая дзяўчына, прыхінула старую, дала ёй паесці, і пераапранулца, і нешта з сабою. У падзяку тая цэлую ноч пераказвала ёй замовы (а замовы бабы Ксені – разгорнутыя, большай часткай эпічныя сюжэты, якія, дарэчы, некалькі вылучаюцца на агульналепельскім фоне). Замовы засталіся ў памяці. Гл. таксама каментарый знахаркі з Бешанковіцкага р-на: «А залатнік, рожа, я часта ліжала ў бальніцы, там былі такія старухі. І вот яны тады: Валька, давай цябе будзем вучыць, раз ты такі доктар. Нескалькі разоў перагаворуць. А я тады паўтару. А я вот адну вучыла, ліжала ў Бішанковічах, яна прасіла: Баба Валя, навучы мяне ад рожы. Я ей нагавару, а яна назаўтра ўстанець і нічога: Ішоў Гасподзь полем... А куды пашоў – ні знаю. А я аж зругаюся: якая ты непамятлівая»[2].

Поўдзень цэнтральнай Віцебшчыны наогул вылучаецца адкрытасцю замоўнай традыцыі. Інфармантки не толькі ахвотна пераказваюць замовы, але і імкнуцца да перадачы ведаў. Надзея Важанава, 1935 г.н., з в. Будзілава Бешанковіцкага р-на пераказала мне свой замоўны арсенал, а затым, надзеўшы акуляры, старанна перачытвала мой нататнік – ці ўсё я запісала правільна – «каб жа памагала».

І яшчэ адзін немалаважны фактар – далучанасць пераемніка да царквы, веры, ахрышчанасць. «Нада верыць Богу. Прынясуць грошы ці хто што. Я іду ў царкву, стаўляю свечкі. Я ж Бога прашу, каб Бог памог. Вот я і стаўлю свечку і ў скарбонку кідаю грошы. Нада пераказаваць таму, хто верыць і хто хочыць. Нада дзяржаць у душэ»[3]. Семеж Марыя, шаптуха з в. Валынцы Верхнядзвінскага р-на, свой сшытак з замовамі асвяціла ў царкве – «Эту цетрадку бацюшка асвяціў у царкве. Я з ім пагаварыла: ці можна эта. Ён паглядзеў: можна, эта ж спасаеш ты»[4].

У шэрагу выпадкаў/раёнаў веды перадаваліся перад смерцю, пераказаныя раней часу і чалавеку старонняму прыводзілі да страты знахаркай яе моцы. Так, адмаўляліся пераказваць свае замовы лекаркі з Віцебскага р-на, неахвотна гэта рабілі з Талочынскага. У Чашніцкім р-не не сталі пераказваць замовы актыўна практыкуючыя маладзейшыя знахары, у той час як старэнькая бабуля Таня (Т.І. Гаспадарык) надыктавала старанна і ахвотна.

Варта агаварыць тую акалічнасць, што без роздуму перадаюцца магічныя формулы, прыгаворы, якія суправаджалі тое ці іншае рытуальнае дзеянне. Разгорнутыя замовы, якія базуюцца на сакральнай моцы ўласна слова, часцей практыкуючымі моцнымі вылучанымі знахарамі не пераказваюцца і належаць да каштоўнай эзатэрычнай веды. «З'яўляючыся немалаважным фактарам, што абумоўліваў размеркаванне сацыяльнага статусу і дабротаў, а значыць аўтарытэту, уплыву і ўлады, замоўныя тэксты выступалі ў якасці значнай каштоўнасці, складалі своеасаблівую інтэлектуальную ўласнасць» [2, с. 78].

Такім чынам, ёсць пэўныя рэгіянальныя асаблівасці ў самім працэсе перадачы сакральных ведаў, аднак спецыяльныя доследы ў гэтым плане не праводзіліся і гэта толькі папярэднія назіранні, большасцю з уласнага збіральніцкага вопыту.

Асаблівасці структуры замоў Віцебшчыны

Падзвінскія замовы ўяўляюць сабою даволі неаднародны кантынуум – ад невялікіх заклінальных формульных тэкстаў да разгорнутых эпічных структур, якія, аднак, пераважаюць у раёнах, адносных да

[1] Зап. Т. Валодзіна ў 2007 г. у в. Слабада Ушацкага р-на ад Каваленка Таццяны Ягораўны, 1935 г. нар.
[2] Зап. А. Богданева і Т. Валодзіна ў 2006 г. у в. Сокарава Бешанковіцкага р-на ад Лабацёнак Валянціны Сямёнаўны, 1928 г. нар.
[3] Зап. у 2005 г. Т. Валодзіна ў в. Марцінава Верхнядзвінскага р-на ад Ламінскай Ніны Мікалаеўны, 1931 г. нар.
[4] Зап. у 2005 г. Т. Валодзіна ў в. Валынцы Верхнядзвінскага р-на ад Семеж Марыі Мітрафанаўны, 1920 г. нар.

зоны Падняпроўя. Прымяняльна да класічнай лекавай замовы можна вылучаць малітоўны ўступ, наратыўную частку і закрэпку. Разам з тым абсалютная большасць тэкстаў на Віцебшчыне ва ўсялякім разе запісаная без малітоўных уступак і закрэпак, а адразу ідзе наратыўная частка або зварот да хваробы. Аднак варта агаварыцца, што ў рэальнай практыцы кожная знахарка можа скарыстоўваць свае зачыны і закрэпкі, не лічыўшы іх адноснымі да канкрэтнай замовы, пра якую яна апавядае. Тым не менш у параўнанні з іншымі рэгіёнамі вялікая колькасць віцебскіх замоў выглядае як адначастковая структура.

Вельмі ўмоўна ўвесь корпус замоў можна падзяліць на сюжэтныя і вакатыўныя (зваротныя), хаця існуе вялікая колькасць тэкстаў, дзе разгорнуты сюжэт затым уключае зварот да хваробы, а замова, якая з вакатыву пачалася, заканчваецца кароткім пазначэннем сюжэтнай сітуацыі. Вакатыўныя замовы – невялікія па аб'ёме, складаюцца з аднаго-трох сказаў, часам пабудаваныя па прынцыпу падабенства «як адбываецца гэта, каб гэдак адбылося тое».

Круг, лішай, ідзі сьвінням мяшай.
Свярбіць, шчакочыць, уміраць ня хочаць.
Як хросная мамка пад крэст станавіла,
у Бога долі-шчасьця прасіла, круга не спамінала,
каб целца век круга не знала.
Амін[1].

У гэтай групе звяртаюцца канкрэтна да адной хваробы, мадальнасць звароту разгортваецца ад просьбы да пагрозы, хваробу просяць выйсці ці катэгарычны выганяюць.

У Падзвінні дамінуе менавіта вакатыўны тып замоў. Прыблізна дзве трэці вядомых тэкстаў уяўляюць сабою або наўпроставы зварот да хваробы, які не месціць ні малітоўных уступаў, ні папярэдніх заўваг (асабліва характэрна для замоў ад залатніка, пуду, грызі), або гэты зварот ідзе за рэмаркамі адносна шляху сакральнага персанажа ці іншымі ўводнымі канструкцыямі.

Зачыны. Абсалютную большасць зачынаў падзвінскіх замоў складае зварот па дапамогу да хрысціянскага персанажа – «Святыя святочкі, гасподнія дзянёчкі, памажы, Божачка, ад залатніка. Я ж нікога не знаю, толькі Госпада Бога, Духа Святога, Ісуса Хрыста, мертвяца» *Леп.*; «Ва імя Айца, і Сына, і Святага Духа. Залатнік замаўляю, Бога ўспамінаю Пана Язуса, Найсвеншу Матку. Бог помач, а я з духам». *Докш.*; «Дыхні, Госпадзі, сваім духам гасподнім. Стань, Госпадзі, на помач, рабе божае Ганне на пользу» *Лёзн.*; «Святы Юрый-Ягорый, Госпадзі Божа, благаславі. Святая Божая Маці, памажы і спасі маю скацінку» *Пол.*

Папулярныя на ўсёй тэрыторыі Беларусі «Першым разком, лепшым/Божым часком» даволі частотныя ў Шаркаўшчынскім, Глыбокскім, Лепельскім, Чашніцкім, Талочынскім, Аршанскім, Дубровенскім раёнах, а вось «Устану я раненька, умыюся я беленька» запісаны ў адзінкавых тэкстах (Бешанковічы, Чашнікі).

Сваімі разгорнутымі зачынамі вылучаецца паўднёвы ўсход Віцебшчыны, фактычна зона, блізкая да Падняпроўя, дзе на дапамогу заклікаюцца побач з Божай Маці, Госпадам Богам і Ісусам Хрыстом і шэраг іншых святых, дзён тыдня – «Дванаццаць царэй і дванаццаць каралей, і цара Давыда ўпрашаю і ўмаляю» *Дубр.*; «Першым разком, лепшым часком, з гаспадаром Богам, св. Юры, св. Мікола, матка Пакрова, памажы мне лячыць» *Арш.* Ва ўсходне-беларускіх замовах наогул малітоўны разгорнуты зварот па дапамогу да вышэйшых сілаў мог складаць цэлую замову. Паказальна і тое, што пералічэнне ўсіх святаў календару разгортвала цэласнасць каляндарнага цыклу, што магічна скіроўвалася на паўнату жыццёвае моцы хворага – яго ацаленне: «Святое Благавешчанне, святое Хрышчэнне, бацюшка-цудатворац, Дух, Тройца, Купала Іван, Казанская Божая маць, Ільінская Пятніца, Ілля, Макавей, Спас, Бугуродзіца, Пакроў, Устрэчанне, благаславі. Святая маць Бугуродзіца, святоя Ражаство, святой Сірахім, святой Іван, святыі апосталы, усе памоцьнікі, Госпадзі, памагіце, я памагаю і вы памагіце» *Гарад* [1, с. 311].

Даволі частотны зварот да зары – «Зара-зараніца, ранняя (або вячэрняя) памашніца, памажы, Божа, (імя хворага)» *Леп., Арш.,Тал.*, вышэй на поўнач звяртаюцца да зары-зарніцы (Уш. і Пол.). Як закрэпка выступае формула «Зара прападаець/затухаець, так у... хвароба прападасць» (Беш., Глыб., Пол., Уш.), у Аршанскім р-не, наадварот, акцэнтуецца падыманне зары – «Святая зарыца, ад Госпада Бога памачніца, як зара падымаецца, так расход рукі ўстанаўляецца» *Арш.* Варта пазначыць, што і зварот да зары ў абсалютнай большасці выпадкаў дапаўняецца зваротам да хрысціянскага персанажа – «Первую зару замаўляю, Госпада Бога ўпрашаю» *Арш.*, «Госпадзі Божа, благаславі, Святая Бож'я Маці, памажы. Зара-зарніца, усяму свету памашніца, памажы-пасабі загаварваць» *Пол.*

Класічны разгорнуты зачын, прысвечаны вадзіцы-ачысціцы, якая абмывае ўсё наваколле і гэткім жа чынам ачысціць чалавека ад сурокаў, катэгарычна падзяляе Віцебшчыну на дзве часткі, амаль пасярэдзіне, гэты матыў вылучае ўсходнюю зону. На Полаччыне ў пачатку XX стагоддзя А. Шлюбскім запісаная разгорнутая эпічная замова, якая распачынаецца ад просьбы да вадзіцы, затым пераходзіць да просьбы іншым стыхіям аж да ўлагоджання духаў прасторы. Гэтая замова па праву можа быць аднесеная (па-за

[1]Зап. А. Боганева і Т. Валодзіна ў 2006 г. у в. Сокарава Бешанковіцкага р-на ад Лабацёнак Валянціны Сямёнаўны, 1928 г. нар.

належнай ёй прагматыкай) да ўзораў народнай паэтычнасці і выступае як узор арганічнай суладнасці з прыродай: «Царыца-вадзіца, красная дзявіца, марская крыніца, божжа памачніца, і ўгодніца Ульяніца, і румяніца, рака вялікая. Коцішся ты, вадзіца, па дням, па начам, па вячэрнім зарам, ідзеш з-пад крутых гор, з-пад красных зор, з-пад жаркага сонца, з-пад яснага месяцу, з-пад Латыра-камню, (па) тонкім жылам, марскім сілам. Падмываіш ты крутыя берагі, жоўтыя пяскі, калоды валяныя, траву шаўковую, вымываіш сыроя карэння, белая каменя; абмуваіш камішкі дробныя, крамення чорныя і жалеззя марскоя цяжкоя. Ачышчаіш цароў, каралёў і ўвесь народ хрысьціянскі, абмый і сцалі рабу гэту нядужную ад першага вока аднавокага, і ад карага, і ад ярага, і ад белага, і ад шэрага, ад стрэчнага, ад пупярэчнага, ад падзіўнага і пасьмешнага, ад падумнага і нагляднага, ад прыгаворнага і набродната, ад галоснага і ад злоснага, ад завіснага і ад радаснага, ад вадзянага і сухавейнага, і скразіцельнага, і скрозыілотнага, і сьветавога, і агнявога, і гаравога, і палявога; ці схода, ці маладзіка, ці пад поўная; ад часіны, ад хвіліны, і дзённага, і ночнага, і ранняга, і вячэрняга, і паўночнага, і паўдзённага, і радзімага, і насыланага, і падымнога, і сьветавога, і калючага, і балючага, і ламучага, і гаручага; ці панскага, ці цыганскага, ці дзякоўскага, ці жыдоўскага, ці мужчынскага пад вянцом, ці жаноцкага пад чапцом, ці хлапецкага пад шапачкай, ці дзявоцкага пад завіткай, ці ўдовіна, ці ўдаўцова, ці дзядова, ці бабіна, ці бацькіна, ці маткіна, ці братава, ці сястрына, ці рабячага, ці сабачага, ці дзядзькіна, ці цёткіна, ці ад старых старыкоў, ад старых старушак, ад ведзьмінскіх ічараўніцкіх і таго біззаконнага ўдовіна навараджэнца, які два разы маць сасець; і на чым бы яны ні былі: на піцянні ці на ядзянні, на гулянні-красаванні ці на мяккім спачыванні» [3, с. 37 – 38].

Заходне-падзвінскія замовы, лаканічныя самі па сабе, і малітоўны зачын (які сустракаецца вельмі рэдка) маюць адпаведны – «Прасвятая Багародзіца, дапамажы» *Брасл.*; «Памажы, Божа і святы панядзелак (ці які там дзень) ад...» *В.-Дз.*

Формулы недвухсэнсоўна канстатуюць вызначальную ролю ў лекаванні менавіта Бога і толькі пасярэдніцкую шаптуна: «Я з словамі, Бог з духамі, як стала, так перастала» *Пол.*; «Бог з помачу, баба з варажбой» *Тал.*, «Я са словам, а Бог з дапамогай. Хух, Божы Дух!» *Чаш.*; «Я – з духам, а Бог Ісус Хрыстос із помаччу. Не я памашніца – Госпад Бог, а мой лёгкі дух» *Чаш.* Такія формулы характэрныя як для зачынаў, так і для канцовак – «Госпадзі, не я памагаю, а дух мой, а я толькі гляджу» *Беш.*; «Дай Гаспадзь Бог на помач, а я на радачку» *Беш.*, «Бог помач, а я з духам» *Докш.*, *Чаш.*, «Бог з дапамогай. Я з духам. *Тал.*; Бог з помаччу, я з духам. *Чаш.*, *Тал.*, *Уш*; «Бог з помаччу, я з душой» *Тал.*; «Дай, Гасподзь, на помач, а мой сьвяты дух. *Уш.*; «Бог на помач, мой лёгкі дух» *Чаш.*

Закрэпкі. У закрэпках канстатацыя не сваёй – вышэйшай – дапамогі рэалізуецца ў наступных варыянтах: «Не сам я сабой – Гасподней помаччу, нябеснай каляснічы» *Віц.*, « І цур табе хрышчонага і нараджонага, Спасіцель у помач. А мае рыкі ды дух» *Тал.*; «Мой дух, Найсвеншая Матка, Ісус Хрыстос» *Чаш.* Для докшыцкіх замоў характэрная закрэпка «Бог да помачы, а я да рады». Многа часцей у завяршэнні замаўлення яшчэ раз выпрошваецца дапамога ў вышэйшых сіл – «І ўсі празьнічкі, божыя ўгоднічкі, памажыця мне ў карысьці, у радасьці, у добрым здароўю. Вячэрняя зара, палуношная зара і светавая зара ўвесь свет сакрашалі і Госпадам Богам памагалі» *Дубр.*; «Стань, Госпад, Найсвеншая Матка, на помач», «Гасподзь Бог на помач, ангелы на радасьць» *Беш.* і інш.

Акцэнтацыя ўласнай дапамогі вельмі рэдкая і практычна нідзе не выступае асобна «Пастаўлю сваім сьвятым духам. Амінь!» *Докш.*; «Госпадзі, памагі, я памагаю і ты памагі» *Гарад.* І толькі ў асобных замовах можна сустрэць катэгарычны перфарматыў «Я цябе словам убіваю» *Леп. Чаш.*

У гэтым кантэксце вельмі цікавая замова з Мёрскага раёна, дзе знахарка прыраўноўвае сябе да Божай Маці, сімвалічна прымае на сябе яе функцыі ў лекаванні хворага.

Малітва да Прачыстай Маткі Боскай.

Дапамажы (імя каму) упуд адганяць.
На рацэ сяджу, на бягучую ваду гляджу.
На чыстую, на ўпудную.
Благаславі, Божа, узяць і мне (імя) раду даць.
Я, Найсвеншая Матка, на камяні сяджу,
На ўпудную ваду гляджу,
Шоўк вышываю, упуд замаўляю.
Маўры-гаўры. Фу-Фу-Фу. (3 р)[1].

З адзінкавых, але вартых увагі закрэпак – «Кажу я сваімі вуснамі, якімі прымала святое Прычасце, каб было ў ... помач» *Уш.*; «Ісус Хрыстос, явіся, уся сурока ўніміся» *Дубр.*, «Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс!» *Пол.*; «Не я памагаю, Гасподзь памагаець. Капцы этай хваробе» *Пол.*;

[1] Фальклорны архіў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта: зап. М. Пракулевіч у 2003 г. у в. Цвеціна Міёрскага р-на ад Веры Іванаўны Дземянчонак, 1918 г. нар.

«Ох, Божухна, стань на пуць, а злый дух – на муць» *Пол.* У якасці і пачатку і канца падзвінскіх замоў вельмі папулярныя просценькія формулы «Памажы, Божа», «Бог, на помач».

Паратыўная частка. Безумоўна, віцебскія замовы з'яўляюцца арганічнай часткай агульнабеларускіх і, шырэй, усходнеславянскіх, выяўляюць вялікую колькасць паралеляў з замовамі суседніх народаў. Гэтае падабенства заснаванае перадусім на універсальных прынцыпах пабудовы замовы, сярод якіх прыпадабненне, зварот да хваробы з пагрозамі, просьбамі, адсылкамі, прапановамі, апісанне дзеяў самога знахара ды зварот па дапамогу да іншых персанажаў. Спецыфіка можа быць выяўленая ў перавазе і найбольшым развіцці той ці іншай сюжэтнай лініі.

Сярод прысутных частотных матываў вылучаюцца: пералічэнне частак і органаў цела (... «пуд выбіраць з русых валасоў, з светлых воч, з белай касці, з чырвонай крыві, з-пад локцікаў, з-пад ногцікаў»), адкуль хвароба мусіць быць выдаленая, і выразнае фармуляванне локусаў адсылкі хваробы, сярод якіх вылучаюцца месцы, адкуль хвароба і паходзіць, фактычна той свет – «Ідзі ты, грыжы, на мхі, на балоты, на ніцыя лозы. Дзе пцічкі не пяюць, петушыны голас не даходзіць і дзе людзі не ходзюць» (Леп.). Характэрна для замоў ад пуду, ад скулы. Пазначэнне магчымых прыстанішчаў хваробы ў целе як сюжэтаўтваральная канструкцыя мае асобны магічны змест, акрамя першаснага імкнення не прапусціць магчымых месцаў лакалізацыі хваробы, бо сустракаецца ў тэкстах ад тых немачаў, якія ў прынцыпе маюць канкрэтную прывязку да цела.

У параўнанні з заходнепалескімі замовамі звяртае на сябе ўвагу многа меншая распаўсюджанасць дыялогавай структуры ў тэкстах сюжэтнага тыпу (там гаворку між сабою вядуць сакральныя персанажы ў шляху да хворага), у дадзеным выпадку рытуальны дыялог суправаджае і вытлумачвае магічныя дзеі – пры паланні дзіцяці пры начніцах, пры выгрызанні грызі і, што асабліва папулярна, у дыялогу з месяцам пры болю зубоў.

Матыў міфалагічнага цэнтра ў замовах Віцебшчыны займае даволі значнае месца. Цэнтр прэзентуе дзве сферы светабудовы: месцазнаходжання сакральнага персанажа, які сваімі пэўнымі дзеямі дапамагае хвораму, і цэнтр антысвету, прытулак хваробаў, куды адсылаецца і дзе чакаецца немач аб'екта замовы.

Сакральны цэнтр прадстаўлены ў наступных канфігурацыях яго канцэнтрычных складнікаў і насельнікаў: <у чыстым полі> на сінім моры (белы) камень/<прыстол (з кубкамі паналіванымі)>, на ім Божая Маці чытае кнігу (ад пуду, *В.-Дз.*), бярэць ключы залатыя, «замыкае злому духу рукі, язык і мову і кідае ў сіняе мора» (*В.-Дзв.*); у Пол. спасае ад сурокаў і выкідышу; «кубкі мыла, шоўк сучыла, шоўк расшывала, уроцы зашывала» (Уш.). І нават «на пяньку Найсьвеншa Матачка тонкі кужаль прадзець» (ад залатніка, Докш.) Такія здольнасці ў рукадзеллі прыпісваюцца і іншым жаночым персанажам, якія ў цэнтры дапамагаюць хвораму: гэта могуць быць тры сястрыцы (дзявіцы)-рукадзельніцы, якія сваімі дзеямі выбіраюць сурокі/рожу (Арш., Дубр.); на камені сярод мора тры панны Ганны матаюць красны шоўк (Віц.); «там на моры, на лукамор'і злішныя панны гулялі і ўроцы вымывалі» (Дубр.); «дванаццаць сясцёр платкі шыюць, вышываюць, дванаццаць рожаў замаўляюць» (Мёр); на камені Латыры дзяўчынка тчэ шаўковы кужалёк (ад крывацёку, Шум.); тры сястрычкі над яблынай: «адна шыла, другая вышывала, трыцяя зьвіх вымаўляла» (Чаш.); «А на моры стаіць ложа, прыбранае, засланае, на тым ложы ўдавіца, у ўдавіцы тры дзявіцы: адна тонка прала, адна часта ткала, адна трубкі качала, суставы сустаўляла» (Тал.)» на моры бел камень, на ім царква – прэстол – паненка – «нічога не знаіць, не маіць – толькі ад уроцы памагаець» (Чаш.). «На моры, на акіяне, на востраве, на Буяне стаіць саборная апостальская царква, стаіць Маці Святая Багародзіца і прыпадобны Анцыпій» (Докш). «Шол Ісус Хрыстос чэраз сіняе мора, на тым моры высака цэрква, на той цэркві крэст, на тым красце святы Пётр, святы Фабіян, святая Тройца, едзіны» (ад рожы, Бсш.); «На моры ляжыць камень Імператар, на тым камні 12 ключкоў і 12 замкоў. На тым камні сядзіць дзедбеладзед, нічэво не есьць, нічэво не п'ець – толькі с этага жывець» (ад урокаў, Рас.); «На сінім моры стаіць купіна, на той купіне стаіць драбіна. На той драбіне сам Гасподзь Бог. С кадзілам выкажае, вымаляе, нячыстую сілу выганяе з раба божага» (ад пуду, Рас.).

У падзвінскіх замовах міфалагічны цэнтр пазначаецца адразу і практычна адсутнічае апісанне шляху да яго. У самім цэнтры дзейнічае перадусім сакральны персанаж, з'яўленне там суб'екта замовы – у адзін-кавых тэкстах.

Ландшафтныя зоны першага ўзроўню прадстаўленыя ў абсалютнай большасці морам (усе раёны), поле сустракаецца толькі некалькі разоў, рака толькі ў словазлучэнні «акіян-рака», адзінкавы запіс – Дунай. Лес як прастора антыцэнтра, дзе месцяцца самі хваробы, зафіксаваны ў замове ад рожы (Докш.) і ад скулы (Арш.), хаця ў цэлым сакральны статус лесу на Падзвінні вельмі высокі, што дазволіла ў адметнай вайсковай замове звярнуцца наўпрост: «Святы Божа, лес зялёны. Спасі мяне. Спасі. Спасі ад шашак алавянных, нажоў вострых, злога вока, ад вады студзёнай, ад пулі паганай і ад усякай бяды»[1]. Цэнтр першай буйной зоны маркіруецца востравам і ў двух запісах гарой. Паказальна, з'яўленне вострава пераважае ва ўсходне-віцебскіх замовах, там жа сустракаецца і назва вострава – Буян.

[1] АНДЛ: зап. у в. Каханавічы Верхнядзвінскага р-на ад Курклінскай Ганны Карпаўны, 1917 г. нар.

На другім узроўні (у канцэпцыі Т. Агапкінай [4]) змяшчаюцца сакральныя культавыя аб'еты: прыроднага паходжання – *камень, дрэва/куст,* ці рукатворныя (хрысціянскія) – *царква, касцёл;* у адзінкавых выпадках мірскія аб'екты – *дом, хата.* Па частотнасці абсалютнае першае месца належыць каменю. Дрэва сустракаецца пераважна ў замовах ад змеяў, там гэта можа быць іва, ракітавы куст, у балышыні выпадкаў у міфалагічным цэнтры расце дуб і ні разу – у адрозненне ад іншых зонаў – ліпа, груша, у адзінкавых замовах – яблыня і бяроза. Трэці значны культавы аб'ект другога ўзроўню – царква – не з'яўляецца частотным (7 фіксацый супраць 43 для каменя); касцёл сустракаецца толькі ў двух выпадках. З больш дробных і рэдкіх адзнак цэнтра ў падзвінскіх замовах зафіксаваныя: прастол і ў некалькіх выпадках крыж і крэсла/краваць. Цікава, прастол у шэрагу запісаў сустракаецца адразу ў моры, на востраве, без папярэдняй узгадкі царквы, часцей на камені, што паказвае на іх семантычную блізкасць. Ва ўсходняй палове Віцебшчыны фіксуецца ўзгадка каменя Латыра.

Т.А. Агапкіна на падставе аналізавання значнай колькасці ўсходнеславянскіх замоў выказала гіпотэзу, што матыў міфалагічнага цэнтра ў варыянце *мора – (востраў) – камень – царква* мог, хаця б у пэўнай ступені, сфармавацца пад уплывам астраўной культуры Рускай Поўначы, дзе святыні і культавыя аб'екты ўзводзяцца і размяшчаюцца на аддаленых астравах. У той жа час у паўднёваруска-беларуска-ўкраінскім варыянце матыву ў сакральны цэнтр змяшчаецца дрэва як асноўны культавы аб'ект гэтай часткі Усходняй Славіі [4, с. 281 – 283]. У падтрымку такога тэзісу даследчыца прыводзіць наступныя аргументы: адсутнасць у беларуска-ўкраінскіх замовах папярэдняга матыву шляху; размыванне рэгулярнасці сакральных міфатапонімаў тыпу Сіянская гара, Буян, Латыр і г.д.; з'яўленне новых аб'ектаў другога ўзроўню тыпу горад, лес, курган; змяшчэнне матыву ў межах аднаго тэксту побач з іншымі матывамі і не заўсёды на першым месцы, як на Рускай Поўначы; набыццё цэнтрам функцый антылокуса, тады як у паўночнарускай традыцыі ён вытрымлівае статус сакральнага цэнтра. Калі ў рэчышчы ўсяго вышэйзгаданага паглядзець на замовы Віцебшчыны, то можна адзначыць захаванасць перадусім на ўсходзе вобласці (на агульнабеларускім фоне) асобных паўночнарускіх рысаў, аднак з тэндэнцыяй да размывання ядра матыву.

Персанажны ровень сюжэтнага тыпу «міфалагічны цэнтр» прадстаўлены цэлым шэрагам сакральных памочнікаў, цэнтральнае месца сярод якіх належыць хрысціянскім персанажам. На першым месцы – Божая Маці, вобраз якой сустракаецца ў замовах практычна ад усіх хвароб. Рэгіянальная адметнасць хіба ў яе найменні: Найсвяцейшая Маці/Матачка ў заходніх раёнах, Прысвятая Багародзіца – ва ўсходніх (Гар., Шум.). Значна радзей у сакральным цэнтры знаходзяцца Госпад Бог, Хрыстос і, што цікава, яго вобраз суседнічае з дрэвам, полем – «У ціхім полі Дунай, у ім прыстол – Госпад Бог сядзіць, каля яго Ісус Хрыстос, Маці Багародзіца... аб уроцы гукаюць» (Пол.); «за сінім морам дуб, пад дубам прастол, на прастоле скацерць. Там сам Госпад Бог сядзіць» (Пол.); на востраве на прастоле Госпад не шые-вышывае (!), а «чараўнікоў адганяе, залатой пугай па вадзе памахае, сыр-масла наганяе, сыроватку на ваду пускае» (Уш.).

З іншых персанажаў сустракаюцца як старцы, так і святы і птушкі: на камені-алатыры тры старцы з жалезнымі пугамі, якія ўшчуваюць 12 сёсцёр-ліхаманак (Арш.); «За ракамі агні гараць, за агнямі сталы стаяць, за сталамі святыя гадавыя праздзяйкі сідзяць, кнігу дзяржаць і чытаюць і злодзеяў, і чарадзеяў ссылаюць» (Докш.); «Ёсць на белам свеце акіян-рака, на той рацэ стаіць дуб, на том дубе сядзелі тры вароны чорныя. Яны гаварылі...» (Дубр.); «на сінім моры камень, на камені дубок, на дубку трыдзевяць катоў, на тых катах трыдзевяць гняздоў, на тых гняздах трыдзевяць сарок, трыдзевяць урок – ад жаноча...» (Пол.)

У архаічнай ахоўнай замове міфалагічны цэнтр пераносіцца непасрэдна ў хату лекара/хворага – «У маём домі ні долі, ні волі, – прастол на прастолі; на тым прастолі латрый-камень, на тым камні Мікіта-мучанік; а перад ім стаіць сам Сус Хрыстос, а перад ім стаіць маць Праснятая Бугуродзіца: сцеражэць, бераженъ, – у дзень на работкі, у ночкі на пасцелькі, пад красным сонцам, пад ясным месяцам, пад лунным лунам, пад частым звездам. Амін» (Гарад.) [1, с. 51].

Разам з тым у шэрагу замоў хаця і пастулюецца наяўнасць цэнтра, актыўнасць у лекаванні прама заяўляецца самім выканаўцам: «на моры, на Іардані ляжыць камень Ля́дан, на ім сам Гасподзь Бог, Ісус Хрыстос з усімі сваімі апосталамі», але *Зганяю, здуваю ўрага-супастата* (Пол.) «На сінім моры стаіць дуб, на тым дубе дванаццаць сучкоў, на тых сучках дванаццаць гняздоў, а ў тых гняздах дванаццаць яец». Але «Я гнёзды яец знімаю, падвея аднімаю, Госпада Бога на помач прызываю...» (Тал.).

Хваробы сваім цэнтрам маюць гэтаксама канцэнтрычна ўкладзеныя локусы, самым першым аддаленым локусам можа выступаць і сіняе мора: рожавая маці на моры збірае да сябе сваіх ражанят з хворага (Арш.); – «пану-басурману»прапаноўваецца «серы конь і залатое сядло», каб паехаць да паненак, якія гуляюць у сінім моры ў карты; «На моры, на лукамор'і стаяў куст ракітавы, а ў тым кусце ляжала змяя Шкурапей» (Уш.); «Стаіць акіян-мора, за акіянам – астроў. На астраве – іва. На іве – чорна руно. На чорным руне – зьмяя Шкарлупея» (Шум.), але ў выпадках з хваробамі ўсё часцей з'яўляецца чыстае поле, хай сабе за морам – «У чыстым полі на сінім моры стаіць дуб шыракаліст, пад тым дубам воўцы стары, пераяры, чорная воўна. На тэй воўні ляжыць змяя змяіная (Гарад.); «На востраві на Сакалоні стаіць дуб, а на тым дубу дванаццаць кокатаў, а пад тым дубам дванаццаць галубоў. ...на сінім моры ляжыць камінь, пад тым камянём ляжыць дашка, а пад тэй дашкой ляжыць мая таска» (Пол.); «у чыстым полі явор стаіць, пад тым яворам твае сястрыцы сідзяць, сталы засцілаюць і цябе дажыдаюць» (Слабада);

«пад белу бярозу – там дванаццаць грызь п'юць, гуляюць, трынаццатую дажыдаюць» (Старына); у чыстым полі дуб, пад ім 12 залатнікоў прастолы засцілаюць, адпачываюць і чакаюць (Пол.). Звяртае на сябе ўвагу той факт, што антылокус амаль кожным разам маркіраваны вобразам дрэва ў адрозненне ад каменя, на якім знаходзіцца сакральны вышэйшы песанаж.

Згодна з назіраннямі Т.А. Агапкінай, на агульнаўсходнеславянскім фоне толькі рэдкія замовы змяшчаюць у міфалагічны цэнтр самі хваробы або міфалагічны цэнтр асэнсоўваецца як тагасветавая прастора, локус немачаў [4, с. 276]. Аднак у замовах Віцебшчыны гэтая прапорцыя некалькі іншая: тэкстаў з матывам «хвароба знаходзіцца або адсылаецца ў антыцэнтр» не на шмат меней, чым з «класічнай» схемай знаходжання там сакральнага памочніка, прычым такія замовы фіксуюцца ў адных і тых жа раёнах.

Матыў *шляху міфалагічнага персанажа* прадстаўлены ў замовах ад бальшыні хвароб і па ўсёй тэрыторыі вобласці. Шлях сакральнага персанажа, яго сустрэча з хваробай ці іншым персанажам уяўляе сабою вельмі старажытны сюжэт, які мае паралелі яшчэ ў асірыйскіх заклінаннях. У тэкстах з Віцебшчыны распрацоўваецца матыў шляху міфалагічнага персанажа, дзеянні якога прасцыруюцца ў свет хворага і тым выклікаюць яго выздараўленне. У замовах ад звіху гэта пашыраны кругом матыў шляху або паездкі Бога/Госпада/Ісуса Хрыста/Юрыя/Архайлы/Даніла ці самога звіха на вараным/сівым/залатым кані праз залаты/калінавы/жалезны мост. Спатыкаецца конь або сам персанаж/угібаецца мост – звіх становіцца на месца. Гл. адрознае – «Ехаў Бог па полю на сівым каньку, выламаў галінку. Табе, галінка, не шумець. А гэтай косці не балець» (Мёр.) або» Ехаў персанаж, вецце ламаў, раны затыкаў (Глыб.); «Ехаў Бог па нябесах, на срэбраных калясах». Іншы блок міфічнага падарожжа – паездка цара на вайну з Богам (Глыб.), адпачатковая безвыніковасць якой найлепшым чынам праграмавала і знікненне болю.

Гэтаксама матыў шляху сакральнага персанажа шмат разоў паўтараецца ў замовах ад рожы, калі тры кветкі (у Глыб. не толькі тры ружы, але і юргінію, півонію і ружу) нясе/знаходзіць Божая Маці/Хрыстос («святыя ангелы падбягаюць, ружу-красачку аднімаюць» (Чаш.)). Кроў унімаць ідуць Мікола, Ягор'я і Міхайла са сваімі вострымі мячамі ці Гасподзь з залатым крастом (Арш.); на шляху Хрыстос сустракае тых, што «секліся, біліся, там і кроў лілася» (Докш.), а за ім «двенаццаць апосталаў, дарожку пяском насыпалі, каб двенаццаць змей не кусалі» (Уш.).

Як найпершая памагатая ў хваробах бачыцца Божая Маці, калі ў замовах апісвасцца яе шлях і тое, што яна «костачкі састаўляла» (Гняздзілава) або выздараўленне чакаецца ў выніку пэўнага яе ўчынку – «Ішла Найсвенша Матка па чыстаму полю, несла чашу. Чаша ўпала – косць на месца стала» (Чаш.). У сваім замоўным падарожжы Маці Божая рыхтуе магічнае зелле: «па бару хадзіла, траўку-мамку сабірала, 20 рож і скул замаўляла» (Пол.).

Асобны блок складаюць замовы з *міфалагічным прэцэдэнтам*: Божая Маці спяшаецца да хворага Ісуса Хрыста, дапамагае яму і гэта магічна спрыяе ацаленню хворага: «Насвенша Матка па небу хадзіла, Сынка свайго за ручку вадзіла. Прывяла: «Ах, Сынку ты мой пралюбезны, сваёй Маці прыбалезны». «Ах, Матачка ты мая, прыцерпіў раны свае... » (Мёр.); «Ішла Найсвяцейшая Матка па бару, несла Ісуса Хрыстоса ў падалу, Ісуса Хрыстоса змывала, ад сурокаў, нагавораў радыпомачы (імя) давала» (Чаш.). Радзей сустракаецца матыў шляху Божае Маці да Ісуса, які параніўся (Дубр.). Залатнік вызывае з цела «Найсвенша Матка на Дунаі» або «Насвеншая Матка па саду хадзіла, Ісуса Хрыста радзіла, у яслях страдала, а труду не знала, у крэсле сядзела, залатніка на месці пастанаўляла» (Пол.). Адсутнасць болю праграмуецца на ўзор вытрымкі Божай Маці - «Шла Найсвентшая Матка, Святая Багародзіца па бальшых гарах, па высокіх мастах. Масты абламіліся, горы праваліліся. Найсвентшая Матка, Святая Багародзіца эці раны здзержала і балезні не знала» (Пол.).

Сюжэт сустрэчы Божае Маці з іншым персанажам ці хворым – у падзвінскіх замовах вельмі і вельмі рэдкі, гл., да прыкладу, «Ішла Насвенчая Матка па мяжах, сустрэла царыцу на крастах: – Што ты, царыца, сабіраеш? – Сабіраю жылачкі, костачкі, суставачкі, каб гэтыя жылачкі, костачкі, суставачкі на месца сталі, балець перасталі» (Чаш.). З іншых жаночых персанажаў на дапамогу спяшаюцца тры дзявіцы, якія «рвалі тры травіцы. Первая – зелье краснае, другая – зелье жоўтае, трэцця – зелье белае» (Докш.) [2, с. 98 – 99].

Замовы ад залатніка актыўна распрацоўваюць матыў шляху самое хваробы, калі залатнік ідзе сам «па залатому масту, спускаў свае косы па сырой траве, па сырой зямлі», «ідзі па залатых дарожках, па залатых кусточках, па залатых масточках, па залатых сцежках» (Уш.). Разам з залатніком «Бог ідзе мяжой» і тады «як Гасподзь Бог на прыстоле стаў, так залатнік Раманаў на месцы стаў» (Уш.). Замовы ад залатніка маюць і свайго адмысловага «падарожніка» – Яна Златавуста. З іншых хваробаў «ісці/хадзіць» можа нейкая невідзімка (Уш., Пол.), якая ў амаль даслоўных варыянтах аказваецца Праскоўкай, можа шукаць пражыўлення і знайсці яго сабе ў пупе (ад грыжы).

Заходнепадзвінскія замовы, арганізаваныя вакол матыву шляху, вылучаюцца сваёй лаканічнасцю і пазбаўленыя суправаджальных дэталяў і канструкцый. Варта тут адзначыць, што менавіта такая структура замоў характэрная для літоўскай традыцыі, для якой наогул не ўласцівая эпічнасць. «Літоўскія замовы, як правіла, статычныя, і матывы шляху, у асноўным, адпавядаюць запазычаным з заходнееўрапейскай ся-

рэднявечнай традыцыі сюжэтам. Як правіла, гэтыя сюжэты не развіваюцца ў разгорнуты эпічны сюжэт, а ўяўляюць сабой кароткую канстатацыю факта: нехта ішоў, нешта здарылася, у выніку чаго боль знікла ці павінна знікнуць» [5, с. 235]. Гл. тут тыповыя браслаўскія замовы – «Ішоў Езус каля Усі. Ніхто яго не бачыў, няхай і мяне не ўбачаць» (ад сабак, Брас.); «Ехаў пан, вёз жбан, жбан пабіўся, вада палілася, і ў (імя) галаве боль унялася» (Брас.).

Калі ж спрабаваць акрэсліць пашыранасць асноўных матываў у складзе замоў Віцебшчыны, то на першым месцы адназначна змесціцца зварот да хваробы, на другім – матыў шляху сакральнага персанажа і толькі на трэцім – матыў міфалагічнага цэнтра. У рэгіянальных адносінах захад аддае бясспрэчную перавагу матыву шляху, матыў міфалагічнага цэнтра асабліва распрацаваны на паўднёвым усходзе, у зоне Падняпроўя.

З прасоўваннем на ўсход павялічваецца эпічнасць тэксту, што выяўляецца ў выразным пазначэнні прасторавай характарыстыкі дзеяння, імкненні вылучыць цэнтр і галоўнага дзейснага персанажа. Ды і сама палітра сакральных памочнікаў на ўсход становіцца ўсё больш і больш разнастайнай. Да Божай Маці, Бога і Ісуса Хрыста на захадзе тут далучаюцца дзеўкі, баба, дзед-беладзед і інш. Паказальна, у віцебскіх замовах амаль не сустрэнеш святых Юрыя, Міколу, Міхайлу, як на Палессі, вельмі спарадычна тут фіксаваныя Пётра, Анцыпій, Фабіян, Ціхан Задонскі.

М. Зав'ялава, параўноўваючы беларускія і літоўскія замовы, адзначае, што «адрознай рысай беларускіх замоў з'яўляецца выразнае проціпастаўленне свету чалавека (таго, хто замаўляе) астатняму свету, які ёсць антыподам свайго, яго люстраным адбіткам. Менавіта ў гэтым свеце разгортваецца асноўнае дзеянне замовы, там жывуць хваробы, там адбываецца барацьба двух пачаткаў ці заключаецца мірная дамова. Пераважная большасць беларускіх замоў пачынаецца з тэмы шляху ў гэты свет з паступовым звужэннем фокуса, набліжэннем да цэнтра, сутнасці» [5, с. 195].

Аднак замовы Віцебшчыны дэманструюць некалькі іншую карціну. Шлях самога знахара/хворага на той свет фіксаваны ў адзінкавых прыкладах. І хаця свет хваробы акрэслены досыць празрыста і выяўна, мяжы між светамі практычна не існуе. Хвароба – і нават у межах аднаго тэксту – адпраўляецца як на той свет, што за морам, так і на той, што ўнутры самога чалавека (гл. замовы ад залатніка). Наогул, падрабязная антрапамарфізацыя хваробы яшчэ раз сведчыць не проста пра дыялогавы характар дачыненняў між светамі, але і пра арганічнасць іх стасункаў, адсутнасць рэзкай мяжы.

І хаця «дапамога магутных сілаў выступае адной з асноўных прынцыповых асаблівасцяў беларускіх замоў» [5, с. 195], самы колькасна прадстаўнічы блок замоў Падзвіння прадстаўляе якраз наўпроставую камунікацыю чалавека з хваробай. Знахар або сам хворы звяртаецца да немачы з просьбамі ці патрабаваннямі рознай мадальнасці, імкнецца да выгоднай для сябе «здзелкі».

І некалькі заўваг адносна рэгіянальнай характарыстыкі адной з самых старажытных і паказальных асноўных тэматычных груп замоў ад змяі. У блоку замоў ад змяі ўсход Віцебшчыны (Арш., Лёзн., Шум.) вылучае пагрозы наслаць на гадаў нябесных воінаў з мячамі і агнём. Моцнае тут перакананне ў моцы самога знахара, які можа наслаць тры хмары (Віц., Гарад.) ці перамагчы змяю адным позіркам або засекчы сам (Беш., Дубр., Пол., Рас., Тал.). Варта агаварыцца, што такое падкрэсленне ўласнай магічнай моцы ў віцебскіх замовах і вылучае найперш блок «ад змяі» – адзін з самых старажытных. Архаічны матыў змяі на руне ў цэнтры свету зафіксаваны ў Віц., Гарад., Леп., Уш., Шум., глядзі – «На моры на Кіяні, на быстрым буяні стаіць ліпавы куст, пад тым кустом ляжыць бел камень, у белым камні чорна руна, у чорнай руні змяя Шкурлупея, сястра Палагея, цётушка Аўхім'я. А ты, змяя Шкурлупея, сястра Палагея, цётушка Аўхім'я, змірай сваіх змей, а то буду прасіць Міхайла-арханела – ён цябе громам заб'ець, маланнёю спаліць, буйным ветрам по-пел разнясець. Унімі сваіх змей, сіпучых, лятучых, паўзучых, земляных, вадзяных, навозных, дзярновых, крышачных, бярновых, падкалодных, карчавых, падмежных, запечных, качарэжных. Госпадзі, памілуй, баславі, Госпадзі» [1, с. 113].

Віцебшчына як бы дзеліцца напалам у самім характары пагрозы змяі. Калі ўсходняя частка вылучае матывы «вогненнай» пагрозы – засячы яе, спаліць, прычым з дапамогаю самога Госпада Бога і Духа Святога ды святога нябеснага воінства, то на захадзе (Глыб., Шарк., Мёр.) змяю пакарае сама прырода, якая не прыме да сябе. «Гадзіна вадзяная, земляная, сляпні і вужы, змеі і вужакі, ярыца, пераярыца. Аддайце і вазьміце сваю жаласць і ярасць. Калі не аддасцё сваю жаласць і ярасць, то не будзе вам збудзішча ні пад кустом, ні пад лістом, ні пад карэннем. Сонца і яркі месяц не будзець вам свяціць і не будзе прынімаць вас сыра маць зямля»[1]. На поўначы (Рас.) змяю знахар пагражае ў зямлю адправіць. Цэнтр (Докш., Леп., Уш., Шум.) дапускае абменныя адносіны са змеямі. З персанажаў-памочнікаў ніжэйшага рангу вылучаюцца тры сястрыцы (Леп., Уш.):

На роўнай дарожцы ішло тры сястрыцы.
Адна ў золаце, другая ў серабрэ, трэцяя ў аксаміце.
І шыпуху-грымуху із-пад мяжы выганялі і жыгала замаўлялі.
І я замаўляю.
Ва векі вякоў. Амінь[2].

[1] Архіў Глыбоцкага Дома культуры: зап. у в. Празарокі ад Хоміча Часлава Іосіфавіча, 1924 г. нар.
[2] Фальклорны архіў Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта: зап. Л. Мазго ў в. Звязда Лепельскага р-на ад Янкоўскай Антаніны Пятроўны, 1924 г. нар.

У цэлым заканамерная і відавочная значная колькасць падзвінска-агульнабеларускіх адпаведнікаў. Найперш гэта тычыцца міжфункцыянальных матываў (г. зн. тых, якія скарыстоўваюцца пры лекаванні некалькіх хваробаў), тады як спецыфічных матываў адносна няшмат. Міжфункцыянальнасць такіх матываў яўна карэлюе з іх міждыялектнасцю і ўказвае на прыналежнасць да замоўнага універсуму ў цэлым. Асаблівым багаццем, разнастайнасцю матываў і паэтычнай распрацоўкай вылучаюцца замовы ад дзіцячых хваробаў, сурокаў, пярэпалаху, залатніка, звіху. Параўнальна няшмат замоў ад вогніка, валасня, адзінкавыя замовы ад каўтуна ці падучай, хаця амаль у кожнай вёсцы памятаюць пра рытуальна-магічнае лекаванне гэтых хвароб.

Як колькасныя паказнікі, так і характарыстыка асноўных матываў дазваляюць вылучыць наступныя зоны: па большасці крытэрыяў Віцебшчына дзеліцца на ўсход і захад, прычым колькасная і сюжэтна разнастайная характыстыка навялічваецца паступова з заходняй мяжы на ўсход, якасна новы зрух назіраецца перад Полацкім, Ушацкім раёнамі, але ўлучае і Докшыцкі р-н. Эпіцэнтрам бачыцца Лепельшчына з прылеглымі Докшыцкім, Ушацкім, Чашніцкім раёнамі. Усходняя падзвінская зона выразна адасабляецца ад Талочынскага, Аршанскага, Дубровенскага раёнаў, якія складаюць гісторыка-этнаграфічную зону Падняпроўя. Поўнач Віцебшчыны прадстаўлены адносна невялікай колькасцю запісаў, якія, аднак, выяўляюць пэўную розпасць з Мёрскімі ці Полацкімі. У заходніх раёнах запісана няшмат замоў, да чаго спрычыніліся закрытасць традыцыі, уплыў касцёлу, які ставіцца да замаўлення негатыўна, літоўскае этнічнае памежжа са сваёй практыкай лекавання замовамі.

Застаецца адкрытым пытанне, чаму ў некаторых традыцыях той ці іншы універсальны сюжэт не зафіксаваны ці прадстаўлены адзінкавымі запісамі. Хутчэй за ўсё тут сказваецца непаўната сабранага матэрыялу і, верагодна, пры далейшым зборы многія лакуны будуць запоўненыя.

Праца выканана ў межах галіновай праграмы «Культура».

ЛІТАРАТУРА

1. Замовы / уклад., сістэм. тэкст., уступ. арт. і камент. Г.А. Барташэвіч; рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 597 с.
2. Полацкі этнаграфічны зборнік: у 2 ч. / склад. У.А. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння.
3. Шлюбскі, І. Матар'ялы да вывучэння фальклёру і мовы Віцебшчыны / І. Шлюбскі, Ал. Шлюбскі. – Мінск: Друк. Інбелкульту. – 190 с.
4. Агапкина, Т.А. Сюжетный состав восточнославянских заговоров (мотив мифологического центра) / Т.А. Агапкина // Заговорный текст. Генезис и структура. – М.: Индрик, 2005. – С. 247 – 291.
5. Завьялова, М.В. Балто-славянский заговорный текст: лингвист. анализ и модель мира / М.В. Завьялова; Ин-т славяноведения РАН. – М.: Наука, 2006. – 563 с.

ПАГАНСКІЯ КАПІШЧЫ І ДАХРЫСЦІЯНСКІЯ КУЛЬТАВЫЯ КОМПЛЕКСЫ ПАСТАЎШЧЫНЫ

краязнаўца А. ГАРБУЛЬ
(Лынтупы, Пастаўскі раён)

На падставе палявых краязнаўчых даследаванняў і аналізу навуковых крыніц зроблена спроба абагульніць, сістэматызаваць інфармацыю па аб'ектах сакральнай геаграфіі Пастаўскага рэгіёну і ахарактарызаваць іх міфалагічны статус і рытуальныя функцыі як у часы старажытнасці, так і на сучасным этапе.

Пошукам дахрыстыянскіх культавых помнікаў аўтар займаецца ўжо больш 15 гадоў. За гэты час зроблена больш 200 экспедыцый, падчас якіх сабрана шмат фальклорнага і этнаграфічнага матэрыялу, выяўлена каля 100 аб'ектаў старажытных культаў (культавыя камяні, дрэвы, крыніцы, балоты, горы і інш.). І гэта ўсё на невялічкай тэрыторыі заходняй часткі Пастаўскага раёна, у ваколіцах мястэчка Лынтупы, плошчай каля 1000 кв. км.

Большасць гэтых аб'ектаў вядомая шырокаму колу даследчыкаў. Так, напрыклад, Святы (Дзюравы) камень ля в. Каптаруны, на думку даследчыцы Л.У. Дучыц, з'яўляецца адным з самых вядомых культавых камянёў Беларусі ў навуковых колах Еўропы.

Вывучэннем знойдзеных намі культавых аб'ектаў з непасрэдным выездам на месца займаліся вядомыя навукоўцы: Эдвард Зайкоўскі, Людміла Дучыц, Уладзімір Васілевіч, Валеры Вінакураў (Беларусь), Вікантас і Дайва Вайткевічус (Літва), Дзяніс Самкоў (Расія), знаёміліся і іншыя навукоўцы падчас


міжнародных навуковых канферэнцый у Відзенцы. Аўтар гэтых радкоў у 2002 годзе выдаў краязнаўчую працу «Скарбы сівых валуноў», дзе апісаў выяўленыя на той час дахрысціянскія культавыя помнікі [1], выступаў у перыядычным друку, пры падтрымцы экалагічнага аб'яднання «Экадом» (Мінск) і культурна-асветніцкага цэнтра «Ярга» (Масква), Пастаўскага цэнтра турыстычных паслуг, агратурыстычнай кавальскай сядзібы Грабуцішкі праводзіў экскурсіі для беларускіх і замежных (Літва, Эстонія, Расія, Украіна, Венгрыя, Польша, Германія і інш.) турыстаў. У дадзеным артыкуле мы абмяжуемся матэрыялам, знойдзеным за апошні час і невядомы шырокаму колу даследчыкаў, ды некаторымі новымі гіпотэзамі, якія ўзніклі ў час даследаванняў раней знойдзеных аб'ектаў дахрыстыянскіх культаў.

Гурніцкі ўзгорак «Магіла рыцара» («Буцянок»)

Гурніцкі ўзгорак «Магіла рыцара» («Буцянок»), на нашую думку, з'яўляецца капішчам паганскага бога вясны, урадлівасці і плоднасці Ярылы (літоўскага Пяргрубрюса). Аб'ект быў выяўлены напачатку 1990-х гадоў і актыўна даследуецца навукоўцамі. Пагорак знаходзіцца ў 20-ці м з правага боку ад дарогі Саранчаны – Палхуны, у 60-ці м на поўдзень ад першай хаты в. Гурніца. Лынтупскага с/с, і каля 150 м на поўнач ад Саранчанскага возера. З боку дарогі і возера ўзгорак выглядае як аб'ект штучнага паходжання. Ён эліпсападобнай формы з пляскатай вяршыняй, вышынёй каля 3 м, шырынёй – 15 м, даўжынёй – 25 м. Узгорак узвышаецца над паўночна-ўсходнім берагам возера. На паўднёва-ўсходнім схіле ўзгорка 0,5 м ніжэй вяршыні ляжыць валун шэрага колеру. Верхняя роўніца камлыгі мае схіл з паніжэннем на поўнач і аддалена нагадвае трохкутнік з накіраванай у цэнтар узгорка вяршыняй; даўжыня валуна – 1,25 м, шырыня – 0,95 м, вышыня – 0,73 м, аб'ём – 0,45 куб. м, вага – 1,18 т. Ля заходняга краю верхняй плашчыні, троху ніжэй цэнтральнай восі камлыгі, знаходзяцца 3 невялікія паглыбленні эліпсападобнай формы. Глыбіня іх каля 0,5 см, шырыня – 0,5 см, даўжыня – 1 см. Цэнтральная вось глыбіні выемак мае нахіл каля 30° адносна верхняй роўніцы каменя. Калі паміж паглыбленнямі правесці прамыя лініі, атрымаецца форма трохкутніка. На думку літоўскага даследчыка Вікантаса Вайткевічуса, гэтыя паглыбленні маюць рукатворнае паходжанне і зроблены жалезным прадметам.

Летам 2008 года сумесна з расійскім археолагам Дзянісам Самковым на верхняй роўніцы каменя пад пластом лішайніка знойдзены выдрапаныя знакі. На словах расійскага археолага, знакі маюць штучнае паходжанне.

Ад верхняга правага (паўднёва-заходняга) боку камлыгі ўніз пад нахілам у 45° да вертыкальнай восі выдрапана прамая дыяганальная паласа. Гэта паласа праходзіць амаль па ўсёй верхняй роўніцы каменя і абрываецца ў якіх 10 – 15 см ад супрацьлеглага краю. Да гэтай паласы з бакоў падыходзяць пад нахілам іншыя палосы, ствараючы з ёй вострыя вуглы, быццам схематычныя галіны да ствала дрэва (выява сусветнага дрэва?). Некаторыя з бакавых палос дробна перакрэсленыя кароткімі рыскамі. Злева ад гэтага «дрэва» выбіты падвоены крыж, абведзены квадратам. Гэтая выява нагадвае салярны знак, сімвал сонца. Іншыя незразумелыя знакі размешчаны вакол «дрэва» знізу, з бакоў і па ўсёй роўніцы каменя. Найбольш выразныя з іх паказаны на малюнку 1.



Мал. 1. Выявы на камені ва ўрочышчы «Магіла рыцара» ля в. Гурніца

Археолаг Дзяніс Самкоў выказаў гіпотезу аб прызначэнні трох паглыбленняў. Ён мяркуе, што ў паглыбленні ўстаўляўся нейкі трыножнік. Узяўшы гэту гіпотезу за аснову, мы здагадаліся і аб прызначэнні самаго каменя. На нашую думку, камень з'яўляўся месцам варожбаў. На трыножнік, які трывала стаяў на наклоннай паверхні, дзякуючы паглыбленням, ставіўся сасуд у які павольна налівалася вадкасць (вада, кроў, масла, расплаўленыя тлушч ці воск), калі сасуд перапаўняўся, вадкасць з дапамогай ветра капала на выдрапаныя знакі, і з гэтага паганскі святар прадказываў будучыню (надвор'е, ураджай, поспех, паразу ў ванне, мор ці моцную пладавітасць жывёлаў і людзей і інш.).

Лакаварацкае свяцілішча

Знаходзіцца ў 300 м на поўдзень ад мястэчка Лынтупы паміж балотам Лакавараці і чабалочанай далінай р. Лынтупка. Паміж балотам і далінай рэчкі, з абодвух бакоў меркаванага свяцілішча праходзяць пратокі, якія адразаюць яго ад прылягаючай сушы. Таму свяцілішча знаходзіцца як бы на выспе і ў старажытныя часы, хаця і знаходзілася ў непасрэднай блізкасці ад паселішча, але была цяжкадаступным месцам.

Свяцілішча ўяўляе з сябе высокі ўзгорак (каля 5 м) эліпсападобнай формы з пляскатым верхам, шырынёй каля 16 м і даўжынёй каля 25. Схілы ўзгорка даволі стромкія, асабліва з поўночна-заходняга боку, дзе перапад высотаў складае каля 2 м на метар даўжыні. Якраз з гэтага боку, ля прыступак узгорка, аўтарам знойдзены фрагмент аплаўленай старажытнай падковы. Знаходка была перададзена навукоўцам, якія храналагічна аднеслі яе да позняга сярэдневечча. Фрагмент падковы знаходзіўся на глыбіні 25 – 30 см, у пласце вугалёў.

Па словах мясцовай жыхаркі Пажыс (Цюкша) Веранікі Антонаўны, якраз у гэтым месцы праваліўся касцёл і знаходзіліся «вароты Локіса». Легенда аб гэтым месцы запісана аўтарам у 2005 годзе ад гэтай жанчыны: «Амаль у мяжы Лынтупаў, за чыгуначным вакзалам, на той бок рэчкі ёсь балота, Лакавараці завецца. Вельмі страшное месца. Сярод тога балота ёсь востраў, дзе, старыя казалі, пры Польшы ляснік павесіўся. Ужо на маю памяць, Валодька, бандыт такі, адразу пасля вайны быў, любіў там камуністаў вешаць. І ўжо ў наш час, хлапчук адзін у тым месцы са зброяй бавіўся і выпадкова застрэліў аднаго чалавека. Ад тога выпадка і па сёнешні дзень там крыжык драўляны стаіць. Ды шмат чаго яшчэ страшнога аб тым месцы людзі расказывалі. Гэта месца як вір рачны людскую кроў прыцягівае і засмоктывае ў сябе чалавечыя ахвяры. Кажуць, што пачалося страхаццё гэта ўсё пасля таго, як калісьці ў тым месцы мядзведзь разарваў дзяўчыну. Але мама мая калісьціі нам, малым, такую байку аб тых Лакаварацях расказывала.

Як Бог стварыў зямлю, ён кожнаму жывому стварэнню адвёў сваё месца, свой кавалак зямлі і наказаў усім ім жыць у стрыманасці, ласке і згодзе. Адзін чалавек з-за прагны і хцівасці сваёй пачаў звярам нагаворваць аднаму на другога. А як пайшлі паміж звярамі звады ды спрэчкі, людзі пачалі захопліваць іхныя землі і забіваць звяроў на ежу, каб пракарміць сваё незлічонае патомства, якое з'явілася на свет ад нястрыманасці і распусты чалавечай. Жыў тады сярод звяроў адзін звер-чалавек. Звалі яго Локіс. Кажуць, нарадзіўся Локіс ад кахання мядзвядзя і адной дзяўчыны, таму меў сілу звярыную і розум чалавечы. Звяры з-за гэтых яго здольнасцей выбралі Локіса сваім царом.

Як і бацька яго, Локіс жаніўся на дачцы чалавека, ды меў ад яе такіх самых як і ён сам дзяцей – напалову звяроў, напалову чалавекаў. Як мог абараняў Локіс звяроў ад націску людзей, а як зразумеў, што не справіцца з гэтымі хітрымі і крывадушнымі стварэннямі, сабраў усіх звяроў, што лічылі яго гаспадаром, сваю сям'ю і павёў у падземнае царства. Там, у тым царстве, што пачалі называць царствам Локіса, ён усталяваў першапачатковыя законы, створаныя калісьці на зямлі Богам. А каб чалавек не змог дабрацца і да тога царства, загадаў сваім нашчадкам пільна ахоўваць вароты ў тое царства.

Пазней, усіх нашчадкаў тога Локіса людзі пачалі называць локісамі. Локісы патаемна жылі сярод людзей у чалавечым абліччы, але, часам, пераварочваліся ў звяроў і нападалі на іх, каб стварыць хоць нейкую боязь у чалавека і абараніць сваё царства. Кажуць, што адны з тых варотаў у царства Локіса якраз і знаходзіліся на Лакаварацкім востраве. Ахоўваў яго адзін локіс з далёкіх сваякоў саболкаўскіх паноў. Ніхто не ведаў з людзей, што ён локіс, а ў чалавечым абліччы быў вельмі прыгожым хлопцам. Гэтага хлопца людзі лічылі сіратой, таму, саболкаўскія паны, яго сваякі, узялі яго да сябе спачатку на выхаванне, а пасля, як падрос, паставілі ў сваім маёнтку на пасаду эканома.

Хлопец гэты быў хоць і малады, ды вельмі здатны да навукі, гаспадарку сваіх прыёмных бацькоў вёў на зайздрасць усім бездакорна. Казалі, у прыгажосці, розуме і сіле не было яму роўных. У звярыны воблік гэты хлапец-локіс абарочваўся вельмі рэдка. Толькі каб наведаць сваіх бацькоў у падземным царстве Локіса і каб пастрашыць людзей, якія блізка падыходзілі да варотаў у тое царства. На людзей ён ніколі не нападаў, толькі, бывала, на свойскую жывелу, і то, на тую, што была хворая – гэта каб зараза не распаўсюджвалася, ды каб мор па вёскам не пайшоў.

І можа ўсё было б добра, каб не пакахаў гэты локіс дачку адных багатых і санавітых паноў. Падобна, што і дзяўчына прыхільна адносілася да яго, бо неўзабаве папрасіў у бацькоў гэты хлапец рукі іх дачкі. Адказ быў адмоўны. Багатыя і фанабэрыстыя бацькі, канечне, не хацелі мець сваім зяцем нейкага нікому не вядомага эканома з дзіравымі кішэнямі.

Пасля адмовы бацькоў той хлапец патаемна сустрэўся са сваёй каханай. Ён прапанаваў ёй збегчы з ім і абвянчацца без дазволу бацькоў. Але дзяўчына таксама адмовіла яму і, больш таго, пасмяялася з яго беднасці. Абражаны хлапец тады закрычаў ёй у вочы: "Ты хочыш каб твой выбраннік быў багаты і санавіты?.. Ты яго атрымаеш! Твой муж будзе царскага роду! Ты будзеш мець незлічаныя багацці! Толькі дарога да шлюбу пройдзе ў цябе праз рэчку крыві, ў якой захлібнуцца твае бацькі і ўвесь твой род. А пасля шлюбу ты больш не ўбачыш чалавечага твару! Ведай! Я наследны прынц царства Локіса! Гора таму, хто абразіў наш род!.. Гора крывадушнаму чалавечаму роду!.." – з гэтымі словамі на вачах дзяўчыны той хлапец пераварочваецца ў вялізарнага медзвядзя і раздзірае на кавалкі прыбегшых на яго крыкі слугаў і знікае.

Даўно дзяўчына раскаялася ў сваіх грахах. Толькі не ведала як застанавіць тое мора крыві, што штоноч лілося па ўсім краі. Ні куля, ні шабля не бралі локіса. Людзі як мышкі, затачыліся па сваім хатам, спадзяваліся, што жытло іх выратуе ад нявіданага звера. Але локіс іх знаходзіў і там. Гінулі цэлымі сем'ямі. Локіс не меў літасці ні да старых, ні да малых. Ён ужо знішчыў усіх блізкіх і далёкіх сваякоў той дзяўчыны. Чарга падыходзіла і да яе бацькоў.

Адной ноччу дзяўчына пачула жудасны крык з бацькоўскіх пакояў. Прыбегшы на крык, яна ўбачыла акрываўленае нерухомае цела бацькі і амаль нежывую ад страха маці. Яна закрыла сабой маці і цвёрда сказала локісу:

- Я згодна выйсці за цябе!

- Тады прыходзь на Лакаварацкі востраў, там замацуем наш шлюб», – адказаў локіс.

- Не магу я пад адкрытым небам пад вянец ісці, – зхітрыла дзяўчына, – Трэба хоць якую будыніну паставіць.

- Што ж, стаў, – згадзіўся локіс, - Толькі паспяшайся, роўна адну нядзелю табе даю.

Роўна праз нядзелю драўляная хата стаяла на востраве. Толькі воблік яе быў даволі незвычайны, хата не мела ніводнага акна, глухія сцены яе аж зіхацелі ад намазанай на бярвенне жывіцы, толькі наперадзе гэтай будыніны стаяў невялікі дашчаты ганачак з адчыненымі дзвярамі. Якраз у гэтых дзвярах і сустрэла дзяўчына локіса. Прыгожая, у шлюбным убранстве, яна нізка пакланілася свайму гаспадару, запрашаючы рукой зайсці ў хату. Локіс нічога не западозрыў. Калі ж ён зайшоў у хату, дзяўчына падставіла свечку пад самую сцяну ганка і зайшла ў хату да локіса, шчыльна зачыніўшы за сабой дзверы.

Агонь свечкі хутка перайшоў на багата прапітаную смалой сцяну і праз час ахапіў усю будыніну. Людзі чулі ў трэску полымя жудасны мядзвежы рык локіса і ціхенькі вар'яцкі смех дзяўчыны. Так былі зачыненыя назаўсёды вароты ў падземнае царства Локіса.

Кажуць, што дух той дзяўчыны да цяперашняга часу сцеражэ тыя вароты і не дае сіле Локіса вырвацца ў свет людзей. Праўда, калі на зямлі людзямі робіцца нейкае вялікае злачынства, вароты на час прыадчыняюцца і сіла Локіса ўсмоктвае ў сябе чалавечыя ахвяры»[1].

Гэта легенда адразу нагадала аўтару навэлу французскага пісьменніка Праспера Мерыме «Локіс». І нам спачатку падалося, што невядомы аўтар перарабіў гэту навэлу ў мясцовую легенду. Але пры далейшых даследаваннях выявілася ўсё дакладна наадварот. Старыя людзі вёсак Раманішкі і Саболкі казалі, што бацька апошняга раманішска-саболкаўскага пана Ксаверы Даўгяла (гады жыцця 1816 – 1914) сябраваў з нейкім знакамітым французскім пісьменнікам. Гэтыя звесткі ўдакладнілі накірунак пошукаў.

Вядома, што з 1834 года Мерыме самааддана працуе ў Камісіі гістарычных помнікаў французскага правіцельства, даследуе і адкрывае да навукі шматлікія гістарычныя і археалагічныя помнікі [2, с. 7]. А Ксаверы Даўгяла ў другой палове XIX стагоддзя першым пачынае археалагічныя раскопкі Лынтупскіх курганаў. (Ці не з падказкі Мерыме?). Акрамя таго, продкі Ксаверыя па матчынай лініі – Гедройці – валодалі Раманішкамі і Саболкамі бесперапынна з далетапісных часоў, і невыключана, яшчэ з часу існавання ў гэтай мясцовасці старажытнай Нальшчанскай дзяржавы. Таму ў гэтым родзе вышэйзгаданая легенда магла перадавацца з пакалення ў пакаленне шмат стагоддзяў, і, безумоўна, кожны прадстаўнік гэтага роду, як і месціч, чуў ці нават валодаў яшчэ не памершай у той час нальшчанскай мовай. А Мерыме ў пачатку сваёй навэлы якраз і нагадвае аб нейкім знікаючым дыялекце літоўскай мовы [2, с. 311 – 312] (Ці не аб нальшчанскай мове ідзе размова? І ці не са звестак Ксаверыя Даўгялы даведываецца Марыме аб гэтым?). Больш таго, Мерыме, слаба дасведчаны ў літоўскіх прозвішчах, прозвішча цёткі галоўнай гераіні навэлы дае Даўгяла [2, с. 330].

Невыключна, што прыведзеныя намі факты з'яўляюцца простымі супадзеннямі, а легенда аб варотах Локіса ні што іншае, як шырока распаўсюджаная ў нашым краі трансфармацыя старажытнага міфа.

Яноўскі культавы комплекс

Знаходзіцца ва ўрочышчы «Кундры», за 3 км на поўдзень ад в. Трабуцішкі Лынтупскага с/с і ў 2 км на захад ад в. Пешкаўцы. Яноўскі культавы комплекс уключае ў сябе курганны могільнік, святую Яноўскую крыніцу і два культавых камня з выявамі вока на адным з іх. Апроч вока на камені выбіты аб'ёмныя выявы гада і галавасціка. Не выключана, што да гэтага комплексу можна аднесці і суседняе ўрочышча «Стадалішча», дзе аўтарам знойдзены прадаўгаваты плітападобны камень, які па сваім абрысам нагадвае стод (даўжыня – 2,26 м, шырыня – 0,94 м, таўшчыня – 0,57 м). На верхняй роўніцы камлыгі моцна выдзяляюцца тры шліфаваныя выступы. У верхняй частцы два выступы нагадваюць масіўныя жаночыя грудзі. У ніжняй (калі браць чалавечае тулава – раён жывата) – выступ нагадвае вялікае зерне збожжа. Акрамя таго, у верхняй частцы камлыгі знаходзіцца шліфаваная выемка, як бы да ўсталявання ў яе галавы стода.

Курганны могільнік комплексу адносіцца да археалагічнай культуры ўсходне-літоўскіх курганоў і датуецца IV – VI стагоддзямі. Гэта адзіны могільнік каменных курганоў у Віцебскай вобласці [3, с. 116].

Яноўская крыніца з'яўляецца помнікам прыроды рэспубліканскага значэння. Легенда, звязаная з крыніцай: «Гэту гісторыю мама мая расказывала. Ёй, яшчэ малой, калісьці яе тата, мой дзед, апавядаў.

[1] Запісана аўтарам у 2005 г. са словаў Пажыс (Цюкшы) Веранікі Антонаўны, 1931 г.н. з в. Кавалі Пастаўскага р-на.

Пры цары гэта было. У той час на адной гары ля вёскі Янова кожны год збіралася моладзь на свята св. Яна. Не толькі з суседніх вёсак прыходзілі, а і з мястэчак – Лынтупаў, Свіраў кожны год былі, нават з аддаленых вёсак, бывала, прыязжалі. Людзей было, як на фэст які касцёльны. Збіраліся пад вечар. Вогнішча раскладалі, песні спявалі, хараводы вадзілі, зёлкі розныя збіралі. Раней людзі ў розныя забабоны верылі, дык у тым месцы на Яна ўвесь час моладзь варажыла. Скакалі праз агонь, каб нячыстай сілы пазбавіцца. Дзеўкі ў расе купаліся, каб прыгожымі быць, хлопцы плыткі маленькія рабілі, на іх траву сухую ці галінкі падпалівалі, ды па вадзе пускалі, дзяўчаты вянкі плялі і таксама па рэчцы пускалі. А хто ў лес ішоў папараць-кветку шукаць ды шмат яшчэ што рабілі. Ведаеце, моладзь. Казалі, што каму – кольвек з дзевак святы Ян і бахура ў тую ночку падкідываў. А чаго ў тым месцы збіраліся, дык ніхто і не ведае. Іх дзяды тут маладымі святкавалі і яны сюды на Яна прыходзілі.

Неяк, у адзін год, лета выдалася вельмі зімное і дажджлівае. Вясна яшчэ так сяк была, а ў пачатку лета такая непагадзь ды зімно зрабіліся, што і наса на двор без справы ніхто не паказываў. Гэтакае надвор'е і напярэдадні Яна было, таму на гару Яноўскую прыйшла толькі адна пара. Хлопец быў з Кавалёў, Марцінкевічаў сын, Пятром, здаецца, яго клікалі, а дзяўчына местачковая, лынтупская была, Марыся, Яноўскіх дачка. Людзі казалі, што каханне ў іх моцнае было, нават дня адзін без другога пражыць не маглі, таму і ў непагадзь такую да гары прыйшлі.

Адразу пасля Яна па хатах нейкая старая жабрачка пачала хадзіць. Ніхто не ведаў адкуль яна з'явілася. Да гэтага часу ў нашым краі яе ніхто не бачыў. А казала старая страшныя рэчы. Апавядала яна аб краіне хрыстянскай далёкай Балгарыі, што ў паўднёвых краях знаходзіцца, за святой Дунай-ракой. Казала, што краіну тую нехрысць-бусурманін з вялікім войскам захапіў і з народа тога хрысцянскага здзекуецца. Так лютуе, што бедным сынам Езусавым ратунку няма. Замест быдла цяглавага ў павозкі людзей хрыстовых запрагае, вупраж з жылаў людскіх робіць, дзетак маленькіх ад матак адбірае і ў сваю веру антыхраставу абарочвае, каб бацькоў іхных у ярме трымаць. А хто паўстане супраць здзека бусурманскага, тых карае пакутлівай смерцю. Ля дарогаў ў той краіне, як платы ў вёсках нашых, стаяць калы з адсечанымі галовамі сыноў Езусавых.

Казала, што маладыя мужчыны з нашага краю хутка пойдуць з тымі нехрысцямі біцца, каб народ балгарскі ад іх вызваліць. Толькі шмат паляжа дзяцюкоў нашых у той вайне, бо святы Ян больш не апякуе над моладзю нашай. Зазлаваўся ён, што на свята яго ніхто не прыйшоў апроч толькі адной пары. Толькі той пары і будзе ён дапамагаць. А смерць моладзь нашу будзе касіць да таго часу, пакуль дзяўчына з той пары не аднясе 99 залатых у ахвяру святому.

Людзі не паверылі прадказанням старой. З кожнай хаты прэч гналі яе, як ліхаманку якую. Думалі, што ніхто сам з людзей нашых да той краіны пакутлівай не даберыцца, бо дзе Балгарыя гэта. А на цара дык ніхто і не спадзяваўся, што за народ той бедны заступіцца. Колькі ён у нашым краі людзей пабіў, колькі ў Сібір адправіў, колькі дзяцей сіротамі заставіў. Здавалася, што яму да пакутаў нейкага там народа простага балгарскага. А што датычыцца ахвяравання св. Яну, дык дзе столькі золата возьміш, калі цар пасля паўстанняў увесь наш край голым заставіў.

Вырашылі людзі проста. Адагналі жабрачку падалей ад сваіх хатаў, каб бяды не наклікала, ды пачалі жыць далей, стараючыся забыць страшное прадказанне.

Толькі дзе ж ты ад лёса схаваешся. У тым жа годзе пачаў цар вайну з тымі басурманамі. Мусі, вырашыў перад Богам грахі свае адкупіць, што над нашымі людзямі здзекаваўся. Раней хлопцы нашы не хацелі ў царскае войска ісці, як маглі ад яго адхрышчываліся. Але на гэты раз нікога прымушаць не прыйшлося, самі, нават добраахвотна, запісываліся ў войска. Той, хто сам пакуту няволі зведаў, і чужое гора як сваё ўспрымае. Усе маладыя хлопцы з нашага краю як простыя, так і шляхцюкі пайшлі за веру нашу хрысціянскую ваяваць, народ балгарскі з няволі нехрысцявай вызваляць.

Ды, неўзабаве, з далёкай Балгарыі пачалі ў нашы вёскі прыходзіць весткі жалобныя. І так шмат іх было, што ўвесь край напоўніўся галашэннем матак і дзевак загінуўшых. Успомнілі людзі тады прадказанне старой жабрачкі. Дык дзе ж грошы возьміш на ахвяру заступніку моладзі нашай – святому Яну? Ніхто не ведаў як спыніць кола смерці ў нашым краі.

Даведаўся аб тым на нябёсах і сам святы Ян. Хацеў дапамагчы, але не мог. Мусі, воля Боская такая была, каб Ян заступніцтва над моладзю нашай вярнуў толькі з дапамогай багатай ахвяры. Паслаў Ян тады жабракоў па вёсках балгарскіх каб паведамілі людзям тамтэйшым аб бядзе сваіх вызваліцелей. Хаця краіна Балгарская тады вельмі бедная была, праклятыя нехрысці амаль усё дабро ў сваю краіну басурманскую вывязлі, але народ балгарскі разумеў, што жыццё чалавечае даражэй за хоць якое багацце. І вырашылі яны тады: за кожнага загінуўшага вызваліцеля паслаць па аднаму залатому бацькам іхным.

Днём і ноччу не зачыняліся дзверы ў хаце Марысі, бацькі загінуўшых на вайне хлопцаў няслі і няслі сабраныя балгарамі грошы. У роспачы прасілі дзяўчыну, каб аднясла ахвяру св. Яну, каб зноў гэты святы ўзяў пад сваё заступніцтва жывых і загінуўшых хлопцаў тутэйшых, ды спыніў неміласэрднае кола смерці.

Напярэдадні свята святога Яна дзяўчына пералічыла сабраныя грошы. Нехапала да 99 залатых, што прадказвала жабрачка, адной манеты. Марыся падумала, што святы даруе ім гэты маленькі недахоп, злажыла грошы ў кошык і пайшла да Яноўскай гары, каб да яе прыступак высыпаць гэта золата ў рэчку Лынтупку на ахвяру св. Яну.

Менш кіламетра заставалася да патрэбнага месца, калі за сваёй спіной пачула дзяўчына тупат конскіх капытаў. Марыся азірнулася і сэрца дзявочае здрыганулася ад болю. Да яе на поўным хаду, увесь час лупцуючы каня, нёсся малодшы брат яе любага Пятра і здалёку паказываў у сваёй руцэ недастаючы залаты.

Што магла падумаць бедная дзяўчына, як ні аб пагібелі свайго каханага. Не паспела даведацца Марыся, што яе каханы Пятро жывы і здаровы, а вестка жалобная аб адным сіраціне Кавалёўскім, таму і папрасілі вяскоўцы адвесці яго залаты брата Пятра, бо загінуўшы зусім сваякоў не меў. Не паспела даведацца аб гэтым Марыся, сэрца яе дзявочае не вытрывала і разарвалася ад болю нясцерпнага і ўжо бяздыханая апусцілася цела яе ля ног узмыленага каня на мяккі дыван імха ляснога.

Там, дзе павалілася Марыся, адразу з-пад зямлі паміж чарнічніку разлапістага паказаўся струменьчык вады і забруіла крынічка студзёная. Бліскануў крывавым рубінам у промнях сонца заходзячага залаты, выслізгнуў са здранцвелай рукі хлапчуковай і бразнуўся ў кошык Марысін. Як толькі апошні залаты апынуўся сярод сваіх пабрацімаў, струменьчык крынічны на вачах узрушанага хлапчука падхапіў кошык дзявочы і панёс у бок рэчкі Лынтупкі да гары Яноўскай. Далей, калі струменьчык з сілаў выбіваўся ад цяжкой ношы, кошык прыпыняўся, нахіляўся і з яго выпадаў адзін залаты. У тым месцы, дзе падаў залаты, з зямлі вырывалася новая крынічка, падхоплівала кошык, ды з новай сілай нясла далей. І так – да самай рэчкі – Лынтупкі, да прыступак святога месца Янавага. А ў паветры, над стварыўшымся крынічным раўчуком, як сцвярджаў пасля хлапчук, ззяў цёплым нябесным агнём воблік святога Яна.

Людзі казалі, што сам святы дапамог Марысі данясці ахвяру да месца назначанага. Пазней, у тым месцы, дзе загінула Марыся і вырвалася на свет Божы крынічка, людзі паставілі вялікі крыж з абразом св. Яна. Прыходзілі сюды, маліліся, крынічку святой лічылі, а ваду – гаючай. Уздоўж раўчука крынічнага, ля кожнай новай крынічкі, што папаўнялі струмень святога раўчука, стаялі 99 маленькіх крыжыкаў. Тыя крыжыкі былі вельмі сціплыя, як народ наш пакутлівы, – вышынёй ад зямлі тры пядзі ды лазовай карой замашваныя два сучкі яловыя. Але ў людзей не меншую пашану мелі, чым вялікі крыж. Лічылася, што кожную гэту крынічку ўсе святыя і душы загінўшых на Баягарскай вайне хлопцаў кашых ахоўваюць.

Даўней людзі казалі, што калі ў ноч на св. Яна закаханыя пакаштуюць вады з усіх тых 99-ці крынічак і выкупаюцца ў Лынтупке там, дзе святая крыніца з гэтай рэчкай зліваецца, дык ніколі не расстнуцца, а хлапцоў на вайне не возьме ні шабля, ні куля. У тыя часы і маладыя ў час вяселля Яноўскую крыніцу наведвалі. Лічылі, што вада той крыніцы мае вялікую моц мужчынскую і вернасць жаночую»[1].

Асноўнымі элементамі Яноўскага комплексу з'яўляюцца адмысловыя валуны, якія, з вялікай доляй верагоднасці, мелі рытуальнае прызначэнне.

Камень № 1. Знаходзіцца ў вадзе р. Лынтупкі ля старога брода дарогі, якая злучала шашу Свір – Лынтупы з былой в. Янова (мал. 2). Камень блёкла-цаглянага колеру, па сваёй форме нагадвае страху вясковай хаты. Доўгая вось каменя арыентавана па лініі ўсход – захад. На сярэдзіне бакавой паўночнай роўніцы маецца паглыбленне ў форме чалавечага вока. Глубіня паглыблення – 2,5 см, даўжыня – 18 см, шырыня – 10 см. Памеры самаго каменя: даўжыня – 1,15 м, шырыня – 0,5 м, вышыня – 0,3 м.




Мал. 2. Яноўскі комплекс. Камень з выявай вока (?)

[1] Запісана аўтарам у 2005 г. са словаў Пажыс (Цюкшы) Веранікі Антонаўны, 1931 г. нар. з в. Кавалі Пастаўскага р-на.

Камень № 2. Ляжыць у 10 м на поўнач ад першага камяня, на правым беразе р. Лынтунка, якраз на той восі, куды глядзіць вока першага камяня (мал. 3). Ён заглыблены ў зямлю і на паверхні бачна толькі верхняя роўніца каменя, якая ўзвышаецна над зямлёй толькі на 12 см. Камень недакладнай яйкападобнай формы, блёкла-шэрага колеру. У аношні час пачаў актыўна зарастаць мохам. Доўгая вось арыентавана па лініі поўнач – поўдзень. Даўжыня яго – 0,57 м, шырыня – 0,41 м.

На верхняй роўніцы каменя маецца паглыбленне, ідэнтычнае паглыбленню на першым камені. Розніца паміж імі заключаецца ў тым, што на першым камені паглыбленне знаходзіцца на бакавой паверхні каменя і арыентавана на поўнач, а на другім камені наглыбленне знаходзіцца на верхняй роўніцы і глядзіць у неба. Памеры і форма паглыбленняў амаль аднолькавыя, за выключэннем іх глыбіні. На другім камені паглыбленне значна меншае і састаўляе ўсяго 1,5 см. Доўгая вось гэтага паглыблення арыентавана па лініі паўднёвы захад – поўночны ўсход.

З паўночнага боку ад «вока» каменя № 2 знаходзіцца аб'ёмны звілкі выступ пароды, які нагадвае паўзучага гада. Каменны «гад» расцягнуўся за «вокам» па ўсёй верхняй роўніцы каменя з поўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Выява гэтага «гада» ўзвышаецца над роўніцай каменя на 1,5 см, даўжыня яго – 40 см, шырыня вагаецца ад 3 да 4 см.



Мал. 3. Яноўскі комплекс. Камень з зааморфнымі і крыжападобнымі выявамі

З поўднёвага боку ад «вока» знаходзіцца яшчз адзін выступ пароды, які па сваім абрысаам нагадвае малька жабы – галавасціка. Даўжыня «галавасціка» – 20 см, шырыня ў раёне «галавы» – 5 см, «хваста» – ад 2 см, вышыня над паверхняй каменя – 2 см. Хаця выявы «гада», «галавасціка» і двух «вокаў», падобна, ксеналітнага (прыроднага) паходжання, але, бясспрэчна, старажытны чалавек не заўважыць іх не мог і, верагодна, выкарыстоўваў у культавых мэтах. Ускосна аб гэтым сведчыць курганны могільнік, які знаходзіцца за 250 м на захад ад камянёў, і святая Яноўская крыніца (прыкладна ў тым жа напрамку на адлегласці 120 м, а яе вусце – каля 150 м ніжэй па цячэнню р. Лынтупкі).

Выява вока ў дахрысціянскіх культах асацыявалася з вакном у іншасвет [4, с. 22, 91 – 92, 394 – 395]. Гад (змяя) – гэта архаічная форма выяўлення багіні наканавання канца жыцця, смерці, Гільцыні, а галавасцік (жаба) – багіні наканавання пачатку жыцця, нараджэняя, Лаймы [5, с. 174, 214], дзе якраз галавасцік і падкрэсліваў гэты пачатак.

Стукаўшчынскі культавы комплекс

Знаходзіцца ў чатырохкутніку паміж вёскамі Шудаўны, Яўнелішкі, Янанішкі і Жакі Лынтупскага с/с, у ваколіцах былой в. Стукаўшчына. Комплекс раскінуўся на значнай тэрыторыі, недзе каля 10 кв. км.

Актыўную дапамогу ў палявых даследаваннях Стукаўшчынскага комплексу аказалі настаўнік гісторыі Лынтупскай школы Сяргей Васільеў і ўдзельнікі школьнага краязнаўчага гуртка. На цяперашні час даследаванні далёка не закончаны. Але сабраны матэрыял, мы лічым, ужо цяпер павінен стаць вядомым шырокаму колу даследчыкаў. Гэты матэрыял мы прапануем ніжэй.

Цэнтрам Стукаўшчынскага культавага комплексу можна лічыць высокую гару Каўказ. А з літоўскай мовы «kaukas, kukas» – гэта чорт. Па меркаванні Вікантаса Вайткевічуса, на гарах з такімі назвамі паганцы спальвалі сваіх памерлых [6, р. 291]. Гэтыя культавыя месцы, падобна, знаходзіліся за межамі культурнага асяроддзя старажытных паселішчаў і адрозніваліся ад культавых месцаў культурнага асяроддзя сваім спецыфічным міфалагічным значэннем [6, р. 291].

У 200 м на захад ад г. Каўказ знаходзіцца г. Капліца, на поўночным схіле якой рос «Тысячагадовы» культавы дуб. Па словах месцічаў, раней ля гэтага дуба збіраліся людзі на святы. Нажаль, апавядальнікі не памятаюць, на якія святы, і што там рабілі. Па іншых звестках, у час Напалеонаўскай вайны гэты дуб быў арыенцірам да французскіх жаўнераў. У 1 м ад ствала дуба выяўлены тыпічны каменны ахвярнік. Тут жа, пад дубам знойдзена старажытная кераміка. Апавядаюць, таксама, што ў даўнія часы на г. Капліца стаяла сапраўдная драўляная капліца, а калі яна павалілася, дык чэрці апанавалі гэту гару і ўсё бліжэйшае наваколле.

Сапраўды, старажылы апавядаюць шмат здарэнняў, звязаных з чарцямі, якія адбыліся на гэтай гары і ў суседніх урочышчах. Так, шмат легендаў бытуе аб балацінке «Аседзіца», якое раскінулася з поўночнага боку г. Капліца ля самых яе прыступак і ў 230 м на поўночны захад ад г. Каўказ. Кажуць, калі ў ноч на св. Яна пайсці з лапатай на гэта балота і стаць пасярэдзіне яго, у поўнач з'явяцца тры чорных кані, якія паскачуць на парушальніка спакою гэтага балота. У гэты час, кажуць, трэба не спужацца, а лупануць лапатай паміж вачэй каню, які будзе пасярэдзіне. Адразу коні-зданні рассыпяцца, а перад чалавекам вырасце вялікая гара золата.

Іншая легенда апавядае, як калісьці ксёндз ездзіў у гэтым месцы па калядзе і заблукаў. Раптам ён убачыў, што нейкі агеньчык свеціцца. Пасылае ён тады свайго фурмана паглядзець, што там ёсць і, калі гэта чалавечае жытло, спытаць дарогі. Фурман пайшоў на гэты агеньчык, бачыць – хата, а з вакна свет прабіваецца. Ён заходзіць у хату і вітаецца: Нех бэндзе пахвалёны Езус Хрыстус! Пры гэтых словах хата знікла, а фурман апынуўся сярод балота.

Адразу за балотам Аселіца знаходзіцца ўрочышча «Падбаба». Гэта каля 1 км на поўнач ад г. Каўказ. Аб урочышчы згадваюць, што калісьці пад вялікай разлапістай елкай знайшлі забітую (памершую) бабу (водгукі культа багіні памерлых – Вялёны? [5, с. 57 – 59]). Апроч гэтага, у гэтым урочышчы ўспамінаюць вялікі камень і крыніцу, «якая біла з самай гары».

Правей ад ур. «Падбаба», сярод леса «Навіна» (за 0,7 км на поўночны ўсход ад г. Каўказ), паводле сведчанняў старажылаў, быў ставок у якім пастаянна тапіліся людзі (Культ вадаёмаў, патрабуючых ахвяраў?).

Правей стаўка, у 200 м на ўсход ад г. Каўказ выяўлены комплекс камянёў. З поўночнага боку ляжыць буйная пляскатая камлыга буйназярністага граніта, якую называюць Ложкам. Ніжэй «Ложка», у 7 м на паўночны захад, знаходзіцца камень э паглыбленнем, у якім скапліваецца лекавая вада (мал. 4).



Мал. 4. Культавы камень з лекавай вадой ля г. Каўказ

У 12 м на поўдзень вышэйназваных камянёў знаходзіцца буйная камлыга купалападобнай формы, якую называюць Дзедам. «Дзед» і суседнія меншых памераў камені ўтвараюць два кругі, дыяметрам 5 і 7 м. У цэнтры гэтых камянёў – камень-ахвярнік, ля якога быў выяўлены моцны пласт вугалёў. Заходней «Дзеда», у 15 м стаіць невялікі камень з высячаным на ім крыжыкам.

Адносна ўрочышча была зафіксавана наступная легенда: «Калісьці развялося на зямлі шмат гадаў. І так шмат іх было, што нават праходу не давалі. Вось тады і прыйшоў аднекуль здалёку адзін дзед-варажбіт, ды і кажыць людзям, што калі тыя дазволяць яму пасяліцца тут, дык вызваліць ён гэту зямлю ад тых гадаў. А калі людзі згодзяцца, дык дзед паабяцаў лячыць ад розных хваробаў, толькі з адной умовай: калі тыя паабяцаюць у яго новае жытло не заходзіць і не падглядаць за ім. Людзі згадзіліся і дзед застаўся. Той дзед ведаў нейкія моцныя заклёны і хутка вывеў усіх гадаў. Жытло ён зрабіў сабе ў капне сена. Унутры выдзер невялікі пакойчык, а вузкі праход шчыльнай завесіў тканінай, каб ніхто не змог зазірнуць у сярэдзіну. Побач са сваім жытлом паставіў драўляны ложак і вызваліў з зямнога палону крынічку, мусіць не без дапамогі чараўніцтва, бо вада той крынічкі дапамагала ад розных хваробаў. Так і пачаў жыць у гэтым месцы той дзед.

Удзень, у добрае надвор'е грэў ён свае старыя косці на тым ложку, што паставіў ля свайго новага жытла. Побач струменілася лекавая крынічка. А ноччу, у непагадзь і для варажбы хаваўся дзед у тым пакойчыку, што зрабіў у капне сена. За лячэнне ад хваробаў людзі прыносілі яму ежу. Ад шчодрых дароў дзед не ведаў нястачы ніколі. Задаволеныя былі і людзі.

Але неяк у аднаго мужыка не магла разрадзіцца баба. Вось і прыбег ён да дзеда за дапамогай. Дзед выслухаў мужыка і загадаў таму пачакаць на двары, пакуль ён у сваім пакойчыку замовіць лекі да яго бабы. Доўга чакаў мужык, а дзед усё не выходзіў. Стаяла цёмная ноч і раптам, бачыць мужык, што праз тканіну, якой быў завешаны праход у сховішча дзеда, пачало прабівацца нейкае дзівоснае блакітнае святло, аж вочы пачало сляпіць. Ад цікавасці мужык той не сцярпеў і зазірнуў за тканіну. Адразу ўспыхнула дзедава будыніна пябесным агнём, разам запаліўшы і мужыка. Той, ахінуты полымем, ратуючыся, кінуўся ў ваду лекавай крыніцы. Вада зашыпела, агонь згас і наваколле праглынула непраглядная цемра.

Наранку людзі ўбачылі, што ўсе збудаванні дзеда-варажбіта акамянелі. Драўляны ложак, дзе адпачываў дзед, ды тая капна сена – дзедава жытло. Акамянела і лекавая крынічка разам з тым мужыком, Таму людзі і кажуць, што там камень у камень уросшы. Бо, як ратаваўся той мужык ад агню ў крынічцы, так у ёй і акамянеў. Адсюль, адзін камень – акамянелая крынічка, другі – мужык. Але моц той крынічкі, мусі большая, чым чараўнічая моц, бо і па сённяшні дзень лекавая вада прасочваецца праз тоўсць каменя і збіраецца ў ямцы на яго верхняй роўніцы.

Я сама хадзіла за той лекавай вадой, як маладая была. Яшчэ старыя раней страшылі, што ўночы небяспечна хадзіць у тое месца. Бо ў поўнач, казалі, той дзед выходзіць з каменя і свеціць сваім чараўнічым ліхтарыкам – прываблівае цікаўных людзей. Калі ўночы ўбачыш які агеньчык у тым месцы, трэба хутчэй уцякаць, бо калі не паспееш уцячы, перавернішся ў камень. Казалі, што нездарма ў тым месцы столькі камянёў. Гэта ўсё людзі акамянелыя»[1].

Правей гэтых камянёў, у 600 м на паўднёвы ўсход ад г. Каўказ знаходзіцца камень з падоўжанымі лодкападобнымі паглыбленнямі. Паглыбленні ідуць паралельнымі лініямі па ўсёй верхняй роўніцы (трохі пукатай) камлыгі ў 5 см адна ад другой. Трохі далей у гэтым напрамку знаходзіцца камлыга, форма якой характэрная да камянёў-стодаў і зачараваных людзей. На ксеналітным паглыбленні каменя праглядаецца выдрапаныя два чалавечкі – адзін большы, другі меншы, і над імі крыжык. Побач з ксеналітным паглыбленнем знаходзіцца рукатворнае паглыбленне лодкападобнай формы. У 1 км на поўдзень ад г. Каўказ выяўлены курганны могільнік. Захавалася 5 насыпаў круглай формы.

Такім чынам, палявыя даследаванні паказваюць, што ў ваколіцы Лынтупоў захавалася значная колькасць прыродных аб'ектаў, якія з вялікай доляй верагоднасці мелі культавае прызначэнне ў дахрысціянскую эпоху. Іх міфалагічнае значэнне і рытуальную скіраванасць дазволяць высветліць далейшыя даследаванні комплекснага характару.

ЛІТАРАТУРА

1. Гарбуль, А. Скарбы сівых валуноў / А. Гарбуль. – Паставы: Сумежжа, 2002. – 96 с.
2. Мэрымэ, Праспэр. Навелы / Праспэр Мэрымэ. – Мінск: Мастацк. літ., 1990. – 366 с.
3. Зверуго, Я.Г. Исследования восточно-литовских курганов на территории Беларуси / Я.Г. Зверуго // Lietuvos archeologija. – 2001. – Т. 21. – P. 111 – 120.
4. Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік / С. Санько [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 2006. – 599 с.
5. Грэймас, А.Ю. Пра багоў і людзей. У пошуках этнічнай памяці / А.Ю. Грэймас. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2003. – 404 с.
6. Vaitkevičius, Vykintas. Alkai: baltų šventviečių studija / Vykintas Vaitkevičius. – Vilnius: Diemedis, 2003. – 320 p.

[1] Запісаў аўтар у 2005 г. ад Яраш Марыі Іванаўны, 1915 г. нар., у в. Жакі Пастаўскага р-на.

ЭТНАЭКАЛОГІЯ І ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА

канд. культуралогіі В.В. КАЛАЦЭЙ
(Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск)

Разглядаюцца праблемы і перспектывы развіцця этнаэкалагічных накірункаў ў сістэме вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь, характарызуюцца мэты і задачы этнаэкалагічнай кампаненты адукацыі, пазначаецца яе актуальнасць у кантэксце сучасных грамадскіх працэсаў.

У апошнія два дзесяцігоддзі дзеячы культуры, педагогі і адміністратары краін Усходняй Еўропы паслядоўна шукаюць шляхі будовы м а д э л і адукацыйнага працэсу на падмурку традыцый мясцовых э т н і ч н ы х к у л ь т у р. Мэта іх дзейнасці - замацаваць у адукацыйным працэсе механізмы перадачы этнаэкалагічнага патэнцыялу свайго народа. Сёння на тэрыторыі Беларусі пражываюць прадстаўнікі каля 100 народнасцей. Па перапісу 1989 года небеларусы складалі 22,2 % насельніцтва краіны (табл. 1) [1, с. 50].

Таблица 1

Этнічны склад насельніцтва Беларусі ў 1989 годзе

Этнічная прыналежнасць	Колькасць	
	тыс. чал.	%
Беларусы	7 897	77,8
Расіяне	1 341	13,2
Палякі	417	4,1
Украінцы	290	2,9
Яўрэі	112	1,1
Іншыя	71	0,9

Прадстаўнікі разнастайных этнічных груп паспяхова існуюць у нас у агульным соцыуме і гэта лічаць паказчыкам гарманічнасці міжэтнічных адносін. Да канца XX стагоддзя, увогуле, ва урбаністычных асяродках панавала небеларуская культура, што было абумоўлена этнічнай структурай насельніцтва гарадоў, дзе беларусы складалі меншасць. Агульныя для Еўропы пачатка XXI стагоддзя тэндэнцыі, якія акрэслілі чарговы ўздым інтарэсу да этнічных каранёў, да сваёй культуры адлюстраваліся і ў статыстыцы этнічнай самаідэнтыфікацыі насельніцтва Беларусі [2, с. 30]. За 10 год (1989 - 1999) беларусамі сталі лічыць сябе яшчэ амаль 3 % насельніцтва краіны (табл. 2).

Табліца 2

Этнічны склад насельніцтва Беларусі ў 1999 годзе

Этнічная прыналежнасць	Колькасць	
	тыс. чал.	%
Беларусы	8 159	81,2
Расіяне	1 142	11,4
Палякі	396	3,9
Украінцы	237	2,4
Яўрэі	28	0,2
Іншыя	80	0,9

Як сведчыць рэчаіснасць, людзі, якія лічаць роднай беларускую мову, збольшага імкнуцца да традыцыйных (этнаэкалагічных) каштоўнасцей, прадстаўленых у беларускай культуры: культ сям'і, павага да ўсіх формаў жыцця, супольнае выраўненне сацыяльных пытанняў, сацыяльная справядлівасць, павага і шанаванне старэйшых у сям'і і грамадзе, захаванне нацыянальных традыцый як гарантыі стабільнага існавання грамадства.

Забеспячэнне пераемнасці такіх каштоўнасцей – э т н а к у л ь т у р н а е в ы х а в а н н е – *набыццё грамадскакарысных ведаў, уменняў, навыкаў сродкамі пераймання народнай культуры і мастацтва.* Яго адметная рыса - *дакументальная аснова,* гаму этнакультурнае выхаванне – дзейнасць, якая грунтуецца на вывучэнні, засваенні і трансляцыі беларускай традыцыйнай культуры як цэласнай грамадска-гістарычнай з'явы, у якой адлюстраваны светапогляд, маральна-этычныя і эстэтычныя каштоўнасці беларускага народа. Самы лепшы спосаб далучэння дзяцей да народных традыцый – гэта развучванне з імі гульняў і побытавых танцаў, расповяды казак, спевы ў фальклорных гуртах і ўдзел у каляндарных абрадах.

У Беларусі напачатку XXI стагоддзя быў пэўным чынам абагульнены рэспубліканскі досвед працы ў гэтым кірунку. Імпрэзы, на якіх адбываўся рэспубліканскі абмен вопытам у галіне этнакультурнага выхавання, з 2002 года ладзіць аддзел народных мастацкіх рамёстваў і фальклору ўстановы адукацыі «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. З 2003 года аддзел іх ладзіць сумесна з факультэтам традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

На працягу 2002 – 2007 гадоў гэтыя імпрэзы (табл. 3) сталі своеасаблівай «трыбунай» для абмеркавання розных аспектаў дзейнасці па навучанні дзяцей і моладзі асновам беларускай культуры [3, с. 22]. Усе, хто спрычыніўся ў краіне да мэтаў, эстэтыкі, дыдактыкі этнакультурнага выхавання, да праблем яго адаптацыі да сучасных акалічнасцей навучальнага працэсу і творчай практыкі, меў магчымасць падзяліцца з калегамі сваімі набыткамі і паслухаць пра дасягненні і праблемы іншых.

Табліца 3

Рэспубліканскія мерапрыемствы
па абагульненні досведа этнакультурнага выхавання ў 2002 – 2006 гады

Дата	Імпрэза	Удзельнікі
20.09. 2002 г.	Рэспубліканскі «круглы стол» па тэме: «Этнакультурнае выхаванне і летні адпачынак дзяцей і падлеткаў»	Школьнікі і моладзь Мінскага, Любанскага р-наў, г. Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі
01.04. 2003 г.	Рэспубліканскі майстар-клас «Традыцыйны побытавы танец як складальнік этнакультурнага выхавання: досвед фальклорных аб'яднанняў паўночнай і цэнтральнай Беларусі»	Школьнікі і моладзь Расонскага, Любанскага, Мінскага р-наў, г. Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі
08 – 09.10. 2003 г.	Рэспубліканскі майстар-клас «Рэспубліканскі эксперыментальны праект "Танцавальны фальклор і дзеці" – эфектыўная адкрытая сістэма этнакультурнага выхавання»	Школьнікі і моладзь Любанскага, Барысаўскага, Мінскага р-наў, г. Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі
14 – 15.04. 2004 г.	Рэспубліканскі «круглы стол» па тэме: «Святы "Сонечнага крыжа" і сістэмнасць працэсу этнакультурнага выхавання дзяцей і падлеткаў»	Школьнікі і моладзь Любанскага, Драгічынскага, Акцябрскага раёнаў, г. Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі
27 – 28.10. 2004 г.	Рэспубліканскі майстар-клас «Пераемнасць беларускай этнафанічнай традыцыі: тэорыя і практыка»	Школьнікі і моладзь Валожынскага, Лепельскага, Мінскага р-наў, г.Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі
30 – 31.03. 2005 г.	Рэспубліканскі «круглы стол» па тэме: «Адаптацыя традыцыйнага строя ў дзіцячым і маладзёжным фальклорным гурце»	Школьнікі і моладзь Любанскага, Барысаўскага, Мінскага р-наў, г. Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі
16 – 17.11. 2005 г.	Рэспубліканскі майстар-клас «Інструментальная этнафонія беларусаў: месца ў адукацыйнай і культурнай прасторы XXI стагоддзя»	Школьнікі і моладзь Драгічынскага, Акцябрскага, Мінскага р-наў, гарадоў Мінска, Рыгі, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Рэспублікі Беларусь
24 – 25.04. 2006 г.	Рэспубліканскі «круглы стол» па тэме: «Правядзенне святаў і фестываляў: пытанні дакументальнай асновы мастацкай творчасці»	Школьнікі і моладзь Мінскага раёнаў, гарадоў Мінска, Вільнюса (Літва), супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі
24 – 26.10. 2006 г.	Рэспубліканскі майстар-клас «Гісторыка-культурныя вытокі традыцыйнай музыкі»	Школьнікі і моладзь Кобрынскага, Мінскага раёнаў, горада Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі
17 – 19.05. 2007 г.	Рэспубліканскі «круглы стол» па тэме: «Ландшафтны код святаў і фестываляў»	Школьнікі і моладзь Любанскага, Мінскага р-наў, гарадоў Мінска, Паланга (Літва), супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі
17 – 19.05. 2007 г.	Рэспубліканская фальклорная школа па тэме: «Традыцыйныя музычныя інструменты ў рэкрэатыўнай и абрадавай практыцы XXI стагоддзя»	Школьнікі і моладзь Мінскага р-на, гарадоў Мінска, Санкт-Пецярбурга, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі Беларусі

Як сведчыць наменклатура тэматыкі вышэйпералічаных імпрэзаў, за пяць гадоў у колах спецыялістаў былі разгледжаны і абмеркаваны амаль усе віды і аспекты дзейнасці па этнакультурным выхаванні ў Беларусі. У дыскусіях і выступах удзельнікаў гэтых мерапрыемстваў неаднаразова і шырока абмяркоўваўся досвед суседніх краінаў: Літвы, Латвіі, Расіі, Польшчы. Вынікі абмеркавання публікаваліся ў рэспубліканскіх СМІ і даводзіліся да ведама адказных асобаў з міністэрстваў культуры і адукацыі.

Сярод спецыялістаў, якія ўдзельнічалі ў гэтых мерапрыемствах, на працягу 2002 – 2006 гадоў, было праведзена экспертнае апытанне па праблемах беларускай культуры, якой яны мусяць займацца ў сілу ўласных службовых абавязкаў і ў большасці выпадкаў па прызванні і ў сілу асабістай сацыяльнай пазіцыі.

Усяго ў ім удзельнічала 210 супрацоўнікаў устаноў культуры і адукацыі з шасці абласцей Рэспублікі Беларусь і з горада Мінска. Збольшага гэта кіраўнікі музычных, харэаграфічных, харавых студый і гурткоў, аб'яднанняў па розных жанрах дэкаратыўна-побытавага мастацтва, супрацоўнікі метадычных цэнтраў культуры, спецыялізаваных школ і сярэдніх спецыяльных устаноў сферы культуры і адукацыі, выкладчыкі ВНУ. У час правядзення апытання аналізаваліся прынцыпы і мэты арганізацыі працэсу навучання і выхавання сродкамі народнай культуры. Рэспандэнтам былі прапанаваны шэраг пытанняў (табл. 4), на якія даследчыкі атрымалі наступныя адказы.

Табліца 4

Ацэнка экспертамі эфектыўнасці нарматыўнай падтрымкі дзейнасці па этнакультурным выхаванні ў Рэспубліцы Беларусь

№ пп	Пытанне да групы экспертаў	Адказ (% апытаных)		
		«так»	«не»	«цяжка адказаць»
1	Ці ўдзельнічаеце Вы (самастойна ці з калектывам, установай) у комплексных мэтавых праграмах і праектах па захаванні традыцыйнай культуры Беларусі?	5	84	11
2	Ці карыстаецеся Вы ў сваёй дзейнасці нарматыўнымі дакументамі па ахове помнікаў нематэрыяльнай спадчыны народа (па ахове фальклору, традыцыйнай медыцыны, сямейнай абраднасці, духоўных практык аздараўлення, культур нацыянальных меншасцей)?	11	69	20
3	Ці адпавядае, на Ваш погляд, дзяржаўны каляндар нацыянальным традыцыям беларусаў, ладу іх жыцця і прыроднаму цыклу іх ландшафту?	2	94	4
4	Ці ўведзены элементы этнапедагогікі ў вучэбныя праграмы і планы Вашай установы?	15	79	6
5	Ці мае дадатковыя крыніцы фінансавання Вашай дзейнасці (спецыяльныя артыкулы выдаткаў на экспедыцыйную, фестывальную, камунікатыўную дзейнасць) адміністрацыя Вашай установы?	2	91	7

Як бачым, сярэдні паказчык па другім, «адмоўным» слупку (адказ «не») – 83 %. Відавочная незадаволенасць абставінамі сваёй дзейнасці з боку спецыялістаў-выхавацеляў сродкамі этнічнай культуры – сведчанне пэўнага дысбалансу, які сёння мае месца ў пытаннях, знітаваных з этнаэкалогіяй тытульнага этнасу Беларусі. Гэта – адчувальнае сведчанне «няўпісанасці» яго культуры ў стандарты дзейнасці дзяржаўных устаноў.

Калі беларуская культура недастаткова прадстаўлена ў дзейнасці ўстаноў сацыяльнай сферы, якія істотна праграмуюць светапогляд будучыні краіны – дзяцей і моладзі, паўстае пытанне: «Што за культура там прадстаўлена?». Як сведчыць мой асабісты досвед, на гэтае пытанне мала хто зможа зразумела, паслядоўна і аргументавана адказаць. Увогуле, увесь сусветны досвед міжэтнічнага суіснавання можна звесці да кароткага, але ёмістага выраза «бацькі гісторыі» Герадота: «Калі дазволіць усім народам на свеце абраць найлепшыя звычаі і паводзіны, то кожны народ, уважліва разгледзеўшы чужыя, абраў бы лепшымі свае» [4, с. 9]. Гэтая простая фраза – сапраўднае крэда этнаэкалогіі. З пункту гледжання логікі, 80 % насельніцтва з беларускімі каранямі павінны мець этнічную культуру, прадстаўленую ў нарматыўных дакументах выхавання іх дзяцей. Сёння мы маем сітуацыю з амаль адваротным паказчыкам. Апытанне – сведчанне ў сярэднім 83 %-най (адказ «не», гл. табл. 4) адмоўнай ацэнкі экспертамі-практыкамі асноўных сучасных нарматыўных складальнікаў этнакультурнага выхавання беларускай культурай у рэспубліцы.

Безумоўна, наўрад нейкая з нацыянальнасцей, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі, сёння цалкам задаволена сітуацыяй са станам развіцця ўласнай культуры. Аднак, як сведчыць аўтарытэтнае меркавання прафесіяналаў і сітуацыя з культурай увогуле, «парадокс Беларусі» ў тым, што ў найбольш неспрыяльным становішчы ў краіне знаходзіцца этнічная культура менавіта беларусаў. Сапраўды, культуры «этнасаўгасцёў» добра і разнастайна прадстаўлены і запатрабаваны ў першую чаргу ва ўласных метраполіях; а дзе застаецца месца для культуры беларусаў, калі ў сябе на Радзіме яе месца не дэкларавана як след?

Адносна этнаэкалогіі і функцыяніравання вышэйшай школы ў Рэспубліцы Беларусь можна зрабіць наступныя высновы:

1) сёння культурны ландшафт краіны, у першую чаргу, беларускія СМІ, інтэрнэт, вучэбны працэс галіны мастацкай адукацыі занятыя рознымі культурнымі ўзорамі (еўрапейскімі, амерыканскімі, расійскімі, беларускімі) у памерах, якія не адпавядаюць рэальным суадносінам у этнічнай структуры насельніцтва краіны;

2) як сведчыць меркаванне педагогаў-удзельнікаў працэсу этнакультурнага выхавання, сёння існаванне самога гэтага працэсу – а) вынік самаадданасці і энтузіязму асобных педагогаў; б) мецэнатства, прафесійнай дальнабачнасці і актыўнай сацыяльнай пазіцыі некалькіх адміністратараў і прыватных асобаў;

3) калі ўлічыць небяспеку гібрыдызацыі, маргіналізацыі культур розных этнасаў і наступстваў гэтага працэсу для грамадства, трэба а) сур'ёзна вывучаць пытанне пра заканамернасці і перспектывы этна-

культурнага выхавання і этнамастацкай адукацыі; б) уносіць адпаведныя карэктывы ў адукацыйныя стандарты Рэспублікі Беларусь, у першую чаргу ў сферы вышэйшай школы.

ЛІТАРАТУРА

1. Саракаік, І. Беларусазнаўства / І. Саракаік. – Мінск: Веды, 1998. – 284 с.
2. Шахотько, Л.П. Социальная демография. Переписи населения: методология, методика, результаты: пособие / Л.П. Шахотько. – Минск: Бестпринт, 2005. – 104 с.
3. Пладунова, Т. Рухомы фэст «Па святах «Сонечнага крыжа»: сацыяльны запыт і канцэпцыя / Т. Пладунова // Штудыі Рэспубл. сезоннай фальклор. школы / рэд. кал. В. Калацэй (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – С. 22 – 27.
4. Токарев, С.А. История изучения календарных обычаев и поверий / С.А. Токарев // Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: исторические корни и развитие обычаев. – М.: Наука, 1983. – С. 8 – 23.

НЮАНСЫ ПАЛЯВОЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ НА ПАДЗВІННІ 70 – 80 ГАДОЎ XX СТАГОДДЗЯ

В.К. КАРАТАЙ
(Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск)

Падкрэсліваецца тэзіс, што Падзвінне – своеасаблівы этналінгвістычны і этнакультурны феномен, які ўзнік на скрыжаванні розных сацыякультурных вектараў і ўяўляе сабой адмысловую «ружу вятроў». Прыводзяцца факты з асабістага вопыту фальклорнага палявога абследавання Паазер'я ў 70 – 80 гады XX стагоддзя. На аснове матэрыялаў архіва вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору Беларускага дзяржаўнага універсітэта даказваецца жыццяздольнасць сучаснай палявой фальклярыстыкі, падаюцца асобныя ўзоры каляндарна- і сямейна-абрадавай паэзіі, зафіксаваныя ў Верхнядзвінскім раёне, робяцца назіранні за іх паэтыкай.

Як бы нядаўна ўсё было – / Мой Полацк! Наддзвінне! /
А ўжо і пяцьдзесят прайшло, / Калі я вас пакінуў.

Пятрусь Броўка.

Беларускае Паазер'е (Падзвінне) здавён вабіла шматлікіх навукоўцаў-даследчыкаў. Гісторыкаў – як зямля старажытных крывічоў, як зямля нашых славутых продкаў: святароў і ваяроў, безыменных рупліўцаў коласа ды ільну. Літаратуразнаўцаў – як радзіма славутых П. Броўкі, В. Быкава, Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, А. Вялюгіна, А. Асіпенкі. Мовазнаўцаў і фальклярыстаў – як своеасаблівы этналінгвістычны і этнакультурны феномен, які ўзнік на скрыжаванні найрозных сацыякультурнных вектараў: цэнтральна-беларускіх (ліцвінскіх), рускіх, балцкіх і ўяўляе адмысловую «ружу вятроў». Гэтым ён цікавы і мне – нараджэнцу Нарачанскага краю, які непасрэдна мяжуе з паўднёва-заходняй граніцай назначанага арэала, і як літаратуразнаўцу і фальклярысту.

Першы раз мне, студэнту філфака ЬДУ, давялося ўдзельнічаць у палявых запісах вуснай народнай творчасці ў 1974 годзе падчас вучэбнай практыкі. І гэта была Віцебшчына, а дакладней, Мёрскі раён. Як вядома, такія даследаванні праводзяцца ў стацыянарнай, доўгатэрміновай (ад 2 – 3 месяцаў да некалькіх гадоў) або, як у нашым выпадку, экспедыцыйнай формах. Тэрмін практыкі – два тыдні, але і іх часам было цяжкавата дабыць да канца. Прычын тут некалькі, асноўная ж – адсутнасць належных матэрыяльна-бытавых умоў. Ужо пасля заканчэння ВНУ як выкладчык і кіраўнік студэнцкіх экспедыцыйных груп я даведаўся пра рэальныя выдаткі на палявую практыку alma mater і дзяржавы. Нават з улікам тагачасных цэн лічбы былі непрыемна шокавымі: 10 капеек на суткі кватэрных, 50 – сутачных (харчавых). Праўда, поўнасцю аплочваўся транспарт, аднак толькі «цвёрдыя» аўтобусы і «агульныя» чыгуначныя вагоны. А калі да месца прызначэння курсавалі толькі іншыя, дык даводзілася дабірацца «на перакладных» або даплочваць з уласнай кішэні. Такія вось бугалтарскія парадоксы таго часу (ды, відаць, не толькі таго).

Наступная праблема мела ў большай ступені суб'ектыўны характар. Справа ў тым, што сярод двух метадаў экспедыцыйнага абследавання – куставога і маршрутнага – для ВНУ найбольш прыдатным быў першы, калі група размяшчалася ў адным, больш буйным, уладкаваным у бытавым сэнсе і геаграфічна цэнтральным населеным пункце. Але пры гэтым адказным асобам (існавалі ў тыя часы аддзелы практык) трэба было загадзя здабыць інфармацыю ў мясцовых улад і ўсё з імі ўзгадніць. Мы ж тады, у 1974-м, трапілі ў апорную вёску – асяродак старавераў-перасяленцаў, якія паставіліся да нас вельмі незычліва і да таго ж не з'яўляліся носьбітамі беларускай фальклорнай аўтэнтыкі.

Гэты студэнцкі вопыт давялося потым улічваць у педагагічнай працы, калі надарылася наведаць больш за палову раёнаў Віцебшчыны, і, прызнаюся, добрыя, цёплыя ўспаміны засталіся не толькі ад сустрэч з таленавітымі, часам унікальнымі інфармантамі, але і проста сардэчнымі, гасціннымі людзьмі.

Як вядома, з-за адсутнасці фінансавання экспедыцыйны выезд студэнцкіх груп у апошнія дзесяцігоддзі не практыкуецца, але палявое абследаванне рэгіёнаў Беларусі не перапыняецца. Сведчанне таму, у прыватнасці, рэгіянальныя, жанравыя, аўдыё- і відэаархівы Вучэбна-навуковай лабараторыі (ВНЛ) беларускага фальклору БДУ, у якіх належнае месца займаюць і матэрыялы Паазер'я. Прывяду прыклад з рэестра толькі аднаго – Полацкага – раёна (фонд 2, вопіс 14), у якім за апошнія дзесяць гадоў занатавана адпаведна 73 тапанімічныя і 1837 фальклорных адзінак (толькі ў рэгіянальным архіве), сярод якіх прадстаўлены самыя розныя паэтычныя, празаічныя жанры, а таксама анісанні і фіксацыі абрадаў.

Зварот да канкрэтных прыкладаў дазваляе выявіць некаторыя дамінантныя і маргінальныя, другасныя характарыстыкі вуснай народнай творчасці Падзвіння і асаблівасці яе бытавання ў канкрэтных мікрарэгіёнах. Пры гэтым вызначаюцца і агульныя, уласцівыя ўсяму сучаснаму фальклору рысы: амбівалентнасць, полісемантычнасць вобразаў, жанравая і моўная інтэрферэнцыя, дыфузія пры захаванні пэўных генералізуючых пачаткаў. Так, пад кіраўніцтвам Л.К. Тарасюк у 1985 годзе ў в. Каханавічы быў зафіксаваны шэраг цікавых узораў народнай лірыкі, сярод якіх вылучаюцца вясельныя сіроцкія песні. Аднак прывядзём іншыя: купальскую і радзінную (абедзве з жартоўнай канатацыяй):

Іван, Іван ды Мар'я, / На гарэ ды купалле / А пад гарой карыта / Поўна вады наліта / Там дзевачкі ножкі мылі, / А мальчыкі ваду пілі / Іван, Іван ды Мар'я, / На гарэ купалле / А пад гарой карыта, / Поўна мёду наліта / Там пчолкі ножкі мылі, / А дзевачкі пілі (ад М.І. Глінскай, 1907 г. нар.) [1].

Песня, відаць, не з'яўляецца цалкам арыгінальнай, яе варыянты выяўленыя і ў іншых мясцінах, аднак твор вабіць арганічнай паяднанасцю дзвюх стыхій: высокай язычніцкай, святочнай і бытавой, гумарыстычнай, што зусім не зніжае агульную танальнасць.

У сваю чаргу ўзор радзіннай паэзіі дазваляе даследчыку ўбачыць не толькі той самы жанравы дуалізм, але і зафіксаваны студэнткай характэрны характэрны для паўночна-усходняга дыялекту казус фанетычнай дысіміляцыі (падкрэсленыя гукі-літары, відаць, вымаўляюцца як Ъ): Кацярынушка гарох сеяла, / А пасеяўшы, у грабы пайшла. / З грабоў прыйшоўшы да забалела. / – Мамачка, мая галоўка баліць. / Дачушка мая, завяжы платок. / Мамачка мая, платок караток. / Дачушка мая, узлезь на печку. / Мамачка мая, там дзіця мала. / Дачушка мая, да дзе ж ты брала? / Мамачка мая, у грабах найшла. / Дачушка мая, нашто ж ты брала? / Мамачка мая, а мне жаль стала (ад Е.І. Мацкевіч, 1899 г. н.) [1].

Натуральна, пазначаная праблема вымагае не эскізна-пункцірнай, а больш грунтоўнай гаворкі з выяўленнем мажлівых тыпалагічных паралеляў і парадыгм. Важна толькі, каб феномен палявых фальклорных роспытаў не стаўся ўсяго толькі фактам далёкай гісторыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Архіў ВНЛ беларускага фальклору Беларус. дзярж. ун-та. – Фонд 2. – Воп. 4. – Спр. 9.

АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКАЙ ПАЛІТЫКІ ГЕНАЦЫДУ ЯЎРЭЙСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
(НА ПРЫКЛАДЗЕ Г. ПОЛАЦКА)

канд. гіст. навук А.І. КОРСАК
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

Нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці прац, у якіх закраналася праблема Халакоста, застаецца шмат звязаных з ёю маладаследаваных і недаследаваных праблем, таму ў дадзеным артыкуле аб'ектам даследавання з'яўляецца правядзенне нацысцкай Германіяй палітыкі ізаляцыі яўрэйскага насельніцтва і знішчэнне гета на тэрыторыі Полацка ў 1941 годзе. У працы вырашаюцца наступныя задачы: па-першае, адлюстраваны меры, якія прадпрымаліся нямецка-фашысцкімі акупантамі дзеля пазбаўлення асоб яўрэйскай нацыянальнасці палітычных і эканамічных праў; па-другое, разглядаецца працэс паступовага ізалявання ад іншага насельніцтва і стварэння гета – канцэнтрацыйнага лагера для размяшчэння яўрэйскага насельніцтва на прыкладзе г. Полацка; па-трэцяе, паказаны метады карнай палітыкі нямецка-фашысцкіх захопнікаў у дачыненні да яўрэяў г. Полацка.

Другая сусветная вайна з'явілася адной з самых трагічных старонак у гісторыі XX стагоддзя. Яна ўцягнула ў сваю арбіту больш за тры чвэрці насельніцтва зямнога шара і была самай крывапралітнай і разбуральнай. Здзейсненыя нацыстамі ў перыяд іх дванаццацігадовага панавання ў Германіі і асабліва ў часы другой сусветнай вайны злачынствы не маюць аналагаў у гісторыі чалавечай цывілізацыі.

Нямецка-фашысцкія акупанты і іх пасобнікі знішчалі многія народы, аднак поўнасцю знішчаны былі толькі цыгане, а страты сярод яўрэйскага насельніцтва складаюць прыкладна 6 мільёнаў, трэць нацыі. Гэта было не проста забойства велізарнай колькасці людзей, а спроба знішчыць яўрэйства як этнас.

Генацыд яўрэяў Еўропы звычайна называюць словам «халакост». Пад дадзеным паняццем разумеецца знішчэнне нацыстамі і іх пасобнікамі яўрэйскага насельніцтва ў Германіі і на акупіраваных ёй тэрыторыях у 1939 – 1945 гадах. Яго этымалагічная крыніца – грэчаскае слова «holocaustos»: holos – «цэлы, цалкам, поўнасцю», kaustos – «спаленне». У яўрэйскага насельніцтва яшчэ ў біблейскай гісторыі існавала некалькі відаў ахвяр: ахвяра спалення, ахвяра граху, ахвяра віны, ахвяра ачышчэння. Грэчаскі назоўнік «holocaustos» выкарыстоўваўся ў Бібліі для абазначэння яўрэйскай ахвяры [1, с. 36]. У навуковас абарачэнне дадзены тэрмін быў уведзены ў пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя лаўрэатам Нобелеўскай прэміі пісьменнікам Элі Візэлем для абазначэння генацыду цэлага народа ў крэматорыях нацысцкіх лагераў смерці: «Не ўсе ахвяры нацызму былі яўрэямі, але ўсе яўрэі былі ахвярамі нацызму» [2, с. 1]. У гэтым і складаецца асаблівасць лёсу яўрэйства ў перыяд панавання гітлераўцаў у параўнанні з іншымі народамі акупіраваных тэрыторый.

У 1943 годзе Р. Лемкін увёў тэрмін «генацыд», маючы на ўвазе палітыку нацыстаў у дачыненні да яўрэяў у гады другой сусветнай вайны. Але дадзены тэрмін шырэйшы, чым Халакост, так як уключае ў сабе не толькі масавае знішчэнне пэўнага народа, але і меры па абмежаванні правоў у палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сферах жыццядзейнасці [3, с. 15].

У ізраільскай гістарыяграфіі для абазначэння трагедыі яўрэйскага народа прымяняюцца тэрміны «Катастрофа», «Шоа». Гэта было злачынства супраць чалавецтва, прыняўшае гістарычныя маштабы, злачынства, якое, па меркаванні большасці людзей, неабходна зразумець і вывучыць. Катастрофа адрозніваецца ад іншых масавых забойстваў людзей, вядомых у гісторыі чалавецтва, і па колькасці забітых, і па намерах знішчыць усіх яўрэяў, па планаванню і дасканаласці правядзення гэтых акцый.

Нацысты выкарыстоўвалі ў сваёй тэрміналогіі ўмоўнае паняцце «канчатковае вырашэнне яўрэйскага пытання», пад якім разумелася пагалоўнае знішчэнне асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Злачынствы нацызму аддюстроўвалі яго ідэалагічную канцэпцыю, галоўнымі элементамі яе былі расавая тэорыя і антысемітызм, на падставе якіх ажыццяўляўся генацыд яўрэйскага насельніцтва.

Пасля заканчэння другой сусветнай вайны тэма знішчэння яўрэйскага насельніцтва некалькі дзесяцігоддзяў была ў забыцці. Яна з'яўлялася закрытай у першую чаргу для афіцыйнай акадэмічнай гістарыяграфіі. Але трэба адзначыць тое, што фармальнай цэнзурнай забароны – не ўзгадваць ахвяры Халакосту – не было. Розныя аспекты генацыду яўрэйскага насельніцтва даследаваліся ў рамках вывучэння нацысцкай Германіі, другой сусветнай (Вялікай Айчыннай) вайны, у кантэксце знішчэння «мірных жыхароў», але комплекснага даследавання не праводзілася. Толькі з распадам савецкай дзяржавы становішча ў вывучэнні пытанняў Халакосту змянілася: сталі даступнымі для навукоўцаў архіўныя дакументы і матэрыялы, пачалі публікавацца ўспаміны відавочцаў тых падзей і г.д.

Тэарэтычнай базай для акупацыйнага рэжыму была расавая тэорыя аб нераўназначнасці народаў і аб выключнай ролі германскага народа, якая павінна была служыць абгрунтаваннем права А. Гітлера і нацысцкай Германіі панаваць над іншымі дзяржавамі. Як выказаўся Г. Гімлер: «Германія – сэрца і мозг Еўропы, цэнтр ствараючай арыйскай расы» [4, с. 290]. Таму галоўнай мэтай унутранай і знешняй палітыкі нацыянал-сацыялістычнай дзяржавы абвяшчалася дасягненне сусветнага панавання і атрыманне «жыццёвай прасторы» на Усходзе – у Польшчы і СССР для выбранага германскага народа. А. Гітлер пісаў у кнізе «Мая барацьба»: «Наша дзяржава будзе перш за ўсё імкнуцца ўсталяваць здаровую, натуральную жыццёвую прапорцыю паміж колькасцю нашага насельніцтва і тэмпам яго росту, з аднаго боку, і колькасцю і якасцю нашых тэрыторый – з другога. Толькі так нашая знешняя палітыка можа забяспечыць лёс нашай расы, аб'яднанай у нашай дзяржаве» [5, с. 255].

«Канчатковае вырашэнне яўрэйскага пытання» на тэрыторыі Беларусі пачалося адразу пасля яе акупацыі ў 1941 годзе. Паводле адміністрацыйнага распараджэння № 1 камандуючага тылам групы армій «Цэнтр» генерала пяхоты М. фон Шэнкендорфа ад 7 ліпеня 1941 года ўводзіліся адметныя знакі для яўрэйскага насельніцтва: «Усе яўрэі і яўрэйкі, якія знаходзяцца на занятай рускай тэрыторыі і дасягнуўшыя 10-гадовага ўзросту, неадкладна абавязаны насіць на правым рукаве верхняга адзення і сукенкі белую паласу шырынёй да 10 см з намаляванай на ёй сіняісцкай зоркай або жоўтую павязку шырынёй да 10 см. Такімі павязкамі забяспечваюць сябе самі яўрэі і яўрэйкі. Яўрэям катэгарычна забараняецца вітацца з іншымі людзьмі» [6].

Акрамя ўжо існуючых правіл паводзін паводле дырэктывы Г. Лозэ ад 13 жніўня 1941 года яўрэям таксама забаранялася: выязджаць з мясцовасці або мяняць месца жыхарства без належнага дазволу гебітс-камісара ці штабс-камісара; карыстацца тратуарамі, грамадскім транспартам, месцамі і ўстановамі адпачынку, наведваць тэатры, кінатэатры, бібліятэкі, музеі, школы, лякарні; валодаць аўтамашынамі і радыёпрыёмнікамі і г.д. [7, с. 54]. У адпаведнасці з загадам Дзяржаўнага камісара Остланда Г. Лозэ ад 6 верасня 1941 года «для яўрэяў мясцовыя акружныя камісары, у залежнасці ад неабходнасці, устанаўліваюць асобую каменданцкую гадзіну» [8, с. 154]. Урачам з ліку асоб яўрэйскай нацыянальнасці дазва-

лялася лячыць ці кансультаваць толькі яўрэйскіх пацыентаў. У створаныя гета яны накіроўваліся для лячэння яўрэяў. У выпадку невыканання ўсіх загадаў і распараджэнняў яўрэйскае насельніцтва каралася смерцю.

Не выключэннем у правядзенні нацысцкай палітыкі «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання» з'яўляецца тэрыторыя г. Полацка, якая была занята нямецка-фашысцкімі акупантамі праз тыдзень пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Часу для эвакуацыі насельніцтва дадзенай тэрыторыі не было, таму амаль усё мясцовае жыхарства засталося на сваіх месцах, не выключэннем у дадзеным выпадку было і яўрэйскае насельніцтва.

Паводле «Інструкцыі аб асобных абласцях да дырэктывы № 21 (план «Барбароса»)» на акупіраванай тэрыторыі, якая знаходзілася за раёнам баявых дзеянняў, арганізоўвалася ўласнае палітычнае ўпраўленне. Згодна з гэтым тэрыторыя з улікам нацыянальнасці насельніцтва і ў прыблізным суаднясенні з межамі дзеянняў груп армій дзялілася спачатку на рэйхскамісарыяты: «Украіна» на чале з Э. Кохам і «Остланд», якім кіраваў Г. Лозе. Рэйхскамісарыяты складаліся з генеральных акруг: «Беларусь», «Літва», «Валынь – Падолія», «Жытомір», тылавы раён групы армій «Цэнтр». Генеральныя акругі ў сваю чаргу падзяляліся на абласныя акругі (гебіты). Распараджэнні галоўнакамандуючага сухапутнымі войскамі праводзіў у жыццё на пераважнай частцы тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і Полацкага раёна, камандуючы тылам групы армій «Цэнтр» М. фон Шэнкендорф.

Дакладнай даты стварэння гета ў г. Полацку для яўрэйскага насельніцтва невядома. Паводле ўспамінаў відавочцаў, у жніўні 1941 года гета ўжо існавала, яго арганізацыяй займалася мясцовая камендатура. Да гэтага часу яўрэі жылі па сваіх дамах, але ўсіх, акрамя старых і дзяцей, ганялі на прымусовыя працы – падмятаць вуліцы, пілаваць дровы і г.д. Вядома, што нямецка-фашысцкія акупанты знішчалі палітработнікаў, людзей з пэўнай прафесіяй, і у першую чаргу мужчын, тых, хто мог у той ці іншай ступені аказаць супраціўленне «новаму парадку». Верагодна, адна з першых акцый была скіравана на знішчэнне неблаганадзейнай і непрыхільнай часткі яўрэяў: «Праз некалькі дзён пасля акупацыі горада немцы сабралі дзве машыны яўрэяў – і такіх, што на працы былі, і другіх вывезлі. Больш гэтых людзей ніхто не бачыў. Хутчэй за ўсё іх расстралялі» [12].

Усіх яўрэяў перасялілі ў раён вуліц Камуністычнай, Гогалеўскай, Войкаўскай, Інтэрнацыянальнай (былая Яўрэйская) – найбольш разбураная частка горада. На тэрыторыі гета знаходзіліся амбулаторыя, банна-пральны камбінат, электрастанцыя, школа № 12, сінагога, пошта, якая была абнесена калючым дротам, выхад і ўваход забараняўся. З боку вул. Гогалеўскай размешчана шыльда з надпісам «Гета». Тут жа вісеў плакат: «Кожны заўважаны на тэрыторыі лагера «Гета» рускі будзе пакараны». У гета знаходзілася каля 5 тыс. чалавек. Згодна пратаколу допыту відавочца Н. Манш ад 14 чэрвеня 1947 года, пры перасяленні тут жа ў гета і на кватэрах у яўрэйскага насельніцтва былі разрабаваны і канфіскаваны ўсе каштоўнасці і каштоўная маёмасць, пры гэтым яўрэі падвяргаліся жорсткім пакаранням, усе каштоўнасці былі аддадзены ў мясцовую камендатуру [9, с. 234].

Акупацыйныя ўлады імкнуліся атрымаць ад гета ўсё неабходнае для вермахта, гестапа і свайго абагачэння праз арганізацыю адміністрацыйных формаў кіравання ўнутры канцэнтрацыйнага лагера. Дзеля гэтага пры каменданце гета ствараліся юдэнраты і яўрэйская паліцыя. Стварэнне юдэнратаў вызначалася дырэктывай Р. Гейдрыха 1939 года па пытанню абыходжання з яўрэйскім насельніцтвам [10, с. 33]. Юдэнрат (ням. «яўрэйскі савет») – орган, уведзены нямецка-фашысцкімі акупацыйнымі ўладамі для кіравання яўрэйскім насельніцтвам асобных гарадоў і мястэчак, які складаўся з прызначаных уладамі з упаўнаважаных прадстаўнікоў з ліку яўрэяў і нёс адказнасць за выкананне нацысцкіх загадаў і распараджэнняў, што датычыліся асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Пасля стварэння гета юдэнрат адказваў за ўсё, што адбывалася ўнутры яго. Ён хутка прыдбаў галоўную ролю і кантраляваў яўрэйскую паліцыю, пажарную частку, гаспадарчую дзейнасць, забеспячэнне харчаваннем, ахову здароўя, сацыяльныя службы [11, с. 80]. Функцыі кіраўніцтва ў Полацкім гета выконвалі стараста, былы сталяр А. Шэрман, і яго намеснік, былы працаўнік майстэрні па рамонту веласіпедаў, С. Апкін, якія па даручэнню немцаў накіроўвалі людзей на працу. А. Шэрман нават бізунамі караў кожнага зняволенага, каб выслужыцца перад акупантамі. Але, дарэчы, яго расстралялі раней за ўсіх.

Перад тым як перасяліць вязняў гета на новае месца, карнікі спланіравана ажыццявілі масавыя расстрэлы яўрэяў: «У жніўні 1941 года ў раёне гор. Полацка немцы арганізавалі масавы расстрэл мірнага насельніцтва яўрэйскай нацыянальнасці. Тут былі расстраляны: Кіст Гіля, яго жонка Рыва, Шульке Мендэль, яго жонка, сям'я Брусіліных, якая складалася з двух дарослых і трох дзяцей, і многія іншыя. Немцы прымушалі капаць для сябе магілы, затым распраналі, расстрэлівалі і скідвалі ў яму» [12]. Дакладнай колькасці расстраляных з ліку вязняў гета не вядома.

У верасні 1941 года гета перамясцілі на ўскраіну горада, у раён в. Лазоўка (цяпер адзін з раёнаў г. Полацка), непадалёку ад ваенных гарадкоў Баравуха-2 і Баравуха-3, тут ужо размяшчалася каля 8 тыс. чалавек [12]. Такая лічба абумоўлена далучэннем яўрэяў з навакольных вёсак. Усіх пасялілі ў 10 бараках. Тэрыторыя была агароджана калючым дротам і ахоўвалася паліцыяй. Рэжым прапускоў быў больш жорсткім, чым раней. Немцы прыязджалі толькі рабаваць: усіх выганялі на вуліцу, загадвалі распранацца (жанчын), потым абшуквалі, забіралі ўсе каштоўныя рэчы і золата. Рэжым у гета быў падпарадкаваны

мэтам масавага знішчэння яўрэяў. Ежа выдавалася адзін раз у суткі – мучная баланда без солі і 100 г хлеба, прыгатаванага з сумесі здробненага пілавання са жмыхам. Вады не давалі зусім. Тых, хто не меў сілы для працы, расстрэльвалі або збівалі да паўсмерці. Часта раніцай 2 – 3 чалавекі не паднімаліся на працу – паміралі ад голаду і хвароб. Каля 3000 чалавек з ліку яўрэйскага насельніцтва пасля новага перасялення было расстраляна ў Ельнічы непадалёк ад завода па вырабу цэглы [9, с. 237].

Сказаць дакладна, калі былі поўнасцю знішчаны вязні Полацкага гета, складана. Згодна паказанням відавочцы і вязня гета г. Полацка (прозвішча не названа), змешчаных у зборніку матэрыялаў і дакументаў пад рэдакцыяй Р. Чарнаглазавай, полацкія яўрэі былі знішчаны ў лістападзе 1941 года: «Раніцай 21-га лістапада зноў прыехалі немцы. Мы падумалі, што гэта як і раней, прыехалі грабіць. Усіх выгналі, пастроілі, адчынілі вароты і павялі ў бок Баравухі, гэта 2 – 3 кіламетры ад Лазоўкі, дзе было гета. Аб тым, што вядуць на расстрэл, не здагадваліся. Казалі нават, што ў Палестыну адправяць. Калона выцягнулася на адзін кіламетр. Мы ішлі дзесьці пасярэдзіне, і раптам пачулі стрэлы – гэта першых пачалі расстрэльваць. Калону ахоўвалі паліцэйскія, спрабаваць збегчы можна было. Тое, што расстрэліваюць, зразумелі, калі сталі чутны стрэлы, калі ўжо зварочвалі з дарогі, ужо было бачна. Там ужо было вырыта 5 – 6 ям. Гэта праз дарогу ад рускага могільніка, якое на горачцы. Паліцаі распраналі, вопратку кідалі ў кучу, затым яўрэі ішлі да ямы, іх падганялі паліцаі. Некалькі чалавек спрабавалі збегчы, але іх забілі. Расстрэлівалі немцы з вінтовак, стаялі па пяць каля кожнай ямы» [7, с. 122 – 123].

У рукапісы «Полацк в XX веке» І. Дэйніса згадваецца, што «восенню 1941 года ўсе яўрэі з гета былі пераведзены ў баракі цэглавага завода, маёмасць была рэквізавана немцамі і паліцаямі. Праз некалькі дзён усіх яўрэяў вывезлі з заводу да пясчаных сопак каля Баравухі-2, дзе былі ўжо вырыты траншэі і ўсіх расстралялі: старыкоў, старух, дзяцей і дарослых. Было знішчана каля 9000 чалавек» [13].

Архіўныя дакументы, у прыватнасці Акт Надзвычайнай Дзяржаўнай камісіі аб злачынствах нямецка-фашысцкіх акупантаў у г. Полацку і Полацкай вобласці, датуюць апошні час існавання Полацкага гета – снежань 1941 года – знішчана больш 8000 чалавек мірнага яўрэйскага насельніцтва: «Падчас расстрэлу нямецкія палачы яўрэяў распраналі, дзяцей многіх кідалі жывымі ў яму, а таксама многіх дарослых кідалі жывымі ў яму і засыпалі зямлёй яшчэ жывымі, асабліва старыкоў. Месца расстрэлаў многіх жыхароў Полацка было за в. Лазоўка за чыгуначным пераездам правей Зялёнага Гарадка, у лесе, у снежні 1941 года» [14]. Вядомы прозвішчы паліцаяў, якія ўдзельнічалі ў масавых расстрэлах полацкіх яўрэяў: Шасцітка, Агурэцкі, Лабецкі, Аўласенка, Любельскі, Правіла [15].

Такім чынам, у г. Полацку было створана два гета, адно – «адкрытага» тыпу ў цэнтры горада, якое, хоць і мела агароджу, але жорсткага кантролю за выхадам з гета не было. Другое – «закрытага» тыпу – было намерана вынесена па-за межы горада ад мясцовага беларускага насельніцтва з далейшай яго ліквідацыяй. У гета былі свае органы ўнутранага парадку – «юдэнрат», старшынёй якога з'яўляўся А. Шэрман. Месцам масавага знішчэння вязняў Полацкага гета была тэрыторыя за в. Лазоўка. Дакладную лічбу знішчанага яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі г. Полацка назваць складана. Звязана гэта ў першую чаргу з недакладнасцю дадзеных Актаў Надзвычайнай Дзяржаўнай камісіі, складзеных на падставе сведчанняў відавочцаў тых падзей, і ўспамінаў, якія даюць розныя лічбы, даты і месцы расстрэлаў. Тым не менш большасць з іх згадваюць лічбу ў 8000 чалавек.

ЛІТАРАТУРА

1. Зеленин, А.В. Холокост: история понятия / А.В. Зеленин // Русская речь. – 2000. – № 3 – 4. – С. 35 – 39.
2. Арад, И. Холокост. Катастрофа европейского еврейства (1933 – 1945) / И. Арад. – Иерусалим: Яд Ва-Шем, 1990. – 165 с.
3. Катастрофа европейского еврейства: в 6 ч. / под ред. Д. Михмана. – Телль-Авив: изд-во Открытого ун-та, 1995. – Ч. 1 – 2: Юдофобия и антисемитизм. – 269 с.
4. Мельников, Д. Империя смерти: Аппарат насилия в нацистской Германии. 1933 – 1945 / Д. Мельников, Л. Черная. – М.: Политиздат, 1987. – 414 с.
5. Гитлер, А. Моя борьба / А. Гитлер. – Смоленск: Русич, 2000. – 658 с.
6. Административное распоряжение № 1 командующего тылом группы армий «Центр» генерала пехоты М. фон Шенкендорфа от 7 июля 1941 г. // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Фонд. 4683. – Оп. 3. – Д. 952. – Л. 1 – 5.
7. Трагедия евреев Белоруссии в 1941 – 1944 гг.: сб. материалов и докум. / Р.А. Черноглазова, Х. Хеер; ответ. ред. Р.А. Черноглазова. – 2-е изд. – Минск: Гальперин, 1997. – 398 с.
8. Лейзеров, А. Геноцид белорусского еврейства глазами немецких оперативных документов / А. Лейзеров // Актуальные вопросы изучения Холокоста на территории Беларуси в годы немецко-фашистской оккупации: сб. науч. работ / сост. и ред. Я.З. Басин. – Минск, 2006. – С. 148 – 158.
9. Холокост в Беларуси. 1941 – 1944: докум. и материалы / сост.: Э.Г. Иоффе, Г.Д. Кнатько, В.Д. Селеменев. – Минск: НАРБ, 2002. – 276 с.

10. Козак, К. Германский оккупационный режим в Беларуси и еврейское население / К. Козак // Актуальные вопросы изучения Холокоста на территории Беларуси в годы немецко-фашистской оккупации: сб. науч. работ / сост. и ред. Я.З. Басин. – Минск, 2006. – С. 23 – 59.
11. Мюллер, Н. Вермахт и оккупация (1941 – 1944) / Н. Мюллер; под ред. А. Юденкова. – М.: Воениздат, 1974. – 387 с.
12. Акт о злодеяниях в Полоцке и Полоцкой области в отношении еврейской национальности // НАРБ. – Фонд. 861. – Оп. 1. – Д. 13. – Л. 5.
13. Дейнис, И.П. Полоцк в XX веке (1905 – 1967 гг.) / И.П. Дейнис // Полоц. ист.-культурн. заповедник. – Фонд КП – S 2774. – Л. 181.
14. Акт о злодеяниях, совершённых немецко-фашистскими захватчиками в г. Полоцке и Полоцкой области // Зональный государственный архив в г. Полоцк. – Фонд. 687. – Оп. 1. – Д. 1. – Л. 23 – 24.
15. Список полицейских, учавствовавших в расстрелах еврейского населения // Полоц. ист.-культ. заповедник. – Фонд КДФ-4 2544/1-38. – Л. 2.

ВЯСКОВЫЯ МОГІЛКІ: ЗРУБНЫЯ НАДМАГІЛЛІ
(ПА МАТЭРЫЯЛАХ УСХОДНІХ РАЁНАЎ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ І МАГІЛЁЎСКАГА ПАДНЯПРОЎЯ БЕЛАРУСІ)

канд. мастацтвазн., дац. В.А. ЛАБАЧЭЎСКАЯ
(Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск)

На падставе палявых матэрыялаў, архіўных фотаздымкаў, гістарычных звестак разглядаюцца два тыпа архаічных зрубных надмагільных пабудоў – рэліктавыя драўляныя домікі («церамкі») і абрубы магіл адным-двума вянцамі зрубаў і дошкамі ў рэгіёне Віцебска-Магілёўскага Падняпроўя Беларусі. Прыцягненне параўнальнага матэрыялу – выяў надмагільных домікаў на гэтак званых «дубровенскіх ручніках», лакалізаваных у зоне бытавання зрубных надмагілляў, а таксама лакалізацыя на данай тэрыторыі памінальнага звычая засцілання на Радаўніцу абрусаў на магілах і сямейных трапез на іх, дзеля чаго прыстасавана форма саміх магіл і пабудоў на іх, дазваляе зрабіць вывад аб устойлівасці архаічных уяўленняў, звязаных з культам продкаў, які фіксуецца ў гэтым рэгіёне летапіснымі крыніцамі і археалагічнымі матэрыяламі.

Вясковыя могілкі трэба разглядаць як важную крыніцу ведаў аб культуры лакальных супольнасцей. Надмагільныя помнікі, якія належаць да розных храналічных перыядаў, спосабы афармлення і ўпарадкавання магіл трэба разглядаць як кашоўныя ў інфармацыйным плане артэфакты мінулай і сучаснай культуры беларускай вёскі. Яны сведчаць аб этнічным паходжанні тутэйшага насельніцтва, змене культурных традыцый, а адпаведна таму – светапоглядавых пераменах у свядомасці людзей.

Імкліва змяняецца выгляд вясковых могілак у апошняе дзесяцігоддзе. Асабліва гэта тычыцца спосабаў прадметна-пластычнага афармлення магіл, формы надмагільных помнікаў, ужываемых матэрыялаў. Сакральная пахавальна-памінальная прастора вясковай культуры, якая доўгі час захоўвала свае архаічныя традыцыі, у нашы дні апынулася ў рэчышчы агульных сацыяльна-эканамічных і цывілізацыйна-культурных перамен. Актуальнай зрабілася праблема вандалізму і гэтак званай «чорнай археалогіі», у выніку чаго нішчацца могілкавыя комплексы, знікаюць стражытныя надмагільныя помнікі.

Не выпадкова навукоўцы, мясцовыя краязнаўцы і журналісты ўсё больш увагі надаюць праблеме дакументацыі, прыцягненню грамадскасці да захавання, вывучэння вясковых могілак. Шэраг публікацый у цэнтральнай і мясцовай прэсе апошні час прысвечаны каменным надмагільным крыжам.

Разам з сябрамі навукова-краязнаўчага і грамадскага аб'яднання «Этнагістарычны цэнтр "Явар"» аўтарам на працягу апошніх гадоў праводзіцца мэтанакіраванае абследаванне і фотадакументацыя вясковых могілак на Беларусі. Адной з яго задач з'яўляецца выяўленне архаічных тыпаў надмагільных помнікаў, якія захаваліся на вясковых могілак: каменных крыжоў, каменных жорнаў-помнікаў і зрубных надмагілляў. Першапачатковае абагульненне сабранага матэрыялу ўжо зараз дае магчымасць прасачыць пэўныя рэгіянальныя адрозненні ў тыпах старадаўніх надмагільных помнікаў і спосабах афармлення магіл.

Асаблівая ўвага была скіравана на рэліктавыя зрубныя драўляныя надмагіллі ў выглядзе домікаў, якія наяўна адлюстроўваюць адну з галоўных ідэй культу продкаў.

Пахавальныя пабудовы ў выглядзе драўляных камер с двухсхільным дахам, якія паўтараюць жыллё жывых і з'яўляюцца пасмяротным домам для душы і цела памерлага, вядомы з дахрысціянскіх часоў і распаўсюджаны на шырокай тэрыторыі Еўразіі. Ва ўсходніх славян ён зафіксаваны ад Валыні да Прыанежжа. Да канца XIX стагоддзя такі звычай захоўваўся ў карэлаў і іншых фіна-ўгорскіх народаў, у пляменах Сібіры і Далёкага Усходу [1, с. 79]. Узвядзенне надмагільных пабудоў было выклікана анімістычнай ідэяй аб прыродзе душы памерлага, якая захоўвае патрэбу ў жыллі, як і жывыя людзі, аб пасмяротным доме для тых, хто пайшоў у іншы свет. Надмагільныя дамы ўвасаблялі адзінства жывых і памерлых

членаў сям'і і роду, выконвалі важную функцыю ў пamінальнай абраднасці. Агульная для чалавецтва ідэя аб працягу жыцця ў іншым свеце аднолькава кіравала як будаўнікамі егіпецкіх пірамід, так і тымі, хто яшчэ на пачатку XX стагоддзя ставіў драўляныя зрубы на вясковых могілках на Беларусі.

У навуковай літаратуры даследаванню архаічных тыпаў пахаванняў, звязаных з культам продкаў, які ў славян носіць назву «домики мертвых», «изба смерти», «домивины», «столпы», «домовины», «голбцы», прысвечаны грунтоўныя працы М.О. Фрэймана [2, с. 86 – 87], Б.А. Рыбакова [3, с. 73 – 120].

У беларускай этнаграфіі гэтую тэму закрануў М.Х. Раманюк у артыкуле «Беларускія народныя надмагілліі», дзе ім прыведзены назвы надмагільных вяночных зрубаў з дахам на Беларусі: «хатка», «наруб», «дамавіна» [4, с. 262 – 263]. Энцыклапедычны артыкул «церамок» аб драўлянах надмагільных пабудовах у выглядзе хаткі напісаны Л.У. Дучыц [5, с. 540]. Лінгваэтнічнаму аспекту існавання надмагілляў-нарубаў прысвечаны артыкул Г.А. Цыхуна [6]. Назвы і формы палесскіх надмагільных помнікаў картаграфаваны ўкраінскім этналінгвістам В.Л. Свіцельскай [7].

Наш артыкул – першая спроба абагульніць палявыя матэрыялы па архаічных відах зрубных надмагілляў у Беларусі. Найбольш цікавыя матэрыялы былі сабраны ва ўсходніх раёнах Віцебскай вобласці і на Магілёўскам Падняпроўі. Параўнанне рэліктавых артэфактаў з архіўнымі фотаматэрыяламі пачатку XX стагоддзя і гістарычнымі звесткамі дазваляе рэканструяваць пласт пахавальна-пamінальнай культуры беларусаў, які ўжо фактычна належыць мінуламу.

Драўляныя надмагілліі ў выглядзе доміка

Унікальныя па захаванні зрубныя надмагілліі ў выглядзе домікаў выяўлены ў 2007 годзе на могілках в. Гацькаўшчына Аршанскага раёна Віцебскай вобласці (мал. 1, 2).



Мал. 1. Драўляныя надмагілліі – «церамкі»
на могілках в. Гацькаўшчына Аршанскага раёна Віцебскай вобл. (2007 г., фота аўтара)



Мал. 2. Рэшты надмагільнага «церамка»
на могілках в. Гацькаўшчына Аршанскага раёна Віцебскай вобл. (2007 г., фота аўтара)

Два вяночных зруба з дахамі, якія захаваліся ў дастаткова добрым стане, размешчаны побач адзін ля аднаго ў левым баку ад увахода на могілкі. Яны зрублены з трох радоў часаных брусоў у чысты, гэтак званы «нямецкі вугал». Адно з надмагілляў знаходзілася ў лепшым стане – яго дах з пяці дошак захаваўся цалкам, на другім не стае цэнтральнай дошкі. Драўніна надмагільных пабудоў моцна пашкоджана часам, спарахнелая, парослая зялёным імхом. Адна з тарцовых сценак мае невялікую адтуліну – акенца ў форме крыжыка. Яно ўтворана ступенчатымі зарубамі пасярэдзіне дзвюх дошках, якія злучаюцца паміж сабой. На вялікі жаль, намі не былі праведзены абмеры гэтых помнікаў.

Зрубы стаяць на зямлі, у іх сярэдзіне адсутнічае надмагільнае ўзвышша. Унутры зруба, бліжэй да тарца з акенцам, усталяваны металічныя крыжы, звараныя з труб і пафарбаваныя ў зялёны колер. Крыжы пазнейшыя, яны адносяцца прыкладна да 1970-х гадоў. Яшчэ чатыры такіх самых па форме, памеры і колеры крыжы стаяць побач злева і справа на суседніх пахаваннях так, што ўтвараюць адну лінію з тымі, што ўсталяваны ў зрубах. Відаць, усе пахаванні належаць аднаму роду і даглядаюцца да нашага часу. На момант даследавання на ўсіх крыжах былі ўмацаваны кавалкі белай тканіны або фартушкі – знакі памяці аб продках.

На тэрыторыі могілак выяўлены рэшткі яшчэ некалькіх драўляных надмагілляў, у якіх захаваліся толькі зрубы з двух-трох вянцоў. На іх добра бачна адсутнасць надмагільнага халма, трапецападобная форма бакавін зруба, прыдатная для мацавання дошак двухсхільнага даху.

Ад мясцовай жыхаркі Таццяны Абрамаўны Каткоўскай (1938 г. нар., ураджэнка в. Старажоўка Дубровенскага раёна) запісана назва такіх надмагільных помнікаў – «грабнічкі», «церамкі»[1]. Яна сказала, што «разгнілі церамкі, апалі» і такія ўжо даўно на магілах не ставяць.

Выяўленныя ў Аршанскім раёне зрубныя пабудовы на магілах пашыраюць нашы веды аб геаграфіі распаўсюджвання гэтага архаічнага тыпу надмагільных помнікаў, якіх на Беларусі да нашага часу захавалася адзінкі. Археолагам Л. Дучыц у 1997 годзе выяўлена надмагілле ў выглядзе доміка на могілках в. Баркі Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці. У 2005 годзе пры наведванні гэтых могілак помнік быў задакументаваны і намі. Драўляны, зроблены з дошак домік быў пастаўлены ў 1929 годзе і дайшоў да нашага часу ў выдатным стане, бо даглядаецца нашчадкамі К. Цмыха і яго жонкі, якія тут пахаваны. Захаванню надмагільнага доміка садзейнічае тое, што яго дах накрыты толлю. Каля тарца надмагільнага доміка ўсталяваны два драўляныя крыжы і камяні пад імі. На час першага абследавання могілак Л. Дучыц, тут мелася яшчэ адно паўразбуранае надмагілле ў выглядзе доміка з вялікім драўляным крыжам, што зафіксавана на фотаздымку. У 2005 годзе яно ўжо было зусім зруйнаванае і спарахнелае. Пры апытанні вяскоўцаў намі была выяўлена мясцовая назва такіх надмагілляў – «церамок».

Зонай бытавання архаічных зрубных пабудоў на магілах лічыцца Палессе. Надмагільных домікаў – «нарубаў», або «снарубаў», – калісьці было багата на палескіх могілках. У 1926 і 1929 гадах у вёсках Велута, Сінкевічы, Мокраць Лунінецкага павета іх задакументавалі на фотаздымках польскі этнограф К. Машынскі і ўдзельнік экспедыцыі на Палессі па фіксацыі помнікаў культуры і мастацтва, арганізаванай Цэнтральным бюро інвентарызацыі ў Варшаве, фатограф С. Бохінг [8, с. 223, 225 – 228].

У 2007 годзе ў палесскай зоне Салігорскага раёна Мінскай вобласці на могілках, агульных для некалькіх вёсак (Чаланец, Хорастаў і інш.), намі былі зафіксаваны каля дзесяці зрубных надмагілляў. Зрубы выкананы з тоўстых часаных дубовых дошак, дахаў ні на адным з іх не захавалася. Надмагіллі маюць розныя памеры, сярод іх ёсць маленькія, дзіцячыя. Яны размешчаны на самай высокай, найбольш даўняй частцы могілак. У адрозненні ад зрубных надмагілляў у Аршанскім і Клічаўскім раёнах, яны зрублены ў «ластачкін хвост», дзе канцы дошак выступаюць. Іх можна датаваць канцом XIX – пачаткам XX стагоддзя на той падставе, што на фотаздымку польскага этнасацыёлага Ю. Абрэмбскага перыяду яго экспедыцый на Палессі 1934 – 1937 гадоў[2], на гэтых могілках дахі драўляных домікаў ужо моцна разбураны [9, с. 10].

Выяўленыя ў Аршанскім раёне артэфакты зрубных надмагілляў, архіўныя матэрыялы і факты якіх сведчаць аб існаванні такіх надмагілляў на ўсходзе Беларусі і сумежных тэрыторыях, дазваляюць істотна дапоўніць нашы ўяўленні аб асаблівасцях пахавальнага абраду беларусаў, архаічных формах надмагіляў, якія падпарадкаваліся сучасным відам надмагільных помнікаў і знакаў.

Апытанні насельніцтва шэрагу вёсак Аршанскага і Дубровенскага раёна наконт назвы зрубных надмагілляў, якія, па сведчанні жыхароў старэйшага ўзросту, да надаўняга часу можна было бачыць на вясковых могілках, далі дастаткова стракатую тэрміналагічную карціну. Свяшчэннік царквы в. Крапіўніца – суседняй з в. Гацькаўшчына, называе надмагільныя пабудовы ў выглядзе домікаў «нарубы». Жыхарка в. Гацкаўшчына Аляксандра Ільінічна Новікава (1947 г. нар.) паведаміла, што ў дзяцінстве, гэта значыць у 1960-я гады, яна бачыла такія надмагіллі ў вёсках Махначы, Кабачэва, якія размешчаны паблізу в. Чубакова Дубровенскага раёна, дзе яна нарадзілася. Надмагільныя пабудовы тут называлі «капліца», «домікі». У вёсках Рыбалтава і Чубакова запісаны назва «награбенне», «награбніца» і інфармацыя, што іх выраблялі з елкі

[1] Тут і далей цытуюцца экспедыцыйныя матэрыялы з архіва аўтара.

[2] Ідэнтыфікацыя фотаздамка, лакалізацыя якога была невядома, зроблена аўтарам.

пераважна багатыя вяскоўцы. У в. Семахі Аршанскага раёна ад Аляксея Рыгоравіча Багамолава (1931 г. н.) запісана[3], што ў яго дзяцінстве, напярэдадні вайны, на мясцовых могілках было некалькі драўляных пабудоў, зробленых у два вянцы ў «нямецкі вугал». Іх называлі «прыкладзень», «прыклады». Ставілі такія надмагілі праз год пасля пахавання, крыж усталёўвалі ў галаве нябожчыка.

Назвы надмагільных пабудоў у выглядзе домікаў на ўсходзе Беларусі адлюстраваны ў этнаграфічнай літаратуры і рэгіянальных слоўніках. М. Нікіфароўскі згадвае назву «галубец», якая існавала на Віцебшчыне для прадольнага зруба на магілах у 3 – 5 вянцоў з дахам [10, с. XXXI]. М. Каспяровіч у «Віцебскім краёвым слоўніку» (1927) прыводзіць назву маленькага драўлянага домікa на магіле – «церамок» і прыклад выразу з ужываннем гэтага слова з в. Вейна Сенненскага раёна: «на магіле бацькі церамок згніў» [11, с. 335]. У раёне Драгобуша на Смаленшчыне драўляные надмагілле ў выглядзе домікa мела назву «домовина» [12, с. 70].

Фотаархіўныя матэрыялы сведчаць, што ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя на ўсходзе Беларусі вясковыя могілкі з драўлянымі надмагіллямі ў выглядзе домікаў выглядалі як сапраўдныя вясковыя паселішчы ў мініяцюры. У Музеі антрапалогіі і этнаграфіі ў Санкт-Пецярбургу захоўваецца фотаздымак 1895 года могілак у Аршанскім павеце Магілёўскай губ.[4], на якім добра бачны драўляныя хаткі, а агульны выгляд могілак нагадвае вёску з драўлянай забудовай (мал. 3).



Мал. 3. Могілкі ў Аршанскім павеце Магілёўскай губ. 1895 г.
(Рэпрадукцыя з кнігі: Т.А. Берштам Молодость в символизме переходных обрядов восточных славян: Учение и опыт Церкви в народном христианстве. – СПб.: Петербургское Востоковедение. 2004. – С. 238. Рис. 25)

У зборы Расійскага этнаграфічнага музея ў Санкт-Пецярбурзе ёсць здымак могілак, зроблены ў 1905 годзе на сумежжы з Аршанскім і Дубровенскім раёнамі Віцебскай вобласці – у Красненскім павеце Смаленскай губерні. На здымку бачна, што могілкі на ўзгорку складаюцца з вялікай колькасці драўляных хатак з двухсхільнымі дахамі і крыжамі над імі. У музейным вопісу фотаздымка пазначана этнічная прыналежнасць гэтай этнаграфічнай з'явы – «беларусы»[5].

У пачатку XX стагоддзя драўляные зрубныя надмагіллі ў беларусаў былі ўжо рудыментнай з'явай і таму выклікалі вялікую цікавасць этнографаў. У 1905 годзе ў в. Омельна Ігуменскага павета Мінскай губерні драўляныя «надгробкі» з крыжыкамі зафіксаваў В.К. Костка[6]. У 1912 годзе ў в. Масток Магілёўскай губерні іх фотафіксацыю зрабіў А.К. Сержпутоўскі[7]. Фатаграфічная спадчына этнографа сведчыць пра тое, што ён цікавіўся гэтым старадаўнім пахавальна-памінальным звычаям беларусаў. У 1924 годзе А.К. Сержпутоўскі сфатаграфаваў драўляныя надмагіллі – калоды на «могліцах» в. Сава Горыцкага павета Магілёўскай губерні[8], у 1926 годзе - надмагіллі ў выглядзе домікаў у в. Кабыліна Гомельскага павета[9], на якім

[3] Зап. І.Ю. Смірновай у 2008 г.
[4] МАЭ, № 1689-10.
[5] РЭМ, кал. 766. Набыты ў 1905 г. у М.Ф. Крукоўскага.
[6] РЭМ, кал. 806 – 25.
[7] РЭМ, кал. 2711 – 1.
[8] РЭМ, кал. 4167 – 22.
[9] РЭМ, кал. 5053 – 93.

можна разгледзець, што вянцы зрублены «ўлапу». Надмагільныя помнікі такога кшталту ў 1930 годзе зафіксаваны А. Дуйсбург на могілках в. Аляксандраўка Прапойскага раёна (цяпер Слаўгарадскі раён) Магілёўскай вобл. Мадэль надмагільнага збудавання ў выглядзе доміка з назвай «церамок» у ¼ частку сапраўднага памеру прывёз у пачатку XX стагоддзя ў Расійскі этнаграфічны музей у Санкт-Пецярбургу Е.Р. Раманаў з Веліжскага павета Віцебскай губерні (цяпер Смаленская вобл.)[10].

Тыя надмагільныя артэфакты, якія зафіксаваны пералічанымі этнографамі, адносяцца да сярэдзіны XIX – пачатку XX стагоддзя. Перыяд жыцця драўляных пабудоў на магілах і крыжах на адкрытым паветры, па нашым назіранням, складае прыкладна 70 – 80 гадоў. У глыбінных, лясных вёсках, ізаляваных ад вонкавага свету, надмагіллі ў кшталце доміка ставілі яшчэ ў 1940-я гады. Некаторыя з іх захаваліся да канца XX стагоддзя. Так, напрыклад, у 1990 годзе ў Кармянскім раёне Гомельскай вобласці на могілкі з драўлянымі хаткамі – «нарубамі» патрапіў М. Раманюк [13, с. 82 – 87]. Даследчык быў першым, хто пасля працяглага занядбання ў беларускай савецкай этнаграфіі тэмы народных надмагілляў у пахавальна-памінальнай абраднасці звярнуўся да яе вывучэння [4].

У экспедыцыі 2004 года Міжнароднай гуманітарнай школай ОВТА Варшаўскага універсітэта «Беларусь і яе памежжы: гісторыя, культура, мова» былі сабраны цікавыя матэрыялы аб драўляных зрубных надмагіллях на беларуска-расійскім памежжы: Горацкім, Дрыбінскім раёнах Магілёўскай, Дубровенскім раёне Віцебскай і Манастыршчынскім раёне Смаленскай абласцей. Па сведчанні мясцовых жыхароў надмагільныя домікі былі тут шырока распаўсюджаны ў першай палове XX стагоддзя. У мясцовай лексіцы захаваліся іх назвы. Трэба адзначыць, што ў адной вёсцы паралельна ўжываліся розныя намінацыі зрубных надмагільных домікаў: «грабніца», «церамкі» (в. Валынцава Горацкага раён), «церамок», «церамы», «нагробнік» (в. Горы Горацкага раёна), «грабок» (в. Рэкатка, Масалыка Горацкага раёна), «церамкі», «церамы» (в. Абраімаўка, Новае Прыбужжа Дрыбінскага раёна), «прікладзі» (в. Масалыка Дрыбінскага раёна), «прыкладні» (в. Муралёўка Горацкага раёна), «надгробніца», «грабкі» (в. Сяморжа Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобл.)[11].

Драўляныя зрубныя надмагіллі, як і «прыклады» на магілах, у выглядзе гарызантальна пакладзенага на невысокі земляны насып бервяна даследчыкі адносяць да этнавызначальных прызнакаў культуры беларусаў [4, с. 260]. Напрыклад, звычай ставіць драўляныя «шрубы», гэта значыць зрубы (скрыні), замест насыпу магільных халмоў на магілах, яднаў «літвінаў» паўночных раёнаў Чарнігаўскай губерні з беларускім этнасам і падкрэсліваў іх роднаснасць [14, с. 35]. Беларусы-перасяленцы канца XIX – пачатку XX стагоддзя захавалі гэты старадаўні звычай у Сібіры. У Омскай вобласці этнографам М. Беражновай і А. Мініным у 2005 годзе былі выяўлены зрубныя надмагіллі ў выглядзе хатак – «домікі» на могілках в. Аціркa Тарскага раёна (мал. 4), дзе калісці спыніліся перасяленцы з Віцебскай і Магілёўскай губерняў [15, с. 195 – 198; 16].



Мал. 4. Надмагільны домік беларусаў-перасяленцаў у в. Аціркa Тарскага раёна Омскай вобл. 1995 г. (Фота [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ethnography.omskreg.ru/page.php?id=874)


[10] РЭМ, кал. 539 – 1.

[11] Матэрыялы палявых запісаў захоўваюцца ў архіве Міжнароднай гуманітарнай школы (MSH) ОВТА Варшаўскага універсітэта (Польшча) і архіве аўтара.

Надмагільныя домікі і абрубы на тэрыторыі ўсходніх раёнаў Віцебскай вобласці і Магілёўскага Падняпроўя

Аналізуючы сабраныя этнаграфічныя матэрыялы і архіўныя сведчанні аб існаванні надмагільных рэліктаў, мы прышлі да высновы, што разам з палесскай зонай архаічных драўляных надмагілляў, на Беларусі можна вылучыць усходні рэгіён – левабярэжжа Дняпра, дзе ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя быў распаўсюджаны звычай ставіць на магілах зрубы з двухсхільным дахам і крыжом. Найбольшая колькасць фактаў іх існавання паходзіць з Аршанскага і Дубровенскага раёнаў Віцебскай вобласці, Горацкага і Дрыбінскага раёнаў Магілёўскай вобласці, а таксама з памежжа Смаленшчыны. Шэраг звестак аб драўляных зрубных надмагіллях тычацца іншых правабярэжных па Дняпру раёнаў Магілёўскай і Гомельскай абласцей і Чарнігаўшчыны. Адзінкавыя прыклады згадваюць пра існаванне надмагільных домікаў у басейне рэк: Западная Дзвіна (Сенненскі раён Віцебскай вобл.), Бярэзіна (Клічаўскі раён Магілёўскай вобл.), Пціч (Пухавіцкі раён Мінскай вобл.). Аперыруючы лексічнымі і этнаграфічнымі фактамі, беларускі мовазнавец Ф.Д. Клімчук выказаў думку, што мяжа паміж зонай бытавання архаічных зрубных надмагілляў-домікаў і помнікаў у выглядзе калод («нарубы», «прыхаромы», «прыклады») праходзіць па мяжы Усходняга і Заходняга Палесся ў Лунінецкім і Столінскім раёнах[12].

У плане даследавання архаічных традыцый зрубных надмагілляў нашай пільнай увагі варты ўсходні рэгіён, які можна акрэсліць як Віцебска-Магілёўскае Падняпроўе. Па нашым меркаванні, ён з'яўляецца зонай, у якой склаліся і асабліва доўга захоўваліся пэўныя рэгіянальныя асаблівасці пахавальна-памінальнага абраду, адным з цэнтральных атрыбутаў якога выступалі драўляныя надмагіллі ў выглядзе домікаў. Невыпадкова на гэты рэгіён прыпадае зона распаўсюджвання гэтак званых «дубровенскіх ручнікоў» з выявамі домікаў (мал. 5), узоры якіх паходзяць з Дубровенскага, Аршанскага, Шклоўскага, Горацкага, Мсціслаўскага раёнаў [17, с. 80], а таксама з сумежнай тэрыторыі Смаленшчыны [18, с. 7, мал. 9]. Адметнасцю ручнікоў гэтага лакальнага тыпу з'яўляецца наяўнасць у іх арнаментацыі выяў «домікаў» або «хатак», «цэркавак» з крыжамі, якія, як намі было паказана раней, сведчаць аб тым, што яны з'яўляюцца выявамі надмагільных пабудоў [19, с. 861]. Такія ручнікі, звязаныя з культам продкаў, удзельнічалі ў пахавальна-памінальных абрадах, з'яўляюцца медыятарамі паміж светам жывых і памерлых продкаў – дзядоў. Даследчыца рускай народнай вышыўкі Г.С. Маслава таксама выказвала думку аб тым, што ручнікі з выявамі ў арнаменце надмагільных домікаў з крыжамі на двухсхільным даху, былі прызначаны для вывешвання ў дні памінання продкаў на могілках і крыжах [20, с. 162, 175].




Мал. 5. Ручнік з выявамі надмагільных домікаў. Канец XIX стагоддзя. Вышыўка, в. Баева Дубровенскага раёна Віцебскай вобл. (фота аўтара)

[12] Думка выказана ў размове пры абмеркаванні тэмы архаічных форм надмагілляў, за што аўтар выказвае Ф.Д. Клумчуку сваю шчырую ўдзячнасць.

Нашы палявыя матэрыялы дазваляюць таксама вылучыць рэгіён Віцебска-Магілёўскага Падняпроўя як зону існавання традыцыі рабіць на магілах вяночные зрубы ў адзін-два вянцы з бярёвнаў або абкладаць іх дошкамі, злучанымі ў скрыню. Вясковыя могілкі гэтага рэгіёна вылучаюцца тым, што магілы на іх маюць прамакутную форму, абрублены з усіх бакоў, плоскія, без надмагільнага ўзвышша. Іх называюць «абруб» (Горацкі, Дрыбінскі раёны), «угалкі» (в. Прусіна Крычаўскага раёна), «обробы» (в. Канахоўка Клімавіцкага раёна), «грабнічкі» (в. Шарэйкі Касцюковіцкага раёна). Такі спосаб афармлення магіл характэрны для Аршанскага, Горацкага, Крычаўскага, Чэрыкаўскага, Клімавіцкага, Касцюковіцкага, Краснапольскага, Слаўгарадскага раёнаў. У некаторых вёсках згадваюць, што на могілках калісці стаялі таксама драўляныя домікі. Назвы для домікаў і для магіл, якія афармленыя зрубам, адрозніваюцца: першыя называюць «церамою», «нагробнік» (в. Горы Горацкі раён), другі – «абруб» (в. Новае Прыбужжа, Абраімаўка Дрыбінскага. в. Рэкатка Горацкага раёна).

Драўляныя абрубы, якія мы зафіксавалі, зроблены або з бярвёнаў ці, часцей, з тоўстых шаляваных брусоў (мал. 6). Найбольш даўнія абрубы зрублены ў чысты вугал. У некаторых з іх тарцовыя сценкі, вышэйшыя за падоўжныя і зацёсаныя накшталт трапецыі, ці закруглёныя, дзякуючы чаму яны нагадваюць надмагільныя домікі без дахаў. Гэта дазваляе нам меркаваць, што надмагіллі такога кшталту з'яўляюцца рэдуцыраванай формай зрубнага надмагілля ў выглядзе доміка. Зрубы ўспрымаюцца як знак, сімвал ідэі пасмяротнага жылля для продкаў, якая ў сваёй паўнаце ўвасоблена ў надмагільных доміках. Яны сведчаць пра тое, што гэтая краевугольная ідэя культу продкаў са стратай архаічнага звычая пабудовы на магіле драўлянага доміка, працягвае функцыянаваць на ўзроўні знака. Зрубны вянец – аснова дома – сімвалізуе дом, жыллё для памерлага, з'яўляецца яго знакам, нясе ў сябе сімвалічную інфармацыю. У гэтым сэнсе сімвалічным з'яўляецца і тое, што на могілках гэтага рэгіёну можна бачыць сямейныя пахаванні, калі некалькі магіл заключаны ў адзін вялікі абруб і маюць столькі крыжоў, колькі тут маецца пахаванняў. Такія пахаванні ўвасабляюць ідэю радавой еднасці ў адным агульным для ўсіх доме і ў пасмяротным жыцці.



Мал. 6. Магіла з драўляным абрубам на магілках в. Грышына Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобл. (2006 г., фота аўтара)

Замест драўляных зрубаў для афармлення магіл таксама ўжываюць пілаваныя дошкі, з якіх робяць скрыню. Як можна меркаваць, гэты звычай не апошняга часу. На вясковых могілках беларусаў-перасяленцаў з Віцебскай і Магілёўскай абласцей у Омскай вобласці выяўлена суіснаванне абодвух тыпаў надмагільных пабудоў – зрубныя «домікі» і абрубы з дошак, якія называюць «дошкі» [16]. Абрубы падобныя на невысокую скрыню, унутры якой фарміруецца магільнае ўзвышша [15, с. 195 – 198].

У апошні час форму драўлянага абруба паўтараюць з сучасных матэрыялаў, якія сталі даступныя селяніну: цэглы, цэменту, зварных металічных канструкцый (мал. 7, 8). Прамакутная абрубы з цэглы робяцца ў 2 – 4 рады кладкі. Часам адзін з іх тарцоў, выкладзены з цаглін, мае ступенчатую форму (в. Язёры Чэрыкаўскага раёна) ці так зроблены абодва тарцы (в. Абраімаўка Дрыбінскага раёна), якія паўтараюць завяршэнне драўляных надмагільных зрубаў – домікаў, каб зручней было накрываць дахам з дошак.


Некаторыя асаблівасці абраду памінання продкаў Віцебска-Магілёўскага Падняроўя ў сувязі са зрубнымі надмагіллямі

Зрубныя домік, ці абруб, прынята ставіць на магіле праз год пасля пахавання памерлага родзіча. Крыж усталёўвалі ў галаве пахаванага. Нашы інфарманты падкрэслівалі, што надмагільныя домікі рабілі пераважна людзі заможныя. Хутчэй за ўсе разгледжаныя намі два тыпы зрубных надмагільных помнікаў –

домікі і абрубы існавалі ў пахавальна-памінальнай звычаёвасці разам ужо ў старажытнасці і з'яўляліся сведчаннем сацыяльнага размежавання грамадства. Занядбанне звычая будаваць на магіле зрубны дом прыпадае на 1920 – 1930-я гады, што было выклікана сацыяльна-культурнымі пераменамі ў беларускай вёсцы ў савецкі час. Разбурэнне міфалагічнай свядомасці, міжпакаленных сувязяў у вясковай грамадзе парушыла цэласнасць уяўленняў, звязаных з культам продкаў, што прывяло да адказу ад традыцыйных пахавальна-памінальных звычаяў і традыцыйных форм надмагільных пабудоў. Разам з тым у арэале Віцебска-Магілёўскага Падняпроўя назіраецца захаванне аднаго з архаічных элементаў культу продкаў, які непасрэдна звязаны з формай надмагільнай пабудовы – сямейнай трапезы з ужываннем ежы непасрэдна на магіле продка.



Мал. 7. Абрубы магіл з цэглы, 2006 г., в. Абраімаўка Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобл. (фота аўтара)




Мал. 8. Магілы з маталічнымі абрубамі, 2006 г., в. Прусіна Крычаўскага раёна Магілёўскай вобл. (фота аўтара)

Д.К. Зяленін, спасылаючыся на матэрыялы Расійскага геаграфічнага таварыства, пісаў пра гэты беларускі звычай: «У белорусов могилу часто покрывают *прикладам*, имеющим форму длинного, похожего на гроб ящика и сделанным из цельного толстого пня или досок; в головах на него ставят маленький деревянный крест. Обычно такое сооружение возводят над могилой в годовщину со дня смерти, и в этот день, покрытое скатертью, оно служит столом при поминках (ОР РГО, I, 312)» [21, с. 351].

На Магілёўскім Падняпроўі намі былі таксама запісаны звесткі, што на Радаўніцу «церамок» накрывалі абрусам і на ім абедалі, памінаючы памерлых родзічаў. Не выпадкова, сярэдняя дошка на даху надмагільных домікаў звычайна пакладзена роўна, без нахілу. Ежай «частавалі» таксама памерлага, аб чым сведчаць прарубленыя ў тарцовых сценках домікаў акенцы. Праз іх на магілу клалі яйкі і іншыя пачастункі.

У 2006 годзе на Радаўніцу разам с сябрамі таварыства «Явар» мы праехалі па шэрагу раёнаў Магілёўскага Падняпроўя і на ўласныя вочы пабычылі і зафіксавалі сучасны стан абраду засцілання абрусамі могілак (мал. 9), іх асвяшчэння святаром і сямейных трапез. Памінальны стол накрываецца непасрэдна на магіле. Невыпадкова плоская форма магілы, яе афармленне са ўсіх бакоў абрубам, нагадвае стол. Магіла – стол звязаны з традыцыяй культавых калектыўных памінанняў продкаў. Цэнтральным месцам рытуалу служыць само месца пахавання – магіла, форма якой семантычна звязаная з язычніцкімі ахвярнікамі і алтарамі. Не выпадкова для надмагільных пабудоў на Палессі існуе назва «стіл» [22].



Мал. 9. Магілы, засланыя абрусамі на Радаўніцу, 2006 г., в. Студзянец Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобл. (фота аўтара)

Звычай засцілання магіл плоскай формы з абрубамі патрабуе картаграфавання, што ў сваю чаргу вымагае пашырэння палявых даследаванняў і прыцягнення матэрыялу, назапашанага іншымі даследчыкамі, у тым ліку археалагічных. Гэта дапаможа акрэсліць арэал існавання магіл з абрубамі і надмагільных зрубных пабудоў – домікаў. Пакуль што можна зрабіць папярэднія вывады.

Гэтая архаічная традыцыя на Віцебска-Магілёўскім Падняпроўі і памежных землях Смаленшчыны захавалася на тэрыторыі засялення віцебска-смаленскіх крывічаў, а таксама ў нашчадкаў радзімічаў у міжрэччы Дняпра і Сажа на Гомельшчыне і Чарнігаўшчыне. Даная гіпотэза стасуецца з летапіснымі звесткамі аб язычніцкім звычаі пахавання «на стоълпе на путьх», які быў уласцівы плямёнам вяцічэй, крывічаў, радзімічаў [3, с. 86], і археалагічнымі матэрыяламі. Звычай будаваць для нябожчыка жыллё з дрэва вядомы па археалагічным матэрыялам канца I тыс. н.э. Над «домікамі памёрлых», «дамавінамі» славяне рабілі насыпы, як гэта бачна, напрыклад, у рэканструкцыі археалагічнага помніка Чорная магіла пад Чарнігавам, зробленай Б.А. Рыбаковым [23, мал. 8], ці ставілі іх на версе магільнага кургана. На тэрыторыі Беларусі надмагільныя пабудовы, якія нагадвалі маленькую хатку з дахам і маленькім акенцам, характэрныя для сярэднявечных пахаванняў на тэрыторыі Мінскай губ. [24, с. 71]. Археолаг У.З. Завітневіч, які даследаваў у канцы XIX стагоддзя курганы ў Аршанскім, Асіповіцкім, Бабруйскім, Клічаўскім, Рэчыцкім, Мазырскім паветах, адзначаў, што драўляныя зрубы ў насыпах курганаў па форме такія ж самыя, як і драўляныя збудаванні, што можна ўбачыць на вясковых могілках [25].

Язычніцкі звычай не здолела вынішчыць хрысціянства, нягледзячы на тое, што праваслаўныя місіянеры спрабавалі забараніць ставіць домікі на магілах і нават разбуралі іх, што вядома па актавых матэрыялах XVIII стагоддзя [26, с. 79].

Артэфакты архаічных надмагільных помнікаў у выглядзе домікаў, якія дайшлі да нашага часу, а таксама рэдуцыраваны варыянт гэтага звычая – абрубы на магілах, з'яўляюцца ўвасабленнем галоўнай ідэі культу продкаў у пазажыццёвае існаванне душы і цела чалавека ў іншасвеце, які з'яўляецца люстэркавым адлюстраваннем гэтага свету, і веру ў заступніцтва адышоўшых у вырай продкаў – дзядоў.

ЛІТАРАТУРА

1. Горюнова, Е.И. Этничная история Волго-Окского Междуречья / Е.И. Горюнова // Материалы и исследования по археологии СССР. – М., 1961. – № 94. – С. 78 – 82.
2. Фрейман, М. Придорожная часовня – пережиток «погребения на столбах на путях» / М. Фрейман // Советсткая этнография. – 1936. – № 3. – С. 86 – 87.
3. Рыбаков, Б.А. Язычества Древней Руси / Б.А. Рыбаков. – М.: Наука, 1987.
4. Раманюк, М. Беларускія народныя надмагіллі / М. Раманюк // Беларусь паміж Усходам і Захадам. – Мінск: Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны, 1997. – Ч. 1: Беларусіка-6.
5. Дучыц, Л. Церамок // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд. дап. – М.: Беларусь, 2006. – С. 540.
6. Цыхун, Г.А. Полесские нарубы (лингвоэтнический аспект) / Г.А. Цыхун // Язык культуры: семантика и грамматика. К 80-летию со дня рождения акад. Н.И. Толстого (1923 – 1996): сб. ст.; Рос. акад. наук. Ин-т славяновед. – М.: Индрик, 2004. – С. 466 – 475.
7. Свительская, В.Л. Опыт картографирования полесского погребального обряда / В.Л. Свительская // Славянский и балканский фольклор. Этнолингвистическое изучение Полесья. – М., 1995. – С. 188 – 208.
8. Рушчык, Г. Палессе ў фотаздымках дваццатых і трыццатых гадоў / Г. Рушчык, А. Энгелькінг. – Варшава, 1999.
9. Фотаэтнаграфічная выстаўка «Палессе, якога не ведаем» (прысв. даследаванню Палесся польскім этнасацыёлагам Юзафам Абрэмбскім). – Брэст–Пінск–Кобрын–Мінск, сакавік – верасень 1997.
10. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Беларусии и описание предметов обиходности (Этнографические данные) / Н.Я. Никифоровский. – Витебск, 1895.
11. Каспяровіч, М. Віцебскі краёвы слоўнік / М. Каспяровіч. – Віцебск, 1927.
12. Динцес, Л.А. Дохристианские храмы Ручи в свете памятников народного искусства / Л.А. Динцес // Советская этнография. – 1947. – № 2. – С. 67 – 94.
13. Раманюк, М. Беларускія народныя крыжы / М. Раманюк // Наша Ніва. – 2000.
14. Материалы для географии и статистики России. Черниговская губерния. – СПб., 1865.
15. Бережнова, М.Л. «Домик» – последний приют (К вопросу о генезисе намогильных сооружений русских) / М.Л. Бережнова, А.В. Минин // Интеграция археологических и этнографических исследований. – Омск: Издат. Дом «Наука», 2005. – С. 195 – 198 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http: //ethnography.omskreg.ru/page.php?id=874. – Дата доступа: 12.11.2008.
16. Бережнова, М.Л. Особенности погребального обряда белорусов Омского Прииртышья (о возможности реконструкции традиций погребального обряда прошлого) / М.Л. Бережнова. – 2006 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ethnography.omskreg.ru/page.php?id=960. – Дата доступа: 12.11.2008.
17. Лабачэўская, В. Повязь часоў – беларускі ручнік / В. Лабачэўская. – Мінск: Беларусь, 2002.
18. Новоселов, Ю. Русский народный орнамент / Ю. Новоселов. – Рига, 1928.
19. Лабачэўская, В.А. Традыцыйны народны тэкстыль / В.А. Лабачэўская // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне.
20. Маслава, Г.С. Орнамент русской народной вышивки / Г.С. Маслава. – М.: Наука, 1978.
21. Зеленин, Д.К. Восточнославянская этнография / Д.К. Зеленин. – М.: Наука, 1991.
22. Конобродська, В.Л. Вербальний компонент традиційного поховального обряду в поліських говорах: автореф. дис. ... канд. філол. наук / В.Л. Конобродська. – Львів, 1999 [Электоронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.lib.ua-ru.net/inode/3188.html/. – Дата доступа 30.11.2008.
23. Рыбаков, Б.А. Древности Чернигова / Б.А. Рыбаков // Материалы и исследования по археологии древнерусских городов // МИА. – М., 1949. – № 11. – Т. 1.
24. Сысоў, У.М. Беларуская пахавальная абраднасць / У.М. Сысоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995.
25. Завитневич, В. Археологические изыскания в бассейне реки Березины / В. Завитневич // Отчет императорской археологической комиссии за 1893 год. – СПб., 1895. – С. 124 – 153.
26. Горюнова, Е.И. Этничная история Волго-Окского Междуречья / Е.И. Горюнова // Материалы и исследования по археологии СССР. – М., 1961. – № 94.

МОДИФИКАЦИИ ФРАНЦУЗСКИХ ЗВУКОВ У РУССКОЯЗЫЧНЫХ БЕЛОРУСОВ ВИТЕБСКОГО РЕГИОНА И РОССИЯН ПСКОВСКОЙ ОБЛАСТИ

канд. филол. наук, доц. И.Г. ЛЕБЕДЕВА
(Полоцкий государственный университет)

Сложившаяся в Беларуси двуязычная среда предполагает контактирование русского и белорусского языков. Длительный языковой контакт массового характера неизбежно сопровождается интерферентными проявлениями в фонетике, лексике и грамматике. Данный факт не всегда осознается русскоязычным коренным населением Беларуси, однако является немаловажным, например, при изучении иностранного языка. Качество иноязычного акцента русскоговорящих белорусов не изучено до настоящего времени. Проводится сопоставительный анализ модификаций иноязычных звуков (французских), возникающих при изучении иностранного языка у русскоязычных белорусов Витебского региона и россиян Псковской области. Сопоставляются категории интерферентных ошибок в вокализме и консонатизме. Учитывается характер, качество и позиция образовавшихся модификаций. Проводится акустический анализ и сопоставляются характеристики интенсивности и длительности, свойственные носителям изучаемого иностранного языка и их интерферентные модификации, возникающие в реализации восточных белорусов и псковичей.

Принято считать, что национальные варианты стандартного произношения полинациональных языков, отличающиеся друг от друга особенностями артикуляции отдельных звуков, представляют собой национальные произносительные нормы [1]. Русский язык, являясь полинациональным, обнаруживает в реализации белорусов стертость и размытость границ кодового переключения, совмещенные свойства, присущие русскому и белорусскому языкам в пределах слога и даже звука [2]. Исследователи отмечают наличие специфических черт как сегментного, так и просодического уровней [3 – 6].

На общенациональные черты накладываются региональные разновидности произношения. При этом максимально зависимыми от диалектальной принадлежности являются характеристики белорусских гласных в безударном слоге. Так, при недиссимилятивном аканье, распространенном на большей части Минской области, качество ударного слога на предударный не влияет [7]. На юге Беларуси отмечаются окающие и укающие говоры, где на месте гласного *[а]* в безударном слоге возможна реализация *[о]* или *[и]*: да*[о]*вай, сна*[и]*пы. На большей территории Витебской области распространено диссимилятивное аканье, при котором качество слогового предударного гласного предопределяется составом ударного слога – в предударном слоге на месте гласного *[а]* реализуется редуцированный звук неполного образования, если ударный слог также содержит гласный *[а]*: трыва (трава), выда (вода). В группе говоров на территории Витебска, Лиозно, Городка, частично Полоцка и Шумилино в безударном слоге отмечается качественная редукция гласных *[і]* и *[ы]* и гласных *[а]* и *[э]*: лі*[l'i̯̊]*са, пы*[ъ]*тацца, вя*[v'i̯̊]*сна, тэ*[ts'i̯̊]*ле*[l'i̯̊]*грама [8]. Как видно из примеров, редукция двух последних гласных наблюдается в безударных слогах с мягкими согласными.

Из сказанного следует, что на территории Беларуси имеет место артикуляторная вариативность сегментного состава слога, которая носит как общенациональный, так и региональный характер.

Сложившаяся на территории Беларуси двуязычная среда обусловливает тот факт, что речь белорусов-билингвов, которые говорят преимущественно по-русски, регулярно окрашивается характерными белорусскими чертами [3, 7]. Данный факт является общеизвестным, однако из него не делается вполне закономерный вывод о том, что речь белоруса на иностранном языке будет характеризоваться значительным присутствием белорусских черт, несмотря на функциональное превалирование русского языка.

При взаимодействии языковых систем интерферирующее воздействие родного языка обнаруживается в каждой из подсистем изучаемого языка – фонетической, грамматической, лексической. Учет интерферентных особенностей необходим при разработке учебников и учебных пособий по формированию и коррекции слухо-произносительных навыков обучаемых на иностранном языке, однако комплексных исследований, позволяющих сравнить качество акцентных явлений при изучении иностранного языка у россиян и у русскоязычных белорусов, до настоящего времени проведено не было.

С целью сопоставления артикуляторных модификаций иноязычных звуков, возникающих в условиях интерферентного влияния родного языка, в Полоцком государственном университете было проведено экспериментальное исследование. Материалом для изучения особенностей модификаций иноязычных звуков испытуемыми послужило подготовленное чтение аутентичных французских текстов с фиксацией полученного результата на магнитный носитель. В качестве испытуемых выступили 10 человек. Из них пятеро являются коренными россиянами, родившимися и постоянно проживающими на территории Псковской области (Россия), и пятеро – выходцами из Витебской области (Беларусь). Обе группы испытуемых состояли из студентов 3-го курса языковых специальностей, продолжающих изучать француз-

ский язык после средней школы и имеющих примерно одинаковый уровень владения иностранным языком. В общей сложности от испытуемых был получен материал объёмом в 7340 слогов. Данный материал был подвергнут аудитивному и акустическому анализам.

В ходе эксперимента было выявлено, что испытуемыми обеих групп было допущено приблизительно одинаковое количество ошибок (15,5 % в группе россиян и 17,7 % в группе белорусов), однако имело место различное распределение артикуляционных модификаций в зависимости от лингвистических регионов, выходцами из которых являлись испытуемые. Так, в произношении россиян отмечалось преобладание в 1,5 раза количества вокалических модификаций (56,3 %, рис 1). В произношении белорусов доминирующими являлись консонантные модификации (70,8 %).




Рис. 1. Соотношение количества вокалических и консонантных модификаций, выявленных в реализации испытуемых, % от общего количества ошибок в каждой группе испытуемых

В артикуляции испытуемых были выявлены ***вокалические модификации***, позволяющие себя классифицировать по пяти признакам: ряда, подъема, огубленности, выпадения и вставки [9].

При общих трудностях в реализации характеристик ряда и подъема французских гласных испытуемыми имеет место различное распределение количества модификаций по данным признакам в зависимости от принадлежности испытуемых к тому или иному лингвистическому региону (табл. 1, рис. 2).

Таблица 1

Вокалические модификации испытуемых,
% от общего количества ошибок в реализации гласных

Модифицируемый признак	Группы испытуемых		Σ
	белорусы	россияне	
Подъём	17,1	20,1	37,2
Ряд	7,3	25,6	32,9
Огубленность	4,9	9,1	14,0
Выпадение	2,4	5,5	7,9
Вставка	2,4	5,5	7,9
Итого:	34,2	65,8	100,0




Рис. 2. Вокалические модификации,
% от общего количества ошибок в каждой из групп испытуемых

Как видно из рисунка 2, в группе белорусских испытуемых модификации признака подъема составляют половину от всех выявленных вокалических модификаций (50,0 %). Являясь наиболее частотным, количество модификаций подъема в 2,3 раза превышает число ошибок по признаку ряда, также остающееся значительным в данной группе испытуемых (21,4 %). В группе российских испытуемых наибольшее количество вокалических модификаций вызывает реализация дифференциального признака ряда, что в 1,3 раза превышает число ошибок по признаку ряда (38,9 % и 30,6 % соответственно). Обращает на себя внимание тот факт, что распределение количества модификаций по признакам огубленности, выпадения и вставки остается практически одинаковым в каждой из групп (см. рис. 2).

Модификации гласных по дифференциальному признаку подъёма обнаруживают пересечение особенностей французской фонологической системы со своеобразием русской и белорусской. Наличие в белорусском и русском языках аллофонических вариантов, разнящихся степенью подъёма, а также изменение степени подъёма в процессе одной реализации, при изучении французского языка затрудняют переход к фонемной дифференциации французских гласных. Наиболее модифицируемыми звуками по исследуемому признаку в группе россиян были гласные [a] и [e] (44,4 % и 33,3 %, табл. 2). Оба эти гласные замещались одним и тем же субститутом [ɛ]. Например: *Les deux fillettes, tranquillisées, s'approchèrent* [sa̲prɔ'ʃɛr]= [sɛ̲prɔ'ʃɛr], *Viens te coucher* [vjɛ̃ tə ku 'ʃe̲] = [vjɛ̃ tə ku 'ʃɛ̲]. В группе белорусских испытуемых почти половина модификаций по признаку подъема (48,4 %) представлена неадекватной реализацией полузакрытого гласного [e], заменяющегося также как и в группе российских испытуемых полуоткрытым [ɛ]: [apor'te], [apor'tɛ̲].

Таблица 2

Качественные модификации признака подъема

Гласный		Группа испытуемых	
эталон	вариант	белорусы	россияне
[a]	[ɛ]	1,9	44,4
	[ы]	3,6	0,0
[e]	[ɛ]	48,4	33,3
	[i]	4,8	0,0
[i]	[ɛ]	12,2	11,1
[o]	[ɔ]	4,2	11,1
	[u]	2,7	0,0
[ɛ]	[i]	22,1	0,0
Итого:		100,0	100,0

Следующая по значимости артикуляторная трудность белорусов по признаку подъема представлена звуком [ɛ], замещаемого гласным [i] (22,1 %): [eła'nɛ:ɜ] = [ił̪a'nɛ:ɜ].

Обращает на себя внимание тот факт, что в речи белорусов практически отсутствовали замены гласного [a] звуком [ɛ], а в группе российских испытуемых не было ошибок по субституции [ɛ] гласным [i] (см. табл. 2).

Анализ позиционной обусловленности вокалических модификаций по признаку подъёма выявил аналогичное распределение ошибок у испытуемых обеих групп. Так, в группе российских испытуемых более половины модификаций по признаку подъёма имели место в ударном слоге, в то время как в группе белорусских испытуемых большинство подобных ошибок происходило в предударном слоге (50,0 и 70,0 % соответственно, рис. 3).

Анализ качественных модификаций дифференциального признака ряда выявил сходные трудности у испытуемых обеих групп. Выявлена проблемность реализации огубленных гласных переднего ряда.

Как видно из таблицы 3, в группе российских испытуемых более двух пятых от всех выявленных случаев составили модификации открытого гласного переднего ряда [œ], что в 1,5 раза превышает количество ошибок с гласным [ø] также являющегося проблемным (42,9 и 28,6 % соответственно). В группе белорусских испытуемых наиболее модифицируемым является закрытый гласный переднего ряда [ø] (41,1 %), а количество модификаций гласных [œ] и [y] оказываются одинаковыми (29,0 и 29,8 %).

Обращает на себя внимание тот факт, что в речи россиян имела место не представленная в произношении белорусов субституция гласного [œ̃] звуком [ɔ̃], например: un gros ours brun [œ̃ gro urs 'brœ̃]=[œ̃ gro urs 'brɔ̃].




Рис. 3. Позиционные модификации по признаку подъема
(% от их общего количества по данному признаку в акцентной единице)

Таблица 3

Качественные модификации дифференциального признака ряда

Эталон	Вариант	Группа испытуемых	
		белорусы	россияне
[œ]	[o]	29,0	42,9
[ø]	[o]	41,1	28,6
[y]	[u]	29,8	14,3
[œ̃]	[ɔ̃]	0,0	14,3
Итого:		100,0	100,0

Анализ позиционной обусловленности вокалических модификаций по признаку ряда выявил различия между испытуемыми обеих групп. Так, в группе российских испытуемых более половины модификаций по признаку ряда имели место в ударном слоге (52,9 %, рис. 4), в то время как в группе белорусских испытуемых большинство подобных ошибок происходило в предударном слоге (85,7 %).




Рис. 4. Подверженность слогов модификациям по признаку ряда
(% от их общего количества в акцентной единице по исследуемому признаку в каждой группе испытуемых)

Модификации артикуляции испытуемых по признаку огубленности маркируют два финальных предударных слога. Распределение модификаций по признаку огубленности объясняется особенностями артикуляционной базы русского и белорусского языков, в которых безударный слог является позицией, где имеет место нейтрализация огубленного гласного [о].

Анализ качества модификаций по признаку огубленности показал, что доминирующим признаком является делабиализация гласных. Однако практически три четвёртых (66,7 %, табл. 4) делабиализируе-

мых в реализации россиян гласных представлено переходом в звук [ɛ]. В речи белорусов практически такое же количество гласных (66,8 %) замещается гласным [а].

Таблица 4

Качество модификаций гласных по признаку огубленности в разных группах испытуемых (% от общего количества модификаций в каждой группе)

Эталон	Вариант	Группа испытуемых	
		белорусы	россияне
[œ]	[ɛ]	25,1	50,0
	[а]	24,7	0,0
[ɔ]	[а]	21,4	33,3
[о]	[а]	20,7	0,0
[ø]	[ɛ]	8,2	16,7
Итого:		100,0	100,0

Анализ модификаций выпадения и вставки выявил их контрастный характер. У испытуемых обеих групп наблюдалось появление вставочных гласных в ударном слоге (78,6 % в группе российских испытуемых и 100 % в группе белорусов). Модификации вставки наблюдались только в ударном слоге (100 %). При общем сходстве тенденций у испытуемых отмечаются различия в качестве выпадающих и вставочных гласных. Так, в группе российских испытуемых отмечено выпадение двух открытых звуков [ɛ] и [а], а в группе белорусских испытуемых выпадал преимущественно гласный [і]. Например: *les animaux* [lɛ zanimo] – [lɛ z_ni'mo], *la belle barbe blanche* [la bɛl barbə'blɑ̃ʃ]–[la b_l barbə'blɑ̃ʃ], *d'où il était venu* [du i le tɛ və'ny]– [du le tɛ və'ny].

Вставка гласных происходила в ударном слоге, однако россияне использовали в качестве вставочного гласный [ɛ], а белорусы – преимущественно [а]: *une veuve vivait* [yn 'vø:v vi 'vɛ]– [yn 'vøvɛ vi 'vɛ], devant l'âtre [dəvɑ latr]– [dəvɑ̃'latar].

Анализ вокалических модификаций позволяет сделать вывод о том, что в исследуемых группах испытуемых имеются как сходные, так и различные черты. Следует отметить формальный характер сходства, поскольку оно проявляется в наиболее общих признаках:

- в наличии одинакового набора модифицируемых вокалических признаков;
- в доминировании процесса делабиализации в модификациях по признаку огубленности;
- в присутствии вставки в ударном слоге и выпадения в предударном.

Различия между группами испытуемых носят преимущественно качественный характер:

1) в группе россиян преобладают вокалические модификации по признаку ряда, а в группе белорусов – подъема;

2) при одинаковой проблемности реализации передних огубленных гласных и их замене гласными заднего ряда в группе российских испытуемых данная тенденция преобладает в ударном слоге, а у белорусов в предударном;

3) при совпадении места модификаций по признаку ряда и проблемности реализации неогубленных гласных переднего ряда у россиян наблюдается субституция гласного [а] звуком [ɛ], а у белорусов – замещение [ɛ] гласным [і];

4) в модификациях по признаку огубленности в процессе делабиализации преобладающим субститутом у россиян выступает гласный [ɛ], а у белорусов – [а];

5) в модификациях выпадения у белорусов может опускаться гласный [і], а у россиян [ɛ] и [а];

6) у россиян преобладают вставки из звука [ɛ], а у белорусов вставочным является звук [а].

Следует отметить, что вокалические модификации русскоязычных белорусов приближаются к общим тенденциям, свойственным белорусскому языку.

Консонантные модификации, выявленные в артикуляции испытуемых, классифицировались по четырем признакам: палатальность, степень участия голоса, выпадение и вставка.

Анализ выявленных у испытуемых консонантных модификаций показал, что наиболее проблемной для испытуемых обеих групп явилась адекватная реализация дифференциальных признаков палатальности и степени участия голоса. Модификации по данным признакам составили практически три четверти от всех выявленных (36,3 и 53,3 %, табл. 5).

Следует отметить, что более половины консонантных модификаций россиян представлены ошибками по признаку палатальности (20,8 % из 38,2 %). У белорусов две трети всех консонантных модификаций вызваны неадекватной реализацией признака степени участия голоса.

Таблица 5

Консонантные модификации испытуемых
(% от общего количества выявленных ошибок в реализации согласных)

Модифицируемый признак	Группы испытуемых		Σ
	белорусы	россияне	
Степень участия голоса	42,9	10,4	53,3
Палатальность	15,4	20,8	36,3
Вставка	1,7	3,5	5,2
Выпадение	1,7	3,5	5,2
Итого:	61.8	38,2	100,0

Консонантные модификации по признаку степени участия голоса вызваны нейтрализацией противопоставления звонкости глухости на конце слова в родных языках испытуемых и в расширении дистрибуции качества глухости. Как показало исследование, в группе белорусских испытуемых изменениям качества оглушаемых звонких согласных подвергаются исключительно переднеязычные. Из них наибольшее количество ошибок вызвано реализацией конечных [3] и [d] (72,9 % и 21,6 % соответственно). Например: *Rose-Rouge* [ʃ],*le ménage* [ʃ],*la fourrure chaude* [t].

В группе российских испытуемых отмечались практически равные по частотности модификации переднеязычного [z], губно-зубного [v] и заднеязычного [g] (30,0, 20,0 и 20,0 % соответственно). Например: *petites peureuses* [s], *une veuve* [f], *une barbe longue [k]*.

Анализ консонантных модификаций по признаку палатальности показал, что в группе белорусских испытуемых основное количество ошибок по исследуемому признаку отмечалось в предударном слоге (68,4 %). В группе российских испытуемых изменения числа модификаций палатальности в зависимости от места слога в акцентной единице не выявлено.

Исследование качества недодифференцируемых согласных показало, что в произношении белорусов три четверти ошибок вызвано реализацией переднеязычных согласных (54,0 % из 68,4 % в предударном слоге и 22,5 % из 31,6 % – в предударном). Среди подвергаемых модификациям переднеязычных согласный [l] приобретал чрезмерную мягкость, согласные [t], [d] заменялись аффрикатами [ts'], [dz'], а щелевые [s], [z] – ш-образными белорусскими [š'], [ž']. Например: *Blanche-Rose* [blɑ̃ʃ 'ro:z]= [bl'ɑ̃ʃ 'ro:z], *au petit bois* [o pətʂ'i 'bwa], *dit* [dz'i] *la maman, de souci* [də su'š'i], *de plaisir* [də plɛ'ž'i:r]. В группе российских испытуемых значительными являются модификации переднеязычного [l] и заднеязычных [k] и [g].

Обращает на себя внимание тот факт, что во всех перечисленных модификациях в качестве артикуляторных вариантов выбирались чрезмерно твердые субституты. Например: *Blanche-Rose [blɑ̃ʃ 'ro:z] = = [bl•ɑ̃ʃ 'ro:z], coquette [kɔ'k•ɛt], les égayaient [le ze g•ɛ'jɛ].*

Анализ модификаций вставки и выпадения выявил сходство между испытуемыми обеих групп. Три четверти случаев вставки и выпадения (72,8 %) имеют место в предударном слоге. В качестве вставочного согласного испытуемыми использовался [v], возникающий при переходе от губно-губных фрикативных сонантов к следующему за ними гласному: *lui dit [lyvi 'di]*.

Анализ выпадения согласных выявил трудности реализации двойных согласных [l] и [t] на стыке слов. В модификациях один согласный опускался: *qu'elles lui avaient apportées, toute timidité*.

Анализ консонантных модификаций позволяет сделать вывод о том, что в исследуемых группах испытуемых отмечается сходство в имеющихся наборах модифицируемых признаков: степени участия голоса, палатальности, выпадения и вставки. У испытуемых отмечаются похожие тенденции к оглушению согласных на конце слова, одинаковые трудности при реализации перехода от губно-губных фрикативных сонантов к следующему за ними гласному, а также сходные проблемы реализации удвоенных согласных. Однако консонантные модификации выявили существенные различия между испытуемыми обеих групп по признаку палатальности. Модифицируя переднеязычные согласные, белорусы реализуют типичные для них аффрикаты [ts'], [dz'] и фрикативные [š'], [ž']. В произношении россиян отмечается реализация непривычно твердых для французского языка звуков [l•] и заднеязычных [k•] и [g•].

Наличие значительного количества качественных и позиционных расхождений в интерферентных модификациях у русскоязычных белорусов и россиян позволяет предположить, что данные процессы обусловлены, прежде всего, имеющими место в языках различиями ритмического характера, поскольку именно ритмика способна модифицировать качество звука [10]. Данное обстоятельство показало необходимость дополнения аудитивного анализа акустическим и потребовало сравнения реализаций французов, белорусов и россиян. Как видно из интонограммы, при реализации испытуемыми одной и той же фразы имеет место существенная разница (рис. 5).




Рис. 5. Акустический анализ параметров интенсивности и длительности разными группами испытуемых

В группе французов параметр интенсивности практически оставался неизменным на протяжении одной акцентной единицы (40 – 45 db), а параметр длительности увеличивался в 1,7 раза на конце элементарной акцентной единицы и в 2,3 раза на конце членимой акцентной единицы (220 и 386 ms, 247 и 552 ms).

В группе белорусских испытуемых параметр интенсивности оставался практически неизменным в элементарных акцентных единицах (50 – 61 db), но несколько увеличивался на первом предударном слоге членимых акцентных единиц (50 – 60 – 51 db). Параметр длительности также существенно не изменялся в элементарной акцентной единице, но возрастал в 2 раза на конце членимой акцентной единицы (280 и 350 ms, 263 и 537 ms).

В группе российских испытуемых параметр интенсивности варьировался от слога к слогу и регулярно увеличивался на первом предударном слоге как элементарных, так и членимых акцентных единиц (74 – 69 db, 52 – 69 – 61 db). Яркие контрасты в распределении длительности отсутствовали: в элементарных акцентных единицах ударный слог незначительно отличался от безударного, а в членимой акцентной единице только в 1,6 раза превосходил по длительности предударный слог (489 и 510 ms, 396 и 637 ms).

Испытуемые	Параметр	Фраза				
		Blanche-	'Rose	et	Rose-	"Rouge
Французы	интенсивность	44 db	45 db	44 db	43 db	40 db
	длительность	220 ms	386 ms	134 ms	247 ms	552 ms
Белорусы	интенсивность	61 db	60 db	50 db	60 db	51 db
	длительность	280 ms	350 ms	115 ms	263 ms	537 ms
Россияне	интенсивность	74 db	69 db	52 db	69 db	61 db
	длительность	489 ms	510 ms	195 ms	396 ms	637 ms

Данные акустического анализа показывают, что в речи французов существует стабильность параметра интенсивности. В течение фразы он варьировался на 5 db, причем контраст между соседними слогами никогда не превышал 2 db. В отличие от характеристики интенсивности параметр длительности обладал изменчивостью и значительно варьировался как на конце элементарных акцентных единицах, так и сложных акцентных единиц и фразы. Таким образом, в речи французов устанавливалась строгая иерархия длительности ударных слогов различной степени выделенности: в элементарной акцентной единице ударный слог был длиннее соседних предударных в 1,3 – 1,5 раза, в сложной – в 2 – 2,5 раза, во фразе – в 3 раза.

В речи белорусов параметр интенсивности варьировался от 40 до 61 db. Внутри фразы интенсивность возрастала в двух случаях. Во-первых, она увеличивалась на отдельных финальных слогах акцентных единиц, если они уступали по длительности предшествующим. Например:

	une	*'veuve*	*vi*	*'vait*	*dans*	*une*	*mai*	*'son*	*co*	*"quette*
Интенсивность (db)	42	40	42	42	44	45	38	**58**	39	48
Длительность (ms)	200	305	180	170	205	183	145	**113**	158	323

Во-вторых, интенсивность увеличивалась одновременно с параметром длительности внутри акцентной единицы, когда говорящий стремился подчеркнуть важные с его точки зрения элементы фразы. Например:

	a	*vec*	**ses*	*deux*	*'fille…*	*en*	**son*	*jar*	*'din*
Интенсивность (db)	40	51	**62**	40	40	49	**66**	46	44
Длительность (ms)	102	158	**300**	220	487	212	**313**	305	318

Обращает на себя внимание тот факт, что оба эти случая идентифицировались аудиторами как наличие выделенности в речи испытуемых.

В речи испытуемых россиян параметр интенсивности имел широкий диапазон вариативности: 52 – 70 db. Аудиторы фиксировали как присутствие выделености в слогах, имеющих большую интенсивность по сравнению с последующими, а также в слогах, значительно отличающихся показателем длительности. Например, в слоге *veuve*, являющимся центром подлежащего, возрастает как интенсивность, так и длительность (70 db и 335 ms), в слоге *quette*, представляющим центр группы обстоятельства *dans une maison coquette* увеличивается только длительность (352 ms), а на выделенном внутри этой же группы слоге *dans* возрастает только интенсивность (70 db):

	une	*'veuve*	*vi*	*'vait*	*dans*	**une*	*mai*	*'son*	*co*	*"quette*
Интенсивность (db)	63	70	53	66	63	70	52	53	58	61
Длительность (ms)	253	335	174	180	180	180	188	310	153	352

Проведенное исследование позволяет сделать следующие выводы:

1. Интерферентные явления сопровождаются проявлением черт родного языка в иностранном, в результате чего у носителей разных языков, изучающих один и тот же иностранный язык, отмечаются модификации различного характера. В случае полинациональности языка индивидуальное двуязычие сопровождается контактированием иностранного языка и национальной произносительной нормы.

2. Реализации артикуляторных программ французского языка у русскоязычных белорусов находятся под влиянием диалектальных черт белорусского языка, что свидетельствует о важности исследования диалектального варьирования в рамках национального варианта языка.

3. Контактирование французского языка с белорусским и русским национальными вариантами русского языка сопровождается различным распределением модификаций сегментного уровня. Наиболее подверженным модификациям у белорусов оказывается консонантный компонент. У россиян – вокалический.

Интерферентные модификации французских гласных у русскоязычных белорусов и россиян характеризуются изменениями дифференциальных признаков ряда, подъема, огубленности и назальности, а также появлением ненормативных вставок и выпадений. При одинаковом наборе модификаций у представителей разных лингвистических регионов имеет место различное распределение ошибок в акцентной единице, а также различная степень их значимости. Наиболее модифицируемым признаком у восточных белорусов выступает подъем, а у россиян – ряд.

Консонантный компонент также обнаруживает схожесть набора модифицируемых признаков: по степени участия голоса, палатальности, вставке и выпадению. В ошибках по реализации согласных отмечается как различная значимость модифицируемых признаков, у представителей различных лингвистических регионов, так и различный характер происходящих в согласных трансформаций по признаку палатальности. У белорусов отмечается выбор исключительно мягких вариантов, у россиян – твёрдых.

4. Различная позиционная локализация и качество артикуляторных трансформаций обусловлены расхождениями в физической природе ударения в национальных вариантах русского языка на территории Белоруссии и России. Белорусское ударение формируется регулярными увеличениями в длительности выделенных слогов, и незначительным изменением интенсивности предударного слога. В речи россиян, напротив, отмечается ощутимые колебания интенсивности и отличное от русскоязычных белорусов распределение длительности в акцентной единице.

ЛИТЕРАТУРА

1. Раевский, М.Р. Опыт определения понятия «произносительная норма» / М.Р. Раевский // Нормы реализации языковых средств. – Горький, 1986. – С. 90 – 95.

2. Типология двуязычия и многоязычия в Беларуси / Нац. акад. наук Беларуси. Ин-т языкозн. им. Я. Коласа, Беларус. респ. фонд фундамент. исслед. / под общ. ред. А.Н. Булыко, Л.П. Крысина. – Минск: Беларус. навука, 1999. – 246 с.
3. Фанетыка слова ў беларускай мове / Л.Ц. Выгонная [і інш.]; пад рэд. А.І. Падлужнага. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 200 с.
4. Метлюк, А.А. Взаимодействие просодических систем в речи билингва / А.А. Метлюк. – Минск: Высш. шк., 1986. – 109 с.
5. Выгонная, Л.Ц. Псіхалагічныя аспекты беларуска-рускага білінгвізму / Л.Ц. Выгонная // Беларус. лінгвістыка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1996. – Вып. 45. – С. 10 – 13.
6. Пиотровский, Р.Г. Синергетика текста: учеб. пособие / Р.Г. Пиотровский. – Минск: МГЛУ, 2005. – 156 с.
7. Крывіцкі, А.А. Фанетыка беларускай мовы / А.А. Крывіцкі, А.І. Падлужны. – Мінск: Выш. шк., 1984. – 250 с.
8. Вайтовіч, Н.Т. Ненацiскны вакалізм народных гаворак Беларусі / Н.Т. Вайтовіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1968. – 168 с.
9. Общая и прикладная фонетика / Л.В. Златоустова [і інш.]. – М.: МГУ, 1997. – 414 с.
10. Dufeu, B. Rythme et expression. Apprentissage de l'intonation: quand le son est aussi porteur de sens / B. Dufeu // Le français dans le monde/ Novembre – Décembre, 1986. – № 205. – P. 62 – 70.

КУЛЬТАВЫЯ КРЫНІЦЫ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ: ВОПЫТ АРЭАЛЬНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

канд. гіст. навук, дац. У.А. ЛОБАЧ
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

На падставе шырокага кола гістарычных, краязнаўчых і палявых этнаграфічных крыніц разглядаецца сімвалічны статус і рытуальныя функцыі «святых крыніц» у сістэме традыцыйнай культуры беларусаў Падзвіння. Асобная ўвага ўдзяляецца праблемам комплекснага, міждысцыплінарнага вывучэння аб'ектаў сакральнай геаграфіі, а таксама іх стану і перспектывам далейшага захавання.

Даследаванне і захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларускага этнаса – надзвычай актуальная праблема айчыннай этналогіі, цесна звязаная з неабходнасцю выяўлення рэгіянальных і лакальных форм бытавання этнакультурнай традыцыі. Аднак калі традыцыйны абрадавы фальклор і народныя рамёствы разглядаюцца як найбольш яскравыя праявы нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў, то традыцыі культавага ўшанавання крыніц ці знахарства ў гэтай якасці практычна не фігуруюць.

У той жа час азначаныя культурныя феномены ў кантэксце іх распаўсюджанасці і захаванасці на Беларусі цалкам падпадаюць пад вызначэнне «нематэрыяльная культурная спадчына», якое было прынята на 32-й Генеральнай сэсіі ЮНЭСКА (Парыж, 2006): «Нематэрыяльная культурная спадчына» азначае звычаі, формы ўяўленння, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, прызнаныя супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, пэўнымі асобамі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны. Такая нематэрыяльная культурная спадчына пастаянна ўзнаўляецца супольнасцямі і групамі ў залежнасці ад акаляючага іх асяродка, іх узаемадзеяння з прыродай і іх гісторыі і фармуе ў іх пачуццё самабытнасці і пераемнасці, спрыяе тым самым павазе культурнай разнастайнасці і творчасці чалавека» [1, с. 2].

Праблемы даследавання культавых крыніц Беларускага Падзвіння. Сістэмнае вывучэнне культа святых крыніц, як важнага кампанента беларускай народнай культуры, што арганічна спалучае традыцыйныя светапоглядныя ўяўленні, міфалогію, рэлігійныя вераванні і рытуальныя практыкі, у айчынным народазнаўстве пачалося толькі ў апошнія дзесяцігоддзі. У сваю чаргу гэта паставіла перад даследчыкамі дадзенай праблематыкі шэраг прынцыповых праблем тэарэтычнага, метадалагічнага і практычнага характару, якія з'яўляюцца актуальнымі і ў рамках рэгіянальнага вывучэння аб'ектаў сакральнай геаграфіі. Сярод прыярытэтных можна вылучыць наступныя праблемы:

- *Даследаванне генезісу і гісторыка-культурных форм бытавання культа крыніц* на Беларусі і на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў прыватнасці. Асноўнай задачай пры вырашэнні дадзенай праблемы з'яўляецца не толькі характарыстыка светапоглядных асноў і тыпалагічных паралеляў азначанага культурнага феномену, але і аналіз характару і форм узаемадзеяння паганскіх і хрысціянскіх элементаў у гістарычнай і сінхроннай праекцыі. Падобны падыход дазволіць пазбегнуць спрошчаных інтэрпрэтацый, калі, з аднаго боку, ушанаванне крыніц разглядаецца як з'ява выключна дахрысціянская, а з другога – як элемент народнай культуры, цалкам асіміляваны царкоўнай традыцыяй.

- *Выяўленне, фіксацыя культавых крыніц і верыфікацыя этнаграфічных (краязнаўчых) звестак у рамках палявых даследаванняў* уяўляюць сабой складаную праблему, абумоўленую наступнымі фактарамі: а) недакладнасцю, фрагментарнасцю апублікаваных крыніц па тэме даследавання, што ў шэрагу выпадкаў не дазваляе дакладна лакалізаваць аб'ект вывучэння ў рэальнай прасторы; б) зменамі і неадпаведнасцю сучаснага прыроднага і культурнага ландшафту прасторавай сітуацыі канца XIX – першай паловы XX стагоддзя, калі шэраг культавых крыніц, зафіксаваных у папярэднюю эпоху, на сучасным этапе ўжо не існуюць фізічна; в) знікненнем «інфармацыйнага поля» культавых крыніц – адсутнасцю аўтэнтычных носьбітаў інфармацыі, здольных пацвердзіць сакральны статус аб'екта; г) стратай шэрагам крыніц рытуальнага статусу ў пасляваенны час (спыненне абрадавых практык, знішчэнне культурных маркераў, геамарфалагічная дэградацыя), што ў сукупнасці са старэннем мясцовага насельніцтва робіць праблематычным суаднясенне вербальнай інфармацыі мемарыяльнага плану з рэальнай крыніцай, асабліва ў цяжкадаступных, лясных урочышчах.

- *Вызначэнне і характарыстыка сімвалічнага статусу і рытуальных функцый культавых крыніц* у міфапаэтычнай карціне свету беларусаў Падзвіння – адна з асноўных задач даследаванняў, прысвечаных сакральнай геаграфіі рэгіёну. Яе вырашэнне вымагае комплексных, полідысцыплінарных даследаванняў (этнаграфія, фальклярыстыка, археалогія, гістарычнае краязнаўства) як палявога, так і тэарэтычнага фармата. Разам з тым у шэрагу выпадкаў, калі традыцыя рытуальнага ўшанавання крыніц спыніла сваё існаванне ў 1920 – 1960-х гадах, а інфармацыя аб іх сакральным статусе з'яўляецца фрагментарнай, альбо не захавалася ў калектыўнай памяці мясцовага насельніцтва ўвогуле, скрайне праблематычнай з'яўляецца даследаванне «міфалагічнай этыялогіі» крыніц, адлюстраванай у легендах і паданнях аб іх паходжанні. Гэтыя ж фактары не дазваляюць у поўнай ступені ахарактарызаваць і абрадавую функцыянальнасць крыніц у кантэксце рытуалаў каляндарнага, сямейнага і аказіянальнага (у тым ліку народна-медыцынскіх) тыпу.

- *Вылучэнне арэалаў рытуальнай функцыянальнасці культавых крыніц* на практыцы азначае лакалізацыю інфармацыйнай прасторы (вёска, група вёсак, мікрарэгіён), сакральным цэнтрам якой і з'яўляецца «святая крыніца». У акцыянальным плане, размова ідзе пра пэўную тэрыторыю, насельніцтва якой не толькі ведае пра існаванне азначанага аб'екта, але і рэгулярна (спарадычна) здзяйсняе з яго дапамогай камунікацыю рытуальнага тыпу. Аб'ектыўнае вызначэнне падобных зон на сучасным этапе ўскладняецца рэзкім скарачэннем колькасці вясковых паселішчаў і, адпаведна, карэннага насельніцтва, у параўнанні з папярэдняй гістарычнай эпохай.

- *Даследаванне прынцыпаў і спецыфікі арганізацыі сакральнай прасторы культавых крыніц у межах канкрэтных рэгіёнаў (мікрарэгіёнаў)* дазваляе выявіць і ахарактарызаваць механізм і светапоглядныя прынцыпы лімітацыі і размежавання «сакральнага» і «прафаннага» ў лакальных народных традыцыях. У практычным плане рэканструкцыя архетэктонікі культавых крыніц павінна быць выкарыстана ў працэсе іх упарадкавання, рэабілітацыі і музеяфікацыі.

- *Картаграфаванне культавых крыніц Беларускага Падзвіння і стварэнне электроннай базы даных* з'яўляецца, па сутнасці, праблемай сістэмнай апрацоўкі і інфармацыйнай адаптацыі ўсёй сукупнасці крыніц і матэрыялаў (палявых, апублікаваных, этнаграфічных, фальклорных, гістарычных, архіўных, аудыё-, фота-, відэафармата і г.д.), вырашэнне якой дазваляе ўзняць аналітычны характар даследавання на якасна новы ўзровень.

- *Упарадкаванне, захаванне, музеяфікацыя культавых крыніц, наданне ім статусу «помнікаў прыроды і культуры»* з'яўляюцца практычным аспектам комплекснага даследавання аб'ектаў сакральнай геаграфіі, што дазволіць захаваць іх як каштоўную частку «нематэрыяльнай культурнай спадчыны» беларускага этнасу.

Праблемы, пазначаныя вышэй, адначасова акрэсліваюць актуальныя і перспектыўныя накірункі даследавання, паслядоўнасць і метадалагічныя прынцыпы іх рэалізацыі. Пры гэтым асабліва пазначым, што абавязковымі, у рамках падобных даследаванняў, з'яўляюцца наступныя ўмовы: «Прынцып міждысцыплінарнасці (г. зн. выкарыстанне не толькі фальклорных, але і этнаграфічных, археалагічных, гістарычных і інш. даных) і рэгіянальны падыход – абмежаванне вывучаемага матэрыялу рамкамі цэласных этнакультурных, гісторыка-этнаграфічных і ландшафтна-геаграфічных утварэнняў» [2, с. 13].

Культавае ўшанаванне крыніц: этнакультурная тыпалогія з'явы. Ушанаванне і культавае выкарыстанне водных аб'ектаў (рэк, азёр, крыніц) – універсальная з'ява ў культуры чалавечай цывілізацыі, якая мае сваім міфалагічным грунтам архетыповае ўспрыняцце вады як зыходнай субстанцыі ўсяго існага (хаоса) і ўласна жыццядайнай сілы, з дапамогай (пасродкам) якой свет і чалавек нараджаюцца, адраджаюцца, перанараджаюцца. Аднак характар, змест і формы ўшанавання водных аб'ектаў маюць выразны адбітак канкрэтнай этнакультурнай традыцыі, у рамках якой яны і існуюць.

Беларуская этнічная тэрыторыя вылучаецца вялікай колькасцю культавых водных аб'ектаў, сярод якіх безумоўна пераважаюць «святыя крыніцы» (ключы, калодзежы) [3]. Ушанаванне крыніц на беларускіх землях мае даўнюю гістарычную традыцыю і сярод іншых праяў язычніцтва ўзгадваецца яшчэ ў XII стагоддзі

тураўскім епіскапам Кірылам. Пры гэтым у павучэннях Кірылы Тураўскага ўзгадваецца дзве асноўныя катэгорыі водных культавых аб'ектаў, якія з'яўляюцца найбольш пашыранымі і ў наш час, – калодзежы і ўласна крыніцы, якім прыносіліся ахвяры: «Ни жрем бездушным идолом..., не служим бо твари паче Творца, не чтем огня, не работаем солнцу, не даём требы горам, ни кладязем с источники» [4, с. 377]. Аднак устойлівасць і шырокая распаўсюджанасць культавага ўшанавання водных аб'ектаў была настолькі моцная, што хрысціянская царква мусіла змяніць сваю тактыку ў дачыненні да гэтай традыцыі і замест асуджэння адаптаваць яе да сістэмы ўласных каштоўнасцяў. На сённяшні момант «святыя крыніцы» вядомыя ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, пры гэтым іх значная частка ўключана ў сістэму народна-рэлігійных практык і знаходзіцца пад патранажам царквы, пераважна праваслаўнай.

Разам з тым гісторыка-этнаграфічныя і палявыя матэрыялы паказваюць, што культавае ўшанаванне крыніц далёка не аднародна прадстаўлена ў рэгіянальных традыцыях беларускай этнічнай культуры. Так, калі на Брэстчыне вядома 7, на Гродзеншчыне – 10, а на Гомельшчыне і Магілёўшчыне – па 15 культавых крыніц [3, с. 102 – 104], то на тэрыторыі Беларускага Падзвіння, паводле этнаграфічных і краязнаўчых матэрыялаў XIX – пачатку XXI стагоддзя, іх налічваецца каля 80 [5, с. 45]. Тлумачыць такую істотную розніцу толькі геамарфалагічнымі адметнасцямі (складаны ўзгоркавы рэльеф, які абумоўлівае выхад грунтовых вод на паверхню) Поўначы Беларусі наўрад ці правамоцна. Бо, як паказваюць экспедыцыйныя даследаванні, колькасць прыродных крыніц Падзвіння, не ўключаных у сістэму сакральнай геаграфіі і народных міфалагічных уяўленняў, у разы пераўзыходзіць колькасць «святых крыніц». Пры гэтым водныя аб'екты першай і другой катэгорыі могуць зусім не карэляваць паміж сабой: наяўнасць некалькіх крыніц вакол паселішча зусім не азначае, што хаця б адна з іх з'яўляецца «святой».

Такім чынам, канстатуючы біялагічную дадзенасць прыроднай крыніцы, мы павінны адзначыць, што яе сакральны статус – прадукт выключна культурнай традыцыі канкрэтнага рэгіёну, які ўключае ў сябе мноства ўзаемазалежных і ўзаемазвязаных элементаў (міфалогія прасторы, народны каляндар, медыцынскія веды і магічныя практыкі, соцыянарматыўныя ўстаноўкі, каштоўнасці і інш.). Іншымі словамі, **культавая крыніца** – *гэта прыродны аб'ект, які ў лакальнай народнай традыцыі мае пастаянны сакральны статус і адыгрывае функцыю рытуальнага цэнтра ў пэўных абрадавых сітуацыях калектыўнага (каляндарныя святы, аказіянальныя рытуалы) і індывідуальнага (народна медыцынскія практыкі) характару.*

Падобнае вызначэнне, блізкае да катэгорыі «вясковыя святыні» (А.А. Панчанка), пад якой разумеюцца «шанаваныя ландшафтныя аб'екты (артэфактычнага і прыроднага паходжання), якія не прадугледжаны кананічным царкоўным абіходам, але ў той жа час адыгрываюць істотную ролю ў традыцыйнай рэлігійнай практыцы вяскоўца» [2, с. 12]. Разам з тым выкарыстанне вызначэнняў «святы» і «культавы» як сінанімічных у дачыненні да прыродных аб'ектаў, што займаюць адметнае месца ў народнай міфалогіі прасторы, не заўсёды апраўдана. Шэраг крыніц, камянёў, і асабліва азёр, маркіруюцца ў фальклорнай традыцыі як сакральна вылучаныя, «святыя» (Богавы, Чортавы, Перуновы) паводле свайго надзвычайнага паходжання, але ў рэлігійна-рытуальныя практыкі вясковай грамады не ўключаны, г. зн. іх сакральны патэнцыял не актуалізуецца ў межах каляндарнага года пасродкам пэўных культавых дзеянняў. Можна дапусьціць, што вялікая колькасць аб'ектаў легендарнай геаграфіі ў рамках архаічнага грамадства, дзе адсутнічае універсальная знакавая сістэма – пісьмовасць, выконвала інфармацыйныя функцыі і з'яўлялася, пасутнасці, прадметным увасабленнем (ілюстрацыяй) важнейшых міфалагічных уяўленняў супольнасці. У сваю чаргу гэта не азначае, што падобныя локусы абавязкова павінны суадносіцца з аб'ектамі дахрысціянскага культу (капішча, свяцілішча), як гэта разумеюць некаторыя сучасныя даследчыкі [6, с. 560; 7, s. 279]. Так, прыкладам інфармацыйнасці элементаў ландшафту могуць быць курганы і гарадзішчы, якія «ў беларускай народнай культуры выконвалі надзвычай важную функцыю ў якасці тапаграфічна апрадмечанай калектыўнай памяці (фальклорнай гісторыі) таго ці іншага рэгіёну», фіксуючы звесткі пра «шведскую», «французскую» вайну ці набегі татараў [8, с. 12].

Лакалізацыя культавых крыніц Беларускага Падзвіння ў межах сучасных тэрытарыяльна-адміністратыўных адзінак была праведзена на падставе ўсёй сукупнасці інфармацыі, змешчанай у этнаграфічных, гістарычных і краязнаўчых публікацыях XIX – XX стагоддзяў, а таксама з улікам палявых матэрыялаў, зафіксаваных этнаграфічнымі экспедыцыямі Полацкага дзяржаўнага універсітэта на працягу 1995 – 2008 гадоў. Пры гэтым матэрыялы па Аршанскім, Докшыцкім, Дубровенскім, частцы Сенненскага і Талачынскага раёнаў не ўлічваліся, у сілу іх суаднесенасці з гісторыка-этнаграфічнымі рэгіёнамі Падняпроўе і Цэнтральная Беларусь.

Статыстычна культавыя крыніцы на тэрыторыі рэгіёну размяркоўваюцца наступным чынам: Бешанковіцкі раён – 4 крыніцы; Браслаўскі – 3; Верхнядзвінскі – 10; Віцебскі – 5; Гарадоцкі – 1; Глыбоцкі – 2; Лёзненскі – 1; Лепельскі – 8; Мёрскі – 3; Пастаўскі – 2; Полацкі – 15; Расонскі – 2; Сенненскі – 6; Талачынскі – 3; Ушацкі – 5; Чашніцкі – 3; Шаркоўшчынскі – 1; Шумілінскі – 5 крыніц.

Прыведзеныя даныя не з'яўляюцца канчатковымі, бо кожная палявая экспедыцыя выяўляе культавыя крыніцы, вядомыя насельніцтву канкрэтнага мікрарэгіёну і не зафіксаваныя ў пісьмовых крыніцах, аднак дазваляюць даволі дакладна прасачыць іх распаўсюджанасць на тэрыторыі Беларускага Падзвіння.

Звяртае на сябе ўвагу, што значная канцэнтрацыя культавых крыніц характэрна для цэнтральнай часткі Беларускага Падзвіння (Полацкі, Лепельскі, Ушацкі, Шумілінскі, Бешанковіцкі, Чашніцкі раёны, усходняя частка Глыбоцкага і заходняя частка Сенненскага раёнаў), а таксама Верхнядзвіншчыны, дзе зафіксавана 58 крыніц з 79 вядомых. З другога боку, ва ўсходніх (Віцебскі, Гарадоцкі, Лёзненскі) і заходніх (Браслаўскі, Мёрскі, Пастаўскі, Шаркоўшчынскі) раёнах Падзвіння культавыя крыніцы нешматлікія (7 ва ўсходняй і 10 – у заходняй зоне) і размешчаны дысперсна (мал. 1).



Мал. 1. Лакалізацыя культавых крыніц на тэрыторыі Беларускага Падзвіння
(па даных XIX – пачатку XX ст.)


Такім чынам, геаграфічная лакалізацыя звестак пра культавыя крыніцы дазваляе вылучыць арэал іх найбольшай канцэнтрацыі, а таксама перыферыйныя зоны, дзе падобныя аб'екты сустракаюцца адзінкава.

Падаецца невыпадковым, што арэал, дзе культавыя крыніцы сустракаюцца найбольш, практычна цалкам супадае з зонай максімальнай канцэнтрацыі курганных пахаванняў полацкіх крывічоў X – XI стагоддзяў. Больш таго, палявыя даследаванні на дадзенай тэрыторыі выявілі цесную прасторавую суаднесенасць шэрага «святых крыніц» і курганных пахаванняў, што дазваляе выказаць думку пра іх рытуальную ўзаемасувязь у гістарычным мінулым. Так напрыклад, культавая крыніца «Святуха» (ля в. Углы Ухвішчанскія Полацкага р-на) знаходзіцца на перыферыі вялікага (каля 200 насыпаў) курганнага могільніка. Каля 300 курганоў зафіксавана непадалёк «Святой крыніцы» ля в. Красналучка Лепельскага раёна. Таксама крывіцкія пахаванні азначанага перыяду сустракаюцца побач з культавымі крыніцамі ля вёсак Лісна, Чарнавокі (Верхнядзвінскага р-на), Бабруйшчына (Глыбоцкага р-на), Мікуліна, Жыхары, Труды (Полацкага р-на), Забор'е (Расонскага р-на), Баравыя (Чашніцкага р-на).

Культавыя крыніцы ў міфанаэтычнай карціне свету беларусаў Падзвіння. Прынцыповым адрозненнем традыцыйнай (архаічнай) свядомасці з'яўлялася ўспрыняцце прасторы як «ажыватворанай і якасна разнароднай», у той час як для сучаснага чалавека яна ёсць нейкай ідэальнай мёртвай абстракцыяй [9, с. 340]. Неаднароднасць прасторы перадусім выяўляецца ў наяўнасці так званых «благіх», «ліхіх» локусаў (балота, лясное пажарышча, закінутыя могілкі), якія ў сімвалічным плане змыкаюцца з хтанічным ярусам светабудовы, і шырэй, з ідэяй дэструкцыі і хаосу ўвогуле, а таксама «святых», «добрых» месцаў (асобныя пагоркі, камяні, крыніцы), своеасаблівых кропак іерафаніі (праяўленне боскага), што ў народных уяўленнях, суадносіцца непасрэдна са сферай сакральнага [10, с. 22]. Аднак, як трапна заўважыў М. Эліадэ, людзі міфалагічнай традыцыі «не вольныя ў выбары сакральнага месца. Ім дадзена толькі шукаць і знаходзіць яго з дапамогай таемных знакаў» [11, с. 26]. Такім знакам з'яўляецца пэўны міфалагічны (легендарны) прэцэдэнт, звязаны з канкрэтным локусам, памяць пра які захоўваецца ў калектыўных уяўленнях як фальклорнае сведчанне і доказ святасці крыніцы, каменя, азяра ці іншага аб'екта.

У нашым выпадку народная традыцыя захавала легендарныя (часам фрагментарныя) звесткі аб надзвычайным, цудоўным паходжанні шэрага крыніц, якія можна ўмоўна падзяліць на тры катэгорыі: 1) паданні аб праяве боскага (святога) персанажа ці аб'екта ля (на месцы) крыніцы; 2) паданні аб дзівоснай метамарфозе (з'яўленні, пераўтварэнні), у выніку якой утвараецца крыніца, альбо ўжо існуючы водны аб'ект набывае звышнатуральныя ўласцівасці; 3) паданні пра надзвычайнае, цудоўнае выздараўленне.

Да першай катэгорыі можна аднесці паданне пра з'яўленне святой крыніцы «Пяцінкі» ля вёскі Гавенькава Верхнядзвінскага раёна: «Бачуць людзі: прышла ікона сьвятая Божай Мацеры і села лі бяроскі. Людзі ўзялі яе акуратна і занясьлі ў царкву ў Росіцы. Глідзяць – ікона апяць прышла і села лі бяроскі. Дагадаліся людзі, што знак гэна Божы. Выкапалі на том месьці калодзіц. А лі яго тапарамі зрубілі цэркву малінькую. Зьдзелалі хрэст. Гаварылі, вада там была сьвітая – памый той вадой, хто балеў, то ці памрэць зразу, калі ні на жысь, ці жыць будзіць доўга»[1]. Тоесным чынам людзям даецца знак і пра сакральнасць крыніцы ля вескі Чарневічы Глыбоцкага раёна (мал. 2): «Раскажу, што знаю. А ці праўда ці не. Што найшлі на гэтым месцы ікону, дзе цяпер стаіць каплічка. Занясуць у цэркву ікону, а яна зноў тут паявіцца. І сколькі раз яны насілі, я не знаю. Тады рашылі паставіць каплічку тут. Ну дык яны і далі ёй тут імя»[2]. Паводле іншай версіі, знак пра цудадзейнасць крыніцы дае сам Іаан Хрысціцель (Ян), імём якога яна і пачынае называцца: «Ну вот, гавораць, што ішоў чалавек у бор і будзець ён сеч бор. Сячэць ёлку, з гэтай ёлкі пашла кроў. Тады аказаўся чалавек. Кажыць: «Я Іян-крысьціцель. Я должан жыць на вадзе тут». Гэта расказывалі даўнія, старыя дзяды-прадзеды. Так, стаіць чалавек, стаіць чалавек: «Тут должан быць Ян-крысьціцель» [12, с. 99].



Мал. 2. Святая «Янава» крыніца ля в. Чарневічы Глыбоцкага р-на

У наратывах другой катэгорыі крыніца таксама ўзнікае воляю вышэйшых (боскіх) сіл, але ўжо па просьбе чалавека ці ў адказ на яго ўчынак. Так, з'яўленне і надзвычайныя ўласцівасці «Дзявочых калодзежаў» ля вёсак Жыхары і Янчыкава Полацкага раёна звязваюцца мясцовым насельніцтвам з вобразам дзяўчыны, якая была ператворана Богам у крыніцу (мал. 3). «Гаварылі старыя людзі, бабушка была мая жыва, гаварыла, што дзевушку хацеў насілаваць малец. А яна бегла, уцікала ад яго і сказала Богу: «Праваліцца мне на гэтым месьці, толькі б каб ня дацца яму». І там сразу стаў калодзезь, дзе яна правалілася. І крыж стаяў, і грошы насілі, клалі. Там і палаценцы вешалі, і крыж быў. Ну, поўнасьцю калодзезь»[3].

З праявай боскай волі звязваецца і паходжанне «Марозава ключа» ў в. Забор'е Расонскага раёна: «Летам робілі жанчына і два мужчыны там, на пожні. І горача было, і сталі маліцца яны Богу. І Гасподзь павялеў на пожні радзіцца ключку, а вада ў ключку стала сьвятая»[4].


[1] Архіў гісторыка-філалагічнага факультэта ПДУ (АГФФ): зап. А.М. Картэнка ў 2004 г. ад А.А. Усялёнка, 1935 г. нар. у в. Росіца Верхнядзвінскага р-на.

[2] Зап. аўтарам у 2008 г. ад Шахоўскай Марыі Іванаўны, 1924 г. нар. у в. Варонкі Мёрскага р-на.

[3] Зап. аўтарам у 2008 г. ад Фунцікавай Галіны Сяргееўны, 1933 г. нар. у в. Баяноўшчына Полацкага р-на.




[4] АГФФ: зап. аўтар у 1998 г. ад Е.Ц. Гаўрыленка, 1923 г. нар., у в. Азёрная Расонскага р-на.

У шэрагу выпадкаў, умяшальніцтва вышэйшых сіл наўпрост не агаворваецца, але надзвычайнасць падзеі, якая ляжыць у аснове сакралізацыі вады, гэта падразумевае. Так, вада ў крыніцы ля в. Піруціна робіцца святой пасля таго, як туды трапляе карэта (золата): «А крыніца! Дык гэта некалі гаварылі, што там даўным-даўно ішла карэта і звалілася. Карэта ці нехта з яе. І як бы золата туда ўпала ў тую крыніцу. І гэта даўно было і мяне яшчэ не было. Яе разумелі як свянцоная вада. Калі Евфрасінню неслі (перанос машчэй Прападобнай Ефрасінні ў 1910 г. – *У. Л.*), то ваду з яе бралі, маліліся там і кідалі капейкі. Людзям бальным саветавалі, што вадзічка з крыніцы халодная. Піць трэба наташчах. Я і сам хадзіў, браў адзін раз»[1].




Мал. 3. «Дзявіччы калодзеж» ля в. Жыхары Полацкага р-на і курганнае пахаванне непадалёк ад яго

У народных апавяданнях трэцяга тыпу знакам святасці крыніцы з'яўляецца цудадзейны, лекавы характар яе вады, нібыта выпадкова выяўлены кімсьці з людзей. У адной з версій пра паходжанне Янавай крыніцы ля вёскі Чарневічы гаворыцца: «Дзедушка расказваў гісторыю, што хто-та нешта шукаў. І быў з ім сляпы чалавек. Яны першыя знайшлі гэту ваду, яна ідзець дзе-та зверху. Яны дакапаліся да гэтай вады, стары абмыўся ей і пачаў відзець. Тады ўжо рашылі, што гэта святая вада. І пачалі ўжо дзелаць усё тут. Яна ідзець чуць не зверху. Яе там і адкрылі. Расказвалі, што было гэта дзе-та 200 – 300 лет назад»[2]. Падобным чынам, толькі ў сне адбываецца «адкрыццё» святой крыніцы ля в. Вуглы Ухвішчанскія Полацкага раёна (мал. 4), калі хворы чалавек спраўджвае свой сон на яве, знаходзіць у лесе крыніцу і атрымлівае пазбаўленне ад хваробы.

Мал. 4. Культавая крыніца «Святуха» ля в. Вуглы Ухвішчанскія Полацкага р-на

Аднак сюжэтныя акалічнасці гэтых паданняў (сляпы старац, знак, атрыманы ў сне) указваюць на веды, недасяжныя чалавеку ў побытавай сітуацыі, але атрыманыя надзвычайным чынам (сон, як знакавая прастора быцця), альбо пры дапамозе адпаведных пасрэднікаў паміж «гэтым» і «тым» светам (старац як «божы чалавек» – вобраз надзвычай распаўсюджаны ў беларускім фальклоры).

У большасці выпадкаў міфалагічны прэцэдэнт, які стаў прычынай сакралізацыі воднага аб'екта, не захаваўся ў калектыўнай памяці мясцовага насельніцтва. Адсюль святасць крыніц і іх надзвычайныя ўласцівасці характарызуюцца старажытамі як спрадвечныя, вядомыя яшчэ «дзядам-прадзедам», ці «даўным-даўно», і, такім чынам, па шкале традыцыйнага часаўспрыняцця суадносяцца з міфалагічным, ідэальным часам.

[1] Зап. аўтарам у 2008 г. ад Маліноўскага Паўла Кузьміча, 1925 г. нар., у в. Піруціна Полацкага р-на.
[2] Зап. аўтарам у 2008 г. ад Хрол Марыі Віктараўны, 1940 г. нар. у в. Чарневічы Глыбоцкага р-на.

Рытуальныя функцыі культавых крыніц у жыщі вясковага насельніцтва Беларускага Падзвіння рэалізуюцца перадусім у сферы народна-медыцынскіх практык, што мае шырокія паралелі з культурнымі традыцыямі індаеўрапейскіх (і не толькі) народаў. Падобная скіраванасць рытуальнай прагматыкі цалкам вытлумачальная з гледзішча архаічнага светаўспрыняцця. «Святая крыніца» як міфалагічны цэнтр тагасвету вылучаны не чалавечаю, але вышэйшаю воляй, характарызуецца зыходнай, прыроднай, першаснай чысцінёй і ідэальнасцю, апрадмечанай крынічнай вадой. Адсюль зварот да «жывой вады» быў неабходны менавіта хвораму чалавеку, прыродны стан якога (здароўе) парушаны.

Як і па ўсёй Беларусі, у даследаваным рэгіёне звышнатуральныя ўласцівасці «святых крыніц» выяўляюцца ў іх надзвычайных лекавых здольнасцях, якія мясцовым насельніцтвам характарызуюцца, як правіла, абагульнена і формульна: «ад усякіх хвароб», «ад усяго памагае», «для здароўя» і да т.п. Разам з тым вада большасці культавых крыніц разглядаецца як эфектыўны сродак пры хваробе вачэй ці немачы, атрыманай праз візуальны кантакт (сурокі, зглаз). Падобныя ўяўленні не выпадковыя і ўзыходзяць да архаічных пластоў індаеўрапейскай культуры. Так, назва крыніцы, якая фігуруе ў хецкім абрадзе ачышчэння, šakuni – узыходзіць да хецк. šakuwa «вочы» (дзеяслоў šakuwai – «бачыць», готск. saihan, ням. sehen, англ. to see), што ў сваю чаргу адносіцца да індаеўрап. *ok^{W}-«вока». Адсюль ст. польскае okno- «ключ, крыніца», серба-харв. oko «вока», глыбокае месца на дне, дзе маецца крыніца..., а таксама літ. akis «акно ў балоце», vandeñs akis «крыніца = «вока вады», латыш. velna acis (літаральна «чортава вакно») [13, с. 37]. Падобныя аналогіі знаходзім і ў беларускай мове. Так, у паўночна-заходніх гаворках адно са значэнняў слова «акно» – «прорва, крыніца, жарало»: «Акно бывая ў паплавах, у крыніцы, глыбокае места, у акно ўвалісся – не вылезіш» [14, с. 72].

На Вілейшчыне яшчэ ў 1930-х гадах захоўвалася архаічнае, агульнаіндаеўрапейскае ўяўленне, што і азёры і крыніцы – гэта «вочы маці-зямлі» [15, s. 198]. Такім чынам, сімволіка выкарыстання вады з культавай крыніцы, якая ўвасабляла святое «вока з таго свету», пры лекаванні хвароб вачэй з'яўляецца даволі празрыстай.

У народнай традыцыі «лекавая спецыялізацыя» культавых крыніц знаходзіць сваё адлюстраванне ў тэматычных апавяданнях пра канкрэтныя выпадкі пазбаўлення ад той ці іншай хваробы. У адрозненне ад этыялагічных паданняў, якія тлумачаць з'яўленне крыніцы ці прычыну набыцця ёю святасці, апавяданні гэтага тыпу апелююць да рэальнай гісторыі канкрэтных людзей (называюцца імёны ці падрабязныя характарыстыкі дзеючых асобаў), якія дзівосным чынам атрымалі здароўе з дапамогай «святой вады».


Так, святая крыніца ля вёскі Матырына Ушацкага раёна дапамагала хворым на вочы, што і знайшло сваё адлюстраванне ў народнай прозе. «Ну і вот, эта яшчэ мой папа расказываў. Тут, у Матырыне, быў чалавек, хлопец. І то лі прыўраждзёны, ну ня відзеў, малады чалавек, і ня відзеў, сьляпы. А тады яму прысьніўся сон, што дапаўзі да крыніцы, да Ліньня, і дастань вады, і напійся, і памыйся – і будзеш відзець. Ну, і што вы думаеце, дык поўз чалавек гэты на каленьках, эта даўно дужа было, але гэта было дзесьвіцельна верна, чалавек гэты поўз на каленьках, дапоўз да гэтай. Ішоў чалавек упярод ужо, а ён поўз за ім. Дапоўз да тый крыніцы, дастаў, папіў вады, памыўся і чалавеку адкрыліся вочы» [12, с. 219]. Гісторыі пра вяртанне зроку цалкам невідушчаму чалавеку ў народнай традыцыі фігуруюць як «цуд», здзейснены «святой вадой», які адначасова даказвае яе высокі сакральны статус і цудадзейныя здольнасці: «Ад вачэй добра памагала (крыніца ля в. Красналучка Лепельскага р-на – *У. Л.*, мал. 5). Многія дажа, адна сляпая была і то хадзіла, яна ўжо ўмерла. Ну ей пасаветавалі, так яна (схадзіўшы) і памёрла, ачкі не адзіваўшы»[1]].

Доказам лекавых уласцівасцяў крынічнай вады можа выступаць спасылка на вопыт блізкага чалавека, сваяка. Так, здольнасць «Дзявіччага калодзежа» (ля в. Жыхары Полацкага р-на) лекаваць вочы верыфікуецца наступным чынам: «Як бабушка, пакойніца, бывала просіць, як хто ідзець у лес: «Прынясіце мне. Як памыюся, – гаворыць, – зразу мне відней станець глядзець, зразу глазы мае лучшэ відзяць»[2]. Альбо, наадварот, прыезд «далёкіх людзей» да «святой крыніцы» з мэтай пазбавіцца ад канкрэтнай хваробы – таксама, ва ўяўленях мясцовых жыхароў, з'яўляецца надзейным паказчыкам яе звышнатуральнай сілы: «У Бароўкі (Лепельскага р-на) крынічка ёсьць Сьвятая. Туды людзі за вадой ад вачэй прыязджалі. На Дзяды бралі. Нават з Полацку людзі прыязджалі» [10, с. 23].


Уяўленне пра ваду як ачышчальную стыхію і яе фізічныя здольнасці змываць і чысціць ляжаць у аснове народных перакананняў пра высокую эфектыўнасць крынічнай вады лекаваць («змываць») «сурокі» і «упуды», асабліва з маленькіх дзяцей. Менавіта гэтыя ўласцівасці падкрэсліваюцца мясцовымі жыхарамі ў аповядах пра Стайкаўскую крыніцу (Ушацкі р-н): «Кажуць, очэнь памагаець. Вот с глаза калі што-небудзь, скаціне, кароўку змываюць і дзецям. Узяў, пабрызгаў, яе ж у рот не нада браць. Калі ў рот узяў гэтай вады, то святое ж ужо з'еў»[3]. Сярод шырокага спектра лекавых уласцівасцяў, здольнасць дапамагаць ад сурокаў і ўпуду фігуруе ў народных характарыстыках Святой крыніцы на Верхнім замку ў Полацку (мал. 6): «Ад усяго памагала. Калі ў мяне сэрца забаліць, пап'ю гэтай вадзічкі, мне кажацца лучша. Калі печань баліць, пайду, вот, я часта хажу ў горад, набяру бутылачку вады. Ну, пап'ю, а Бог яго знаіць. Да, вот ад дурнога вока, ад дурнога глаза, да. Дажа многія прыходзяць іздалека. Як вот, Грамы, напры-

[1] Зап. аўтарам у 2008 г. ад Няміры Альберта Іосіфавіча, 1923 г. нар., у в. Красналучка Лепельскага р-на.
[2] Зап. аўтарам у 2008 г. ад Фунціkавай Галіны Сяргееўны, 1933 г. нар. у в. Баяноўшчына Полацкага р-на.
[3] Зап. Т. Валодзіна, У. Лобач у 2008 г. ад Лабэцкай Розы Мікалаеўны, 1937 г. нар., у в. Старынка Ушацкага р-на.

мер, у нас тут, эты раён там, з (вуліцы) Марыненкі прыходзяць. Спугаецца вот рабёнчак, ці спугаешся сам другі раз, бальшы. Пап'еш этай вадзічкі, кажацца лучша» [12, с. 198].



Мал. 5. «Святая крыніца» з ахвярным крыжам ля в. Красналучка Лепельскага р-на



Мал. 6. Святая крыніца на Замкавай гары ў Полацку

Падобная інфармацыя зафіксавана і адносна крыніцы «Пяцінка» ля в. Слабада Віцебскага р-на (мал. 7): «І мамка мая хадзіла туды, к Пяцінке. Ну нашы хадзілі сюды, у Слабаду. Хадзілі ў цэркву, маліліся Богу, пакланяліся іконе Пяціннай. Там і крынічка – ключ такі. Вадзічку бралі тыя людзі. Бывала і карову збрызгівалі, калі што-небудзь не пагадзілась і дзіцё малое, калі што-небудзь балела, гэтай вадзічкай»[1].

Адначасова, паралельна са здольнасцямі крынічнай вады дапамагаць пры хваробе вачэй, могуць вылучацца і дадатковыя лекавыя ўласцівасці, якія і складаюць спецыфіку той ці іншай культавай крыніцы. Так, жанчыны, якія мелі праблемы з нараджэннем дзяцей, абракаліся і ахвяраваліся ля Сарочынскай святой крыніцы (Ушацкі р-н), дзеля чаго праходзілі на каленках ад царквы да капліцы, пабудаванай над крынічнай вадой, і ахвяравалі ў ёй грошы, ручнікі ці фартухі. Падобнымі ўласцівасцямі, паводле народных перакананняў, валодае і Чарневіцкая (Янава) крыніца: «У нас, у Чарневічах жыла Бабіч Іра, яна доўгі час не магла радзіць. Бярэменеець – першы раз выкідыш, другі раз… Разоў дзесяць так было. Купалася яна ў гэтай вадзе, а зараз у яе дзевачка, якой 2 годзікі. Вось яшчэ прыязджалі з Барысава ка мне родственнікі далёкія. І я ім пасаветавала, што ў нас было такое чуда, няхай з'ездзе да святой крынічкі. Так вот яе матка званіла, казала, што дачка бярэменная»[2]. У шэрагу выпадкаў вада культавых крыніц, як ля вёскі Кавалеўшчына Полацкага раёна, дапамагае ад болю ў суставах: «Я знаю, што пасля вайны прыехала жанчына

[1] Зап. Т. Валодзіна, У. Лобач у 2007 г. ад Палячэнка Марыі Іванаўны, 1928 г. нар., у в. Брыгітполле Віцебскага р-на.

[2] Зап. аўтарам у 2008 г. ад Хрол Марыі Віктараўны, 1940 г. нар. у в. Чарневічы Глыбоцкага р-на.

з Польшчы і ў яе ногі адказвалі. Жыла яна ў Гаравых і гэтай вадой лячылася. І піла яе, і есці сабе варыла на гэтай вадзе, і сваімі нагамі і пайшла» [10, с. 23]. Такія ж здольнасці маюць і Янавы крыніцы ля вёсак Бабруйшчына і Чарневічы Глыбоцкага раёна (мал. 8). Аднак у апошнім выпадку, практыкавалася абмываннe хворага месца крынічнай вадой: «Калі рукі баляць, ногі. Ліцо абмывалі і вочы таксама. Мой зять казаў, што акунуліся тут і год пазваночніка не чулі. І Люсі Жэня казаў, што яму так сціснула спіна і ён узяў пакупаўся. Дык ён казаў, што ўсё сышло, як рукамі зняла. Расказвалі, што прывазілі маленькага з Полацка, яму так нага балела, раны адкрываліся, абмывалі нагу. І пчалам бяруць ваду, каб добра вяліся»[1].



Мал. 7. Культавая крыніца «Пяцінка» ля в. Слабада Віцебскага р-на
(Фота А. Пашкевіча)



Мал. 8. Паломніцтва да «Янавай крыніцы» ля в. Бабруйшчына Глыбоцкага р-на (2002 г.)


Вада некаторых крыніц («Грамячы калодзеж» ля вёскі Жарцы Полацкага раёна, «Святая крыніца» ля вёскі Красналучкі Лепельскага р-на), па словах інфармантаў, мае здольнасць спыняць крывацёк і гоіць адкрытыя раны ці дапамагаць ад хваробаў страўніка (крыніцы ля в. Кавалеўшчына Полацага і Матырына Ушацкага р-наў).

Характар рытуальных дзеянняў ля культавых крыніц мае ў аснове прынцып *дарааўмену*, калі атрыманне «долі» (здароўя) у выглядзе «святой вады» прадугледжвала ахвяру (дар) з боку чалавека. Найчасцей у якасці прынашэнняў святым крыніцам фігуруюць грошы (манеты), ручнікі, палатно і воўна. Адначасова, асабліва ў выпадку цяжкіх хвароб, практыкавалася і абраканне – выкананне асабістага зароку чалавека, які мог рэалізоўвацца ў разнастайных формах: паломніцтва-выпрабавання (нашча, пешкі ці нават

[1] Зап. аўтарам у 2008 г. ад Муравей Антаніны Васільеўны, 1933 г. нар. у в. Рослева Глыбоцкага р-на.

на каленках, у строга вызначаны час), усталявання крыжа, упарадкавання крыніцы ці ўзвядзення ля яе капліцы. Падобныя патрабаванні паломніцтва як абсалютная ўмова магчымага выздараўлення: «Было што-та, пастройка какая-та іс крышай (капліца – *У. Л.*). Уход, выхад там. Так вот, мама гаварыла, ужо і крывыя, і сьляпыя, і такія ўвечлівыя такія, ўсякія цягнуліся! Здалёк! Здалёк! Пешкам, пешкам! Тады ж пешкам нада, есьлі ж ужэ ў цэркву і да споведзі, ужо на якое прычашчэння. Эта ўжо абавязкова нада пешкам! І наташчак жа ж, нееўшы нада! Ужо вечарам вады папіўшы, а ўтрам ужо і вады няльзя папіць» [12, с. 253]. «Ад нас жа «Ян» (культавая крыніца – *У.Л.*) недалёка! Вы б паглядзелі, як там вадзіца бяжыць. Там людзі бяруць там, мыюцца… Там вада пастаянна бяжыць, яна бяжыць і бяжыць. Капліца зроблена, а Ян такі, во фігура, як чалавек, ну вот як я ростам. Але яго забіраюць у Чарневічы ў цэркву за тое, што яго тут украдуць. А тут у бары красіва: такая пагурак, лагчынка і капліцу новую. У нас брыгадзір ня меў здароўя, і ён рашыў пастроіць новую» [12, с. 97].

Рытуальнае ўшанаванне крыніцы магло мець калектыўны характар і строгае суаднясенне з канкрэтным святам народнага календара. Пісьмовыя крыніцы і матэрыялы палявых даследаванняў даюць інфармацыю аб каляндарнай прымеркаванасці культа крыніц у значнай колькасці канкрэтных выпадкаў. Так, калектыўнае паломніцтва да шанаванай крыніцы адбывалася на **Вадохрышча** (в. Лісна Верхнядзвінскага, в. Цінаўка Полацкага, в. Забор'е Расонскага, в. Вішкавічы Чашніцкага р-наў, г. Полацк і Сянно), **Барыса і Глеба** (в. Наўліца Полацкага, в. Высокі Гарадзец Талачынскага р-наў), **Юр'я веснавога** (Віцебск), **Міколу веснавога** (в. Курына Віцебскага р-на), **Вялікдзень** (В. Ніжнія Калтуны Полацкага, в. Вішкавічы Чашніцкага р-наў), **Ушэсце** (в. Сарочына Ушацкага р-на), **Тройцу** (в. Каханавічы Верхнядзвінскага, в. Дабрыгоры Бешанковіцкага, в. Мосар Ушацкага р-наў), **Яна** (вв. Бабруйшчына,Чарневічы Глыбоцкага, в. Гентава Мёрскага, в. Лоўжа Шумілінскага р-наў), Пятніца напярэдадні **Пятра і Паўла** (м. Асвея, Маркаў манастыр у Віцебску, м. Лукомль Чашніцкага р-на), **Іллю** (в. Будзішча Сенненскага, Стайкі Ушацкага р-наў), **Макавей** (в. Богіна Браслаўскага, в. Чарнавокі Верхнядзвінскага, в. Углы Ухвішчанскія Полацкага р-наў).



а) б)

Мал. 9. «Святыя калодзежы» ля в. Лоўжа Шумілінскага р-на:
а – для людзей; б – для хатняй жывёлы

У большасці гэтых выпадкаў ля крыніц адбывалася царкоўная служба, вада асвячалася і такім чынам яе сакральны статус аднаўляўся і замацоўваўся ў межах бягучага года. Паказальна, што паломнікі, нават не маючы хваробаў, імкнуліся набіраць ваду «на цэлы год» менавіта ў святочны дзень, калі яна асвячалася. Пасля чаго вада «святой крыніцы» захоўвалася ў хаце ў якасці своеасаблівага абярэга на выпадак розных хваробаў і немачаў, што маглі адбыцца з людзьмі ці скацінай.

Часам, наведванне крыніцы адбываецца некалькі разоў на год, у межах буйных рэлігійных святаў. Так, да крыніцы на Замкавай гары ў Полацку хадзілі як мінімум тройчы: «Ну, гэта самае, на такія вот – Пасха, Раждзяство, Пакроў, эта самае там, якія бывают празьнікі такія, мы бярём этую ваду, кідаем дзеньгі, там, як бы плацім. Ну і эта, яна круглы год цякёць» [12, с. 197]. Падобным чынам калектыўнае паломніцтва адбывалася і да святой крыніцы ля вёскі Красналучка Лепельскага раёна. Пры гэтым інфармант падкрэслівае неабходнасць сітуатыўнага, будзённага шанавання крыніцы пры наведванні лесу, дзе яна размяшчаецца. «Да, і на Тройцу (хадзілі), і на Пятра, і на ўсе, якія празьнікі ёсь. Знаеш, дзетка, я табе быль раскажу. Пашлі мы з сястрой у алешнічак, кругом рос, пашлі мы ў баляс, недалёка ад каплічкі. Сястра кажаць: "Давай сходзім у каплічку". А я кажу: "Некалі, некалі". І я як дзюбнула сабе ў нагу, і ўсё. Тады яна кажаць: "Ну што, час нашоўся?!" А тут залілося кроўю ўсё. Хустку з сябе, завязала і пашлі мы ў эту крынічку. Рукі памылі, і ўсё, і кроў стала. Вот так»[1].

[1] Зап. Т. Валодзіна ў 2008 г. ад Каралёвай Марыі Сцяпанаўны, 1926 г. нар. у в. Малыя Таронкавічы Лепельскага р-на.

Такім чынам, персанальнае наведванне крыніцы, як правіла, з'яўлялася аказіянальным, г. зн. выкліканым як надзвычайным здарэннем (раптоўная хвароба чалавека, яго блізкіх ці хатняй жывёлы), так і сітуацыяй будзённага характару (наведванне пры зборы ягад, грыбоў, рэгулярныя візіты пры хранічнай хваробе і інш.).

Прасторавыя рамкі рытуальнай функцыянальнасці культавых крыніц Беларускага Падзвіння дазваляюць вылучыць тры катэгорыі азначаных аб'ектаў:

а) *субрэгіянальныя*, інфармацыя пра якія бытуе на даволі значнай тэрыторыі, што ўключае ў сябе не толькі навакольныя вёскі, але бліжэйшыя мястэчкі і нават гарады. Крыніцы такога тыпу вылучаюцца ўпарадкаванасцю і арганізаванасцю сакральнай прасторы, паломніцтвы да іх носяць масавы характар (ад некалькіх дзясяткаў да некалькіх сотняў чалавек), строга прымеркаваныя да пэўнага рэлігійнага свята і суправаджаюцца царкоўнымі службамі. Да субрэгіянальных адносяцца культавыя крыніцы ля вёсак Бабруйшчына, Чарневічы Глыбоцкага раёна, ля вёскі Стайкі Ушацкага раёна, і, з пэўнымі агаворкамі, у г. Сянно;

б) *вузкалакальныя* культавыя крыніцы з'яўляюцца найбольш распаўсюджанымі як у мінулым, так і ў сучаснасці. Геаграфія іх рытуальнай функцыянальнасці звычайна ахоплівае невялікую вясковую прастору, што ўключае ў сябе бліжэйшае і 2 – 5 суседніх паселішчаў. Архітэктоніка такіх крыніц носіць больш сціплы характар (зруб, маленькая капліца, крыж), колькасць паломнікаў адносна невялікая, царкоўныя службы на сённяшні момант, як правіла, не праводзяцца. Падобная сітуацыя назіраецца і на тэрыторыі Пскоўшчыны, дзе «самае масавае распаўсюджанне маюць крыніцы пры вёсках, да якіх адбываецца паломніцтва жыхароў невялікага кола вакольнага «куста» вёсак» [16]. Скарачэнне колькасці вясковага насельніцтва, яго старэнне і адсутнасць пераемнасці ў традыцыі ўшанавання крыніц у шэрагу выпадкаў звужае іх інфармацыйнае поле і пераводзіць у наступную катэгорыю;

в) *мікрарэгіянальныя* крыніцы, інфармацыя пра якія бытуе ў межах аднаго населенага пункта і не вядомая жыхарам нават суседніх вёсак. Культурна-рэлігійная атрыбутацыя падобных крыніц (вёскі Мётлы, Мікуліна, Піруціна, Труды Полацкага раёна) можа адсутнічаць цалкам, а іх наведванне мае пераважна індывідуальны характар і аказіянальныя прычыны, не суаднесеныя з сістэмай каляндарных святаў.

Тапаграфія, атрыбутыка культавых крыніц і лакальныя асаблівасці іх ушанавання. Характэрнай рысай Падзвінскага рэгіёну з'яўляецца лакалізацыя асноўнай колькасці культавых крыніц па-за межамі паселішчаў і, у большасці выпадкаў, у лясных масівах і ўрочышчах. Падобная асаблівасць арганізацыі сакральнай прасторы падаецца далёка не выпадковай. Здавалася б, «святая крыніца» як сакральна вылучаная кропка прасторы, надзеленая звышнатуральнымі патэнцыямі, павінна быць цэнтрам, вакол якога і мусіць арганізоўвацца «свет людзей» – вёска. Аднак у міфапаэтычнай свядомасці ўзаемадзеянне паміж «сваім» (чалавечым, засвоеным, культурным) і «тым» (прыродным, дзікім, боскім ці інфернальным) светам ніколі не прадугледжвае поўную інкарпарацыю і культурную асіміляцыю апошняга першым. Справа ў тым, што «іншасвет у любых яго іпастасях выступае ў традыцыйных уяўленнях як адзіна магчымая крыніца звышнатуральных (не чалавечых) патэнцый і рэсурсаў» [17, s. 144], якія з'яўляюцца неабходнымі для калектыва і чалавека ў крытычных, рытуальна напружаных сітуацыях. У гэтым плане асобнае месца ў беларускай этнічнай традыцыі займае лес, які суадносіцца з боскім сегментам светабудовы: *«Лес насеіў Бог, ніхто яго ні росьціў, не годуваў...»* [18, с. 20]; *«Лес – Божы гай!»* [19, с. 198]. Невыпадкова, што і лясныя крыніцы мелі ва ўяўленнях беларусаў надзвычайны статус: «...народ верыць у цудадзейную сілу некаторых лясных крыніц... кідаюць на дно крыніцы некалькі срэбраных ці залатых манет. У некаторых мясцовасцях гэтыя крыніцы маюць святочны дзень» [20, с. 13].

Калі лакалізацыя культавых крыніц па-за межамі паселішчаў і ў лясных урочышчах з'яўляецца, хутчэй, агульнай рысай ушанавання крыніц не толькі на тэрыторыі Падзвіння, але і на Беларусі ў цэлым, то лакальныя адметнасці ў межах рэгіёну выяўляюцца на ўзроўні народнай «этыялогіі сакральнасці», характару рытуальных дзеянняў і спецыфікі арганізацыі сакральнай прасторы.

Так, для левабярэжжа Дзвіны і паўночна-заходняй часткі правабярэжжа характэрнымі рысамі культу крыніц з'яўляюцца:

а) перавага біблейскіх (хрысціянскіх) персанажаў і царкоўных атрыбутаў у паданнях пра знаходжанне святых крыніц;

б) калектыўны характар ушанавання крыніц і яго ўключанасць і цесная прывязка да сістэмы каляндарных святаў;

в) спалучэнне народных форм ушанавання і царкоўных богаслужэнняў;

г) распаўсюджанасць малых архітэктурных форм (мураваных і драўляных капліц) у арганізацыі сакральнай прасторы;

д) устойлівасць і большая соцыякультурная значнасць культа крыніц як у мінулым, так і ў сучаснасці (культавыя крыніцы субрэгіянальнага тыпу сустракаюцца выключна ў азначаным арэале).

У сваю чаргу ушанаванне культавых крыніц у правабярэжнай зоне Полацкага (Цэнтральнага) Падзвіння характарызуецца наступнымі асаблівасцямі:

а) сакральнасць крыніц у народных уяўленнях вынікае з іх пачатковага, прыроднага статусу і не «верыфікуецца» адпаведнымі паданнямі, дзе фігуруюць персанажы біблейскай гісторыі ці царкоўныя атры-

буты. Так, святасць «Божага ключа» (у лесе ля в. Труды) вызначаецца мясцовымі старажыламі не з дапамогай этыялагічных паданняў і культурных маркераў, але шляхам суаднясення прасторавых параметраў крыніцы з архаічнай мадэллю свету, дзе базавай з'яўляецца гарызантальная вось Усход – Захад: «А там ключ, ключ ад Госпада Бога, з-пад сонца ідзе, яна лячэбная вада, бяруць як лякарства тую ваду, п'юць. Ад упуду памагаіць, і ад всякай хваробы памагаіць, людзі бяруць і пьюць. – *Можа свяціл калі ваду?* – Яна, тая вада, ад Бога свянчоная» [12, с. 167];

б) ушанаванне крыніц носіла (носіць) пераважна індывідуальны і аказіянальны характар, не суаднасілася з канкрэтнымі часавымі кропкамі на шкале каляндарных святаў і не суправаджалася царкоўнымі службамі, што, аднак, не ўплывала на іх сакральны статус. Паказальнай у гэтым плане з'яўляецца народная характарыстыка святой крыніцы ля вёскі Сянькоўка Віцебскага раёна: «Вот там рэчка Струечка цячэ, вот там бяры піць вадзічку. У нас была ручавінка такая, дык во так во Струйка ад туда ільецца Струйка, вот там эта называеца крыніца, святая вадзіцца, самая лучшая, харошая вадзічка. Там ручаек, а вадзічка пойдзеш і тэй вадзічкай і сабралі тую ваду, яна как святая вада была там. Во так і струечкай льецца ад туда, струечка з зямлі, чыстая крынічная вада. Эта вада цэнная святая вада, там не ўсегда бывае во там вун. *– Яна святая сама сабою?* – Не нада яе свяціць, яна сама сабою святая вада. О-о-ой, яна крынічная вадзічка, ого! – *Ну, а што ей лечылі тады этай крынічкай?* – Любое, вот так балееш, ад упуда вып'еш этай вадзічкі – палегчаець. Ну эта вада очень хорошая і ценная. – *Можа бацюшка хадзіў яе свяціць, ці проста яна сама сабой святая?* – Сама сабой, ад ныне да веку»[1];

в) культурныя маркеры культавых крыніц з'яўляюцца мінімальнымі альбо адсутнічаюць цалкам і не з'яўляюцца вызначальнымі ва ўспрыняцці іх святасці. Так, культавая крыніца ў лясным урочышчы «Чортавы навіны» ля вёскі Залессе Полацкага раёна лічыцца святой, не маючы ніякіх культурных маркераў: «Там у лесе цякла крынічка, звалі – «Святая крынічка». Мы малыя туды хадзілі ў ягады. Там стаяў пянёк, а было там бальшое балота з клюквай, на гэты пянёк усегда стаяла кружачка, пілі з гэтай крынічкі вадзічку. А ў крынічку гэту кідалі капейкі. Гэтая вада лічылася святой, яе свянціць у цэркві не нада было»[2];

г) пераважаюць культавыя крыніцы вузкалакальнага, мікрарэгіянальнага тыпаў, што з улікам вышэйпазначаных фактараў і скарачэння носьбітаў традыцыі робіць праблематычным выяўленне (даследаванне) такіх аб'ектаў, а таксама вядзе да згасання культавага ўшанавання крыніц увогуле.


Падобныя адметнасці левабярэжнай зоны тлумачацца, на нашую думку, цэлым шэрагам прычын. У прыватнасці, большай колькасцю і шчыльнасцю вясковага насельніцтва як арганічнага асяродка захавання традыцыі ўшанавання крыніц, большая колькасць царкоўных прыходаў, што ў дарэвалюцыйны час і сучасную эпоху стымулюе легітымнае развіццё традыцыі, а таксама сітуацыяй міжканфесійнай канкурэнцыі і ўзаемаўплываў, калі культавая крыніца выступае не толькі сакральным цэнтрам, але і моцным фактарам кансалідацыі праваслаўнай грамады. Так, адна з найбольш вядомых культавых крыніц Падзвіння – Чарневіцкая (Святога Яна) ў народных наратывах вельмі часта фігуруе як прадмет своеасаблівага гонару мясцовых праваслаўных вернікаў і аб'ект змагання за «сваю веру» ў часы II Рэчы Паспалітай (1921 – 1939). З другога боку, узровень рэлігійнай свядомасці і царкоўнай дысцыпліны вернікаў у зонах канфесійнага памежжа вышэйшы, чым у монаканфесійных (праваслаўных) раёнах, што выяўляецца ў рэгулярным упарадкаванні культавых крыніц і іх наведванні. Пэўнае значэнне ў заходніх раёнах Віцебшчыны адыграў і значна меншы ў параўнанні з Усходняй Беларуссю перыяд савецкай рэчаіснасці, з уласцівым яму «ваяўнічым атэізмам», што суправаджаўся фізічным разбурэннем вясковых святынь.

Сучасны стан і праблемы захавання культавых крыніц Беларускага Падзвіння. Параўнаўчы аналіз крыніц XIX – XX стагоддзяў і матэрыялаў сучасных палявых даследаванняў паказвае, што ўшанаванне культавых крыніц у Падзвінскім рэгіёне з'яўляецца ўстойлівым феноменам народнай культуры, які працягвае сваё бытаванне і на пачатку XXI стагоддзя. Аднак радыкальныя пераўтварэнні і змены, якія закранулі вёску ў XX стагоддзі, прывялі да істотнага змяншэння колькасці крыніц, што захавалі сваю рытуальную функцыянальнасць на сучасным этапе (гл. мал. 1). Разам з тым нават у тых выпадках, калі абрадавае наведванне крыніц спынілася ў 1950 – 1970 гады, іх сакральны статус яшчэ знаходзіць сваё адлюстраванне ў калектыўнай памяці жыхароў той ці іншай мясцовасці. У сваю чаргу гэта спараджае праблему суаднясення вуснай інфармацыі з аб'ектам рэальнай прасторы, вырашэнне якой ускладняецца тым, што крыніцы з мінімальнымі культурнымі маркерамі альбо тыя, што іх не маюць увогуле, выявіць без дакладнага ўказання мясцовых інфармантаў надзвычай складана. Адсюль перад палявымі даследчыкамі паўстае нетыповая задача першаснага ўпарадкавання культавых крыніц. Іх расчыстка дазваляе не толькі фізічна захаваць (аднавіць) помнік прыроды і культуры, але мае і навукова-даследчы эфект. Прыкладам можа быць выяўленне і ўпарадкаванне Барыса-Глебскай крыніцы ля вёскі Наўліца Полацкага раёна, праведзеныя экспедыцыйнымі групамі Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Пачатковыя звесткі аб рытуальным статусе крыніцы былі зафіксаваныя ад адзінага (!) старажыла, які пражываў у вёсцы, на сучас-

[1] Зап. Т. Валодзіна, У. Лобач у 2007 г. ад Дубавец Ганны Парфенаўны, 1919 г. нар. у г.п. Сураж Віцебскага р-на.

[2] АГФФ: зап. аўтар у 2002 г. ад М.М. Качанок, 1933 г. нф. у в. Мікуліна Полацкага р-на.


ным этапе суцэльна заселенай прыезджымі людзьмі і дачнікамі. Старэчы ўзрост інфарманта не дазволіў яму ўказаць дакладнае месцазнаходжанне крыніцы ў лясным масіве, што зрабіла яе выяўленне надзвычай цяжкім. Падчас першаснага агляду крыніцы не было зафіксавана ніякіх культурных маркераў (рэшткі зруба, капліцы, крыжа), якія б указвалі на яе сакральны статус, а сама яна выглядала, як дэградаваны (заглеены) прыродны аб'ект. Упарадкаванне крыніцы дазволіла не толькі фізічна аднавіць яе, але і выявіць рэшткі каменных падмуркаў капліцы, а таксама ўдакладніць храналогію яе культавага функцыянавання. Апошняе стала магчымым, дзякуючы знаходцы фрагментаў керамікі і манет XVII – пачатку XX стагоддзяў (мал. 10).



Мал. 10. Артэфакты XVII – пачатку XX стагоддзя, выяўленыя пры ўпарадкаванні Барыса-Глебскай крыніцы

Гэтыя акалічнасці ўказваюць на тое, што ў дадзенай вясковай акрузе менавіта святая крыніца і капліца, збудаваная на ёй, з'яўляліся пачатковым рэлігійна-рытуальным цэнтрам мясцовага насельніцтва, бо храм святых Барыса і Глеба ў вёсцы Наўліца быў узведзены не раней за сярэдзіну XIX стагоддзя.

Падобныя мерапрыемствы былі праведзены і ля Сарочынскай культавай крыніцы (Ушацкі р-н), што ў бліжэйшай перспектыве дазволіць не толькі канчаткова ўпарадкаваць яе, але і вярнуць рытуальную функцыянальнасць пасродкам рэсакралізацыі (асвячэння), у якой зацікаўлена мясцовае насельніцтва (мал. 11).



а) б)

Мал. 11. Стан Сарочынскай крыніцы ў 2003 годзе (а) і яе ўпарадкаванне (б), 2008 год

Аднак далейшае комплексная і сістэмная праца па захаванні культавых крыніц Беларускага Падзвіння магчымая толькі пры ўмове надання ім статусу нематэрыяльнай культурнай спадчыны і пры цесным узаемадзеянні навукоўцаў, мясцовых і рэспубліканскіх уладаў, а таксама насельніцтва канкрэтнага рэгіёну.

Такім чынам, комплексныя, міждысцыплінарныя даследаванні культавых крыніц Беларускага Падзвіння ў спалучэнні з навукова абгрунтаванымі рэкрэатыўнымі мерапрыемствамі па іх захаванні павінны стаць адным з прыярытэтаў у галіне айчыннага народазнаўства.

Даследаванне выканана ў межах галіновай праграмы «Культура».

ЛІТАРАТУРА

1. Международная конвенция об охране нематериального культурного наследия (UNESCO). – Париж, 2006. – 16 с.
2. Панченко, А.А. Исследования в области народного православия. Деревенские святыни Северо-Западной России / А.А. Панченко. – СПб.: Алитейя, 1998. – 298 с.
3. Зайкоўскі, Э.М. Жыватворныя крыніцы Беларусі / Э.М. Зайкоўскі, Л.У. Дучыц. – Мінск: Ураджай, 2001. – 111 с.
4. Мельнікаў, А.А. Кірыл, епіскап Тураўскі: Жыццё. Спадчына. Светапогляд / А.А. Мельнікаў. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – 462 с.
5. Лобач, У.А. Аб'екты сакральнай тапаграфіі Беларускага Падзвіння ў сістэме народнай медыцыны / У.А. Лобач // Полацкі этнаграф. зб. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. / склад. А.У. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – Ч. 1. – С. 45 – 50.
6. Зайкоўскі, Э.М. Свяцілішчы / Э.М. Зайкоўскі, Л.У. Дучыц, Э.А. Ляўкоў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993. – 702 с.
7. Vaitkevičius, Vykintas Alkai: baltų šventviečių studija / Vykintas Vaitkevičius. – Vilnius: Diemedis, 2003. – 320 p.
8. Лобач, У.А. Курганы і гарадзішчы ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў / У.А. Лобач // Весн. Полац. дзярж. ун-та. Сер. А. Гуманітар. навукі. – 2007. – № 7. – С. 2 – 11.
9. Топоров, В.Н. Пространство / В.Н. Топоров // Мифы народов мира: энцикл.: в 2-х т. / гл. ред. С.А. Токарев. – М.: Сов. энцикл., 1991. – Т. 2: К – Я. – С. 340 – 342.
10. Волкаў, А.А. Аб'екты сакральнай геаграфіі ў народнай медыцыне Лепельшчыны / А.А. Волкаў, У.А. Лобач // Лепельскія чытанні: матэрыялы навук.-практ. канф., Лепель, 24 кастр. 2004 г. – 2004. – С. 22 – 26.
11. Элиаде, М. Священное и мирское / М. Элиаде; пер. с фр.; предисл. и коммент. Н.К. Гарбовского. – М.: Изд-во МГУ, 1994. – 144 с.
12. Полацкі этнаграф. зб. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. / склад. А.У. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – Ч. 2. – 332 с.
13. Иванов, В.В. Категория «видимого» – «невидимого» в текстах архаических культур / В.В. Иванов // Сб. ст. по вторичным моделирующим системам / отв. ред. Ю. Лотман. – Тарту: Тарт. гос. ун-т, 1973. – С. 34 – 38.
14. Мацкевіч, Ю.Ф. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча: у 5-ці т. / уклад. Ю.Ф. Мацкевіч [і інш.]; рэд. Ю.Ф. Мацкевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – Т. 1: А – Г. – 512 с.
15. Sielicki, Fr. Wierzenia na dawnej Wilejçzczyznie / Fr. Sielicki // Slavia orientalis. – 1986. – T. XXXV. – № 2. – S. 195 – 222.
16. Платонов, Е.В. Культ родников и почитаемые источники на Северо-Западе России / Е.В. Платонов // Деревенские святыни северо-запада России [Электронный ресурс]. – 2008. – Режим доступа: //http: //www.countrysite.spb.ru / Library/ Kult_vodi.htm. – Дата доступа: 08.04.2008.
17. Валодина, Т. Пространственные характеристики ритуальных практик в народной медицине белорусов / Т. Валодина, В. Лобач // Acta Neophilologica. – 2007. – T. IX. Olsztyn, Wyd-wo Uniwersytetu Warminsko-Mazurskiego. – S. 143 – 153.
18. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб.: Типогр. имп. Акад. наук, 1902. – Т. 3. – 596 с.
19. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі; прадм. У.К. Касько. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
20. Сно, Е.Э. В болотах Полесья. Белорусы / Е.Э. Сно. – СПб.: Изд-во О.Н. Поповой, 1904. – 24 с.

МИРОВОЗЗРЕНЧЕСКИЕ ОСНОВЫ ПРИМЕТ И ГАДАНИЙ БЕЛОРУСОВ ПОДВИНЬЯ

П.И. МИШИН
(Полоцкий государственный университет)

Рассматриваются общие принципы функционирования таких феноменов традиционной культуры белорусов, как гадание и примета. Автор стремится показать зависимость этих форм прорицания от базовых представлений, лежащих в основе мировоззрения. Дана характеристика данных базовых представлений, а именно специфики восприятия времени (как фактора, определяющего существование гадания) и особенностей восприятия человека как части традиционного Космоса (как фактора, определяющего существование примет). В качестве примеров использованы как уже опубликованные этнографические материалы (из сборников Н.Я. Никифоровского, В.В. Василевича), так и полевые этнографические записи автора, относящиеся к территории Белорусского Подвинья.

Приметы и гадания занимают существенное место в традиционной картине мира белорусов. Эти феномены народной культуры являются широко распространённым и столь же широко известным явлением. И приметы, и гадания встречаются в самых ранних текстах, содержащих записи фольклора, и продолжают фиксироваться вплоть до настоящего времени.

Определимся для начала с предметом нашего исследования. Как гадание, так и примета являются прорицанием (предсказанием будущего) по различным знакам. Отличия между ними заключаются лишь в искусственном или же естественном способе формирования ситуации, в рамках которой и происходит чтение знаков.

Рассматривая эти древние феномены – гадание и примечание – в современном их бытовании, приходится констатировать их упадок и деградацию. Приметы стали считаться или суевериями, или шутками. Гадания вытеснены в сферу жизни маргинальных групп, массы рассматривают их лишь как способ развлечения. Среди причин деградации гаданий и примет важное место занимает, безусловно, смена среды жизни основной массы населения. Большинство примет было ориентировано на чтение знаков, возникающих именно в сельской среде. К ней же были приспособлены и гадания. В городе многие способы прорицания просто не могут быть исполнены. Здесь, к примеру, практически невозможно осуществить гадание на замужество посредством перебрасывания ботинка через дом, узнать будущее с помощью пробегающего мимо зайца (встреча с ним – неблагоприятна [1, с. 120]) или волка (встреча с волком считалась в традиционной среде одной из благоприятнейших [1, с. 20]). Однако это, само по себе, ещё не является признаком упадка. Настоящим признаком деградации примет и гаданий является то, что практически перестали появляться новые способы прорицания.

На первое место среди причин упадка традиционных способов проникновения в будущее, по нашему мнению, следует поставить те изменения, которые произошли в процессе эволюции от традиционного мировоззрения к современному.

В основу всех видов мировоззрения положены некоторые общие, базовые представления. Опираясь на те основные категории[1], которые лежат в основе современного мировоззрения, мы не способны предложить адекватное описание механизма действия традиционных форм прорицания. Из этого следует, что, во-первых, именно изменения в основах мировоззрения сделали невозможным сообразное существование примет и гаданий в нашем сегодняшнем обществе. Во-вторых, это предписывает нам обратиться к основным категориям традиционного мировоззрения. Только взглянув через их призму на собранный материал этого типа, мы сможем добиться правильного и адекватного его понимания. Рассматривая же феномены, порожденные совершенно иным мировоззрением, именно с нашей – современной – точки зрения, мы рискуем совершить ошибку. Европоцентрическая и механистическая модель мироздания с неизбежностью низведут все не принадлежащие им феномены до уровня архаизмов и заблуждений.

Следует отметить, что в последнее время была проделана немалая работа по реконструкции архаического мировоззрения. Большое внимание уделялось и базовым представлениям как таковым. Мы, опираясь на проведенные исследования, будем рассматривать те из них, от которых напрямую зависит действие традиционных форм прорицания. Прежде всего, следует отметить, что эта магия (и гадание, и примечание представляют собой специфические формы предсказательной магии) предназначена для определения типа или характера ещё не наступившего события, события, которое произойдёт в будущем. Это органично подводит нас к такому основополагающему понятию мировоззрения как время.

[1] Термин А.Я. Гуревича.

В современном восприятии время может определяться как форма существования материи, заключающаяся в закономерной координации сменяющих друг друга явлений. Мы, измеряя протекание времени с помощью хронометров и координируя с их показаниями все наши действия, привыкли воспринимать время как достаточно абстрактное понятие. Между тем человек не способен воспринимать время напрямую. Оно воспринимается им опосредовано, как последовательность или череда событий, следующих одно за другим и проистекающих одно из другого. Речь идёт, таким образом, о причинно-следственных цепочках, которые как бы протекают на фоне времени. Но такой подход – продукт современного мировоззрения. Рассматривая время в рамках традиционной культуры, прежде всего следует обратить внимание на слияние событийного и временного планов. В архаическом мировоззрении время не является абстрактным понятием. Оно привязано к событиям, не существует вне событий и маркируется именно ими.

Попробуем теперь объединить это представление с ещё одним, хорошо изученным представлением, характерным для традиционной культуры. Время в ней циклично, в отличие от нашего – векторного. Соединение этих представлений даёт весьма любопытный эффект. Причинно-следственные цепочки, которые и есть время, замыкаются в циклы. Специфичность архаического представления о времени усугубляется тем, что оно ещё и прерывисто. Важнейшие годовые праздники (приуроченные к переходным положениям Солнца) разрывают время. Всякий событийный цикл – поскольку времени вне события не существует – начинается заново, с пустой пространственно-временной цепочки. Поэтому столь важным являются первые действия в начале нового цикла – в Новом году («Всякое новогоднее излишество и недостаток, мирное состояние и ссоры и проч. служат показателем того, что предстоит человеку во весь год, и с чем застал человека Новый год, – с тем он останется до конца его» [1, с. 231]); в только что заключённом браке (тот из молодых, кто первым уснёт в брачную ночь, умрёт первым [1, с. 66]); в начале жизни человека (дитя, закричавшее во время крещения, будет сердитым человеком [1, с. 20]). Именно эти действия становятся первым звеном новой причинно-следственной цепочки.

Праздник – именно в силу разорванности причинно-следственных цепочек – самое подходящее время для начала чего-то нового. Это время вызова, время испытания своей удачи. Это время гадания. Ритуал прорицания будущего (точнее, его итог) и станет тем первым звеном в причинно-следственной цепочке, которая приведёт к закономерному результату. Однако будущее – это слишком серьёзно, чтобы полагаться на случайности. Если первое звено вновь начинающейся причинно-следственной цепочки породит все последующие и приведёт к определённому результату, разумнее будет не полагаться на волю случая. Недоверие к гаданию приводит к возникновению и широкому распространению практик его имитации – псевдо-гаданий. Причина их происхождения заключается во вполне понятном стремлении – взять судьбу под свой контроль, в свои руки, исключить всякую случайность, а значит положить в начало череды событий именно то звено, которое гарантированно приведёт к желаемому результату:

«– Так а (на Кутью – П.М.) сено зачем на стол ложили?

– Ну, гэта варожуць. Гэта паложана было, бажэственна як-то. Вот на стол ложуць, а тады зверху закрываюць настольнікам, а тады як ужо куццю эту паядуць, цягнуць, варожуць, які лён будзець, у каго лушчы лён. Хто большую эту травіну выцініць – значыць, лён будзіць такі во бальшы».[1]

В данном случае этот ритуал рассматривается именно как «варажба» – гадание, хотя его результат будет закономерно позитивен.

Итак, временные циклы в праздники разорваны. Причинно-следственные цепочки прошлых циклов уже завершены, а вновь начинающиеся в этом цикле ещё не сформированы, пусты. В свете этого становится понятным и стремление провести эти дни в ничегонеделании, в праздности. Ведь любое действие может стать началом череды событий, которая принесёт беду и страдания. Судя по многочисленным празднествам, налагающим запреты на специфические виды деятельности, в определённых точках годового цикла брали своё начало причинно-следственные цепочки, касавшиеся тех или иных аспектов бытия. Например, в день Громниц «не пачынаюць ніякае работы; акрамя таго, заўважаючы дзень, на які прыпала гэтае свята, цэлы год не снуюць асноў, каб не сустрэцца з ваўкамі» [2, с. 390]; «В промежуток между Юрьем и Николиным днем… нельзя ставить, на даже исправлять изгородей, иначе в округе разведутся волки. По той же причине в это время нельзя делать основы, ни даже перевозить готовой из деревни в деревню. При крайней необходимости переместить основу, последняя замыкается висячим замком, чтобы замкнуть волчьи пасти» [1, с. 247]. Или современная запись:

«– А гаворуць на Каляды нельзя там шыць, вязаць? А чаго гэта так?

– Ну, як гаворуць скаціна ў каго, дык вот калі там што лапіць, дык авечкі будуць тады... няроўная шэрсць, будзіць лапікамі, дый можыць і крываногі радзіцца ягнёнак, ці цялёнак, вот такія шчэ прысказкі былі»[2].

Особо следует отметить, что гадания, равно как и предписания бездействия, и ритуальные действия (псевдо-гадания и им подобные) относятся не только к годовым праздникам. Они могут касаться и

[1] Записали П.И. Мишин, В.И. Мишина в 2008 г. от Буды Франца Вацлавовича, 1934 г. р., д. Никитёнки, Шарковщинский р-н.

[2] Записали П.И. Мишин, В.И. Мишина в 2007 г. от Чеклин Елены Павловны, 1930 г. р., д. Макаровщина, Лепельский р-н.

событий, маркирующих разрывы в жизненном цикле отдельного человека или социума: «За неделю до свадьбы невеста наполняет две миски: одну – хлебными зернами, а другую – водой, и подносит к ним свою любимую курицу. Когда курица станет прежде клевать зерна, то будущий муж будет трудолюбивым хозяином, пить воду – пьяницей и, следовательно, бедным человеком» [1, с. 56].

Представление о важности первого действия в подобных ситуациях сохранилось до наших дней: на личных и официальных празднествах мы нередко стремимся своими действиями заложить основу будущего счастья – загадать желание перед тем, как задуть свечи, разбить бутылку о борт корабля и т.п.

Обратимся теперь ко второй форме прорицания, распространённой в традиционной белорусской культуре. Это примета, так же как и гадание, необычайно широко распространённая ранее и, так же как и гадание, находится сейчас в упадке. Примету можно истолковать как знак, получаемый сам собою (без осуществления направленных на его получение действий) и свидетельствующий о начинающейся или уже идущей причинно-следственной цепочке. В этом его отличие от гадания, которое представляет собой создание новой причинно-следственной цепочки посредством закладывания первого её звена (в праздники, когда причинно-следственные цепочки уже разорваны, гадать могут все; вне праздников гадают чаще всего специалисты – ворожеи и чародеи). Соответственно, специфическое восприятие времени не является настолько важным для существования приметы (в отличие от гадания). Необходимым для нормального действия примет компонентом мировоззрения является антропоцентрический холизм. Этот терминологический конструкт означает восприятие Космоса как некой целостности и человека, как центральной (для него самого) части этой целостности.

В современном понимании антропоцентризм воспринимается как нечто предосудительное, приводящее к противопоставлению человека окружающему миру и возвышению за счёт этого мира. Именно антропоцентризм может считаться причиной экологического кризиса, истощения полезных ископаемых и т.п. Однако стремление отказаться от присутствия человека в картине мира, добиться подлинно аналитического подхода в изучении мира привело к обратному и тоже негативному результату. Акт научного познания строится на принципах объективности. Человек вообще исключается из схемы восприятия окружающего мира, предстаёт неким абстрактным познавательным субъектом[1]. Более того, сам процесс научного познания организуется таким образом, чтобы исключить всякое влияние наблюдателя на изучаемое явление. Таким образом, получается, что всё происходящее в мире происходит само собой, вне зависимости от участия человека. Химическая реакция протекает определённым образом в любой лаборатории мира. Её результат не зависит от того, кто её проводит. Физические законы неизменны в любой точке пространства. Анатомия человека всегда одна и та же, вне зависимости от того, кто изучает тело и кому оно принадлежало. Из акта восприятия, действия, познания, полностью исключён фактор наблюдателя. Между тем именно на нём основывается как феномен приметы, так и многие виды магии (например, алхимия, где результатом одних и тех же действий будет в одном случае философский камень, а в другом – ничего; в зависимости от личности алхимика).

Если мы пытаемся рассмотреть примету с точки зрения современного мировоззрения, то в результате последовательного размышления придём к однозначному выводу. Часть примет является первой попыткой обобщения накопленного в течение поколений знания, а часть – простыми суевериями. Причина такого, ещё раз отметим, закономерного и логичного вывода – в опровержении порождаемой современным мировоззрением гипотезы. Если примечаемый факт есть след начинающейся или протекающей цепочки событий, ведущей к тому или иному результату, то этот факт (или факты) должны наблюдаться **всегда**, когда имеет место упомянутая причинно-следственная цепочка (рис. 1). Следовательно, **всегда** при наблюдении, к примеру, перебегающей дорогу лисы или белки [1, с. 120], должно происходить нечто неудачное. Поскольку попытки подтвердить это экспериментально (см. например: Приметы – это миф // Советская Белоруссия – Беларусь сегодня. – 23 июля 2008 г.) успеха не принесли, учёные, принадлежащие к современному дискурсу, с чистой совестью объявили большую часть примет суевериями.




Рис. 1. Восприятие примет с позиций современного мировоззрения

[1] Картина начала меняться только во второй половине XX века, но изменения пока затронули лишь философские системы.

Между тем бытие начинающейся или уже протекающей цепочки событий, ведущей к тому или иному (хорошему или плохому) результату, своеобразно. Она не существует, пока её следы не заметит наблюдатель, или её не существует для наблюдателя, что одно и то же. Наблюдение знака, свидетельствующего о идущей или начинающейся цепочке событий, невозможно без человека. Именно наблюдатель, сведущий в системе знаков, осуществляет акт примечания. Это и включает его в череду событий, которые могут касаться как его самого, так и кого-нибудь другого:

«– А вось прыкметы якія былі на вяселлі? Можа можна было як вызначыць, як маладыя жыць будуць? Конь там спатыкнецца?

– Ай, гэта бываіць усяк, ну толькі што вот казалі, і я адну пару прыменіла. Вот у касцеле як вінчаюцца, як там на алтарах свечкі гараць. Калі свечкі гараць роўна, значыць жызня будзіць іхная добрая. Свечка некаторая ў старане пагаснець – гэта плоха. І я гэдак во была... как раз вінчаліся... На ягонай старане дужа спрытна гарэлі, а на ейнай так марна. Падпалілі – адна загасла, другая загасла, а такі ўсё закрыстыян паліў, і пад канец узялі загаслі свечкі. А на ягонай дужа красіва гарэлі. Марная была жызня ў яе»[1].

При этом весьма высока роль субъективного фактора. Невозможно приметить то, что не предназначено человеку. Невозможно не приметить того, что не предназначено ему (рис. 2).




Рис. 2. Восприятие приметы с позиций традиционного мировоззрения

Подведём итог. Время, рассматриваемое не как абстрактное понятие, а как череда событий, циклическое и прерывистое, определяет своей спецификой существование гаданий. Начинающийся новый цикл пуст, цепочки причин и следствий были завершены в предыдущем цикле, а новые ещё не сформировались. Отсюда – огромная важность первого события, которое станет началом череды событий этого цикла. Именно такое восприятие времени и делает возможным существование гадания. Его результат и станет первым событием новой причинно-следственной цепочки, которая пройдёт через весь цикл и приведёт к закономерному результату. Понимание огромной, исключительной важности первого звена череды событий порождает практики запрета на лишние действия – или вообще на все действия, кроме ритуальных (нацеленных на хорошее будущее). С другой стороны, нежелание отдавать жизненно-важное действие на откуп случайности, стремление гарантировать своё «хорошее» будущее, порождают практики псевдо-гаданий. Но в основе гадания лежит именно специфическое, не похожее на современное, восприятие времени как череды событий, текущих в рамках прерывающихся циклов.

Что касается приметы, то этот феномен базируется на целостном восприятии Космоса и человека, как неотъемлемой части его. Именно присутствие наблюдателя позволяет произвести акт примечания, получив тем самым информацию о начавшейся или длящейся череде событий, ведущей к некоторому результату. Это знание и становится в дальнейшем причиной и поводом действий или же бездействия.

ЛИТЕРАТУРА

1. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах (Собраны в Витебской губернии) / Н.Я. Никифоровский. – Витебск, 1897. – 336 с.
2. Жыцця адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У.В. Васілевіча. – Мінск: Мастацк. літ., 1998. – Кн. 2. – 607.

[1] Записали П.И. Мишин, В.И. Мишина в 2008 от Василевской (Касевич) Виктории Иосифовны, 1921 г.р., д. Терешки, Шарковщинский р-н.

СТРУКТУРА І СІМВОЛІКА ТРАДЫЦЫЙНАГА ВЯСЕЛЬНАГА АБРАДУ БЕЛАРУСАЎ ЦЭНТРАЛЬНАГА І ЗАХОДНЯГА ПАДЗВІННЯ Ў 1930 – 1950-я ГАДЫ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ЭТНАГРАФІЧНЫХ ЭКСПЕДЫЦЫЙ ПДУ)

В.І. МІШЫНА
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

На аснове комплексу матэрыялаў этнаграфічных экспедыцый Полацкага дзяржаўнага універсітэта ажыццёўлена спроба аналізу структуры і сімволікі традыцыйнага вясельнага абраду беларусаў цэнтральных і заходніх раёнаў Падзвіння ў 1930 – 1950-я гады. У якасці аб'екта аналізу выкарыстаны таксама этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя студэнтамі спецыяльнасці «Гісторыя» ў межах вывучэння спецкурсу «Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў: гісторыка-культуралагічны аспект». На падставе праведзенага аналізу аўтар выдзяляе асноўныя этапы традыцыйнай вясельнай абраднасці, разглядае асноўныя сімвалічныя аспекты, імкнецца вызначыць ступень захаванасці ці трансфармацыі асобных абрадавых элементаў. Акрамя гэтага, у артыкуле разглядаюцца асобныя соцыякультурныя аспекты, у прыватнасці, спосабы падбору шлюбнай пары, змены ў асэнсаванні прыкмет і павер'яў, месца і роля рэлігійнага фактара пры заключэнні шлюбу і інш.

Як вынікае з прааналізаваных аўтарам этнаграфічных матэрыялаў, традыцыйны вясельны абрад пазначанага перыяду ў заходнім і цэнтральным Падзвінні ў цэлым захаваў трохчастковую структуру, якая, згодна прынятаму ў беларускай этналагічнай навуцы падзелу, уключае абрады давясельныя (або падрыхтоўчыя), уласна вясельныя, і паслявясельныя [1, с. 126].

Як паказваюць матэрыялы, пры падборы шлюбнай пары ў большасці выпадкаў рашаючую ролю мела ўласнае жаданне хлопца і дзяўчыны, менавіта яны выступалі ініцыятарамі заключэння шлюбу, кіруючыся ўзаемнымі пачуццямі: Аднак і ў такім выпадку важную ролю іграла адабрэнне бацькамі выбару сына ці дачкі, дазвол на ўступленне ў шлюб, які бацькі давалі дзецям. Калі такога дазволу ці адабрэння не было, шлюб мог і не адбыцца, або, калі маладыя ўсё ж пераступалі волю бацькоў, вясельныя абрады маглі не праводзіцца ўвогуле.

Найлепшым часам для вяселля, як адзначалі многія інфарманты, з'яўляўся Мясаед, а таксама позняя восень (менавіта перыяд пасля збору ўраджаю). Выключанай была магчымасць гуляць вяселле ў пост, гэта лічылася вялікім грахом, «бо пана Езуса ў часе Вялікага паста мучалі, і нельга было рабіць гучных забаў»[1]. Непажаданымі месяцамі года лічыліся таксама май (агульнавядомае перакананне, што маладыя будуць «маяцца»), а таксама і сакавік: «муж з жаной будуць драцца як сабака з катом»[2].

Перадвясельны этап у разглядаемы перыяд прадстаўлены найперш сватаннем і запоінамі (заручынамі), прычым разглядаецца тэндэнцыя да скарачэння колькасці сустрэч паміж прадстаўнікамі родаў жаніха і нявесты да адной-двух, за рэдкім выключэннем (на Браслаўшчыне зафіксавана «першая, другая і трэцяя водка», калі на першы раз сваты не атрымлівалі адказу ўвогуле, на другі раз даваўся адказ, а на трэці дасягалася канчатковая дамоўленасць)[3]. Аднак, як можна меркаваць па этнаграфічных матэрыялах, у большасці выпадкаў сватанне адбывалася толькі тады, калі ўжо існавала папярэдняя дамоўленасць хлопца і дзяўчыны, і бацькі былі папярэджаны аб гэтым. У такім выпадку сватанне становілася збольшага фармальнай працэдурай знаёмства прадстаўнікоў абодвух родаў, а таксама падчас яго бакі дамаўляліся аб акалічнасцях вяселля.

Само сватанне працякала досыць традыцыйна, галоўным сватам, як правіла, абіраўся паважаны мужчына сталых гадоў (хросны, дзядзька жаніха), а агульная колькасць сватоў дасягала прыкладна 2 – 5 чалавек, у тым ліку бацька (радзей і маці) маладога, іншыя родзічы. У 1930-я гады ролю галоўнага свата мог выконваць брыгадзір, страшыня калгаса і інш.

На традыцыі, сваты працягвалі ўжываць іншасказальныя формулы для абвяшчэння мэты свайго візіту (прадстаўляліся купцамі, паляўнічымі, гаварылі, што шукаюць кабылку ці цялушку і інш.), перш чым завесці прадметную гаворку. Пасля сватання адбываліся запоіны. Практычна паўсюдна сваты прыносілі сваю гарэлку, а сям'я дзяўчыны падавала закуску. На Полаччыне нявеста ў знак згоды абвязвала свата рушніком: «сват ідзе з рушніком, што высватаў дзеўку, значыць, свадзьба будзець»[4]. У асобных рэгіёнах дыферынцыраваліся яшчэ заручыны (ці закармліны), дзе згода на шлюб замацоўвалася канчаткова.

Падрыхтоўка да вяселля працягвалася ад некалькіх тыдняў да некалькіх месяцаў, зыходзячы з магчымасцей сям'і. У заходніх раёнах маладыя «запісвалі запаведзі», пасля чаго на працягу трох тыдняў у касцёле рабілася абвяшчэнне аб маючым адбыцца шлюбе.

---

[1] Запісана студ. ПДУ Міхайлоўскім В. у 2007 г. ад Міхайлоўскай Б.М., 1937 г. нар., в. Дудалі, Браслаўскі р-н.
[2] Запісана студ. ПДУ Лях Ю. у 2007 г. ад Барысенка В.С., 1916 г. нар., в. Лесава, Полацкі р-н.
[3] Запісана студ. ПДУ Варашылінай М. у 2007 г. ад Гіліна Я.П., 1921 г. нар., в. Скур'яты, Браслаўскі р-н.
[4] Запісана студ. ПДУ Драздовай Е. у 2008 г. ад Купрыненка Н.І., 1926 г. нар., в. Дохнары, Полацкі р-н.

Даволі значнае пашырэнне, асабліва на заходняй частцы Падзвіння, меў апошні вечар перад вяселлем -- «дзявочы», «паненскі», «вечарынка», дзе бліжэйшыя сяброўкі дапамагалі маладой у яе прыгатаваннях перад шлюбам – вілі вянок, рыхтавалі вэлюм, моладзь танцавала, спявала песні. Аднак такі вечар у разглядаемы перыяд бытаваў не паўсюдна (адмовілі яго існаванне інфарманты ў асобных раёнах Браслаўшчыны, Полаччыны, Шаркаўшчыны).

Амаль паўсюдна ў цэнтральных і заходніх раёнах Падзвіння да пачатку вяселля (у суботу, часам у ноч на нядзелю) выпякалі каравай (торт, пірог). Выпякалі яго старэйшыя ў сям'і жанчыны (бабуля, маці, хросная, цётка), суседкі. Яго імкнуліся як мага лепей упрыгожыць (выявамі птушак і іншымі фігуркамі з цеста, цукеркамі, кветкамі). На жаль, практычна не фіксуюцца якія-небудзь абрадавыя дзеянні і каравайныя песні, хаця апублікаваныя раней этнаграфічныя і фалькорныя матэрыялы сведчаць аб існаванні даволі развітага каравайнага рытуалу ў ранейшы перыяд. Зрэшты, часам інфарманты згадвалі, што нейкія песні ўсё ж спявалі, але яны іх не памятаюць. Разам з тым даволі распаўсюджаным з'яўлялася перакананне, што «калі каравай добра падымецца, дык маладыя будуць доўга і добра будуць жыць»[1]. З караваем сустракалі маладых пасля вянчання ці роспісу, а затым ставілі на стол, дзе ён і знаходзіўся да канца вяселля. Каравай нявесты ў адных выпадках выкуплялі і дзялілі перад яе ад'ездам да маладога, у другіх – везлі да маладога і дзялілі ўжо там. На Лепельшчыне караваі маладых разразалі напалам, імі абменьваліся прадстаўнікі абодвух родаў[2].

У многіх рэгіёнах Падзвіння ў разглядаемы перыяд яшчэ прасочваўся абрад пасаду маладой (у адзінкавых выпадках – маладога), які адбываўся на дзяжу і вывернуты кажух, часам проста на лаву за сталом, засцеленую кажухом. Сімволіка дзяжы і кажуха па-ранейшаму звязвалася найперш з забеспячэннем дабрабыту маладой сям'і. Цікава, што ў асобных выпадках назіраецца трансфармацыя абрадавай сімволікі прадметаў, калі пасціланне кажуха разглядаецца інфармантамі як шкоданосныя дзеянні, «чары», «варажба», якія прыносілі рознага роду беды ў сям'ю: «...сядзела Валя на паўшубках, точна. А тады як каснулася, ... гэта во Валя тады памёрла маладухай, а я думаю: гэта калі я пайду, хай нічога мне не варожаць»[3].

Вясельны ўбор маладой у разглядаемы перыяд ужо не меў нічога агульнага з традыцыйным касцюмам; як правіла, гэта была доўгая сукенка белага колеру, вэлюм, упрыгожаны натуральнымі ці штучнымі кветкамі, галінкамі мірту. Вясельны ўбор маладога складаўся звычайна з касцюма цёмнага колеру і белай кашулі. На пінжак прымацоўвалася кветка ці бант.

Абавязковай, як сведчаць этнаграфічныя матэрыялы, была наяўнасць дружыны маладой і маладога. У склад першай уваходзілі сяброўкі нявесты («падружкі», «баяркі», «шаферкі», «шаферыцы», «асыстэнткі»), якія спявалі песні, запляталіі нявесце касу, апраналі вэлюм, сачылі, каб не ўкралі нявесту. У склад дружыны жаніха ўваходзілі нежанатыя хлопцы («паджанішкі», «шафяркі», «шаферы»), якія дапамагалі яму найперш падчас выкупу нявесты. Важная роля належала таксама і свату, які таксама ўдзельнічаў у выкупе, кіраваў застоллем, адорваннем маладых і інш.

Не ставячы перад сабой мэту падрабязнага выкладання ходу ўсяго вясельнага абраду, мы хацелі б засяродзіцца найперш на тых яго момантах, якім у разглядаемы перыяд уласціва найбольшая ступень захаванасці, і якія ўяўляюць найбольшую цікавасць з пункту гледжання абрадавай сімволікі.

Сярод такіх найперш варта адзначыць абрады сустрэчы маладога ў доме нявесты і яе выкуп. Шэраг інфармантаў адзначалі, што ніякіх перашкод падчас сустрэчы жаніху не чынілі, сустракаць яго выходзілі бацькі маладой з іконай, хлебам-соллю, гарэлкай ці віном. На Полаччыне малады выпіваў паднесены яму напой, а рэшткі выліваў уверх – «штоб жызнь уверх ішла»[4]. У іншых выпадках маладога перапынялі ля парога і прымушалі выконваць розныя заданні. Практычна заўсёды малады і яго дружына павінны былі выкупіць маладую ці месца каля яе. Пры гэтым, напрыклад, на Полаччыне, пакуль выкуп не адбыўся, шаферкам забаранялася нават размаўляць з дружынай маладога: «...нявеста ў гэтат час сядзела за сталом прыбраная і сядзелі шаферыцы каля яе. І стаяла тарэлка з дзеньгамі. Вот пусць шаферы накроюць гэтыя дзеньгі, што ляжаць на стале. Нільзя шаферыцам ні «здраствуйце» прыняць ад шафярэй, ні сігарэту будуць сунуць закурыць – нільзя. Нічыво ад шафярэй нільзя. Тады прадасі за здароўе, прадасі за сігарэту маладую»[5]. Выкуп за маладую давалі, як правіла, грашыма, цукеркамі, гарэлкай. Сяброўкі нявесты пры гэтым імкнуліся атрымаць выкуп як мага большы: «Баяркі сачылі за тым, каб дружкі жаніха не закінулі на галаву нявесты насавы платок. Тады дружкі плацяць цукеркі, спяваючы: 'Багачы дружкі, багачы // па базару хадзілі, // золатка, серабра збіралі // і баяркам плацілі'. А ў другім выпадку, калі дружкі давалі невялікі выкуп, спявалі: 'Беднякі дружкі, беднякі, па шуменікам хадзілі і баяркам плацілі'»[6].

---

[1] Запісана студ. ПДУ Лапеньковай С. у 2008 г. ад Сівой З.А., 1928 г. нар., в. Франопаль, Міёрскі р-н.
[2] Запісана Мішынай В.І. і Мішыным П.І. у 2007 г. ад Чэклін А.П., 1930 г. нар., в. Макараўшчына, Лепельскі р-н.
[3] Запісана экспедыцыяй ПДУ ў 2007 г. ад Кузняцовай Н.Я., 1937 г. нар., в. Заслаўкі, Лепельскі р-н.
[4] Запісана студ. ПДУ Лях Ю. у 2007 г. ад Барысенка В.С., 1916 г. нар., в. Лесава, Полацкі р-н.
[5] Запісана студ. ПДУ Лях Ю. у 2007 г. ад Барысенка В.С., 1916 г. нар., в. Лесава, Полацкі р-н.
[6] Запісана экспедыцыяй ПДУ ў 1998 г. ад Спірыдонавай М.З., 1911 г. нар., в. Гарадок, Ушацкі р-н.

Пры гэтым маладому дапамагалі яго шаферы, а таксама сват. Калі ж дружыне маладога ўдавалася накінуць маладой на галаву, ці закінуць за яе плечы хустку, то выкупу не патрабавалася. Такі звычай адзначаны інфармантамі на Лепельшчыне, Полаччыне, Ушаччыне.

Заслугоўваюць увагі і такія рытуальныя моманты вяселля, як благаслаўленне і выпраўленне маладых да вянца ці роспісу. Пры гэтым, як правіла, маладых благаслаўлялі з іконай ці крыжыкам, абводзілі вакол стала, абсыпалі зернем вясельны поезд. Варта адзначыць, што ў некаторых раёнах заходняй часткі Падзвіння маладых зернем не абсыпалі ні ў якім разе, тлумачылася гэта тым, што зернем пасыпаюць толькі за нябожчыкам: «ззаду, за пакойнікам пасыпаюць зярном, штоб пакойнік пашоў, а жыта, жыта асталося, як жыццё»[1].

Даволі складаным для пазначанага перыяду з'яўляецца пытанне ўключэння ў структуру вясельнага абраду царкоўнага вянчання і грамадзянскай рэгістрацыі шлюбу. У 1930-я гады на тэрыторыі Заходняй Беларусі вянчанне з'яўлялася неад'емнай часткай вяселля, яно абстаўлялася вельмі ўрачыста і аказвала даволі моцнае эмацыянальнае ўздзеянне на ўдзельнікаў. У цэнтральных і ўсходніх раёнах, якія адносіліся да Савецкай Беларусі, вянчацца ў царкве пазбягалі прадстаўнікі ўладаў, мясцовай адміністрацыі, дзяржаўныя служачыя, іншыя таксама не імкнуліся рабіць гэта адкрыта. Пасля вайны прыкладна такая ж сітуацыя склалася і ў заходніх раёнах: «распісваліся ў сельсавеце і вянчаліся тады ціханька»[2]; «маміна сястра была, можа траюрадная, яна бібліацекаршай работала, яны ціханька павянчаліся, а тады яе выгналі з работы» [3].

Што тычыцца грамадзянскай рэгістрацыі ў сельсавеце, то яна, як дазваляюць меркаваць матэрыялы, у разглядаемы перыяд займала даволі непрыкметнае месца ў шэрагу вясельных абрадаў, часта нават выносілася за межы ўсяго вяселля, і не была абстаўлена ўвогуле ніякімі рытуаламі. Толькі пазней, калі была распрацавана ўрачыстая форма рэгістрацыі (а гэта ўжо 1970 – 80-я гг.), роспіс стаў арганічнай часткай вяселля.

Падчас вянчання імкнуліся па гарэнню свечак прадказаць будучае жыццё пары, маладая клала шматок воўны ў абутак, маладыя павінны былі глядзець на царскія вароты ў царкве («каб нараджаліся прыгожыя дзеці»)[4].

Паўсюдна на тэрыторыі цэнтральнага і заходняга Падзвіння маладым, якія вярталіся ад вянца ці з роспісу, перагароджвалі дарогу – ставілі рагаткі (на Браслаўшчыне – «брамы»). Калі вясельны поезд не спыняўся перад рагаткай, маладых, на народных уяўленнях, у жыцці (як зямным так і замагільным) маглі чакаць розныя нягоды. Як правіла, гэта тлумачылася тым, што сустракалі маладых з іконай, распяццем, якія нельга было ігнараваць: «Ікону аб'едзеш – тады грэх табе будзіць. Будзіш у пекле»[5]; «Бога абмінаць ніколі нельзя»[6]. Інфарманты неаднаразова прыводзілі прыклады, у якіх менавіта тым, што маладыя не спыніліся перад рагаткай, тлумачыліся беды ў іх наступным жыцці. Як своеасаблівы індыкатар часу, выступае зафіксаваны на Лепельшчыне звычай выстаўляць на рагатцы не ікону, а партрэты савецкіх кіраўнікоў[7].

Пэўнай сімволікай характарызуюцца на гэтым этапе абрады сустрэчы маладых пасля вянца ў доме нявесты. Паўсюдна адзначаецца звычай сцяліць на парозе кажух – «каб багата было»[8], прычым сачылі, «хто з маладых першым на яго ступіць: калі маладая, дык яна будзе верхаводзіць у сям'і, калі малады, тады ён»[9]. У некаторых вёсках Лепельскага, Міёрскага, Полацкага раёнаў інфарманты адзначалі, што падчас сустрэчы кажух апранала таксама маці, што таксама звязвалася з забеспячэннем маладых багаццем і дабрабытам. Многія інфарманты адзначалі, што сустракаць маладых як у доме нявесты, так і потым у доме жаніха абавязкова трэба было ў пары: «а калі нет ужо бацькі ці маткі, то тады беруць сасэда, каб былі яны абодвы, і бацька, і матка каб былі, каб ужо ўдавой не асталася, ці ўдаўцом»[10]. Бацькі (ці асобы, якія іх замянялі), сустракалі маладых з хлебам-соллю, іконай, чаркамі з гарэлкай. Варта адзначыць, што папулярны сёння звычай разбівання чарак «на шчасце» не паўсюдна ўспрымаўся як належнае. На Міёр-

[1] Запісана Мішынай В.І. у 2007 г. ад Ліпскай М.Э., 1944 г. нар., в. Волкаўшчына, Міёрскі р-н.
[2] Запісана Мішынай В.І. у 2007 г. ад Ліпскай М.Э., 1944 г. нар., в. Волкаўшчына, Міёрскі р-н.
[3] Запісана Мішынай В.І. у 2007 г. ад Ліпскай М.Э., 1944 г. нар., в. Волкаўшчына, Міёрскі р-н.
[4] Запісана студ. ПДУ Сямёнавай Т., Каржанеўскай Ю. у 2008 г. ад Вікенцьевай Н.С., 1934 г. нар., в. Слабада, Ушацкі р-н; Мішынай (Ліпскай) В.І. у 1997 г. ад Крэер Я.У., в. Заборцы, Міёрскі р-н; Мішынай (Ліпскай) В.І. у 1997 г. ад Шамёнак Н.А., в. Заборцы, Міёрскі р-н.
[5] Запісана Мішынай В.І., Мішыным П.І. у 2008 г. ад Ляўшынскага І.Г., 1927 г. нар., в. Барсукі, Шаркаўшчынскі р-н.
[6] Запісана Мішынай В.І., Мішыным П.І. у 2008 г. ад Васілеўскай В.І., 1921 г. нар., в. Цярэшкі, Шаркаўшчынскі р-н.
[7] Запісана Мішынай В. І., Мішыным П.І., Халадковай А. У. і студ. ПДУ Прахарэнка Я., Жолудзевай П. у 2007 г. ад Шчэрбіка У.І., 1930 г. нар., в. Камень, Лепельскі р-н; Мішынай В. І., Мішыным П.І., Халадковай А.У., і студ. ПДУ Шышіла У., Мілянцеем А. у 2007 г. ад Петушкова Л.І., 1930 г. нар., в. Губіна, Лепельскі р-н.
[8] Запісана Мішынай В.І., Мішыным П.І. у 2008 г. ад Буды Ф.В., 1934 г. нар., в. Нікіцёнкі, Шаркаўшчынскі р-н.
[9] Запісана студ. ПДУ Сямёнавай Т., Каржанеўскай Ю. у 2008 г. ад Вікенцьевай Н.С., 1934 г. нар., в. Слабада, Ушацкі р-н.
[10] Запісана экспедыцыяй ПДУ ў 2007 г. ад Валадзько Г.І., 1936 г. нар., в. Бор, Лепельскі р-н.

шчыне казалі, што разбіваючы чаркі маладыя «выкідваюць сваю судзьбу»[1], у іх не будзе дзяцей; а ў Шаркаўшчынскім раёне адзначалі, што «у жыдоў... абізацільна нада пад нагу і расціснуць чарку», а «ў нас не было»[2].

Пасля сустрэчы маладых у доме нявесты пачыналася застолле (адзін, два, або тры «сталы» ў залежнасці ад мясцовай традыцыі і ступені заможнасці гаспадароў, падчас якога гучала «вялікая колькасць разнастайных песень» [2, с. 330]. Напрыканцы застолля ў шэрагу раёнаў цэнтральнага і заходняга Падзвіння маладую дарылі. Варта, аднак, адзначыць, што ў розных лакальных традыцыях (нават у межах некалькіх блізкіх вёсак) надзяленне маладой магло адбывацца ў розныя моманты вяселля: «у маладой, перад тым як маладую атпраўляць да вянца, гэта ў некаторых случаях так было, дарылі. А ў другіх случаях было, што вот прыехала свадзьба ўжо да маладой, сразу маладую садзюць і маладую дорупь»[3]. Гэдак жа, да розных момантаў вяселля магло быць прымеркавана і адорванне маладога. У некаторых раёнах, напрыклад на Полаччыне, спачатку адорвалі кожнага з маладых паасобку, а потым – яшчэ і разам: «Маладую цэлую гару наложуць, як доруць. І так жа маладога доруць. А тады як прыедуць к маладому, апяць маладых абаіх доруць»[4].

Сярод падарункаў, якія дарылі маладым на вяселлі, называюцца як грошы, так і розныя рэчы, найчасцей тканыя вырабы, адзенне, посуд. Пры гэтым, як адзначае большасць інфармантаў, хоць матэрыяльнае становішча было цяжкім, імкнуліся падарыць хоць нешта, па сваіх магчымасцях.

Амаль паўсюдна рытуальнымі дзеяннямі быў абстаўлены выкуп пасагу маладой. Даволі часта інфарманты згадвалі, што «падушкі прадавалі» дзеці, якім і лавалі выкуп (грашыма, цукеркамі): «Пасодзюць во такога рабёначка. Я пасадзіла сястру дваюрадную. Яна трошку большая была, можа 5 гадкоў. Сказалі: «Прасі бумажку з хвосцікам». А гэта была дваццацьпятка сіняя. Крычыць: «Давай»! А ў маладзёна нічога не было. Ну, алі даў бумажку з хвосцікам»[5]. У заходніх раёнах Падзвіння за некалькі гадзін да ад'езду маладой яе пасаг («шкаф») адвозіў да маладога спецыяльна прызначаны для гэтага «кубельнік» (на Браслаўшчыне – «кіслы сват»).

Рытуальнымі дзеяннямі суправаджаўся і ад'езд маладой з дому бацькоў. Галашэнні маладой пры развітанні ў большай ступені мелі распаўсюджанне ва ўсходніх раёнах Падзвіння (Гарадоцкі, Віцебскі, Лёзненскі, Шумілінскі, усходняя частка Полацкага і Расонскага раёнаў), бытавалі таксама і ў цэнтральных (Лепельскі, Ушацкі, паўночная частка Верхнядзвінскага раёна) [2, с. 229]. Таму гэты момант вяселля ў пазначаных лакальных традыцыях вылучаўся значным драматызмам. На захадзе Падзвіння галашэнні пашыраны не былі, абрад ад'езду маладой насіў больш стрыманы характар. Пры развітанні маладых благаслаўлялі, абсыпалі зернем. Маладая, выходзячы з хаты, цягнула са стала абрус – каб яе сяброўкі выходзілі замуж[6].

Паўсюдна на тэрыторыі Падзвіння сустракаецца звычай красці з дому маладой пры ад'ездзе розныя рэчы, гаспадарчае начынне, і нават хатнюю птушку і жывёлу: «І індычку, і авечку, там і чапёлы, і качэргі, там хто толька што... Ўсё гэта кралі, ну адбіраць ужо назад нельзя было»[7]. Пры гэтым асаблівай сімволікай надзяляўся крадзеж курэй. Калі на Гарадоччыне «шчыталась, што куріца ета ўсё адно как нівеста: пріжівёцца тая куріца і нівеста пріжівёцца» [2, с. 352], то на ў заходніх раёнах курэй красці было нельга ўвогуле, «каб маладая не капалася, як курыца»[8].

Пэўная колькасць рытуальна-сімвалічных дзеянняў выконвалася і падчас сустрэчы маладых у доме жаніха. У якасці рытуальных атрыбутаў тут таксама фігуруюць хлеб-соль, пасцелены на парозе вывернуты кажух, ікона, прысутнічае патрабаванне сустракаць маладых абавязкова ў пары. На нашу думку, найбольш цікавымі з пункту гледжання рытуальнай сімволікі з'яўляюцца дзеянні маладой, накіраваныя на «асваенне» чужой для яе прасторы. Гэта абсыпанне хаты зернем, печывам, цукеркамі: «Яна канфетамі ўжо і па людзях, па вуліцы, і ў хаце сыпіць сладасцю, штоб сладка жыць было»[9]; развешванне паўсюдна ў хаце ўласных вырабаў: «сваёй адзёжай краваць убярэць. Усё сваё, і сталы пакрыіць сваім усім, і на ікону палаценцы павесіць»[10]; а таксама і адорванне новай радні. У некаторых раёнах інфарманты адзначалі, што маладая прывозіла і вешала ў хаце сваю ікону. Рэшткі цікавых абрадавых дзеянняў ахвяравальнага характару былі зафіксаваны ў Шаркаўшчынскім раёне: «ўжо я гэтага ні заспела – а мая сестра старэйшая. Прышла маладая – яе назаўтрага адпраўляюць за вадой. Яна далжна павешаць на карамысла два

[1] Запісана Мішынай (Ліпскай) В.І. у 1997 г. ад Шук Н.В., в. Казлы, Міёрскі р-н.
[2] Запісана Мішынай В.І., Мішыным П.І. у 2008 г. ад Васілеўскай В.І., 1921 г. нар., в. Цярэшкі, Шаркаўшчынскі р-н.
[3] Запісана Мішынай В.І. у 2007 г. ад Ліпскай М.Э., 1944 г. нар., в. Волкаўшчына, Міёрскі р-н.
[4] Запісана студ. ПДУ Лях Ю. у 2007 г. ад Барысенка В.С., 1916 г. нар., в. Лесава, Полацкі р-н.
[5] Запісана Мішынай В.І., Мішыным П.І., Халадковай А.У. і студ. ПДУ Шыпіла У., Мілянцеем А. у 2007 г. ад Літвін М.П., 1932 г. нар., в. Губіна, Лепельскі р-н.
[6] Запісана экспедыцыяй ПДУ ў 1995 г. ад Аржанік В.В., 1918 г. нар., г.п. Асвея, Верхнядзвінскі р-н.
[7] Запісана Мішынай В.І. у 2007 г. ад Ліпскай М.Э., 1944 г. нар., в. Волкаўшчына, Міёрскі р-н.
[8] Запісана Мішынай В.І. у 2007 г. ад Ліпскай М.Э., 1944 г. нар., в. Волкаўшчына, Міёрскі р-н.
[9] Запісана студ. ПДУ Лях Ю. у 2007 г. ад Барысенка В.С., 1916 г. нар., в. Лесава, Полацкі р-н.
[10] Запісана студ. ПДУ Лях Ю. у 2007 г. ад Барысенка В.С., 1916 г. нар., в. Лесава, Полацкі р-н.

паясы. Гэта ж нада нечым ваду насіць. Тады выправілі яе ў амбар, там за чым-нібудзь - яна далжна туды павешаць палатно, ілі палаценцы эты тканыя, ілі скацерці... Пасля ўжо... даўней жа ж гумно, у ток, абізацільна нада туды занясці тожа палатна якога там»[1]. У Верхнядзвінскім раёне маладая дарыла «намётку» таму, хто прывёз яе ў дом маладога, а таксама пакрывала «намёткай» каня[2].

Аб абраднасці каморы і наступнага падымання маладых у прааналізаваных матэрыялах сустракаюцца нешматлікія звесткі: падчас пакладзін «спявалі глумлівыя песні»[3], у ложак маладым клалі палена[4]. Пэўныя рытуальна-сімвалічныя дзеянні выконваліся пасля падымання маладых: на Ушаччыне, калі маладая аказалася цнатлівая, жаніх выносіў чырвонае віно, калі не – белую гарэлку[5]; на Міёршчыне калі нявеста была «чэсная», бацька маладога разбіваў збан[6].

На другі дзень вяселля ў хаце маладога (ці нават увечары першага дня) амаль паўсюдна адбывалася змена касцюма маладой, асабліва акцэнтавалася змена галаўнога ўбору. Як правіла, вэлюм і вянок замяняліся хусткай (у больш раннім варыянце – чапцом), а белая сукенка замянялася на светлую, іншага колеру. У некаторых рэгіёнах (напрыклад, на Ушаччыне) у час змены галаўнога ўбору нявесту саджалі на дзяжу[7].

Захаваліся ў градыцыйнай абраднасці разглядаемага перыяду і элементы выпрабавання маладых: «Прынясуць браўно, даюць пілу: ці ўмеюць дровы рэзаць? Жаніх ці ўмее дровы калоць? Маладая іх нясець у хату - ці ўмеець печ тапіць, ці ўмеець есці варыць?»[8]. У некаторых выпадках, як і ў абраднасці больш ранняга перыяду, маладыя давалі падарункі тым, хто выконваў работу за іх: «бабка тады пол падмяцець, і шуму к парогу, і садзіцца на парог, тады тожа ўжо – ідзеш са двара, нада заплаціць гэтай бабцы, што яна хату падмяла»[9].

У другой частцы вяселля, якая адбывалася ў доме маладога і насіла больш мажорны характар, асабліва на другі дзень, павялічвалася роля карнавальнага элемента.

Даволі пашыраным на тэрыторыі заходняга і цэнтральнага Падзвіння быў прыход «падстаўных маладых», калі хто-небудзь з гасцей апранаўся ў нібыта шлюбнае адзенне супрацьлеглага полу, сядаў на месца маладых і патрабаваў ад іх выкуп. Характэрным для названых рэгіёнаў быў і вясельны звычай пераапранання ў «цыганоў»: «Былі гэтыя цыгане. ...Ну вот прытвараюцца, вытвараюцца – ці ўзнаеш ты мяне? ...Абы-якую адзежу знайдуць, якую-небудзь рваную такую. ...Намажуцца і малёўкамі, і сажай, і чым ні папала»[10].

Паўсюдна на вяселле запрашалі музыкаў. Яны прысутнічалі падчас усяго вяселля, а напрыканцы яго ў заходніх рэгіёнах ігралі «марш»: «пара, хто сядзіць, муж з жаной там ілі парань з дзевушкай, ён для іх іграіць марш. Ну і плацяць»[11]. Грошы, сабраныя падчас марша, з'яўляліся заробкам музыканта, калі ж іх было менеш, чым дамаўляліся, то гаспадары даплочвалі патрэбную суму. Сярод музычных інструментаў для пазначанага перыяду найбольш характэрны скрыпка, цымбалы, гармонік.

Неад'емнай часткай вясельнага абрадавага комплексу з'яўляліся песні. Яны суправаджалі практычна ўсе этапы вяселля, пачынаючы ад сватання і запоін. Значная колькасць вясельнага абрадавага фальклору зафіксавана этнаграфічнымі экспедыцыямі ПДУ, аднак дэталёвы яго аналіз пакуль не праводзіўся.

Літаральна на кожным з этапаў традыцыйнага вяселля ў разглядаемы перыяд можна прасачыць бытаванне разнастайных прыкмет, з дапамогай якіх імкнуліся вызначыць будучае жыццё маладых, а таксама выкананне пэўных магічных дзеянняў, найперш апатрапейнага характару. Так, разнастайныя меры прадпрымаліся маладымі, каб засцерагчыся ад суроку (выкарыстанне вострых прадметаў, часнаку, зёлак, апырсквание свянцонай вадой, апранание на адваротны бок ніжняй бялізны). Існаваў цэлы шэраг рэгламентацый для навакольных, чые дзеянні маглі неяк пашкодзіць маладым: забаранялася пераходзіць маладым дарогу, нельга было праходзіць паміж імі, асабліва калі маладыя вярталіся ад вянца. Пэўныя дзеянні апатрапейнага і прадукавальнага характару павінны былі выконваць і самі маладыя. Так, нявесце гаварылі: «Ты не глядзі на яго, каб ён быстрэй на цябе паглядзеў, бо тады ён за табой усю жызнь будзе ганяцца»[12]; калі маладую везлі ў дом жаніха, ёй забаранялася аглядвацца назад, «бо жызнь не будзіць, верніцца дамой»[13];

---

[1] Запісана Мішынай В.І., Мішыным П.І. у 2008 г. ад Васілеўскай В.І., 1921 г. нар., в. Цярэшкі, Шаркаўшчынскі р-н.
[2] Запісана экспедыцыяй ПДУ ў 1995 г. ад Марынскай Т.Ф., 1937 г. нар., в. Канчаны, Верхнядзвінскі р-н.
[3] Запісана студ. ПДУ Сямёнавай Т., Каржанеўскай Ю. у 2008 г. ад Вікенцьевай Н.С., 1934 г. нар., в. Слабада, Ушацкі р-н.
[4] Запісана студ. ПДУ Міхайлоўскім В. у 2007 г. ад Міхайлоўскай Б.М., 1937 г. нар., в. Дудалі, Браслаўскі р-н.
[5] Запісана студ. ПДУ Сямёнавай Т., Каржанеўскай Ю. у 2008 г. ад Вікенцьевай Н.С., 1934 г. нар., в. Слабада, Ушацкі р-н.
[6] Запісана студ. ПДУ Рундо Н., Навічонак Н. у 2008 г. ад Сіцька Л.М.,1928 г. нар., в. Маназыль, Міёрскі р-н.
[7] Запісана студ. ПДУ Сямёнавай Т., Каржанеўскай Ю. у 2008 г. ад Вікенцьевай Н.С., 1934 г. нар., в. Слабада, Ушацкі р-н.
[8] Запісана студ. ПДУ Аніскавец В. у 2007 г. ад Андзілеўка Н.В., 1929 г. нар., (былой жыхаркі в. Зуі Полацкага р-на), г. Наваполацк.
[9] Запісана Мішынай В.І. і Мішыным П.І. у 2007 г. ад Чэклін А.П., 1930 г. нар., в. Макараўшчына, Лепельскі р-н.
[10] Запісана Мішынай В.І., Мішыным П.І. у 2008 г. ад Рыбакоз В.І., 1925 г. нар., в. Нікіцёнкі, Шаркаўшчынскі р-н.
[11] Запісана Мішынай В.І., Мішыным П.І. у 2008 г. ад Буды Ф.В., 1934 г. нар., в. Нікіцёнкі, Шаркаўшчынскі р-н.
[12] Запісана студ. ПДУ Лупенько Т. і Кавалёвай І. у 2008 г. ад Седуновай В.В., 1927 г. нар., в. Жаўнова, Полацкі р-н.
[13] Запісана студ. ПДУ Лях Ю. у 2007 г. ад Барысенка В.С., 1916 г. нар., в. Лесава, Полацкі р-н.

прыехаўшы на двор маладога, яна павінна была рассупоніць каня, каб лягчэй было нараджаць у будучым[1]. Сярод прыкмет адным з самых распаўсюджаных было назіранне за надвор'ем. На Браслаўшчыне лічылі, «калі будзе ісці дождж, то будуць слёзы, а калі добрае надвор'е, то шчасце будзе»[2], а вось на Міёршчыне дождж, наадварот, лічылі прыкметай багацця[3]. Кепскімі прыкметамі лічылася страта заручальнага пярсцёнка, пераварочванне воза, у якім сядзелі маладыя. Пры гэтым інфарманты неаднаразова выказвалі меркаванне, што менавіта гэтыя акалічнасці адмоўным чынам адбіваліся на іх жыцці: «Мяне то абярнулі, і ў вазку вязлі, 5 чалавек, ...і ўсе на мяне павалілісі. ...І ніякая жызнь была. Можа гэта й прымета, Бог яго ведаець»[4].

Сярод шкоданосных магічных прыёмаў, якія маглі выкарыстоўвацца падчас вяселля, напэўна, самым распаўсюджаным з'яўляецца «перадзіранне катом дарогі», неаднаразова згаданае інфармантамі, асабліва на Лепельшчыне: «...бывалі ж усякіі. Што вот напрымер, ён любіцца с адной, ну а жэніцца з другой. Ну я ня відзіла гэтага, алі казалі. А ён тады як ужо вязець маладуху, яна тады ката за хвост цігаіць па дарозе, каб гаворыць, драліся ўсю жысць»[5]. Маглі так зрабіць і пасля рагаткі: «Еслі я ні ўгасціў іх, ілі плоха абашоўся з імі, то яны абязацельна за заднія лапы і папярок маладым гэтым, дзе свадзьба, папярок дарогі дзелаюць»[6]. Разам з тым некаторыя інфарманты адзначалі, што не вераць у розныя прыкметы, выказвалі скептычнае стаўленне да старадаўніх звычаяў: «А па-мойму, хоць чым абсыпай, калі ня робіш, дык і багатым ня будзіш... Ніхто не насобіць... Ні кажух той не паможыць»[7].

Такім чынам, на працягу 1930 – 1950-х гадоў вясельны абрад беларусаў у цэнтральных і заходніх раёнах Падзвіння бытаваў у даволі разгорнутым выглядзе, захоўваючы значную частку традыцыйных элементаў, якія, як правіла, з'яўляліся ключавымі момантамі абрадавага комплексу. У асноўным захоўвалася сімволіка рытуальных дзеянняў, матэрыяльных атрыбутаў, слоўных формул. Не была яшчэ страчана, хоць і зведала скарачэнне, спеўная састаўляючая традыцыйнай абраднасці. Разам з тым сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, ідэалагічна-культурныя рэаліі разглядаемага перыяду аказвалі істотны ўплыў на традыцыйны абрадавы комплекс: у яго ўключаліся новыя, не характэрныя раней элементы, іншыя, наадварот, паступова адміралі; адбываліся пэўныя трансфармацыі ў галіне абрадавай сімволікі.

ЛІТАРАТУРА

1. Малаш, Л.А. Вяселле / Л.А. Малаш // Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / рэдкал. І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 126 – 128.
2. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]; склад. Т.Б. Варфаламеева. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – 910 с.

КРАЯЗНАЎЦЫ ПОЛАЧЧЫНЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

канд. гіст. навук М.В. ПІВАВАР
(Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава)

Вызначаецца роля краязнаўцаў-аматараў у гісторыка-культурным жыцці краіны, а таксама рэгіянальных даследчыкаў, якія займаліся краязнаўчымі даследаваннямі Полаччыны другой паловы XX стагоддзя. Складзены кароткія біяграмы, асветлены асноўныя накірункі іх дзейнасці, дасягненні, прыведзена кароткая бібліяграфія даследчыкаў.

Полаччына, як частка гісторыка-культурнага рэгіёну Беларускага Паазер'я здаўна была аб'ектам вывучэння як вядомых навукоўцаў, так і краязнаўцаў-аматараў. Аднак самі даследчыкі, асноўныя накірункі іх працы і навуковыя зацікаўленасці, дасягненні, жыццёвы лёс практычна не вывучаліся. Аднак, калі дзейнасць дарэвалюцыйных даследчыкаў знайшла пэўнае адлюстраванне ў навуковым друку краіны [1], вывучэнне дзейнасці навукоўцаў савецкага перыяду, і асабліва перыяду незалежнай Беларусі, не стала тэмай асобнага даследавання. Выключэнне верагодна складаюць найбольш вядомыя навукоўцы, якія працавалі і працуюць у акадэмічных установах НАН Беларусі і ВНУ краіны. Да і пра тых, як правіла, артыкулы выходзілі толькі з нагоды юбілеяў. Па-за ўвагай застаюцца лёсы рэгіянальных навукоўцаў і краязнаўцаў-аматараў, якія робяць для вывучэння краю не менш значныя намаганні.

---

[1] Запісана Мішынай (Ліпскай) В.І. у 1997 г. ад Крэер Я.У., в. Заборцы, Міёрскі р-н.
[2] Запісана студ. ПДУ Міхайлоўскім В. у 2007 г. ад Міхайлоўскай Б.М., 1937 г. нар., в. Дудалі, Браслаўскі р-н.
[3] Запісана студ. ПДУ Лапеньковай С. у 2008 г. ад Сівой З.А., 1928 г. нар., в. Франопаль, Міёрскі р-н.
[4] Запісана Мішынай В.І., Мішыным П.І., Халадковай А.У. і студ. ПДУ Шыпіла У., Мілянцеем А. у 2007 г. ад Літвін М.П., 1932 г. нар., в. Губіна, Лепельскі р-н.
[5] Запісана Мішынай В.І., Мішыным П. І. ад Ханяк А.І., 1932 г. нар., в. Макараўшчына, Лепельскі р-н.
[6] Запісана Мішынай В. І., Мішыным П.І., Халадковай А. У. і студ. ПДУ Прахарэнка Я., Жолудзевай П. у 2007 г. ад Шчэрбіка У.І., 1930 г. нар., в. Камень, Лепельскі р-н.
[7] Запісана Мішынай В.І. і Мішыным П.І. у 2007 г. ад Чэклін А.П., 1930 г. нар., в. Макараўшчына, Лепельскі р-н.

Трэба адзначыць, што роля краязнаўца-аматараў у гісторыка-культурным жыцці краіны з'яўляецца «terra incognita». Вывучэнне гэтай тэмы мае пэўныя асаблівасці. Па-першае, адзначым амаль поўную адсутнасць архіўных крыніц, таму ў даследаваннях можна абапірацца толькі на бягучыя архівы арганізацый, устаноў, прыватныя зборы, успаміны сучаснікаў з розных рэгіёнаў краіны. На жаль, так і не быў створаны даведнік «Краязнаўцы Беларусі», выданне якога планавалася краязнаўчай камісіяй БФК і Навуковаасветным цэнтрам імя Ф. Скарыны. Па-другое, дакументальныя комплексы з прыватных архіваў часта немагчыма ўвесці ў навуковы зварот з прычыны адыходу з жыцця саміх краязнаўцаў і страты напрацаваных імі матэрыялаў.

У гэтым артыкуле мы ставілі перад сабой мэту выяўлення асоб, якія займаліся краязнаўчымі даследаваннямі Полаччыны другой паловы XX стагоддзя, скласці кароткія біяграмы і асветліць асноўныя накірункі іх дзейнасці, дасягненні, прывесці бібліяграфію даследчыкаў.

Праведзенымі даследаваннямі (аналіз мясцовага перыядычнага друку, кнігі «Памяць», апытанне, анкетаванне, інтэрв'юіраванне) выяўлена каля 50 асоб, якія праводзілі, ці працягваюць праводзіць вывучэнне роднага краю. Верагодна, у спіс трапілі не ўсе асобы, якія займаліся вывучэннем Полаччыны, не пра ўсіх атрымалася сабраць поўную інфармацыю біяграфічнага характару, скласці бібліяграфію, асабліва па мясцовых перыядычных выданнях. Праца будзе працягнута.

Развіццё краязнаўства ў другой палове XX стагоддзя ўмоўна можна падзяліць на дзве часткі: 1950 – 1985 гады і 1986 – 2000 гады, улічваючы за падзельную падзею пачатак палітыкі «перабудовы».

Пачнём з найбольш значных даследчыкаў другой паловы XX стагоддзя, жыццёвы шлях якіх прыйшоўся на **1950-я – 1970-я гады.**

Аднім з найбуйнейшых даследчыкаў гісторыі і культуры г. Полацка з'яўляўся **Дэйніс** Іван Пятровіч (1900 – 1985). З 1905 года жыў у Полацку. Яшчэ ў 1920-я гады браў удзел у дзейнасці Полацкага акруговага краязнаўчага таварыства [2].

Пакінуў успаміны пра гісторыю Полацка «Полацк у XX стагоддзі (1905 – 1967)». Запісы ўяўляюць сабой рукапіс аб'ёмам 220 лістоў (433 старонак па аўтарскай нумарацыі чырвоным алоўкам). Перададзена аўтарам 26 красавіка 1972 года ў Полацкі краязнаўчы музей. Рукапіс захоўваецца ў фондах Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (КП-5-2774). Мемуары выдадзены М. Баўтовічам пад назвай «Полацкая даўніна» ў перакладзе на беларускую мову ў 2007 годзе [3].

У архіве захоўваюцца і іншыя рукапісы краязнаўцы: «Богоявленский монастырь», «Борисоглебский или Бельчанский монастырь», «Главная площадь города Полоцка. Исторический очерк», «Иезуиты в Полоцке», «Мой командир (воспоминания о начальнике 43-х Полоцких комкурсов Я.Ф. Фабрициуса)», «Полоцк в XX веке», «Полоцкие замки», «Полоцкий лесной техникум», «43 Полоцкие объединенные курсы комсостава рабочее-крестьянской Красной армии», «Софийский собор и униаты в Полоцке», «Спасо-Евфросиньевский монастырь», Учебные заведения в Полоцке до Октябрьской революции». Літаратурная спадчына даследчыка не вывучана ў поўнай меры, прыводзім толькі некаторыя артыкулы, надрукаваныя ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку [4].

Другім па значнасці даследчыкам Полаччыны пасляваеннага часу з'яўляецца, на нашу думку, краязнаўца, педагог, ганаровы грамадзянін г. Полацка **Маніс** Мікалай Аляксандравіч (1912 – 1996). На працягу ўсяго пасляваеннага жыцця ён вёў вялікую краязнаўчую работу, апублікаваў дзесяткі артыкулаў па гісторыі Полацка і раёна, прымаў удзел у падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі «Памяць». Даследаваў гісторыю рэвалюцыйнага руху на Полаччыне і ў 3-й Арміі Заходняга фронту прыватнасці. Сустракаўся з удзельнікамі рэвалюцыйнага руху і Грамадзянскай вайны, збіраў іх успаміны. На аснове сабраных матэрыялаў была напісана і выдадзена кніга «Память о них жива в Белоруссии» [5].

З'яўляўся адным з аўтараў кнігі «Полацк» (1962). У 1988 годзе выдаў кнігу «Память о них жива в Белоруссии». Удзельнічаў у працы Полацкага аддзялення БДТАІПіК, быў лектарам таварыства «Веды», дзе актыўна чытаў лекцыі па гісторыі Полацка. Публікаваў вялікую колькасць матэрыялаў у рэспубліканскім і мясцовым («Сцяг камунізму», «Полацкі веснік») перыядычным друку [6].

Полацкім краязнаўцам першай перыяду з'яўляўся **Клокаў** Сцяпан Антонавіч (1909 – 1992), які пасля вайны працаваў загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі Расонскага (1944 – 1949) і Ветрынскага (1949 – 1952) райкамаў КП(б)Б, дырэктарам СШ № 3, потым № 8 г. Полацка (1952 – 1969).

У час працы ў школе вёў актыўную грамадскую і выхаваўчую працу. Даследаваў родны край. Займаўся вывучэннем помнікаў гісторыі і культуры. Выявіў, увёў у навуковы зварот і ініцыіраваў узяцце пад ахову шэраг помнікаў археалогіі ў Полацкім, Расонскім раёнах. Аказваў дапамогу ў даследчай рабоце, якую вялі ў Полацку навукоўцы: А.Р. Мітрафанаў, М.К. Каргер, Г.В. Штыхаў. З дапамогай апошняга ўзяў на ўлік усе помнікі Расонскага раёна. Падрыхтаваў і чытаў многія гады лекцыі пра помнікі археалогіі роднага краю, аб іх захаванні, пра старажытныя помнікі Полацка. Надрукаваў па гэтых тэмах шэраг артыкулаў. Вывучаў падзеі вайны 1812 года на Полаччыне і ўдзельнікаў гэтых падзей. Аўтар кнігі прысвечанай генералу Я.П. Кульнёву [7].

Шмат гадоў збіраў звесткі пра герояў Грамадзянскай вайны У.М. Азіна. На аснове сабраных матэрыялаў і дакументаў (успаміны родных, першага настаўніка, баявых паплечнікаў, землякоў і шэрага інш.)

быў створаны музей У.М. Азіна ў школе, дзе на той час працаваў С.А. Клокаў [8]. Арганізаваў збор матэрыялу пра Я. Фабрыцыўсе, што кіраваў у Полацку школай Чырвоных афіцэраў (1921 – 1923).

У 1960 – 1970-я гады друкаваў шмат артыкулаў у гарадской газеце «Сцяг камунізма» («Полацкі веснік»). Страціўшы зрок у 1977 годзе працягваў займацца грамадскім жыццём і вывучэннем краю.

Ветэран Вялікай Айчыннай вайны **Вільчынскі** Іван Сцяпанавіч (1912 – 1999) доўгі час даследаваў гісторыю Полаччыны ў час другой сусветнай вайны. Служыў у войску (1934 – 1958), пасля вайны працаваў у Кемераўскім вучылішчы сувязі. Пасля выхаду ў адстаўку працаваў у арганізацыях сувязі Полаччыны. Узначальваў няштатны аддзел ваенна-патрыятычнага выхавання ў газеце «Сцяг камунізму» [9].

Склаў кароткую гісторыю сувязі Полаччыны. Даследаваў жыццёвыя лёсы асобаў, у гонар якіх названы вуліцы Полацка, аддаючы перавагу ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар шэрага артыкулаў у газеце «Сцяг камунізму» пад рубрыкай «Вуліцы нашага горада», прысвечаных ветэранам-удзельнікам другой сусветнай вайны [10].

Пэўны ўклад у гісторыю вывучэння Полаччыны ў Вялікую Айчынную вайну зрабіў журналіст, мастак **Ліхачоў** Уладзімір (1925 – 1994). Член Саюза журналістаў (1984). З 1970 года працаваў выкладчыкам, мастаком, карэспандэнтам, карэспандэнтам газеты «Сцяг камунізму» (з 1991 г. «Полацкі веснік») [11].

Даследаваў гісторыю абароны Полацка летам 1941 года. Працаваў ў Цэнтральным архіве МАР РФ (г. Падольск), музеі Вялікай Айчыннай вайны (г. Мінск), ПКМ, збіраў успаміны ўдзельнікаў баёў, мемуарную літаратуру. На аснове гэтых крыніц падрыхтаваў артыкулы для кнігі «Памяць» г. Полацка, газеты «Сцяг камунізма» [12]. Аўтар-укладальнік «Палачане – Героі Савецкага Саюза» (1990), «Героі-полочане» (1992), у якой змешчаны нарысы пра 17 герояў Савецкага Саюза – палачан [13]. Аўтар буклета «Ганаровыя грамадзяне г. Полацка» (1972). Аўтар шэрага артыкулаў у мясцовай і рэспубліканскай прэсе, у якіх прапагандаваў гісторыю Полацка і яго традыцыі.

Ветэранам-краязнаўцам, які займаўся вывучэннем гісторыі Полаччыны з'яўляўся **Фамін** Мітрафан Іванавіч (1913 – 1993). Скончыў Магілёўскі педінстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў інспектарам Ветрынскага РАНА, настаўнікам гісторыі, завучам, дырэктарам Вароніцкай сярэдняй школы. Полацкага раёна. Адзін з пачынальнікаў музейнай справы ў Полацкім раёне. Браў удзел у пошукавым руху. Працаваў у АМАРФ (Падольск). Выявіў дзесяткі імёнаў салдат, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі ў Полацкім раёне ў гады другой сусветнай вайны [14].

З 1968 года пошукавым рухам займаецца педагог, краязнаўца, настаўніца рускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 2 г. Наваполацка **Трапезнікава** Яўгенія Анатольеўна (1931). У сярэдзіне 1960-х гадоў пераехала на Беларусь. Стала ініцыятарам стварэння і арганізатарам школьнага музея баявой славы. На яго аснове стварыла ў сваім класе атрад Чырвоных следапытаў «РВС» («Разведчики воинской славы»), які пазней быў ператвораны ў пошукавы клуб «Разведчики воинской славы» (РВС). Асноўнымі накірункамі дзейнасці аб'яднання сталі: добраўпарадкаванне і дагляд воінскіх могілак, раскопкі на месцах баёў, устанаўленне асобаў загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны воінаў, дапамога і падтрымліванне адносін з ветэранамі, удзел у вахтах памяці, выданне школьнай штомесячнай газеты «Следопыт».

Намаганнямі гурткоўцаў была ўсталявана мемарыяльная дошка (1969) ў в. Рубанава Полацкага раёна на месцы партызанскай пераправы. Узвялі помнік на брацкай магіле ў в. Грышына Расонскага раёна (1975) і вызначылі імёны 170 прозвішчаў загінуўшых савецкіх салдат 28-й СД. Членамі клуба вызначана 7 месцаў гібелі самалётаў. Устанавілі прозвішчы лётчыкаў, загінуўшых на самалёце Іл-2 (1983), узвялі ў г. Наваполацку на месці гібелі экіпажа памятны знак (1985). Усяго дзякуючы даследчай працы членамі клуба і савета музея баявой славы ў горадзе ўстаноўлена чатыры помнікі, а ў Полацкім раёне 4 мемарыяльныя дошкі і 3 помнікі. Штогод удзельнікі клуба бяруць удзел у вахтах Памяці, якія праводзяцца ў РФ. Вядзецца вялізная перапіска з ветэранамі 6 гвардзейскай і 4 Ударнай Армій, партызанамі брыгады «Неуловимые», са сваякамі загінуўшых воінаў [15].

Асобна адзначым былога выпускніка Полацкага кадэцкага корпуса П. **Арла**, які пражываў у Маскве і напісаў успаміны «Горад Полацк у перадрэвалюцыйныя гады» (1959), якія з'яўляюцца цікавай крыніцай па гісторыі месца [16].

1986 – 2000-я гады. У 1985 годзе з пачаткам палітыкі «перабудовы» адбываюцца якасныя змены ў стане і выніках краязнаўчай справы на Полаччыне. Звязана было гэта са зменамі ў грамадска-палітычным жыцці краіны, правядзенні палітыкі «галоснасці». Не кранаючы зменаў у дзяржаўным накірунку краязнаўства (рэгіянальным аспекце дзейнасці музеяў, архіваў, НДІ АН БССР), коратка нагадаем пра дзейнасць грамадскіх арганізацый, у першую чаргу мясцовых аддзяленняў БДТАПГіК і новых, нефармальных гісторыка-культурных таварыстваў «**Маладзік**» і «**Вытокі**»), так як у асноўным менавіта асобы, якія бралі ўдзел у дзейнасці гэтых таварыстваў вызначыліся як найбольш актыўныя краязнаўчы другой паловы 1980-х – 1990-х гадоў. Сярод іх у сваю чаргу найбольш актыўнымі можна лічыць Ул. Арлова, С.М. Глушко, І. Залілава, Л.В. Малашэню, С. Сокалава (Сокалава-Воюша) і інш.

Праца грамадскага аб'яднання «Маладзік» была размеркавана па некалькіх секцыях: гісторыка-культурнай працы, удзелу ў рэстаўрацыйных работах, археалагічны, пошукавы (збор легенд, паданняў, звестак пра камяні, крыніцы). Удзельнікі таварыства ладзілі сустрэчы з цікавымі людзьмі (Н. Гілевічам,

Марачкіным, З. Пазняком, С. Навумчык), вандравалі па Беларусі (Баруны, Гальшаны, Друя, Камаі, Крэва, Навагрудак, Паставы, Опса). Члены таварыства выступілі супраць забудовы ў цэнтральнай частцы горада шматпавярховых будынкаў, якія б непапраўна змянілі б выгляд горада. Аматары даўніны ўдзельнічалі ў археалагічных раскопках у старажытнай частцы горада. Удзельнікі таварыства праводзілі святкаванні юбілейных дат: юбілея Полацкай акадэміі, юбілея І. Хруцкага ў в. Захарнічы, на перапахаванні праха І. Луцкевіча ў Вільні, выступілі з ініцыятывай аднаўлення помніка 1812 года [17].

Цяпер у алфавітным парадку прывядзем біяграмы асоб, дзейнасць якіх па вывучэнню Полаччыны прыйшлася на канец XX стагоддзя.

Аркуш Алесь, *Васіль Кроква* (сапр. Аляксандр Барысавіч Козік) (1960), пісьменнік, журналіст. Скончыў аддзяленне аўтатрактарнага электраабсталявання Жодзінскага політэхнікума (1979), планава-эканамічны факультэт БДІНГ (1987). Працаваў канструктарам на Беларускім аўтамабільным заводзе (1981), інжынерам на Наваполацкім заводзе «Вымяральнік» (1987 – 1988); карэспандэнтам у шматтыражцы «Знамя новостройки» Наваполацкага будтрэста № 16 (1988 – 1996), карэспандэнтам газеты «Витебский курьер М» (1996 – 2006). Стваральнік Таварыства Вольных Літаратараў (1993). Уваходзіў у літаратурную суполку «Тутэйшыя». З 1987 года жыве ў Полацку.

Займаецца даследаваннямі гісторыі Жодзіна, Полацка, а таксама гісторыяй беларускай літаратуры. Браў удзел у шэрагу краязнаўчых канферэнцый, якія праводзіў Полацкі дзяржаўны музей-запаведнік. Удзельнічаў у літаратуразнаўчых канференцыях, якія праводзіліся ПДУ, на якіх выступаў з дакладамі па гісторыі літаратурнага руху Полаччыны, даклады надрукаваны ў матэрыялах канферэнцый. Удзельнічаў у шэрагу канферэнцый у Познані, дзе чытаў даклады пра гісторыю замежных (скандынаўскіх і польскіх) уплываў на Полаччыну і пра пазацэнзурны друк Полаччыны ў 80 – 90 гадах XX стагоддзя. Аказаў дапамогу ў зборы матэрыялаў па беларускаму пазацэнзурнаму друку канца XX стагоддзя і па гісторыі літаратурнага таварыства «Тутэйшыя». Падтрымліваў адносіны з ГА «Дыярыюш».

Атрымаў прэмію за матэрыялы па гісторыі Полацкага аэрадрома. Асвятляе ў СМІ гісторыю Полацка. Аўтар шэрага артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку: часопісы «Дзеяслоў», «Arche», «Калосьсе», «Правінцыя», газет «Наша Ніва«, «Витебский Курьер М». Аўтар эсэ, у якіх асвятляюцца розныя бакі гісторыі і культуры Полаччыны. Некаторыя з іх надрукаваны ў кнізе «Аскепкі вялікага мазаіку» [18]. Аўтар тэксту гімна горада Полацка і песень шэрага рок-гуртоў: «Мясцовы час», «RIMA». Аўтар каля дзесяці зборнікаў паэзіі і двух зборнікаў эсэістыкі. Захоўвае вялікі архіў Таварыства Вольных Літаратараў. Старшыня арганізацыйнага камітэту літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес«.

Арлоў Уладзімір Аляксеевіч (1953), пісьменнік, краязнаўца. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1986). Краязнаўчую дзейнасць распачаў у студэнцкія гады. Займаецца даследаваннем гісторыі г. Полацка і Полаччыны. Актыўны арганізатар і ўдзельнік навуковых канферэнцый, літаратурных чытанняў і сустрэч. Аўтар шэрага артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым друку. Найлепшым краязнаўчым даследаваннем, прысвечаным роднаму краю, можна лічыць кнігу «Таямніцы Полацкай гісторыі» (1994, 2001), у якой на высокім мастацкім узроўні апісваюцца розныя старонкі гісторыі і культуры Полаччыны [19].

Глушкоў Сяргей Мікалаевіч (1947), краязнаўца. Займаецца комплекснымі даследаваннямі Полаччыны. Праводзіць росшукі і вывучэнне каменных крыжоў, святых крыніц, сакральных валуноў, капішч, мольбішч. Збірае легенды, паданні, вывучае тапаніміку горада і навакольляў. Робіць важную справу па адраджэнню памяці выдатных землякоў і асоб, звязаных з Полаччынай.

Сістэматычна пачаў займацца краязнаўчымі даследаваннямі з 1984 года, калі зацікавіўся геалагічнымі помнікамі прыроды. Пачаў вывучаць помнікі геалогіі (камяні, крыніцы). Выявіў шэраг незвычайных камянёў, месцаў былых капішчаў і перадаў звесткі пра іх у Інстытут геафізікі АН БССР. У 1987 годзе, калі на Полаччыне праводзілася экспедыцыя Інстытута геафізікі АН БССР, пад кіраўніцтвам Э. Ляўкова, В.Ф. Вінакурава, пачаў супрацоўнічаць з імі. Выявіў шэраг унікальных камянёў (больш 20) і сабраў пра іх фальклорны матэрыял. Цікавіцца тапанімікай. Для тлумачэння назваў шэрага айконімаў прыводзіць арыгінальныя версіі, добра абгрунтаваныя і абаснаваныя (назва мікрараёна «Грамы» каля Полацка, напрыклад, паходзіць ад таго, што там змяшчалася капішча Пяруна, які меў некалькі іншых імёнаў, сярод якіх – Гром). У цесным кантакце з навукоўцамі выявіў у в. Забалацце месца нараджэння Ганны Баляславаўны Місуна (першага геолага-жанчыны), дадаследаваў Бікульніцкае капішча, каля воз. Янова. Разам з іншымі полацкімі краязнаўцамі і праўнучкай І. Хруцкага Ядзвігай Аляксандраўнай Мацяеўскай, выявілі месца, дзе ў в. Захарнічы была магіла вядомага мастака, яго брата Андрэя і добраўпарадкавалі іх. У 1998 годзе на месцы пахавання быў узведзены помнік (арх. Гвоздзікаў), які пазней, на жаль быў знішчаны вандаламі.

На працягу трох гадоў, разам з іншымі полацкімі краязнаўцамі вёў даследчыцкую работу па аднаўленню імя адмірала Павалішына, сядзіба якога знаходзілася ў в. Янкавічы, на мяжы Полацкага і Расонскага раёнаў. Дзякуючы старанням, было адноўлена імя вядомага земляка. У в. Янкавічы імем адмірала названа вуліца, школа, паляўнічы домік. Усталявана шыльда на месцы пахавання Павалішына. Прыцягнуў увагу і займаецца даследаваннямі лёса выдатнага беларускага мастака Яфіма Спажынскага, які жыў і працаваў у Полацкім павеце на мяжы XVIII – пач. XIX стагоддзя. Даследуе жыццёвы шлях і сувязі генерала Кульнева з Полаччынай. Аўтар шэрага артыкулаў у мясцовым перыядычным друку [20]. Удзельнік устаноўчага з'езда па арганізацыі БКТ (снежань 1989), быў абраны ў Цэнтральную Раду ад Полацкай акругі.

Баўтовіч Міхась Мікалаевіч (1957), краязнаўца. Займаецца даследаваннямі Полацка і навакольля, царкоўным краязнаўствам. Актыўны ўдзельнік экспедыцый па Полаччыне: Полацк – Друя – Дрысвяты, Полацк – Свір – Гальшаны (1990), Полацк – Себеж – Невель (1999) і інш. Удзельнік шэрага краязнаўчых і рэгіянальных канферэнцый (1996). Аўтар кніг «Полацкія пакутнікі» (1999), «Вянок акафістаў» (2000), «Эпісталяцыя Сьвятого Езафата» (2006). Браў удзел у стварэнні даведніка «Архіў уніяцкіх мітрапалітаў» (1999). Узначальвае полацкае грэка-каталіцкае выдавецтва «Сафія».

Падрыхтаваў да друку і выдаў кнігу «Полацкая даўніна» паводле рукапісу І.П. Дэйніса з аўтарскімі замалёўкамі розных аб'ектаў Полацка (на беларускай мове), аўтар прадмовы і нарыса пра І.П. Дэйніса [21].

Данько Леў Фёдаравіч (1969), краязнаўца. Займаецца комплексным даследаваннем Полаччыны, аддаючы перавагу асобным пытанням царкоўнага краязнаўства, археалогіі Полацка, нумізматыцы, вывучэнню каменных крыжоў, культавых камянёў, выдавецкай дзейнасці. Мае шырокую эрудыцыю, валодае добрым слогам. У час працы ў ПДУ стаў адным з арганізатараў гістарычнага клуба, пазней гісторы-культурнага таварыства «Полацкі рубеж», які існаваў пры музеі гісторыі ПДУ. У час працы ў ПКМ браў удзел у навукова-практычных канферэнцыях (1987, 1992). Стаў ініцыятарам, рэдактарам і выдаўцом гісторыка-культурнага альманаха «Полацкі летапісец» (выйшла 2 нумары (1992, 1993). Змясціў у іх некалькі сваіх артыкулаў, а таксама надрукаваў у № 1 успаміны палачаніна Міхаіла Андрэева, прысвечаных пошукам падземных хадоў у Полацку. Выдаў 3 кнігі ў «серыі «Бібліятэка «Полацкага летапісца»: Д.М. Володихин «Спорные вопросы истории Беларуси», А.П. Сапунов «Заметка о коллегии иезуитов в Полоцке», В.В. Новодворский «Взятие Полоцка войсками Стефана Батория в 1579 г.».

З другой паловы 1980-х гадоў распачалося шырокае развіццё школьнага краязнаўства на Віцебшчыне. На Полаччыне ў канцы XX стагоддзя распачалі і працягваюць на цяперашні час такія краязнаўцы-педагогі: У.П. Драбышэўскі, В.П. Карасёў, А.К. Краснова, В.Я. Сітлзікава. Да ліку ***школьных краязнаўцаў***, якія вывучалі Полаччыну на працягу канца XX стагоддзя аднясем наступных:

Драбышэўскі Уладзімір Паўлавіч (нар. 1936, г.п. Ветрына), краязнаўца. Працаваў настаўнікам, намеснікам дырэктара, дырэктарам Зялёнкаўскай СШ Полацкага раёна (1959 – 2006). Займаецца даследаваннем партызанскага руху і гісторыяй народнай адукацыі на Полаччыне. Вывучаць родны край стаў працуючы ў школе. Пэўны ўплыў на дзейнасць У.П. Драбышэўскага аказаў М.А. Маніс. Стварыў у Зялёнкаўскай СШ музей баявой славы. Бярэ ўдзел у рэгіянальных навуковых канферэнцыях. Аўтар артыкулаў у мясцовым перыядычным друку («Полацкі веснік»).

Карасёў Віктар Раманавіч (1937), краязнаўца. Краязнаўчымі даследаваннямі стаў займацца з 1994 года. Значны ўплыў на фарміраванне як краязнаўчы аказаў А. Падліпскі. Вывучае гісторыю роднага Ветрына і Полаччыны. Сярод найбольш значных дасягненняў адзначым наступныя. Знайшоў месца пахавання беларускага і рускага этнографа, археолага, фальклярыста, краязнаўцы А.М. Семянтоўскага. Намаганнямі аматара быў устаноўлены памятны знак на магіле. Адшукаў і апублікаваў матэрыялы пра братоў Івана і Антона Весценбергаў, якія з'яўляліся партызанскімі разведчыкамі і былі расстраляны фашыстамі вясной 1944 года. Адзін з ініцыятараў і стваральнікаў музея Ветрына і музея Ветрынскай школы. Актыўна ўдзельнічае ў грамадскім і культурным жыцці краю. З'яўляецца членам раённага каардынацыйнага Савета па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (з 2000 г.), літаратурнага аб'яднання «Паддзвінне». Бярэ ўдзел міжнародных, рэспубліканскіх і абласных канферэнцыях краязнаўчай накіраванасці.

Аўтар шэрага артыкулаў у мясцовым і рэспубліканскім перыядычным друку [22]. На аснове шматлікіх матэрыялаў сабраных на працягу дзесяцігоддзяў напісаў кнігі, прысвечаныя роднаму кутку і Ветрынскай школе: «Ветрына і навакольле», «Мая любоў Ветрына», «Сэрца майго часцінка».

Краснова Аліна Канстанцінаўна (1941), педагог, краязнаўца. Краязнаўчую дзейнасць распачала з сяр. 1980-х гадоў. У 1988 годзе адкрыла школьны музей «Беларуская хатка», у 1998 – музей Б.І. Эпімаха-Шыпілы. Вялікі ўплыў на станаўленне як краязнаўца аказаў А.В. Куржалаў. Асноўныя тэмы даследаванняў: жыццё славутых землякоў, літаратурнае краязнаўства і этнаграфічная спадчына рэгіёну пражывання. Распрацоўвае тэмы «Гісторыя славутага роду Эпімах-Шыпілаў», «Народныя святы Ветрыншчыны», «Свята рушніка», «Беларуская рукапісная хрэстыматыя Б.І. Эпімах-Шыпілы» [23]. Брала ўдзел у навукова-практычных і краязнаўчых чытаннях, якія ладзіліся ДАВВ, НАРБ, ДАМЛіМ, літаратурным дзяржаўным музеям Я. Купалы, інстытутам літаратуры імя Я. Купалы НАН Беларусі. Аўтар шэрага артыкулаў у рэспубліканскім і мясцовым другу («Настаўніцкая газета», «Полацкі веснік»). З'яўляецца ўкладальнікам кнігі «Б.І. Эпімах-Шыпіла і яго час» (2004).

Сітдзікава Вольга Яўгенаўна (1971), настаўніца. Выкладае біялогію ў Ветрынскай СШ Полацкага раёна. Даследуе палацава-паркавыя комплексы, сядзібы, помнікі прыроды Полаччыны. Вывучае гісторыю праваслаўных храмаў у Полацкім раёне, тапаніміку і нумізматыку месца пражывання [24].

На канец 1980-х гадоў прыходзіцца пачатак краязнаўчай працы шэрага **навукоўцаў-палачан**: І.М. Шарухі, У.А. Лобача, Д. Дука.

Дук Дзяніс Уладзіміравіч (1977), гісторык, археолаг. Краязнаўчую дзейнасць распачаў з 1996 года пад уплывам дзейнасці Г.В. Штыхава, С.В. Тарасава, А.А. Егарэйчанкі. Даследуе археалогію сярэднявечча Полаччыны, археалогію Полацка сярэднявечча і ранняга Новага часу. Штогод праводзіць археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Полацка і Полацкага раёна.

Лобач Уладзімір Аляксандравіч (1972), гісторык, этнограф. Займаецца вывучэннем традыцыйнай духоўнай культуры (фальклору, каляндарных і сямейных рытуалаў, магічнай практыцы, народнай медыцыны, даследуе этнастэрэатыпы і светапоглядную сістэму і сакральную геаграфію Беларускага Падзвіння. На працягу шэрага гадоў удзельнічае ў комплексных этнаграфічных экспедыцыях па раёнах Віцебскай вобласці і сумежных раёнах Расійскай Федэрацыі (з 1992 г.).

Шайкоў Васіль Іванавіч (1954), гісторык. Даследуе гісторыю Полацка 2-й пал. XVIII – пач. XX стагоддзяў адзін з аўтараў зборнікаў навуковых прац «Полацк: карані нашага радаводу» (1996).

Шаруха Ігара Мікалаевіча (1968), педагог, географ. Асноўнымі кірункамі краязнаўчых даследаванняў з'яўляюцца: гісторыя геаграфічнага вывучэння Беларусі, тапаніміка, культурная геаграфія Беларусі, складанне геаграфічна-статыстычных слоўнікаў. Бярэ актыўны ўдзел у міжнародных і рэгіянальных канферэнцыях (больш за 50). Аўтар больш за 500 артыкулаў. Асаблівую ўвагу выклікае «Геаграфічна-статыстычны слоўнік Полацкага раёна» (1990), які мае больш за 3 тыс. апісаных геаграфічных аб'ектаў па раёну) [25].

На жаль, па розных прычынах, не атрымалася знайсці інфармацыю пра І.І. **Каліноўскага**, І.З. **Залілава**, а таксама музейных работнікаў Т.А. **Джумантаевай**, В.Д. **Краско** пачатак краязнаўчай дзейнасці якіх прыпадае на канец XX стагоддзя.

На працягу другой паловы XX стагоддзя краязнаўцы Полаччыны зрабілі значны ўклад у вывучэнне краю, ахову помнікаў даўніны, пошукавы рух, папулярызацыю і прапаганду гісторыка-культурнай спадчыны. Важнай асаблівасцю гэтага перыяду з'яўлялася вывучэнне гісторыі ў асноўным савецкага перыяду, разгляд падзей праз прызму маркісцка-ленінскай ідэалогіі. З канца 1980-х гадоў ідэалагічныя абмежаванасці знікаюць, назіраецца павелічэнне тэматыцы даследаванняў, адраджэнне нацыянальнай спадчыны Беларусі, плюразізм думак, рост грамадскіх арганізацый краязнаўцаў накіраванасці. Набыткі краязнаўцаў другой паловы XX стагоддзя з'яўляюцца важным падмуркам для сучаснага развіцця краязнаўства.

ЛІТАРАТУРА

1. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI веке – 30-е годы XX века / Л.В. Алексеев. – Минск: Беларус. навука, 1996. – 206 с.; Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.; Півавар, М.В. Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.: даведнік / М.В. Півавар. – Віцебск: Віцебск. абл. друкарня, 2006. – 176 с.
2. Дэйніс Пятро Язэпавіч – выдатны полацкі краязнаўца // Нац. Полац. гіст.-культ. музей-запаведнік: матэрыялы навук.-практ. канф. (па выніках навук.-даследч. работы ў 2005 г., люты 2006 г.). – Полацк, 2006; Баўтовіч, М. Полацкі храніст / М. Баўтовіч // Дэйніс І.П. Полацкая даўніна. – Мінск: Медисонт, 2007. – С. 3 – 4.
3. Дэйніс, І.П. Полацкая даўніна / уклад. М. Баўтовіч. – Мінск: Медисонт, 2007. – 330 с.
4. Ніжні замак у Полацку // Помнікі гісторыі культуры Беларусі. – 1983. – № 2; Нижний замок в Полоцке // Полоц. истор.-культ. заповедн. Личный фонд И.П. Дейниса. Кн. 21422/8 // Полоцкая старина. Ч. 4. – С. 78 – 85; Такім быў 1918 г. // Сцяг камунізма (СК). – 1968. – 1.01; Легенды аб святых машчах // СК. – 1973. – 15.06; Ірага да ведаў // СК. – 1977. – 01.05; Курсы чырвоных камандзіраў // СК. – 1978. – 04.02; Пра мінулае роднага краю // СК. – 1978. – 28.07; Раніца новага жыцця // СК. – 1978. – 28.12.; У першы раз пасля вайны // СК. – 1980. 01.01; Масква, Крэмль, правадыру пралетарыяту // Звязда. – 1980. – 20.04.
5. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 726.
6. Полацк у гады 1-й сусветнай вайны // СК. – 1974. – № 34, 39, 41, 43, 49; Вялікі Кастрычнік і ўстанаўленне Савецкай улады на Полаччыне // СК. – 1974. – № 53; 58; 64; 65; 78; 81; 85 – 87; 92; Працоўныя Полаччыны змагаюцца ў барацьбе з казейраўскімі захопнікамі // СК. – 1974. – № 93; 98; 108; 114; 117; У першых радах абаронцаў завадў Кастрычніка // СК. – 1977. – № 129; Барацьба палачан з белапольскімі акупантамі // СК. – 1977. – № 139; На шляху сацыялістычнага будаўніцтва. Аднаўленне народнай гаспадаркі // СК. – 1977. – № 27.08; 14.09.; Полацк у гады першых пяцігодак // СК. – 1977. – 23.09; 30.09; 14.10; Вернасць сцягу // СК. – 1980. – 08.07; Народжаны ў агні рэвалюцыі (60 год ЛКСМБ) // СК. – 1980. – 15.08; Паражэнне ворага: Аб гераічнай абароне Полацка ў вайне 1812 г. // ПГКБ. – 1982. – № 4; Масква, Крэмль, Леніну // ВР. – 1980. – 20.04. – С. 2; Старшыня ваенрэўкома // ВР. – 1982. – 7.11. – С. 2; Юнацтва, апаленае агнём [У. Шкірэнка] // СК. – 1985. – № 15. – С. 3; Слаўны сын Полаччыны [Чувахоў В.] // СК. – 1985. – № 52. – С. 3; Настаўнікі [ветэраны] // СК. – 1985. – № 134. – С. 2; Застаецца ў страі [У.А. Германовіч] // СК. – 1985. – № 161. – С. 2; Шляхамі цяжкіх перамог [да 75-годдзя Г. Гародніка] // СК. – 1986. – № 19. – С. 4; Апаліла полымя вайны [В.Я. Баханькоў] // СК. – 1986. – № 28. – С. 3; І з Одэра вады адведаў [І.А. Сухарукаў] // СК. – 1986. – № 138. – С. 2; Рэвалюцыя крочыць па Полацкай зямлі [лета 1918 г.] // СК. – 1987. – № 108, 153, 156; Народжаная ў полымі рэвалюцыі. Пачатковыя старонкі летапісу Полацкай камсамольскай арганізацыі // СК. – 1988. – № 131. – С. 2; Кастрычнік у лёсах працоўных Полацка // СК. – 1988. – № 204, 205; За ўладу Саветаў [100 год Анучыну С.А.] // СК. – 1989. – № 165. – С. 3; Полаччына, 1905 год // СК. – 1990. – № 16. – С. 2, 3; Палачане – Леніну // СК. – 1990. – № 63. – С. 1, 2; У тыя вогненныя дні (па старонках памяці і газеты «Бальшавіцкі шлях») // СК. – 1990. – № 101 – 104; Ворагу не скарыліся [жыхары ўсходняй часткі раёна ў 1941 – 1944 гг.] // Полацкі веснік (ПВ). – 1993. – № 96, 99, 103. – 1994. – № 12; Яны былі першымі [3-я Беларуская партызанская брыгада] // ПВ. – 1994. –

№ 52. – С. 2; Святло з усходу [вызваленне раёна] // ПВ. – 1994. – № 53. – С. 2; Полацкая Хатынь [в. Сосна] // ПВ. – 1995. – № 30. – С. 2; Памяць аб ім незабыўная [Сухавей С.В.] // ПВ. – 1995. – № 78. – С. 3; Жудасная расправа гітлераўцаў над патрыётамі Полацка [20.09. 1942 г.] // ПВ. – 1995. – № 84. – С. 2.

7. (разам з М. Манісам) Айчынная вайна 1812 г. на Полаччыне Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацкага раёна. – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 55 – 56; Гений русского военного искусства Кульнев Яков Петрович. – СПб., 2005. – 71 с.
8. Маніс, М. След на зямлі / М. Маніс // СК. – 1985. – 13.12. – С. 2; Клокаў, С.А. Некралог / С.А. Клокаў // ПВ. – 1993. – № 2. – С. 4; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка горада Полацка. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 725.
9. Ліхачоў, У. Ветэран, патрыёт, камуніст / У. Ліхачоў // СК. – 1987. № 21. – С. 2; Вільчынскі, І.С. Некралог / І.С. Вільчынскі // ПВ. – 1999. – № 2. – С. 4.
10. Дзеля жыцця на зямлі // СК. – 1978. – № 73. – С. 2; Радаснае свята вызвалення // СК. – 1978. – № 103. – С. 2; Незабыўная сустрэча // СК. – 1979. – № 102. – С. 2; Дзеля жыцця на зямлі [Сушкоў] // СК. – 1979. – № 142. – С. 3; На ўсё жыццё // СК. – 1980. – № 7. – С. 2; (разам з У. Ліхачовым). Аперацыя «Баграціён» і вызваленне Полаччыны // СК. – 1980. – № 67, 69, 73, 85; (разам з У. Ліхачовым). Над Полацкам сцяг вызвалення // СК. – 1980. – № 104. – С. 2; Імя І.А. Краснова // СК. – 1985. – № 72. – С. 3; Імя П.У. Сушкова // СК. – 1985. – № 90. – С. 3; Аб загінуўшых памяць // СК. – 1985. – № 102. – С. 3; Імя генерала Бабахіна // СК. – 1985. – № 105. – С. 2; Імя Магалашвілі // СК. – 1986. – № 31. – С. 3; Набліжалі перамогу [Катушаў Г.Р.] // СК. – 1986. – № 104. – С. 2; Трывожаць раны генерала [А.Я. Хвастоў] // СК. – 1986. – № 174. – С. 3; Освобождал Полотчину [М.М. Броннікаў] // Химик. – 1987. – № 12. – С. 2; Камкоры // СК. – 1987. – № 105. – С. 2; Пахаваны на плошчы [І.Ф. Марахоўскі] // СК. – 1988. – № 104. – С. 3; Узнагароджаны за вызваленне Полацка [М.С. Самасенка] // СК. – 1988. – № 116. – С. 3.
11. Ліхачоў, У. Некралог / У. Ліхачоў // ПВ. – 1994. – № 86. – С. 4; Кірылаў, Г.І. Ліхачоў, У.І. // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка горада Полацка. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 811.
12. (разам з І. Вільчынскім). Аперацыя «Баграціён» і вызваленне Полаччыны // СК. – 1980. – № 67, 69, 73, 85; Наперадзе атакуючых [Чэркас] // СК. – 1980. – № 72. – С. 2; (разам з І. Вільчынскім). Над Полацкам сцяг вызвалення // СК. – 1980. – № 104. – С. 2; Рэвалюцыя 1905 г. на Полаччыне // СК. – 1985. – № 3. – С. 2; Яркае святло ў жыцці [А.Д. Пятрова] // СК. – 1985. – №38. – С. 2; Чапаеў у баях за Полацк // СК. – 1985. – № 39. – С. 2; За вёску Троіцкае // СК. – 1985. – № 60. – С. 2; Помніць герояў зямля Полацкая // СК. – 1985. – № 66. – С. 2; Ад Масквы да Берліна [П.С. Чэркас] // СК. – 1985. – № 71. – С. 2; У 41-м пад Полацкам // СК. – 1985. – № 91, 92; Імя Зыгіна // СК. – 1985. – № 106. – С. 2; Палачанін Якаў Купрыянаў // СК. – 1985. – № 174. – С. 2, 3; (разам з Ф. Пятуховым) Дзеля праўды [1944] // СК. – 1985. – № 191. – С. 3; Самая памятная // СК. – 1986. – № 1. – С. 4; Салдаты сорак першага // СК. – 1986. – № 102. – С. 2, 3; «І цень густы Дзвіны» [М. Стэльмах] // СК. – 1986. – № 104. – С. 3; Свята вуліцы // СК. – 1986. – № 106. – С. 2; Хлопцы з Полаччыны [танкісты] // СК. – 1986. – № 145. – С. 2, 4; Байцы вогненнага фронту // СК. – 1986. – № 146. – С. 3; Прамой наводкай [С.С. Жукаў] // СК. – 1986. – № 198. – С. 2; Ветэран, патрыёт, камуніст [І.С. Вільчынскі] // СК. – 1987. – № 21. – С. 2; Ён штурмаваў Зімні [В.С. Барэйка] // СК. – 1987. – № 44. – С. 2; За ўладу Саветаў [Н.Ш. Сіма-ноўскі] // СК. – 1987. – № 59. – С. 2; Герой у рабочым страі [В.А. Пашкевіч] // СК. – 1987. – № 73. – С. 3; Грамілі ворага чапаеўцы // СК. – 1987. – № 105. – С. 2; Праз тры вайны [сям'я Свірко] // СК. – 1987. – № 115. – С. 3; Ганаровы чыгуначнік [А.В. Глебаў] // СК. – 1987. – № 121. – С. 2; Светлая памяць аб генерале Бацанаве // СК. – 1987. – № 122. – С. 3; Звагаўся за Полацк герой з Арла [В.А. Дзямідаў] // СК. – 1987. – № 136. – С. 3; Любіце і шануйце свой горад [Казлоў І.П.] // СК. – 1987. – № 166. – С. 2; Гэтых дзён не змоўкне слава [В.І. Партноў] // СК. – 1987. – № 167. – С. 2; З вінтоўкай і партбілетам [І. Дабровольскі] // СК. – 1987. – № 172. – С. 2; У гарачым небе Афганістана [В.В. Шчарбакоў] // СК. – 1988. – № 17. – С. 3; Кавалер ордэна Чырвонага сцяга [Д.П. Сяржантаў] // СК. – 1988. – № 72. – С. 2; Воін, педагог, патрыёт [П.К. Пацей] // СК. – 1988. – № 114. – С. 2; Камбрыг Зыгін // СК. – 1988. – № 119 – 122; Подзвіг Лілії Касценка // СК. – 1988. – № 170, 171; Увекавечыць памяць героя [Корнеў Л.С.] // СК. – 1989. – № 24. – С. 3; Герой Савецкага Саюзу Грыгор'еў Аляксандр Іванавіч // СК. – 1989. – № 93. – С. 2; Памяць сэрца [А.Р. Марозаў] // СК. 1989. – № 102. – С. 2; «Полацк зноў савецкі» [П.Н. Бардоў] // СК. – 1989. – № 103. – С. 2; Выратаваў сцяг [А.М. Герасімаў] // СК. – 1989. – № 176. – С. 3, 4; Хто ведае Пісарэнку? // СК. – 1989. – № 200. – С. 2; У нас была вялікая вера ў перамогу [А.З. Сутармін] // ПВ. – 1990. – № 19. – С. 2; Абарона Полацка [І.В. Івах] // ПВ. – 1990. – № 31. – С. 3; Герой Савецкага Саюза палачанін А.Я. Пісарэнка // ПВ. – 1990. – № 34. – С. 4; Уліца імя Валогіна // ПВ. – 1990. – № 51. – С. 2; Імя Айтыкава // ПВ. – 1990. – № 87. – С. 2; Наш зямляк – герой двух войнаў [Д.Д. Валенцік] // ПВ. – 1990. – № 95 – 97; Імя Халеева // ПВ. – 1990. – № 104. – С. 3; Душэўнасць [Я.Я. Славін] // ПВ. – 1990. – № 109. – С. 2; Герой вайны – полацкі чыгуначнік // ПВ. – 1990. – № 122. – С. 3; Залічыце мяне ў партызаны // ПВ. – 1990. – № 131. – С. 2; Штурмуючы ДОТы [М.В. Рапейка] // ПВ. – 1990. – № 134. – С. 2; Загінуў пад Полацкам [А.Ц. Федаровіч] // ПВ. – 1990. – № 166. – С. 3; Быццам легенда [70-годдзе З.М. Тусналобавай-Марчанка] // ПВ. – 1990. – № 184. – С. 2; Палкаводзец і яго сын [У.В. Блюхер] // ПВ. – 1990. – № 190. – С. 3; Памяць салдацкая [С.А. Сергіеўскі] // ПВ. – 1991. – № 8. – С. 3; Памятую ракавую нядзелю [Ф.Д. Яўчэнка] // ПВ. – 1991. – № 70. – С. 2; Загінуў пад Полацкам у 1941-м [А.М. Васін] // ПВ. – 1991. – № 78. – С. 2; На прамой наводцы [А.Л. Фурман] // ПВ. – 1991. – № 79. – С. 2; Камендант Полацкага ўмацаванага раёна [А.Л. Дэві]

// ПВ. – 1991. – № 114. – С. 2; Дзе пахаваны радавы Фёдар Палянок? // ПВ. – 1991. – № 120. – С. 2; Артылерыст Зуеў // ПВ. – 1991. – № 130. – С. 2, 3; Хто падтрымае? [аб выданні кнігі «Героі-палачане»] // ПВ. – 1992. – № 2. – С. 2; Ручнікі [М.М. Пятрэнка] // ПВ. – 1992. – № 92. – С. 2, 3; Доблесць палачаніна [І. Аляксееў] // ПВ. – 1993. – № 5. – С. 2, 3; З кагорты першых [С.Ф. Васільеў] // ПВ. – 1993. – № 37. – С. 3; Мужнасць абаронцаў Полацка // ПВ. – 2001. – № 78, 80, 86; Абарона Полацка // ПВ. – 2004. – № 7 – 8, 15, 30, 33, 43.

13. Герои-полочане. Полоцк: Полоцкая тип. им. Ф. Скорины. – 111 с.; За свабоду Іспаніі [П.Е. Купрыянаў] // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацкага раёна. – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 130; У першыя дні вайны // Тамсама. – С. 133 – 134; Абарона // Тамсама. – С. 134 – 138.
14. Фамін, М.І. Некралог / М.І. Фамін // ПВ. – 1993. – № 46. – С. 4.
15. Черноок, С. Учитель – профессия не из легких? / С. Черноок // Иформ Пресс. – 2001. – № 41. – С. 3.
16. Арлоў, У. Таямніцы Полацкай гісторыі / У. Арлоў. – 2-е выд. – Мінск: Полымя, 2002. – С. 415.
17. Гісторыка-краязнаўчы клуб пачынае дзейнічаць // СК. – 1988. – 3.12. – С. 3; Малашэня, Л. Клуб «Вытокі». Закаханых у Бацькаўшчыну цяжкасці не засмучаюць / Л. Малашэня // СК. – 1990. – 1.08. – С. 3
18. Аркуш, А. Аскепкі вялікага малюнку / А. Аркуш. – Мінск: выд. І.П. Логвінаў, 2007. – 136 с.
19. Таямніцы Полацкай гісторыі. – 2-е выд. – Мінск: Полымя, 2002. – 464 с.
20. Ушануем славутага земляка [І.Ф. Хруцкі] // СК. – 1987. – № 2. – С. 3; Достоин памяти потомков [І. Хруцкі] // Химик. – 1987. – № 9. – С. 2 Ці ўмеем паважаць продкаў // СК. – 1987. – № 85. – С. 2; Мадэрн каля старых муроў // СК. – 1987. – № 120. – С. 3; Валун у гонар Чэрскага // СК. – 1988. – № 144. – С. 4; Да Вас, сучаснікі мае // СК. – 1989. – 4.08.; Краязнаўчы з'езд // СК. – 1990. – 9.01.; Хто мы такія? // ПВ. – 1999. – № 95. – С. 3; Масты: паміж мінулым і будучым // ПВ. – 2002. – 29.12.; Пра тое, што побач // ПВ. – 2003. – 3.10.; Прости нас, Волово озеро! // ПВ. – 2003. – 31.10.; Тое, што побач [могілкі першай сусветнай вайны] // ПВ. – 2004. № 15. – С. 5; З надзеяй на ўваскрашэнне [сядзіба і магіла адмір. Павалішына] // ПВ. – 2004. – № 106 – 107. – С. 6; (разам з К.М. Анціпавым) Илларион Афанасьевич Повалишин // ГлРс. – 2004. – 20.04; Чистая житие... // ПЕв. – 2005. – сакавік; (разам з Анціпавым К.М.) Семья Повалишиных // ГлРс. – 2006. – 27.09; (разам з К.М. Анціпавым) Новое о Повалишиных // ГлРс. – 2006. – 4.08; (разам з К.М. Анціпавым) Новое о Повалишиных // ГлРс. – 2006. – 8.08; Преподобный Варсонофий Оптинский // Вестник культуры. – 2007. – № 6.
21. Архіў уніяцкіх мітрапалітаў: Дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XV – XIX стст. у фондзе «Канцылярыя мітрапаліта грэка-уніяцкіх цэркваў у Расіі»: Даведнік / БелНДІДАС. Полац. грэка-катал. грамада; склад.: С.І. Паўловіч, Т.М. Мальцава; навук. рэд.: М.Ф. Шумейка, М.М. Баўтовіч. – Мінск: БелНДІДАС; Полацк: Грэка-катал. рэлігійн. грамада, 1999. – 385 с.; Эпісталяцыя архібіскупа полацкага Язафата Кунцэвіча // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV Міжнар. навук. канф. – Полацк, 2003. – С. 7 – 14; Эпісталяцыя Сьвятога Язафата: Зб. дакум. / уклад. М. Баўтовіч. – Полацак: Грэка-каталіцкая парафія Сьвятапакутніка Язафата, 2006. – 144 с.; Горад сэрца – Архэ. – 2006. – № 6; Полацкі храніст // Дэйніс І.П. Полацкая даўніна. – Мінск: Медисонт, 2007. – С. 3 – 4; Балтызмы ў беларускіх гаворках як адзнака этнічных працэсаў // Радзіма майго духу / Radzima.org. [Электронны рэсурс]. – 2002. – Рэжым доступу: http://radzima.org/pub/artykul.php?sn=12. – Дата доступу: 27.11. 2008.
22. У гонар героя [І.Е. Аляксееў] // СК. – 1985. – № 63. – С. 2; Яшчэ раз пра Ганну Місуну // ПВ. – 1998. – 16.12. – С. 2; Найвялікшае шчасце – служыць людзям [Ракомса М.П.] // ПВ. – 1999. – № 6. – С. 2; Так пачыналася вайна. Старонкі гісторыі Ветрына // ПВ. – 1999. – № 59. – С. 3; Ветрына – чэрвень 1944-га // ПВ. – 1999. – № 63. – С. 3; Лётчык з Дубраўкі [Ф. Барэйка] // ПВ. – 1999. – № 71. – С. 3; Маршал Чуйкоў В. і Полаччына // ПВ. – 1999. – № 81. – С. 2; Восень 1939-га: час уз'яднання // ПВ. – 1999. – № 82. – С. 2; Тут кропка адліку яго высокага ўзлёту [касманаўт У. Залескі з в. Бабынавічы] // ПВ. – 2000; Юны абаронца Брэсцкай крэпасці жыў і вучыўся ў Ветрына // ПВ. – 2000. – № 16, 18; Сяброўкі-медсёстры // ПВ. – 2000. – № 20. – С. 2; І такія былі маладыя хлопцы // ПВ. – 2000. – № 37. – С. 4; Крылы дала Полаччына [У.Ф. Лабок] // ПВ. – 2000. – № 68. – С. 3; Чараўнік роднага слова [М.Р. Суднік] // ПВ. – 2000. – № 93. – С. 2; Хрысціянскія храмы Ветрынчыны // ПВ. – 2001. – № 57, 58; Багатая на ўраджай восень яе жыцця [А.В. Яцкевіч] // ПВ. – 2001. – № 67. – С. 2; З кагорты юных абаронцаў Айчыны // ПВ. – 2002. – № 16, 17; Этнограф, гісторык, патрыёт [А.М. Семянтоўскі] // ПВ. – 2002. – № 66. – С. 3; Даніна памяці. Генацыд яўрэяў у Ветрына // ПВ. – 2002. – № 89. – С. 3; Засталіся маладымі [В. Біганава, Г. Вайтовіч] // ПВ. – 2003. – № 22. – С. 7; Руплівец роднага слова [М.Р. Суднік – дырэктар Ін-та мовазн. АН БССР] // ПВ. – 2003. – № 95. – С. 10; (разам з Яцкевіч У.) Добры чалавек [М.М. Сівіцкі] // ПВ. – 2003. – № 100. – С. 3; Дзяцінства, растралянае вайной // ПВ. 2004. – № 77. – С. 8; Настаўнік, камбрыг, дзяржаўны дзеяч [Цябут] // ПВ. – 2004. – № 74 – 75. – С. 7; Подзьвіг маці [Д.Р. Мялешка] // ПВ. – 2005. – № 99 – 100. – С. 2; У гонар землякоў-пісьменнікаў [В. Гарбук, М. і С. Сямашкі] // ПВ. – 2006. – № 54, 56, 64; Яе мялікасць – маці // ПВ. – 2006. – № 33. – С. 5; Герой, які служыў Айчыне не памірае [ген. Кульнеў] // ПВ. – 2007. – 24.07. – С. 4.
23. Пошукава-даследчая работа музея Браніслава Эпімах-Шыпілы // 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі: матэрыялы навук. канф., Віцебск, 24 лістап. 1999 г. – Мінск: БелНДІДАС, 2000. – С. 75 – 80.
24. Шпакоўская, Г. Кожны край – скарбонка гісторыі / Г. Шпакоўская // Народ. Слова. – 2007. – 13.11. – С. 5.
25. Арлоў, У. Таямніцы Полацкай гісторыі / У. Арлоў. – 2-е выд. – Мінск: Полымя, 2002. – С. 159.

АБРУСЫ З КАЛЕКЦЫІ «ТКАНІНА (ТЭКСТЫЛЬ)» У ФОНДАХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПОЛАЦКАГА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА МУЗЕЯ-ЗАПАВЕДНІКА

Ю.С. ПРАКОФ'ЕВА
(Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік)

Прадстаўлен агляд абрусаў з калекцыі «Тканіна (тэкстыль)», якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Асвятляецца гісторыя стварэння і камплектавання, храналагічныя і геаграфічныя рамкі калекцыі тканых вырабаў. Даследуюцца метрычныя характарыстыкі абрусаў, матэрыял тканіны, тэхнікі выканання, форма, характар кампазіцыі дэкору, арнамент. Паводле вывучэння музейнага збору прыйшлі да высновы, што абрусы з калекцыі маюць разнастайнае лакальнае аблічча, заключанае ў мастацка-тэхналагічным вырашэнні і характары выкарыстання вырабаў.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік пачаў фарміравацца ў верасні 1967 года. У 1968-м з'явілася «Положение об историко-археологических заповедниках»; 20 лістапада Полацкі гарадскі савет дэпутатаў прымае «Пастанову аб ахоўнай зоне вакол Сафійскага сабора». Такім чынам, паступова пачынаюць складвацца ўмовы для даследавання, рэстаўрацыі і музеефікацыі помнікаў архітэктуры і археалогіі Полацка і Полацкай зямлі. У 1990 годзе прымаюцца і зацвярджаюцца пастановы «О Полоцком историко-культурном заповеднике» і «О Полоцком историко-культурном заповеднике республиканского значения». На сённяшні дзень у складзе запаведніка, які ў 1997 годзе пачаў называцца гісторыка-культурным музеем-запаведнікам, а з 2004-га – Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам, працуюць 11 музеяў [1].

Адным з асноўных накірункаў у рабоце запаведніка з'яўляецца навукова-даследчая работа, якая ўключае навуковае камплектаванне, рэстаўрацыю, захоўванне фондаў, экспазіцыйна-выставачную, метадычную і адукацыйна-выхаваўчую работу. На базе НПГКМЗ праводзіцца музеефікацыя унікальнай гістарычнай тэрыторыі Полацка у адпаведнасці з профілямі існуючых і будучых музеяў, па наступных накірунках: музеялогія, гісторыя, архітэктура, археалогія, літаратура, мастацтва, беларускае кнігадрукаванне, выдавецкая дзейнасць, педагогіка, музейная сацыялогія, прырода краю, экалогія, этнаграфія.

Навуковая арганізацыя фондаў фіксуе значэнне музейных прадметаў для навукі, культуры ў цэлым і непасрэдна для дадзенага музея, а таксама іх пэўнае юрыдычнае палажэнне, стварыць умовы, якія б спрыялі захаванню, даследаванню і выкарыстанню ў музейных мэтах. Аб'яднаныя фонды запаведніка ўтрымліваюць 82457 прадметаў музейнага значэння (лічба на 01.01.2007 г.), 58333 з іх – прадметы асноўнага фонду, які штогод павялічваецца на 2000 адзінак. Музейны фонд НПГКМЗ падзелены на калекцыі, якіх налічваецца больш за 35: жывапіс, графіка, скульптура, народнае мастацтва, нумізматыка, археалогія, этнаграфія, шкло і фарфор, зброя, адзенне, мэбля, старадрукі, рукапісныя і друкаваныя выданні, дакументы, фота- і фонаматэрыялы і інш. Самымі вялікімі з'яўляюцца калекцыі нумізматыкі, археалогіі, фотаматэрыялаў і друкаваных выданняў [2].

Пачэснае месца ў музейным зборы НПГКМЗ займае калекцыя «Тканіна (тэкстыль)», якая ўтрымлівае наступныя складнікі: этнаграфічны (народны) тэкстыль (узоры ручнога ткацтва: тканіны з лёну, канаплі, крапівы, воўны; узорыстыя народныя тканіны, вышыўка, набойка, карункі і г.д.); дэкаратыўны тэкстыль (дываны, габелены – вырабы прафесійных мастакоў фабрык, мануфактур); прамысловы тэкстыль (узоры тканін фабрычнай вытворчасці), нятканы тэкстыль (лямец, вата, сеткі, дубліровачныя тканіны); тэкстыльная галантарэя (ніткі, вяроўкі, канаты).

Гэтыя прадметы прадстаўляюць інтарэс для вывучэння, і заслугоўваюць падрабязнага і грунтоўнага апісання. Так, у мінулым, на Віцебшчыне, як і паўсюль на Беларусі, былі шырока распаўсюджаны ўзорыстыя тканіны хатняга вырабу: адзенне, ручнікі, абрусы, посцілкі. У сялянскім асяроддзі іх выраблялі ў хатніх умовах і ўжывалі для ўласных патрэб. У мастацкіх адносінах традыцыйныя тканіны Віцебшчыны складаюць адметную групу, выразныя асаблівасці якіх вылучаюць іх сярод народнага тэкстылю іншых рэгіёнаў Беларусі. Разам з тым традыцыі аўтэнтычнага хатняга ткацтва і вышыўкі на Віцебшчыне, у адрозненне ад некаторых іншых рэгіёнаў, дзе яны застаюцца жывымі і сёння, тут ужо адышлі ў нябыт. У віцебскіх вёсках ужо амаль не ткуць, і можна прывесці толькі адзінкавыя прыклады індывідуальнага занятку ў нашы дні гэтым традыцыйным рамяством. Вышыванне існуе як від сучаснага рукадзелля і ўжо даўно страціла свае адметныя арнаментальныя і мастацка-тэхналагічныя традыцыі, якія былі ўласцівы сялянскай культуры рэгіёну напачатку XX стагоддзя [3, с. 836].

Калекцыя тканых вырабаў у фондах НПГКМЗ пачала фарміравацца ў 1956 годзе, калі ў Полацкі краязнаўчы музей паступілі 2 фрагменты тканіны з Глыбоцкага раёна канца XIX – пачатку XX стагоддзяў. З 1956 па 1998 год ў фонды запаведніка былі пераведзены на пастаяннае захоўванне 225 народных тканін. З 1999 па 2008 год паступіла яшчэ 115 тканых прадметаў. Зараз калекцыя «Тканіна (тэкстыль)» налічвае 340 экспанатаў. З іх 287 – знаходзяцца на пастаянным захоўванні, 23 – у дапаможным фондзе і 30 – на ча-

совым захоўванні. Сярод гэтых прадметаў асноўную частку складаюць ручнікі (144, з іх 2 фрагмента), посцілкі (89, з іх 1 фрагмент), абрусы (56, з іх 1 фрагмент), палавікі, сурвэткі, фіранкі, прасціны і іншыя тканыя вырабы народнага побыту (51). У экспазіцыі Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я знаходзіцца 80 адзінак тканых вырабаў [4, с. 86].

Прадметам дадзенага даследавання выступаюць абрусы з калекцыі «Тканіна (тэкстыль)» у фондах НПГКМЗ. Паводле «Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы», настольнік, настольніца, скацерць (скацер, скацерсць), скацерка, абрус, абрусак абазначалі часцей за ўсё абрус хатняга вырабу, саматканы, без узораў, якім засцілаюць стол кожны дзень. У тым выпадку, калі ў адным населеным пункце суіснуюць два словы, адно з іх абазначае абрус, якім засцілаюць стол кожны дзень, другое - абрус святочны. Часта словы настольнік, скацерць, абрус прыводзяцца без тлумачэнняў, або гэтыя тлумачэнні няпоўныя. Словам сурвэта звычайна абазначалі святочны абрус фабрычнай вытворчасці, з узорамі, часта каляровы, або вязаны з нітак [5, с. 925].

Варта пазначыць, што ўсе галоўныя моманты нараджэння, жыцця, смерці і памінання чалавека маркіруюцца абрусам, якім засцілаюць стол, адзін з найбольш рытуалізаваных і шанаваных прадметаў у традыцыйнай культуры. Паводле прасторавай характарыстыкі інтэр'ера, стол стасуецца з верхам, усходам і адпаведна святлом (трывалае месцазнаходжанне стала – покуць, чырвоны кут). Падчас абрадавай трапезы стол набывае падкрэсленую функцыю сакральнага цэнтра, своеасаблівага ахвярніка, калі пачастунак прызначаецца не толькі прадстаўнікам чалавечай, але і касмічнай супольнасці [6, с. 489 490].

Найбольш архаічнай функцыяй абруса з'яўляецца выдзяленне ачышчанага і асвячонага месца для правядзення рытуалу (старэйшая за абрус функцыя любой распасцёртай і засланай тканіны). Абрусам засцілаліся магілы на Радаўніцу: «у гэты дзень хадзілі пасля абеду на могілкі, паміналі нябожчыкаў. Могілкі абмяталі. Магілу засцілалі скацеркай і абедалі»[1]. Шырока распаўсюджаным на Падзвінні быў звычай варожбаў на Святкі па сене, пакладзеным пад абрус, аб ураджаі збожжа ў новым годзе. З-пад настольніка выцягвалі сцябліны, даўжыня якіх мусіла спрагназаваць даўжыню будучага лёну, а то і жыцця кожнага з удзельнікаў варажбы. На навагоднія святы гаспадыня карміла курэй на абрусе, каб прывучыць іх да сваёй хаты. «Перад Пасхай вялікі пост. У чацьвер людзі чацьвяргуюць, а ў пятніцу і суботу нічога не ядуць. Ноччу з суботы на нядзелю ідуць на ўсеночную. Лічуць, што маць нарадзіла Ісуса ў хлеве і таму на першы дзень Пасхі на стол кладуць сена, накрываюць яго скацеркай, а зверху кладуць яйкі, хлеб. І пасля таго як пад'ядуць ідуць у госці»[2]. У дзень зажынак стол накрывалі чыстым абрусам на гумно, абрус расцілалі перад ім або вешалі на браме гумна [7, с. 109].

Абрус абавязкова ўваходзіў у пасаг нявесты: «эта ж нада было не толькі ручнікоў, посцілак, скацёрак наткаць, а яшчэ гатовіла дзеўка фіранкі, прасціны, шмат чаго гатовіла, каб замуж узялі»[3]. Новым абрусам накрывалі стол, калі прымалі сватоў, у «зборны вечар» перад вянчаннем, калі прыязджалі ў дом маладога пасля вянца [8, с. 109]. Перамены страў падчас вясельнага піру ў старажытнасці прадугледжвалі і перамену абрусаў. Так, падчас адной «трапезы», павінны былі мяняць у «ідэальным» варыянце 12 абрусаў. Паводле некаторых звестак, перамены страў рабілі, здымаючы адзін за адным абрусы, што былі ў шмат слаёў пасланыя на стале [9, с. 130].

Сёння ў калекцыі на пастаянным захоўванні налічваецца 56 абрусаў (з іх 2 кавалкі тканіны на абрус, 1 фрагмент настольніка); 9 абрусаў знаходзіцца ў экспазіцыі Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я, 3 – у экспазіцыі Краязнаўчага музея, 44 – захоўваюцца ў фондах НПГКМЗ.

Храналагічна выраб абрусаў з калекцыі ахоплівае перыяд ад 1900 да 1970-х гадоў, акрамя КП 14 10613, які датуецца 1887 годам. У калекцыі прадстаўлены абрусы наступных раёнаў Віцебскай вобласці: Полацкага (16 адзінак); Міёрскага (10); Докшыцкага (7); Глыбоцкага (6); Шаркаўшчынскага (6); Пастаўскага (5); Верхнядзвінскага (2); Расонскага (1). Таксама два абрусы з Валожынскага і адзін з Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Асноўны шлях папаўнення калекцыі – гэта экспедыцыйныя пошукі навуковых супрацоўнікаў запаведніка. Матэрыялы для музейнага збора набываліся ў прыватных асоб у вёсках, мястэчках, гарадах. Не апошнюю ролю ў фарміраванні калекцыі адыгралі падворныя абходы і выпадковыя закупкі тканых вырабаў у мясцовага насельніцтва гарадоў Полацка, Наваполацка, Баравуха-1, Баравуха-2, вёскі Экімань Полацкага раёна.

Паводле метрычнай характарыстыкі абрусаў са збору НПГКМЗ было выяўлена наступнае: у канцы XIX – пачатку XX стагоддзя абрусы рабілі даўгімі – да 214,0 см (напрыклад, памеры настольніка КП 7 4029 складаюць 214,0×183,0 см). Шырыня вырабу вагалася ад 108,5 см (КП 11 6714) да 183,0 см (КП 7 4029) (на шырыні стала, які быў разлічаны на вялікую сям'ю). У пасляваенны час форма абрусаў змянілася: яны сталі меньш і квадратнымі (напрыклад, памеры абруса КП 3 976, які быў сатканы ў канцы 1940-х гадоў, складаюць 125,0×107,0 см).

---

[1] Архіў гіст.-філал. фак. УА «Полац. дзярж. ун-т» (далей – АГФФ УА «ПДУ»): зап. этнаграф. эксп. 19.07.1996 г. ад Шастаковіч Віктара Юльянавіча, 1923 г. н. у в. Падрэзы Бешанковіцкага раёна.

[2] АГФФ УА «ПДУ»: запісана этнаграфічнай экспедыцыяй 18.07.1996 г. ад Долгай Аляксандры Дзямідаў-ны, 1919 г. нар. у в. Касмыры Бешанковіцкага раёна.


[3] Запісана аўтарам 13.08.2007 г. ад Назаравай Тамары Ільінішны, 1932 г. нар. у в. Казакова Віцебскага раёна.

Калі казаць пра канструктыўныя асаблівасці крою, абрус складаецца звычайна з дзвюх полак, уяўляючы сабою два злучаныя ручнікі, працягваючы такім чынам лінію развіцця папярэдніх форм, уключаючы іх тэхналагічныя, семантычныя і функцыянальныя параметры. Гэта канструкцыя маркіруе ролю абруса – распасціраца, пакрываць, ствараць асобую прастору, з яе старой якасцю – даўжынёй, і з новай – шырынёй [9, с. 129]. Адрозненне формы ручніковых палотнаў – іх архаічная даўжыня, працягласць, магчымасць сімвалізаваць рух у прасторы і часе, а таксама быць повяззю розных прастораў у шырокім і пераносным сэнсе. Менавіта шырыню як новую семантычную якасць, але спадкаемцу старых форм ствараe і адзначае спосаб з'яднання двух «ручнікоў» у абрусе праз мярэжку-«размежаванне». Варта звярнуць увагу і на той факт, што месцы злучэння полак у абрусах маркіраваныя альбо чырвонай ніткай, альбо плеценымі або вязанымі карункамі. Трэба пазначыць, што абрусы, якія рабіліся такім чынам, адносна позняя з'ява ў культуры XIX стагоддзя. Тым не менш прынцыпы іх канструявання захавалі на інтуітыўным узроўні ўніверсальны прынцып архаічных тэхналогій, які апынуўся фактарам кансервацыі культурных традыцый.

Калекцыя ўтрымлівае 28 тканых абрусаў. Для настольнікаў «на кожны дзень», «абыдзенных» выка-рыстоўвалі зрэбны лён (КП 6 3561, КП 7 3640), святочныя абрусы ткаліся з тонкай кужэльнай пражы (КП 7 4029, КП 9 4843).

Пры вырабе абрусаў выкарыстоўваліся наступныя тэхнікі: простае ткацтва («упроста») – двухнітовае, шматнітовае ткацтва (трох-; чатырохнітовае адна-, двухуточнае; пяцінітовае, у шэсць, восем, дванаццаць, шаснаццаць нітоў), бранае (аднауточнае (паўажурныя і фактурныя тканіны), двухуточнае), пераборнае ткацтва (перабор пад слупок (двух-, аднабаковы), двухбаковы перабор «пад палатно»), двухбаковы перабор «пад паркі», перабор з пупламі), закладное, выбарнае, двухасноўнае ткацтва [10, с. 495].

Адной з найбольш старажытных і распаўсюджаных тэхнік ткацтва з'яўляецца чатырохнітовае, узоры якой шырока прадстаўлены ў калекцыі НПГКМЗ. Вылучаюць аднаўточнае ткацтва, што дазваляла атрымліваць тканіну палатнянага, рыпсавага, саржавага, паўажурнага і ячэістага перапляцення. Ільняныя абрусавыя тканіны ткалі ўжо ў канцы XIX стагоддзя [11, с. 68]. Найбольш пашыраным у XX стагоддзі на Віцебшчыне было двухуточнае чатырохнітовае ткацтва. Паўсюдна шахматныя ўзоры народных тканін мелі назвы: «дымка», «у дымку» (КП 15 12300, выканаўца: М.А. Адамовіч, в. Бабышкі Міёрскага раёна, 1950 – 60-я гады), а яе разнавіднасці называлі «простая дымка» (КП 3 976, выканаўца: невядомы, в. Зуі Полацкага раёна, 1940-я гады), «ламаная дымка». Тканіны гэтага тыпу таксама называлі ў адпаведнасці з іх узорамі: «у кружочкі», «у кругі» (КП 4 2176, выканаўца: невядомы, Полацкі раён, канец 1940-х гадоў), «шашкі», «клеткі», «шклянкі». У Лепельскім раёне чатырохнітовыя ўзоры мелі назвы: «касая дымка» ці «арцабы з мандылямі») [3, с. 840]. Для іх характэрны рэльефны шашачны арнамент, які ствараецца ніцямі дадатковага ўзорнага ўтку, пракінутага праз усю шырыню тканіны (ён насцілаецца асобнымі ўчасткамі папераменна па правым і левым баку), як, напрыклад, на абрусе КП 6 3561 (выканаўца: невядомы, в. Слабада Докшыцкага раёна, 1946 – 1947 гады). Разнастайнасць узораў дасягалася рознымі варыянтамі накідання ніцей асновы ў ніты і парадкам ходу на панажах (мал. 1).



а) б)

Мал. 1. Фрагменты абрусаў, выкананых у тэхніцы чатырохнітовага двухуточнага ткацтва:
а – КП 4 2176; б – КП 6 3561

Аднаўточны варыянт васьмінітовага ткацтва таксама бытаваў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Ён дазваляў вырабляць тканіны саржавага перапляцення з простым геаметрычным арнаментам у выглядзе квадратаў, прамавугольнікаў, ромбаў [12, с. 539].

Сярод традыцыйных тэхнік беларускага ўзорыстага ткацтва ў канцы XIX – пач. XX стагоддзя найбольш распаўсюджанай была браная. Менавіта ёй аддавалася перавага пры аздабленні святочнага адзення – жаночых кашуль, фартухоў, намітак, а таксама ручнікоў-набожнікаў, абрусаў. Народныя майстрыхі віртуозна валодалі рознымі спосабамі бранага ткацтва і выкарыстоўвалі іх як для стварэння яркіх рэльефных бардзюраў, насычаных чырвоным колерам, з выразным геаметрычным арнаментам (бранае двухуточнае ткацтва), так і для вырабу вельмі тонкіх белых тканін з ажурападобным ці фактурным ячэйкавым дэкорам (бранае аднаўточнае ткацтва) [8, с. 64]. У гэтай тэхніцы былі зроблены абрусы: КП 15 11858 (выканаўца: Н.І. Касатая, Міёрскі раён, 1913 г.), КП 14 10613 (выканаўца: Е.С. Чэрап, г/п. Ветрына Полацкага раёна, 1897 год). Як па ўзору, так і па фактуры яны падобны да чатырохнітовых, бо рабіліся на маленькай колькасці пруткоў – на адным, двух або трох. У пасляваенны час сталі ткаць браныя абрусы на вялікай колькасці дошчачак. Самы распаўсюджаны ўзор – «вянок»: сярэдзіна затыкалась раслінным арнаментам, які распалагаўся ў выглядзе эліпса, узор паўтараўся па краях. Асаблівасць гэтых абрусаў заключаецца ў тым, што іх ткалі колеравымі ніткамі – блакітнымі, жоўтымі на белым тле [8, с. 65].

У тэхніцы пераборнага ткацтва, якое прыйшло на змену старажытнаму бранаму і шматнітоваму ткацтву, на Віцебшчыне выраблялі пераважна посцілкі, але сустракаюцца і тканыя абрусы. Пераборнае ткацтва мае шмат разнавіднасцей, многія з якіх вядомы на Беларусі: перабор «пад палатно», перабор «пад паркі», аднабаковы перабор з прыціскной асновай, двухбаковы перабор з прыціскной асновай, перабор з выбарам, пяцельны перабор. Найбольш познія з іх – аднабаковы і двухбаковы віды перабору з прыціскной асновай вызначаюцца высокай дэкаратыўнасцю, магчымасцю перадаваць складаныя формы арнаменту і разнастайныя кампазіцыйныя вырашэнні. Асаблівае развіццё і распаўсюджанне гэтых тэхнік ткацтва прыйшлося на сярэдзіну – другую палову XX стагоддзя [10, с. 496].


Двухбаковы перабор з прыціскной асновай сваёй тэхнікай выканання падобны на бранае двухуточнае ткацтва. Узор, таксама як і ў браным ткацтве, перабіраецца дошчачкай-бральніцай, толькі не па ліку нітак асновы, а па ліку пучкоў нітак асновы, раздзеленых «страчавымі» ніткамі. Атрыманы зеў, як і ў браным ткацтве, фіксуецца паўнітамі («ніткамі») або доўгімі шнурамі («матузамі»), а ўзорны ўток пракідваецца чаўнаком праз усю шырыню тканіны [8, с. 66]. Прыкладамі дадзенай тэхнікі з'яўляюцца абрусы: КП 9 4846 (выканаўца: С.І. Мядзелец, в. Маназыль Міёрскага раёна, 1940-я гады) , КП 6 3566 (выканаўца: невядомы, в. Слабада Докшыцкага раёна, 1970-я гады).

Адной з рэгіянальных асаблівасцей народнага тэкстылю Віцебшчыны з'яўляецца шырокая распаўсюджанасць тут ажурных тканін, якія маюць назву «рэдчыкі». Празрыстае, ажурнае, нібы карункі, палатно, выкананае на ткацкім станку непасрэдна падчас ткання, ужывалі ў сялянскім побыце для настольнікаў, полагаў, фіранак «у кут» і на вокны. Нярэдкасць на Віцебшчыне і цалкам ажурныя без арнаменту ручнікі-набожнікі, якія сустракаюцца ў Гарадоцкім і іншых раёнах. Найбольш ажурных тканін канца XIX – першай паловы XX стагоддзя даследчыкамі было зафіксавана ва ўсходніх раенах вобласці: Аршанскім, Сенненскім, Бешанковіцкім, Лёзненскім, Гарадоцкім, Талачынскім, Дубровенскім. У заходняй частцы Віцебшчыны ажурныя тканіны сустракаліся радзей [13, с. 89].

У тэхніцы ажурнага ткацтва выкананы абрус КП 9 4843 з Міёрскага раёна (выканаўца: Л.М. Зелянкевіч, 1930 – 1940 гады). Узор абруса будуецца на чаргаванні ўчасткаў палатнянага перапляцення і буйных ажурных мярэжак, што размяшчаюцца ў гарызантальным напрамку. Па тэхніцы вырабу гэта звычайнае палатно, выкананае на двух нітах. Для ўтварэння гарызантальных дарожак пры тканні ў адкрыты зеў закладвалі вузкую лінейку, за якой працягвалі ткаць звычайнае палатно, прыбіваючы да яе ніці ўтку. Наткаўшы патрэбную колькасць палатна, лінейку вымалі і зноў закладвалі ў зеў. Перавіўку ніцей у дарожках рабілі іголкай пасля зняцця тканіны са станка. У 40-я гады XX стагоддзя ажурныя тканіны страцілі сваё ўтылітарнае прызначэнне, але нейкі час яшчэ ўжываліся ў сялянскім быце ў якасці дэкаратыўных ручнікоў, абрусаў, посцілак. Ажурнае ткацтва знікае з сялянскага рамяства разам з ільном, які сяляне перасталі вырошчваць для ўласных патрэб з утварэннем на вёсцы калектыўных гаспадарак (ва ўсходніх раёнах Віцебшчыны). Таксама ў 1930-я гады на вёсцы назіраецца заняпад шматнітовага ткацтва, вырабу простага палатна, узорыстых ручнікоў, настольнікаў, тканін для адзення [3, с. 844].

Вязанне з'яўляецца больш складаным відам пляцення, заснаваным на счапленні паміж сабой петляў адной ніткі [14, с. 403]. Вязаныя абрусы складаюць асобную групу ў фондах НПГКМЗ. Выкананыя ў XX стагоддзі, яны захавалі традыцыйныя формы, каларыт, узоры і назвы. Разнастайнымі з'яўляюцца тэхнікі іх выканання. Асабліва шырока ў музейным зборы прадстаўлены абрусы вязаныя кручком (16 адзінак).


Папулярнасць вязання ў першай палове XX стагоддзя спрыяла пашырэнню вырабу вязаных абрусаў. З часам у народным мастацтве склаліся традыцыйныя прыёмы і тэхніка, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Часта ў карункавых узорах паўтараюцца матывы тканых узораў. Матэрыялам для вырабу вязаных кручком абрусаў служылі льняныя (КП 7 4037, КП 7 4043, КП 7 4110, КП 9 4847, КП 9 4872, КП 9 4873, КП 11 6730, КП 12 7196, КП 20 25469) ваўняныя (КП 7 4024), баваўняныя (КП 7 3626, КП 11 16760, КП 13 8627, КП 16 15790, КП 17 18425, КП 17 18426) ніткі (мал. 2).



а) б)

Мал. 2. Фрагменты абрусаў, вязаных кручком (а) КП 9 4872, (б) КП 16 15790

З дапамогай чаўнака (ігліцы) і дошчачкі на Падзвінні вязалі рыбалоўныя сеткі. Пачыналі вязаць сеткавае палатно, карыстаючыся, як правіла кавалкам старой сеткі. Канец ніткі, наматанай на ігліцу, прывязвалі да крайняга левага вочка, вывязвалі некалькі радоў новых вочак, затым частку із адразалі, крайні рад нанізвалі на вяроўку ці тоўстую нітку і давязвалі сетку да патрэбнай даўжыні [15, с. 461]. Па сетцы выконвалася вышыўка «у насціл» ваўнянымі паліхромнымі ніткамі, шырока распаўсюджаная ў 20 – 30-я гады XX стагоддзя на Віцебшчыне, Гродзеншчыне, Магілёўшчыне, Міншчыне. Вышыўка на абрусах мела раслінна-кветкавы характар і дывановую кампазіцыю з акцентаваным цэнтрам, вугламі і бардзюрам. Для вышыўкі ўжывалі самапрадзеную пафарбаваную ў розныя яркія колеры воўну. Пераважнымі колерамі нітак былі чырвоны, сіні, зялёны, жоўты. Вялікае значэнне меў фон, на якім выконвалася вышыўка. Часцей за ўсё ён быў чорнага колеру, таму арнамент успрымаўся вельмі выразна (мал. 3).



а) б)


Мал. 3. Фрагменты сеткавых абрусаў (а) КП 13 9264 (б) КП 13 8625

Сеткі таксама маглі вязацца кручком, як напрыклад абрусы: КП 7 4037 (выканаўца: Ю.А. Вышаткевіч, в. Бельдзюгі Шаркаўшчынскага раёна, 1930-я гады) і КП 11 6730 (выканаўца: В.Г. Яблонская, в. Жаўнова Полацкага раёна, 1939 год), або на раме (КП 7 3657, КП 9 4868, КП 11 6665, КП 11 6691, КП 11 6731, КП 13 8625, КП 13 9264, КП 17 1956).

У першай палове XX стагоддзя была распаўсюджана тэхніка вязання «на вілачцы» кручком, напрыклад, абрусы КП 1 643 (выканаўца: А.А. Балаш, в. Румполле Міёрскага раёна, 1920-я гады) і КП 7 4025 (выканаўца: невядомы, в. Мосар Глыбоцкага раёна, 1940 г.) выкананы ў гэтай тэхніцы (мал. 4).

Яшчэ з канца XIX стагоддзя пашырэнне набывае вышыўка крыжыкам – адзін з тэхналагічных прыёмаў дэкору абрусаў калекцыі. Арнаментыка абруса КП 11 6714 (выканаўца: М.У. Мароз, в. Семянец Полацкага раёна), тканага ў 1915 – 1920-я гады спалучае геаметрычныя (падвоеная васьміпялёсткавая разетка – характэрны элемент традыцыйнага арнаменту) і раслінныя (кайма з вышытых «крыжыкам» чырвонымі і чорнымі ніткамі кветак) матывы. Справа ў тым, што ва ўзорах пачатку XX стагоддзя раслінныя


матывы займалі значнае месца. Сярод раслінной арнаментыкі найбольшую папулярнасць набыў матыў пахіленай галінкі, ад якой у два бакі адыходзяць кветкі і лісце. Матывы вінаградных гронак і лістоў, карон звязаны з распаўсюджваннем штампаваных (бракараўскіх) узораў. Яны выконваліся як раз такі для аздаблення прадметаў бытавога ўжытку – ручнікоў ды абрусаў [16, с. 160].



а) б)

Мал. 4. Фрагменты абрусаў, вязаных «на вілачцы» кручком (а) КП 1 643 (б) КП 7 4025

Абрусы ўпрыгожваліся карункамі або махрамі. Вузкія канцы затыкаліся чырвонымі паскамі [17, с. 13]. Агульны кампазіцыйны сэнс чырвонай паласы па двух краях фрагмента настольніка КП 15 13676 (выканаўца: А. Шаруха, в. Ульянава Пастаўскага раёна, 1920 – 1930 гады) – мяжа палатна. Абрусы КП 1 655, КП 2 1283, КП 6 3561, КП 7 3640 па характару арнаменту і кампазіцыі традыцыйныя: дзве полкі спалучаюцца прошваю, выкананай строчкаваю вышыўкай, якая паўтарае па колеры асноўную тканіну. Полкі часта злучалі карункавым паскам (прошва, расшыўка), як, напрыклад, наступныя абрусы з калекцыі: КП 7 4029, КП 18 21949, КП 18 20582, КП 20 26178 (мал. 5).



а) б)

Мал. 5. Фрагменты карункавых прошваў абрусаў (а) КП 20 26178 (б) КП 18 21949

Такім чынам, даследуючы абрусы з калекцыі «Тканіна (тэкстыль)» у фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, можна зрабіць наступныя высновы: праблема навуковага апісання тканін з'яўляецца надзвычай актуальнай. Пры складанні апісання варта асаблівую ўвагу засяродзіць на тэхніцы вырабу, тэхналогіі выкання дэкору, рэгіянальных арнаментальных асаблівасцях, утылітарнае прызначэнне вырабу. Паводле праведзенага агляду, абрусы з музейнага збору НПГКМЗ, пры сваім стылязаваным адзінстве, падцвердзілі пэўныя рэгіянальныя адрозненні ў тэхніках ткацтва і прыёмах аздаблення. Настольнікі вызначаюцца разнастайнасцю арнаменту, дэтальнай распрацоўкай узораў. Асабліва трэба вылучыць ажурныя і сеткавыя, вышытыя раслінным буйнарапортным паліхромным арнаментам, абрусы. Склад калекцыі можа быць ахарактарызаваны як няпоўны, нават, фрагментарны. Гэта тлумачыцца

маленькай колькасцю прадметаў для аналізу. Варта заўважыць, што задача стварэння прадстаўнічай, па магчымасці, поўнай калекцыі перад збіральнікамі не ставіліся. Падчас экспедыцый (1987 – 1989-я гады) збіраліся прадметы матэрыяльнай культуры Беларускага Падзвіння, разам з гэтым набываліся і асобныя тканыя вырабы. Раёны збора калекцыі абмяжоўваліся ў асноўным Полацкім, Міёрскім, Пастаўскім, Глыбоцкім, Шаркаўшчынскім, Пастаўскім, Верхнядзвінскім, Расонскім раёнамі Віцебскай вобласці, Валожынскім і Капыльскім Мінскай вобласці. Перадусім, Лепельскі, Ушацкі, Браслаўскі, Чашніцкі, Шумілінскі раёны Віцебскай вобласці ў калекцыі не прадстаўлены. На жаль, згублены ўжо той час, калі была магчымасць набыць найцікавейшыя тканыя вырабы. Аднак зараз прасочваецца добрая тэндэнцыя, звязаная з тым, што пошук экспанатаў стаў больш мэта-накіраваным. Абмяжоўваюць значнасць калекцыі як навуковай крыніцы і храналагічныя рамкі вырабу і выкарыстання музейных прадметаў: 1900 – 1970-я гады. Фондавыя калекцыі з'яўляюцца першакрыніцай і аб'ектам даследавання практычна ва ўсіх абласцях навуковай дзейнасці музея. Больш 80 % калекцыі «Тканіна (тэкстыль)» з фондавага збору НПГКМЗ прайшлі першую стадыю вывучэння – навуковае апісанне. Зараз здзяйсняецца паслядоўны агляд і каталагізацыя калекцыі. Рыхтуюцца да выдання каталогі ручнікоў і посцілак Беларускага Падзвіння. Але, нягледзячы на незакончанасць калекцыі, малую колькасць экспанатаў, яна, пры дапаўненні іншымі матэрыяламі (палявымі назіраннямі, навуковымі працамі) – стане каштоўнай навуковай крыніцай для вывучэння традыцыйнага тэкстылю Беларускага Падзвіння канца XIX – пачатку XX стагоддзяў.

ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя запаведніка і этапы яго развіцця [Электронны рэсурс] // Нац. Полац. гіст-культ. музей-запаведнік. – Полацк, 2008. – Рэжым доступу: http://www.polotskmuzey.vitebsk.by/ by/ file/index.htm. – Дата доступу: 02.11.2008.
2. Фонды запаведніка [Электронны рэсурс] // Нац. Полац. гіст.-культ. музей-запаведнік. – Полацк, 2008. – Рэжым доступу: http://www.polotskmuzey.vitebsk.by/by/ file/index.htm. – Дата доступу: 02.11.2008.
3. Лабачэўская, В.А. Традыцыйны народны тэкстыль / В.А. Лабачэўская // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]; склад. Т.Б. Варфаламеева. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – С. 835 – 891.
4. Дамаскіна, В.Ф. Агляд калекцыі народнага тэкстылю Паазер'я з музейнага збору НПГКМЗ / В.Ф. Дамаскіна // Матэрыялы навук.-практ. канф.: (па выніках навук.-даслед. работы ў 2006 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк: НПГКМЗ, 2007. – С. 82 – 90.
5. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы: уступ. артык., давед. матэрыялы і камент. да карт / Акад. навук БССР, Ін-т мовазн. ім. Я. Коласа; пад рэд. І. Аванесава, Ю.Ф. Мацкевіча. – Мінск: Выд-ва Акад. навук БССР, 1963. – 970 с.
6. Дучыц, Л. Стол / Л. Дучыц, У. Лобач // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўн. / С. Санько [і інш.], склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск: Беларусь, 2006. – С. 489 – 491.
7. Беларускія народныя тканіны ў зборы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР: Каталог. – Мінск: Беларусь, 1979. – 255 с.
8. Курилович, А.Н. Белорусское народное ткачество / А.Н. Курилович. – Мінск: Наука и техника, 1981. – 119 с.
9. Нячаева, Г.Р. Арнамент: прастора рэчы і мова традыцыі. Жаночыя кашулі, «платкі» і абрусы. Неглюбка / Г.Р. Нячаева // Навук. зап. Веткаўск. музея нар. творч. / [уклад. Г.І. Лапацін]. – Гомель: Гом. дзярж. ун-т, 2004. – С. 111 – 138.
10. Віннікава, М.М. Ткацтва / М.М. Віннікава, Г.М. Курыловіч // Этнаграфія Беларусі: энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл., рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 495 – 497.
11. Селивончик, В.И. Возрождение ремесла: пособие по ручному узорному ткачеству / В.И. Селивончик, М.Н. Винникова. – Минск: Полымя, 1993. – 142 с.
12. Віннікава, М.М. Шматнітовае ткацтва / М.М. Віннікава // Этнаграфія Беларусі: энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл., рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 539 – 540.
13. Віннікава, М.М. Ажурныя тканіны Віцебшчыны / М.М. Віннікава // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: Новыя даслед.: зб. арт. / АН БССР. Ін-т мастацтвазн., этнагр. і фалькл.; рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 89 – 92.
14. Сахута, Я.М. Пляценне / Я.М. Сахута // Этнаграфія Беларусі: энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл., рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 403 – 404.
15. Браім, І.М. Сеткавязанне / І.М. Браім / Этнаграфія Беларусі: энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл., рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 461.
16. Промыслы і рамёствы Беларусі / В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 192 с.
17. Фадзеева, В.Я. Абрус / В.Я. Фадзеева // Народная культура Беларусі: энцыкл. даведнік / пад агул. рэд. В.С. Цітова; маст. І.І. Бокі, У.М. Жук. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 12 – 13.

СІСТЭМА ВОБРАЗАЎ У ЗАМОЎНАЙ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

Т.Д. РАБЕЦ
(Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Мінск)

Разглядаецца надзвычай цікавая архаічная з'ява – замоўны тэкст у яго разнастайных аспектах з пераважным акцэнтам на сістэме вобразаў замоўнай традыцыі беларусаў Падзвіння і тых паэтычных сродкаў, якія дапамагаюць станаўленню і развіццю замоўных вобразаў. Увага да вобразаў, якія адносяцца да ліку найбольш устойлівых элементаў культуры, абумоўлена актуальнай на сённяшні дзень праблемай рэканструкцыі старажытнай духоўнай культуры. Вывучэнне семантыкі вобразаў замоў з'яўляецца адным з прыарытэтных напрамкаў сучаснай фальклярыстыкі.

Высвятленне сучаснага стану замоўна-заклінальнай традыцыі – адзін з аспектаў важнейшай для фальклярыстыкі праблемы культурнай спадчыны. Гэта – пытанне аб месцы і значэнні замоў у духоўным жыцці нашага сучасніка, аб асаблівасцях фальклорнага працэсу ў нашы дні.

У пачатку XXI стагоддзя склалася такая сітуацыя, калі дзяржаўныя ўлады больш не выступаюць супраць народных лекараў, хутчэй наадварот, і ўлады, і СМІ падтрымліваюць і папулярызуюць іх дзейнасць. Выдаюцца новыя зборнікі замоў і перавыдаюцца старыя, выйшла ў свет новая літаратура па магіі, вядзьмарству і знахарству. Паявіліся новыя «прафесіяналы»: рознага роду знахары, экстрасэнсы, чараўнікі, спецыялісты па народнай медыцыне, якія ў сваёй практыцы часткова выкарыстоўваюць народныя замовы, часткова самі іх складаюць, часткова абапіраюцца на замежныя крыніцы. Запісы і публікацыі апошніх гадоў адлюстроўваюць усё больш узрастаючы ўплыў кніжнай прадукцыі на бытаванне замоўнай традыцыі: людзі купляюць сучасныя выданні замоў, перапісваюць іх, а фальклярысты фіксуюць і зноў публікуюць, пры гэтым нават не заўсёды ведаюць іх першакрыніцу. Не цяжка прадбачыць, што і замовы, складзеныя сучаснымі знахарамі, таксама будуць з цягам часу часткова засвоены традыцыяй і зведаюць на сабе працэс фальклярызацыі.

Такім чынам, можна заўважыць, што ў апошнія гады назіраецца актывізацыя бытавання замоў, якая адзначаецца паўсюдна, але ступень яе інтэнсіўнасці розная па рэгіёнам. Прасочым гэта на прыкладзе замоў, сабраных на тэрыторыі Беларускага Падзвіння.

У калекцыі замоў Падзвіння, прадстаўленай у «Полацкім этнаграфічным зборніку» [1], найбольшая колькасць лекавых замоў. Пры гэтым да нашага часу захаваліся менавіта тыя замовы, якімі валодалі амаль у кожнай вясковай хаце, гэта замовы «Ад скулы», «Ад грыжы», «Ад залатніку», «Ад урокаў», «Ад зубнога болю», «Ад крыві», «Ад змяі», «Ад начніц», «На сон», «Ад рожы», «Ад звіху» і інш. Амаль не сустракаюцца замовы «Ад ліхаманкі», «Ад падвею», «Ад каўтуна». У той жа час з'явіўся цэлы шэраг новатвораў, складзеных па ўсіх канонах класічных узораў замоўнай традыцыі. Гэта замовы «Ад рэўматызму», «Ад паліпаў у носе», «Ад каларацкіх жукоў» і інш.

Тэксты лячэбных замоў беларусаў Падзвіння вызначаюцца кароткай формай і адсутнасцю развернутага шматпланавага апавядальнага элемента і канцовак-закрэпак. Мабыць, кароткасць садзейнічала і іх больш шырокаму ў параўнанні з сюжэтна-складанымі замоўнымі тэкстамі распаўсюджванню сярод носьбітаў традыцыйнай культуры.

Трэба заўважыць, што для замоў канца XX – пачатку XXI стагоддзя характэрна некаторая дэхрысціянізацыя замоўнай традыцыі. У большасці замоў адсутнічае малітоўны ўступ, замовы маюць толькі апавядальную частку і пачынаюць нагадваць прыгаворы, якія суправаджаюць і апісваюць магічныя дзеянні знахара. Аднак усё ж, як сведчаць матэрыялы «Полацкага этнаграфічнага зборніка», некаторыя замовы захавалі традыцыйныя малітоўныя ўступы, характэрныя для замоў пачатку XX стагоддзя, напрыклад, найбольш часта сустракаюцца ўступы: *«Первым разам, добрым часам. Госпадзі, памажы. і Прачыстая Маці, і Сьвяты Міхаіл Архангел, суддзя праведны, памажыце і станьце на помач к рабе божай (імя). Дай, Госпадзі, час добры»* [1, № 24, с. 130]; *«Первым разам, добрым часам. Зара-зарыца, Гасподняя памашніца. Я са словам, а Бог з помаччу»* [1, № 11, с. 127] і інш. Яшчэ радзей у тэкстах сустракаюцца закрэпкі. У калекцыі замоў беларусаў Падзвіння можна ўбачыць толькі некалькі тэкстаў, не страціўшых гэты структурны элемент, напрыклад, *«Дунуў, дух не мой – Гасподні. Мой дух прылюбі, а Гасподні дух стань на помач. Амінь»* [1, № 11, с. 127]; *«Дай Божа памоч раба Божага (імя). Амін!»* [1, № 222, с. 114]; *«Прашу Ісус Хрыста і Госпада Бога, памажы і я памагу»* [1, № 206, с. 112] і інш.

Асобныя сюжэты, формулы, словазлучэнні замоў застаюцца амаль нязменнымі на працягу многіх стагоддзяў. На нашу думку, гэта абумоўлена народнымі вераваннямі ў тое, што замовы толькі тады будуць мець сілу, калі будуць выконвацца без змен і пропускаў. Так, у замоўных тэкстах беларусаў Падзвіння знайшлі адлюстраванне многія віды формул, характэрных увогуле для ўсходнеславянскіх замоў. Сярод іх можна вылучыць:

1) **формулы дзеяння**, якія адлюстроўваюць функцыі персанажаў: формулы выгнання хваробы туды, дзе нічога не адбываецца: *«Ідзіце, пуды, на сухія лясы, на ніцыя лозы, на сухія калоды, дзе людзі і*

жывотныя не ходзяць, пціцы не лятаюць, пцічы голас не заходіць. І там жа вам прапасьці, што б ён (імя) вас не знаў» [1, № 113, с. 98]; формулы праклёну: *«Хто падумаў тое ліхое, няхай таму тоя. Траскучыя палена ў калена!»* [1, № 7, с. 127]; формулы знішчэння: *«Будзе езьдзіць Міхайла-архайла з вострай сечай, з агнянай печай, будзе вас высякаць, выжыгаць, к дзесятай часьці высылаць»* [1, № 149, с. 102], *«Сходзіт Егорый з неба па залатой лесьніцы, сносіт Егорый трыста лук златапёрых і трыста лук златапалотных. Стрэліць, адстрэліваець у раба божыя (імя) урокі, прыносы, грыжы бальной нечасьці і аддаець чорнаму зьверу на хрыбет...»* [1, № 73, с. 91]; формулы пабрацімства: *«Зара-зарніца, родная сястрыца, у цябе дачка, у мяне сын – будзем іх жаніці»* [1, № 161, с. 104]; формула задобрывання: *«Ідзі, спутнік, на балоты, пад асінавыя калоды – там тваі бацькі, маткі гуляюць, кубкі наліваюць, цябе дажыдаюць»* [1, № 115, с. 98] і інш.;

2) **формулы «фона»**, якія адлюстроўваюць час, месца дзеяння, месца выгнання, стан персанажаў і іншыя апісальныя моманты замовы: тапаграфічныя формулы: *«На моры-акіяне стаіць залатая цэркаў. У гэтай цэркве стаіць прастол, ля тога прастола стаіць сам Ісус Хрыстос»* [1, № 18, с. 128]; часавыя формулы: *«Первым разам, добрым часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Маці пакланюся!»* [1, № 23, с. 129]; формулы цудоўнага загароджвання: *«Ля майго двара – огненая рака, каменная сцяна, цярновай трасцінай аграджана, Гасподняй пячацьцю наложана»* [1, № 25, с. 130] і інш.;

3) **кампазіцыйныя формулы**: формулы пераліку: *«...Прачыстая Маці прыдзі, помачы прынясі к рабе божай (імя) выгаварываць, вымаўляць усякую хваробу: насыльную, нарадную, намоўную, прыгаворную, падумную, паглядную, пасьмешную, пацешную, жаласную, радасную, мужскую, жэнскую, дзявочаю, хляпечую, рабячую, дзіцячую, мінутную, часінную, гадзінную, начную, палуночную, дзянную, палудзенную»* [1, № 23, с. 129]; формулы параўнання: *«Як на моры вална б'ецца, так унутры грызь грызецца. Як на моры вална заміраець, так унутры грызь паміраець»* [1, № 173, с. 106] і г.д. Многія замоўныя матывы таксама застаюцца нязменнымі, напрыклад, матыў змывання хваробы вадой: *«Вадзіца-царыца, чыстая крыніца, амываюць пяскі, крутыя бераж кі, амы раб божы Вера глаза...»* [1, № 55, с. 89], матыў загрызання: *«Грызу грызьць цераз сук»* [1, № 174, с. 106] і інш.

У той жа час і замоўная традыцыя ў цэлым, і асобныя элементы тэкстаў замоў досыць значна эвалюцыяніравалі. І ў тэксты замоў, і ў апісанні дзеянняў, якія суправаджаюць іх вымаўленне, трапляюць асобныя сучасныя рэаліі. У многіх замовах сустракаецца сучасная лексіка або лексіка, якой няма ў матэрыялах XIX стагоддзя: *«На сінім моры сіні камень ляжыць – буян Ланорскі...»* [1, № 80, с. 92], *«Сядзіць, нічога не робіць, толькі салфеты засьцілаіць...»* [1, № 27, с. 142]. Паралельна з абнаўленнямі ў змесце замовы нярэдка губляюць рэаліі, якія перастаюць быць актуальнымі. Напрыклад, з пераліку прадстаўнікоў царкоўнай улады знікаюць папы і епіскапы, архіепіскапы і інш. Паступова трансфармуецца стылістыка замоў: новыя рысы паяўляюцца ў адлюстраванні прасторы, знешнасці чалавека і яго ўнутранага жыцця: *«Иди на хмарь, на старый плуг, на горький лук, на ворота деревянные, на поделы окаянные, на свиное рыло»* [1, № 28, с. 143], *«Спасу я помолюсь, крестом перекрещусь. Дайте мне ветра, воздуха дышать, задыха не знать, не страдаць. Куда крылатая птица отлетает, задых крылами заметает, птенцов своих успокаивает»* [1, № 22, с. 141]. Многія вобразы і сюжэты запазычваюцца з іншых фальклорных жанраў: *«Яжэ прашу цебя, жаба-жабіца, руская дзявіца, устань перада мной, как ліст перад травой»* [1, № 42, с. 146], *«Вецер, ты магуч, ты дуеш па паднябесьсі, носішся па ўсім сьвеце...»* [1, № 95, с. 95].

Важнай праблемай вывучэння асаблівасцей паэтыкі замоў з'яўляецца аналіз тых паэтычных сродкаў, якія дапамагаюць станаўленню і развіццю вобразнай сістэмы замоў. Увага да вобразаў, якія адносяцца да ліку найбольш устойлівых элементаў культуры, абумоўлена актуальнай на сённяшні дзень праблемай рэканструкцыі старажытнай духоўнай культуры. Вывучэнне семантыкі вобразаў замоў з'яўляецца адным з прыарытэтных напрамкаў сучаснай фальклярыстыкі.

Для замоў як для жанру вуснай народнай творчасці характэрна ўстойлівае кола вобразаў. Аднак трэба адзначыць, што пры даследаванні замоўных вобразаў узнікаюць некаторыя цяжкасці, якія зводзяцца да таго, што замова, як і любы абрад, валодае дынамікай: гэта не статычнае адлюстраванне жаданага, а акт, працэс пераходу ад аднаго стану рэчаў да іншага. Яе слушна адзначае Ю.М. Кісялёва, «сітуацыя (аб'ект – яго якасць) узнаўляецца праз дзеянне, у працэсе магічнага акта. Менавіта праз дзеянне-акцыю замаўляючы змяняе стан рэчаў... На ўзроўні сэнсавай арганізацыі замовы мы вылучылі агульны сэнс дзеянняў, у выніку якіх змяняецца рэчаіснасць і здзяйсняецца замаўленне, – акцыю. Акцыя выражаецца ў рытуальных дзеяннях, дзеяннях, які выконваюцца персанажамі ў тэксце або ў адносінах да іх; моўнымі дзеяннямі (загадамі, просьбамі і г.д.)» [2, с. 168]. Такім чынам, можна заўважыць, што ў замоўным сюжэце галоўнымі з'яўляюцца два структурных кампанента: першы – гэта аб'ект, або адрасат, да якога звяртаюцца; другі кампанент – гэта ўласна выражэнне галоўнага прызначэння формулы, выражэнне мэты яе вымаўлення – магічная функцыя. Сувязь паміж персанажамі і іх дзеяннямі ўслед за У.Я. Пропам [3, с. 23] звычайна разглядаюцца наступным чынам: дзеянні, учынкі персанажаў з'яўляюцца пастаяннымі элементамі фальклорнага сюжэта, у той час як самі персанажы, іх вобразы (а разам з імі і атрыбуты) – велічыня пераменная. Гэтыя інварыянты дзеянняў былі названы **функцыямі** персанажаў. Выяўляючы падабенства «інварыянтных персанажаў» і іх функцый у казцы і замове, А.М. Пяскоў выдзяляе ў замове пяць функ-

цый, якія выконваюцца трыма «інварыянтнымі персанажамі»: памочнікам, шкоднікам і прасіцелем. **Памочнік** – персанаж, здольны змагацца са злом – выконвае тры функцыі: 1) прыводзіць да жаданага выніку, 2) звяртаецца да другіх персанажаў з якімі-небудзь патрабаваннямі, 3) «замацоўвае» жаданае. **Шкоднік** – персанаж-носьбіт зла. Яго функцыя – шкодзіць чалавеку або свойскай жывёле. **Прасіцель** – персанаж, які звяртаецца да памочніка з патрабаваннямі ўздзейнічаць на аб'ект або на шкодніка. Функцыя яго – прасіць памочніка аб тым, каб той сваімі дзеяннямі выклікаў жаданае. Аналізуючы функцыі персанажаў у замове, даследчык азначае, што яны вызначаюцца пэўнымі ўстойлівымі слоўнымі канструкцыямі – формуламі. «Гэтыя схемы, якія ляжаць у аснове славеснай часткі замовы, напаўняюцца ў канкрэтных тэкстах канкрэтнай семантыкай, якая адпавядае агульнаму значэнню схем (напрыклад, у формуле «памочнік уздзейнічае на аб'ект» у канкрэтным тэксце можа прысутнічаць некалькі памочнікаў..., з функцыяй памочніка можа сумяшчацца функцыя прасіцеля и г.д., але агульнае значэнне накіраванага ўздзеяння застаецца незалежна ад канкрэтнага семантычнага напаўнення формулы)» [4, с. 29 – 30].

У залежнасці ад адрасата, называемага ў першай частцы замоўнага сюжэта, другая частка можа змяняцца і выражаць просьбу, загад, патрабаванне або прапанову абмену, сватаўства, пабраціміства і г.д. Суб'ект – хворы або пасрэднік (знахар, шаптуха, бабка і інш.) звяртаецца непасрэдна да хваробы, хворага органа, да прыродных з'яў і стыхій, да раслін, жывёлы, птушак, міфалагічных персанажаў – віноўнікаў хваробы, да персаніфікаваных святых, да Бога, рознага віду прадметаў, рэчаў і г.д. Зварот да пералічаных вышэй персанажаў і прадметаў выкліканы імкненнем пазбавіцца ад пакут, але гэта жаданне можа выражацца па-рознаму: гэта можа быць просьба, пагроза, застрашванне і інш. Просьба можа суправаджацца рознага роду прапановамі: абмен, сватаўство, пабраціміства і інш. На аснове размежавання персанажаў розных узроўняў замовы можна падзяліць на дзве групы. Першая група аб'ядноўваецца зваротамі да хваробы, якая павінна стаць выканаўцам волі, жадання хворага – яна павінна адысці і тым самым вызваліць хворага ад сваёй прысутнасці. Як вядома, па народным уяўленням хвароба ўваходзіць у цела чалавека або ў адзін з яго органаў, дзе і жыве потым, прыносячы пакуты і боль.

Сярод замоў Падзвіння вылучаюцца пераважна тыя, у якіх увасабляюцца такія хваробы, як рожа, начніца, залатнік, удар, звіх, урокі і інш. Так, шматлікую групу складаюць замовы ад рожы (26 тэкстаў). Цікава, што ў гэтых замовах хвароба можа ўвасабляцца як у вобразе прыгожай «краснай» [1, № 26, с. 84] або «харошай» [1, № 35, с. 85] дзявіцы, так і ў вобразе трох (чатырох, дванаццаці) руж. Калі рожа паўстае ў жаночым вобразе, то яе адсылаюць на *«жоўтыя пяскі, на піленыя ляса, на мягкія падушкі»* [1, № 26, с. 84] або *«на мхі, на балоты, на ніцявыя лозы»* [1, № 35, с. 85] і інш. Для замоў, у якіх рожа выступае ў якасці кветкі, характэрны матывы «Рожа-кветка цвіце, вяне, ссыхае» і «Шоў нехта, нёс рожы; усе тры звялі, прапалі», якія вельмі распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Спецыфіку замоў ад рожы складаюць асаблівыя эпітэты, якія характарызуюць хваробу па розным прыкметам: 1) па месцу на целе чалавека: касцявая, нутраная, глазная, ушная і інш.; 2) па каляровай прыкмеце: красная, сіняя, чорная, ружовая, залацістая, серабрыстая і інш.; 3) па крыніцы захворвання: вадзяная, урочлівая, падзіўная, пасьмешная і інш.

У беларускай традыцыі замовы ад залатніку – адна з найбольш распрацаваных функцыянальных груп [5, № 778 – 830, с. 230 – 244]. У большасці замоў Падзвіння абыгрываецца назва хваробы (яе сувязь з золатам): «залатнік-залатнічуга» [1, № 7, с. 81], «залатнік залаценькі» [1, № 10, с. 82], «залатнік залатой, твой рог залатой» [1, № 13, с. 82] і інш. Часта ў тэкстах сустракаюцца і іншыя «залатыя рэаліі»: залатнік ідзе «па залатых дарожках, па залатых кусточках, па залатых масточках, па залатых сьцежках» [1, № 20, с. 83], папіраецца «залатым шастом» [1, № 4, с. 81] і г.д.

Залатнік асэнсоўваецца як адушаўлёная істота; у яго ёсць сваё ганаровае месца на «залатым крэсьлічку» [1, № 11, с. 82]. Хвароба апісваецца такім чынам, быццам залатнік пакінуў сваё месца і вандруе па целе. Найбольш частотны характар у замовах мае формула «Залатнік, стань на сваё месца». Формула шырока вядома ў беларускіх, рускіх і ўкраінскіх замовах. Можна заўважыць, што ў тэкстах замоў ад залатніку сустракаюцца формулы, характэрныя для іншых функцыянальных груп замоў, так, напрыклад, замовы № 14 і 18 [1, с. 82 – 83] пабудаваны па формуле, якая выкарыстоўваецца ў замовах ад звіху: «Нехта ідзе/едзе, спатыкаецца, звіх праходзіць».

Урокі таксама персаніфікуюцца. Паводле народных уяўленняў, урокі (сурокі, падзел, падзіў, нарадка, прыстрэк) узнікаюць пад уплывам благога погляду (злога, зайздроснага вока) або слова ці нават думкі ў бок пацярпеўшага. Яны бываюць розных відаў: *«Уціхайцеся, улягайцеся, уроцы, прыроцы: устрэчныя, папярэчныя, завісныя і радасныя, жаноцкія і дзявацкія, мужчынскія і младзенскія...»* [1, № 74, с. 91]. Лічыцца, што ўрокі могуць быць наўмысныя і ненаўмысныя. У першым выпадку суб'ектамі ўрокаў з'яўляюцца чараўнікі і ведзьмы, а таксама людзі, якія вылучаюцца сярод іншых сваім незвычайным выглядам або маюць пэўныя адхіленні ў здароўі ці паводзінах ад агульнапрынятых нормаў, што магло паказваць на іх сувязь з «іншасветам» (крывое, «краснае», сляпое і г.д. вока). Але найбольш небяспечнымі лічыліся ўрокі, выкліканыя адмысловымі праклёнамі («прымоўленыя», «нагаворныя», «пагаданыя»), што тлумачыцца паганскімі ўяўленнямі аб матэрыяльнай сутнасці і энергетычнасці слова, асабліва прамоўленага ў так званую «благую часіну» (уначы, апоўдні, напярэдадні свята і інш.), калі мяжа з іншасветам робіцца найбольш празрыстай. Узгадаем, што архаічным з'яўляецца суаднясенне ўрокаў з асноўнымі прыроднымі стыхіямі

(ветраное, вадзяное, агнявое, зямное), якія выступаюць не толькі як першакрыніца ўрокаў, але і як сродак пазбаўлення ад іх (зварот па дапамогу ў замовах да Лесавіка, Палевіка, «царыцы-вадзіцы», «цара-сонца», ветру, месяца і г.д.). Значна меншую небяспеку ўяўляюць урокі ненаўмысныя («пасмешныя», «падзіўныя», «завісныя», «радасныя» і інш.). Асноўнай прычынай падобных урокаў бачылася так званая «благая (дурная) часіна», калі выказаная пахвала ці здзіўленне мелі негатыўныя наступствы. Адсюль распаўсюджаныя формулы-перасцярогі кшталту: «У добры час сказаць, у благі памаўчаць», «Не пры нас гаворачы» і інш.

Розныя віды ўрокаў патрабуюць і розныя спосабы іх лячэння. Таму адной з першых аперацый знахара была дыягностыка («Трыдзевяць урокаў: які ты ўрок?») і выяўленне крыніцы захворвання з мэтай далейшага лячэння. Эфектыўнымі сродкамі ад ненаўмысных урокаў лічылася, напрыклад, вада з роту таго, хто сурочыў, ці пралітая праз рэч з адтулінай (Перунова страла», ключ, замок, клямка і інш.), працягванне дзіцяці паміж ног маці або праз кашулю, што сімвалізавала новае (здаровае) нараджэнне. Наўмысныя ўрокі здольны лячыць толькі знахары, якія валодаюць адмысловымі замовамі. У замовах знахар звяртаецца за дапамогай да цудоўных памочнікаў: святых, вады, птушак, жывёлы і інш., або ўласнай чароўнай сілай выганяе ўрокі з цела хворага і адсылае іх туды, адкуль яны ўжо не могуць шкодзіць чалавеку.

Цікава, што на тэрыторыі Падзвіння зафіксавана некалькі тэкстаў замоў ад «валасніка». Валасень у старажытнасці ўяўляўся ў выглядзе чарвяка, які трапляе ў цела і прабівае ў мяккіх частках хады і дзіркі. Як паведамляюць некаторыя даследчыкі, «хвароба ўзнікае ад таго, што ў час купання Валасіцік (жывы волас) трапляе пад скуру і поўзае там, -- пераважана на руках» [6, с. 96], або ўзнікае быццам бы ад чалавечага воласа, які ўрос у цела; таму знахары і прымушаюць яго выйсці з хворага і абвіцца вакол пальца» [7, с. 8]. Валасень у такой ступені рэальны, што некаторыя яго бачаць і нават вымаюць яго з раны: «Працэс вылечвання скандэнсаваны ў формуле «валасы, ідзіце на каласы». Рытуальнае дзеянне зводзіцца да таго, што пры захаванні адпаведных умоў праз каласы пралівалася на хворае месца гарачая вада. Потым на каласах знаходзілі мноства скручаных валасоў» [8, с. 62]. Параўнаем апісаны рытуал з наступным тэкстам замовы: *«Я хадзіла па чыстаму полю, каласкі сабірала, валасень выганяла. Валасень калючы, валасень ламучы, валасень урочны, валасень малочны, валасень касьцявы, валасень галаўны, выхадзі на чыстаю вадзіцу, плыві па чыстых азёрах, па чыстых рэках»* [1, № 206, с. 112].

Згаданыя вышэй прыклады паказваюць наколькі разнастайныя і цікавыя погляды чалавека на сутнасць і розныя праявы хвароб, што знайшло свае ўвасабленне ў мастацкіх вобразах. Адно бясспрэчна, што хваробы – нешта матэрыяльнае, што можна ўзяць у рукі, выгнаць, знішчыць пры дапамозе пэўных фізічных дзеянняў і г.д. Хваробы нярэдка персаніфікуюцца, да іх звяртаюцца як да жывых істот з просьбай або загадам пакінуць чалавека і сысці ў «чужы» свет. Гэтыя ўяўленні сведчаць аб тым, што замовы супраць хвароб вельмі старажытныя і адлюстроўваюць асаблівасці светапогляду чалавека на ранніх этапах яго развіцця, калі развіваліся розныя вераванні, у аснове якіх ляжала адухаўленне сіл прыроды, вера ў тое, што сілай магічнага слова можна ўздзейнічаць на любую хваробу.

Другая група замоў аб'ядноўвае тэксты, у якіх ужо не хвароба будзе выканаўцам просьбы хворага, а пасрэднік, да якога хворы звяртаецца за дапамогай. Пасрэднікі – святіла, стыхіі, расліны, жывёлы і г.д. – павінны забраць хваробу і даць чалавеку пакой і аблягчэнне. Вобразы гэтай групы надзеланы звышнатуральнымі магічнымі якасцямі і могуць абараніць чалавека ад уздзеяння стыхійных варожых з'яў рэчаіснасці. Звычайна гэта найвышэйшыя сакральныя і магутныя сілы прыроды, якія з увядзеннем хрысціянства трансфармаваліся ў вобразы хрысціянскіх святых, але пры гэтым захавалі свае асноўныя магічныя функцыі, а таксама ўласцівыя для іх атрыбуты.

У замовах Падзвіння знайшлі адлюстраванне як язычніцкія, так і хрысціянскія вобразы-пасрэднікі. Сярод язычніцкіх вобразаў вылучаюцца вобразы зары і вады. Да зары-зарніцы звяртаюцца за дапамогай у большасці замоў ад начніц: *«Вячэрняя зарніца, Божа памашніца, будзь как родная сястрыца»* [1, № 163, с. 104]. Трэба адзначыць, што ва ўсходнеславянскай традыцыі адсутнічаюць этыялагічныя паданні пра зару, але пры больш глыбокім даследаванні генезісу і спецыфікі вобраза зары можна заўважыць падабенства «зары-зараніцы» да ведыйскай Ушас: «Зара-зараніца, божая памашніца», «Зара-зарніца, красная дзявіца», «Зорка-зараніца, родная сястрыца» і інш. Так у замоўнай традыцыі ствараецца вобраз зары-царыцы, краснай дзявіцы, памочніцы Бога, блізкай людзям, учыннай да іх просьбаў. Для тэкстаў замоў ад начніц характэрны матыў «пабрацімства», «кумаўства», «сватання» як асаблівых умоў ажыццяўлення «абмену»: *«Зара-зарыца, божая памашніца, вазьмі ў майго дзіцяці начніцы, а дай яму саніцы»* [1, № 158, с. 104], *«Начніцы-сястрыцы, наце вам хлеб-соль, дайце майму дзіцяці сон»* [1, № 170, с. 105]. Акрамя схемы «вазьмі бяссонніцу – дай сон», замовы змяшчаюць клішэ з заклікамі ўстанаўлення сваяцкіх адносінаў: *«Зара-зарніца, родная сястрыца, у цябе дачка, у мяне сын – будзем іх жаніці. Вазьмі ў яго начніцы начныя, паўднёвыя і раньнія»* [1, № 161, с. 104].

Вобраз вады з'яўляецца галоўным персанажам замоў ад урокаў. Вада ў замовах персаніфікуецца, да яе звяртаюцца як да жывой істоты з асабліва паважлівымі адносінамі: «вадзіца-царыца, чыстая крыніца», «вада-дзявіца, Богу памажніца» (1, № 61, с. 89), або «вадзіца-царыца, усяму сьвету памашніца» (1, № 64, с. 90) і г.д. «Вадзіца-царыца», якая змывае карэнні, каменні, лічыцца універсальным сродкам, здольным змыць любую хваробу: *«Вадзіца – харошая славіца, смывала горы і даліны, крутые бераж кі, жоўтыя пяскі,*

сырое карэньне і шэрае каменьне. Смой с Рымінага белага цела, чтобы за вочы не балела...» [1, № 75, с. 91]. Погляд на ваду як на ачышчальную стыхію заснаваны на відавочнай і даволі рэальнай якасці вады – змываць усялякую гразь. Гаючыя ўласцівасці вады пры некаторых умовах таксама з'яўляюцца рэальным фактам. Таму зразумела тая роля, якую вада атрымала ў старажытнай знахарскай практыцы, у розных ачышчальных абрадах усходніх славян, як дарэчы, і вельмі многіх іншых народаў. Але звышнатуральныя, магічныя ўласцівасці прыпісваліся, безумоўна, не ўсякай вадзе, а вадзе, чым-небудзь неадзвычайнай: гэта павінна быць «замоўленая» ці «святая» вада, асвечаная папом або набраная з якой-небудзь «святой» крыніцы. Такая вада, на думку веруючых, валодае патэнцыяльнай гаючай і ачышчальнай сілай. Гаючай лічылася яшчэ дажджавая вада, раса, вада, набраная з трох (сямі ці нават дзевяці) рэчак або калодзежаў, а таксама вада, у якой варыліся велікодныя яйкі, якой мылі хлебную дзяжу, іконы, якую пралілі праз рэшата, адтуліну ад сучка ў смаліне. Гаючыя здольнасці набывае вада, у якую апускалі лекавыя расліны, вугалькі са сваёй печы, медныя, срэбраныя ці залатыя грошы.

Цікава ўзгадаць, што па народных уяўленнях, вада – адна з асноўных касмічных стыхій (побач з зямлёй, паветрам і агнём). У многіх міфалогіях, у тым ліку і ў славянскай, вада звязваецца з пачаткам стварэння Сусвету. Згодна з этыялагічнымі паданнямі, зямля была створана з пяску, узятага на дне першапачатковых водаў [9, с. 57]. Па другім паданні, «зямля стаіць на вадзе, а вада на зямлі... Канец зямлі дзесь далёка за морэм, там, дзе зямля стыкаецца з небам... Другія кажуць, што пад зямлёю е рэкі, вазёра й так шмат вады, што каб яна выступіла на землю, та б быў бы зноў патоп і ён заталіў бы ўвесь свет» [10, с. 47 – 48]. Няма амаль ні воднага народа, у якога вада не лічылася б Маці ўсяго жывога, гаючай, ачышальнай сілай плоднасці. Рускі народ гаварыў у старажытнасці: «Мать-водица – всему царица», «Нет воды – нет жизни» [11, с. 169]. Паняцце аб вадзіцы-царыцы ўзыходзіць як да хрысціянскіх, так і да язычніцкіх уяўленняў. Кантамінацыя гэтых вераванняў вызначыла вобраз райскай ракі, вады ў Эдэме, затым прымеркаваны былі да храма ў Іерусаліме і часткова атаясамліваемы з Іарданам. У Ветхім завеце ёсць апавяданне аб прывідах прарока Ізэкііля, дзе Гасподзь паказвае яму нябесны храм, з-пад парога якога цячэ вада на ўсход і дае жыццё: «Потым прывёў ён мяне назад да дзьвярэй храма, і вось, з-пад парога храма цячэ вада на ўсход: бо храм стаяў на ўсход, і вада цякла з-пад правага боку храма, па паўднёвы бок ахвярніка... І сказаў мне: гэтая вада цячэ ва ўсходні бок зямлі, сыдзе на раўніну і ўвойдзе ў мора: і воды яго зробяцца здаровымі. І ўсякая жывая істота, якая поўзае там, дзе ўвойдуць два струмяні, будзе жывая... і воды ў моры зробяцца здаровымі, і куды ўвойдзе гэты паток, усё будзе жывое там» (Іез., 47:1, 8, 9) [12, с. 1090].

Сярод вобразаў-пасрэднікаў у замовах Падзвіння, у прыватнасці ў замовах «Ад вяхі і мышынага гнязда» [1, № 29, с. 131] і «Ад рожжы» [1, № 9, с. 136], сустракаюцца вобразы цудоўных птушак, якія «кагцямі-нагцямі» выграбаюць, крыллем размятаюць, дзюбамі выдзёўбваюць хваробы: *«На сінім моры, на лукаморы, там стаіць дуб, на том дубе сядзіць чорны воран-залатыя крылья, зямчужныя пер'я, стальныя когці. А ты тут, воран, не сядзі, ляці ты к этай скаціне, (такой-та) шарсьціне. Разьбяры, раскулупай нагцямі-кагцямі, павыбірай вяху, павуціну і мышынае гняздо. Нясі на мхі, на балоты, на ніцыя лозы, дзе вецер не вея, дзе сонца ня грэя, дзе добрыя людзі не ходзяць»* [1, № 29, с. 131]. Гэтыя вобразы бяруць пачатак з таго прыёму лячэння, да якога звяртаўся заклінальнік у замоўным абрадзе, які ў сваю чаргу звязаны з уяўленнямі аб магчымасці перадачы хваробы каму- або чаму-небудзь. Хваробу перадаюць, напрыклад, зерню; з гэтай мэтай хворага «абсяваюць», абсыпаюць зернем, а потым куры, здзёўбваючы зерне, разам з тым знішчаюць хваробу. Так, пры лячэнні дзіцяці ад «прыткі» і ад «сценя»: дзіця саджаюць на дзежку, тройчы абсяваюць яго зернем, затым склікаюць кур, «штоб оны надбиралы зирнятка – стень больного» [13, с. 166].


У замовах «Ад начніц» нярэдка сустракаецца зварот за дапамогай да кур: *«Добры вечар певень Царык, заморскі пятух, і курыца Царыца Каця. Вам хлеб соль, дайце (імя) сон»* [1, № 28, с. 131], *«Курячкі рябыя, наце вам хлеб-соль, а нашаму (імя) дайце сон!»* [1, № 166, с. 105] . Пры гэтым працэс замаўлення, як правіла, суправаджаецца абрадавымі дзеяннямі: дзіця нясуць на ранішняй або вячэрняй разы да кур пад седала і вымаўляюць гэтыя замовы.

Сярод вобразаў хрысціянскіх святых у замовах Падзвіння часцей за ўсё сустракаюцца вобразы Ісуса Хрыста, Бога, Багародзіцы, Яна Златавуста, Ягорыя, Мікалая, Спаса і інш. Вобразы Ісуса Хрыста, Бога і Багародзіцы з'яўляюцца універсальнымі. Яны сустракаюцца ў замовах розных тэматычных груп. У адных выпадках да святых толькі звяртаюцца ў малітоўных уступах і закрэпках: *« Я ж цебе прашу, я ж цебе малю, ні сама сабой, а Госпадам Богам. Маць Прычыста, прыступі, мой дух палюбі»* [1, № 77, с. 92] *«Адзін утрох атракаем: Бог Ацец, Бог, Дух Сьвяты. Ах, Божа, мой Божа, я нічога не знаю кроме Господа Бога і духа Сьвятога, Ісус Хрыста і ўсіх Сьвятых імя тварца»* [1, № 79, с. 92]. У другіх выпадках святыя з'яўляюцца актыўна дзеючымі асобамі. Яны лечаць, здымаюць боль, знішчаюць хваробы або проста адсылаюць іх у іншасвет: *«На чыстым корні, на сінім моры Найсветша Матка Марыя пад белым камнем бель бяліла, шоўкі спрадала, кубкі мыла, цяжкую балезьнь замаўляла на векі вечныя»* [1, № 105, с. 96], *«Ішоў Ісус Хрыстос цераз дванаццаць поль, нёс Ісус Хрыстос дванаццаць рож...»* [1, № 39, с. 86]. Адным са спосабаў увядзення ў сюжэт вобразаў Ісуса і Багародзіцы з'яўляецца згадванне

іх у сувязі з тымі ці іншымі пакутамі або дзеяннямі, якія ў дадзены момант зведвае на сабе аб'ект замовы, напрыклад, сярод замоў Падзвіння часта сустракаюцца роз-ныя мадэфікацыі хрысціянскай малітвы «Сон Багародзіцы» [1, № 219, с. 113; № 224, с. 115]. Вобраз Ісус нярэдка звязваецца з матывам яго хрышчэння на Іардане [1, № 19, с. 83; № 138, с. 101; № 142, с. 101; № 186, с. 108].

Па нашым назіранням, вобразы хрысціянскіх святых Міхаіла-архангела і Георгія Пераможца выконваюць у замовах функцыю абаронцы, змагара з праціўнікамі чалавека: *«Будзе езьдзіць Міхайла-архайла з вострай сечай, з агнянай печай, будзе вас высякаць, выжыгаць, к дзесятай часьці высылаць»* [1, № 149, с. 102], *«Сходзіт Егорый з неба па залатой лесьніцы, сносіт Егорый трыста лук златапёрых і трыста лук злата-палотных. Стрэліць, адстрэліваець у раба божыя (імя) урокі, прыносы, грыжы бальной нечасьці і аддаець чорнаму зьверу на хрыбет...»* [1, № 73, с. 91]. Даследуючы генезіс і семантыку гэтых вобразаў, можна заўважыць, што па сваім функцыянальным асаблівасцям яны збліжаюцца з вобразам Перуна на аснове агульнага змеяборчага матыву. Як адзначае Л.Г. Неўская, «трансформы грамавержца – Гасподзь, Міхаіл архангел, Георгій, прарок Ілля і інш. – у замове ўжываюцца як абсалютныя сінонімы, і ў выпадку выраджэння тексту з'яўляюцца адзіным знакам, які ўказвае на залежнасць і вытворнасць замоўнага тэксту ад міфалагічнага...» [15, с. 71].

Вялікую групу складаюць вобразы, якія садзейнічаюць ажыццяўленню сітуацыі ў рэчаіснасць і ўзмацняюць магічнае ўздзеянне замовы. Гэта месца, час выкарыстання замовы, элементы малітоўных уступаў і закрэпкі. Большасць замоў, згубіўшы ў працэсе бытавання яўную сувязь з рытуалам, не маглі не захаваць асноўныя семантычныя прыкметы абрадавых дзеянняў, якія ў працэсе развіцця набылі, як правіла, міфалагічны сэнс. У сувязі з гэтым у замовах адлюстравалася асаблівая сакральная міфалагічная прастора, у якой адбываецца магічнае дзеянне. Перш, чым звярнуцца за дапамогай да чароўнага пасрэдніка (памочніка, абаронцы, апекуна або наадварот да праціўніка), суб'ект дзеяння (знахар або сам хворы) павінен устанавіць непасрэдны кантакт з іншасветам, увайсці ў яго. У адных замовах гэты момант як бы сам сабой зразумелы і фармальна ў тэксце не адлюстраваны (гэта ў асноўным невялікія тэксты, пазбаўленыя эпічнага зачыну): *«На чыстым корні, на сінім моры Найсветша Матка Марыя пад белым камнем бель бяліла...»* [1, № 105, с. 96]; у другіх тэкстах, забяспечаных такім зачынам, уваходу суб'екта ў нябачны свет адпавядае апісанне яго шляху праз міфалагічную прастору: *«Выйду я ў чыстае поле, гляну на сінія мара, там стаіць вярба. У той вярбе – нара»* [1, № 21, с. 129]. Міфалагічная прастора, як правіла, пабудавана па пэўнай мадэлі і запоўнена вобразамі-аб'ектамі, якія вызначаюць шлях суб'екта магічнага дзеяння да цэнтра сакральнай прасторы, дзе толькі і магчыма вырашэнне той ці іншай крызіснай сітуацыі. Выхад са «сваёй» прасторы падразумевае пераадоленне шэрага меж, з улікам якіх шлях героя да цэнтра сакральнай прасторы можна ўявіць у выглядзе наступнай схемы:



Аднак трэба адзначыць, што ў замовах Беларускага Падзвіння матыў выхаду персанажа ў сакральную прастору мае няпоўную форму. У тэкстах замоў амаль не сустракаюцца формулы, якія адпавядаюць першым двум элементам схемы, у замовах адразу апісваецца сакральная прастора, дзе адбываецца замоўнае дзеянне: *«Устану я раненька, умыюсь я бела-бяленька, выйду я ў чыстае поле, памалюсь я Госпаду вярненька: «На полі на Буяне, на моры на Сіяніі ляжыць Латар – белы камень. На том Латарэ, на белам камені Прачыстая Маць Сьвятого Спасіцеля садзержала...»* [1, № 24, с. 130]. Найбольш значныя локусы для дзеяння замоўных персанажаў – гэта «мора», «поле», «камень». Яны з'яўляюцца універсальнымі, таму што каля іх выконваюцца практычна ўсе дзеянні.

Праведзенае даследаванне паказвае, што вобразы замоў Беларускага Падзвіння даволі рознабаковыя, яскравыя і самабытныя. Аднак можна заўважыць, што рэгіянальная спецыфіка замоўных вобразаў беларусаў Падзвіння фарміруецца на глебе разнастайных традыцый усходнеславянскай замоўнай традыцыі і з'яўляецца яе неад'емнай часткай.

ЛІТАРАТУРА

1. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. / склад. А.У. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – Ч. 1. – 148 с.

2. Киселева, Ю.М. Композиционные разновидности русских лечебных и любовных заговорных формул / Ю.М. Киселева // Славянская традиционная культура и современный мир: сб. материалов науч. конф. – М.: Гос. респ. центр рус. ф-ра, 2002. – Вып. 4. – С. 166 – 178.
3. Пропп, В.Я. Морфология сказки / В.Я. Пропп. – М.: Наука, 1969.
4. Песков, А.М. Об устойчивых поэтических элементах русского заговора / А.М. Песков // Филология. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1997. – Вып. 5. – С. 26 – 39.
5. Замовы / рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – 597 с.
6. Романов, Е.Р. Белорусский сборник: Заговоры, апокрифы и духовные стихи / Е.Р. Романов. – Витебск: Тип-лит. Г.А. Малкина, 1891. – Вып. 5. – 452 с.
7. Сборник малороссийских заклинаний / сост. П.С. Ефименком // Чтения в Имп. Обществе истории и древностей российских при Московском университете. – М.: Университетская тап., 1874. – Кн. 1. II: Материалы отечественные. – VI. – 70 с.
8. Валодзіна Т. Валасень // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік / Т. Валодзіна [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 2004. – 592 с.
9. Зайкоўскі, Э. Вада // Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / Э. Зайкоўскі [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 57 – 59.
10. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / прадм. У.К. Касько; маст. В.Р. Мішчанка. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
11. Шахнович, М.И. Первобытная мифология и философия / М.И. Шахнович. – Л.: Наука, 1971. – 240 с.
12. Біблія. Кнігі Сьвятога Пісаньня Старога і Новага Запавету / пераклад В. Сёмуха. – 1-е выд. World Wide Printing Duncanville. – USA, 2002. – 1534 с.
13. Добровольский, В.Н. Смоленский этнографический сборник: в 4 ч. / сост. В.Н. Добровольский. – СПб. – М., 1891 – 1903. – Ч. 1. СПб., 1891.
14. Славянские древности: Этнолингвист. словарь: в 5-ти т. / под ред. Н.И. Толстого. – М.: Междунар. отношения, 1995. – Т. 1. – 584 с.
15. Невская, Л.Г. О заговорной реализации одного эпизода основного мифа / Л.Г. Невская // Этнолингвистика текста. Семиотика малых форм фольклора: тез. и предварит. материалы к симпоз.: в 2 ч. – М.: Наука, 1988. – Ч. 1. – С. 69 – 72.

ГЕОГРАФИЧЕСКИЕ, АРХЕОЛОГИЧЕСКИЕ И ЭТНОГРАФИЧЕСКИЕ ИССЛЕДОВАНИЯ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ В XIX – НАЧАЛЕ XX ВЕКА

канд. филол. наук, доц. С.М. СОРОКО
(Полоцкий государственный университет)

Анализируется процесс проведения в XIX веке научных исследований Северо-Западного края Российской империи через деятельность в регионах Губернских статистических комитетов, которые работали в непосредственном контакте между собой и географическими, археологическими, антропологическими, историческими научными сообществами, образующимися в это же время в Санкт-Петербурге и Москве. Проводится идея о синкретичном характере первоначально проводимых исследований Подвинья официальными государственными и общественными структурами на местах, постепенном разделении научных направлений и непосредственной связи полевых исследований с задачами и планами развития российской науки, которая сама в XIX веке находилась на стадии становления. Приводятся подтверждающие факты, что результаты многочисленных исследований Подвинья постоянно публиковались на страницах официального издания Витебской губернии – «Витебских губернских ведомостей», одновременно проходя патентование и апробацию полученных результатов.

Системное научное исследование белорусского края и культуры белорусов было начато в XIX веке в Российской империи. В первой половине XIX века эту работу вели ученые Российской академии наук, Московского общества истории и древностей Российских, Русского географического общества, а также отдельные представители передовой интеллигенции края, работающие или сотрудничающие с различными государственными и общественными организациями [1, с. 213]. Результаты исследований непременно публиковали официальные издания Санкт-Петербурга, Москвы или местные губернские ведомости. В это время официальные периодические издания Российской империи выполняли своеобразную патентную функцию, подтверждая самим фактом опубликованной информации право автора на научную разработку или изобретение. В Витебской губернии с 1838 года таким авторитетным официальным изданием были «Витебские губернские ведомости», причем, единственным светским периодическим изданием Подвинья вплоть до 1890-х годов, когда система прессы Северо-Западного края стала качественно меняться [2].

Среди вышеназванных научных центров выделялось Русское географическое общество (впоследствии Императорское Русское географическое общество). Оно было создано в 1845 году в Санкт-Петербурге и являлось одним из старейших (после Парижского, 1821; Берлинского, 1828; Лондонского, 1830) центров развития географической науки в мире. В 1846 году в Санкт-Петербурге было создано Русское археологическое общество (с 1849 года Императорское). У Витебска с Санкт-Петербургом были особые взаимоотношения. В Петербургский учебный округ с 1850 года после расформирования Белорусского учебного округа вошли все учебные заведения Витебской и Могилевской губерний (в 1796 – 1802 годах это была единая Белорусская губерния). То есть в XIX веке именно Санкт-Петербург был образовательным, научным, политическим, идеологическим центром, с которым были налажены непосредственные административные связи, из которого велся централизованный контроль и управление витебским регионом.

Географическая, археологическая и этнографическая наука в Витебской губернии Российской империи стала активно развиваться во второй половине XIX века благодаря деятельности членов Витебского губернского статистического комитета. В рамках этой официальной структуры, собственно говоря, и была долгое время сосредоточена основная научно-исследовательская деятельность, проводимая на местах по всестороннему изучению Белорусского Подвинья, в том числе проживающего здесь народа.

Губернские статистические комитеты под председательством гражданских губернаторов были образованы в Российской империи в январе 1835 года в соответствии с Указом Правительствующего Сената. Фактически действующим руководителем статистического комитета был его секретарь. В соответствии с уставом в число «непременных членов» губернского статистического комитета входили руководители всех губернских учреждений, а также руководители важных окружных учреждений губернии. «Действительные члены» губернского статистического комитета избирались из активной части дворянства, ученых, которые руководили экспедициями или временно по поручению правительства занимались различными научными исследованиями края. Само правительство Российской империи определило основной задачей статистического комитета сбор и предварительную обработку различной информации о регионе, в том числе о количестве и качестве имеющихся в губернии земель, природных ресурсов, об истории края, о населении, его языке и традициях. Естественно, полевые методы научного исследования местности здесь длительное время преобладали. Географические, археологические, антропологические и этнографические исследования первоначально велись параллельно, они еще не были разделены на самостоятельные научные направления как сегодня. То есть эта стадия формирования научно-исследовательской деятельности в Подвинье характеризуется синкретичностью, целостностью восприятия различных явлений, что немаловажно сегодня.

В Витебске, как и во многих других губернских городах Российской империи, деятельность статистического комитета разворачивалась медленно. Некоторое время он существовал лишь формально, на бумаге. В 1853 году царское правительство предприняло попытку активизировать деятельность губернских статистических комитетов, которых в этом году уже насчитывалось 33 в 49 губерниях европейской части Российской империи. В период 1853 – 1862 годов член Витебского статистического комитета архимандрит Никодим вел исследования по истории церковной архитектуры Полоцкой епархии. Возрождение православных традиций и истории православной церкви в «полонизированном» крае было актуальным и для православных, и для российской идеологии. Первые научные разработки носили стихийный и субъективный характер, часто проводились только благодаря энтузиазму отдельных неординарных личностей.

Активным членом Императорского археологического общества был коллежский советник Ксенофонт Говорский – редактор неофициальной части «Витебских губернских ведомостей» в 1858 – 1860 годах. Он опубликовал серию исторических обзоров из прошлого Полоцкой епархии [3], описал в ведомостях результаты полевых исследований археологической экспедиции, в которой сам принял участие. Это исследование местных курганов (волотовок), каменных крестов в местечках Экимань, Бездедовичи, Ветрино, усадьб и кладбищ кривичей в районе Полоцка [4, 5].

С 1853 по 1860 год члены Витебского губернского статистического комитета тщательно исследовали грунт, климат, равнины, болота, озера, реки с их содержимым; подробно описали почвенный покров берегов Двины. Все было скрупулезно подсчитано, итоги географического исследования Витебской губернии опубликовали «Витебские ведомости». Публикация представляет собой объемную статистическую информацию по всем 12 уездам губернии: Велижскому, Витебскому, Городокскому, Динабургскому, Дриссенскому, Лепельскому, Люцинскому, Невельскому, Полоцкому, Режицкому, Себежскому, Суражскому [6]. По своим размерам территория Подвинья Витебской губернии Российской империи XIX века была шире сегодняшнего Белорусского Подвинья. К Латвии уже отошли бывшие белорусские или витебские земли Динабурга-Двинска (современный Даугавпилс), Якобштадта (Екабпилс); к России – Себеж и Невель (Псковская обл.), Велиж (Смоленская обл.), Ильино (Тверская обл.), Сураж (Брянская обл.).

В 1861 году была разработана и утверждена правительственная Программа исследования губернии, которую напечатали «Витебские губернские ведомости». Истинной же датой начала масштабной научной деятельности Витебского губернского статистического комитета нужно считать 1863 год [7], когда испол-

няющим обязанности секретаря Витебского губернского статистического комитета стал ученый, писатель, член-сотрудник Императорского Русского географического общества Александр Максимович Сементовский-Курило (1821 – 1893). Одновременно он возглавил редакцию «Витебских губернских ведомостей» (постоянно подписывал номера газеты как редактор А. Сементовский, без приставки «Курило»).

Неофициальная часть витебской газеты «сделалась органом гласности Витебского статистического комитета» [8]. Витебским военным и гражданским губернатором, а также председателем Витебского губернского статистического комитета в это время был В.Н. Веревкин. Комитет активно сотрудничал с Виленским и Гродненским статистическими комитетами, с Императорским Московским Археологическим обществом. Из различных уголков империи сюда присылали уникальные находки, так или иначе касающиеся истории Беларуси. Например, из Оренбургского статистического комитета член-корреспондент Московского археологического общества Р. Игнатьев прислал в редакцию «Витебских ведомостей» корреспонденцию «Антиминс Буйницкаго монастыря, в имении подкомория Граецкаго, XVII века, найденный в г. Уфе» [9]. На страницах ведомостей публиковали информацию о проводимых в крае исследованиях, печатали ежегодные подробнейшие отчеты по деятельности комитета – «Журналы» заседаний Витебского губернского статистического комитета [10]. Лучшие достижения заносили в «Памятную книжку Витебской губернии». С 1861 по 1914 год вышла 31 книга [11].

Проделанная в 1860-х годах местными исследователями работа впечатляет своим объемом и исторической ценностью. Например, «Журнал Витебского губернского статистического комитета» в 1865 году содержит полные сведения о жителях губернии, об имеющихся постройках, сельскохозяйственных угодьях, лесах, озерах и реках, о развитии экономики края и т.д. [12]. Основную работу по обобщению и анализу данных, собранных непременными и действительными членами Витебского статистического комитета, выполнял А.М. Сементовский. Его вклад в становление геологии, археологии и этнографии Беларуси высоко оценен последователями, в том числе нашими современниками. В этом же «Журнале» приведены результаты проведенного А.М. Сементовским и Н.И. Костомаровым исследования уникальных текстов Центрального архива древних актовых книг города Витебска, датируемых XVI – XVIII веками. В Московском археологическом обществе, которое было образовано в 1864 году, профессор Н.И. Костомаров (1817 – 1885) занимался исследованиями истории Западной Руси. Ученые удивлялись, что древние акты «до того испещрены польскими и латинскими словами и выражениями, хотя писанными впрочем, русскими буквами, что незнакомому с этими языками, или, по крайней мере, с польским, невозможно понять даже смысла рукописи» [12]. Сегодня история Беларуси трактуется с позиции национальных белорусских приоритетов и ценностей, а в то время, в составе Российской империи, выводы, к которым приходят витебские ученые, можно назвать тенденциозными, идеологически окрашенными, преобладает российская православная ориентация. Тем не менее, это не опровергает истинности фактов, что очень важно.

Становление в этот период белорусской археологии прослеживается по публикациям Михаила Кустицкого. Его статья «Опыт археологических исследований в Лепельском уезде» [13] была опубликована в неофициальной части «Витебских губернских ведомостей» в 1865 году. Газета в это время находилась на пике публицистической активности, а ее корреспонденты успешно соперничали в журналистском мастерстве даже с корреспондентами «Виленского вестника», который редактировал и в котором публиковал свои статьи литератор, общественный деятель, археолог, этнолог, польско-литовско-белорусского ученый, действительный член Виленской археологической комиссии Адам Киркор (1812 – 1886). Не только «Виленский вестник», а и Московские, Санкт-Петербургские ведомости, журнал «Юго-Западный вестник» неоднократно перепечатывали краеведческие статьи «Витебских губернских ведомостей» 1864 – 1865 годов. Михаил Кустицкий – авторитетный ученый, участник серии археологических экспедиций, которые провело Московское археологическое общество на Витебщине и Смоленщине в 1860-х и 1870-х годах.

Начиная с 1870-х годов «Витебские губернские ведомости» публиковали труды по белорусской антропологии и этнографии. В 1870 – 1872 годах А. Сементовский представил витебскому читателю серию статей «Этнографический обзор Витебской губернии», где подробно описал границы поселений, жилище, быт, пищу, земледелие, вероисповедание различных народностей Подвинья, большую часть которых составляли белорусы. В 1872 году под таким же названием вышла в свет его книга в Санкт-Петербурге. Историческая статья «Человек каменного века в Витебской губернии» представляла собой содержание V главы приготовленного к печати сочинения члена Императорского Московского археологического общества Александра Сементовского [14]. История, антропология, этнография развивались еще «не членимо» друг от друга, постепенно формируя в общественном сознании идею об уникальности и самобытности белорусского этноса.

В 1880-х годах «Витебские ведомости» особое внимание уделили краеведческим научным разработкам. Путевые заметки «Озеро Лубань» Дейлидовича – это исследование автором озера («в географическом, геологическом, гигиеническом и экономическом отношении») с прилегающими к нему местностями по поручению витебского губернатора князя В.М. Долгорукова – председателя Витебского губернского статистического комитета [15]. Научные исследования проводились практически в каждом уезде. Наиболее интересные сведения публиковали ведомости, как например, статьи О.М. Киселева о Велиже [16, 17].

Такое повышенное внимание к краеведению было характерно и для других официальных изданий Северо-Западного края. Например, для «Минского листка» в 1886 и 1887 годах, когда в авторском коллективе работали М. Довнар-Запольский, И. Адамович, Н. Янчук, Янко Лучина и другие исследователи истории и традиций белорусского народа. Н. Янчук представлял деятельность Общества любителей естествознания, антропологии и этнографии (организовано в 1863 с целью проведения экспедиций и выставок) Московского университета. Н. Янчук и К. Иков провели полевые антропологические измерения жителей белорусских земель, а также исследовали человеческие останки, обнаруженные в курганах-погребениях [18]. Кстати, Н. Янчук, особо отмечая высокий научный уровень этнографических трудов А.Н. Пыпина, упрекнул членов Императорского Русского географического общества (Сантк-Петербург) в том, что они «устремились вместе с победоносным шествием русского оружия в Среднюю Азию» и совсем забыли про Белоруссию [19]. Вероятно, критика была отчасти справедливой. «Витебские ведомости» отреагировали на нее в 1896 году, опубликовав список трудов по этнографии Беларуси членов Императорского русского географического общества. Это Ю.Д. Талько-Гринцевич «К антропологии народностей Литвы и Беларуси»; Н.Ф. Сумцов «Разбор этнографических трудов Е.Р. Романова: а) Белорусский сборник; б) Опыты белорусского народного снотолкователя; в) Катрушницкий лемезень; г) Очерк быта нищих Могилевской губернии и их условный язык»; Ф.И. Леонтовичь «Крестьянский двор в литовско-русском государстве»; A. Letowski «Z zycia ludu bialoruskiego» (Wisla); М.А. Лобода «Белорусская народная поэзія и русскій былевой эпос» [20].

В 1890-х годах в творческом коллективе «Витебских губернских ведомостей» работали А. Сапунов, Н. Никифоровский, И. Долгов, Д. Довгялло, А. Пшелко, И. Спрогис, В. Стукалич, Н. Битная-Шляхто и многие другие исследователи истории белорусской культуры, труды которых общеизвестны и не требуют комментариев. Неофициальная часть газеты опубликовала много статей по языку, обрядам, традициям, быту белорусов. В 1893 году в Вильно прошел IX археологический съезд, организатором которого было Московское археологическое общество. В следующем 1894 году в городе Люцине Витебской губернии (ныне Лудза в Латвии) были проведены раскопки на территории Люцинского замка, уникальные реликвии 293 погребений исследованы учеными Императорского исторического музея [21]. И хотя редакция «Витебских ведомостей» выступает против статей полемического характера, звучит одна и та же мысль: белорусы – самостоятельный этнос, с собственной уникальной историей. Ее подтверждает В. Стукалич в «Краткой заметке о белорусском наречии» [22]. Но в целом переход от полевых исследований к системному анализу происходит в начале XIX века, когда уже появляется устойчивая самоидентификация белорусов, становится реальностью новая научная сфера – белорусоведение. В этом процессе немаловажную роль сыграли исследования Подвинья членами Витебского губернского статистического комитета на протяжении XIX века. Часть из них была продолжена или систематизирована Алексеем Парфеновичем Сапуновым (1852 – 1924) – исполняющим обязанности секретаря Витебского губернского статистического комитета в 1901 – 1907 годах; редактора «Витебских губернских ведомостей» в первой половине 1907 года, где был опубликован его историко-статистический очерк «Белоруссия и Белорусы» [23]; депутата III Государственной Думы в 1907 – 1912 годах.

Становление географической, археологической, антропологической, этнографической науки в витебском регионе происходит во второй половине XIX века на основе полевых исследований, проводимых членами Витебского губернского статистического комитета. Этот процесс шел планомерно, широко освещался в официальных изданиях. Опубликованные в «Витебских губернских ведомостях» более ста лет назад результаты исследований Подвинья и сегодня можно рассматривать как достоверные научные факты.

ЛИТЕРАТУРА

1. Русецкі, А.У. Мастацкая культура Беларусі / А.У. Русецкі. – Віцебск: Выд-ва Віцебск. дзярж. ун-та імя П.М. Машэрава, 1998. – 360 с.
2. Сороко, С.М. Витебские губернские ведомости (Официальная часть и неофициальная часть) / С.М. Сороко. – Москва – Новополоцк: Научный центр славяно-германских исследований ИСл РАН, 2004. – 220 с.
3. Сороко, С.М. Ксенофонт Говорский в «Витебских губернских ведомостях» / С.М. Сороко // Проблемы истории литературы: сб. науч. ст. / Моск. гос. откр. пед. ун-т. – М., 2001. – Вып. 13. – С.188 – 198.
4. Говорский, К. Археологические разыскания в окрестностях Полоцка / К. Говорский // Витебские губернские ведомости. – 1860. – № 11, 12.
5. Говорский, К. Поездка из г. Полоцка по направлению Ольгердовой дороги / К. Говорский // Витебские губернские ведомости. – 1860. – № 6.
6. Статистическое описание Витебской губернии // Витебские губернские ведомости. – 1860. – № 20.
7. Сапунов, А.П. Исторический очерк 50-летия Витебского губернского статистического комитета (1863 – 1913) / А.П. Сапунов. – Витебск, 1913. – 37 с.
8. Сементовский, А. Об издании неофициальной части Витебских губернских ведомостей / А. Сементовский // Витебские губернские ведомости. – 1864. – № 1.

9. Игнатьев, Р. Антиминс Буйницкаго монастыря, в имении подкомория Граецкаго, XVII века, найденный в г. Уфе / Р. Игнатьев // Витебские губернские ведомости. – 1865. – № 38.
10. Журнал Витебского губернского статистического комитета // Витебские губернские ведомости. – 1865. – № 25.
11. Памятная книжка Витебской губернии // Витебск: энциклопедический справочник. – Минск, 1988. – С. 273 – 274.
12. Журнал годичного общего собрания членов Витебского губернского статистического комитета // Витебские губернские ведомости. – 1865. – № 4.
13. Кустинский, М.Ф. Опыт археологических исследований в Лепельском уезде / М.Ф. Кустинский // Витебские губернские ведомости. – 1865. – № 20.
14. Сементовский, А.М. Человек каменного века в Витебской губернии / А.М. Сементовский // Витебские губернские ведомости. – 1887. – № 13.
15. Дейлидович. Озеро Лубань / Дейлидович // Витебские губернские ведомости. – 1886. – № 1 – 3.
16. Киселев, О. Несколько слов к истории города Велижа / О. Киселев // Витебские губернские ведомости. – 1886. – № 1, 2.
17. Киселев, О. Материалы к истории церквей г. Велижа / О. Киселев // Витебские губернские ведомости. – 1887. – № 15.
18. Янчук, Н. Из научной поездки в Белоруссию / Н. Янчук // Минский листок. – 1886. – № 67.
19. Янчук, Н. Из научной поездки в Белоруссию / Н. Янчук // Минский листок. – 1886. – № 73.
20. Сочинения о Белоруссии, изданные Императорским русским географическим обществом // Витебские губернские ведомости. – 1896. – № 67.
21. Люцин, Г. // Витебские губернские ведомости. – 1894. – № 16.
22. Стукалич, В. Краткая заметка о белорусском наречии / В. Стукалич // Витебские губернские ведомости. – 1895. – № 13 – 15.
23. Сапунов, А. Белоруссия и Белорусы / А. Сапунов // Витебские губернские ведомости. – 1907. – № 2.

ТРАДЫЦЫЙНЫЯ НАРОДНЫЯ ТКАНІНЫ ПАДЗВІННЯ: ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПАЛЯВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ 1998 – 2008 ГАДОЎ

Н.А. СУХАЯ
(Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці, Мінск)

Паказан абагульнены вопыт і вынікі палявых этнаграфічных даследаванняў «Студэнцкага этнаграфічнага таварыства» ў галіне вывучэння рэгіянальных адметнасцяў і мастацкіх асаблівасцяў народнага ткацтва беларусаў Падзвіння.

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» (РМГА СЭТ, далей – таварыства) узнікла на аснове суполкі студэнтаў-аматараў традыцыйнай культуры Беларусі. Экспедыцыйная дзейнасць вядзецца з 1998 года. Этнаграфічны рэгіён Падзвінне выклікае асаблівую зацікаўленасць даследчыкаў. Ад самага пачатку дзейнасці арганізацыі найбольш увагі ў палявых даследаваннях надавалася фальклорнаму матэрыялу, вывучэнню культавых камянёў і да т.п. Вывучэннем матэрыяльнай культуры, у тым ліку народнага тэкстылю, займаліся дадаткова. Адпаведна росту зацікаўленасці сярод сяброў СЭТа развіваліся і прафесійныя навыкі. Гэтаму спрыялі шматлікія кансультацыі ўжо вядомых даследчыкаў.

На працягу дзейнасці таварыства палявымі пошукамі было ахоплена каля 10 раёнаў Віцебскай вобласці, 8 – Мінскай, рэгіёны расійска-беларускага і латышска-беларускага памежжа. У артыкуле выкарыстоўваюцца матэрыялы экспедыцый: 1998 год – Лепель; 1999 – Гарадок – Усвяты; 2000 – Сянно – Талачын; 2001 – Крупкі; 2002 – Себеж; 2005 – Лёзна; 2006 – Ушачы – Докшыцы – Лепель; 2007 – Сураж, Латгалія; 2008 – Чашнікі. Лічбавыя і аналагавыя фотаздымкі з архіва СЭТ фіксуюць знаходкі, якія захоўваюцца ў прыватнай уласнасці жыхароў даследаваных вёсак, школьных музеях, клубных установах і сельскіх бібліятэках. Шмат каштоўных матэрыялаў дало знаёмства з калекцыямі раённых краязнаўчых музеяў.

У дадзеным артыкуле робіцца спроба прадэманстраваць сучасны зрэз захаванасці тэкстыльных вырабаў у рэгіёне даследавання паводле матэрыялаў палявых даследаванняў РМГА СЭТ, а таксама суаднесці знаходкі з існуючай класіфікацыі.

Традыцыйныя народныя тканіны Падзвіння даволі добра апісаныя даследчыкамі [1]. Асабліва гэта датычыць ручнікоў: у кнігах Фадзеевай [2] і Лабачэўскай [3] ручнікам Падзвіння (Паазер'я) прысвечаны асобныя главы. Апісанне ажурных тканін Віцебшчыны, якія з'яўляюцца адметнасцю яе заходняй часткі, падаецца ў даследаванні Віннікавай [4].

Характэрнай асаблівасцю народнага тэкстылю самага паўночнага этнаграфічнага рэгіёну Белаурсі, на думку Віннікавай, з'яўляецца тое, што тут старыя прыёмы дэкаравання тканін (бранае, выбарнае, ажурнае ткацтва) спалучаюцца з новымі шматнітовымі і пераборнымі тэхнікамі, якія ўвайшлі ў народнае мастацтва ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя праз школы-майстэрні. Пры чым выкарыстанне бранага ткацтва больш характэрна для ўсходняй часткі рэгіёну (у чым прасочваецца падабенства з паўночнарасейскімі тканінамі), а шматнітовыя тэхнікі Заходняга Падзвіння нясуць на сабе шмат агульнага з ткацкімі традыцыямі Панёмання і краін Балтыі [1, с. 9]. Акрамя таго, сярод ручнікоў Падзвіння выразную групу ўяўляюць сабой вырабы ста-раабрадцаў, якім прысвечаны шэраг артыкулаў Лабачэўскай [5]. Па матэрыялах Крупска-Барысаўскай экспедыцыі 2001 года і асабістых даследаванняў сябра таварыства В.М. Дзядовік падрыхтавала артыкул «Традыцыйнае мастацтва вырабу і аздаблення тканінаў Барысаўшчыны: да пастаноўкі праблемы» [6], у якім прапануе разглядаць Крупска-Барысаўскія ручнікі тыпу стараабраніцкіх як самастойную групу, дзе традыцыі стараабрадцаў цесна пераплятліся з традыцыямі мясцовага насельніцтва, што і адлюстравалася ў мастацкіх асаблівасцях названых ручнікоў.

На Падзвінні рана перасталі займацца хатнім вырабам тканін для патрэб гаспадаркі. Віной таму блізкасць рэгіёну да буйных тагачасных цэнтраў прамысловай вытворчасці тэкстылю (Масква, Пецярбург, Рыга), наяўнасць добрых шляхоў гандлёвых зносін з імі [7, с. 837]. Таму з цягам часу ўсё складаней знайсці лакальна адметныя прыклады традыцыйнага тэкстылю.

Знаходкі экспедыцый 1998 – 2008 гадоў можна ўмоўна падзяліць на дзве асноўныя групы па часе вырабу: тканіны даваеннага вырабу (першая палова XX ст.) і пасляваенныя. Абедзве групы маюць выразныя адрозненні. Больш старыя тканіны – сціплыя ў каляровым вырашэнні, аднак валодаюць большай разнастайнасцю рэгіянальных і лакальных рысаў, вылучаюцца багаццем асартыменту і тэхнік выканання. На тэрыторыі паўночнага рэгіёну напрыканцы XIX – пачатку XX стагоддзя дзейнічалі ткацкія школы-майстэрні. Колькасць такіх майстэрань на Віцебшчыне значна пераважала ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі [8, с. 32]. Таму ў раёнах Лёзна, Лепеля, Браслава і Вяліжа сустракаюцца шматнітовыя (на 5, 6, 8, 16 нітоў) складаныя вырабы пачатку XX стагоддзя, якія выкананы вясковымі ткачыхамі, якія праходзілі навучанне на курсах і ў майстэрнях.

У пасляваенных тканінах, наадварот, сціпласць змяняецца шырокай паліхромнасцю, аднак асартымент звужаецца ў асноўным да посцілак і ручнікоў. У 50-я гады XX стагоддзя папулярнай тэхнікай амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі, у тым ліку на Падзвінні, становіцца пераборнае ткацтва. Шматколерным «выкладаннем» дэкаруюць посцілкі, ручнікі, абрусы. Даступнымі становяцца фабрычныя фарбавальнікі, якія ствараюць новы вобраз традыцыйнага народнага тэкстылю.


Лепельская экспедыцыя 1998 года прынесла невялікую колькасць знаходак традыцыйных тканін. Па-першае, на той момант асноўную зацікаўленасць сяброў таварыства выклакаў песенны фальклор, традыцыі, звязаныя з каляндарнымі і сямейнымі абрадамі. Тэкстыльныя вырабы фіксаваліся паралельна, ім не надавалася належнай увагі. Па-другое, не была распрацавана метадалагічная база па даследаванню народнага тэкстылю. Крыху пазней склаліся творчыя кантакты з вядучымі навукоўцамі ў гэтай галіне, студэнты сталі карыстацца апытальнікамі, распрацаванымі лабараторыяй традыцыйнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры (цяпер Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»).

Асноўную частку зафіксаваных тэкстыльных вырабаў Лепельскага раёна складаюць посцілкі 50-х гадоў і пазнейшага перыяду вырабу. Сярод тэхнік ткацтва распаўсюджаны аднабаковы і двухбаковы перабор. Першы тып посцілак (з аднабаковым пераборам) уяўляе сабой дывановага тыпу вырабы, дзе малюнкі выкладаюцца на цёмным (чорным) фоне рознакаляровай пражай. Арнаментацыя часцей носіць раслінны (кветкавы) характар. Двухбаковыя пераборныя посцілкі выкананы з дзвух тыпаў пражы кантрастных колераў: чорнага (фарбаваны лён, фабрычная бавоўна) і каляровага (жоўтая, ружовая ці чырвоная воўна, сінтэтычныя ніткі). Уздоўж доўгіх бакоў перыметру ідзе палоска арнаментальнай каймы (напрыклад, «дубкі»), сярэдзіна запоўнена сеткавым арнаментам з ромбаў, зорак, кветак. Абодва тыпы посцілак сшыты з дзвюх полак.

Асобную групу ўяўляюць сабой чатырохніговыя двухутковыя посцілкі. Яны лічацца больш традыцыйнымі для дадзенага рэгіёну і больш старыя па часе вырабу. Выконваюцца з пражы двух гатункаў: аснова і першы ўток з ільну, воўна аднаго ці некалькіх колераў стварае другі ўток. Пры вырабе такіх тканін утвараецца перапляценне, якое нагадвае шашачны малюнак. Двухколерныя чатырохнітовыя посцілкі ў рэгіёне носяць назву «дымы́» ці «ды́мкі».

Ручнікі, зафіксаваныя на Лепельшчыне, простага палатнянага перапляцення з вышыўкай крыжыкам па канцах, аздоблены карункамі, плеценымі пры дапамозе шыдэлка. Узоры вышыўкі – раслінныя і зааморфныя (напрыклад, «пеўнікі»). Скарэй за ўсё, гэтыя знаходкі можна аднесці да групы так званых бракараўскіх ручнікоў [3, с. 202]. Цікавы ручнік з групы стараверскіх выбарных (паводле Лабачэўскай [3, с. 146]), зафіксаваны на фотаздымку (мал. 1). Ручнік вісіць на куце. На яго канцах у тэхніцы выбарнага ткацтва выканана выява дрэва жыцця, стылізаванага ў выглядзе вазона з кветкамі. Арнаментальная кампазіцыя

выткана з пражы двух колераў (магчыма – чорнага і чырвонага). Паабапал асноўнага вялікага вазона сіметрычна выяўлены два маленькія. На чорна-белым здымку бачна, што канцы ручніка з дэкорам прышыты, верагодна пазней, да асноўнай чатырохнітовай палатніны.



Мал. 1. Ручнік, Лепельскі раён
(архіў РМГА СЭТ, Лепель – 1998, стужкаVIII, фота 4)

Экспедыцыя «Усвяты-Гарадок» 1999 года даследавала надзвычай цікавую частку беларуска-расійскага памежжа. Асноўным вывадам даследавання памежных тэрыторый з'яўляецца тое, што дзяржаўныя межы часта не супадаюць з межамі этнічнымі. Лакальная культура Гарадоцка-Усвяцкага мікрарэгіёну вызначаецца шэрагам адметнасцей як у лінгвістычных адносінах, песеннай творчасці, так і ў праявах матэрыяльнай культуры. Ручнікоў з ажурным шыццём па сетцы, якія з'яўляюцца адметнасцю Гарадоцкага, Шумілінскага і Віцебскага раёнаў (паводле Фадзеевай [2, с. 261]), у экспедыцыі не сустракалася. Гэтыя вырабы адносяцца даследчыкамі да пачатку XX стагоддзя. Сярод больш позніх вырабаў удалося заўважыць некаторыя кампазіцыйныя заканамернасці. Найбольш папулярным спосабам дэкору зафіксаваных ручнікоў з'яўляецца вышыўка. Сустракаюцца бардзюрныя бракараўскія кампазіцыі з выкарыстаннем чорнай і чрвонай пражы, паліхромная вышыўка гладдзю і крыжыкам. Аднак любая вышыўка размяшчаецца на ручніку ў выглядзе палос арнаменту. Нават рэалістычныя разеткі з ружаў выстройваюцца ў бардзюры па канцах ручніка. У большасці вырабаў першая паласа ўзору аддзяляецца ад наступных ці ад асноўнай палатніны палоскай карункаў, плеценых шыдэлкам. Канцы ручніка таксама аздоблены плеценымі карункамі з падобным арнаментам. Больш раннімі па часе, напэўна, з'яўляюцца ручнікі, вышытыя сцябліністым швом чорнымі ніткамі з дадатковай «расфарбоўкай» асобных элементаў чырвонай гладдзю (мал. 2).



Мал. 2. Ручнікі, Гарадоцкі раён
(архіў РМГА СЭТ, Гарадок – Усвяты – 1999, стужка Т-І, фота 10)


Асноўная палатніна ручнікоў выткана ў шматнітовай тэхніцы. Ніз ручнікоў і прошва, якая аддзяляе вышыўку ад асноўнай часткі, аздоблены плеценымі карункамі – захоўваецца традыцыйны тып ручніковай кампазіцыі.

Сярод посцілак пераважаюць чатырохнітовыя двухутковыя вырабы. Адзінкавай знаходкай з'яўляецца тканы пояс з в.Зайкава. Пояс выкананы ў тэхніцы ткацтва на ніту чырвонай воўнай па шэрым ільняным фоне. Чырвоныя доўгія кутасы перацягнуты зялёнай ніткай. Арнамент ромба-геаметрычны (мал. 3).


Папулярнай у вясковым асяродку 50 – 70-х гадоў тэхнікай тэкстыльнага дэкору з'яўляецца гафтаванне. Ажурныя малюнкі са скразнымі прарэзкамі аздабляюць падузорнікі, фіранкі, накідкі на падушкі, сурвэткі і іншыя вырабы на Гарадоччыне.

Гафтаванне па выніках даследавання 2000 года атрымала распаўсюджанне і ў Сенненскім і Талачынскім раёнах. Сустракаліся таксама шматнітовыя ручнікі, аздобленыя сцяблістым швом. Зафіксаваны чатырохнітовыя двухутковыя посцілкі: як двухколерныя, так і з выкарыстаннем рознакаляровага ўтку.

Пераборныя посцілкі Крупскага раёна (экспедыцыя Крупкі – 2001) мала адрозніваюцца ад тых, што апісаны па матэрыялах Лепельскай экспедыцыі. Двухколерныя чорна-жаўтыя і чорна-ружовыя яны маюць бардзюрны арнамент па доўгіх баках перыметру, сярэдзіну запаўняе сетка з кветкавымі, зоркавымі ці рамбічнымі элементамі. Цікавай знаходкай з'яўляецца ручнік у тэхніцы бранага двухуточнага ткацтва (мал. 4).



Мал. 3. Пояс, в. Зайкава, Гарадоцкі раён
(архіў РМГА СЭТ, Гарадок – Усвяты – 1999, стужка Т-І, фота 13)



Мал. 4. Ручнік, Крупскі раён
(архіў РМГА СЭТ)

Па нізу ідуць тры шырокія паласфы ромба-геаметрычнага арнаменту, вышэй – дзве больш тонкія паласы, якія ўяўляюць сабой фрагмент большага арнаменту. Асноўная частка ручніка выткана ў тэхніцы чатырохнітовага ткацтва («у агуркі» ці «у кругі»). Арнамент вытканы ў тэхніцы бранага ткацтва, якое характэрна для ручнікоў усходняй часткі Падзвіння, аднак мастацкія асаблівасці апісанага ручніка не супадаюць ні з адной вызначаных груп ручнікоў Віцебшчыны. Сярод позніх па вырабе ручнікоў (50 – 70-я гады XX ст.) пераважаюць вышываныя паліхромнай гладдзю з кветкавымі кампазіцыямі. Яны не маюць вузкай рэгіянальнай прывязкі і сустракаюцца па ўсёй тэрыторыі краіны. Лёзненскі раён парадаваў яскравымі прыкладамі віцебскіх ручнікоў [3, с. 142].

Браныя ручнікі са шмат'яруснай бардзюрнай кампазіцыяй належаць па часе да канца XIX – пачатку XX стагоддзя (мал. 5, справа). Выразную адметнасць вырабам гэтай групы надае меланжыраванне чырвонага ўтку чорнымі ніткамі. Найпрыгажэйшыя прыклады віцебскіх ручнікоў зафіксаваны ў вёсках Ніўкі і Шацілава. У падобнай тэхніцы дэкараваны рукавы і плечы кашулі з в. Ніўкі.

Цікавую групу складаюць ручнікі, вышываныя сцяблістым швом і «расфарбаваныя» гладдзю, са шмат'яруснымі кветкавымі кампазіцыямі, а таксама ручнік з выявамі цэркваў (мал. 6). Верагодна, яны маюць дачыненне да стараверскай традыцыі.

Ручнік, падобны да названых, прадстаўлены ў зборніку «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Віцебскае Падзвінне» [7, мал. 293] паходзіць з Дубровенскага раёна.

Багатыя знаходкі народнага тэкстылю прынесла вандроўка 2006 года на Ушаччыну. Васьмінітовыя шэрыя абрусы, паліхромныя «вясёлкавыя» паласатыя посцілкі, пераборныя посцілкі, якія імітуюць малюнкі фабрычных дываноў з замкнёнай цэнтрычнай кампазіцыяй, перабіраныя бела-шэрыя і бела-сінія ручнікі, гафтаваныя вырабы – вось перапачатковы пералік найбольш часта сустракаемых рэчаў. Тканіны


рэгіёну нясуць усе прыкметы заходняга Падзвіння, блізкага да Панёманскай традыцыі. Існаванне тут складаных шматнітовых тканін (мал. 7) тлумачыцца, магчыма, уплывам Лепельскай ткацтка-дывановай майстэрні, якая была заснавана Лепельскім павятовым земствам да 1914 года [8, с. 32].



Мал. 5. Ручнікі, в.Шацілава, Лёзненскі раён (архіў РМГА СЭТ)



Мал. 6. Ручнікі, в. Шацілава, Лёзненскі раён (архіў РМГА СЭТ)




Мал. 7. Абрус, васьмінітовае ткацтва, Ушацкі раён (архіў РМГА СЭТ, фота З. Мурашкі)

Характэрнай з'явай сярод тканін Заходняй Белаурсі з'яўляюцца папярочнапаласатыя бясшоўныя посцілкі – «вясёлкі». Іх паходжанне звязваецца з Гродзеншчынай. У пасляваенныя гады такія посцілкі пачалі ткаць і на Віцебшчыне, спачатку ў заходніх яе раёнах [7, с. 841]. Посцілкі не маюць шва пасярэдзіне, абедзьве полкі ткуцца адначасова пры дапамозе аднаго ўтку, які аб'ядноўвае два слаі асновы. Менавіта такія прыклады зафіксаваны на фотаздымках з Ушацкага раёна (мал. 8).


Папулярнай тэкстыльнай тэхнікай 70 – 80-х гадоў XX стагоддзя на Ушаччыне стаў выраб ворсавых дываноў пры дапамозе спецыяльнай іглы. Кампазіцыі нагадваюць фабрычныя дыфваны, аднак сустракаюцца і аўтарскія дываны з пейзажнымі малюнкамі, выявамі жывёл. Адметныя дываны зафіксаваны ў в. Заляддзе – аўтар Майсяёнак Надзея Філіпаўна (1942 г. н.).

Сярод ручнікоў адметнымі з'яўляюцца шырокія ручнікі, якія вытканы ў тэхніцы двухбаковага перабору «пад слупок» (мал. 9). Доўгія і шырокія (каля 50 см) вырабы выраблены з ільняных нітак, маюць вузкую кайму ўздоўж кромкі і раслінны арнамент з вертыкальным рапортам пасярэдзіне. Сціплае каляровае вырашэнне – два адценні натуральнага і адбеленага ільну – надаюць ручнікам далікатнасць і вытанчанасць. Стылістыка ручнікоў, зафіксаваных на Ушаччыне, падобная да гродзенскіх пераборных ручнікоў [7, с. 192], якія атрымалі распаўсюджанне на ад Навагрудка да Смаргоні і Ашмян. Аднак арнаментыка гродзенскіх ручнікоў геаметрызаваная. Магчыма, апісаныя вырабы з Ушаччыны паходзяць ад віленскіх

скіх шматнітовых ручнікоў [7, с. 182], падобныя да якіх вырабы сустракаліся і ў экспедыцыі 2006 года. Яны таксама даволі шырокія, падобныя ў каларыстычным вырашэнні. Адрознай з'яўляецца тэхніка выканання. Верагодна, прыклады з Ушаччыны з'яўляюцца позняй інтэрпрэтацыяй мастацкага канона ручнікоўых вырабаў Заходняга Падзвіння і Панямоння.




Мал. 8. Посцілкі, Ушацкі раён
(архіў РМГА СЭТ, фота З. Мурашкі)



Мал. 9. Ручнікі, в. Заляддзе, Ушацкі раён
(архіў РМГА СЭТ, фота З. Мурашкі)


У Латгальскай экспедыцыі 2007 года бралі ўдзел супрацоўнікі музея традыцыйнага ткацтва Паазер'я, таму фіксацыя гэтага віду рамяства вялася больш падрабязна. Сярод папулярных знаходак можна адзначыць распаўсюджаныя на Падзвінні чатырохнтовыя посцілкі ў тэхніцы двухбаковага перабору, посцілкі – «дымкі», шматнітовыя ручнікі з пазнейшай вышыўкай гладдзю па канцах. У позніх тканых рэчах назіраецца ўплыў фабрык мастацкіх вырабаў, якія ў 70-я гады прыцягвалі да работы ткачых-надомніц. Прыкладам такога ўзаемадзеяння могуць служыць посцілкі, утвораныя ад «вясёлак», дзе ў якасці дэкаратыўнага эфекту дадаюцца палосы бранага арнаменту. Сярд ходнікаў вылучаюцца чатырохнітовыя з каляровай асновай (мал. 10). Такія вырабы, па сведчанню мясцовага насельніцтва, прывозіліся з Белаурсі і рэалізоўваліся на кірмашах.



Мал. 10. Ходнік, Латгалія
(архіў РМГА СЭТ)

Папулярнай знаходкай уэкспедыцыі сталі вышываныя насцілам па сетцы (накшталт рыбалоўнай) вырабы з дывановай кампазіцыяй (мал. 11). Сеткі плялі пры дапамозе чоўніка, шыдэлка ці вязалі на раме. Вышыўка выконвалася воўнай розных колераў. Такі від дэкору атрымаў распаўсюджанне ў Паўночна-Заходніх раёнах Белаурсі ў пасляваенныя гады і звязваецца даследчыкамі з распаўсюджаннем моды на дывановыя вырабы (у тым ліку маляваныя) [7, с. 848]. Такія сеткі выкарыстоўвалі ў якасці насценных ды-


ваноў, покрываў на ложкі і абрусаў. Сеткавыя вырабы сустракаюцца на паўночным Захадзе нашай краіны (Валожынскі, Вілейскі, Мядзельскі раёны Мінскай вобл.).



Мал. 11. Вышыўка па сетцы, Латгалія, архіў РМГА СЭТ

Рэгіён беларуска-латышскага памежжа адметны таксама вялікай колькасцю карункавых вырабаў.

Экспедыцыя 2008 года ў Чашніцкі раён прынесла адметныя ў колькасным і якасным плане знаходкі стараверскіх выбарных ручнікоў [7, с. 146] (мал. 12). Найбольш такіх ручнікоў з выявамі стылізаванага дрэва жыцця зафіксавана ў вёсках Валасачы, Вяцера і інш. Асноўная палатніна большасці вырабаў выконваецца ў тэхніцы чатырохнітовага двухутковага ткацтва. Па канцах выкладзена класічная выява дрэва, якая вар'іруецца ў вялікай разнастайнасці прыкладаў. Сустракаюцца і прыклады з антрапаморфнымі выявамі, якія характэрны выключна для Падзвіння. Цікавы ручнік з выявай ромба, вяршыні якога прарастаюць вялікімі геаметрычнымі фігурамі (мал. 13)



Мал. 12. Ручнік, Чашніцкі раён
(архіў РМГА СЭТ, фота Я. Санко, А. Емельянавай)



Мал. 13. Ручнік, Чашніцкі раён
(архіў РМГА СЭТ, фота Я. Санко, А. Емельянавай)

У літаратуры падобная выява адлюстравана як прыклад выбарных ручнікоў стараверaў з Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці [7, мал. 158]. Аднак у верхняй частцы арнаментаваных канцоў ручніка

там выяўлены рад з ромбападобных фігур з парасткамі. У нашым прыкладзе ж выразныя жаночыя фігуры з апушчанымі ўніз рукамі. Падобны ручнік сустрэўся нам у царкве в. Прусы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці і апісаны ў артыкуле Лабачэўскай [9].

Сустракаюцца ручнікі, вышытыя сцяблінстым швом і гладдзю. Выявы раслінага характару (стылізаванае дрэва жыцця). Падобныя прыклады сустракаліся ў Гарадоцкім і Лёзненскім раёнах.

Чашніцкія посцілкі ў большасці чатырохнітовыя двухутковыя. Сустракаюцца вырабы з сеткавай кампазіцыяй тыпу «дымак», посцілкі з двухбаковым пераборам чорна-чырвоныя, чорна-зялёныя і да т.п. Кампазіцыйнай выразнасцю вылючаюцца двухбаковыя перабіранкі з дывановай кампазіцыяй. Сярод позніх вырабаў вылучаюцца аднабаковыя паліхромныя посцілкі і вышываныя гладдзю ручнікі, наўлечкі і падузорнікі, распаўсюджана гафтаванне і пляценне карункаў.

Паводле палявых дасладаванняў РМГА СЭТ 1998 – 2008 гадоў раёнах Падзвіння зараз амаль не займаюцца хатнім рукадзеллем. Хатні выраб тканін эпізадычна існаваў прыкладна да 50 – 60-х гадоў XX стагоддзя. Адбылося гэта па прычыне выцяснення хатніх вырабаў фабрычнымі. Майстрыхі-аматаркі, якія займаліся ткацтвам, спынілі свой занятак па прычыне сталага ўзросту.

Сярод знаходак сустракаюцца тканіны даваеннага вырабу, якія адрозніваюць сціплая каляровая гама, разнастайнасць тэхнік і асартыменту. Сярод ткацкіх тэхнік, характэрных для рэгіёну, сустракаюцца шматнітовае ткацтва першай паловы XX стагоддзя (4 – 8-нітовыя абрусы, ручнікі, посцілкі), браныя вырабы – ва ўсходняй частцы Падзвіння. Выразную групу складаюць тканіны стараверскай традыцыі (браныя, выбарныя, вышываныя сцяблінстым швом). Рэчы другой паловы XX стагоддзя выконваюцца ў тэхніцы папулярнага адна- і двухбаковага пераборнага ткацтва, вышываюцца паліхромнай гладдзю. Знаходкі пасляваеннага часу вырабу ўяўляюць сабой паліхромныя вырабы з пражы часцей фабрычнай вытворчасці. Па позніх вырабах складана прасачыць рэгіянальныя і лакальныя адметнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. Винникова, М.Н. Народное узорное ткачество Беларуси конца XIX – начала XX века: автореф. дис. ... канд. искусствовед. / М.Н. Винникова. – Минск, 2001.
2. Фадзеева, В.Я. Беларускі ручнік / В.Я. Фадзеева. – Мінск: Полымя, 1994. – 327 с.
3. Лабачэўская, В.А. Повязь часоў – беларускі ручнік / В.А. Лабачэўская. – Мінск: Беларусь, 2002. – 232 с.
4. Віннікава, М.М. Ажурныя тканіны Віцебшчыны / М.М. Віннікава // Помнікі мастацкай культуры Беларусі. Новыя даследаванні: зб. артыкул. / АН БелССР. Ін-т мастацтвазн, этнагр. і фалькл.; пад рэд. С.В. Марцэлева. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 89 – 92.
5. Лабачэўская, В.А. Ручнікі стараабрадцаў з Віцебшчыны / В.А. Лабачэўская // Мастацтва. – 1995. – № 11. – С. 62 – 65; № 12. – С. 40 – 44.
6. Дзядовік, В.М. Традыцыйнае мастацтва вырабу і аздаблення тканінаў Барысаўшчыны: да пастаноўкі праблемы / В.М. Дзядовік // Традыцыйнае ткацтва Міншчыны: матэрыялы аблас. канф., 2001.
7. Лабачэўская, В.А. Рэгіянальныя асаблівасці народных тканін / В.А. Лабачэўская // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева [і інш.]; склад. Т.Б. Варфаламеева. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – Т. 2: Віцебскае Падзвінне. – 910 с.
8. Лабачэўская, В.А. Вучэбныя ткацкія майстэрні на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / В.А. Лабачэўская // Ткацтва: зб. матэрыялаў па беларус. народ. ткацтву / уклад. В.А. Лабачэўская. – Мінск: БелІПК, 1999. – 100 с.
9. Лабачэўская, В. Вандраванне ўзору (аб паходжанні аднаго арнаментальнага матыву ў старадарожскіх пераборных ручніках) / В. Лабачэўская // Традыцыйнае ткацтва Міншчыны: матэрыялы аблас. канф.

ТУРОЎЛЯ Ў СУПРАЦЬСТАЯННІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І МАСКОЎСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ ПАДЧАС ІНФЛЯНЦКАЙ ВАЙНЫ

Ю.Ф. УСЦІНОВІЧ
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

Напачатку другой паловы XVI стагоддзя Вялікае княства Літоўскае схілілася да ўдзелу ў Інфлянцкай вайне. Але ўрад не ўлічыў нізкі вайсковы патэнцыял дзяржавы. Асноўныя вайсковыя сілы, паспалітае рушэнне, ужо не адпавядалі запатрабаванням часу, а на ўтрыманне належнай колькасці наймітаў не хапала сродкаў. Таксама менавіта цяпер відавочна праявіўся крызіс ва ўтрыманні і будаўніцтве дзяржаўных умацаванняў. Пакуль ваенныя дзеянні адбываліся не на землях ВКЛ, апошняя з пазначаных акалічнасцяў не аказвала істотнага ўздзеяння на ход вайны. Аднак як толькі тэатр ваенных дзеянняў пашырыўся на межы дзяржавы, гэта пачало аказваць негатыўны ўплыў. Пасля страты Полацка ўрад ВКЛ быў не здольным узвесці неабходную колькасць новых умацаванняў на стратэгічна важных плацдармах. Яскрава гэта дэманструе прыклад з Туроўляй.

Пасля захопу Полацка Іванам IV, маскоўскі і літвінскі бакі па-рознаму інтэрпрэтавалі права ўладарання над усёй Полацкай зямлёй. Маскоўскія ўлады сыходзілі з таго, што з авалоданнем галоўным горадам ваяводства ўсе падпарадкаваныя яму землі павінны перайсці пад іх уладу. Магчыма гэта стала адной з прычынаў, чаму ў першыя гады ўладарання на Падзвінні Масква не ўзводзіла тут новых умацаванняў.

Кіраўніцтва ВКЛ, са свайго боку, працягвала лічыць левабярэжную Полаччыну сваёй тэрыторыяй і ў рэшце рэшт здолела не дапусціць яе пераходу пад поўны кантроль царскіх ваяводаў. Адразу ж пасля страты Полацка літвінскі бок распачаў будаўніцтва на тэрыторыі Полацкага ваяводства новых умацаванняў. Ніжэй па цячэнню Дзвіны ад маскоўскага Полацка спешна ўзводзіцца Дзісенскі замак [1, с. 106, 107]. Таксама, у 1563 годзе пачалося будаўніцтва Ульскага замка. Але дадзенае мерапрыемства не было завершана. Разумеючы ўсю небяспеку замацавання на ўльскім плацдарме літвінаў, царскія войскі напалі і знішчылі недабудаванае ўмацаванне [2, с. 690]. Узвядзенне літвінскіх фартэцый адбывалася ў 1564 годзе і ў Вароначы [3, с. 100]. У 1566 годзе вялося будаўніцтва ўмацаванняў у Лепелі [4, с. 747].

Але ўвогуле трэба адзначыць, што каб больш-менш выконваць свае функцыі, узведзеныя ў ВКЛ на хуткую руку ўмацаванні, патрабавалі далейшай дабудовы. Так, яшчэ нават вясной 1568 года, разам з пасылкай з гаспадарскіх валасцей людзей на ўзвядзенне замка ў Чашніках і правядзення рамонтна-будаўнічых работ на Дрысе, працоўныя сілы адпраўляліся з той жа мэтай да Дзісны, Вароначы і Лепеля [5, s. 251]. Такім чынам, урад ВКЛ распачаў ўзвядзенне ўмацаванняў у Дзісне пасля 1563 года, у Вароначы ў 1564 годзе, у Лепелі ў 1566-м, але не здолеў цалкам завяршыць справу яшчэ да вясны 1568 года.

У гэтым плане параўнацца з магчымасцямі Маскоўскай дзяржавы ў будаўніцтве новых фартэцый ВКЛ не магло. Прычына заключалася ў тым, што сістэму ўзвядзення і ўтрымання дзяржаўных умацаванняў у дзяржаве спасціг крызіс. Ён выкліканы некалькімі прычынамі. Па-першае, накапілася шмат розных змяненняў даўніны, якія прыводзілі да блытаніны ў выкананні мясцовым насельніцтвам абавязкаў на карысць умацаванняў. Па-другое, скарачэннем дзяржаўнага зямельнага фонду, бо памяншаліся паступленні ў скарб і, адпаведна, змяншаліся магчывасці дзяржавы выдаткоўваць сродкі на свае ўмацаванні. Па-трэцяе, стратай тэрыторый на ўсходніх межах. Паколькі з іх спынялася выкананне ўсялякіх павіннасцяў і службаў на карысць умацаванняў, то ўзнікала патрэба ў павелічэнні датацый з боку дзяржаўнага скарба. Па-чацвёртае, свавольствамі феадалаў, якія, карыстаючыся слабасцю цэнтральнай улады, самавольна спынялі выкананне павіннасцяў на карысць дзяржаўных умацаванняў.

Тым часам, Іван IV з 1563 года паступова нарошчваў ваенную прысутнасць царскіх войскаў на полацкіх і віцебскіх землях. Наступны, 1564, год прынёс для ВКЛ новыя страты – літвіны згубілі замак Азярышча [3, с. 90]. Калі з сярэдзіны 60-х гадоў XVI стагоддзя для Маскоўскай дзяржавы стала відавочным, што ўсё Полацкае ваяводства не пяройдзе цалкам пад яе уладу, яна распачынае актыўнае будаўніцтва сваіх замкаў у месцах, якія менавіта на той момант станавіліся стратэгічна важнымі. Пры іншых межах паміж дзяржавамі будаўніцтва гэтых умацаванняў магло быць немэтазгодным. У выніку ў ліпені 1565 годзе быў пабудаваны Усвяцкі замак, у кастрычніку 1566-га – Ульскі, а ў снежні таго ж года – Сокал [6, с. 351, 353].

Агульную сітуацыю і магчывасці ВКЛ у фартыфікацыйным супрацьстаянні з Маскоўскай дзяржавай дастаткова паказальна характарызуе рэакцыя ўрадавых колаў на ўзвядзенне ваяводамі Івана IV падчас перамір'я замкаў на Усвяце і на Уле. Ульская крэпасць была ўзведзена маскоўцамі непасрэдна на землях ВКЛ. Вялікі князь знаходзіўся на той момант у Польшчы і атрымаў звесткі аб новай маскоўскай фартэцыі ад віцебскага ваяводы Станіслава Паца і найвышэйшага гетмана Грыгорыя Хадкевіча толькі на прыканцы жніўня. Гаспадар накіраваў да найбольш аўтарытэтных паноў радных зварот сабрацца ўсім разам і абмеркаваць, што належыць прадпрыняць у сувязі з такім учынкам. Для прыняцця неадкладных захадаў па абароне дзяржавы і супрацьдзеяння маскоўцам радныя паны не знайшлі нічога лепшага акрамя склікання агульнага сойма. Вальны сойм з гэтай нагоды сабраўся ўрэшце толькі ў самым пачатку снежня [4, с. 756]. Але да гэтага часу маскоўскія ваяводы ў кастрычніку паспелі ўжо ўзвесці яшчэ адзін замак у вусці р. Ула і дабудоўвалі Сокал [6, с. 353].

Тэмпы ўзвядзення маскоўцамі замкаў былі значна больш высокімі. Рэальна ацэньваючы магчымасці будаўніцтва ў ВКЛ новых умацаванняў, найвышэйшы гетман Грыгорый Хадкевіч у 1567 годзе адзначаў: «...мы про неготовость свою до будованья такъ поспешни и способни быть не можемъ, яко Московский» [5, s. 180].

Каб хоць якім-небудзь чынам супрацьстаяць узмацненню пазіцый Маскоўскай дзяржавы на Падзвінні, урадавыя колы імкнуліся павялічыць кантынгент найманых атрадаў. Таксама шырокімі вайсковымі і іншымі паўнамоцтвамі былі надзелены кіраўнікі шляхты ў Полацкай зямлі – Баркулаб Корсак і Юры Зяноўевіч [3, с. 100]. Але і гэта не магло істотна змяніць становішча, бо наяўныя вайсковыя сілы ВКЛ, якія дзейнічалі на Полаччыне і Віцебшчыне, не ў стане былі захапіць новапабудаваныя маскоўскія фартэцыі. Для правядзення аблогі маскоўскіх замкаў ім не хапала колькасці, артылерыі і адпаведных навыкаў. Для больш паспяховай арганізацыі процідзеяння войскам Івана IV вясной 1567 года сюды быў накіраваны ў якасці выканаўцы абавязкаў польнага гетмана Раман Сангушка [5, s. 112 – 113].

Адразу ж па сваім з'яўленні на Падзвінні Раман Сангушка распачаў актыўную барацьбу з маскоўскімі сіламі. З перапіскі Рамана Сангушкі з гаспадаром і найвышэйшым гетманам бачна, што яшчэ пачынаючы з сярэдзіны чэрвеня 1567 года, ён неаднаразова прапаноўваў замацавацца ў месцы ўпадзення р. Тураўлянкі ў Дзвіну і пабудаваць тут замак. Па яго меркаванні, пры ўзвядзенні літвінамі свайго ўмацавання менавіта тут маскоўскі Ульскі замак акажацца адрэзаным ад паставак з Полацка і падзе сам сабою. Але больш таго, і Полацк апынецца ў цяжкім становішчы. Замацаваўшыся на тураўлянскім плацдарме, можна было б кантраляваць і перасцерагаць спробы маскоўскіх войскаў пашыраць зону свайго ўплыву ў левабярэжнай Полаччыне, ці ўвогуле адваяваць захопленыя тэрыторыі. Раман Сангушка ў рэшце рэшт пераканаў у неабходнасці будаваць у вусці Тураўлянкі замак і Грыгорыя Хадкевіча. Апошні спачатку хоць і пагаджаўся з аргументамі польнага гетмана, але скептычна ацэньваў магчымасці будаўніцтва Тураўлянскага замка з-за недахопу сродкаў. У чаканні моманту калі з гаспадарскага скарбу паступяць грошы і будуць вынайдзеныя працоўныя рэсурсы, Раман Сангушка размясціў побач з вусцем Тураўлянкі роты наймітаў. Яны павінны былі перашкодзіць царскім войскам замацавацца на гэтым плацдарме [5, s. 134, 143, 145 – 146, 149 – 151, 154, 160].

Але як раз у 1567 годзе кіраўніцтва ВКЛ планавала перайсці да наступальнай вайны. Зрабіўшы стаўку на яе, урад накіраваў велізарныя грошы на значнае павелічэнне найманага войска. Выдаткоўваць сумы на іншыя вайсковыя патрэбы дзяржаўны скарб быў ужо не ў стане. Аднак менавіта на гэты перыяд прыходзіцца пік суперніцтва паміж Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ у будаўніцтве новых замкаў на спрэчных тэрыторыях Падзвіння.

Сітуацыя ў рэшце пагоршылася настолькі, што нават найвышэйшы гетман ВКЛ быў не ў стане дабіцца выдзялення з гаспадарскага скарбу сродкаў на тыя вайсковыя выдаткі, якія рабіў сам [5, s. 147]. Грыгорый Хадкевіч, характырызуючы рэчаіснасць у сваім лісце да Рамана Сангушкі адзначаў наступнае: «Який порадок, а дбалость и послушенство на том враде деет(ся) иж праве яко о господара не дбають и роскозанья его не слухають и никоторых речей пристойных чинити не хочуть, то явне бачим. А штож чинить, коли господарь самъ о себе не дбаеть и таковыхъ непослушных скарати не хочеть...» [5, s. 149]. Праз такое становішча Хадкевіч быў вымушаны асабіста пазычаць артылерыю, грошы і закладаць свае маёнткі, каб атрымаць сродкі на вядзенне вайны [5, s. 204, 241].

У наступныя гады сітуацыя з паступленнямі ў гаспадарскі скарб толькі пагаршалася. Відавочна на гэта ўказвае перапіска гетманаў. У 1568 годзе выказванні найвышэйшага гетмана аб існуючай у ВКЛ рэчаіснасці і сваёй бездапаможнасці ў дабыванні грошаў на тэрміновыя вайсковыя патрэбы робяцца ўсё больш раздражнёнымі і катэгарычнымі: «гды колвекъ до Его Королевское Милости...пишу и посылаю о гроши служебным и Казаком, о опатрене тых замковъ будованемъ и живностями, о убежене городищъ, тогды ничого иншого от Его Королевское Милости не маю, одно листы отписы, а о гроши указуеть... до поборцев, а поборцы одного гроша, якомъ приехал тут, до мене не несуть...». У адрас гаспадара Хадкевіч заяўляе: «жадных потреб военных не хочеть починать аж на сойме» [5, s. 247]. Альбо таксама: «Его Королевская Милость вси потребы ўкраинные на мене, яко на осла, да на Вашу Милост (на польнага гетмана) вкладаеть, а чимъ што почать, того ани не вспоминаеть» [5, s. 253].

Тым часам маскавіты не збіраліся спыняцца на дасягнутым і размясціліся на літвінскім гарадзішчы Межава, каб там таксама паставіць замак [4, с. 758]. У красавіку – маі 1567 года да гетмана найвышэйшага даходзілі звесткі, што маскавіты збіраюцца выкарыстаць Улу як плацдарм, для ўзвядзення ўмацаванняў у Сорыцы, Чашніках і Лукомлі, на р. Сары ў міле ад замку Дрысы і пры ўпадзенні р. Свольны ў Дрысу ў трох мілях ад дрысенскай фартэцыі [5, s. 118, 125, 128]. Сама Ула была пабудаваная маскоўцамі, відаць, да пачатку лета, бо аб яе існаванні Грыгорый Хадкевіч узгадвае ў перапісцы з Раманам Сангушкам у лісце, які датуецца 18 чэрвенем [5, s. 134].

У пачатку ліпеня 1567 года Грыгорый Хадкевіч прыйшоў да меркавання, што перш за ўсё трэба ўзводзіць замак у Крывіне. Тут, па першае, правядзенне будаўнічых работ магло быць больш бяспечным ад супрацьдзеяння маскоўскіх войск, чым, напрыклад, у Туроўлі. Па другое, будаўніцтва абыйшлося б танней з-за блізкасці лесу і нязначных памераў гарадзішча. Да таго ж князі Сакалінскія абяцалі накіраваць на ўзвядзенне фартэцыі 200 сваіх сялян. Адзначаныя моманты аказаліся вырашальнымі для пераканання Грыгорыя Хадкевіча, які вымушаны быў лічыцца з татальным недахопам сродкаў на вядзенне вайны ў гаспадарскім скарбе. Разам з тым сыходзячы з стратыгічных меркаванняў замак у Крывіне павінен быў мець важнае значэнне, бо прыкрываў Сорыцкае гарадзішча, і Віцебск. Таму Грыгорый Хадкевіч прапаноўваў Раману Сангушку спаліць плецень, які паспелі ўзвесці, на Сорыцы і сканцэнтраваць намаганні на будаўніцтве ўмацавання ў Крывіне [5, s. 150 – 151]. Але яшчэ і ў маі 1568 года гетманы ВКЛ так і не змаглі распачаць будаўніцтва [5, s. 267]. А напачатку верасня найвышэйшы гетман прапаноўваў Раману Сангушку для аховы гарадзішча пакінуць на Крывіне толькі вайсковыя фарміраванні [5, s. 282].

Што датычыцца Тураўлянскага гарадзішча, то найвышэйшы гетман урэшце нават пагаджаўся з Раманам Сангушкам у сваім лісце ад 13 ліпеня 1567 года паслаць на Тураўлю 200 рабочых, якіх раней планавалася выкарыстоўваць на ўзвядзенне ўмацавання ў Крывіне і дадаць да іх яшчэ 100 чалавек. Усе яны накіроўваліся з Магілёва. Таксама з Магілёва не на Крывіна, а на Тураўлю Грыгорый Хадкевіч гато-

вы быў паставіць 300 бочак жыта. Найвышэйшы гетман абяцаў Раману Сангушку прыкласці ўсе намаганні, каб да Тураўлі было адпраўлена харчаванне і з Барысава, якое раней планавалася даставіць у Чашнікі, а па магчымасці, яшчэ выправіць адтуль 100 ці 200 рабочых. Таксама Грыгорый Хадкевіч абяцаў звярнуцца са свайго боку да ўрадніка Любашанскай воласці, каб і з яе на будаўнічыя работы было накіравана 200 рабочых [5, s. 159].

Складаным было пытанне з забеспячэннем будучага замка артылерыяй. На першы час Грыгорый Хадкевіч вырашыў накіраваць на Тураўлю адну гармату і дваццаць гакаўніц з Магілёва і дзве гарматы з Лепеля. Разам з агнянальнай зброяй з гэтых месцаў дастаўляўся і порах да яе. Да гэтых трох гармат з бліжэйшых памежных замкаў найвышэйшы гетман абяцаў прызначыць двух пушкароў [5, s. 160].

З-за пільнай патрэбы ў артылерыі на Сорыцы і ў Дзісне найвышэйшы гетман не пагадзіўся адтуль пераправіць гарматы. Таксама, ён выказаў сумніў на прапанову Рамана Сангушкі, што можна будзе разлічваць на 500 рабочых ад пана старасты лепельскага і пана Баркулаба Корсака, бо апошнія не закончылі да гэтага часу будаўніцтва замкаў на сваіх урадах. Аднак Грыгорый Хадкевіч паабяцаў пасадзейнічаць і ў гэтым пытанні [5, s. 160 – 161].

Праз некалькі дзён Грыгорый Хадкевіч паведамляў Раману Сангушку, што да яго будуць дасланыя яшчэ чатыры гарматы і дзесяць гакаўніц з порахам кулямі і снарадамі [5, s. 163].

Аднак пабудаваць замак на Тураўлі Раман Сангушка так і не здолеў. Калі раней гаспадар пакідаў пытанне будаўніцтва Тураўлянскага замка на вырашэнне гетманаў, то 13 жніўня выказаў сваё адмоўнае стаўленне да будавання новых умацаванняў на Тураўлі і ў Чашніках. Ён быў перакананы, што перш за ўсё неабходна давесці да канца ўзвядзенне ўжо распачатых будавацца замкаў. Таму рабочых з Магілёва гаспадар загадваў накіраваць да Варонача [5, s. 177]. Будаўнічыя работы там не былі цалкам закончанчаныя яшчэ ў сярэдзіне восені 1568 года [5, s. 299].

Пэўны час Тураўлянскі плацдарм літвінскія войскі ахоўвалі без правядзення істотных работ па іх умацаванню. Пры хранічным недахопе сродкаў на ўзвядзенне новых абарончых аб'ектаў такая практыка прымянялася вайсковым кіраўніцтвам ВКЛ досыць часта і пры ўтрыманні іншых стратэгічна важных гарадзішчаў [5, s. 190 – 191, 246, 248, 282]. У такіх выпадках займаемыя пазіцыі маглі абносіцца ўсяго адным плятнём [5, s. 150]. Толькі такім чынам ВКЛ было здольнае супрацьстаяць і перашкаджаць планамернаму ўзвядзенню маскоўцамі сваіх новых замкаў на стратэгічна важных месцах у межах ВКЛ. Утрымлівацца на такіх гарадзішчах дазвалялі тыя абставіны, што маскоўскія ваяводы не імкнуліся да адкрытых сутычак [1, с. 33], а пасля паразы на Уле пад Чашнікамі ў 1564 годзе увогуле стараліся пазбягаць баявых дзеянняў у полі [3, с. 90].

20 чэрвеня 1567 года адбылася падзея, якая звычайна вызначасцца як вялікі поспех літвінскіх войскаў. На чале з Раманам Сангушкам яны разбілі значна пераўзыходзячую па колькасці маскоўскую групоўку войск [3, с. 101]. Але пры гэтым па-за ўвагай застаецца той момант, што галоўнай мэтай канцэнтрацыі царскіх войскаў было даць магчымасць маскоўскаму ваяводзе Ю. Такмакову замацавацца на Сушы. І з гэтай задачай ён паспяхова справіўся. Польны гетман не здолеў выбіць апошняга з востраў. Сангушка не давёў справу да канца не ў малой ступені з-за недахопаў у забеспячэнні войска. Асабліва яму не хапала для правядзення паспяховай аблогі артылерыі [5, s. 174]. Ужо 19 жніўня 1567 года на Сушы былі ўзведзены ўмацаванні, якія Юры Зяноўевіч у данясенні Раману Сангушку назваў замачкам [5, s. 184]. І будаўніцтва хуткімі тэмпамі працягвалася далей. Каб не патрапіць у засаду пры нарыхтоўцы будаўнічага лесу, маскоўскія людзі рабілі гэта кожны раз у новым месцы і заўсёды пад аховай вялікага войска [5, s. 188 – 189]. Ужо ў канцы месяца Грыгорыю Хадкевічу даклалі, што, выкарыстоўваючы Сушу, маскавіты збіраюцца ўзводзіць новыя ўмацаванні, якія павінны будуць супрацьстаяць Лепелю на Добрыцы за Ляднам або ў Долцах [5, s. 207].

З гаспадарскага ліста да Рамана Сангушкі ад 18 мая 1568 года вынікае, што Туроўлю ўрэшце занялі маскоўскія войскі. Тут яны таксама хуткімі тэмпамі распачалі ўзвядзенне абарончых умацаванняў. Гаспадар са свайго боку ў які ўжо раз адклаў пытанне аб рэакцыі ВКЛ на будоўлю маскоўскай Туроўлі і аб іншых вайсковых патрэбах да наступнага сойму [5, s. 258]. Такім чынам, нягледзячы на намаганні Рамана Сангушкі, літвіны вымушаны былі саступіць маскоўцам надзвычай важны як для абароны, так і для правядзення наступальных кампаній тураўлянскі плацдарм.

Узвядзенне Улы і Сушы дало магчымасць маскавітам распачаць будаўніцтва замкаў Краснага і Туроўлі. Склалася небяспечная сітуацыя для Віцебска. Суша пераразала сухапутныя шляхі, якія ішлі ў абыход воднага шляху кантралюемага маскоўскім Полацкам і звязвалі Віцебск з Дзісной і Рыгай [Archiwum... – T. VII, s. 170]. А Туроўля значна ўзмацняла становішча самога Полацка. Такім чынам, пасля поспеху ў будаўніцтве Сушы Іван IV пашырыў свой уплыў на спрэчных землях Падзвіння і ў будучым мог разлічваць праз яе пранікнуць далей на тэрыторыі ВКЛ.

Такім чынам, Тураўлянскае гарадзішча было надзвычай важным стратэгічным плацдармам для варагуючых бакоў. Маючы тут замкам, улады ВКЛ маглі б, як мінімум, значна абмежаваць сферу маскоўскага ўплыву на тэрыторыі Падзвіння. Але для ўзвядзення ўмацаванняў на Туроўлі ў дзяржаўным

скарбе ВКЛ не знайшлося сродкаў. Каб не даць магчымасці замацавацца тут царскім ваяводам, на Тураўлянскім гарадзішчы пэўны час размяшчаліся атрады ВКЛ. Але пасля ўзвядзення маскоўцамі свайго замка ў Сушы літвіны не здолелі больш утрымлівацца на Туроўлі і саступілі яе маскоўскім ваяводам. Апошнія надзвычай хутка пабудавалі свой замак і значна ўмацавалі гэтым сваё становішча.

ЛІТАРАТУРА

1. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага / падрыхт. А.І. Груша – Мінск: Арты-Фэкс, 2001. – Кніга 44: Кніга запісаў 44 (1559 – 1566). – 229 с.
2. Ткачоў, М. Ульскі замак / М. Ткачоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыкл.: у 2 т. – Мінск: БелЭн, 2006. – Т. 2. – 792 с.
3. Янушкевіч, А. Вялікае княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558 – 1570 гг.: манагр. / А. Янушкевіч. – Мінск: Медисонт, 2007. – 356 с.
4. Любавский, М. Литовско-русский сейм / М. Любавский. – М.: Университет. Типогр., 1900. – 850 с.
5. Archiwum książąt.Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie. – Lwow, 1910. – T. VII. – S. 433.
6. Полное собр. русских летописей / отв. ред. акад. М.Н. Тихомиров. – М., 1965. – Т. 29: Летописец начала царства царя и великого князя Ивана Васильевича. – Александро-Невская летопись. – Лебедевская летопись. – 390 с.

РЭГІЯНАЛЬНЫЯ РЫСЫ ТРАДЫЦЫЙНАЙ АРХІТЭКТУРЫ ЖЫЛЛЯ НА ПАДЗВІННІ (ПА ВЫНІКАХ ПАЛЯВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ «СТУДЭНЦКАГА ЭТНАГРАФІЧНАГА ТАВАРЫСТВА»)

Ю.Т. ШАСТАК
(Праектрэстаўрацыя, Мінск)

Прааналізаваны факты, якія былі сабраныя ў выніку даследавання і якія сведчаць пра тое, што на тэрыторыі Падзвіння да цяперашняга часу захаваліся спецыфічныя рысы народнага дойлідства, якія дазваляюць вызначыць даволі выразныя асаблівасці краю ў параўнаўчай характарыстыцы з другімі беларускімі рэгіёнамі. Адначасова можна вылучыць лакальныя адрозненні ў традыцыйнай архітэктуры паміж паўднёва-заходняй і паўночна-ўсходняй часткамі самога Падзвіння.

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца рэгіянальныя рысы традыцыйнай архітэктуры Падзвіння.

Мэта працы – выяўленне адметных асаблівасцяў народнага дойлідства гісторыка-этнаграфічнага рэгіёну «Падзвінне», вызначэнне мясцовых прыёмаў і спосабаў арганізацыі і аздаблення сядзібы, высвятленне характэрных для рэгіёну рысаў у будаўніцтве. Методыка працы – натурныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі, аналіз літаратурных крыніцаў.

У працэсе жыццядзейнасці чалавек з цягам часу мяняе прыроднае асяроддзе, надаючы яму характар культурнага ландшафту. Культурны ландшафт – гэта паказчык цывілізацыі, культуры гаспадарання, адносінаў да сваёй зямлі і гістарычнай спадчыны. Ён вызначае этнакультурнае аблічча краіны [1, с. 45].

Адно з самых важных месцаў у фарміраванні агульнай карціны культурнага ландшафту займае народнае дойлідства, як яскравае адлюстраванне спосабу адаптацыі да пэўнага геаграфічнага і эканамічнасацыяльнага асяроддзя, а таксама выражэнне этнічных традыцый. Гэта ў сваю чаргу абумовіла унікальнасць асобных канструктыўных і архітэктурна-мастацкіх прыёмаў народнага будаўніцтва ў розных рэгіёнах, дзе лакальныя асаблівасці дойлідства складваліся на працягу стагоддзяў. Разнастайнымі былі прынцыпы арганізацыі вёсак, сядзібаў, заўважна розніліся (пры многіх агульных пунктах) жылыя дамы і гаспадарчыя пабудовы. І хаця на сённяшні дзень назіраецца паўсюдная замена характэрных рэгіянальных рысаў на агульныя па краіне і будаўніцтва без уліку складзеных мясцовых асаблівасцяў, усё яшчэ добра прасочваецца індывідуальнасць кожнага з гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі.

У выніку даследавання былі сабраныя і прааналізаваныя факты, якія сведчаць пра тое, што на тэрыторыі Падзвіння да цяперашняга часу захаваліся спецыфічныя рысы народнага дойлідства, якія дазваляюць вызначыць даволі выразныя асаблівасці краю ў параўнаўчай характарыстыцы з другімі беларускімі рэгіёнамі. Адначасова можна вылучыць лакальныя адрозненні ў традыцыйнай архітэктуры паміж паўднёва-заходняй і паўночна-ўсходняй часткамі самога Падзвіння [2, с. 103 – 106].

Здаўна на Падзвінні пераважалі маладворныя сельскія пасяленні на 3 – 5 сядзібаў, раскіданыя сярод лясных пагоркаў, наблізу рэк і азёр. Мясцовыя жыхары звычайна сяліліся наводшыбе, убаку ад вялікіх дарог з улікам прыстасаванасці да экалагічных умоваў, суседства з вадаёмам і лесам. Сельскія шляхі вызначаліся слабай набітасцю грунту і невыразнымі абрысамі. Паміж невялічкімі вёскамі, хутарамі і асобнымі дварамі вядуць вузкія прасёлкі і сцежкі. Узімку ўзнаўляецца мноства часовых дарог, так званых зімнікаў, што вядуць наўпрост скарочанымі маршрутамі па замерзлых рэках і балотах [1, с. 65].

Агулам у Падзвінні заўважна імкненне да выкарыстання замкнёных схемаў у аб'ёмна-планіровачных вырашэннях сядзібных комплексаў і асобных пабудоваў. Селянін імкнуўся ставіць свае пабудовы такім чынам, каб і яны самі і інтэр'еры былі прыхаваныя ад пастаронняга позірку. Заўважаецца таксама жаданне будаваць такія аб'екты, якія аб'ядноўваюць у сабе некалькі функцый, адсюль узнікае ўскладненне іх планіроўкі і аб'ёмаў. Пры гэтым пільна прадумваліся ўнутраныя сувязі паміж памяшканнямі або асобнымі будынкамі, каб пераходы былі зручнымі і найбольш кароткімі. Унутраныя прасторы будынку, будзь то жыллёва-гаспадарчы комплекс, гумно (або нават царква), як правіла, адкрываюцца не адразу, а паступова. Вялікае распаўсюджанне атрымалі асіметрычныя вырашэнні, якія арганічна звязваюцца з прыродным атачэннем, у прыватнасці з натуральным для Падзвіння складаным перасечаным рэльефам. А восевыя прыёмы – кампаноўка планаў, фасадаў, аб'ёмаў адносна якой-небудзь восі сіметрыі сустракаецца рэдка, як фрагментарныя, дадатковыя да даволі свабодных аб'ёмных вырашэнняў, таму і франтальная кампазіцыя, то бок успрыняцце збудавання толькі з аднога боку, напрыклад галоўнага фасаду, тут была развітая слаба. Усё гэта дапаўняла хаатычны характар забудовы, які ад старажытнасці быў характэрны для сельскіх пасяленняў на поўначы Беларусі. Адначасна ў асаблівасцях мясцовага дойлідства можна ўгледзець адлюстраванне маляўнічасці і разнастайнасці прыроды гэтага краю [3, с. 20 – 21].

Галоўнае, што гэтая нязмушаная на першы погляд хаатычная планіроўка падпарадкоўвалася вызначаным унутраным заканамернасцям, у аснове якіх ляжалі гаспадарча-побытавыя патрэбы і густы чалавека, увасобленыя ў агульных планіровачных прынцыпах, спароджаных шматвекавым досведам. Сярод важных фактароў тут можна назваць наступныя: рацыянальная ўзаемасувязь унутрыгаспадарчых пабудоваў, непарушнасць межаў зямельных надзелаў, найлепшае асвятленне жылых памяшканняў сонцам, фарміраванне ўтульнай жылой прасторы, прыхаванай ад халодных вятроў, стварэнне зручных пад'ездаў да сядзібы і выгану для хатняй жывёлы, і г.д. Усё гэта жорстка рэгламентавала размяшчэнне любой пабудовы, хаця ў цэлым вёска і мела выгляд забудаванай бессістэмна [3, с. 85].

Структурная адзінка, якая фарміруе сельскае паселішча, – гэта сядзіба. На Падзвінні сёння сустракаюцца ўсе варыянты арганізацыі сядзібаў – двары-комплексы, двары вяночнага і пагоннага тыпаў, а таксама сядзібы з незвязанымі пабудовамі.

Самым пашыраным тыпам сядзібнай забудовы на Падзвінні здаўна з'яўляўся двор-комплекс, дзе пабудовы размяшчаюцца вельмі кампактна, гаспадарчыя памяшканні шчыльна прылягаюць да жытла, утвараючы адзіны жыллёва-бытавы комплекс з крытым дваром (мал. 1). Такая планіроўка забяспечвала надзейную абарону ад ветру і снегу ва ўмовах халоднай зімы [4, с. 53]. Важна тое, што дадзены тып арганізацыі двара вядомы толькі ў гэтым беларускім рэгіёне.



Мал. 1. Сядзіба з крытым дваром. В. Селэне (Бароўка), Латгалія

Дварам-комплексам прысутная цеснае спалучэнне жылой часткі з гаспадарчымі пабудовамі. Імкненне забяспечыць зручную сувязь усіх будынкаў, зберагчы ад драпежнікаў быдла і максімальна выкарыстаць цяпло ад печы прывяло да стварэння планіровачнай структуры, заснаванай на прыбудове хлявоў да прадольнай, цёплай сцяны дома. Першапачаткова дах хлева з'яўляўся працягам даху дома, а сам хлеў рабіўся маленькім, толькі каля сенцаў. Прычым уваход у яго быў адзін – цераз сені. Потым хлявы развіваюцца ўздоўж усёй прадольнай сцяны. Аб'ёмна-прасторавая пабудова двара-комплексу атрымоўвала асіметрычнае вырашэнне, арганічна звязанае з прыродным атачэннем. Такая кампаноўка жыллёва-побытавага комплексу роднасная дамам-комплексам Расіі, вядомым як «дом-кашэль» [3, с. 88].

У поўнай ступені гэта прымяніма і да тыпу жылога комплексу з двухшэрагавай сувяззю (мал. 2). Павелічэнне колькасці і памераў гаспадарчых памяшканняў, іх дыферэнцыяцыя прывялі да з'яўлення

дзянніка – гаспадарчага двара, на які вяла адна ці некалькі брамаў. Хлеў з дзянніком і хату пачынаюць перакрываць самастойна прымыкаючымі двусхільнымі дахамі. Сені ператвараюцца ў развіты сувязуючы вузел, кампазіцыйны і камунікацыйны цэнтр усяго двара. Праз іх праходзяць сувязі паміж хатай і варыўняй, або двумя хатамі, а таксама паміж чыстым і гаспадарчым дварамі [3, с. 89].



Мал. 2. Двор-комплекс у Гарадку

Пазней развіваецца трохшэрагавы двор-комплекс, дзе сярэдні шэраг займае хата. Распаўсюджванне з другой паловы XIX стагоддзя пагонных двароў аказала ўздзеянне на фарміраванне двароў-комплексаў, але і тут захоўваецца значэнне сеняў і надаецца больш складанае спалучэнне формам [3, с. 90].

У дварох вяночнага тыпу пабудовы месцяцца па перыметры, пакідаючы вольнаю ўнутраную прастору. Элемент, які звязвае ўсе пабудовы сядзібы, – адкрыты двор. Сені таго значэння, як у дварах-комплексах, ня маюць і з'яўляюцца ўваходным памяшканнем толькі ў жылую частку. Таксама гэты варыянт адрозніваецца значнымі памерамі, большымі за габарыты двара-комплексу. Можна вылучыць два варыянты вяночнай забудовы: поўны і няпоўны. Колькасць такіх двароў павялічваецца па меры набліжэння да Падняпроўя [3, с. 90 – 91].

Развіццё сядзібаў пагоннага тыпу ў пэўнай ступені звязана з планіроўкаю вулічна-палосавых вёсак. Размяшчаюцца ўсе пабудовы глухім бокам уздоўж адной рысы, звычайна па мяжы зямельнага надзела. Вядомыя два тыпы пагонных сядзібаў – аднашэрагавы і двухшэрагавы (пабудовы ставіліся ў два паралельныя шэрагі) [3, с. 93]. На Падзвінні гэты тып арганізацыі сядзібы распаўсюдзіўся слаба.

Пераходныя формы ад вяночнага двара да пагоннага – П і Г-падобныя двары – сустракаюцца найчасцей на мяжы Падзвіння з Панямоннем.

У сядзібах з незвязанымі пабудовамі жылыя і гаспадарчыя будынкі ставяцца на пэўнай адлегласці адзін ад аднаго. З'явіліся параўнальна нядаўна, іх колькасць павялічваеца з пачатку XX стагоддзя [3, с. 97]. Размяшчэнне гаспадарчых пабудоваў было абумоўлена як мерамі супрацьпажарнай засцярогі, агульным паляпшэннем санітарна-гігіенічнага стану вёскі, а таксама адпадзеннем неабходнасці мець на двары шэраг гаспадарчых пабудоваў пасля калектывізацыі [5, с. 30]. На сённяшні дзень можна сцвярджаць, што двор з незвязанымі пабудовамі з'яўляецца самым распаўсюджаным варыянтам арганізацыі сядзібы як для Падзвіння, так і для ўсёй тэрыторыі Беларусі ў цэлым.

На Падзвінні назіраецца агульная тэндэнцыя размяшчаць жылыя пабудовы тарцовым фасадам з адным, двума, або трыма вокнамі да вуліцы (мал. 3). Хату звычайна ставяць або каля самай вуліцы, або за 5 – 8 метраў ад яе. Часам жылыя, а разам з імі і гаспадарчыя пабудовы ўзводзяцца на даволі значным аддаленні ад вуліцы. Гэта часцей за ўсё абумоўлена вузкім пляцам або рэльефам мясцовасці [5, с. 30].

Гумно ў склад падворка звычайна не ўваходзіць. Яго будавалі на некаторай адлегласці (50 – 60 м) у глыбіні сядзібы. Тамсама будавалі і лазню. Гумно ў мясцовым вызначэнні – гэта комплекс гаспадарчых пабудоваў з уласна гумном (ток, такаўня), сушылкай (асець, ёўня), пуняй для саломы і сена, азяродамі. На адкрытай мясцовасці нярэдка ставілі невялічкі млын-вятрак, што задавольваў сціплыя патрэбы сялянскай гаспадаркі [1, с. 67]. Абарогі – рухомыя, пакрытыя саломай або дранкай стрэшкі на чатырох слупах, якія некаторыя даследчыкі лічаць прататыпам сучаснай пуні – дагэтуль выкарыстоўваюцца для прасушкі сена на Падзвінні [5, с. 88].

Агулам па рэгіёнах Беларусі заўважныя адрозненні ў тыпах збудаванняў. Гумны з сушылкаю, дзе месцілася печ, распаўсюджаныя ў Падзвінні і на ўсходзе Беларусі зусім невядомыя Палессю, снапы прасушвалі тут на азяродах. Вялікая рэдкасцю быў на Палессі і пограб – праз высокі ўзровень грунтовых вод для захоўвання гародніны будавалі спецыяльныя пабудовы – варыўні. У Падзвінні, Падняпроўі і Цэнтральнай Беларусі ў вёсцы можна сустрэць як варыўню, так і пограб [3, с. 40]. На поўначы і ўсходзе Беларусі


лазня – звычайная пабудова практычна ў кожнай сядзібе. А ў заходніх і паўдзёвых раёнах сяляне заўжды мыліся дома [3, с. 40].



Мал. 3. Вуліца ў Вушачах

На Падзвінні дагэтуль захаваны старадаўні звычай прыбудоўваць да глухой сцяны хаты хлеў з аднасхільнай страхой, якая па сутнасці была працягам страхі хаты. Цяпер гэтыя падсобныя памяшканні ў асноўным служаць для захавання прадуктаў, рэчаў штодзённага ўжытку і маюць адзін уваход з сенцаў [5, с. 73].

Калі казаць пра мясцовыя будаўнічыя матэрыялы, то трэба адзначыць, што ў Падзвінні шырока выкарыстоўваліся сабраныя на палях камяні для падмуркаў [3, с. 40], брукаванкі вуліцаў (мал. 4), панадворкаў, сценак студняў, нават сеняў у хаце.



Мал. 4. Брукаваная вуліца ў Шаркаўшчыне

Аднак нават тут збудаваныя цалкам з каменю аб'екты былі адзінкавымі да XIX стагоддзя. Асноўным матэрыялам для будаўніцтва жылля з'яўляецца дрэва. У Падзвінні, Падняпроўі, усходняй частцы Цэнтральнай Беларусі хаты традыцыйна ўзводзілі пераважна з круглага лесу [6, с. 131].

Найбольш выразным элементам жылога дома з'яўляецца дах. Найбольшае распаўсюджванне на Падзвінні атрымала двусхільная страха. Можна меркаваць, што менавіта тут яна была самай старажытнай формай, што было звязана з канструкцыяй закотам [5, с. 95]. На паўднёвым захадзе рэгіёну часта сустракалася страха з залобкам. Шатровыя і аднасхільныя дахі на Падзвінні выкарыстоўваюцца амаль выключна толькі для гаспадарчых пабудоваў [4, с. 128]. Традыцыйны матэрыял для пакрыцця стрэх – салома і чарот – ужываўся ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, але ў Паазер'і, Панямонні і Падняпроўі шырока выкарыстоўвалі і дранку [6, с. 131]. У пачатку XX стагоддзя пачынаюць пашырацца з захаду краіны бляха, чарапіца, потым, у савецкі час, распаўсюджваецца пакрыццё шыферам [5, с. 52].

Падыход да вырашэння дэкаратыўнага аздаблення пабудоваў, найперш жылых дамоў, быў наступны. У Падзвінні ўпрыгожвалі асноўным чынам галоўны фасад дома (гзымс, лішты, франтон, куты зруба), але заўжды ў дэкоры вылучаўся асноўны элемент – ці вокны, ці дзверы, ці франтон (мал. 5). Іншыя элементы ўбрання кампазіцыйна яму падпарадкоўваліся [3, с. 40].



Мал. 5. Кампазіцыйнае вылучэнне франтона. Полацкі раён

Найчасцей вядучая роля ў дэкоры жытла належыць аконным ліштвам і параднаму ўваходу. У паўднёва-заходняй частцы рэгіёну важным канструктыўна-дэкаратыўным элементам жытла з'яўляецца франтон з фігурна-шаляваным шчытом і разным падзорам па ніжнім краі [2, с. 103 – 106].

Франтоны найчасцей сустракаюцца двух тыпаў. Першы – з выразным гарызантальным чляненнем на дзве прыблізна роўныя часткі. Другі тып характэрызуецца яскрава абазначанай прастакутнай плямай на вертыкальнай восі сіметрыі пры наяўнасці двух-трох гарызантальных чляненняў – распаўсюджаны на паўднёвым захадзе рэгіёну [4, с. 132].

Найбольш распаўсюджаным дэкорам з'яўляецца адна- і двухслойная шалёўка франтонаў з накладнымі элементамі разьбы. У аздобе франтонаў пераважае фігурнае ашалёўванне па ніжнім ярусе ў выглядзе квадратаў, ромбаў, трохкутнікаў. Характэрнай дэталлю дэкору з'яўляюцца шматслойныя прычэліны з разным геаметрычным малюнкам па ўнутраным краі, а таксама падзоры з ажурнаю разьбою. Франтонападобныя і надбудаваныя аконныя ліштвы атрымалі багатае пластычнае вырашэнне. У дэкоры саміх ліштваў развіліся ўсе групы і кшталты разьбы, аднак пераважае контурнае і скразное выпілоўванне. Меншае распаўсюджанне, чым ліштвы, маюць ваконныя стаўні: шчытовыя, шаляваныя, філёнчатыя і жалюзныя [2, с. 101 – 106].

У дэкоры жытла пашыраныя геаметрычныя, салярныя, раслінныя, зааморфныя, прадметна-побытавыя матывы і элементы савецкай сімволікі (мал. 6). Распаўсюджанне салярных і зааморфных матываў узмацняецца ў накірунку з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход [2, с. 101].

Своеасаблівае развіццё ў комплексе жытла атрымалі арачныя падсеневыя ўваходы, дэкараваныя ажурнай і рэльефнай разьбою з багатым колеравым аздабленнем. Веранды не атрымалі дэкаратыўнага развіцця на поўначы і ўсходзе рэгіёну, у той час як на паўднёвым захадзе яны робяцца галоўным акцэнтам і мастацкім элементам бакавога фасада [2, с. 103 – 106].

Ганкі гэтай часткі Беларусі маюць больш зграбныя прапорцыі, складаны малюнак агароджы. Тут у большай ступені аказвае ўздзеянне тэма балясінаў (мал. 7), а ў заходнім накірунку з'яўляецца тэма класічнай калоны [4, с. 143].

Дэкаратыўная аздоба гаспадарчых пабудоваў паўсюдна вельмі сціплая, у пэўнай ступені нават рэдкая (форма акенца на франтоне, узор палатна дзвярэй у клецях, тарцы закотвінаў у хлявах, выступаючыя канцы страпілаў у гумнах) [3, с. 40].

Побач з павелічэннем ролі пластычнага дэкору ў аздабленні фасада павялічылася яго роля ў рашэнні малых архітэктурных формаў [2, с. 103 – 106].

На поўначы брама, якая з'яўляецца неад'емнай часткай сядзібаў замкнёнага тыпу – вяночных і комплексаў, складаецца з трох масіўных, часцей дубовых, слупоў – шулаў, пакрытых звычайна двусхільным ці чатырохсхільным дахам. Нярэдка дах пакрывае браму і агароджу на ўсім іх працягу [4, с. 178]. Дэкор брамы сканцэнтраваны ў яе завяршэнні ў выглядзе кратавай аздобы, разных элементаў і паліхроміі (мал. 8).

На паўднёвым захадзе рэгіёну распаўсюджаныя нізкія брамы і слаба дэкараваныя агароджы, якія граюць малую дэкаратыўную ролю ў комплексе жытла [2, с. 106].




Мал. 6. Спалучэнне дэкаратыўных матываў. Вушачы



Мал. 7. Балясіны ў афармленні ўваходу (в. Валасачы, Чашніцкі раён)

Характэрным для сучаснай беларускай вёскі ўпрыгожваннем становіцца афарбоўка сцен хаты або яе асобных дэталей – аконнай ліштвы, кутоў, франтонаў. Гэты від аздобы ў старой вясковай архітэктуры сустракаўся выключна рэдка [5, с. 70]. Колеравы дэкор атрымаў распаўсюджванне ў выглядзе манахромнай пафарбоўкі, поліхромнай пафарбоўкі і мастацкага роспісу. Інтэнсіўнае развіццё гэтага кшталту аздобы адбываецца з 1960-х гадоў. Такі від дэкору, як іншародныя накладкі і ўстаўкі з металу, шкла, пластмасы і іншых матэрыялаў, афактурванне сценаў, сустракаецца ў народным жытле з пачатку 1970-х гадоў і мае тэндэнцыю да шырокага распаўсюджвання [2, с. 102 – 103]. Ужыванне новых матэрыялаў (цэглы, шлакабетону) у сельскім будаўніцтве выклікае змены і ў дэкаратыўных элементах. Але перавага і ў новым будаўніцтве аддаецца традыцыйным упрыгожванням ці імітацыі пад іх (мал. 9). У цагляных і шлакабетонных дамах франтон часта робіцца з шалёўкі з узорным выкладваннем. У гэтых жа дамах пры дапамозе размалёўкі па старадаўніх узорах ствараецца імітацыя пад традыцыйныя драўляныя вуглы і аконную ліштву [5, с. 70].



Мал. 8. Брама (в. Бельнякі, Чашніцкі раён)



Мал. 9. Імітацыя прыёмаў традыцыйнага дойлідства дэкаратыўна-выяўленчымі сродкамі (в. Чарэя, Чашніцкі раён)

Такім чынам, упрыгожванні беларускага народнага жытла на Падзвінні даволі багатыя і разнастайныя. Яны ў значнай ступені ўзмацняюць своеасаблівасць ансамбля жылля рэгіёну, вызначаюць яго каларыт.

Пазначаныя рысы архітэктуры традыцыйнага жылля як кампанента, які вызначаецца найбольшай устойлівасцю да часавых трансфармацый, узбагачаюць агульную карціну непаўторнага культурнага ландшафту Падзвіння.

ЛІТАРАТУРА

1. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Краіна і людзі / В.С. Цітоў. – Мінск, 2001.
2. Хитько, И.П. Архитектурно-декоративные ансамбли народного жилища (1950 – 80 годы) / И.П. Хитько // Каштоўнасці мінуўшчыны: матэрыялы навук.-практ. канф. (15 мая 2003 г.). – Мінск, 2003. – Вып. 7. – С. 100 – 108.
3. Сергачёв, С.А. Белорусское народное зодчество / С.А. Сергачев. – Минск: Ураджай, 1992. – 422 с.
4. Трацевский, В.В. История архитектуры народного жилища Белоруссии: учеб. пособие для вузов / В.В. Трацевский. – Минск: Высш. шк., 1989. – 456 с.
5. Бандарчык, В.К. Беларускае народнае жыллё / В.К. Бандарчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – 286 с.
6. Лобач, У.А. Этнаграфія Беларусі: вучэб.-метад. компл. для студ. спец. 1-21 03 01 «Гісторыя», 1-02 01 02 «Гісторыя. Замежная мова» / У.А. Лобач. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 328 с.

ВАЛУНЫ БРАСЛАЎШЧЫНЫ ЯК ПОМНІКІ ГЕАЛОГІІ І ЭТНАГРАФІІ: З ГІСТОРЫІ ВЫЯЎЛЕННЯ І ДАСЛЕДАВАННЯ

К.С. ШЫДЛОЎСКІ
(Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў, Браслаў)

Выяўлены і даследаваны адметныя з пункту гледжання прыродазнаўчых навук, а таксама этналогіі і гісторыі ледавіковыя валуны на тэрыторыі Браслаўшчыны. Гэты азёрны рэгіён размешчаны на захадзе Беларускага Падзвіння, вылучаецца прыроднай разнастайнасцю. Вялікая колькасць ледавіковых валуноў – адна з характэрных рыс мясцовых ландшафтаў. Інтэнсіўная праца па выяўленню сярод іх адметных аб'ектаў пачалася толькі напраканцы XX стагоддзя. У тэксце даецца агляд тых нешматлікіх валуноў, якія зацікавілі даследчыкаў XIX – першай паловы XX стагоддзя. Характэрызуецца перыяд найбольш актыўнага даследавання валуноў, які прыпадае на 90-я гады XX стагоддзя, калі сумеснымі намаганнямі навукоўцаў, музейных супрацоўнікаў, краязнаўцаў былі зафіксаваны і апісаны 29 аб'ектаў. Адлюстраваны асноўныя асаблівасці працы ў гэтым кірунку на сучасным этапе. Прыводзяцца звесткі пра чатыры найбольш цікавыя аб'екты, выяўленыя і даследаваныя ў 2002 – 2008 гадах.

Браслаўшчына з'яўляецца адным з адметных рэгіёнаў Беларускага Паазер'я. У межах адміністрацыйнага рэгіёну налічваецца каля 250 азёраў, якія займаюць больш за 10 % ад агульнай тэрыторыі. Прыазёрнае наваколле, асабліва ў межах браслаўскай грады, вылучаееца маляўнічымі ўзгорыстымі ландшафтамі з вялікай колькасцю выразных ледавіковых форм рэльефа. Яшчэ адна характэрная рыса прыроды Браслаўскага Паазер'я – багацце на паверхні ледавіковых валуноў розных памераў, адзінкавых і ў выглядзе груп ці даволі значных россыпаў.

Вялізныя камлыгі, якія не зачапіла гаспадарчая дзейнасць, становяцца аб'ектам даследаванняў геолагаў, біёлагаў. У праватнасці, вывучаецца відавы склад расліннасці, якая сфармавалася на каменнай паверхні за тысячы гадоў. Вялізныя камлыгі дапамагаюць удакладняць асобныя моманты дзейнасці ледавіковых патокаў. Аналізуючы склад валуноў, геолагі вызначаюць месцы ў горных масівах Скандынавіі, адкуль прынесены да нас гэтыя кавалкі карэнных парод. Паводле існуючых рэкамендацый камлыгі даўжынёй 3 м і болей могуць быць абвешчаны геалагічнымі помнікамі. Вельмі істотна, каб валуны не былі перамешчаны са свайго прыроднага месца.

Асобныя валуны, пераважна вялізных памераў, якія вылучаліся ў краявідзе, а таксама камяні з прыкметнымі прыроднымі адзнакамі (напрыклад, з паглыбленнямі антрапаморфнай і зааморфнай форм), з незвычайнымі агульнымі формамі і г.д. здаўна прыцягвалі ўвагу тубыльцаў, станавіліся прадметамі старадаўніх рэлігійных культаў. Даволі часта былыя культавыя валуны маюць рукатворныя адзнакі. Водгукам даўніх рэлігійных культаў з'яўляюцца легенды і паданні, якія яшчэ можна фіксаваць. Сустракаюцца і валуны, якія маюць надпісы, знакі, не звязаныя з культамі. Некаторыя з іх звязаны з канкрэтнымі асобамі, падзеямі і таксама становяцца аб'ектамі даследавання.


Актыўная праца па выяўленню і даследаванню адметных валуноў Браслаўшчыны распачалася толькі ў 90-х гадах XX стагоддзя. Назапашаны менш чым за 20 год масіў інфармацыі сведчыць аб багацці гэтага рэгіёну і неабходнасці паглыблення і пашырэння даследаванняў.

Да акрэсленага перыяду ў полі зроку даследчыкаў аказалася толькі некалькі адметных валуноў. Падчас вядомай экспедыцыі Маскоўскага археалагічнага таварыства, арганізаванай у 1864 годзе на тэрыторыі так званага Паўночна-Заходняга краю, яе ўдзельнік мастак Дз. Струкаў (1827 – 1899) звярнуў увагу на валун каля в. Краснагорка. На паверхні каменя меўся выразны адбітак конскага капыта. Дз. Струкаў зрабіў замалёўку адбітка, якая зберагаецца ў калекцыі прац мастака ў рукапісным аддзеле бібліятэкі Вільнюскага універсітэта (F 78, № 936). У палявым дзённіку Дз. Струкаў адзначыў: «В 20 верстах от Креславля через Двину в Ковенской губернии озеро Снуды... На берегу есть камень, называемый "Конь Камень". На нем видно вдавленное место, как бы на мягкой глине копыто лошади. Камень твердый серого цвета... Существует поверье, когда лошадь хворает, то лечат водой от камня» [1].

Чатыры адметныя валуны зафіксаваў археолаг, хавальнік Віленскага музея старажытнасцей Ф. Пакроўскі (1855 – 1903). Пры складанні археалагічных карт Віленскай і Ковенскай губерняў Ф. Пакроўскі рассылаў апытальнікі, дзе быў асобны пункт, прысвечаны адметным валунам. Значная частка інфармантаў фармальна аднеслася да запаўнення апытальнікаў. У той частцы Браслаўшчыны, якая адносілася да Віленскай губерні (Дзісенскі павет), цікавых аб'ектаў не было адзначана. Інфармацыю, якая была атрымана з заходняй часткі (Новааляксандраўскі павет) Ф. Пакроўскі змясціў у «Археалагічнай карце Ковенскай губерні»: «При д. Мостище есть камень с выбитою на нем человеческою ногою». По народному поверъю около камня скрыт клад, который теперь нередко бывает предметом поисков, и всегда, обыкновенно, накануне Ивана Купалы (24 июня)... На поле д. Шауров есть так называемый "Копытный ручей". В этом ручье лежит камень с изображением лошадиного копыта с подковой, а неподалеку отсюда – другой

камень, на котором видны две человеческие ступни... На поле им. Миколаюнцы лежит больших размеров камень, на нем заметны следы уничтоженной временем надписи» [2].

У апошнім дзесяцігоддзі XIX стагоддзя вядомы даследчык Падзвіння А. Сапуноў (1851 – 1924) выявіў, замаляваў і апублікаваў Друйскі Барысавы камень. Гэты помнік эпіграфікі XII стагоддзя быў апошнім у групе Барысавых камянёў з зафіксаваных даследчыкамі. Вялізная камлыга з вельмі выразным крыжом і надпісам знаходзілася на тэрыторыі даволі значнага прыдзвінскага гарадка і ні ў кога не выклікала інтарэсу. Гэту акалічнасць адмыслова адзначае аўтар знаходкі [3]. Найбольш аддалены ад Полацка, Друйскі Барысаў камень цешыўся найменшай увагай даследчыкаў, але аказаўся ў стане шэрага неспадзяванак (аб гэтым гаворка пойдзе далей).



Мал. 1. Друйскі Барысаў камень. Помнік эпіграфікі XII стагоддзя [3]

Беларускі этнограф М. Мялешка (1892 – 1941) у рабоце, прысвечанай культавым камяням, змясціў інфармацыю пра каменную чалавечападобную фігуру з чорнага граніту са складзенымі на грудзях рукамі і адбітай галавой, якую мясцовыя жыхары называлі «Стод». Размяшчалася скульптура на востраве Богінскага возера [4]. Вусная традыцыя ўказвае на востраў Гарадзішча гэтага возера.

Валуны Браслаўшчыны як помнікі геалогіі ўпершыню былі адзначаны толькі ў 30-я гады XX стагоддзя, калі раён уваходзіў у склад Польшчы (Браслаўскі павет Віленскага ваяводства). У 1935 годзе па ініцыятыве геолага, прафесара Віленскага універсітэта імя Стэфана Баторыя Ст. Малкоўскага была праведзена рэгістрацыя найбольш значных па памерах валуноў Віленшчыны і суседніх ваяводстваў. З Браслаўшчыны ў рэестр патрапілі 4 камлыгі: каля в. Чэрнішкі (абвод 9 м), каля в. Мілашы, бліжэй да фальварка Палессе (12,9 м), на тэрыторыі фальварка Струста (14 м), на востраве Краснагорка (9 м) [5]. У 1930-я гады Браслаўшчына з'яўлялася рэгіёнам інтэнсіўнага развіцця турызму і адпачынку. Прыходзіць усведамленне, што вялізныя валуны павялічваюць турысцкую прыцягальнасць мясцовых краявідаў. Вялізная камлыга на беразе возера Дрывяты непадалёку ад Браслава патрапіла ў аб'ектыў фатографа А. Бейнаровіча, актывіста браслаўскага аддзела Польскага краязнаўчага таварыства. Сюжэт з каменем вялікіх памераў неаднойчы тыражыраваўся ў фотапаштоўках, а пазней быў выкананы і друкарскім спосабам. Зафіксаваны А. Бейняровічам валун не захаваўся.

Гаспадарчая дзейнасць, асабліва інтэнсіўная меліярацыя другой паловы XX стагоддзя, прывялі да таго, што значная частка ледавіковых валуноў рэгіёну была страчана раней, чым распачаліся інтэнсіўныя пошукі адметных аб'ектаў. Напрыклад, пад канец 1980 года не ўдалося выявіць ніводзін з валуноў, адзначаных у працах XIX – пачатку XX стагоддзя. З вачэй даследчыкаў знік нават такі каштоўны і прыкметны аб'ект, як Друйскі Барысаў камень. Працу па выяўленню адметных ледавіковых валуноў на тэрыторыі Браслаўшчыны, па сутнасці, трэба было пачынаць наноў.

Рэгіянальным цэнтрам па выяўленню, фіксаванню адметных ледавіковых валуноў Браслаўшчыны, збору адпаведнага этнаграфічнага матэрыялу стаў Браслаўскі гістарычна-краязнаўчы музей, актыўная фаза арганізацыі якога пачалася ў 1986 годзе. У гэтым жа годзе былі атрыманы першыя звесткі ад старажылаў, вясковых краязнаўцаў. У ліку першых жыхар мястэчка Відзы Р. Трушанін паведаміў пра зна-


ходку ў наваколлі в. Ждэгелі трох камянёў з выбітымі надпісамі (мал. 2). Ён перадаў ў музей фотаздымкі валуноў, перапіску наконт знаходкі з шэрагам устаноў. Грунтоўны адказ быў атрыманы з Інстытута гісторыі АН Літвы. На думку літоўскіх спецыялістаў, камяні з'яўляюцца межавымі адзнакамі ўладанняў магнацкага роду Ваўжэцкіх канца XVIII стагоддзя. На момант, калі музей атрымаў гэту інфармацыю, два межавых каменя былі перамешчаны ў час меліярацыйных работ.



Мал. 2. Адзін з трох камянёў з выбітымі надпісамі з наваколля в. Ждэгелі
(фота Р. Трушаніна м. Відзы)

Музейныя спецыялісты ад пачатку пошукавай дзейнасці па выяўленню адметных валуноў устанавілі цесныя сувязі з вядомымі беларускімі даследчыкамі: археолагамі Л. Дучыц, Э. Зайкоўскім, геолагамі Э. Ляўковым, В. Вінакуравым. Праводзіліся шматлікія сумесныя выезды, адбываўся абмен інфармацыяй. Музей аказваў дапамогу, у тым ліку фінансавую, у рабоце Л. Дучыц па лакалізацыі Друйскага Барысавага каменя. У сувязі з пачаткам узвядзення плаціны Даўгаўпілскай ГЭС і пагрозай затаплення часткі даліны Заходняй Дзвіны музей ініцыіраваў работы па перамяшчэнню каштоўнага помніка ў бяспечнае месца. Асабліва плённым аказалася супрацоўніцтва з навукоўцамі акадэмічнага Інстытута геалогіі, геахіміі і геафізікі Э. Ляўковым і В. Вінакуравым (апошні з'яўляецца кіраўніком эксперыментальнай базы па вывучэнню ледавіковых валуноў пры інстытуце). У 1993 годзе пасля некалькіх сезонаў інтэнсіўных пошукаў на Браслашчыне, у якіх бралі ўдзел і супрацоўнікі музея, геолагі ўзялі на ўлік на тэрыторыі рэгіёну 25 аб'ектаў. Кожны валун быў абследаваны і апісаны як геалагічны аб'ект, да апісанняў некаторых аб'ектаў былі далучаны гістарычныя і этнаграфічныя звесткі [6].


Адным з істотных дасягненняў першых экспедыцый сталася выяўленне чатырох валуноў са штучнымі ямкамі, ці проста валуноў з ямкамі (мал. 3).



Мал. 3. Камень з ямкамі каля вёскі Старадворышча
(фота В. Вінакурава, пачатак 90-х гадоў XX стагоддзя)

Браслаўшчына – гэта другі пасля Глыбочыны рэгіён Беларусі, дзе былі зафіксаваны падобныя аб'екты. Звесткі пра два каменя з ямкамі ва ўрочышчы Камяніца-2 каля берага возера Дрысьвяты былі перададзены супрацоўнікам музея літоўскімі спецыялістамі. Валуны з ямкамі шырока распаўсюджаны ў краінах Балтыйскага рэгіёну – Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Германіі. Знаходкі ў Беларусі дазволілі пашырыць арэал іх распаўсюджвання. Існуе шмат навуковых версій наконт прызначэння ямак. Паводле некаторых з іх, ямкі ўжываліся ў час адпраўленняў культу продкаў альбо пазначалі размяшчэнне зорак у пэўных частках небасхілу [7].

Да ліку іншых цікавых аб'ектаў рэестра 1993 года можна аднесці валуны з зафіксаванымі легендамі і паданнямі: «Каровін камень» каля в. Чэрнішкі; «Чортаў ці Божы след» каля в. Якубянцы (мал. 4); «Воласкі камень» каля возера Паўночны Волас.



Мал. 4. Камень «Чортаў ці Божы след» ля вёскі Якубянцы
(фота Я. Казулі, пач. 90-х гадоў XX стагоддзя)

Па рэкамендацыі геолагаў 21 ледавіковы валун Браслаўшчыны быў абвешчаны помнікам геалогіі рэспубліканскага значэння. У 2001 годзе прапанавана далучыць да іх яшчэ 8 аб'ектаў [8]. Вось пералік гэтых валуноў з указаннем даўжыні:

- Юравіцкі Вялікі Камень (4,6 м);
- Аколіцкі Вялікі Камень (4,4 м);
- Пузавіцкі Вялікі Камень (4,2 м);
- Прададзены Камень Думарышкінскі (3,4 м);
- Едагальскі Вялікі Камень (3,3 м);
- Лейшаўскі Вялікі Камень (3,5 м);
- Камень-Следавік Думарышкінскі (2,9 м);
- Крэўнянскі Валун (2,7 м);
- Браслаўскі Вялікі Камень (4,9 м);
- Струстаўскі Камень з надпісам (4,5 м);
- Краснагорскі Вялікі Камень з групай валуноў (4,4 м);
- Чортаў Камень Рычаўскі (4,2 м);
- Марцін Камень Лайбуноўскі (4,1 м);
- Сіпавіцкі Камень з ямкай (3,9 м);
- Пастухоў Камень Варапаншчынскі (3,8 м);
- Старадварышчанскі ямкавы Камень (3,8 м);
- Воласкі Камень (3,7 м);
- Мяжанскі Вялікі Камень (3,6 м);
- Чортаў Камень Багданаўскі (3,4 м);

- Анісімавіцкі Вялікі Камень (3,6 м);
- Дудальскі Вялікі Камень (3,5 м);
- Каровін Камень Чэрнішкаўскі (3,4 м);
- Іказненскі Вялікі Камень (3,3 м);
- Буцеўскі Вялікі Камень (3,2 м);
- Чортаў Камень Якубянскі (3,2 м);
- Агонеўскі Вялікі Камень (3,1 м);
- Лявошкінскі Вялікі Камень (3 м);
- Чароўны Камень Сташэліцкі (1,8 м);
- Пашавіцкі ямкавы Камень (1,4 м).

Разам з даследчыкамі геолагамі была зроблена значная праца па апублікаванню вынікаў даследаванняў у навуковых і папулярных выданнях [9].

Ад рубяжа стагоддзяў мінулага і бягучага палявыя працы спецыялістаў па выяўленню новых помнікаў не праводзіліся, але значна актывізавалася дзейнасць у гэтым кірунку школьных краязнаўцаў. Музей каардынуе пошукавую працу мясцовых груп, аказвае кансультацыі, захоўваецца сувязь і з навукоўцамі, у першую чаргу з В. Вінакуравым. Асабліва цеснае супрацоўніцтва склалася з пошукавай групай Канстанінскай базавай школы, якой кіруе географ В. Бунта. Група з'яўляецца адной з найбольш актыўных у Беларусі па выяўленню адметных геалагічных помнікаў. Па ініцыятыве кіраўніка ў 2003 – 2005 гадах была праведзена акцыя «Валуны просяць SOS!», падтрыманая шэрагам школ Браслаўшчыны (сярод іх: Грытунская, Опсаўская, Спрындаўская, Урбанская, Відзы-Лаўчынская). Усяго школьныя краязнаўцы правялі 23 экспедыцыі, маршруты якіх ахапілі практычна ўвесь рэгіён. Было выяўлена 25 адметных валуноў, 15 з іх маюць памеры больш за 3 м, 11 аб'ектаў адзначаны легендамі, паданнямі, павер'ямі. Да ліку важнейшых знаходак школьных груп можна аднесці выяўленне каля в. Латочкі аднаго з самых вялікіх валуноў Беларусі, даўжыня якога каля 7 м, лакалізацыю валуна-следавіка каля в. Масцішча, згаданага ў працы Ф. Пакроўскага, межавага каменя XVIII стагоддзя каля в. Ждэгелі.

Вынікі пошукаў школьныя краязнаўчыя групы звычайна афармляюць у выглядзе справаздач ці конкурсных прац. Некаторыя з іх былі адзначаны на раённых, абласных і нацыянальных конкурсах, у прыватнасці, у рамках экспедыцыі «Наш край». Досвед школьных краязнаўцаў па выяўленню адметных валуноў зацікавіў Еўрапейскую асацыяцыю па захаванню прыроднай спадчыны ProGEO. Кіраўнік пошукавай групы Канстанінскай школы В. Бунта атрымаў запрашэнне прадставіць вынікі сваёй працы на пасяджанні паўночнаеўрапейскай секцыі ProGEO у Фінляндыі ў маі 2007 года. Нажаль, паездка не адбылася з фінансавых прычынаў. Пазнаёміцца з дзейнасцю канстанінскай групы можна на наступных старонках у Internet: //http: //braslaw.by.ru/kanstalina,http://www.fio.by/vypusk/Potok_48//group_3/user_8/deinac.html. Плануецца размясціць адпаведную публікацыю ў Internet-часопісе ProGEO.

За апошнія гады каля 10 адметных валуноў выяўлены і зафіксаваны непасрэдна супрацоўнікамі Браслаўскага музея. Сабрана інфармацыя пра такую ж колькасць аб'ектаў, якія страчаны ў выніку гаспадарчай дзейнасці. Праца па лакалізацыі 5 валуноў працягваецца ў супрацоўніцтве са школьнымі краязнаўцамі.

Усе аб'екты, выяўленыя школьнымі краязнаўчымі групамі, супрацоўнікамі музея, патрабуюць экспертнай ацэнкі і далучэння да афіцыйнага рэестра помнікаў. Агульная колькасць такіх аб'ектаў, зыходзячы з назапашанага матэрыялу, можа скласці каля 50 – 60 адзінак.

Праведзеныя даследаванні дазваляюць уявіць, наколькі значныя страты былі нанесены ледавіковым валунам гаспадарчай дзейнасцю, асабліва інтэнсіўнай меліярацыяй у другой палове XX стагоддзя. На вывучэнні валуноў, цікавых з пункту гледжання этнаграфіі і гісторыі, моцна адбіліся дэмаграфічныя працэсы і змены ў рассяленні насельніцтва рэгіёну. Часцей за ўсё цяпер удаецца запісаць кароткія, фрагментарныя звесткі.

Пасля перыяду вельмі інтэнсіўных пошукаў выяўляць новыя аб'екты становіцца ўсё складанеі Можна пашырыць кірункі даследаванняў. Перспектыўным з'яўляецца мэтанакіраванае даследаванне рэк і азёраў Браслаўшчыны. Паводле папярэдне сабранай інфармацыі вялізныя валуны ёсць на мелях і ў прыбрэжных зонах (напрыклад, на азёрах Дрывяты, Снуды, Струста, Волас, Рычы). Такія валуны могуць дасягаць значных памераў. З пункту гледжання краязнаўства, цікавасць уяўляюць месцы масавага скаплення валуноў, якіх яшчэ не закранула гаспадарчая дзейнасць, напрыклад на Браслаўшчыне: два камяністых прыбрэжных участкі на ўсходнім беразе возера Дрысвяты непадалёку ад в. Пашавічы (камяніца першая і другая). Скапленні валуноў, адметныя ў краявідзе, фіксуюцца каля в. Жвірблі (на захад ад воз. Струста), на паўвостраве паміж азёрамі Войса, Неспіш, Недрава, у наваколлі воз. Укля. Каля такіх месц трэба шукаць адпаведна этнаграфічны матэрыял. У дадатак да асноўнага матэрыялу, звязанага з выяўленнем адметных ледавіковых валуноў, музей распачаў збор тапанімічнага і мікратапанімічнага матэрыялу, у аснове якога ляжыць слова камень (на Браслаўшчыне сустракаюцца як славянскія, так і балцкія варыянты). Сярод падобных назваў ёсць назвы азёраў, рэк, астравоў, паўастравоў, меляў, тоняў, пагоркаў, урочышчаў, вёсак і інш. Збірацца таксама матэрыял па выкарыстанню ледавіковых валуноў у мясцовым будаўніцтве, у якасці

прылад і прыстасаванняў, пры вырабе помнікаў, пра майстроў, якія займаліся ці займаюцца апрацоўкай каменя, прыёмы іх працы.

Часткова назапашаны матэрыял быў прадстаўлены на выставе «Камяні і жыццё», якая экспанавалася ў памяшканні гістарычна-краязнаўчага музея ў маі – верасні 2008 года. Акрамя гэтага матэрыял пра некаторыя валуны прадстаўлены ў пастаяннай экспазіцыі музея, быў апублікаваны ў шэрагу музейных выданняў [10]. Некалькі валуноў з'яўляюцца аб'ектамі паказу ў пазамузейных экскурсіях і турах.

Ніжэй прыводзіцца некалькі прыкладаў з працы па выяўленню і палявых даследаванняў адметных ледавіковых валуноў Браслаўшчыны за апошнія 7 гадоў.

У 2002 годзе краязнаўцы Грытунская базавай школы пад кіраўніцтвам А. Кажанеўскай знайшлі вялізны валун ва ўрочышчы Сталпоўка непадалёку ад в. Латочкі (паўднёва-заходняя частка Браслаўскага раёна). Абмеры і папярэднія даследаванні выканалі вучні Кансталінскай школы пад кіраўніцтвам В. Бунты. Даўжыня камлыгі складае 6,8 м, шырыня – 4,2 м, таўшчыня бачнай часткі – каля 2 м, вага, паводле папярэдніх разлікаў – каля 140 – 150 тон. Камень-волат з'яўляецца рэкардсменам сярод зафіксаваных ледавіковых валуноў Браслаўшчыны і можа быць далучаны да ліку самых вялікіх у Беларусі. Сярод мясцовых жыхароў ён быў вядомы з даўніх часоў, але з-за таго, што плоская вяршыня слаба прыўзнята над паверхняй, валун не прыцягваў увагі, не лічыўся адметнасцю навакольля. Адна з мясцовых назваў валуна – «Закляты камень». Яна звязана з легендай, зафіксаванай ад мясцовага жыхара К. Шыкшняна. Паводле легенды, у навакольлі вылучыўся сваім багаццем нейкі пан Мілевіч. У багацея не было дзяцей, і каб пажытак не дастаўся стараннім, ён закапаў пад валуном асноўную частку багацця – човен, напоўнены золатам. Скарб абараняла закляцце пана – золата дастанецца толькі таму, хто зможа выканаць тры ўмовы. Напачатку трэба распаліць вогнішча на Лысай гары, што размешчана побач, потым здзерці з жывога каня скуру, а потым запрэгчы гэтага каня і прагнаць вакол камлыгі тры баразны. Толькі тады можна будзе адкапаць золата, насыпанае ў човен.

Валуны з плоскімі вяршынямі і падобнымі легендамі маглі быць у даўнія часы камянямі-ахвярнікамі. Яшчэ адна назва валуна «Вількавіцкі камень». Апошняя назва найбольш часта ўжываецца ў публікацыях [11].

Летам 2003 года падчас экспедыцыйнага выезда на Казяншчыну (паўднёвая частка Браслаўскага раёна на памежжы з Пастаўскім раёнам) у в. Стаўрова супрацоўнікі музея зафіксавалі звесткі аб валуне незвычайнай формы, якая нагадвае човен. Па заданні музея пошукавая група пад кіраўніцтвам В. Бунты лакалізавала валун. Пазнеў аб'ект абследавалі супрацоўнікі музея і Нацыянальнага парка. Камень знаходзіцца ў лесе на адлегласці каля 1 км ад в. Дубраўка. Памеры валуна адносна невялікія: даўжыня – 2,9 м, шырыня – 1,5 м, вышыня – 1,1 м, абвод – 7,34 м. Найбольш уражвае знешні выгляд аб'екта. Здаецца, што кароткае тоўстае бервяно пачалі апрацоўваць, каб зрабіць з яго човен, але працу не завяршылі. Чоўны з суцэльнага кавалка дрэва, якія яшчэ пару дзесяцігоддзяў таму можна было ўбачыць на Браслаўшчыне, называлі дубіцамі. Валун каля в. Дуброўкі часта называюць «Каменная дубіца». Сярод іншых назваў – «Камянуха», «Доўбіца». Галоўная вось валуна арыентавана на кірунку ўсход – захад (носам чоўна на ўсход). Паглыбленне слабавыражанае, да 10 см. У ім заўсёды, нават у летняе спякоцце, ёсць вада, чыстая і празрыстая. Ваду лічылі гаючай і выкарыстоўвалі для лекавання. Напрыклад, ужывалі для выдалення барадавак, для паляпшэння зроку. Ваду «Каменнай дубіцы» выкарыстоўваюць для лекавання і цяпер. Да паловы XX стагоддзя побач з валуном праходзіла старая дарога, якая злучала вёскі Дубраўка і Стаўрова. Месца каля каменя славілася сярод падарожных як «блуднас». Тут часта чуліся дзіўныя гукі, у лясным гушчары выдавалася прысутнасць дзіўных істотаў. Асабліва актывізавалася праява нейкіх сілаў на Шостак, праз тыдзень пасля праваслаўнага Вялікадня (На Казяншчыне пераважае праваслаўнае беларускае насельніцтва). Падарожныя імкнуліся хутчэй праехаць чароўнае месца. Лічылася небяспечным схаць, ці ісці тут цемнай парой. Некаторыя мясцовыя жыхары верылі ў тое, што пад валуном зарыта золата. Шукалі скарб патаемна, звычайна ўначы. Скарбашукальшчыкаў выдавалі сляды рыдлёўкі побач з валуном [12].

Два каменя з выбітымі літарамі выяўлены восенню 2008 года побач з паркам Бяльмонты, дзе да паловы XX стагоддзя існавала сядзіба маёнтка. Ад 20-х гадоў XIX стагоддзя маёнтак Бяльмонты належыў графскаму роду Плятэраў. Цяпер парк прымыкае да тэрыторыі в. Ахрэмаўцы. Інфармацыя пра знаходку паступіла ад М. Паўловіча (М. Паўловіч жыве ў г. Даўгаўпілсе, з'яўляецца вядомым краязнаўцам і збіральнікам. Сям'і М. Паўловіча належыць дом, размешчаны побач з паркам Бяльмонты). Два невялікіх па памерах каменя знаходзяцца побач з былым уездам да сядзібы. На плоскіх паверхнях кожнага з іх выразна бачны літары. Адзін з камянёў быў прысыпаны зямлёй, літары сталі бачны толькі пасля раскопак (мал. 5). Мясцовыя жыхары ўказваюць і на трэці валун, які цяпер цалкам засыпаны грунтам.


Яшчэ ў 1980-х гадах супрацоўнікі музея зафіксавалі сведчанні жыхароў в. Ахрэмаўцы аб тым, што побач з сядзібай Бяльмонты існавалі камяні, якія ўшаноўвалі памяць паўстанцаў 1863 года. На іх былі бачны нейкія літары і знакі, называлі валуны «Пяруновымі камянямі». Ва ўмовах царскай цэнзуры ўладальнікі маёнтка не маглі адкрыта ўшанаваць памяць тых людзей з маёнтка, хто загінуў пры падаўленні паўстання, ці браў удзел у выступленні. Нібыта пры галоўным уездзе да сядзібы былі ўстаноўлены памятныя «паўстанцкія» камяні з літарамі, сэнс якіх не быў зразумелы стараннаму. З гістарычных прац

вядома, што графы Плятэры спачувалі паўстанню. Тагачасная ўладальніца маёнтка Ідалія Плятэр з сынам Феліксам у трывожны перыяд выехалі ў Італію, але ў маёнтку ўлады зафіксавалі прыгатаванні да ўзброенага выступлення. Некалькі чалавек з прыслугі, ксёндз, два лектары далучыліся да атрада Я. Ельскага-Ёдкі. Сярод бяльмонцкіх удзельнікаў паўстання былі і забітыя, і рэпрэсаваныя [13]. Плятэры пазбеглі рэпрэсій з боку царскіх улад, а пазней, пасля стабілізацыі сітуацыі, яны сапраўды маглі патаемна ўшанаваць памяць удзельнікаў паўстання. На камянях выразна бачны вялікія заглаўныя літары польскага алфавіта. На адным камені – тры літары, на другім – чатыры. Трэці камень яшчэ чакае раскопак. Расшыфроўка канкрэтнага значэння літар уяўляецца справай вельмі складанай. Не выключана, што мы маем справу з паданнем, рамантычны арэал якога павінен быў прыцягваць увагу гасцей маёнтка. Прыкладам падобнага роду памятных знакаў можа служыць камень з надпісамі ў парку маёнтка Відзы-Лаўчынскія, прысвечаны драматычнай гісторыі сяброўства каня і пса. Аднак і без расшыфроўкі бяльмонцкія камяні з літарамі можна далучыць да групы адметных валуноў Браслаўшчыны.




Мал. 5. Літары на адным з Бяльмонцкіх камянёў
(фота К. Шыдлоўскага, 2008 г.)

Самым каштоўным ледавіковым валуном Браслаўшчыны, звязаным з даўнімі вераваннямі і гістарычнымі падзеямі, з'яўляецца Барысаў камень з крыжом і надпісам XII стагоддзя, які знаходзіцца ў Друі. Пасля таго як валун быў выяўлены і зафіксаваны А. Сапуновым, даследаванні надпісу спецыялістамі больш не праводзіліся. Часткова гэта тлумачыцца тым, што ў 1920-я гады не без удзелу чалавека шматтонная камлыга была зрушана з месца і апынулася на дне р. Друйкі. Толькі ў 2002 годзе ў час засушлівага лета камень удалося лакалізаваць, а потым перамясціць на высокі бераг (мал. 6). Пра гэту падзею шмат пісалася ў прэсе, іншых выданнях [14].



Мал. 6. Пад'ём Барысава камяня са дна р. Друйка, 2002 г.

24 кастрычніка 2002 года, на наступны дзень пасля таго, як Барысаў камень быў перамешчаны на высокі бяспечны бераг Друйкі, аўтар гэтых радкоў зрабіў паведамленне на канферэнцыі «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі». Каштоўны помнік эпіграфікі XII стагоддзя зноў стаў даступным для даследаванняў, і навуковая грамадскасць была праінфармавана пра гэта. Аднак ад 2002 года камень не зацікавіў ніводнага спецыяліста. Між тым ёсць падставы меркаваць, што Друйскі пісанік з'яўляецца адным з найбольш цікавых у групе Барысавых камянёў, а яго даследаванні вельмі перспектыўны. Яшчэ А. Сапуноў звярнуў увагу на рэшткі вялікага надпісу па правы бок ад вертыкальнай стойкі крыжа (мал. 7). Даследчыку ўдалося прачытаць толькі некалькі асобных літар. У адрозненне ад іншых Барысавых камянёў, формула-заклінанне «ГОСПОДИ ПОМОЗИ РАБОУ СВОЕМУ БОРИСОУ» размешчана не сіметрычна па баках ад крыжа, а знаходзіцца на левым баку ўся.



Мал. 7. Крыж і надпіс на Друйскім Барысавым камяні

Літары формулы бачны даволі выразна і чытаюцца без асаблівых цяжкасцей. Горш захаваліся літары надпісу на правым баку ад крыжа. Менавіта гэты надпіс патрабаваў пільнай увагі даследчыкаў. Прачытаць нерасшыфраваны надпіс паспрабавалі краязнаўцы Друйскай школы пад кіраўніцтвам настаўніка М. Ставіцкага. Для таго каб літары сталі больш выразнымі, ужываліся розныя спосабы – забіўка паглыбленняў снегам, пяском, паверхню валуна аблівалі вадой, надпіс фатаграфаваўся лічбавай камерай у розных рэжымах, а фотаздымкі праходзілі камп'тэрную апрацоўку. Самым эфектыўным аказалася капіраванне паверхні каменя з надпісам з дапамогай тэхнічнай фальгі. Пасля абстуківання гумовым малатком на паверхні фальгі адбіваліся самыя дробныя дэталі рэльефу валуна. Пазней для зручнасці ліст фальгі быў прымацаваны да рамкі. З такім адбіткам можна было працаваць у любы час, ствараючы розныя ўмовы асвятлення. Чытаць літары стала значна лягчэй, хаця з-за складанасці рэльефу валуна, прачытанне некаторых літар выклікала сумненне. Да працы падключыліся супрацоўнікі Браслаўскага музея. Былі атрыманы два варыянты прачытання літар, якія маюць адрозненні, але не вельмі істотныя. Літары складваюцца ў сем радкоў, у кожным з якіх зафіксаваны ад 3 да 4 літар. Літары не складаюцца ў тэкст, бо частка радоў пашкоджана сколам. Пашкоджанне, не зафіксаванае на замалёцы А. Сапунова, было, верагодней за ўсё, нанесена ў 1920-я гады ледзянымі крыгамі, якія ссунулі камлыгу ў Друйку.

Такім чынам, у даследчыкаў канца XIX – пачатку XX стагоддзя быў шанец прачытаць надпіс правай часткі цалкам. Такой магчымасці не будзе ў сучасных даследчыкаў, бо адшукаць невялікі фрагмент валуна на дне Друйкі ўяўляецца малаверагодным. Расшыфроўка можа быць больш простай, калі непрачытаны тэкст быў таксама звязаны з хрысціянскімі формуламі. Але гэта толькі адзін з варыянтаў. Тэкст мог быць цалкам арыгінальным. Хацелася б звярнуць увагу на тое, што Друйскі Барысаў камень быў самым аддаленым у групе падобных валуноў і размяшчаўся на памежжы Полацкага княства. Не выключана, што тэкст Друйскага пісаніка ўказваў на прычыны, якія прымусілі ў часы князя Барыса выбіць крыжы і надпісы з просьбай аб дапамозе [15].

Такім чынам, за апошнія няпоўныя два дзесяцігоддзі на Браслаўшчыне была выяўлена вялікая колькасць адметных ледавіковых валуноў. Перспектыўнымі ўяўляюцца працы па далейшаму іх выяўленню і

фіксацыі, але яшчэ больш актуальным з'яўляецца паглыбленае даследаванне найбольш каштоўных аб'ектаў спецыялістамі рознага профілю.

ЛІТАРАТУРА

1. Аддзел рукапісаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі ў Маскве. – Фонд 293. – Папка 39. – Арк. 72.
2. Покровский, Ф. Археологическая карта Ковенской губернии / Ф. Покровский. – Вильна, 1899. – С. 23, 29, 31.
3. Друцкий-Любецкий, В. Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии / В. Друцкий-Любецкий, А. Сапунов. – Витебск, 1896. – С. 122, 123.
4. Запіскі аддзела гуманітарных навук. – Менск, 1928. – Т. 1, Кн. IV: Працы кафедры этнаграфіі. – С. 176.
5. Halicka, A. Materiały do charakterystyki petrodraficznej zabytkowych głazów narzutowych Wileńcsczyzny / A. Halicka // Prace Muzeum Ziemi. Zeszyt 38. – Warszawa, 1986. – S. 63.
6. Вінакураў, В. Ледавіковыя валуны Браслаўшчыны – геалагічныя помнікі прыроды / В. Вінакураў // Дакладная зап. Ін-т геалогіі, геахіміі і геафізікі. Эксперымент. база па вывуч. ледавік. валуноў. – Мінск, 1993. – Машынапіс. (Экзэмпляр працы зберагаецца ў Брасл. гіст.-краязн. музеі).
7. Левков, Э. Кем был прородитель черта / Э. Левков // Навіны Беларускай Акадэміі. – 16 лістап. – 1990. – С. 6.
8. Вінакураў, В. Геалагічная спадчына Браслаўшчыны / В. Вінакураў // Браслаўскія чытанні: матэрыялы V навук.-краязн. канф. – Браслаў, 2001. – С. 17 – 22.
9. Памяць. Браслаўскі раён. Гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 1998. – С. 21 – 25, 63, 64, 65; Вінакураў, В. Ледавіковыя валуны на Беларусі: новыя знаходкі / В. Вінакураў // Навіны Беларус. Акад. – 1992. – 17, 24 студз.; Вінакураў, В. Геалагічныя помнікі прыроды / В. Вінакураў // Браслаўская звязда. – 1992. – 4, 8 студз.
10. Шыдлоўскі, К. Браслаўшчына: прырода і людзі / К. Шыдлоўскі. – Мінск, 2003; Шидловский, К. Браслав и окрестности / К. Шыдлоўскі. – Мінск, 2006. (Гл. таксама выд. краязн. Браслаўшчыны «Павет»).
11. Бунта, В. Камень-волат ля вёскі Латочкі. Хроніка адкрыцця / В. Бунта // Павет. – № 7 – 8 (11 – 12), 2002. – С. 8 – 11; Елісееў, В. Браслаўскі камень-волат / В. Елісееў // Браслаўская звязда. – 2002.
12. Шыдлоўскі, К. Падрабязней пра гэты валун: у госці да Каменнай Дубіцы / К. Шыдлоўскі // Павет. – № 11 (24), 2003. – С. 1 – 2.
13. Hedemann, O. Historia powiatu Brasławskiego / O. Hedemann. – Wilno, 1930. – S. 244, 377, 452, 457.
14. Сергіевіч, К. Знаходка агульнанацыянальнага значэння / К. Сергіевіч // Браслаўская звязда. – 2002. – 12 снежня; Шидловский, К. Легендарный Борисов камень найден! / К. Шидловский // Туризм и отдых. – 2002. – 6 нояб.; Шыдлоўскі, К. Рэліквія з-пад рачных хваляў / К. Шыдлоўскі // Культура – 2002. – 2 – 8 лістап.; Шыдлоўскі, К. Друйскі Барысаў камень. З гісторыі адкрыцця і даследавання / К. Шыдлоўскі // Браслаўскія чыт.: матэрыялы VI навук.-краязн. канф. Браслаў, 2003. – С. 109 – 112. (Барысаваму камяню з Друі, працам па яго лакалізацыі і перамяшчэнню прысв. спец. падвойны нумар выдання «Павет» – № 7 – 8 (11 – 12), 2002).
15. Шыдлоўскі, К. Друйскі Барысаў камень (з гісторыі вяртання і даследавання) / К. Шыдлоўскі // Беларус. гіст. агляд. – Т. XIV. Сшытак. 1 – 2 (26 – 27). Снеж. 2007. – С. 179 – 186. (Падрабязней пра працы над надпісам: Таямніца Друйскага пісаніка. На шляху да разгадкі // Павет – 2008. – № 2 (61).

УЛАСНЫЯ ІМЁНЫ Ў КНІЗЕ Я. БАРШЧЭЎСКАГА «ШЛЯХЦІЦ ЗАВАЛЬНЯ» ЯК КРЫНІЦА РЭКАНСТРУКЦЫІ ЭТНІЧНАЙ КАРЦІНЫ СВЕТУ ПРЫВІЛЕЯВАНАГА САСЛОЎЯ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТАГОДДЗЯ

С.А. ШЫДЛОЎСКІ
(Полацкі дзяржаўны універсітэт)

Прадстаўлены вынікі даследавання твору Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» як крыніцы латэнтнай інфармацыі (яе носьбітамі разглядаюцца ўласныя імёны – антрапонімы, тапонімы, этнонімы, тэонімы і іншае), што здольная раскрыць падставовыя асаблівасці карціны свету прывілеяванага саслоўя Беларускага Падзвіння ў першай палове XIX стагоддзя. Даследаванне тэкставай крыніцы з пазіцый мадэлявання інфармацыйнага асяроддзя дазваляе выявіць суадносіны аб'ектыўнай і суб'ектыўнай інфармацыі ў тэксце. Праводзіцца класіфікацыя тыпаў уласных імёнаў у тэксце Я. Баршчэўскага і частотны аналіз іх выкарыстання.

Пад тэрмінам «этнічная карціна свету» разумеецца пэўная «міфалагема рэальнасці», якая фарміруе логіку адаптацыйных паводзінаў этнасу, або у нашым выпадку часткі этнасу – традыцыйнага прывілеяванага саслоўяў Беларускага Падзвіння. Карціна свету асэнсоўваецца яе носьбітамі часткова і фрагментарна, яна не дадзена ў пэўнай лагічнай цэласнасці, тым больш у гатовым тэксце [1, с. 222]. Узнавіць падобныя ўяўленні магчыма карыстаючыся ўскоснымі звесткамі і крыніцамі, да якіх можна аднесці і

ўласныя імёны, што выяўляюць пэўную «прыродна-ландшафтную, гісторыка-культурную і гаспадарчую лакальную спецыфіку» [2, с. 2].

Уласныя імёны людзей і звышнатуральных істот, якія сустракаюцца ў кнізе Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня», можна ўмоўна падзяліць на некалькі груп. Па-першае, гэта ***беларускія міфалагічныя імёны***. Персанажаў, якія яны пазначаюць, налічваецца 26. Сярод іх вылучаюцца *легендарныя героі* (5 персанажаў – Княжа, Цярэшка, князь Бой, пан Твардоўскі, дзяўчына Ганна) і *звышнатуральныя істоты* (21 – Купала, Вужыны Кароль, Варгін, Будзімір, Паднор, Пруд, Дубіна, Гарыня, Чур, сабакі Стаўры і Гаўры, Пярун, Баба Яга і восем цыганскіх духаў – Нікітрон, Ярон, Ірон, Кітрон, Фараон, Фаразон, Сталідон, Лідон). Фігуруюць у тэксце таксама русалкі, ваўкалакі, цмокі, чума, трасца або фебра, лесуны (Лясны Бог), вадзянік, хляўнік, дамавік, волат і адзін касмапалітычны вампір. Збольшага гэтыя імёны ўзыходзяць да язычніцкага пласту беларускай традыцыйнай свядомасці, агульнай, відавочна, і для сялянства, і для прадстаўнікоў ніжэйшага дваранства. Суіснаванне язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў – вынік гістарычнага кампрамісу на беларускіх землях паміж язычніцтвам і хрысціянствам. Апошняе ў абмен на нябесны прастол пакінула мясцовым язычніцкім духам – зямлю, ландшафт.

Антычных уласных імёнаў у кнізе налічваецца 27 адзінак. Сярод іх можна вылучыць *імёны гістарычных асобаў* (7 – Аляксандр Македонскі, Гамер, Вергілій, цар Спарты Леанід, Цыцэрон, Гарацый, Цэзар), *міфічных герояў* (12 – Парыс, Уліс, Цырцэя, Цыклоп, Эней, Прок, Амулій, Нумітор, Рэй Сільвій, Ромул, Рэм, Фаустул) і *язычніцкіх багоў* (8 – Фартуна, Апалон, Трытон, Нептун, Амфітрыта, Марс, Акіян, Венера). Наменклатуру грэка-рымскіх імёнаў можна пашырыць з улікам безназоўных німф, сатыраў, муз, купідонаў і вясталак. Досыць прадстаўнічая група антычных уласных імёнаў сведчыць аб класічным характары адукацыі, якую атрымаў Я. Баршчэўскі ў Полацкім езуіцкім калегіуме. Свабоднае валоданне дадзеным інфармацыйным пластом мусіла дэманстраваць адукаванасць як аўтара тэксту, так і героя-апавядальніка, легітыміравала аўтарскія амбіцыі і падвышала апавядальніцкі прэстыж у вачах правінцыйнага шляхецкага грамадства. З боку апошняга веды гэтыя аднак не выклікалі асаблівага эмацыйнага водгуку. Так, шляхціца Завальню змарыў сон пакуль пляменнік Янка пераказваў сюжэты грэка-рымскай міфалогіі. Яшчэ адзін высокаадукаваны выхаванец езуітаў арганіст з Расонаў, запэўніўшы грамадства ў тым, што яшчэ ведае на памяць тэксты Цыцэрона і Гарацыя, прызнае, што ўсё гэта vanitas vanitalis (марнасць марнасцяў) [3, с. 148].

Наступная група ўласных імёнаў у тэксце «Шляхціц Завальня» – гэта ***імёны, якія адносяцца да хрысціянскай рэлігійнай традыцыі***. Нягледзячы на высокую частотнасць згадвання хрысціянскіх імёнаў (гэта пераважна звароты да Бога, Айца і Сына, а таксама найсвяцейшай Маці, кшталту, «з Богам», «дзякуй Богу», «Божа», «Божы»), сама іх наменклатура досыць сціплая. Налічваецца каля 20 персанажаў, з улікам імён, што згадваюцца ў звязку са святамі ці назвамі ікон, малітваў і касцёлаў (гэта Бог-Айцец, Ісус, Матка Божая, св. Пётр, Тры вешчуны, Адам, Ева, Каін, св. Ян, св. Ксаверы, св. Казімір, св. Стафан, св. Сафія, св. Барыс і Глеб, Ігнацы Лаёла, Абрам, д'ябал). Аднак пэўныя хрысціянскія імёны маюць вялікую колькасць варыянтаў (гэта датычыць перадусім упамінанняў у тэксце Бога-Айца, Ісуса, дзевы Марыі і д'ябла). Напрыклад, згадваецца Бог, Творца, Айцец і Сын, Езус, Хрыстос, Спасіцель, Пан, Спас, святы Немаўляці; Прачыстая Маці, Найсвяцейшая Маці, Матка Божая, Марыя; д'ябал, шатан, Сатана, Праклятый. Такая шматварыянтнасць, як і высокая частотнасць згадвання дадзеных хрысціянскіх персанажаў, сведчыць аб эмацыйнай хрысціянскай заангажаванасці герояў Я. Баршчэўскага. Асобы хрысціянскага пантэону праз назвы бажніц і мясцовашануемых ікон (Прачыстая Маці Сірацінская) зрабіліся часткай паўночнабеларускага ландшафту – геаграфічнага і культурнага. Аднак звяртае на сябе ўвагу мінімальная прысутнасць у тэксце Я. Баршчэўскага персанажаў Старога Запавету. Гістарычныя прыклады ён больш ахвотна запазычвае з антычных крыніц, а дэманалагічную наменклатуру скарыстоўвае мясцовую, ігнаруючы гісторыка-міфалагічны патэнцыял Бібліі.

Пералік мясцовых імпрэзаў і ўрачыстасцяў – Вялікдзень, Чысты Чацвер, Сёмуха, Купалле, урачыстасці св. Ігнацыя Лаёлы, працэсіі з абразом Святога Немаўляці, Юбілей у Юхавічах, Каляды, свята Трох вешчуноў, Чырвоны полацкі кірмаш, конскія кірмашы ў Бешанковічах і Асвеі – таксама ўказвае на пэўны парытэт паміж язычніцкім і хрысціянскім, нябесным і зямным.

Надзвычай мізэрнай з'яўляецца ***група замежных імёнаў***. У творы Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня» згадваецца толькі пяць заходнееўрапейскіх гістарычных асобаў – Дагер, адзін са стваральнікаў фатаграфіі, Напалеон і тры персанажы, якія звязаны з каталіцкай езуіцкай субкультурай (Ігнацы Лаёла, Клаўбер, кс. Порэ). Такая нязначная колькасць замежных імёнаў можа быць патлумачаная як бракам актуальнай інфармацыі, інфармацыйнай самадастатковасцю правінцыялаў, так і праграмным традыцыяналізмам самога Я. Баршчэўскага, які ў прадмове да сваёй кнігі дэкларавaў, што англійскія, нямецкія або французскія літаратурныя (і, відавочна, культурныя) узоры не пасуюць мясцоваму густу [3, с. 8].

Рускія гістарычныя і культурныя персанажы наўпрост у тэксце «Шляхціца Завальні» не згадваюцца. Але ў іншасказальнай форме, паводле меркаванняў М. Хаўстовіча, пад іменем Белай Сарокі вы-

водзіцца постаць Кацярыны II. У зносцы да тэксту, зробленай Я. Баршчэўскім, згадваецца генерал Кульнёў. Як абагульнены вобраз велікарусы выступаюць у тэксце Я. Баршчэўскага пад назвай *асташоў*, прадстаўнікоў горада Асташкава, якія арандавалі частку азёраў у Паўночнай Беларусі.

І яшчэ адна вялікая група – ***беларускія антрапонімы***, што пазначаюць гістарычных асоб або персанажаў, якія з вялікай доляй верагоднасці маглі мець рэальных прататыпаў. *Па-першае*, гэта ўласныя імёны людзей, якія маюць гістарычныя карані (11), – паны Снарскія, уладальнікі Краснаполя, Белліковічы, уладары Экіманіі, князі Агінскія, уладары Магільна, род Храпавіцкіх, фундатараў царквы св. Сафіі, кароль Казімір, паны Кошка, Цяліца, Жук, Жаба, Грэбніцкі, гаспадар віцебскай карчмы Карлісан. *Па-другое*, уласныя імёны літаратурных персанажаў, прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў (13), рэальнае існаванне якіх не даведзена, – паны Завальня, Сівоха, Латышэвіч, Марагоўскі, Стась і Юзік, сыны Завальні, Янка, пляменнік Завальні, пані Мальгрэта, гаспадыня Завальні, ксёндз Буда, айцец Попэ, пан Чубкевіч, пан Скамароха, суддзя Дадэмуха. *Па-трэцяе*, шляхецкія імёны, што раскрытыя аўтарам не поўнасцю (24) – пан Андрэй (арганіст з Расонаў), сляпы Францішак, пан К.Г., пан З., пан Б., пан М., пан Л., пан С., пані Тэрэза, Атон, Аліна, Альберт і Мальвіна, Гугон, пан Генрык, Амелія, пан ***, Адольф, Альма, Севярын, пан Дамінік, пан Н., Антося, Зося. *Па-чацвёртае*, простанародныя імёны (37): сялянскія і мяшчанскія (32) – Карпа, Гарасім, Агапка, Парамон, Акім, Грышка, Антон, Васіль, Арына, Алюта, Марцін, Максім, Сямён, Марыся, Якуш, Марка, Алена, Ілля, Арцём, Ганка, Аксіня, Родзька, Аўгіня, Варка, Якуб Плаксун, Праксэда, Міхась, Ахрэм, Лукаш, Марынка, Тамаш, Алешка, яўрэйскія (3) – Хаім, Ёсель, Сора, цыганскія (2) – Базыль, Шылка. І ўрэшце, алегарычныя істоты – Чарнакніжнік (Вялікі Чарнакніжнік), Плачка, Сын Буры, Сын Шчасця, Сын Цярпення, Вогненныя духі, Белая Сарока, Чорны госць. (У кнізе сустракаюцца і ўласныя назвы раслін, што таксама выступаюць у Я. Баршчэўскага як пэўныя алігорыі, – гэта Разрыў-трава, Пералёт-трава, Жабер-трава, трава росічка.)

Такім чынам, найбольш прадстаўнічымі групамі сярод беларускіх антрапонімаў кнігі Я. Баршчэўскага паўстаюць прастанародныя імёны і імёны, якія з вялікай доляй верагоднасці належаць прадстаўнікам дробнага каталіцкага дваранства. Імёны арыстакратыі з'яўляюцца эпізадычна. Відавочна, аўдыторыяй, на якую разлічваў Я. Баршчэўскі, – дробнае шляхецтва. Адным жа з галоўных абагульненых герояў кнігі паўстае просты беларускі народ.

У кнізе Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня» ўтрымліваецца 30 ***айконімаў***. На частотнасці згадвання з аграмадным адрывам лідзіруе Полацк (разам з утворанымі ад яго назвамі) – 38 згадак, потым – Рыга (7) і Віцебск (5). Згадкі астатніх айконімаў не перавышаюць трох разоў. Беларускіх айконімаў – 21 адзінка. У вызначэнні атрыбута «беларускі» мы мусім прытрымлівацца меркаванняў самога Я. Баршчэўскага, які пашыраў гэтае азначэнне на тэрыторыю Невельскага і Себежскага павстаў, што належаць зараз Расійскай дзяржаве. Такім чынам, да беларускіх мы аднеслі наступныя назвы гарадоў, вёсак і маёнткаў: Полацк, Невель, Себеж, Юхавічы, Клішкова, Магільна, Віцебск, Казуліна, Клясціцы, Галубова, Струнь, Экіманія, Расоны, Краснаполле, Альбрахтоў, Ушачы, Гарбачова, Бешанковічы, Асвея, Сітна, Сіроцін. Большасць з іх лакалізуюцца на правым беразе Дзвіны. Сярод небеларускіх айконімаў – 6 расійскіх (Пскоў, Вялікія Лукі, Ноўгарад, Старая Руса, Пецярбург, Нарва) і ўрэшце – Рыга. Дадзеная група айконімаў досыць красамоўна назначае вектары эканамічных і культурных сувязяў жыхароў Паўночнай Беларусі. Арганічнай бачыцца ў тэксце Я. Баршчэўскага прысутнасць айконімаў, звязаных з грэка-рымскай цывілізацыяй (Троя і Рым).З назваў краін (гісторыка-культурных рэгіёнаў) найчасцей згадваецца Беларусь (24), і адзін-два разы – Інфлянты, Курляндыя, Расія, Турцыя, Егіпет.

Прадстаўнічай з'яўляецца група ***гідронімаў***, сярод якіх – 12 назваў азёр (Нешчарда – 20 згадак, Шэвіна – 2, Валовая азярына – 1, Расоны – 2, Глухое – 5, Рабло – 4, Язна – 2, Сітнянскае – 2, Глыбокае – 1, Скобрыя – 1, Няведра –1, Невельскае – 1), 9 – рэк (Дзвіна – 13, Дрыса – 10, Палата – 5, Ловаць – 1, Обаль – 1, Страдань – 1, Тыбр – 1, Нява – 1), адной крыніцы (Дзявочая) і мора (Балтыйскае, Фінская затока).

Згадваецца ў тэксце Я. Баршчэўскага таксама 7 назваў гор (Пачаноўская – 3, Магіла Княжа, Ласіная гара, Алімп, замкавая гара ў Полацку, Гарадзецкая, Рабшчызна).

З тапонімаў таксама варта згадаць назвы «Сітнянскі лес» і «Пецярбургскі гасцінец».

З урбонімаў пераважаюць полацкія імёны – назвы бажніц (св. Стафана, св. Сафіі, Спас, св. Ксаверыя, св. Казіміра, царква Барыса і Глеба), могілак (ля св. Ксаверыя) і садоў (Спаса і Экіманіі). Да гэтага надзвычай сціплага спісу можна хіба дадаць такія назвы гарадскіх аб'ектаў, як святыні Перуна і Бабы Ягі, Полацкая езуіцкая акадэмія, мураваны слуп у Полацку са стодам св. Яна, а таксама карчма Карлісана ў Віцебску. Гарадская прастора, міфалагема гарадской прасторы, відавочна, не была добра засвоена ні традыцыйнай сялянскай, ні шляхецкай свядомасцю.

Аналіз тапаніміі кнігі Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» дазваляе выявіць шматслойны характар прасторы, якую апісвае дадзены тэкст.

Найперш, гэта *прастора культуры* – прастора ідэальнага, галоўнай метафарай якой з'яўляецца Сад – гэта адначасова грэцкая Аркадыя і полацкія сады (Спаса і Экіманіі), у якіх бавіўся малады Баршчэўскі за часамі сваёй вучобы ў сзуітаў. Алімп, Тампейскую даліну, Фармапілы герой Я. Баршчэўскага шукае і знаходзіць у ландшафтах Полаччыны, падсвечанымі ўспамінамі юнацтва.

Яшчэ адзін пласт – *прастора гісторыі*, мемарыяльныя мясціны, звязаныя з гістарычнымі падзеямі, напрыклад, Клясціцы. Збольшага яна перакрываецца, паглынаецца прасторай міфалагічнай, напрыклад, паходжанню курганоў, звязаных з гістарычнымі падзеямі, надаецца міфапаэтычнае тлумачэнне. Мясцовая гісторыя падпадае міфалагізацыі не толькі з боку народнай традыцыі, але і высілкамі самога Я. Баршчэўскага.

Прастора міфалагічнага – гэта таксама і *прастора сакральнага*. Яна пазначана назвамі курганоў (Магіла Княжа), крыніц (Дзявочая), камянёў (Змяёвы), дрэў (Дзве Бярозы) і гор. Можна дапусціць, што сакралізацыя мясціны звязана з функцыяй мемарыялізацыі. Міф, прывязаны да пэўнага прыроднага аб'екта, мусіць фіксаваць значымыя для народа гістарычныя падзеі ва ўмовах браку пісьмовай летапіснай традыцыі ці немагчымасці свабодна сцвярджаць уласную версію гісторыі.

Прасторы сакральнага – прасторы памяці (як гістарычнай, так і міфапаэтычнай) супрацьпастаўлена *прастора цывілізацыі*, або штодзённасці, якая маркіравана назвамі гарадоў, вёсак і маёнткаў.

У гарадах адбываецца стабілізацыя рэальнасці ці здаровага сэнсу. Чыннікам стабілізацыі, паводле перакананняў герояў кнігі Я. Баршчэўскага, з'яўляецца наяўнасць у гарадах божых храмаў і святых айцоў. Прычым эфект стабілізацыі рэальнасці залежыць ад пэўных колькасна-якасных параметраў. Чым больш храмаў, тым лепш. Асабліва добра на стабілізацыю рэальнасці ўздзейнічае наяўнасць у месцы айцоў-сзуітаў.

Паветра горада вызваляе чалавека ад прымхаў. Дакладней, пераводзіць містычныя інфернальныя эпізоды ў разрад прымхаў, баек. Так, віцебскія мяшчане высмейваюць містычную гісторыю з панам Генрыкам, у якога крычалі на галаве валасы. У Полацку змяняецца да лепшага, робіцца нармальнай і ўрэшце памірае па-хрысціянску Варка Плаксуніха, дачка вясковай варажбіткі.

Аднак падобнае ўздзеянне гарадоў выяўляецца ў дачыненні інфернальнага, што мае мясцовае паходжанне. Перад замежнымі фармазонамі і чарнакніжнікамі насельніцтва беларускага гораду безабароннае. Так, чарнакніжнік пан Твардоўскі здолеў пранікнуць нават у сцены полацкага езуіцкага калегіума. Да «групы рызыкі» адносяцца музыкі, рыбакі, карчмары, арыстакратыя.

Найменш стабільна рэальнасць у раёне азёр-вокнаў паміж рэальным ды іррэальным. Беларускія азёры часта пазначаюць месцы агіджанай святасці: праваліўшыхся скрозь зямлю цэркваў і цэлых гарадоў (намечана ў Я. Баршчэўскага і тапаграфія беларускіх нетраў, прынамсі, уваходаў у прадонне Беларусі), затопленых званоў і месцаў гвалтоўнай смерці людзей. Аднак дастаткова аднаго толькі адлюстравання храма ў азёрнай вадзе, каб суцішыць інфернальнай. Азёры – гэта месца лёсавання, розыгрышу шанцаў. Няўстойлівасць рэальнасці, балансаванне паміж сапраўднасцю і тагабочным, можа прыводзіць тут як да нечуваных катастроф, так і выйгрышаў. Таму ў свеце шляхціца Завальні ідзе барацьба за азёры з прыхаднямі і чарнакніжнікамі.

Такім чынам, праведзены аналіз дазволіў выявіць вялікі інфармацыйны фактаграфічны патэнцыял тэксту Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня», раскрыццё якога вымагае прыцягнення шырокага міждысцыплінарнага гуманітарнага інструментарыя (этналагічнага, лінгвістычнага, гістарычнага).

ЛІТАРАТУРА

1. Лурье, С.В. Историческая этнология / С.В. Лурье. – М.: Аспект Пресс, 1997. – 448 с.
2. Лобач, У.А. Элементы культурнага ландшафту ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў (на этнаграф. і фалькл. матэрыялах Рэчыцкага рэгіёну) / У.А. Лобач // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2006. – № 7. – С. 2 – 8.
3. Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі; уклад., пер. з пол. мовы М. Хаустовіча. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 383 с. (Спадчына).

МЕТАДАЛОГІЯ ПАЛЯВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

СУЧАСНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ЭТНАЛОГІІ

чл.-кар. НАН Беларусі, д-р гіст. навук, праф. М.Ф. ПЛІПЕНКА
(Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Мінск)

Прадстаўлен аналіз сучаснага стану і вызначэння перспектыўных накірункаў развіцця беларускай этналагічнай навукі. Паказана яе значэнне ў забеспячэнні прагрэсіўнага развіцця беларускага грамадства. Разглядаюцца характэрныя рысы сучаснага стану беларускай этналогіі.

Сучасны перыяд – гэта новы этап у грамадскім і палітычным развіцці Беларусі. Ён ахоплівае 90-я гады XX стагоддзя і пачатак XXI стагоддзя. Менавіта ў гэты час Беларусь становіцца арганічнай часткай еўрапейскай і сусветнай супольнасці ў палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, духоўнай сферах жыцця. Менавіта ў гэты перыяд узрастае значэнне, адказнасць беларускай этнічнай супольнасці за ўсё, што адбываецца ў самабытнай беларускай дзяржаве, за супрацоўніцтва з іншымі этнічнымі супольнасцямі. Узрастае і значэнне беларускай этналагічнай навукі ў забеспячэнні прагрэсіўнага развіцця беларускага грамадства, яго састаўных частак – як беларускага этнасу, так і этнічных груп Беларусі, што жывуць побач з беларусамі. Беларуская этналогія становіцца састаўной часткай еўрапейскай і сусветнай этналагічнай навукі.

У гэты перыяд адбываецца перабудова тэарэтычнага фундаменту беларускай этналогіі, яго ўзбагачэнне, папаўненне новымі метадамі, назапашанымі сусветнай этналогіяй, – структурным, функцыянальным, дыфузіянісцкім і інш. На Беларусі ў гэты перыяд ажыццяўляецца творчая перапрацоўка гэтых метадаў, выкарыстанне іх не толькі паасобку, але і ў спалучэнні адзін з другім.

Наступнай характэрнай рысай сучаснага стану беларускай этналогіі стала публікацыя абагульняючых прац аб беларускім этнасе. Менавіта ў сучасны перыяд створана навуковая серыя «Беларусы». Ужо падрыхтавана і выдадзена 10 грунтоўных тамоў гэтай серыі, у якіх асвятляецца шматвяковае развіццё беларускага народа, многіх частак яго культуры – матэрыяльнай, сацыяльнай, духоўнай, паказваецца пачэснае месца беларускай этнічнай супольнасці ў еўрапейскай цывілізацыі. Нагадаю назвы некаторых тамоў гэтага выдання: «Дойлідства», «Вусная паэтычная творчасць», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Грамадскія традыцыі», «Сям'я» і інш.

Трэцяй характэрнай і вельмі важнай рысай сучаснага стану беларускай этналогіі з'яўляецца тое, што ў сучасны перыяд пачалося фарміраванне новых навуковых школ. І самай прыкметнай з'явай сучаснага развіцця беларускай этналогіі стала фарміраванне такой этналагічнай школы ў Полацкім дзяржаўным універсітэце. За кароткі перыяд існавання Полацкага дзяржаўнага універсітэта ім у галіне этналогіі зроблена шмат. Дацэнтам гэтага універсітэта Уладзімірам Аляксандравічам Лобачам падрыхтаваны і выдадзены падручнік «Этнаграфія Беларусі», дарэчы, другі за ўсю гісторыю беларускай этналогіі. Універсітэт пачаў выдаваць «Полацкі этнаграфічны зборнік». Ужо апублікаваны 2 выпускі. Іх падрыхтавалі да друку дацэнт У.А. Лобач і старшы выкладчык У.С. Філіпенка. «Полацкім этнаграфічным зборнікам» папаўняецца фактычная навуковая база беларускай этналогіі, якая мае істотнае значэнне для навуковых даследаванняў не толькі ў сучасны перыяд, але і ў будучым. На базе сабраных матэрыялаў выкладчыкамі універсітэта ажыццяўляецца навуковае даследаванне многіх частак традыцыйнай культуры – традыцыйных спосабаў гадавання дзяцей, сямейных абрадавых традыцый, народных ведаў, у прыватнасці, народнай медыцыны, культавых мясцін, светапоглядных асноў прыкмет, спосабаў прадказання будучыні. Полацкім універсітэтам надаецца важнае значэнне падрыхтоўцы навуковых кадраў па этналогіі. Ужо падрыхтаваны і паспяхова абаронены дзве кандыдацкія дысертацыі, рыхтуецца доктарская і яшчэ некалькі кандыдацкіх дысертацый. З завяршэннем гэтых навуковых прац полацкая школа беларускай этналогіі набывае трывалы фундамент, зможа вырашыць адну з актуальных задач сучаснай беларускай этналогіі – усебакова вывучыць комплекс традыцыйнай культуры Беларускага Падзвіння, які з'яўляецца вельмі важнай арганічнай часткай беларускай нацыянальнай культуры, адным з самых моцных беларускага этнасу. Фарміраванне і развіццё гэтага комплексу – яркая старонка беларускай гісторыі, якой мы маем усе падставы ганарыцца, любіць, шанаваць яе.

Маштабнае даследаванне комплексу традыцыйнай культуры Беларускага Падзвіння істотна ўзбагаціць беларускую этналогію, будзе садзейнічаць далейшаму прагрэсіўнаму развіццю гэтай навукі. Гэта вельмі добрая перспектыва.

АСНОЎНЫЯ АСПЕКТЫ Ў ДАСЛЕДАВАННІ ВЯСКОВЫХ ПАСЕЛІШЧАЎ ПОЛАЦКАГА ПАДЗВІННЯ Ў КАНЦЫ XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

канд. гіст. навук М.В. КЛІМАЎ
(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)

У артыкуле распавядаецца аб трох асноўных аспектах у даследаванні вясковых паселішчаў Полацкага Падзвіння канца XX – пачатку XXI стагоддзя, а менавіта гаворка ідзе аб тэрытарыяльным (тапаграфічным), храналагічным і тыпалагічным аспекце. Указваецца на частковы характар вывучанасці сельскага рассялення ў дазеным рэгіёне. Аналізуюцца праблемы, звязаныя з высвятленнем храналогіі вясковых паселішчаў. Вызначаюцца крытэрыі тыпалогіі паселішчаў.

З сярэдзіны 90-х гадоў XX стагоддзя аўтарам прадстаўленай публікацыі пачалася актыўная праца па выяўленню і вывучэнню вясковых паселішчаў Полацкага Падзвіння. Да пачатку ўказанага храналагічнага этапу вясковыя ўмацаваныя паселішчы выяўляліся ў большай ступені выпадкова, сукупна з вывучэннем г. Полацка, курганных могільнікаў і гарадзішчаў. У гэтай сувязі мае сэнс згадаць імёны такіх даследчыкаў, як Л.Д. Побаль, Г.В. Штыхаў, В.І. Шадыра, Л.У. Дучыц, С.В. Тарасаў і інш. З сярэдзіны 90-х гадоў праца па вывучэнню вясковых паселішчаў Полацкага Падзвіння пачала насіць сістэматычны характар. У межах праведзенага даследавання магчыма вылучыць наступныя аспекты.

Тэрытарыяльны (тапаграфічны) аспект. Тэрытарыяльны аспект у праведзеных доследах магчыма было б выразіць зыходзячы з тых задач, якія ставіліся на кожным з этапаў доследаў. З 1994 года навуковай тэмай аўтара прадстаўленай публікацыі была вызначана тэма ***акругі г. Полацка***. З аднаго боку, паняцце «акруга» даволі шырока ўжывалася ў навуковым асяродку, з другога – быў падрыхтаваны шэраг публікацый, якія спрабавалі вызначыць паняцце «акруга Полацка» [1].

Для аналізу сістэмы вясковага рассялення патрабавалася выявіць новыя вясковыя паселішчы, перш за ўсё ў акрузе г. Полацка. Безумоўна, што немагчыма было адразу ахапіць археалагічнымі разведкамі ўсю тэрыторыю Падзвіння, таму адмыслова, першапачаткова, у якасці даследчай тэрыторыі былі абраны геаграфічныя межы сучаснага Полацкага раёна. У выніку атрымалася выбарка з генеральнай сукупнасці ўсіх паселішчаў Полацкага Падзвіння. Асабіста аўтарам дадзенай публікацыі было зафіксавана месцазнаходжанне 109 вясковых неўмацаваных паселішчаў са 125 улічаных у межах сучаснага Полацкага раёна.

З 2002 года арэал разведак быў пашыраны і закрануў іншыя раёны Полацкага Падзвіння, а менавіта: Шумілінскі, Шаркаўшчынскі, Верхнядзвінскі, Лепельскі, Глыбоцкі, Расонскі і Міёрскі. Безумоўна, што такіх шчыльных археалагічных разведак на тэрыторыі дадзеных раёнаў не праводзілася, таму і колькасць выяўленых паселішчаў выглядае значна меньшай па параўнанні з Полацкім раёнам. Аб гэтым сведчаць даныя, прыведзеныя ў табліцы.

Вясковыя неўмацаваныя паселішчы,
выяўленыя М.В. Клімавым у 2002 – 2007 гадах

Назва раёнаў	Тып, падтып паселішча			
	прырэчны падтып	прыазёрны падтып	водападзельны тып	усяго
Верхнядзвінскі	21	10	2	33
Глыбоцкі	4	5	1	10
Лепельскі	–	5	1	6
Міёрскі	1	1	1	3
Расонскі	3	–	–	3
Ушацкі	–	4	1	5
Шаркаўшчынскі	4	–	–	4
Шумілінскі	6	1	–	7
Усяго				**71**

З табліцы вынікае перш за ўсё тое, што пошук вясковых паселішчаў меў у асноўным эпізадычны характар, аб чым сведчыць непрапарцыянальнасць у прадстаўніцтве асобных тыпаў і падтыпаў паселішчаў у кожным з раёнаў. Напрыклад, абследаваліся некаторыя азёры (Лепельскі, Ушацкі р-ны), цячэнні асобных рэк (Верхнядзвінскі, Шумілінскі, Шаркаўшчынскі р-ны). У цэлым магчыма ўказаць на тое, што тэрыторыі вышэйуказаных раёнаў патрабуюць больш шчыльных разведак.

Звернем увагу на тое, што, як і ў выпадку з Полацкім раёнам, у ўказаных раёнах быў зафіксаваны даволі нязначны працэнт водападзельных селішчаў.

У Полацкім раёне са 125 вядомых паселішчаў толькі 28 (або 22 %) адносіліся да водападзельных [2]; з 71 паселішча да падобнага тыпу належала толькі 6 адзінак (гл. табліцу). Гэта ўказвае не на адсутнасць водападзельных селішчаў, а на цяжкасць выяўлення, што звязана ў значнай ступені з разведкамі, аддаленымі ад вадаёмаў. Безумоўна, што з XVI стагоддзя пры актывізацыі ўнутранай каланізацыі, аб'ектыўна, доля водападзельных паселішчаў павінна была істотна павялічыцца.

Храналагічны аспект

Акрамя тэрытарыяльнага (тапаграфічнага) аспекту адным са складаных у доследах вясковых неўмацаваных паселішчаў з'яўляецца храналагічны аспект.

Храналогія вясковых паселішчаў высвятляецца праз аналіз стратыграфічнай сітуацыі сукупна з фіксацыяй знаходак у культурным пласце шэрага помнікаў. У выніку магчыма казаць аб двух працэдурах у высвятленні храналогіі на неўмацаваных вясковых паселішчах:

1) аналіз храналогіі помніка на аснове асобных рэчаў;

2) аналіз храналогіі помніка праз высвятленне храналогіі асобных зачыненых комплексаў.

Першы з падыходаў ахоплівае такія катэгорыі артэфактаў:

- керамічны посуд;
- цэгла і пліткі для падлогі;
- кафля;
- вырабы з металаў.

Другі падыход больш дакладны, але менш распаўсюджаны ў археалогіі вясковых паселішчаў, бо пры невялікіх плошчах доследаў вясковых паселішчаў немагчыма дакладна патрапіць на зачыненыя комплексы. Да таго ж у сувязі з нязначнай магутнасцю культурнага пласта складана захаваць зачынены характар комплексу. Зыходзячы з практыкі палявых археалагічных доследаў вясковых паселішчаў ідэальным з пункту гледжання высвятлення храналогіі трэба прызнаць вясковыя неўмацаваныя паселішчы, якія зніклі ў выніку катастрофы, менавіта пажару.

Падобная сітуацыя катастрофы ў пласце на вясковых неўмацаваных паселішчах захоўваецца «in situ» у больш ступені, чым у гарадах, дзе на месцы былых пажараў, як правіла, аднаўлялася забудова. У такім разе, нават калі культурныя напластаванні на помніках не перавышаюць 0,4 – 0,6 м, застаюцца ямы-зачыненыя комплексы, звязаныя з пабудовамі і запоўненыя рэчавым матэрыялам. Пры вывучэнні невялікіх плошчаў на вясковых помніках верагоднасць выяўлення зачыненых комплексаў выглядае мінімальнай, аб чым сведчаць раскопкі аўтара на паселішчах Двор Гомель-1, Рудня, Астроўшчына, Субаўшчына-3 [3]. Наадварот, пры доследах вясковага помніка, плошчай большай за 100 кв. м падобныя комплексы выяўляюцца, што паказалі працы аўтара на помніках Лучна і Лісна [4].

З пункту гледжання дакладнасці ў вызначэнні храналогіі найбольш важнымі з'яўляюцца **комплексы-манетныя скарбы і асобныя знаходкі манет.** Але нават калі скарбы выяўляюцца на тэрыторыі вясковых паселішчаў, яны не заўсёды адлюстроўваюць аб'ектыўную карціну, бо іх захаванне можа быць зроблена пасля знікнення паселішчаў. Падобная сітуацыя прасочана адносна помніка Лучна-1, дзе фіксаваўся храналагічны разрыў паміж знікненнем помніка і больш позняйшым скарбам, схаваным на тэрыторыі помніка, дзе жыццядзейнасць была спынена [5]. Тое ж можа датычыцца і манет, якія могуць патрапіць у слой помніка выпадкова. Найбольш выразна гэта тэндэнцыя праяўляецца адносна так званых «барацінак» 60-х гадоў XVII стагоддзя. Іх колькасць і выпадковасць у знаходцы памяншаюць навуковую значнасць падобных манет як храналагічных маркераў.

Безумоўна, што вызначэнне храналагічных межаў бытавання таго ці іншага вясковага помніка знаходзіцца ў прамой залежнасці ад распрацаванага датавання керамічнага матэрыялу (масавыя артэфакты, найбольш шырока прадстаўленыя ў комплексах) і яго супастаўлення з датамі, якія даюць комплексы з манетамі ці рэчамі з вузкімі храналагічнымі межамі бытавання. Як вядома, падыход, пры якім для датавання вясковых паселішчаў па керамічнаму матэрыялу курганных могільнікаў і гарадоў быў прапанаваны яшчэ В.В. Сядовым, і застаецца актуальным да гэтага часу [6].

Звернемся да праблем храналогіі вясковых паселішчаў на аснове керамічнага посуду як найбольш масавага датуючага матэрыялу.

Аўтарам дадзенай публікацыі пры аналізе дынамікі храналагічных зменаў у развіцці керамікі на паселішчах было вылучана 6 храналагічных керамічных груп (перыядаў) [7]:

- А (X – XIII стст.);
- Б (XIV – XV стст.);
- В (XVI ст.);
- АБ (XIII – XIV(XV) стст.);
- БВ (XIV(XV) – XVI стст.);
- АБВ (X – XVI стст).

Працуя з прадстаўленай схемай, заўсёды ўзнікалі пытанні адносна перыяду X – XIII стагоддзяў. Казаць аб X стагоддзі даволі складана. На вясковых паселішчах амаль адсутнічаюць фрагменты керамікі гэтага перыяду, што сведчыць аб 2-х даследніцкіх момантах: аб'ектыўным і суб'ектыўным:

1) аб'ектыўны момант праяўляецца ў тым, што маршруты археалагічных разведак не закраналі месцы былых паселішчаў X стагоддзя, якія знікалі і змяшчаліся ў іншых месцах, чым сучасная вясковая пасяленчая структура, якая ў асноўных рысах, па меркаванню даследчыкаў, склалася пачынаючы з XV стагоддзя [8]. Таму пры наданні пільнай увагі сучасным населеным пунктам як адлюстраванню аграрнага ландшафту XVI стагоддзя аграрны ландшафт X – XI стагоддзяў не трапляў у поле зроку даследчыка;

2) субъектыўны момант у адсутнасці керамічнага посуду X стагоддзя праяўляецца ў недастатковай ступені шурфоўкі на вясковых паселішчах. Часам невялікія шурфы не закраналі вобласці распаўсюджання культурнага слоя дадзенага храналагічнага рубяжа.

У выніку найбольш аб паселішчах у межах перыяду X – XIII стагоддзяў мы можам меркаваць не па селішчах X – пачатку XI стагоддзя, а па селішчах канца XI – XIII стагоддзя, якія добра ідэнтыфікуюцца па кераміцы з венчыкамі, звернутымі ўнутр (варыяцыя назвы: карнізікі, звернутыя ўнутр), і адпавядаюць дэмаграфічнаму выбуху XII стагоддзя. Гэтыя паселішчы і звязаная з імі кераміка ўжо аналізаваліся аўтарам [9]. Падобны дэмаграфічны выбух характэрны і для іншых рэгіёнаў. Так, на тэрыторыі правабярэжнага Палесся (Украіна) у перыяд XII – XIII стагоддзяў колькасць паселішчаў павялічваецца ў 2,2 разы. Пры гэтым 80 % паселішчаў XI стагоддзя, якія працягвалі існаваць і ў XII стагоддзі, склалі толькі 35 % ад агульнай колькасці паселішчаў [10]. Таму ў межах храналагічнага перыяду X – XIII стагоддзяў колькасць паселішчаў канца XI – XIII стагоддзяў складае большасць.

Пэўная праблема назіраецца і адносна храналогіі керамікі XV стагоддзя. Некаторыя тыпы гаршчкоў маюць «памежны стан»: узнікаюць у XV стагоддзі і працягваюць існаваць у пачатку XVI стагоддзя. У выніку размежаванне паселішчаў XIV – XV і XV – пачатку XVI стагоддзя робіцца праблематычным. Таму і існуе храналагічная керамічная група БВ (XIV(XV) – XVI стст.).

Такім чынам, магчыма прыйсці да высновы аб тым, што працэдура высвятлення храналогіі вясковых паселішчаў павінна знаходзіцца ў прамой залежнасці ад актыўнага выкарыстання зачыненых рэчавых комплексаў, іх супастаўлення з храналогіяй керамічнага посуду і асобнымі рэчамі, якія маюць вузкія межы датавання.

Тыпалагічны аспект

Пры тыпалогіі вясковых паселішчаў існуе дыспрапорцыя паміж тапаграфічнай класіфікацыяй (па ўмовах размяшчэння на мясцовасці) і сацыяльнай класіфікацыяй (па сацыяльнай ролі паселішча ў структуры рассялення). Безумоўна, што тапаграфічная класіфікацыя можа быць ужыта да ўсіх паселішчаў, знойдзеных падчас археалагічных разведак. Разам з тым як сацыяльны тып паселішча можа быць высветлена толькі пры археалагічных раскопках і на аснове аналізу сукупнасці артэфактаў (гаворка можа ісці аб вылучэнні з шэрага паселішчаў сёл, федальных сядзібаў і інш.).

У гэтай сувязі ўкажам на некалькі прыкладаў. Так, помнік Лучна-1 пасля аднаго сезона раскопак па сукупнасці матэрыялаў не пакідаў сумнення аб тым, што перад намі манастыр Св. Міколы Лучанскага, вядомы ў дакументах з XIII стагоддзя. Але пры далейшых доследах высветлілася, што гаворка можа ісці аб феадальнай сядзібе, якая перапыніла сваё існаванне ў пачатку XVI стагоддзя, чаму прысвечаны шэраг публікацый [11]. Дзякуючы археалагічным раскопкам удалося па асаблівасцях матэрыяльнай культуры суаднесці неўмацаваныя вясковыя паселішчы з феадальнымі сядзібамі каля в. Завалынка (Субаўшчына-3) і Рудня Полацкага раёна. Але большасць неўмацаваных вясковых паселішчаў у сацыяльным сэнсе застаюцца не ідэнтыфікаванымі.

Археалагічныя разведкі дазволілі звярнуць увагу і на яшчэ адзін тып вясковых паселішчаў. У выніку археалагічных разведак было высветлена, што ў шэрагу выпадкаў не значылася дакладнага культурнага слоя адпаведнай глыбіні, якая перавышала б 25 см, межы падобнай фіксацыі культурнага слоя таксама заставаліся невызначальнымі, насычанасць мяркуемага культурнага слоя з керамікай лічылася мізэрнай. У падобных выпадках неабходна было весці гаворку не аб саміх паўнавартасных паселішчах, якія існавалі доўгі час. Для абазначэння падобных месцаў было ўведзена паняцце ***«сляды паселішчаў»***.

Пры далейшай распрацоўцы праблемы падобнай прысутнасці малой колькасці матэрыялаў і невыразнасці культурнага слоя аўтар прыйшоў да высновы аб тым, што падобныя сляды паселішчаў маглі сведчыць аб іх часовым існаванні, што не дазваляла за малы прамежак часу накапіць істотны з пункту гледжання археалогіі матэрыял. Гэта пытанне ўжо аналізавалася і адлюстраваннем часовых паселішчаў, прызнаваліся згаданыя ў дакументах пусташы, пустаўшчыны [12]. У выніку магчыма было б выразіць наступную сувязь: ***сляды паселішчаў – пусташы (пустаўшчыны) – часовыя паселішчы.***

Не знайшлі належнага адлюстравання ў класіфікацыйных схемах і паселішчы-вытворчыя комплексы. Магчыма прывесці некалькі прыкладаў. Вясковае неўмацаванае паселішча Дзмітраўшчына (Полацкі р-н) развівалася па абодвух берагах невялікай ракі. Па адным з берагоў дадзенай ракі змяшчаўся комплекс па выплаўцы (варцы) жалеза, на другім беразе фіксаваўся культурны пласт са значнай доляй керамічнага посуду [13]. Узнікае пытанне: якім чынам падаваць дадзенае паселішча, як паселішча-вытворчы комплекс ці асобна як: ***а) паселішча***; ***б) вытворчы комплекс.***

Пры правядзенні тапаграфічнай тыпалогіі таксама выявіліся спрэчныя падыходы ў вызначэнні класіфікацыйных крытэрыяў. Адзін з гэтых крытэрыяў звязаны з вызначэннем адлегласці паселішча ад берага ракі пры аднясенні паселішча да прырэчнага падтыпу або да берага возера – пры вызначэнні прыазёрнага падтыпу. Звычайна падобныя паселішчы не былі аддалены ад берага больш чым на 10 – 15 м, але ёсць выключэнні, якія ставяць пытанне аб крытэрыях дапасаванасці паселішча да рэсурснай зоны ракі або возера.

Такім чынам, на аснове вышэйразгледжаных матэрыялаў магчыма прыйсці да заключэння аб тым, што нягледзячы на істотную даследаванасць вясковых паселішчаў Полацкага Падзвіння застаецца шэраг часткова не разведаных мікрарэгіёнаў, асабліва за межамі Полацкага раёна.

Пры аналізе тэрытарыяльнага (тапаграфічнага) аспекту было высветлена, што доля выяўленых селішчаў водападзельнага тыпу не адлюстроўвае рэальную сітуацыю з падобнымі паселішчамі, асабліва ў дачыненні перыяду XVI стагоддзя.

Храналагічны аспект у доследах селішчаў Полацкага Падзвіння выразіўся ў распрацоўцы керамічных храналагічных груп (перыядаў) і працы з зачыненымі комплексамі і асобнымі індывідуальнымі знаходкамі. *Тыпалагічны аспект* – у непрапарцыянальнасці паміж тапаграфічнай і сацыяльнай тыпалогіяй вясковых паселішчаў, што звязана з малой доляй археалагічных раскопак на асобных паселішчах.

Падводзячы вынікі неабходна адзначыць, што вывучэнне вясковых паселішчаў Полацкага Падзвіння яшчэ далёка ад свайго завяршэння.

ЛІТАРАТУРА

1. Клімаў, М. Акруга Полацка ў X – XIII стагоддзях: сутнасць і вытокі фармавання / М. Клімаў // Полацк: карані нашага радавода: матэрыялы міжнар. навук. канф., Наваполацк, 5 – 6 верасня 1995 г. / Полац. дзярж. ун-т; рэдкал. В.І. Шайкоў [і інш.]. – Полацк, 1996. – С. 36 – 40; Клімаў М. Уплыў сельскай акругі на станаўленне і развіццё старажытнага горада на тэрыторыі Беларусі (на прыкладзе акругі г. Полацка) / М. Клімаў // Беларусь у сістэме трансеўрапейскіх сувязяў у I тысячагоддзі н. э.: тэз. дакл. і павед. міжнар. навук. канф., Мінск, 12 – 15 сакав. 1996 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: В.С. Вяргей [і інш.]. – Мінск: НВФ «VAUKALAKA», 1996. – С. 42 – 43.
2. Клімаў, М.В. Тапаграфія і планіроўка вясковых паселішчаў у акрузе Полацка / М.В. Клімаў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2005. – № 9. – С. 38.
3. Клімаў, М.В. Справаздача аб археалагічных раскопках і разведках у 1997 годзе на тэрыторыі Полацкага раёна / М.В. Клімаў // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 1704; Клімаў, М.В. Справаздача аб археалагічных раскопках і разведках на тэрыторыі Полацкага раёна за 1998 год / М.В. Клімаў // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 1768; Клімаў, М.В. Справаздача пра археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў 2004 годзе / М.В. Клімаў // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 2191.

4. Клімаў, М.В. Справаздача аб археалагічных раскопках на помніку Лучна-1 і выведках на тэрыторыі Полацкага раёна ў 2000 годзе / М.В. Клімаў // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 1768; Клімаў, М.В. Справаздача пра археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў 2006 годзе / М.В. Клімаў // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 2396.
5. Клімаў, М.В. Манетныя скарбы XVI ст. з мікрарэгіёну Лучна / М.В. Клімаў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2006. – № 11. – С. 158.
6. Седов, В.В. Сельские поселения центральных районов Смоленской земли (VIII – XV) / В.В. Седов // Материалы и исследования по археологии СССР. – М.: АН СССР, 1960. – № 92. – С. 14.
7. Клімаў, М.В. Вясковыя паселішчы ў акрузе Полацка X – сярэдзіны XVI ст.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук:07.00.06 / М.В. Клімаў. – Мінск, 2005. – С. 6.
8. Риер, Я.Г. Аграрный мир Восточной и Центральной Европы в средние века (по археологическим данным): моногр. / Я.Г. Риер. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2000. – С. 26.
9. Клімаў, М.В. Аб адной групе паселішчаў на тэрыторыі Полацкага Падзвіння ў XI – XIII стст. / М.В. Клімаў // Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социорелигиоведческих науках Беларуси, Ближнего и Дальнего Зарубежья: материалы междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 19 – 20 апреля 2007 г.: в 3 ч. / Витебск. гос. ун-т. – Витебск, 2007. – Ч. 1. – С. 33 – 34.
10. Томашевський, А.П. Правобережне Полісся / А.П. Томашевський // Село Київської Русі (за матеріалами південноруських земель) / пад рэд. О.П. Моця. – Київ: Шлях, 2003. – С. 16.
11. Клімаў, М.В. Лучна-1: Стратыграфія і храналогія феадальнай сядзібы / М.В. Клімаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV міжнар. канф., Полацк, 23 – 24 кастр. 2002 г. / Нац. Полацкі гіст.-культ. музей-запаведнік; рэдкал.: С.В. Тарасаў [і інш]. – Полацк, 2002. – С. 150 – 159; Климов, М.В. Проблема феодальных усадеб незамкового типа на территории Беларуси: XI – XVI вв. (по материалам памятника Лучно-1) / М.В. Климов // Археология и история Пскова и Псковской земли: материалы I.I науч. семинара; редкол: Н.В. Лопатин [и др.]. – Псков, 2006. – С. 293 – 303.
12. Клімаў, М.В. Асаблівасці рассялення ў акрузе Полацка: X – сярэдзіна XVI ст. / М.В. Клімаў // Гіст.-археалаг. зб. – 2006. – № 21. – С. 33 – 34.
13. Клімаў, М.В. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у Полацку і Полацкім раёне ў 1995 годзе / М.В. Клімаў, С.В. Тарасаў // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 1599.

РЭЗАЛЮЦЫЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАГА СЕМІНАРА «БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА І ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ»

Аргкамітэт рэспубліканскага навукова-практычнага семінара «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў» падагульніў вынікі работы дзвюх секцый «Этнаграфія і краязнаўства», «Археалогія і антрапалогія». Выказаныя прапановы вырашана ўвасобіць у наступных палажэннях:

- *Адзначаючы той факт, што Полацкі дзяржаўны універсітэт склаўся як адзін са значных цэнтраў каардынацыі намаганняў даследчыкаў гісторыі Беларускага Падзвіння, з улікам значнасці Полацка як старажытнага навукова-асветніцкага цэнтра Беларускага Падзвіння і актуальнасці разглядаемых на семінары пытанняў праводзіць навукова-практычны семінар рэгулярна, не радзей аднаго раза на два гады, з наданнем статусу «міжнародны».*
- *Падтрымаць ініцыятыву кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт» аб стварэнні на базе ПДУ вучэбнай лабараторыі па палявому археолага-этнаграфічнаму і антрапалагічнаму вывучэнню Беларускага Падзвіння.*
- *Падтрымаць ініцыятыву кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт» па прадаўжэнню выдання на базе ПДУ вучэбна-хрэстаматыйнага выдання «Полацкі этнаграфічны зборнік».*
- *Падтрымаць ініцыятыву кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт», Полацкага гарадскога выканаўчага камітэта па арганізацыі і дзейнасці пастаяннай археалагічнай экспедыцыі ў г. Полацку сумесна са спецыялістамі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.*

Аргкамітэт рэспубліканскага навукова-практычнага семінара «Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў» выказвае падзяку Пасольству Рэспублікі Азербайджан, Кангрэсу Азербайджанскіх абшчын Беларусі і асабіста Міралі Міраліеву ў дапамозе арганізацыі канферэнцыі.

ЗМЕСТ

АРХЕАЛОГІЯ

А.М. Ляўданскі – пачынальнік полацкай археалогіі *(Дук Д.У.)* 3
Вайцяховіч А.В. Рэканструкцыя пахавальнага абраду крэмацыі
па даных раскопак курганных могільнікаў Полацкай зямлі 5
Дук Д.У. Ляпная кераміка і рэчавы комплекс вакольнага горада старажытнага Полацка
(па выніках раскопак 2008 года) 9
Емяльянчык В.А. Вынікі антрапалагічных даследаванняў
на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў 1998 – 2008 гады 30
Кошман В.І. Асноўныя вынікі даследавання гарадзішча Свіслач
(па матэрыялах 2000, 2005 – 2008 гадоў) 38
Левко О.Н. Итоги, задачи и перспективы археологического исследования Полоцка и его округи 47
Магалінскі І.У. Абутковыя падкоўкі XV – XVIII стагоддзяў
(па матэрыялах археалагічных даследаванняў у горадзе Полацку ў 2000 – 2008 гады) 50
Плавінскі М.А. Курганны могільнік Пагошча: асноўныя вынікі раскопак 2005 – 2008 гадоў 55
Салаўёў А.А. Каменныя будынкі полацкага езуіцкага калегіума апошняй чвэрці XVII – першай паловы
XVIII стагоддзя (па выніках натурных даследаванняў корпуса В) 70
Тарасаў С.В. «Белыя плямы» полацкай археалогіі і гісторыі 79
Халилов М.Дж. Основные итоги исследований раннесредневековых памятников
кавказской Албании 92
Харитонович З.А. Керамика городищ Северной Беларуси 97
Чарняўскі Макс.М. Крамянёвыя вырабы Паўночнабеларускай культуры
ў матэрыялах раскопак 2000 – 2007 гадоў: першыя вынікі даследавання 106
Чарняўскі Міх.М. Кераміка Усвяцкай культуры: набыткі апошніх палявых сезонаў 115

КРАЯЗНАЎСТВА І ЭТНАГРАФІЯ

Андрыеўская С.Ул. Традыцыйныя прыёмы гадавання дзяцей на Падзвінні 123
Антропаў М.П. Традыцыйная духоўная культура Падзвіння
ў матэрыялах архіва «Беларускага этналінгвістычнага атласа» 128
Аўсейчык Ул.Я. Народная медыцына стараверaў Падзвіння
(на аснове матэрыялаў палявых этнаграфічных даследаванняў) 132
Аўчыннікава Ю.А. Архітэктурныя асаблівасці культавай забудовы
Полацкага Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра 136
Бабіч А.Ю. Гісторыя этнаграфічнага і фальклорнага вывучэння Падзвіння
ў другой палове XX – пачатку XXI стагоддзя 143
Боганева А.М. Вобразы і сюжэты Ветхага і Новага Запаветаў
у «Народнай Бібліі» Віцебскага Падзвіння (па сучасных запісах) 153
Борун Е.Н. Православные монастыри Полоцкой епархии в XIX – XX века 159
Вайткявичюс В. Истоки Вилии. Попытка реконструкции сакрального ландшафта 162
Валодзіна Т.В. Да арэальнай характарыстыкі замоўнай традыцыі беларусаў Падзвіння 170
Гарбуль А. Паганскія капішчы і дахрысціянскія культавыя комплексы Пастаўшчыны 178
Калацэй В.В. Этнаэкалогія і вышэйшая школа 187
Каратай В.К. Нюансы палявой фальклярыстыкі на Падзвінні 70 – 80 гадоў XX стагоддзя 190
Корсак А.І. Ажыццяўленне нямецка-фашысцкай палітыкі генацыду яўрэйскага насельніцтва
ў гады Вялікай Айчыннай вайны (на прыкладзе г. Полацка) 191

Лабачэўская В.А. Вясковыя могілкі: зрубныя надмагіллі
(па матэрыялах усходніх раёнаў Віцебскай вобласці і Магілёўскага Падняпроўя Беларусі) 195
Лебедева И.Г. Модификации французских звуков у русскоязычных белорусов Витебского региона
и россиян Псковской области 205
Лобач У.А. Культавыя крыніцы Беларускага Падзвіння: вопыт арэальнага даследавання 213
Мишин П.И. Мировоззренческие основы примет и гаданий белорусов Подвинья 227
Мішына В.І. Структура і сімволіка традыцыйнага вясельнага абраду беларусаў цэнтральнага
і заходняга Падзвіння ў 1930 – 1950-я гады (па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый ПДУ) 231
Півавар М.В. Краязнаўцы Полаччыны другой паловы XX стагоддзя 236
Пракоф'ева Ю.С. Абрусы з калекцыі «Тканіна (тэкстыль)»
у фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка 244
Рабец Т.Д. Сістэма вобразаў у замоўнай традыцыі беларусаў Падзвіння 251
Сороко С.М. Географические, археологические и этнографические исследования Белорусского Подвинья
в XIX – начале XX века 257
Сухая Н.А. Традыцыйныя народныя тканіны Падзвіння:
па матэрыялах палявых даследаванняў 1998 – 2008 гадоў 261
Усціновіч Ю.Ф. Туроўля ў супрацьстаянні Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы
падчас Інфлянцкай вайны 268
Шастак Ю.Т. Рэгіянальныя рысы традыцыйнай архітэктуры жылля на Падзвінні
(па выніках палявых даследаванняў «Студэнцкага этнаграфічнага таварыства») 272
Шыдлоўскі К.С. Валуны Браслаўшчыны як помнікі геалогіі і этнаграфіі:
з гісторыі выяўлення і даследавання 279
Шыдлоўскі С.А. Уласныя імёны ў кнізе Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня»
як крыніца рэканструкцыі этнічнай карціны свету прывілеяванага саслоўя Беларускага Падзвіння
ў першай палове XIX стагоддзя 287

МЕТАДАЛОГІЯ ПАЛЯВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Піліпенка М.Ф. Сучасны стан і перспектывы развіцця беларускай этналогіі 291
Клімаў М.В. Асноўныя аспекты ў даследаванні вясковых паселішчаў Полацкага Падзвіння
ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя 292

Рэзалюцыя рэспубліканскага навукова-практычнага семінара
«Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў» 297